# ARCHE Зьмест № 5’03 ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ


1. Зьмест / Уводзіны
2. Ад стабілізацыі да мадэрнізацыі. Аляксандар Батура ў ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
3. Яшчэ раз пра месца беларусаў у гісторыі. Андрэй Катлярчук у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
4. Вялікае Княства Літоўскае як ідэалягічная рэальнасьць. Андрэй Казакевіч у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
5. Ерусалімскі лёс. Даніла Жукоўскі ў ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
6. Вільня. Чэслаў Мілаш у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
7. Літоўскі Ерусалім: ужо нябачны простым вокам… Віталь Зайка ў ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
8. Зьніклая Вільня. Андранік Антанян у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
9. Вільня — сталіца слабых. Сакрат Яновіч у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
10. Паўгоду ў скуры віленчука. Алесь Аркуш у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
11. Вільня і Літва ў расейскім друку. Мікола Нікалаеў у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
12. Жыцьцё і сьмерць Віленскага гета. Аляксандар Фрыдман у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
13. Духоўнасьць Вільні. Кшыштаф Чыжэўскі ў ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
14. Вільня. Анталёгія беларускай паэзіі XX ст. у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
15. Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі. Міхал Вівэг у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
16. Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сэрбіі і Беларусі. Віталь Сіліцкі ў ARCHE 5(28)-2003.

ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"

17. На Вайсковых могілках. Валянцін Тарас у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
18. Дзёньнік 1998. Вячаслаў Адамчык у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"
19. Вецер і сьпераду, і ззаду. Алесь Мемус у ARCHE 5(28)-2003. ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ. "…"

[image]
**ARCHE** **Пачатак** **№ 5 (28) – 2003**
[image]

[image]



[image]
**ВІЛЕНСКАЯ АНТАЛЁГІЯ**
[image] [image] [image] [image]
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі
[image] [image] [image]
[image]

## Зьмест

***Аляксандар Батура.*** **Ад стабілізацыі да мадэрнізацыі.**
***Андрэй Катлярчук.*** **Яшчэ раз пра месца беларусаў у гісторыі.**
***Андрэй Казакевіч.*** **Вялікае Княства Літоўскае як ідэалягічная рэальнасьць.**

Віленская анталёгія
*Даніла Жукоўскі.* **Ерусалімскі лёс.**
*Чэслаў Мілаш.* **Вільня.**
*Віталь Зайка.* **Літоўскі Ерусалім: ужо нябачны простым вокам.**
*Андранік Антанян.* **Зьніклая Вільня.**
*Сакрат Яновіч.* **Вільня — сталіца слабых.**
*Алесь Аркуш.* **Паўгоду ў скуры віленчука.**
*Мікола Нікалаеў.* **Вільня і Літва ў расейскім друку.**
*Аляксандар Фрыдман.* **Жыцьцё і сьмерць Віленскага гета.**
*Кшыштаф Чыжэўскі.* **Духоўнасьць Вільні.**
**Вільня. Анталёгія беларускай паэзіі XX ст.**

кніга
*Міхал Вівэг.* **Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі.**
палітыка
*Віталь Сіліцкі.* **Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сэрбіі і Беларусі.**
успаміны пра XX стагодзьдзе
*Валянцін Тарас.* **На Вайсковых могілках.**
запісы
*Вячаслаў Адамчык.* **Дзёньнік 1998.**
водгук
*Алесь Мемус.* **Вецер і сьпераду, і ззаду.**

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

---

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/11/30**
[image]

# Аляксандар Батура Ад стабілізацыі да мадэрнізацыі

## Траекторыі расейскай палітыкі

**АЛЯКСАНДАР БАТУРА (нар. у 1977 годзе ў Мядзеле) — палітолаг. Скончыў факультэт права Цэнтральнаэўрапейскі ўнівэрсытэту (Будапэшт). Вучыцца ў дактарантуры “Trinity College” (Дублін) і выкладае там жа на факультэце паліталёгіі. Сёлета двойчы друкаваўся ў “ARCHE”.**

Маскоўскія палітыкі з паліттэхнолягамі супрацоўнічаюць паводле звычнай ім фінансава-палітычнай сыстэмы залатой эпохі дзевяноста трэцяга — дзевяноста шостага гадоў,

навязаўшы яе ўладам. Вось — Крэмль, у Крамлі зьяўляецца выбарчы праект, адзін ці некалькі. Пад яго падбіраюцца палітыкі, падключаецца тэлебачаньне. Калі гэтыя ўмовы замыкаюцца і па контуры пайшлі грошы, усё з радасьцю ажывае. Клоўны лятуць зь месцаў і мэлядычна пукаюць, “актыў” пляскае ў далоні і крычыць “так-так-не-так!” Ідзе масавае ачмурэньне электарату праз тэлебачаньне плюс падцягваньне яго праз так званы адміністрацыйны рэсурс… Усё гэта звалася

палітыкай і ёй было. Але да Пуціна, пры Ельцыну… Палітыка — не тэатар, і, калі вы заходзіце ў палітыку як у тэатар, вам толькі й застаецца, што сьвістаць з галёркі. Калі шоў-палітыкі абрыднуць, глядач робіцца прадусарам, распускае трупу і набірае новую. Вось гэта і ёсьць палітыка.

*З інтэрвію Глеба Паўлоўскага часопісу “Эксперт”*

**П**апуры з царскай Расеі, Савецкага Саюзу і новай Расеі

На працягу першых год прэзыдэнцтва Ўладзімера Пуціна ўсе прафэсійныя аналітыкі расейскай палітычнай сцэны і ўвогуле ўсе, хто цікавіцца палітыкай, імкнуліся адказаць на пытаньне “Хто такі Пуцін?”. Ці гэта ляяльны намесьнік “сям’і”, які працягне “слаўныя” традыцыі ельцынскага прэзыдэнцтва, ці гэта новы андропаў, які павыганяе ўсіх з кінатэатраў у працоўны час і паверне стрэлкі гадзіньніка “back in USSR”? Цяпер, здаецца, большасьць назіральнікаў, асабліва на Захадзе, пагодзіцца, што Пуцін прыемна зьдзівіў. Пуцін — гэта ветлівы малодшы партнэр Злучаных Штатаў, які зьмірыўся з тым, што Расеі наканавана роля рэгіянальнай сілы, прыняў правілы гульні рынкавага капіталізму і дэмакратыі (ці “кіраванай дэмакратыі”). Падобна на тое, што палітычная сыстэма і

эканоміка нарэшце стабілізаваліся, існуе стабільны эканамічны рост, і рэйтынг Пуціна стабільна высокі — не ніжэйшы за 70 %. Краіна задаволеная стабільнасьцю пасьля анархіі ўсёмагутных алігархаў Ельцына. Пуцін, прапанаваўшы расейцам папуры з царскай Расеі, Савецкага Саюзу і новай постсавецкай Расеі, змог задаволіць любы палітычны густ. Пуціна стабільна падтрымліваюць як прыхільнікі камуністаў, так і прыхільнікі лібэралаў. Нарэшце, перадусім у насельнікаў буйных гарадоў і асабліва сярод моладзі ды клясы заможных, зьявіўся пэўны аптымізм. У краіну пацягнуліся чароды рэімігрантаў, якія ўдосыць пакаштавалі “салодкага жыцьця” на Захадзе ў 90-х. Большасьць зь іх працуе мэнэджэрамі і топ-мэнэджэрамі ў заходніх і буйных расейскіх кампаніях, якія з радасьцю прынялі “самаарганізаваных” рэпатрыянтаў. У маіх расейскіх сяброкоў ізноў зьявіўся гонар за шостую частку зямной сушы.

Здаецца, Расея робіцца нармальнай краінаю, дзе моц дзяржавы вымяраецца памерам ВНП, якасьцю чалавечага жыцьця, а ня колькасьцю зброі і краін, якія гэтай зброі баяцца. Сьвяткаваньне 300-годзьдзя Санкт-Пецярбургу сымбалічна адзначыла зьяўленьне новай Расеі — часткі заходняй цывілізацыі. Але адначасова гэтае сьвята таксама выявіла прыярытэт выгляду над зьместам, прыярытэт паказухі над сапраўднымі зьменамі. Мільёны, выдаткаваныя на “пацёмкінскія вёскі”, маглі б пайсьці на разьвіцьцё ледзь жывой інфраструктуры гораду ці тым жа настаўнікам і дактарам.
У пуцінскай Расеі сапраўды існуе парадак і стабільнасьць, прынамсі, нашмат больш парадку і стабільнасьці, чым у ельцынскай Расеі. Але ці не за кошт адмовы ад дэмакратычных нормаў, якія як-ніяк існавалі раней? Ці можна разьлічваць на стабільны, доўгатэрміновы эканамічны рост бяз доўгачаканай адміністрацыйнай рэформы, ці можна збудаваць капіталізм з савецкімі кадрамі на месцах? На чым трымаецца сёньняшняя палітычная стабільнасьць Расеі — на сапраўдных посьпехах Пуціна ці, як сьцьвярджае вядомы палітоляг Лілія Шаўцова, на высокіх цэнах на нафту ды фэнамэнальнай папулярнасьці прэзыдэнта? І калі цэны на нафту і папулярнасьць пойдуць уніз, што застанецца ад стабільнасьці?
На гэтае пытаньне не існуе цьвёрдых адназначных адказаў. Ніжэй прыведзены агляд палітычнага курсу прэзыдэнта

Ўладзімера Пуціна, у якім я паспрабую прапанаваць адказы на такія пытаньні. Акрамя сваіх думак я буду выкарыстоўваць ідэі расейскіх і заходніх палітычных аналітыкаў — Лілії Шаўцовай, Андрэя Рабава, Глеба Паўлоўскага, Дзьмітрыя Трэніна, Андэрса Аслунда, Стывэна Холмса ды іншых. Іх меркаваньні наконт тых ці іншых аспэктаў прэзыдэнцтва Пуціна часам разыходзяцца, таму будзе больш правільна абмеркаваць некалькі найбольш праўдападобных сцэнароў разьвіцьця падзеяў.
Эканамісты і экспэрты па міжнародных стасунках збольшага дадатна ацэньваюць палітычныя паводзіны Пуціна, у той час як тыя, хто аналізуе ўнутраную дынаміку краіны, даюць больш неадназначныя ацэнкі. Таксама і я не імкнуся навязаць сваіх поглядаў, давесьці, прыкладам, што ў нашай суседкі ўсё блага, ідзе вайна, грымяць праз тыдзень тэракты, рэформы буксуюць ці, наадварот, — усё файна і Расею чакае стабільны доўгатэрміновы эканамічны рост ды красаваньне дэмакратыі. Замест гэтага я прапаную палемічны, “каляпаліталягічны” агляд розных аспэктаў, якія характарызавалі першыя тры гады кіраваньня Пуціна, пазнаёмлю з поглядамі вядомых “назіральнікаў” расейскай палітыкі, магчымымі сцэнарамі і прагнозамі яе разьвіцьця. Гэта не навуковы артыкул, а, хутчэй, запрашэньне да дыскусіі. Калі чытач знойдзе нейкія недакладнасьці, неабгрунтаваныя высновы — прашу сьпісаць гэта на мой кошт, а не калег-палітолягаў, творы якіх згадваюцца тут.
У гэтым аглядзе цэнтральнае месца займае панятак стабільнасьці. Акурат з абяцаньнямі стабільнасьці Пуцін прыйшоў да ўлады, слова “стабільнасьць” найчасьцей сустракалася ў яго тэлевізійных прамовах. Калі Расея дасягнула стабільнасьці — гэты аспэкт і зьяўляецца асноўным пытаньнем дадзенага агляду, — то цяпер ёй ужо патрэбна нешта большае, чымся проста стабільнасьць. Да таго ж набліжаецца час парлямэнцкіх і прэзыдэнцкіх выбараў, і якая ж тут стабільнасьць, нават у “кіраванай” дэмакратыі Пуціна?

**“Запаветы Ельцына”**
Каб зразумець пэўныя зьмены ці адсутнасьць зьменаў, трэба зразумець, з чым сутыкнуўся Пуцін пасьля свайго папярэдніка Барыса Ельцына. Рэжым Ельцына звычайна вызначаецца расейскімі палітолягамі як “супэрпрэзыдэнцкая рэспубліка”.

Аднак слова “супэрпрэзыдэнцкая” можа ўвесьці ў зман: “супэрпрэзыдэнцкаю” ўлада была толькі канстытуцыйна, напрыклад, у параўнаньні з заканадаўчай і судовай уладамі. Калі глядзець на ўплыў гэтае ўлады на дзяржаву ў цэлым, з прэзыдэнцкай уладай было ўсё далёка ня “супэр”, хоць яна і заставалася цэнтральнаю ўладай. Існаваў шэраг уплывовых актораў, якія мелі пэўную аўтаномію і зь якімі Ельцыну ўвесь час трэба было дамаўляцца, — гэта і Дзяржаўная Дума, і тады яшчэ вельмі моцная КПРФ, і алігархі, і сродкі масавай інфармацыі, і дзяржаўная “савецкая” бюракратыя. Над губэрнатарамі ці, яшчэ горш, прэзыдэнтамі на месцах, у суб’ектах Фэдэрацыі, кантроль быў яшчэ слабейшы, а часам і ўвогуле адсутнічаў. Формула Ельцына “бярэце столькі ўлады, колькі можаце з сабой панесьці” спрацавала на дэзінтэграцыю краіны. Паміж гэтымі акторамі ішла пэрманэнтная барацьба, у розны час у рознай канфігурацыі, з рознымі вынікамі — паміж цэнтрам ды рэгіёнамі, паміж Прэзыдэнтам ды Думай, паміж рознымі кланамі пры падтрымцы СМІ і рэгіёнаў. Можна сказаць, што існавала *некалькі цэнтраў улады, што канкуравалі міжсобку*. Увядзеньне простых выбараў выканаўчай улады ў рэгіёнах дало дадатковую легітымнасьць рэгіянальным лідэрам, і рэгіёны пачалі паводзіцца ўсё больш і больш самастойна ў сваіх стасунках з фэдэральным цэнтрам. Усё больш і больш рэгіянальных законаў уваходзілі ў супярэчнасьць з фэдэральнай Канстытуцыяй і фэдэральным заканадаўствам. Падаткі не пералічаліся ў фэдэральны бюджэт, “сілавыя” органы на месцах слухаліся мясцовай выканаўчай улады, а не фэдэральнага цэнтру. Прэзыдэнт Ельцын траціў кантроль над краінай, дзяржава паступова, але рашуча *дэзінтэгравалася ў канглямэрат рэгіянальных цэнтраў*. Рэгіянальныя эліты праводзілі сваю ўласную эканамічную і палітычную палітыку, патрэба ў цэнтры паступова адпадала. Усе ўважліва чыталі расейскага геапалітыка Дугіна, які чытаў амэрыканскага геапалітыка Бжазінскага. Абодва яны сьцьвярджалі (хоць і па-рознаму глядзелі на праблему), што дэзінтэграцыя Расеі — гэта адна з рэальных пэрспэктываў.
У той жа час, пачынаючы з 1991 году ў Расеі адбыўся шэраг дэмакратычных выбараў — некалькі на фэдэральным узроўні і сотні — на рэгіянальным і мясцовым, — якія былі больш-менш адкрытымі і сумленнымі. Існавала канкурэнцыя, і, што самае

галоўнае, адбывалася рэгулярная зьмена элітаў. Напрыклад, падчас губэрнатарскіх выбараў 1996—97 гадоў прыкладна палова губэрнатараў страціла ўладу ў электаральнай барацьбе. Можна казаць, што пасьля рэфэрэндуму і прыняцьця на ім Канстытуцыі 1993 году правілы палітычнай гульні сталі даволі стабільнымі і значна не зьмяніліся. Такім чынам, *інстытуцыялізацыя дэмакратычных інстытутаў* — выбараў і выбарчых інстытутаў, партый — была пасьпяховаю. Такой пасьпяховаю, што Расея 2003 году мае сыстэму, якая была сфармаваная ў 1990-х на патрэбу 1990-х, з тымі ж акторамі і партыямі, што цяпер ужо мала каго прадстаўляюць. У той жа час, усё большую ролю ў палітычным працэсе тады пачыналі адыгрываць акторы, якія ня мелі аніякага дачыненьня да інстытутаў дзяржавы, — алігархі. Інстытуты дзяржаўнай улады пачалі абслугоўваць прыватныя інтарэсы. Гэта было відавочна на працягу ўсяго прэзыдэнцтва Ельцына — пачынаючы ад “цёмных” дамоваў падчас абвальнай прыватызацыі першай паловы 1990-х і канчаючы апошнімі кабінэтнымі дамовамі наконт перадачы ўлады новаму прэзыдэнту пры канцы 1999 году. Дастаткова згадаць, што знакамітае абмеркаваньне рашэньняў па эканамічнай палітыцы ў ноч з 16 на 17 жніўня 1998 году, г. зн. напярэдадні т. зв. дэфолту, ішло ў прысутнасьці людзей, што ня мелі аніякага дачыненьня да дзяржаўнай палітыкі, але мелі яўныя камэрцыйныя інтарэсы. З прызначэньнем алігарха Беразоўскага на пасаду ў адміністрацыю Прэзыдэнта можна было сьмела гаварыць, што алігархія ня тое што стаіць ля дзьвярэй дзяржаўнае ўлады Расеі, але яна ўжо даўно ўнутры, на канапе, паклала ногі на стол, адкрыла там сабе бляшанку піва і гаворыць па мабільніку. Рэальная ўлада ў дзяржаве ўсё больш разыходзілася з канстытуцыйнай. Дэзінтэграцыя фэдэральнага цэнтру, рост улады рэгіянальных элітаў і алігархізацыя дзяржаўнае ўлады вялі проста да паралюшу ўлады, калі рашэньні цэнтру не выконваліся, і да страты легітымнасьці інстытуту прэзыдэнта ды ўвогуле дэмакратычных інстытутаў. Існавала рэальная магчымасьць дэзінтэграцыі Расейскай Фэдэрацыі на ўзор Савецкага Саюзу.

**Улада павінна быць уладаю**

Асноўнай задачай пераемніка Ельцына было прыпыненьне

дэзінтэграцыі краіны. Не аналізуючы глыбока чачэнскага крызысу — гэта асобная тэма, — можна зазначыць, што Пуціну ўдалося “адфарматаваць” гэты крызыс у кантраляваны фармат праз маніпуляцыю мас-мэдыямі, некаторыя тактычныя посьпехі на “фронце антытэрарыстычнай апэрацыі”, выбраную самімі чачэнскімі баевікамі яўна тэрарыстычную тактыку і, як вынік, іх паразу на фронце грамадзкай думкі. Аднак на цяперашні момант, нягледзячы на “канстытуцыйны працэс”, што пачаўся на тэрыторыі Чачэніі, сытуацыя там выглядае патавай для абодвух бакоў.

Перш за ўсё новаму прэзыдэнту трэба было павысіць кіраванасьць дзяржавай і кансалідаваць дзелавыя колы ды ўладныя структуры шматлікіх узроўняў. Пуціну збольшага ўдалося знайсьці кампраміс паміж дзелавой супольнасьцю — у тым ліку і з алігархамі, хаця не з усімі, зь дзяржаўнай бюракратыяй і з большай часткай насельніцтва-“падданых”. Першыя баяліся новага перадзелу ўласнасьці, другія — радыкальных зьменаў у апараце ўлады, апошнія — новай сэрыі сацыяльна-эканамічных узрушэньняў і галечы. Пуцін здолеў пабудаваць і стабілізаваць вэртыкаль выканаўчае ўлады (хоць і з пэўнымі хібамі). Перш за ўсё ён імкнуўся пазбавіцца элемэнтаў, якія дэстабілізавалі агульнае становішча ў цэнтры ды рэгіёнах і спрыялі дэзінтэграцыі дзяржаўнай улады.

Пуцін “прапіхнуў” пяць найбольш значных рэформаў, накіраваных на паляпшэньне кіраванасьці дзяржавай. Першая зь іх датычыла Рады Фэдэрацыі — у яе замест мясцовых губэрнатараў і сьпікераў парлямэнтаў губэрнатары і мясцовыя парлямэнты пачалі прызначаць сваіх прадстаўнікоў. Мэтай другой рэформы было павелічэньне ролі фэдэральнага цэнтру ў кіраваньні суб’ектамі фэдэрацыі. Пуцін увёў сем буйных фэдэральных акругаў, якімі пачаў кіраваць наўпрост праз сваіх “паўнамоцных прадстаўнікоў”. Быў таксама прыняты закон, згодна зь якім усе рэгіянальныя законы і мясцовыя канстытуцыі павінны адпавядаць фэдэральнай Канстытуцыі. Паводле іншага новага закону Пуцін займеў права зьвяртацца ў суд, каб звольніць з пасады непажаданага губэрнатара ў выпадку парушэньня апошнім фэдэральных законаў. Таксама Пуцін правёў сэрыю законаў, пакліканых навесьці парадак у падатковай сыстэме. Тым самым ён імкнуўся пазбыцца праклёну рэжыму Ельцына, пры якім фэдэральны цэнтар ня мог

зьбіраць падаткі з сваіх фэдэральных суб'ектаў і плаціць у пару зарплату.
На шчасьце, пабудова эфэктыўнай вэртыкалі ўлады не была самамэтаю Пуціна. Ён сапраўды імкнуўся нэўтралізаваць найбольш адыёзныя аспэкты ельцынскага фэдэралізму, небясьпечныя для цэльнасьці краіны. І яму ўдалося прыпыніць дэзінтэграцыю Расеі ў канфэдэрацыю рэгіёнаў, намінальна кіраваных цэнтрам. У барацьбе з рэгіянальнымі лідэрамі, гэтаксама як і з алігархамі, ён ня прагнуў дасягнуць поўнай перамогі — што ў цяперашніх умовах, напэўна, і немагчыма. Мэтай Пуціна было павялічыць ролю фэдэральнай бюракратыі, каб астатнія гульцы палітычнай сцэны ўспрымалі яе, прынамсі, як "першую сярод роўных". Фэдэральная рэформа задумвалася для павышэньня патэнцыі аслабленае цэнтральнае ўлады: фэдэральны цэнтар пасьля прыняцьця порцыі "віягры" павінен быў закратацца як малады і паказаць, што ён яшчэ можа, як і раней.

Перад тым як перайсьці да абмеркаваньня гэтай фэдэральнай рэформы, хочацца адзначыць, што дагэтулешняя крытыка пуцінскіх рэформаў заходнімі палітолягамі, якія сьцьвярджаюць іх недэмакратычнасьць і ўспрымаюць як замах на "велічныя заваёвы" Ельцына, — крытыка не зусім адэкватная. Можна крытыкаваць гэтыя рэформы за неэфэктыўнасьць і за тое, што яны не дасягнулі мэты. Але пагроза дэмакратыі ў Расеі мае цалкам іншую прыроду і ня зьвязана з спробамі цэнтру прыпыніць дэзінтэграцыю краіны. На пагрозах дэмакратыі я яшчэ спынюся трохі ніжэй, а тут дадам (і заходнім камэнтатарам гэта вядома лепей, чым каму іншаму, пасьля 11 верасьня 2001), што ёсьць такая рэч, як страх перад дзяржавай, якая парушае правы грамадзянаў. Але існуе яшчэ больш фундамэнтальны страх — перад жыцьцём безь дзяржавы ўвогуле. Як пісаў Томас Гобс у сваім "Левіятане", гэта стан, "найгоршы за ўсе, пэрманэнтны страх і небясьпека гвалтоўнай сьмерці".
Расейцы хацелі стабільнасьці, прадказальнасьці, эфэктыўнасьці дзяржавы, і Пуцін рабіў усё, каб гэта даць. Збольшага яго рэформы дасягнулі сваёй мэты. Калі ў 1998 годзе суб'екты фэдэрацыі зьбіралі 61 % дзяржаўных падаткаў і цэнтар усё больш траціў кантроль над фінансавымі плынямі, то ў 2001-м

рэгіёны сабралі ўжо толькі 48 %. Пуціну ўдалося правесьці праз Думу сэрыю законаў, паводле якіх багацейшыя рэгіёны цяпер аддавалі ў цэнтар значна больш падаткаў, чым раней. Бедныя рэгіёны, якія звычайна атрымлівалі з цэнтру больш, чым плацілі падаткаў, і якіх было значна болей, чымся “багатых”, ахвотна падтрымалі ініцыятыву цэнтру. З аднаго боку, Пуцін тут перамог і здолеў выплачваць затрыманыя пэнсіі і зарплаты, з другога, калі раптам у будучыні зноў узьнікне падобная праблема, рэгіёны могуць сьмела ківаць на фэдэральны цэнтар, дзе разьмяркоўваюць грошы.

Другое новаўвядзеньне — сфармаваньне сямі фэдэральных акругаў — не дало пэўнага выніку. “Паўнамоцныя прадстаўнікі” Пуціна, маючы не зусім зразумелыя паўнамоцтвы і рэсурсы, ня здолелі скаардынаваць працу паміж фэдэральнымі міністрамі і мясцовымі лідэрамі. Гэта прывяло да павелічэньня бюракратыі на месцах, бо гэтыя прадстаўніцтвы дублявалі шмат функцый мясцовых органаў. Гарманізацыя фэдэральнага і мясцовага заканадаўства была толькі часткова пасьпяховай: губэрнатары прывялі ў адпаведнасьць канстытуцыі толькі тыя законы, якія з самага пачатку не былі ім асабліва карыснымі, і пакінулі бязь зьменаў астатнія, карысныя ім. Бяз больш шырокай юрыдычнай і, самае галоўнае, адміністрацыйнай рэформы Пуцін наўрад ці здолее дабіцца поўнай гарманізацыі законаў, бо імплемэнтацыя рашэньняў цэнтру дагэтуль залежыць ад асобаў, фінансавыя інтарэсы якіх, у сваю чаргу, залежаць ад “неімплемэнтацыі” гэтых рашэньняў. Цяжка сказаць, наколькі зьмены ў Радзе Фэдэрацыі — замену губэрнатараў на іх прадстаўнікоў — можна назваць сапраўднымі інстытуцыйнымі зьменамі, а не часовай дамоваю паміж рэгіянальнай і фэдэральнай элітамі. На карысьць падобных высноваў гаворыць і той факт, што фэдэральны цэнтар гатовы інстытуцыялізаваць прагу да ўлады рэгіянальных кіраўнікоў у абмен на іх ляяльнасьць. Так, ліпеньская пастанова расейскага Канстытуцыйнага Суду 2002 году, якая ўзаконьвала магчымасьць выбірацца на трэці (і чацьверты) тэрмін для рэгіянальных лідэраў, фактычна азначала, што фэдэральны цэнтар дапускае манапалізацыю рэгіянальнымі элітамі ўлады ў рэгіёнах пры ўмове іх ляяльнасьці.

**Рэйтынг “Надзеі” і высокіх цэнаў на нафту**

На працягу стагодзьдзяў расейскай гісторыі пасьпяховыя і правальныя рэформы, перамогі і паразы, посьпехі і няўдачы запісваліся на рахунак вельмі невялічкай групы асобаў: “цара-бацюхны” зь яго дваром або герантакратаў-чальцоў Палітбюро. Як піша Юры Фёдараў з МДІМА, “гэтая парадыгма, што глыбока пусьціла карані ў нацыянальнай псыхалёгіі, вызначае ўспрыманьне грамадзтвам усёй сацыяльнай рэальнасьці і перашкаджае дэмакратычнай трансфармацыі, бо вядзе да грамадзкай пасіўнасьці і ўвечнівае спэцыяльную дамінантную ролю вышэйшых дзяржаўных асобаў і бюракратаў”. Няма дзіва, што многія расейцы тлумачаць праблемы сваёй краіны памылкамі дзяржаўных асобаў і ўсё чакаюць “моцнага лідэра”, які здолее жалезнай рукой вырашыць усе іх праблемы. У гэтым найвялікшая слабасьць расейскага грамадзтва: замест таго каб бачыць саміх сябе актыўнымі палітычнымі і сацыяльнымі агентамі, якія самі вызначаюць умовы свайго існаваньня і, калі трэба, нясуць адказнасьць за свае рашэньні, *расейцы бачаць сябе аб’ектамі маніпуляцыі кіраўнікоў дзяржавы*. Кіраўнікі дзяржавы выступаюць актыўнымі праваднікамі гістарычнага працэсу, а грамадзтва застаецца пасіўным суб’ектам шматлікіх экспэрымэнтаў і рэформаў. У 1999 годзе грамадзтва чакала моцнага лідэра, які возьме адказнасьць за лёс краіны і вырашыць усе яго праблемы. Формула Пуціна “мачыць бандытаў у сарцірах” выклікала ладны розгалас у псыхалёгіі постсавецкіх выбарцаў і трансфармавалася ў 54 % галасоў “за” ў першым туры прэзыдэнцкіх выбараў.

З таго часу рэйтынг Пуціна цягам болей чым трох гадоў стабільна трымаецца на ўзроўні, не ніжэйшым за 70 %. Калі карыстацца эканамічнымі тэрмінамі, рэйтынг яго неэлястычны. Нягледзячы на непазьбежныя памылкі і праблемы, хранічны “няпосьпех” у Чачэніі, непапулярнасьць у грамадзтве яго празаходняй палітыкі — *рэйтынг Пуціна застаецца высокім і не залежыць ані ад унутранай, ані ад замежнай палітыкі.* Такі рэйтынг — сапраўдны *dream come true* для любога палітыка, і, каб разабрацца ў яго стабільнасьці, трэба зразумець прыроду ўсёй палітычнай стабільнасьці пуцінскай Расеі.

Як ужо адзначалася, у апошнія гады кіраваньня Ельцына расейскія эліты, завязаныя ў кланы з алігархамі, крамлёўскімі групоўкамі і рэгіёнамі, функцыянавалі практычна аўтаномна ад

грамадзтва. У той жа час традыцыйна патэрналісцкія настроі ў расейскім грамадзтве вялі да таго, што большасьць насельніцтва зьняверылася ў магчымасьці пабудовы сваёй асабістай будучыні сваімі рукамі і пакладала адказнасьць на вярхоўную ўладу. Як піша аналітык маскоўскага фонду Карнэгі Андрэй Рабаў, “у такіх умовах рэйтынг Пуціна як прэзыдэнта “надзеі” адначасова выступае ў ролі гаранта і індыкатара нізкай сацыяльна-палітычнай актыўнасьці насельніцтва”. Такая сытуацыя спрыяе элітам — яна дазваляе ім пашыраць эканамічную і палітычную экспансію, не зьвяртаючы ўвагі на грамадзкую рэакцыю. Нізкі ўзровень даверу да інстытутаў улады іх не турбуе, бо стабільнасьць палітычнай сыстэмы забясьпечваецца высокай папулярнасьцю Пуціна. Але гэта павінна турбаваць, калі глянуць глыбей і зразумець прыроду гэтага высокага рэйтынгу. Ён заснаваны не на дасягненьнях улады, а на няўпэўненасьці грамадзтва, на страху шырокіх колаў насельніцтва перад будучыняй, новымі палітычнымі “землятрусамі”, прагай затрымаць дасягнутае, хаця дасягнута ня так ужо й шмат.

Тое, што ўся гэтая сыстэма пабудаваная на папулярнасьці адной асобы, стварае пагрозу яе абвалу ў выніку абвалу рэйтынгу Пуціна. Такая сыстэма ня можа гарантаваць стабільнасьці, такая стабільнасьць ілюзорная і нават небясьпечная. Сытуацыя нагадвае эпоху Ельцына, калі замест таго, каб сьпярша правесьці юрыдычную і судовую рэформы ды замацаваць вяршэнства права, а ўжо пасьля стварэньня гэтых умоваў правесьці саму прыватызацыю і эканамічныя рэформы, усё было зроблена наадварот. Вынік усім вядомы: прыватная ўласнасьць, здабытая дзякуючы закулісным дамовам і ігнараваньню права, так і не прывяла да ўстанаўленьня зразумелых і сумленных правілаў гульні для ўсіх бізнэс-гульцоў, да вяршэнства права і вырашэньня канфліктаў у судох — неабходных умоваў для сапраўднага паляпшэньня эканамічнай сытуацыі ў краіне. “Прыхватызацыя”, праведзеная ўва ўмовах карупцыі, выклікала ўздым карупцыі і масавыя парушэньні права. Рынкавая эканоміка, якая не абапіраецца на вяршэнства права, ня ёсьць стабільнай эканомікай. Гэтаксама і рэйтынг Пуціна, не абаперты на моцны падмурак *незваротных рэформаў*, ня ёсьць стабільным рэйтынгам.

Посьпех і стабільнасьць немагчыма пабудаваць на пяску, павінна быць інстытуцыялізацыя, у гэтым выпадку — інстытуцыялізацыя пуцінскай папулярнасьці. Раптоўны абвал папулярнасьці магчымы нават у найбольш папулярных і харызматычных лідэраў. Гэта зьведаў цяпер Тоні Блэр, які ня здолеў пераканаць брытанскую грамадзкасьць у неабходнасьці вайны з Іракам. Яшчэ паўгоду таму ніхто і не сумняваўся ў тым, што Блэр будзе пераабраны на трэці тэрмін, цяпер ня ўсе ўпэўненыя, што ён дацягне да канца другога. Але абвал папулярнасьці брытанскага прэм'ер-міністра не пагражае палітычнай стабільнасьці Брытаніі, дзе правілы палітычнай гульні даўно інстытуцыялізаваныя.

Інакш у Расеі. Многія назіральнікі лічаць, што Пуцін аказаўся — ці акажацца — закладнікам сваёй асабістай папулярнасьці, сваёй поўнай і, здаецца, канчатковай перамогі над палітычнымі супернікамі. Калі ўлічыць яго асабістыя якасьці нацыянальнага і, ужо можна сьцьвярджаць, міжнароднага лідэра, гэта небясьпечна. *Сыстэма, пабудаваная пад аднаго лідэра, не зьяўляецца стабільнай сыстэмай.*

Тут трэба таксама ўзгадаць, што пасада прэзыдэнта Расейскай Фэдэрацыі канстытуцыйна нагадвае пасаду французскага "супэрпрэзыдэнта". Паўнамоцтвы прэзыдэнта ў ельцынскай канстытуцыі 1993 году былі сьпісаныя з канстытуцыі дэ Голя. Але назваць пасаду французскага прэзыдэнта "супэрпрэзыдэнцкаю" можа толькі той, хто не знаёмы з паўнамоцтвамі постсавецкіх "супэрпрэзыдэнтаў", у тым ліку і расейскага. Улада расейскага прэзыдэнта многім падаецца слабой толькі з прычыны пэўнай слабасьці дзяржаўнай структуры, што можа быць зьявай часовай. Канстытуцыйна ж пасада прэзыдэнта надзвычай моцная. Пры ўмове што Пуцін застанецца прэзыдэнтам у будучым, найхутчэй аніякіх "канстытуцыйных" крызысаў ня будзе: Пуцін выдатны гулец у "канстытуцыйнай" прасторы. Але пры гіпатэтычным прыходзе іншай асобы на пасаду прэзыдэнта гэтая пасада можа зрабіцца занадта моцнай для расейскай "кіраванай" дэмакратыі.

Як ужо было сказана, расейская сыстэма "завязаная" на лідэра — і пры замене лідэра (найпазьней — у 2008 годзе, бо сёлета ў чэрвені Пуцін ясна сказаў, што ніякага трэцяга тэрміну ня будзе) можа адбыцца самае неймавернае. Гэтая праблема — праблема ўсіх постсавецкіх лідэраў. Нават калі іх тэрмін ня

скончыцца паводле канстытуцыі, некалі можа пагоршыцца здароўе ці прыйсьці старасьць. (У Азэрбайджане прэзыдэнт Аліеў, будучы ў паважным веку, перадаў уладу былому прэм'ер-міністру з зусім невыпадковым прозьвішчам Аліеў і так вырашыў сваю праблему-2003. Тая ж праблема чакае і Кучму, які ўжо цяпер спрабуе вырашыць праблему-2004, і Лукашэнку, які вырашае праблему-2006.) Вырашэньне Ельцыным праблемы-2000 было хутчэй выняткам з правілаў — яму ўдалося разьвязаць яе па расейскіх мерках надзіва элегантна. Якімі б стабільнымі ні здаваліся пэрсаналісцкія сыстэмы, яны ня могуць быць стабільнымі паводле азначэньня.

**Стабільнасьць**

Першыя тры гады прэзыдэнцтва пайшлі на прыняцьце тэрміновых стабілізацыйных захадаў. На фоне бязьдзейнасьці ельцынскай улады нават супраціўнікі Пуціна прызнаюць пэўныя пазытыўныя дасягненьні. Фэдэральная сыстэма больш-менш стабілізавалася — хоць і за кошт асабістай папулярнасьці Пуціна і стабільнага эканамічнага росту, у многім забясьпечанага дзякуючы высокім цэнам на нафту. Ствараюцца новыя працоўныя месцы, растуць рэальныя даходы насельніцтва. Пры Пуціну ўдаецца зводзіць фэдэральны бюджэт з прафіцытам, чаго пры Ельцыну ніколі не было. Пасьля 10-гадовага перапынку Расея нарэшце вярнулася на другое месца ў сьвеце ў здабычы нафты і на першае месца ў гандлі энэрганосьбітамі. Як піша расейскі аналітык Аляксей Дзянісаў, "эканамічныя рэформы атрымалі моцны заканадаўчы падмурак. Дзякуючы ўстойлівай цэнтрысцкай большасьці ў Дзяржаўнай Думе быў прыняты важны пакет законаў па ўдасканаленьні падатковага заканадаўства". Былі прынятыя, нягледзячы на апазыцыю КПРФ, Зямельны і Працоўны кодэксы, дадзены старт пэнсійнай і судовай рэформам, забясьпечаныя захады для падтрымкі малога і сярэдняга бізнэсу, пэўнай дэбюракратызацыі эканомікі. Аднак прынятыя даволі лібэральныя эканамічныя законы пакуль не працуюць на поўную сілу і рэформы ня йдуць як мае быць. Большасьць камэнтатараў пагаджаецца, што дасягненьне Пуціна — палітычную стабільнасьць — не ўдалося выкарыстаць для якаснага паляпшэньня жыцьця людзей, для якасных зьменаў у эканоміцы і сацыяльнай сфэры. Чаму так сталася?

Як было адзначана вышэй, стабільнасьць ува ўмовах сучаснай Расеі мае хутчэй сацыяльна-псыхалягічны характар і не заснаваная на аб'ектыўных дасягненьнях. Стабільнасьць грунтуецца на стомленасьці людзей ад зацягнутага пэрыяду радыкальных і непасьпяховых рэформаў 90-х гадоў. Ува ўмовах стабільнасьці ў людзей падае цікавасьць да палітыкі і грамадзкай актыўнасьці ўвогуле. Як піша Андрэй Рабаў, у такіх умовах "палітычны працэс набывае інэрцыйны характар". Дзеля гэтага ўлада ў Расеі, а не грамадзтва і ня бізнэс, працягвае заставацца адначасова і рухавіком, і тормазам усіх новаўвядзеньняў.
Лілія Шаўцова вызначае рэжым Уладзімера Пуціна як бюракратычна-аўтарытарны:

"Пад бюракратычна-аўтарытарным рэжымам я разумею кіраваньне, пры якім улада канцэнтруецца ў руках лідэра, а само кіраваньне зьдзяйсьняецца пры дапамозе бюракратыі і сілавых структураў. Рэфарматарскі патэнцыял такога рэжыму падтрымліваецца за кошт інтэграцыі ў яго пэўнага кола лібэрал-тэхнакратаў… Эканамічным падмуркам такой сыстэмы зьяўляецца алігархічны капіталізм".
Мэтай пуцінскага рэжыму ёсьць спалучэньне стабільнасьці з мадэрнізацыяй сыстэмы без парушэньня яе прынцыпаў. Яго курс можна вызначыць, згодна з Шаўцовай, як трыяду — "эканамічны лібэралізм-аўтарытарызм-арыентацыя на Захад".

Спроба мадэрнізаваць рэжым, не парушаючы пры гэтым балянсу інтарэсаў, які сфармаваўся яшчэ пры Ельцыну, прывяла да ўнутрана супярэчнай базы рэжыму, у якую ўваходзяць часам супрацьлеглыя групы. Увесь гэты час ідзе актыўная "грызьня бульдогаў пад дываном" (так калісьці заходнія саветолягі празвалі прыхаваную барацьбу ўнутры савецкага палітбюро, калі было відаць, што пад дываном ідзе грызьня, у ход ідуць лапы і зубы, але не відаць, хто перамагае, пакуль пераможца сам ня вылезе з-пад дывану) паміж "сям'ёй" і "пецярбуржцамі". Дарма што Пуцін здолеў давесьці сваю незалежнасьць ад клану Ельцына, так званая "сям'я" дагэтуль застаецца вялікай сілай. Цяпер ужо былы кіраўнік прэзыдэнцкай адміністрацыі Аляксандар Валошын і прэм'ер-міністар Міхаіл Касьянаў прадстаўляюць "сям'ю". Разам з

Пуціным у Крамлі зьявілася разнамасная групоўка лібэральных эканамістаў зь Пецярбургу, былых і цяперашніх афіцэраў ФСБ, якія адразу счапіліся зь “сям’ёй” за кантроль “над тэрыторыяй”. “Пецярбуржцы” пачалі дамінаваць ужо ў 2000 і 2001 гадох, выціскаючы стаўленікаў “сям’і” па ўсіх кірунках. “Сям’я” сьцішылася, а пасьля адыгралася пры канцы 2001 году. З таго часу барацьба — за рэсурсы, кантроль над бізнэсам і бюракратыяй, кадравыя прызначэньні — ідзе зь пераменным посьпехам. “Пецярбуржцам” не ўдаецца дасягнуць поўнага кантролю над бізнэсам, а “сям’я” ня ў стане кантраляваць фэдэральную бюракратыю. Апошняя сутычка, якая пагражае перайсьці ў поўнамаштабную вайну, дзе з абодвух бакоў падцягваецца ўсё больш і больш падмацаваньняў, адбылася сёлета 2 ліпеня. У той дзень “пецярбуржцы” пад кіраўніцтвам Віктара Іванова і Ігара Сечына напалі на “Юкас” алігарха Хадаркоўскага. Пра наступствы (інвэстыцыйны клімат) і магчымыя матывы (непапулярнасьць “Адзінай Расеі” і палітычныя амбіцыі Хадаркоўскага) будзе ніжэй, а пакуль можна зрабіць выснову, што Пуцін, хаця й пазбавіўся адкрытай манаполіі алігархаў на вызначэньне палітычнай лініі рэжыму, мусіць зь пераменным посьпехам лавіяваць паміж рознымі кланамі.

Кланавая сутычка “сям’і” зь “пецярбужцамі” насамрэч можа мець больш складаныя матывацыі. Магчыма, напад “пецярбужцаў” на “Юкас” — ня проста чарговы выпад аднаго боку супраць іншага, а якасна новая спроба “сілавікоў” зь пецярбурскай групы вярнуць палітычную сытуацыю да анархіі 1998—99 гадоў. Калі гэта так, то сярод пецярбурскай групы складваецца рэваншысцкая групоўка сілавікоў, зьвязаных з “пакрыўджанымі алігархамі”, якая жадае пабудаваць новую алігархічную сыстэму — гэтым разам зь “сілавікамі” на чале — і пад прыкрыцьцём лёзунгу аб “забесьпячэньні прыярытэту нацыянальнага бізнэсу” перагледзець вынікі прыватызацыі 1990-х, а таксама прыпыніць магчымую страту бюракратычнага кантролю над дзяржаўнай уладай. Спробы Пуціна перавесьці палітыку з узроўню “барацьбы бульдогаў пад дыванам” на публічны ўзровень, якія наблізяцца да посьпеху, калі “Адзіная Расея” даб’ецца перамогі на выбарах; абвешчаная ім адміністрацыйная рэформа, якая пахісьне пазыцыі савецкай бюракратыі; магчымы сыход Пуціна з палітыкі ў 2008 годзе і

“грамадзкі запыт” на “новага крамлёўскага гаспадара” — усё гэта падштурхоўвае “сілавікоў” да дзеяньняў. Пакуль яны здаюцца часткай “знаёмай” барацьбы “пецярбужцаў” зь “сям’ёй”, але могуць неўпрыкметку набыць новую якасьць — барацьбы сілавікоў за ўладу. Падобнае разьвіцьцё падзеяў створыць пагрозу згаданай стабілізацыі разнасортных элітаў, якая, у сваю чаргу, зрабіла магчымай агульную палітычную стабілізацыю. Калі напярэдадні выбараў ідзе сукрытая барацьба ў апараце і каля апарату, гэта вядзе да надзвычай непрадказальных наступстваў.

Андрэй Рабаў лічыць, што галоўным фактарам стабілізацыі палітычнай сыстэмы стала стабілізацыя палітычных элітаў, якія ёсьць сацыяльнай базай сыстэмы. Галоўным акторам на фэдэральным і рэгіянальным узроўнях паступова сталі кланы — “многаўзроўневыя, складана агранізаваныя групы інтарэсаў, якія ўключаюць уладальнікаў і топ-мэнэджэраў вядучых вэртыкальна інтэграваных кампаніяў, высокапастаўленых чыноўнікаў, якія адыгрываюць істотную ролю ў распрацоўцы і прыняцьці найважнейшых эканамічных і палітычных рашэньняў, палітычнае лобі ў партыях і парлямэнтах, мэдыя-эліту”. За апошнія гады эканамічная моц гэтых кланаў значна вырасла.
Вэртыкальна інтэграваныя кампаніі пашыраюць экспансію ў пэрспэктыўныя галіны эканомікі. Завяршаецца падзел аўтамабільнай вытворчасьці, ідзе прыватызацыя кампаній лясной і папера-цэлюлёзнай вытворчасьці. Напярадзе падзел нядаўна легалізаванага рынку сельскагаспадарчай вытворчасьці, чыгуначнага транспарту і шмат чаго іншага. Нягледзячы на “раскручаныя” абяцаньні Пуціна трымаць усе бізнэсы на аднолькавай дыстанцыі, працягваецца канцэнтрацыя нацыянальнага багацьця ў руках невялікай групы вядучых кланаў, якія маюць выхад на прэзыдэнцкую адміністрацыю. Мала што мяняецца. Напрыклад, у 1997 годзе, як піша амэрыканскі палітоляг Даніэль Трайсман, 10 найбуйнейшых кампаніяў Расеі вырабілі каля 57 % ВНП краіны. У 2000-м яны вырабілі ўжо 61 % — і лічбы працягваюць расьці. Кланы маюць “карпаратыўны” выхад на Крэмль і магчымасьць лабіяваць свае інтарэсы наўпрост. Калі вы адносіце леташні выпад Пуціна супраць Лукашэнкі “пра мухі і катлеты” да нестыкоўкі

характараў двух братніх лідэраў, дык вы памыляецеся — ідзе сыстэматычнае лабіяваньне прыватызацыі прамысловасьці СНД блізкімі да Крамля бізнэс-групоўкамі, і палітыка, як казалі клясыкі, тут робіцца толькі працягам эканомікі. Працягваецца канцэнтрацыя нацыянальнага багацьця ў руках некалькіх вядучых кланаў пры абмежаваных магчымасьцях разьвіцьця дробнага і сярэдняга бізнэсу, хоць дробны і сярэдні бізнэс цяпер расьце хутчэй, чым пры Ельцыну. Як заўважыў аналітык Павал Цяплунін, “расейская эканоміка цяпер складаецца зь некалькіх фінансава-прамысловых груповак і сотняў тысяч кіёскаў”. У Расеі навідавоку “клясычны” прыклад тыраніі меншасьці, калі меншасьць значна лепш мабілізаваная, чым большасьць, і жыве за кошт гэтай большасьці. Багатыя ў Расеі багацеюць хутчэй, чым ува ўсім сьвеце. Бедныя ж — бяднеюць, сярэдняя кляса то зьяўляецца, то зьнікае. Кланы ёсьць ня што іншае, як фракцыі, супраць якіх засьцерагаў у сваіх “Нататках фэдэраліста” адзін з бацькоў-заснавальнікаў Злучаных Штатаў Мэдысан 200 год таму, сьцьвярджаючы, што яны “…аб’яднаныя і актуалізаваныя пэўным адзіным імпульсам, жарсьцю, ці інтарэсамі, якія ідуць супраць іншых грамадзянаў ці супраць сталых і супольных інтарэсаў усяго грамадзтва”. Мэдысан прапанаваў і спосабы барацьбы з кланамі: “Трэба пашырыць кола [інтарэсаў] і набраць вялікую колькасьць розных партый ды інтарэсаў [у палітычную сыстэму], і ў вас будзе меншая імавернасьць, што большасьць будзе мець адзіную матывацыю і прагнуць парушаць правы астатніх грамадзянаў, а нават калі такая матывацыя і будзе існаваць, ёй будзе значна складаней зразумець і адчуць сваю моц”. Рана ці позна нешта трэба будзе рабіць з манапалізацыяй інтарэсаў, і добрай магчымасьцю пашырыць удзел грамадзтва, асабліва грамадзтва актыўнага ў дробным і сярэднім бізнэсе, у прыняцьці рашэньняў дзяржаўнай важнасьці могуць стаць будучыя выбары. На жаль, спробы ініцыяваць дыялёг паміж дзяржавай і грамадзянскай супольнасьцю праз шоў накшталт Грамадзянскага Форуму не займелі аніякага ўплыву на рэальную ўладу і прыняцьце рэальных рашэньняў на дзяржаўным узроўні.

Канцэнтрацыя ў руках галоўных суб’ектаў расейскай палітыкі неабмежаваных фінансавых, інфармацыйных, адміністрацыйных і палітычных рэсурсаў дазваляе рабіць мэты

стабілізацыі рэальнымі. Але пра якую стабілізацыю мы разважаем? Ці гэта такая стабілізацыя сыстэмы, калі правілы палітычнай гульні вядомыя ўсім і ўсімі прынятыя, калі насельніцтва больш-менш заможнае і ня хоча кардынальных зьменаў, калі палітычная і эканамічная сыстэмы стабільныя ў тым сэнсе, што яны здольныя вытрываць пэўныя ўзрушэньні, такія як зьмены лідэра ці пагаршэньне эканамічнай каньюнктуры? Хіба што не: перш за ўсё таму, што сыстэма яшчэ не давяла сваёй стабільнасьці ўва ўмовах нізкіх цэнаў на нафту і нізкай папулярнасьці ці яе адсутнасьці — Пуціна-папулярнага прэзыдэнта. Таму да стабільнасьці сыстэмы яшчэ далёка. Хутчэй можна казаць пра пэўную, адносную, "мясцовую" стабільнасьць элітаў, якія знайшлі "мясцовы", далёка не абсалютны (і Хадаркоўскі таму сьведка) *equilibrium* у складаным клубку ўзаемаадносінаў паміж Крамлём, рэгіёнамі, алігархамі, бюракратамі і мэдыямі. Гэта нават цяжка назваць нэакарпаратызмам, бо ў клясычную зьвязку нэакарпаратызму ўваходзіць трыяда ўлады, бізнэсу і прафсаюзаў. У расейскім варыянце зь яе вылятаюць працоўныя з дробнымі і сярэднімі вытворцамі, — застаецца ўлада, алігархі і дзяржаўная бюракратыя. Можна гаварыць пра ўмоўную стабільнасьць палітычнай актыўнасьці — а менавіта неактыўнасьці, пра стабільнасьць палітычных і эканамічных спадзяваньняў шырокіх колаў насельніцтва, пабудаваных на рэйтынгу "надзеі" Пуціна, невялічкіх і нешматлікіх посьпехах яго рэформаў. Шаўцова лічыць, што стабілізацыйны рэсурс цяперашняй формулы кіраваньня зусім не бязьмежны. "Гэтая мадэль улады працуе і самааднаўляецца пры бездакорнай сыстэме субардынацыі і падпарадкаваньня. І сыстэма ня ў стане працаваць пры слабасьці мэханізмаў прымусу". Нават невялічкі збой у сыстэме можа пацягнуць за сабой абвальны эфэкт. Праблема ў тым, што сярод падмуркаў рэжыму няма добрага цэмэнту з моцных прарэфарматарскіх сілаў. Ніводная палітычная партыя, нават "прарэфарматарскія" СПС і "Яблык", ані піскнула, калі пачаўся ціск на "Юкас". Існуе апора на сілы, якія ці падтрымліваюць *status quo*, ці дапускаюць мадэрнізацыю той жа старой сыстэмы толькі такой групоўкай, якая паходзіць зь дзяржаўнага апарату ці бізнэсу. Ува ўмовах стабілізацыі ўлады палітыкі пасьпяхова праводзілі палітыку пэўнага сацыяльнага манэўраваньня і ўтрымлівалі эканоміку ў стане

пэўнай раўнавагі празь бюракратычнае рэгуляваньне. Коштам дасягнутай стабільнасьці стала замаруджваньне далейшых неабходных рэфомаў у эканоміцы і палітыцы.
Большасьць аналітыкаў цяпер пагаджаецца, што стабілізацыйныя фактары сябе ўжо вычарпалі. Тут карысна прывесьці поўнасьцю цытату “шэрага кардынала Крамля” Глеба Паўлоўскага наконт стабільнасьці:

“Пуцінская Расея звыклася з стабільнасьцю, і цяпер амаль усе ўжо жадаюць большага, чым магчыма. Эканамічны рост у нашым слаба адчувальным варыянце падахвочвае апэтыты, якія няма чым задавольніць. А палітыка стабільнасьці, у нашым варыянце “кіраваньня дэмакратыяй”, пакідае гэтыя інтарэсы нават без сымбалічнага задавальненьня — непрадстаўленымі. Але стабільнасьць была ня чым іншым, як замоўчваньнем і затрымкаю найбольш амбіцыйных апэтытаў. Пуціна ганяць за нястачу праектаў агульнанацыянальнага ўзроўню, між тым як у грамадзтве нястачы не існуе — праектаў стае, але ўсе яны адкладзеныя. Улада здолела прымусіць галоўных гульцоў адкласьці іх амбіцыйныя, няўзгодненыя праекты. Узьнік кансэнсус стабільнасьці, калідор, па якім Пуцін і яго людзі рухаліся тры гады. Інтарэсы адкладаліся і не праяўляліся. Ні ўва ўладзе, ні ў апазыцыі яны не былі названыя і прынцыпова абрысаваныя. Амбіцыйнасьць усё расла і расла, але не імкнулася ў палітыку. Палітыка стала бясьпечным заняткам для ўсіх, акрамя Пуціна. Такое разьвіцьцё, якое давала рэсурсы палітыцы стабільнасьці, адначасова разьядала і разьядае палітычную клясу скепсысам і ўсеагульнай беспрынцыповасьцю”.

Існуе глыбокая нявырашаная супярэчнасьць паміж лёзунгамі рэфармаваньня дзяржаўна-палітычнага мэханізму прыняцьця рашэньняў, у тым ліку з эканамічнай галіны, — і рэальнымі вынікамі імплемэнтацыі гэтых лёзунгаў. Шырокія колы насельніцтва гатовыя працягваць падліваць алей у агонь пуцінскага рэйтынгу “надзеі”. Але яны стаміліся ад разыходжаньня словаў і справаў, ад усёўладзьдзя бюракратаў, ад маленькіх зарплат, неадрамантаваных школаў і бальніцаў. Акрамя таго, эканамічная каньюнктура ня будзе заўсёды такой жа пазытыўнай для расейскай нафты, газу і іншай сыравіны.

Нарэшце давядзецца зрабіць выбар паміж структурнымі зьменамі ў эканоміцы і яе далейшай лацінаамэрыканізацыяй. Фізычны знос вытворчых фондаў у электраэнэргетыцы, жыльлёва-камунальнай гаспадарцы і транспарце набліжаецца да крытычнае рысы. Андрэй Рабаў папярэджвае, што эпоха стабілізацыі ўжо амаль выпрацавала свой рэсурс і трэба як мага хутчэй перафарматаваць сыстэму:

“Існуе рызыка, што сыстэма перастане рэагаваць на выклікі, якія надыходзяць звонку, і пачне арыентавацца на самазахаваньне. Гэта толькі… павышае магчымасьць поўнамаштабнай палітычнай дэстабілізацыі ў пэрспэктыве пад цяжарам нявырашаных, загнаных углыб унутраных праблемаў ці пад уплывам вонкавых фактараў, якія могуць падарваць аснову сёньняшняга дабрабыту расейскай эліты, дасягнутага коштам манаполіі на рынках сыравіны”.
Пад унутранымі праблемамі Рабаў разумее нявырашанасьць фундамэнтальных пытаньняў мадэрнізацыі. Яе пасьпяховасьць выяўляецца ня ў колькасьці прынятых прагрэсіўных законаў у рэфармаваньні эканомікі, сацыяльнай сфэры і судовай сыстэме, а ў больш справядлівым разьмеркаваньні ўлады і ўласнасьці, якое б магло забясьпечыць доступ шырэйшых колаў насельніцтва да прыняцьця дзяржавай палітычных і эканамічных рашэньняў.
Другая праблема — гэта ўсё тая ж “старая добрая” праблема структурнай перабудовы эканомікі, ад якой бягуць, вырачыўшы вочы, усе лідэры постсавецкіх дзяржаваў, бо яна, як нішто іншае, пагражае іх стабільнасьці. Ува ўмовах Расеі, акрамя росту сырэдняга і малога бізнэсу, патрабуецца мадэрнізацыя навукаёмістых і высокатэхналягічных галінаў, разьвіцьцё чалавечага капіталу і рост інвэстыцыяў. Менавіта праблема мадэрнізацыі робіцца найважнейшай праблемаю, якая стаіць цяпер перад рэжымам Уладзімера Пуціна. Трэба аддаць яму належнае — ён гэта добра ведае. Калі на працягу першых трох год у яго прамовах гучалі словы “стабільнасьць”, “стабілізацыя” і вытворныя ад іх, дык цяпер Пуцін разважае пра падваеньне ВНП да 2010 году. Словы пра стабілізацыю зьнікаюць зь лексыкону: калі ласка, павітайце “кансалідацыю” і “мадэрнізацыю”.

**Ад стабільнасьці да мадэрнізацыі**

Грамадзтва працягвае абмяркоўваць прамову прэзыдэнта пра падваеньне ВНП за 10 гадоў і дзівіцца, як гэта магчыма. Але падвойны ВНП — гэта ня так шмат, як здаецца. Калі цяпер расейскі ВНП складае 5% ад амэрыканскага, то падваеньне дасьць 10 %, што паставіць Расею побач з такімі краінамі, як Бразылія ці Індыя. Гэта зусім ня шмат. Расея стаіць перад якасна новай стадыяй, зьвязанай з рэалізацыяй тых нарматыўных актаў, якія былі прынятыя раней. Як адзначае міністар эканамічнага разьвіцьця і гандлю Герман Грэф, забясьпечыць рост эканомікі можна толькі пры ўмове вырашэньня галоўнай задачы — павышэньня глябальнай канкурэнтаздольнасьці Расеі. Два асноўныя складнікі гэтай канкурэнтаздольнасьці — якаснае паляпшэньне дзяржаўнага кіраваньня і эканомікі.

Нягледзячы на пэўныя дасягненьні апошніх гадоў, узровень інвэстыцый па-ранейшаму даволі нізкі. Паводле дадзеных Серафімаўскага клюбу (расейскі эканамічны “мазгавы цэнтар”), на сёньня ўвесь аб’ём інвэстыцый у Расею ацэньваецца прыкладна ў 60—70 млрд даляраў. ВНП краіны знаходзіцца прыкладна паміж 350 (паводле афіцыйных ацэнак) і 450 млрд даляраў (з улікам грашовых плыняў, якія ня ўлічваюцца расейскай дзяржаўнай статыстыкай). Такім чынам, нормы інвэставаньня ў Расеі знаходзяцца на ўзроўні 13—20 % ад ВНП. Ці шмат гэта? Калі параўнаць з паказьнікамі разьвітых краінаў, дык гэта зусім няблага — напрыклад, у ЗША гэты паказьнік складае 17 %, у Вялікай Брытаніі — 15 %. Але тут трэба арыентавацца на нормы інвэстыцый у пэрыяды хуткага эканамічнага росту. Зыходзячы з досьведу пасьляваенных Нямеччыны і Японіі, жвавы эканамічны рост узьнікае пры норме інвэстыцыяў у 30—40 %. Другі, не такі даўні прыклад — у сярэдзіне 90-х у Паўднёвай Карэі інвэстыцыі былі на ўзроўні 38 %, у Маляйзіі, Тайляндзе і Кітаі — 41—42 %. Такім чынам, Расея патрабуе інвэстыцыяў, у 2—3 разы большых за сёньняшнія, а іх сучасны ўзровень не адпавядае яе патрэбам, якія растуць штогод. Як прывабіць інвэстараў?

Інвэстараў адпужваюць перш за ўсё застарэлыя сродкі вытворчасьці на большасьці прадпрыемстваў — што азначае неабходнасьць вялізных фінансавых укладаньняў для іх мадэрнізацыі, а таксама карупцыя на ўсіх узроўнях

адміністрацыі. Яшчэ адным “драконам” зьяўляецца незавершаны перадзел уласнасьці. Паводле трапнага выразу вядучага супрацоўніка Сусьветнага Банку Джоэля Хелмана, эканамічную сыстэму, якая існуе ў Расеі, адпаведна аналёгіі з прапанаванай Троцкім канцэпцыяй пэрманэнтнай рэвалюцыі можна лічыць эканамічнай сыстэмаю пэрманэнтнага пераразьмеркаваньня ўласнасьці. Як ужо згадвалася раней, масавая прыватызацыя 1990-х не суправаджалася стварэньнем інстытутаў, якія б вызначылі цывілізаваныя правілы гульні ўдзельнікаў рынку — незалежных судоў і вяршэнства права, стабільнай банкаўскай сыстэмы. Рэфарматары-“тэрмінатары” лічылі, што ўзьніклая кляса прыватных уласьнікаў сама створыць усё *post facto*. Але, “надзіва”, найбольш эфэктыўным спосабам здабыцьця ўласнасьці стала выкарыстоўваньне “шэрых” і пазалегальных мэтадаў. Адсутнасьць ці недааформленасьць законных правоў на ўласнасьць стварае базыс да новага пераразьмеркаваньня ўласнасьці. Няма дзіва, што інвэстары не сьпяшаюцца.

Апошні скандал зь “Юкасам”, калі генпракуратура раптам (але гэтае “раптам” сьведчыць пра добра сплянаваную акцыю) пачала “капаць” пэўныя аспэкты прыватызацыі “Юкасам” дзяржаўнай уласнасьці 10-гадовай даўніны, ня будзе спрыяць павелічэньню замежных інвэстыцыяў у Расею. Як падкрэсьлівае вядомы эканаміст-лібэралізатар Андэрс Аслунд, “які замежнік насьмеліцца ўкласьці грошы ў Расею, калі нават найбагацейшы чалавек Расеі (а Ходаркоўскі легальна найбагацейшы чалавек у краіне, пра нелегальных нічога сказаць ня можам) не адчувае сябе ў бясьпецы?” Абяцаньні Пуціна пра “дыктатуру закону” і добрыя стасункі з Захадам не ўспрымаюцца сур’ёзна, калі адміністрацыя выкарыстоўвае праваахоўныя органы для палітычнага перасьледу. Выпадкі такога кшталту яшчэ раз падкрэсьліваюць, што судовая і праўная рэформа ў Расеі пакуль што далёкая ад завяршэньня. Пры моцнай судовай уладзе справа Ходаркоўскага не займела б гістэрычна-палітызаванага характару, які яна мае цяпер. Кампанія сур’ёзна падарвала давер у недатыкальнасьць прыватнай уласнасьці. Яе эканамічныя і палітычныя наступствы могуць быць самыя сур’ёзныя для краіны: гэта ня жарт — пераглядаць вынікі масавай прыватызацыі 1990-х. Як заўважыў прэм’ер-міністар

Касьянаў, канфлікт паміж пракуратурай і “Юкасам” можа выклікаць адток капіталу і абвал інвэстыцыяў. Іронія, аднак, у тым, што найхутчэй генпракуратура сапраўды мае падставы для крымінальнай справы.

Канкурэнтаздольнасьць дзяржаўнага кіраваньня вызначаецца якасьцю дзяржаўных паслугаў і эфэктыўнасьцю кіраваньня дзяржаўнай уласнасьцю. Адміністрацыйная рэформа зьяўляецца найважнейшай рэформаю, ключом да далейшай мадэрнізацыі Расеі. Ёй перашкаджаюць структуры кіраваньня як на фэдэральным узроўні, так і на рэгіянальным. Выканаўчая ўлада да гэтага часу засталася савецкай, яна думае па-савецку, будуе ўзаемаадносіны з грамадствам ды бізнэсам па-савецку і працуе па-савецку. Лібэралізацыя эканомікі нявыгадная бюракратыі, бо можа падарваць складзеную на працягу многіх гадоў сыстэму намэнклятурнага кантролю над вытворцамі. Сёньняшнія мэханізмы кантролю над эканомікай (напрыклад, ліцэнзаваньне) даюць стабільна высокі прыбытак выканаўчай уладзе. Аніякая барацьба з карупцыяй, павелічэньне інвэстыцый і Вялікі Скачок наперад з гэткай адміністрацыяй проста немагчымы. Гэта таксама, напэўна, адна з самых балючых рэформаў, бо, як заўважыў Герман Грэф, саміх сябе рэфармаваць заўсёды найскладаней.

Як кажа Шаўцова, тармажэньне эканамічнай рэформы ў Расеі выклікана існаваньнем палітычнай надбудовы, якая не зацікаўленая ў эфэктыўным рынку. І праблема можа быць вырашаная ня зьменаю лідэра, а пераглядам саміх прынцыпаў арганізацыі ўлады, адмовай ад прынцыпу пэрсаніфікацыі ўлады і безадказнасьці бюракратыі. Таксама неабходна стварыць мэханізмы кантролю грамадзтва над дзяржавай. Пуцін, вядома, папулярны прэзыдэнт, у шмат чым расейцам зь ім пашанцавала, але, як казаў Паскаль, “як можа адна частка ведаць усё пра цэлае?”.

Для мадэрнізацыі свайго грамадзтва Расеі давядзецца прайсьці яшчэ шмат этапаў. Неабходна рэалізаваць прынцып падзелу ўлады — нездарма яшчэ ў 1789 годзе Французская дэклярацыя правоў чалавека і грамадзяніна абвесьціла: “Любое грамадзтва, у якім падзел уладаў не захаваны, ня мае канстытуцыі ўвогуле”, дасягнуць больш эфэктыўнага ўзаемадзеяньня фэдэральнага цэнтру з рэгіёнамі, дабіцца лепшай імплемэнтацыі судовай і юрыдычнай рэформы, фармаваньня

дзейснай сыстэмы самакіраваньня, вываду эканомікі з “шэрай” зоны, разьвіцьця высокіх тэхналёгіяў (на нафце далёка не заедзеш) і чалавечага капіталу. Расея патрабуе мадэрнізацыі, і я ня ведаю, колькі яшчэ расейскіх субмарынаў павінна патануць, каб усе зразумелі, што мадэрнізацыя патрэбная “тут і цяпер”.

**“Стабільныя” выбары?**

Сыстэма на выхадзе выдае супрацьлеглыя і супярэчлівыя вынікі, палавіністыя рэформы, “недаімплемэнтаваныя законы”, незавершаную мадэрнізацыю. Глеб Паўлоўскі ня верыць у прыгаданы Рабавым інэрцыйны сцэнар: “Лічылася, што калі Пуцін на найбліжэйшых выбарах безальтэрнатыўны, то і ўся сыстэма таксама безальтэрнатыўная, усе выбары завязаныя на прэзыдэнцкія… Усе, трохі пахваляваўшыся, застануцца на сваіх месцах… Сёньня я сьцьвярджаю — інэрцыйны сцэнар памёр, пазначаны й дзень пахаваньня — 14 студзеня 2003 году”.

Для правядзеньня доўгатэрміновай радыкальнай палітыкі рэформаў недастаткова мець заканадаўчую базу і пэўны плюралізм ува ўзаемадзеяньні паміж уладай, грамадствам і бізнэсам. Патрэбная вялікая колькасьць новых палітыкаў і дзяржаўных бюракратаў, здольных думаць і дзейнічаць па-новаму. За мінулае дзесяцігодзьдзе склад кіраўнічай эліты зьмяніўся нязначна. Як піша Андрэй Рабаў, “эліта фактычна ператварылася ў замкнёную карпарацыю, аўтаномную ад грамадзтва і яму непадкантрольную. Так і не былі створаны і інстытуцыялізаваны каналы яе абнаўленьня”.

Пры слабасьці партыйнай сыстэмы, якая ўва ўмовах дэмакратычнага грамадзтва павінна граць асноўную ролю ў рэкрутызацыі эліты, вядучыя пазыцыі ў сучаснай Расеі “ўсур’ёз і надоўга” перайшлі да групавых і кланавых інтарэсаў. Палітычныя эліты больш зацікаўленыя ў прамоцыі менавіта сваіх кланавых інтарэсаў, чымся шырокіх грамадзкіх ініцыятываў. Тым ня менш палітычная сыстэма закасьцянела не да канца і захавала здольнасьць да пэўнай гнуткасьці. Як пісаў Рыгор Яўлінскі, “пры ўсёй сваёй эклектычнасьці і вонкавай нелягічнасьці гэта сыстэма мае ўнутраную ўстойлівасьць, яна здольная ня толькі да самааднаўленьня, але і да пэўнага разьвіцьця”.

Існуе, відавочна, пэўная прыступка, па-за якой сыстэма, каб

рэфармавацца далей, павінна будзе зьмяніць саму сябе, г. зн. унутраныя мэханізмы прыняцьця рашэньняў, і ахвяраваць стабільнасьцю — чытай, прадказальнасьцю палітычных працэсаў. Такая рэформа сыстэмы будзе закранаць інтарэсы магутных групаў уплыву — чаго ніводная пуцінская рэформа дагэтуль яшчэ сур'ёзна не закранала — і зробіць будучыню адкрытай для прагнозаў. Лілія Шаўцова лічыць, што для пасьпяховай трансфармацыі сыстэмы патрэбныя тры фактары: гатоўнасьць да рэформы часткі кіраўнічай клясы, грамадзкі рух за рэформы, моцная падтрымка новай расейскай трансфармацыі з боку Захаду. І ніводнага з гэтых фактараў цяпер няма.
Дарма што прычынаў для аптымізму не існуе, усё ж у Пуціна і прарэфарматарскай групоўкі ёсьць пэўныя шанцы, хоць і невялікія. З аднаго боку, за гэты час палітычны істэблішмэнт, народжаны падчас рэформаў, ператварыўся ў замкнёную карпарацыю, зацікаўленую ў захаваньні *status quo*. Барацьба паміж палітычнымі групоўкамі зводзіцца за ўплыў на Пуціна, а не за розныя праекты разьвіцьця краіны. Гэта хутчэй барацьба за перадзел рэсурсаў, і сярод існых элітаў няма вялікага інтэрасу радыкальна зьмяніць палітычную і эканамічную сыстэмы. Але запыты на мадэрнізацыю растуць, як аб'ектыўна-эканамічныя, так і на ўзроўні грамадзкай думкі. Паводле апытаньняў Інстытуту комплексных сацыяльных дасьледаваньняў РАН, у грамадзтве паступова расьце прага да зьменаў у палітычнай і бюракратычнай эліце. Яна ўжо абрыдла насельніцтву, бо ня здольная спраўджаваць словы справамі. Нават пры характэрным для расейцаў традыцыйным патэрналізьме такая дынаміка кажа пра многае. Камбінацыя стабільнага празаходняга курсу Пуціна зь перамогай на парлямэнцкіх, а пасьля і прэзыдэнцкіх выбарах можа рэвіталізаваць рэжым, прывесьці новых людзей ува ўладу, стварыць пуцінскую партыю і падштурхнуць рэформы і мадэрнізацыю краіны.

Калі Пуцін разважае пра падваеньне ВНП і мадэрнізацыю краіны сур'ёзна і калі ён не зьбіраецца павесьці краіну па кітайскім шляху мадэрнізацыі (што, мабыць, ужо запозна), яго найважнейшай задачай разам з адміністрацыйнай рэформай будзе фармаваньне моцнай партыйнай сыстэмы. Сучасную

партыйную сыстэму найлепш ахарактарызаваў Глеб Паўлоўскі:

“Сёньняшняя сыстэма партыяў — гэта ўвогуле не пра ўладу, не пра выбраньне кіраўнікоў. Палітыка стала спортам накшталт бясьпечнага сэксу, дзе ня столькі трахаюцца, колькі падлічваюць свае траханьні. Улада асобна — партыі асобна. Яны ў нас — стварэнцы этэру і канкуруюць не паміж сабой, а з шоўмэнамі кшталту “апошніх герояў”. Расейскі палітычны этэр падобны да тэлесэрыялу: ёсьць радок у праграме, ёсьць рэйтынг тэлегледачоў, доля аўдыторыі, рэклямны бюджэт. Партыі лічаць, што адсоткі іх рэйтынгу і ёсьць замерам іх электарату. Насамрэч гэта проста іх доля ў палітычным этэры — доля ад долі іх каналу. А доля лічыцца, як вядома, ад наяўнага складу іх удзельнікаў. Старыя шоўмэны дзеляць паміж сабой этэр і аўдыторыю, новых не пускаюць”. Цяперашняя прадстаўнічая ўлада не зьяўляецца прадстаўнічай — яна нікога не прадстаўляе. Існыя партыі зьявіліся раней за цяперашнія клясы і сёньня самі ня ведаюць, чые інтарэсы яны павінны абараняць. У той жа час, пры нармальнай дэмакратыі кожная кляса ці “фракцыя” насельніцтва можа мець сваю асабістую палітычную партыю, якая б абараняла іх інтарэсы. Прадстаўнічая ўлада не аказвае аніякага ўплыву на фармаваньне рэальнай выканаўчай улады. У цяперашняй Расеі існуе маса непрадстаўленых інтарэсаў, асабліва сярод новага дробнага і сярэдняга бізнэсу. 40 % насельніцтва кажа, што ў краіне адсутнічае партыя, якая прадстаўляе іх інтарэсы. Гэта вялізны вакуум. Але інтарэсы павінны знасьці каналы для свайго выражэньня, хай сабе неафіцыйныя, калі не існуе афіцыйных. Ізноў зацытуем Паўлоўскага:

“Усе інтарэсы, якія не пасьмелі выйсьці на публіку, зрылі кратовымі норамі дзяржаўны апарат, дзе цяпер і вядуцца “палітычныя баі”. Гэта можа прывесьці да ўзьнікненьня фракцыі ўва ўладзе, а ў пэрспэктыве — апаратных “фракцый улады”... На парадку дня гэтах выбараў упершыню стаіць пытаньне пра партыю, якая здолее забясьпечыць кіраваньне і насамрэч кіраваць. І тая партыя, якая першая найбольш ясна і пераканаўча пакажа інтарэсам (не тэлевізійнай аўдыторыі, а інтарэсам), што яна зь імі працуе, будзе іх прадстаўляць і несьці адказнасьць, яна атрымае шанец стаць кіраўнічай

партыяй, адна ці ў складзе кааліцыі”.
Як і з чым (і з кім) пойдзе Пуцін на выбары, будзе вызначаць разьвіцьцё Расеі як мінімум на найбліжэйшыя чатыры гады. Але найхутчэй выбары 2003—2004 не прывядуць да сур’ёзных зьменаў у шэрагах палітычных гульцоў і самой палітычнай сыстэме ў цэлым. У палітычнай рыторыцы ідзе адкат ад ідэі стабільнасьці ды пераарыентацыя на мадэрнізацыю і падвойны ВНП. Сапраўды, ізноў ісьці на выбары пад лёзунгамі стабільнасьці значыла б прызнаць, што дасягнуць яе не ўдалося і наступны прэзыдэнцкі тэрмін будзе такі ж стабільны, як і папярэдні. Таму парадак дня мяняецца і найважнейшая задача стварэньня эфэктыўнай партыйнай сыстэмы адкладаецца на лепшыя дні.
Але на якія? Хіба не зручней перафарматаваць усю палітычную сыстэму і ўвесьці новыя правілы гульні акурат напярэдадні выбараў? Аднак ня трэба лічыць Пуціна ўсёмагутным — ён знаходзіцца паміж бюракратыяй і алігархіяй, паміж рэгіёнамі і Масквой. Выбары патрабуюць грошай, і Пуцін будзе вымушаны мабілізаваць пад іх пэўныя кланы, а пасьля разьлічвацца зь імі. Вядома, дзякуючы сваёй завоблачнай папулярнасьці Пуцін можа пачаць неабходныя рэформы. Але стаўка робіцца на “праверанага коніка” — “Адзіную Расею”. Ці не памылкова? Выбары павінны быць “стабільнымі”. Адзіны цэнтар, які вызначае магчымыя сцэнары выбарчай кампаніі, — гэта Крэмль, які валодае палітычнай ініцыятывай і мэдыйнымі рэсурсамі. У рамках мадэлі “кіраванага плюралізму” Крэмль дазваляе свабоду слова ў друкаваных мэдыях (акрамя некалькіх таблёідаў Гусінскага) і радыё, ня ўмешваецца ў дыскусію інтэлектуальных элітаў. Няма праблемаў з інтэрнэт-журналістыкай. Але калі размова заходзіць пра тэлебачаньне нацыянальнага маштабу — калі ласка, пабачце поўны і татальны кантроль ляяльнасьці. Крэмль кантралюе частоты тэлебачаньня, і ўсе партыі, якія зьбіраюцца ўдзельнічаць у будучай кампаніі, мусяць ісьці ў Крэмль дамаўляцца.
Крэмль пакуль ня вызначыўся, ці падтрымліваць некалькі выбарчых праектаў адначасова або зрабіць стаўку на аднаго гульца — “Адзіную Расею”. Здаецца, стаўка зроблена на “Адзіную Расею” і некалькі “замаскаваных” малодшых партнэраў. Моц левай апазыцыі — КПРФ — у значнай меры падарваная, і яна больш не пагражае агульнай стабільнасьці

сыстэмы. Так званыя сацыял-патэрналісцкія спадзяваньні былога электарату камуністаў накіраваныя на “Адзіную Расею”.

Асноўны лёзунг, якім партыя спрабуе падкупіць выбарцаў, — “Разам з прэзыдэнтам!”. Прыблізна так дзейнічаюць і іншыя партыі — выходзіць камічная сытуацыя, калі партыі змагаюцца за галасы не з дапамогай розных эканамічных і палітычных праграмаў, а даводзячы, якая зь іх найбліжэйшая да прэзыдэнта. А што акрамя гэтага? У маніфэсьце “Адзінай Расеі” “Шлях нацыянальнага посьпеху” можна знайсьці шмат дзіўных формул: “Веліч краіны пачынаецца зь вялікіх мэтаў”, “Дзяржава створаная не для вырашэньня тэхнічных пытаньняў, а для служэньня супольнаму дабру”, “Нацыянальны посьпех павінен спалучацца з барацьбой з адставаньнем”. Ідэолягі “Адзінай Расеі” разважаюць пра неабходнасьць стварэньня праўнага падмурку для мадэрнізацыі і адначасова клянуцца, што будуць усяляк дапамагаць мільёнам грамадзянаў у вырашэньні іх паўсядзённых праблемаў. “Партыя энэргічнага сацыяльнага кансэрватызму” адмаўляецца адказваць на канкрэтныя пытаньні і наўзамен напускае туману (чаго толькі варты слоган “энэргія згоды”) замест асэнсаванай праграмы эканамічнай палітыкі. І, дзеля гэтага, з партыі ператвараецца ў нейкі клюб аматараў. Яна робіць стаўку на мімікрыю пад “рознагалосую бальшыню” і, магчыма, “разам з Пуціным” атрымае ў парлямэнце чаканую ад яе большасьць.

Але, бадай, не такая партыя большасьці патрэбная Расеі для мадэрнізацыі. “Адзіная Расея” не апраўдала даверу: у яе няма пераможнай праграмы, яна не карыстаецца асаблівай папулярнасьцю сярод электарату. Усё гэта можна падправіць падцягваньнем адміністрацыйнага рэсурсу і тэлебачаньнем, пагатоў скандал зь “Юкасам” паказвае, што Крэмль гатовы да жорсткіх захадаў.

Што ж адбываецца? Алігархі жывуць няблага, але яны не задаволеныя да канца. Іх правы на ўласнасьць нельга разглядаць як канчатковыя і непарушныя ўва многім дзякуючы таму, як ім гэтыя правы дасталіся. Іх ніхто ня любіць — ані адміністрацыя, ані простыя людзі. Але ў іх ёсьць грошы. Улады ўвесь час могуць іх “мабілізоўваць” на чарговыя “выбірайкі” і іншыя кампаніі. Як піша Андэрс Аслунд, “кажуць, Крэмль сёлета выцягнуў каля 200 млн даляраў на кампанію “Адзінай

Расеі”, па 20 млн з кожнага буйнога алігарха. Гэта ў чатыры разы больш за тое, што Хадаркоўскі, як кажуць, выдзеліў “Яблыку” і СПС, але ня так ужо і шмат, калі “Адзіная Расея” баіцца, што ёй ня хопіць”. Ніхто ня ведае сапраўдных матываў скандалу, акрамя галоўных актораў. Хаця можна згадаць, што Хадаркоўскі, уладальнік найбуйнейшай нафтавай кампаніі Расеі, неяк заявіў, што зьбіраецца ў будучым пакінуць бізнэс і паспрабаваць сябе ў палітыцы. Прэм’ерам? Прэзыдэнтам? Я ня ведаю, якія амбіцыі ў Хадаркоўскага і якія пляны на яго ў Пуціна, але дакладна ведаю, што, калі Пуцін вырашыць, што прыйшоў час спыніцца, кампанія спыніцца.
Як кажуць аналітыкі, у адрозьненьне ад папярэдніх, калі рэй вялі паліттэхнолягі, гэтым разам выбары будуць спаборніцтвам юрыстаў, якія будуць “капаць” пад кандыдатаў. Калі “Адзіная Расея” ўсё ж здолее давесьці Пуціну і выбарцам, што гэта іх партыя, і атрымаць большасьць у Думе, можа быць дадзены сыгнал для запачаткаваньня далейшых рэформаў. СПС мог бы стаць малодшым партнэрам “Адзінай Расеі”, але пакуль партыя ня можа вызначыцца, хто яна і з кім яна. Камуністы найхутчэй пачнуць яшчэ шпарчэй эвалюцыянаваць у бок сацыял-дэмакратыі ўсходнеэўрапейскага ўзору, калі толькі ў будучыні які-небудзь грамадзка-палітычны крызыс не штурхне агульныя настроі ў бок левага нацыянал-сацыялізму.
Вядома адно: калі “Адзіная Расея” не набярэ большасьці — і тут Шаўцова, Рабаў, Паўлоўскі ды шматлікія іншыя экспэрты пагодзяцца паміжсобку, — Пуцін будзе вымушаны кіраваць указамі, што пацягне за сабой выхад з канстытуцыйнага поля і ўзмацненьне аўтарытарных тэндэнцыяў.

**“Акно ў Эўропу”**
Адным з асноўных фактараў выбараў 2003 і 2004 гадоў упершыню зрабілася замежная палітыка. На прэзыдэнцкіх выбарах 1996 і 2000 гадоў міжнародныя тэмы калі й закраналіся, дык толькі вельмі маргінальна, для ілюстрацыі ўнутраных тэмаў. Цяпер жа кожны актор мусіць задэкляраваць свае погляды на асноўныя міжнародныя праблемы. Усьлед за заходнімі аналітыкамі можна нават зрабіць выснову, што пуцінскі рэжым абраў вонкавую палітыку адным з асноўных інструмэнтаў падтрыманьня стабільнасьці і канвэртацыі гэтай стабільнасьці ў нешта больш доўгатэрміновае. Разам з

павышэньнем кіраванасьці дзяржавай і ўнутранымі рэформамі замежная палітыка, стабільны пасьпяховы празаходні кірунак робіцца канстантай у формуле пуцінскай стабільнасьці. Як піша палітоляг Ірына Кобрынская, “вызначаючы асноўную функцыю замежнай палітыкі як стварэньне спрыяльнага вонкавага асяродзьдзя для ўнутранага разьвіцьця, улада таксама імкнецца завяршыць працэс зацягнутай постсавецкай самаідэнтыфікацыі — паводле выбару палітыкі ў адносінах да вонкавага асяродзьдзя”.

У 2000—2001 гадах у расейскай масавай сьвядомасьці пачалася паступовая дэвальвацыя ідэі нэаэўразійства як геапалітычнай дактрыны, што абгрунтоўвае хаўрус славян з туркамі, а праваслаўных — з мусульманамі. У параўнаньні зь сярэдзінай 90-х рэзка спалі наклады кніжак Дугіна. Пасьля пачатку другой чачэнскай вайны і хвалі тэрактаў расейцы хочуць адгарадзіцца ад мусульманскага сьвету. Гэтая тэндэнцыя толькі ўзмацнілася пасьля тэрактаў 11 верасьня 2001 году ў Нью-Ёрку. Так што ня Пуцін прыдумаў празаходні курс. У Расеі празаходні курс існаваў і раней, напрыклад у першай палове 1990-х. Пры гэтым Расею нельга лічыць празаходняй краінай: перад 11 верасьня больш за палову расейцаў лічылі Амэрыку ворагам і толькі менш за трэцюю частку — наадварот. Як сапраўдны стратэг, Пуцін дачакаўся свайго моманту і згуляў ва-банк. Жартам можна сказаць, што, калі большасьць расейцаў танчыла пад “I’m afraid of Americans” Дэвіда Боўі, Пуцін уважліва слухаў Бруса Спрынгстана. Яго геніяльна разыграная адразу пасьля тэрактаў 11 верасьня 2001 году партыя — далучэньне да антытэрарыстычнай кааліцыі, чарада самітаў Расея—ЗША, Расея—НАТА, Расея—ЭЗ — прывяла да таго, што ня толькі заходняя, але і расейская эліта і грамадзтва паверылі ў сур’ёзнасьць намераў Пуціна інтэграваць краіну ў заходнюю цывілізацыю. Праўда, чуліся галасы, што далучэньне да антытэрарыстычнага альянсу ня толькі не наблізіла Расею да заходняй цывілізацыі, але, наадварот, дало Пуціну *carte blanche* расправіцца з мэдыямі і камфортна весьці чачэнскую вайну. У гэтым ёсьць рацыя, але ў дыялёгу Расеі з Захадам было ўсё ж больш пазытыўнага, чым нэгатыўнага, бо найбольш надзейнаю гарантыяй дэмакратычнага разьвіцьця краіны застаецца інтэграцыя з заходнімі дэмакратыямі. Пуцін, на шчасьце, не адзін. Як лічыць вядучы экспэрт

замежнай палітыкі Дзьмітры Трэнін,

“прызнаньне расейскай эканомікі рынкавай з боку ЗША і аналягічнае рашэньне з боку ЭЗ ня толькі набліжае ўступ Расеі ў Сусьветную гандлёвую арганізацыю, але і падымае статус яе эканамічных гульцоў. А менавіта, нафтавыя і газавыя кампаніі, якія імкнуцца быць прынятымі ў сусьветную бізнэс-эліту, кроўна зацікаўленыя ў практычным разьвіцьці анансаванага энэргетычнага партнэрства з ЗША і ЭЗ. Пуціна таксама падтрымлівае “эканамічная” частка ўраду і зьвязаная зь бізнэсам частка бюракратыі”.

Альтэрнатывы больш няма — і гэта, напэўна, найбольш значны “голас” у выбарах Пуціна. З Прымакова альтэрнатывы ня выйшла. Шматпалярнасьць паводле Прымакова не давяла сваёй практычнасьці. Шматпалярнасьць паводле Пуціна — складаная гульня на некалькіх сталах напярэдадні вайны супраць Іраку — выявіла сваю эфэктыўнасьць. Пуцін, згодна з апошнімі вынікамі міжнароднага дасьледаваньня вартасьцяў і сьветапогляду розных краінаў сьвету “World Values Study”, па вайне стаў адным з самых папулярных палітыкаў у сьвеце. Ён застаўся прагматычным малодшым партнэрам Амэрыкі і ня страціў даверу сярод антываеннай кааліцыі. Нядрэнны вынік для такой складанай партыі прадэманстраваў яшчэ і тое, што Расеі трэба рабіць стаўку на Амэрыку. У ЭЗ яе ніхто сур’ёзна не чакае, а кампанія па скасаваньні візаў у ЭЗ выявілася нечым накшталт анэкдоту сярэдняй ступені сьмешнасьці.
Паварот да Захаду мае хутчэй стратэгічны, чым тактычны характар — і нават “курыныя” войны ня ў сілах тут нічога зьмяніць.
Расея можа забясьпечыць свае інтарэсы і бясьпеку перад абліччам пагрозаў з Поўдню і Далёкага Ўсходу толькі ў альянсе з Захадам. Кіраўнік праграмаў Фонду Карнэгі па Расеі і Эўразіі Эндру Качынс лічыць (і я зь ім поўнасьцю пагаджаюся), што стварэньне расейска-кітайскага альянсу немагчымае. Нягледзячы на супадзеньне некаторых пазыцыяў па бясьпецы ў Сярэдняй Азіі і пэўны неспакой з прычыны ўзмацненьня ваеннай супэрмашыны Амэрыкі, абодва бакі завязаныя на супрацоўніцтва з Захадам. Да таго ж дэмаграфічныя тэндэнцыі і разьвіцьцё падзеяў на ўласным Далёкім Усходзе будуць

прымушаць Расею ўхіляцца ад занадта шчыльнага партнэрства з Кітаем. Расея яшчэ можа пагадзіцца быць малодшым партнэрам Захаду, але быць малодшым партнэрам Кітаю — гэта для яе ўжо занадта. А з Кітаем яна можа быць толькі малодшым партнэрам. І невыпадкова зусім нядаўна, пры канцы жніўня, расейскі флёт разам з індыйскім у Індыйскім акіяне пускаў ракеты па вадзе ў бок Кітаю.

Расея будзе працягваць рэформы толькі пры празаходнім курсе. Самы ўплывовы тамтэйшы “think tank” — Рада замежнай і абароннай палітыкі —перасьцерагае супраць празьмерна амбіцыйнай замежнай палітыкі, калі ўнутраныя рэсурсы не адпавядаюць вонкавым амбіцыям. Для новага прэзыдэнцтва Пуціна прапануецца формула: “спачатку самаўзмацненьне, пасьля міжнароднае ўзмацненьне”. Але цяперашняя замежная палітыка Расеі не супярэчыць магчымым пэрспэктывам мадэрнізацыі. Наадварот, існуе рэальная небясьпека, што рэжым ня здолее выкарыстаць усіх паўсталых магчымасьцяў. Новы зьмест адносінаў з ЗША паводле Трэніна — спыненьне суперніцтва, прызнаньне асымэтрыі (5 % ВНП ад узроўню ЗША) і навязваньне партнэрства — вымагае перагляду ня толькі дагэтулешняй замежнай эканамічнай палітыкі і дыпляматыі, але і ваеннай дактрыны. Расейскім генэралам варта выключыць ЗША зь ліку магчымых ворагаў хаця б для таго, каб у галівудзкіх блякбастэрах паменела расейскіх мафіёзі і звар’яцелых афіцэраў.

Празаходні курс Расеі будзе хісткім і непасьлядоўным без радыкальнай рэформы арміі і дыпкорпусу. За апошнія 10 год з МЗС разьляцеліся найлепшыя супрацоўнікі, якія перайшлі ў бізнэс. Расейскае МЗС ператварылася ў корпус нэасавецкага кансэрватызму. Таленавітыя краіназнаўцы з МЗС і МДІМА разьехаліся па краінах сваёй экспэртызы і рэалізуюць сваё веданьне гэтых краінаў на практыцы. На пачатковым этапе МЗС магло б набраць людзей зь бізнэсу — практычных і адукаваных, якія ведаюць, як лабіяваць інтарэсы. Існуюць прыкметы, што гэта ўжо паціху адбываецца. З арміяй праблема яшчэ складанейшая. За гэтыя гады яна ператварылася ў закасьцянелую структуру, дзе людзі думаюць, гавораць і нават апранаюцца, як пры Савецкім Саюзе. Нават дынамізм Сяргея Іванова, “накіраванага” Пуціным у Мінабароны, наўрад ці зьменіць у ім абстаноўку.

Прадуманая заходняя палітыка дае і будзе даваць Пуціну пэўны carte blanche у ягонай палітыцы ў дачыненьні да “блізкага замежжа”. Захад нічога ня мае супраць, каб Расея праводзіла больш актыўную замежную палітыку ў дачыненьні да постсавецкіх дзяржаваў. Статус былых савецкіх рэспублік робіцца трохі падобным на статус былых хаўрусьнікаў СССР ува Ўсходняй Эўропе — фармальна незалежных, але якія каардынуюць асноўныя аспэкты сваёй замежнай і ўнутранай палітыкі з Крамлём. Некаторыя больш залежныя, некаторыя менш. І невядома, ці здолее Ўкраіна застацца сучаснай “Югаславіяй” з такім “Ціта”.

**“Пастка Гарбачова”: замест эпілёгу**

Пуцін нешта зьмяніў у Расеі. Застаецца пытаньне, як многа ён зьмяніў і як надоўга. За гады яго кіраваньня можна пабачыць некалькі цыклаў стабілізацыя—рэформа—стабілізацыя—рэформа… Набліжаюцца выбары — а значыць, рэформы будуць адкладзеныя да абвяшчэньня іх вынікаў. Існуюць перадумовы для далейшых рэформаў пасьля прэзыдэнцкіх выбараў 2004 году. Эпоха стабільнасьці падыходзіць да канца, у паветры ці то вее “вецер пераменаў”, ці то лунае чарговы піяр крамлёўскіх паліттэхнолягаў. У насельніцтва растуць спадзяваньні на паляпшэньне жыцьця і, як піша Аўтандыл Цуладзэ ў газэце “Сегодня”, калі рост спадзяваньняў і рост папулярнасьці Пуціна дасягне крытычнай масы, яго рэйтынгі раптоўна пайдуць уніз. Палітычны маркетынг мае свае абмежаваньні, палітычны імідж можа рэзка абясцэніцца, таму Пуціну трэба нарэшце зрабіць свае абяцаньні *come true*. Матрошкі Пуціна і дываны зь яго постацьцю ўжо цяпер прадаюцца значна горш, чым раней. Пасьля выбараў перад Пуціным паўстане выбар — ці надалей трымацца за свой рэйтынг, не зважаючы на рост нэгатыўных зьяваў у эканоміцы, знос інфраструктуры і пачашчэньне тэхнагенных катастрофаў, ці абаперціся, як піша Лілія Шаўцова, на сацыяльна актыўную меншасьць, правесьці шэраг глыбокіх, балючых рэформаў — пачынаючы ад рэформы дзяржаўнага апарату і да рэформы жыльлёва-камунальнай гаспадаркі, — якія прымусяць Расею зьмяніцца.

У Расеі дагэтуль палепшылася кіраванасьць не дзяржавы, а прэзыдэнцкага рэжыму. Дзяржаву яшчэ трэба рэфармаваць. Трэба рашуча зрабіць выбар паміж выглядам і формай,

імітацыяй і сапраўднымі зьменамі. Рэформы былі прыпыненыя на паўшляху. Існуе імітацыя парадку, імітацыя дэмакратыі, стабільнасьці і прыватнай уласнасьці. Як лічыць аналітык усходнеэўрапейскай палітыкі Стывэн Холмс, пры разглядзе расейскай палітыкі трэба разумець, што ўсе яе дзеяньні — гэта сымуляцыя. “Здавацца для Расеі нашмат больш істотна, чым быць”.

Пуцін падышоў у сваім разьвіцьці да рысы, за якой пачынаецца трансфармацыйны тып лідэрства. Глыбейшыя рэформы ў эканоміцы, далучэньне Расеі да заходніх палітычных інстытутаў, НАТА, СГА, гольф-клюбаў ствараюць перадумовы, каб зламаць хрыбет расейскай мадэлі разьвіцьця, пабудаванай, з аднаго боку, на адзінаўладзьдзі, а з другога — на безадказнасьці ўлады і бюракратыі. Пераход ад апоры на старую бюракратыю, сілавыя структуры і алігархаў на новыя, яшчэ ня створаныя падмуркі, прывядзе да дэстабілізацыі і непазьбежнага падзеньня папулярнасьці прэзыдэнта. Карацей, Пуціна можа чакаць лёс Гарбачова — дый любога рэфарматара: ініцыяваць рэформы, якія ўвойдуць у гісторыю, і ў пераходны пэрыяд страціць папулярнасьць і ўладу. Як правіла, рэфарматары робяцца ахвярамі сваіх жа рэформаў, а на іх месца прыходзяць іншыя асобы.

Згодна з Вэбэрам, для рэформаў патрэбны харызматычны тып лідэра, для захаваньня *status quo* — рацыянальна-выканаўчы тып. Здаецца, Пуцін спалучае гэтыя два тыпы: у Пуціна трохі ёсьць харызмы (стваральнікам фільму пра Гары Потэра чымсьці прыглянуўся вобраз другога прэзыдэнта Расеі, які быў выведзены ў фільме сымпатычным і трохі харызматычным дамавіком). Каб падвоіць ВНП і, самае галоўнае, зьмяніць стаўленьне ў грамадзтве да самога сябе, можа, такі рызыкнуць страціць папулярнасьць?

Сам Пуцін пакуль падае супярэчныя сыгналы. Вялікай падтрымкі ані з Захаду, ані ад грамадзтва для правядзеньня рэформаў пакуль няма. Пуцін на гэтых выбарах не пайшоў на стварэньне сапраўднай рэфарматарскай партыі, якая б пастаўляла “маладых туркаў” для правядзеньня мадэрнізацыі. Як ён здолее правесьці рэформы з аўтарытарнымі бюракратамі, моцнымі эканамічнымі кланамі і мясцовымі дэцэнтралізатарамі — тымі, хто цяпер лабіюе свае інтарэсы праз Крэмль, — невядома. Ці могуць аб’яднацца гэтыя групоўкі

перад адзінай пагрозай — мадэрнізацыяй паводле Пуціна, якая адштурхне ўсіх гэтых, карыстаючыся моваю паліталёгіі, “шукальнікаў рэнты” (rent seekers) ад карыта і створыць роўныя для ўсіх актораў правілы гульні? Другое пытаньне, які яшчэ рэсурс застаўся ў сыстэмы і колькі яна можа існаваць без кардынальнай рэформы?

А цяпер прывядзём некалькі магчымых сцэнароў разьвіцьця сытуацыі. Калі вы ўважліва чыталі гэты артыкул, вы, напэўна, убачылі мой асьцярожны аптымізм. Найхутчэй Пуцін працягне асьцярожныя рэформы, паспрабуе мадэрнізаваць эканоміку і нават падвоіць ВНП за кошт адміністрацыйнага рэсурсу. Таксама магчымы рух да “асьвечанага” аўтарытарызму з “добрым, манархічным” тварам. Змычка паміж “кіраваным плюралізмам”, бюракратыяй і алігархамі застанецца. На карысьць гэтага гаворыць палітычная дынаміка напярэдадні парлямэнцкіх выбараў. Будучыня напярэдадні прэзыдэнцкіх выбараў яшчэ адкрытая, і таму існуе рэальная, хаця і менш імаверная пазытыўная магчымасьць сыстэмнай трансфармацыі, мадэрнізацыі ня толькі эканомікі, але і дзяржавы з грамадзтвам.
Прывяду яшчэ некалькі сцэнароў. Дырэктар Цэнтру стратэгічнага аналізу і прагнозаў Дзьмітры Альшанскі лічыць, што Пуцін застанецца малодшым партнэрам адзінай у сьвеце супэрдзяржавы, а расейскія эліты рана ці позна зразумеюць, што ўнутраныя рэсурсы не адпавядаюць імпэрскім амбіцыям, пакрочаць за Пуціным і разам будуць ствараць стабільную рэгіянальную сілу згодна з наяўнымі рэсурсамі. Зьбігнеў Бжазінскі “стабільна” дае прагнозы ў стылі “Картаген павінен быць зьнішчаны”. Ён лічыць, што Расея дасягне поўнай стабільнасьці толькі тады, калі зьменшыцца і пазбудзецца ядравай зброі. Андрэй Рабаў уважае, што дагэтуль Пуціну ўдавалася ўтрымліваць палітычную стабільнасьць праз лавіяваньне паміж старымі ельцынскімі кланамі і новымі, якія прыйшлі да ўлады разам зь ім. Таму найхутчэй Пуцін прадоўжыць лавіяваць паміж імі і ў будучым, рэфарматарскае заканадаўства будзе арыентаванае на рэалізацыю інтарэсаў вярхоў, сыстэма будзе заставацца закрытаю для грамадзтва. Усё гэта будзе ствараць рызыку, што дасягненьні стабілізацыйнае эпохі могуць быць страчаныя, а рэалізаваная

мадэрнізацыя не прынясе жаданых вынікаў. Шаўцова мяркуе, што расейская палітычная сыстэма ня можа эвалюцыянаваць у бок заходніх стандартаў, бо ўсе сілы, якія фармуюць падмурак пуцінскага рэжыму, атрымліваюць максымальныя выгады менавіта ад сённяшніх прынцыпаў функцыяваньня машыны ўлады і не зацікаўленыя ў радыкальных зьменах… Паварот у бок аўтарытарызму таксама магчымы, хаця на гэты момант для гэтага не існуе значных эканамічных інтарэсаў. Глеб Паўлоўскі не выключае магчымасьці, што Пуцін можа ўзначаліць парлямэнцкую партыю большасьці перад сыходам з пасады прэзыдэнта ў 2008-м і, перачакаўшы эпоху рэгенцтва на пасадзе старшыні партыі, вярнуцца да прэзыдэнцтва ў 2012-м. Нарэшце, Андэрс Аслунд — аптыміст. Ён лічыць, што зьмены нават не магчымыя, а непазьбежныя. Расея перажывае стабільны 6-працэнтны эканамічны рост на працягу 4 год, і Пуцін ня будзе баяцца праводзіць эканамічныя рэформы. Сама ж засяроджанасьць Пуціна на эканамічных пытаньнях — добры знак таго, што Расея стаіць на правільным шляху. Як жа Аслунду ня быць аптымістам, калі паводле яго рэцэптаў рабіліся рэформы 90-х?

Расея расьце, набіраецца ўпэўненасьці і паляпшае свой міжнародны статус, у шмат чым папсаваны на працягу 1990-х. Расейскія эліты пачынаюць сябе адчуваць больш упэўнена за мяжой — як на Давоскім форуме, так і сярод заходніх мільянэраў падчас шопінгу на лёнданскай Savile Row. Як бы ў пацьверджаньне гэтых словаў зусім нядаўна алігарх Абрамовіч набыў футбольны клюб “Чэлсі” і разам зь ім некалькі вядучых гульцоў сьвету, каб тыя гулялі ў яго клюбе. Ці не было б лепш, каб ён гэтыя ж грошы — а лік ідзе больш чым на сотню мільёнаў даляраў — уклаў, скажам, у маскоўскае “Дынама”? Расейскія бізнэс-колы гавораць пра вялікую будучыню Расеі, а самі ўкладаюць капіталы за мяжой. Калі нават самыя заможныя людзі краіны яшчэ не паверылі ў канчатковасьць і незваротнасьць зьменаў, што казаць пр астатніх. Як піша модны пісьменьнік Віктар Ерафееў,

“цяпер у Расеі асноўная барацьба ідзе не паміж левымі і правымі, дэмакратамі і камуністамі, маладымі і старымі, заходнікамі і славянафіламі, а паміж прадуктыўнымі і

контрпрадуктыўнымі элемэнтамі грамадзтва. Найпрасьцейшыя дадатныя заданьні — жыць лепей, зарабляць больш грошай, ствараць здаровую сям'ю — у Расеі дагэтуль для значнай часткі насельніцтва здаюцца незразумелымі".
Цыкл выбараў 2003—2004 гадоў дае Расеі гістарычны шанец канчаткова і незваротна выбраць паміж "здавацца" і "быць" на карысьць "быць". Пуцін здолеў стабілізаваць краіну. Мадэрнізаваць і паверыць у сябе можа толькі сама краіна. На адным канадзкім інтэрнэт-форуме былых савецкіх грамадзян, на якім, дарэчы, добра знаёміцца зь цікавымі дзяўчатамі, нейкі Пятровіч, седзячы не ў такой вялікай, але стабільнай, прадказальнай і заможнай Канадзе, увесь час заканчвае свае мэсыджы мантрай "Усё роўна Расея адродзіцца і стане вялікаю краінай". Калі такія пятровічы самі вернуцца назад будаваць сваю вялікую краіну, можна будзе казаць, што краіна нарэшце паверыла ў сябе.

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/12/14**
[image]

# Андрэй Катлярчук Яшчэ раз пра месца беларусаў у гісторыі

**АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК (нар. у 1968) — гісторык, дасьледчык Школы балтыйскіх і ўсходнеэўрапейскіх дасьледаваньняў (BEEGS) ўнівэрсытэту Паўднёвага Ілінойсу. Апублікаваў сэлета на старонках "ARCHE" рэцэнзію на кнігу выкладчыка Гельскага ўнівэрсытэту (ЗША) Цімаці Снайдэра "The Reconstruction of Nations. Poland, Ukraine, Lithuania, Belarus 1569—

*Stone, Daniel. The Polish-Lithuanian state, 1386—1795. Seattle: University of Washington Press, 2001. 374 p.*

У 2001 годзе чацьвертым томам амэрыканскай сэрыі "Гісторыя Ўсходняй і Цэнтральнай Эўропы" (History of East Central Europe) была выдадзеная праца Даніэля Стоўна "Гісторыя Польска-Літоўскай дзяржавы, 1386—1795 гады", якая працягвае 300-гадовую англамоўную традыцыю гістарыяграфіі Рэчы Паспалітай (далей РП. — **Аўт.**).

Пачнем з гістарыяграфічнае даведкі. Першыя нарысы гісторыі нашай былой дзяржавы зьяўляюцца па-ангельску пры канцы XVII стагодзьдзя[1]. Па яе падзелах колькасьць працаў, натуральна, зьмяншаецца. У XIX стагодзьдзі выйшлі дзьве англамоўныя гісторыі РП. У 1837 годзе ў Лёндане палітычны эмігрант Напалеон Жаба выдаў кароткі нарыс гісторыі РП[2]. У 1859 грунтоўную гісторыю РП атрымаў амэрыканскі чытач[3]. Першыя восемдзесят гадоў XX стагодзьдзя прынесьлі тры выдадзеныя на Захадзе працы па гісторыі РП: кнігі Оскара Халецкага, Нормана Дэвіса ды калектыўную манаграфію кембрыдзкай сэрыі[4]. Колькі твораў па-ангельску выдалі гісторыкі камуністычнай Польшчы[5].

Зацікаўленасьць малавядомымі краінамі за жалезнай заслонай імкліва ўзрасла на Захадзе пасьля краху камуністычнага блёку. Асаблівае месца займала і займае Польшча — першая ў колькасьці насельніцтва і палітычнай значнасьці краіна Цэнтральна-Ўсходняй Эўропы. З 1990-х гадоў пачаўся сапраўдны бум англамоўных выданьняў, прысьвечаных Польшчы. Сярод іх неапошняе месца заняла гісторыя Рэчы Паспалітай — найбуйнейшай калісьці эўрапейскай дзяржавы, на гістарычным абшары якой знаходзяцца сучасныя Польшча, Беларусь, Літва, Украіна, а таксама некаторыя раёны Латвіі, Эстоніі, Малдовы й Расеі[6].

Праца Даніэля Стоўна заслугоўвае асаблівай увагі, што гэта першы ў заходняй гістарыяграфіі погляд на гісторыю ня толькі як на шматкультурную дзяржаву, але яе не гаспадарства, стваральнікамі якога былі розныя сацыяльным паходжаньнем палітычныя эліты. Аўтар кнігі — ад канадзкі гісторык, прафэсар гісторыі ўнівэрсытэту Ларыду Вініпэг, які спэцыялізуецца на дасьледаваньні гісторыі Рэчы Паспалітай[7]. Яго новая манаграфія — грунтоўны падручнік для заходніх студэнтаў і дактарантаў — пабудаваная згодна з храналягічным прынцыпам. Няма сэнсу перакананьня ў кнігі. Прапаную засяродзіцца на адной праблеме, ці менавіта аналізе ролі русінскага (даўнейшага беларуска-ўкраінскага) этнасу ў гісторыі гэтай дзяржавы.

Стоўн не асьвятляе гэтай праблемы так, як гэта рабілі папярэднікі, якія пры канцы разьдзелаў пра культуру ў двух-трох стандартных сказах згадвалі русінаў (Ruthenes). Выхаваны славутай канадзкай школай шматкультуралізму, аўтар паставіўся да ролі продкаў беларусаў і ўкраінцаў у гісторыі ВКЛ і Кароны Польскай надзвычай уважліва, прысьвяціўшы ім ладную частку сваёй працы. “Русінская” тэма зьяўляецца, жо на трэцяй старонцы: “Альгерд перасунуў сталіцу Вялікага Княства Літоўскага з этнічнай Літвы ў Вільню на беларускую мяжу... Вялікія князі літоўскія разглядалі ВКЛ як спадчыну Кіеўскай Русі”. Дадамо, што дынастыя Ягайлавічаў таксама разглядалася русінскай шляхтай як “працяг уладнай гісторыі”. Ягайла быў напалову балтам, напалову русінам. Не рэчы славянка Ўляна адыграла выключную ролю ў яго выхаваньні і ўплывала на прыняцьце ім палітычных рашэньняў. Пра гэта, а таксама пра тое, што беларуская шляхта ўспрымала

1999”


1. **Savage, John.**
**An Ancient and present state of Poland.**
**London, 1697; Conn. Bernard.**
**The history of Poland.**
**London, 1698; Tende, Gaspard.**
**An account of Poland.**
**London, 1698.**
2. **Żaba, Napoleon.**
**Two lectures on the history of Poland, from the earliest period to the present time.**
**London, 1837. 107 p.**
3. **Fletcher, James.**
**The history of Poland. From the earliest period to the present time.**
**New York, 1859. 339 p.**

дынастыю Ягайлавічаў як этнічна роднасную, бо пачатак ёй заклалі Ягайла ды русінская праваслаўная князёўна Алена Альшанская, сьведчаць хронікі ВКЛ.

**4 Halecki, Oskar. A history of Poland. London, 1955. 359 p; Davies, Norman. God's playground: a history of Poland in two volumes. Volume 1. From the origins to 1795. Oxford, 1981. 605 p.; The Cambridge history of Poland. Volume 1. From the origins to Sobieski (1696). Cambridge: Univ. Press, 1950. 607 p.**

**5 Arnold, Stanisław. Outline history of Poland: from the beginning of the state to the present time. Warsaw, 1962. 245 p.; Gieysztor, Aleksander.**

History of Poland. Warsaw, 1979. 668 p.; Topolski, Jerzy. An outline history of Poland. Warsaw, 1986. 315 p.

6 Lukowski, Jerzy. Liberty's folly: the Polish-Lithuanian commonwealth in the eighteenth century, 1697—1795. London, 1991. 316 p.; Sikorski, Radek. The Polish house: an intimate history of Poland. London, 1997. 245 p.; Biskupski, Mieczysław. The history of Poland. Westport: Greenwood, 2000; Davies, Norman. Heart

of Europe: the past in Poland's present. Oxford, New York: Oxford University Press, 2001. 483 p. (папраўленае выданьне); Lukowski, Jerzy. Zawadzki, Hubert. A concise history of Poland. Cambridge: Cambridge University Press, 2001. 317 p.

7 Гл.: Stone, Daniel. Polish politics and national reform, 1775—1788. Boulder: East European quarterly, 1976. 122 p.

Ідэі аўтара наконт характару ВКЛ значна больш шаблённыя: "Ад пачатку ВКЛ складалася зь дзьвюх этнічных супольнасьцяў і дзьвюх палітычных сыстэмаў: Літвы і Русі. Ліцьвіны гаварылі на балцкай мове, мелі ўласныя традыцыі і завядзёнкі. Літоўская шляхта атрымала маёнткі ў эканамічна больш разьвітай Беларусі, дзе яна асымілявалася ды згубіла літоўскую сьвядомасьць". Падобныя працэсы йшлі і ў адваротным

кірунку. Русінская шляхта атрымлівала маёнткі ў этнічнай балцкай частцы дзяржавы і таксама асымілявалася ў неславянскім асяродзьдзі: напрыклад, сям'я князёў Пузынаў, якая атабарылася ўва Ўпіцкім павеце. На думку аўтара, "ВКЛ было адкрытаю дзяржавай, якая адаптавала традыцыі, законы і адміністрацыйную сыстэму Русі, карысталася русінскаю мовай у дзяржаўных дакумэнтах". Думаецца, што гэты папулярны штамп навеяны літоўскай гістарыяграфіяй. Што значыць "адаптавала", калі гаворка ідзе пра дзяржаву дзьвюх палітычных элітаў, якія паступова і не без праблемаў рухаліся да сынтэзу? Высновы Стоўна што да характару ВКЛ застаюцца палавіністымі, бо ён выкарыстоўвае адначасова дзьве супрацьлеглыя канцэпцыі. Паводле першай зь іх, "русіны" ўплывалі на станаўленьне дзяржавы толькі як дэмаграфічная ды культурная сіла. Акурат гэтую канцэпцыю падзяляюць літоўскія і большасьць польскіх гісторыкаў. Што да сучасных беларускіх гісторыкаў (Генадзя Сагановіча, Вячаслава Насевіча, Васіля Вароніна, Алеся Краўцэвіча), дык яны пасьлядоўна глядзяць на ВКЛ як на дзяржаву, палітыку якой ад пачатку вызначалі таксама русіны, якія нароўні з балтамі ўваходзілі ў палітычна-вайсковую эліту краіны. Застаецца пашкадаваць, што большасьць працаў беларускіх гісторыкаў, прысьвечаных гэтай праблеме, зьявілася зусім нядаўна, і да таго ж ніводная зь іх не перакладзеная на ангельскую мову.
Далей Стоўн сьцьвярджае, што "русіны вызнавалі праваслаўе, таму шмат хто зь літоўскіх князёў прыняў гэтую веру", але не тлумачыць, які быў у гэтым сэнс. Між тым, гэта дазваляла здабыць Гедымінавічам у часы стварэньня дзяржавы палітычную падтрымку праваслаўнай русінскай шляхты. Тамсама гаворыцца, што вялікія князі балцкага паходжаньня эфэктыўна кантралявалі "намінальна аўтаномныя княствы, узначаленыя славянскімі князямі". Але які быў мэханізм гэтага кантролю? Што атрымала і што страціла русінскае баярства ў ВКЛ? Аўтар не дае яснага адказу, магчыма, таму, што гэтая тэма дагэтуль нераспрацаваная ў беларускай гістарыяграфіі.

У частцы *"Этнічныя сьвядомасьці ў ВКЛ"* (б. 11—14) Стоўн імкнецца патлумачыць этнічнае мінулае нашага краю. Працытуем колькі фрагмэнтаў, каб потым пракамэнтаваць іх:

“Унія з Польшчай абараніла літоўскую шляхту ВКЛ ад распушчэньня ў колькасна большай і лепш адукаванай русінскай шляхце… Літоўскія князі карысталіся рознымі мовамі: літоўскай, польскай, русінскай, лацінскай, нямецкай… Праваслаўны русінскі кампанэнт ВКЛ граў важную, але другарадную ролю… дэмаграфічнага, эканамічнага і культурнага чыньніка… Праваслаўныя магнаты, у адрозьненьне ад праваслаўных уладыкаў, засядалі ў сойме ВКЛ… ВКЛ адаптавала русінскае права. Ураднікі карысталіся канцылярскай русінскай моваю (Chancery Ruthenian language), якая адрозьнівалася ад маскоўскай. Таксама ВКЛ запазычыла русінскую традыцыю пабудовы абарончых фартэцыяў ды тактыку штурму абарончых умацаваньняў. Вялікім князём літоўскім была патрэбная Русь, таму ня толькі Гедымінавічы, але й Рурыкавічы атрымалі ўсе палітычныя правы. Князі Мсьціслаўскія й Заслаўскія дамінавалі на ўсходзе Беларусі, атрымаўшы роўныя [зь літоўскімі баярамі] эканамічныя правы… Вялікія князі фундавалі праваслаўную царкву… Аднак царква была пад кантролем, а каталіцтва стала дзяржаўнай рэлігіяй. Таму праваслаўныя мітрапаліты выбралі пасьля Кіева сваёй сядзібай Уладзімір й Маскву. У 1415 годзе Вітаўт стварыў для ВКЛ асобную мітраполію як інструмэнт літоўскай палітычнай улады. Ён падтрымліваў праваслаўныя школы ў Смаленску й Вільні. Праваслаўныя кніжнікі лічылі яго нашчадкам князёў Русі. Але нягледзячы на ўжываньне тытулу вялікага князя, запазычанага з тытулятуры Кіеўскай Русі, ён (Вітаўт. — **Аўт.**) не плянаваў стварыць вялікай Русінскай дзяржавы, а імкнуўся толькі да таго, каб падбіць русінскія землі пад Літву”.

Гэтыя развагі, на першы погляд, пярэчаць клясычнай літоўскай гістарыяграфіі, якая схільная адмаўляць ролю русінскага этнасу ў палітычным разьвіцьці ВКЛ. Але за апошнія дзесяць гадоў літоўскія гісторыкі адкарэктавалі ранейшы пункт гледжаньня. Ігнараваць факты, асабліва ў працах, прызначаных для замежнага чытача, стала немагчыма. Зьвесткі пра русінаў ВКЛ падаюцца, але так, каб зарэтушаваць і прынізіць іх палітычную ролю. Напрыклад, у акадэмічнай англамоўнай гісторыі ВКЛ прызнаецца, што палітычная нацыя ВКЛ складалася зь літоўскай (летувіскай) і беларускай шляхты[8]. Але адначасова сьцьвярджаецца, што беларуская шляхта грала

другарадную ролю, насяляючы памежныя абшары дзяржавы[9]. Невядома тады, на “якую мяжу” сьпісаць наваградзкую, менскую ці слуцкую шляхту, кашталяна віленскага Канстанціна Астроскага або праваслаўны да канца XVII стагодзьдзя клан князёў Агінскіх, які палітычна дамінаваў у Троцкім павеце, бо меў там свае маёнткі.

Нягледзячы на арыгінальныя думкі пра характар Крэўскай уніі з Польшчай і запазычаньне ліцьвінамі вайсковых прыёмаў русінаў, Стоўн у цэлым тлумачыць балянс этнічных сілаў ВКЛ у духу сучаснай літоўскай (у англамоўнай, накіраванай на замежжа вэрсіі) гістарыяграфіі. Пры гэтым ён гаворыць пра існаваньне розных моваў у Вялікім Княстве, але не вызначае памераў іх ужываньня. Між тым, акурат русінская (старабеларуская) мова панавала ў ВКЛ да сярэдзіны XVI стагодзьдзя. Няма дакладных лічбаў, але мы ня зьдзівімся, калі нехта з гісторыкаў давядзе, што з 1250 да 1550 году на старабеларускай мове было напісана 80% афіцыйных лістоў канцылярыі ВКЛ. Амаль усё астатняе было па-лацінску. Польская мова ў той час амаль што не выкарыстоўвалася, нямецкая ды арабская — вельмі спарадычна. Што да літоўскай, дык захаваліся ўнікальныя адзінкі, якія сьведчаць пра блізкі да нуля памер яе ўжываньня ў дзяржаўным справаводзтве. Тым самым, паўтараючы клясычны літоўскі тэзыс пра шэраг розных моваў дзяржаўнага апарату ВКЛ, Стоўн некрытычна прымае канцэпцыю нашых паўночна-заходніх суседзяў, скіраваную на тое, каб прыменшыць ролю беларускага этнічнага элемэнту.

**8. Kiappa, Zigmantas. Kiapienė, Jūratė. Kuncevicius, Albinas. The history of Lithuania before 1795. Vilnius, 2000. P.266, 298—299, 303. Зьдзіўляе блытаніна літоўскіх гісторыкаў з назваю гэтай**

шляхты ды яе мовы. У кнізе выкарыстоўваюцца тры розныя паняцьці (расейская, беларуская, заходнерасейская). Невядома куды зьнікла жмудзкая шляхта — трэці этнічны элемэнт палітычнай нацыі ВКЛ згодна з Статутам 1566 і 1588 гадоў. Гл.: Статут Вялікага княства Літоўскага 1588. Менск, 1989. С.118; Статут Великого княжества Литовского. Временник Императорского Московского общества истории и древностей российских. Москва, 1855. Книга 23. Отдел II. С.217

—218.

9 Ibid. P.265.

Што да праваслаўя ў ВКЛ, то барацьба, і барацьба пасьпяховая, за асобную “вялікалітоўскую” мітраполію пачалася задоўга да часоў Вітаўта вялікім князем Альгердам[10]. Мітрапаліт Кіеўскі і Літоўскі (абавязкова шляхціц паходжаньнем) меў сядзібы ў Наваградку й Вільні і адыгрываў важную ролю ў палітычным жыцьці дзяржавы. Сапраўды, праваслаўныя ўладыкі не былі сталымі сябрамі сойму ВКЛ, але вядома, што яны бралі ўдзел у ягоных паседжаньнях. Ацэнка палітыкі Вітаўта як праліцейскай (у этнічным сэнсе) таксама спрэчная. Факты, наадварот, сьведчаць пра яго спробу злучыць наноў падзеленыя ўсходнеславянскія княствы ў адно магутнае цэнтралізаванае каралеўства, у якім палітычныя правы належалі б толькі ці русінскага ды балцкага паходжаньня. Старабеларускія князі эканамічна і палітычна дамінавалі ў Полацкай ды Віцебскай землях, Слуцкім і Друцкім княствах, іншых абшарах Вялікага Княства. Толькі Троцкае і Віленскае ваяводзтвы з сьмешаным балта-славянскім насельніцтвам цалкам кантралявалі балцкай элітай. Ужо грамадзянская вайна 1430-х, разьвязаная Сьвідрыгайлам, выявіла вялізарныя амбіцыі і дзяржаўны ўплыў русінскай эліты. У 1456 і 1461 гадох паны-рада ВКЛ нават абмяркоўвалі магчымасьць абраньня асобнага вялікага князя (Казімер Ягайлавіч, як вядома, быў таксама каралём польскім). Абодва разы кандыдатам на пасаду вялікага князя літоўскага быў праваслаўны слуцкі князь Сямён Алелькавіч. Апрача гэтага, выхадцы з праваслаўнага баярства займалі пазыцыі цэнтральных ураднікаў ВКЛ, як, напрыклад, пісар гаспадарскі Іван Сапега ці маршалак дворны літоўскі Міхаіл Глінскі. На пачатку XVI ст. праваслаўныя радзіны значна пашыраюць свой уплыў у цэнтральным апараце дзяржавы.

Пэўную ўвагу Стоўн надае паўстаньню 1508 году на чале зь Міхаілам Глінскім (б. 25—26). Аўтар зазначае, што яго лідэр быў “праваслаўным літоўскім магнатам мангольскага паходжаньня”, а падчас паўстаньня хадзілі чуткі, што “Глінскі хоча стаць вялікім князем адноўленай Кіеўскай Русі”. Згодна зь легендай, адзін з продкаў Міхаіла Глінскага хан Мансур-Кіят нібыта пераехаў на службу ў ВКЛ за часамі Вітаўта. Прадзед Міхаіла Глінскага праваслаўны князь Іван Глінскі згадваецца

10 Giedroyc, M. The Ruthenian-Lithuanian Metropolitanates and the Progress of Christianization (1300—1458). Le Origine dello sviluppo della christianità Slavo-bizantina. Roma, 1992. P.315—342.

ў гістарычных крыніцах 1398 году. З увагі на тое, што Міхаіл Глінскі рэпрэзэнтаваў чацьвертае пакаленьне насельнікаў ВКЛ, думаецца, што ён хутчэй быў тыповым прадстаўніком тагачаснай русінскай эліты. Яго мангольскае паходжаньне, бадай, трэба ўважаць генэалягічнай легендай[11].

Наступныя цікавыя для нас часткі маюць назвы “Літоўская дзяржава й сьвядомасьць” (б. 44—45) і “Эвалюцыя русінскай шляхты” (б. 45—46). Тут сьцьвярджаецца, што “пры канцы XVI ст. незалежнасьць ВКЛ аслабла ў выніку росту эканамічнай і мілітарнай магутнасьці Польшчы”. Ня маючы нічога супраць гэтай думкі, зазначым, што галоўнай прычынай крызысу ВКЛ была сталая агрэсія Маскоўшчыны, у прыватнасьці акупацыя ў 1562 годзе Полацкай зямлі — палітычна важнай і эканамічна заможнай часткі дзяржавы. Далей слушна гаворыцца, што польская эліта кіравалася ўласнымі інтарэсамі і што, “нягледзячы на польскі ўплыў, ВКЛ захоўвала ўласныя палітычныя інстытуты”. Аўтар зазначае, што Статут ВКЛ 1529 году быў напісаны русінскай мовай. Удакладнім, што русінскай (старабеларускай) мовай былі напісаныя таксама ранейшыя за 1529 год помнікі канстытуцыйнага права ВКЛ, а пазьней і Статуты 1566 і 1588 гг. Разглядаючы становішча русінскай шляхты ВКЛ у XVI ст., Стоўн прыводзіць малавядомы прыклад, што сьведчыць пра крызу цэнтральнай улады ВКЛ: “Падляшша, якое заставалася часткай ВКЛ, ужо ў 1566 годзе перайшло на польскае права. Лаціна зрабілася афіцыйнай мовай. Ужо ў 1560 годзе падляская шляхта папрасіла канцылярыю ВКЛ (! — **Аўт.**) ліставацца зь ёй на польскай мове альбо лаціне, толькі не па-русінску” (б. 46).

У разьдзельчыку *“Друк на іншых мовах”* (б. 107—108) гаворка ідзе перш-наперш пра літоўскія публікацыі. У сваім паведамленьні пра першую кніжку літоўскай мовай Марціна Мажвідаса, выдадзеную ў 1547 годзе, Стоўн ня робіць акцэнту на тым, што гэтае выданьне пабачыла сьвет на тэрыторыі тагачаснага васалу Польшчы Прусіі, якая ніколі не была часткай ВКЛ. Прыводзяцца зьвесткі аб тым, што літоўская інтэлектуальная эліта ВКЛ канца XVI — пачатку XVII ст. (Мікалаюс Даўкша, Мельхіёр Гедройц і г.д.) свядома мацавала літоўскую этнічную сьвядомасьць, заклапочаная бараніць літоўскую мову ад яе выцясьненьня польскай. Тое ж, што ў гэты самы час русінскія інтэлектуалы ВКЛ

**11** **У беларускай гістарычнай лінгвістыграфіі пакаленьня**

стваралі падобныя тэксты, скіраваныя да русінскай шляхты ВКЛ[12], Стоўну невядома — відаць, перадусім дзеля адсутнасьці адпаведных публікацыяў на заходніх мовах. На сярэдзіне 108 ёсьць згадка, што “на вельмі кароткі час у 1525 годзе адчынілася друкарня ў Вільні”. На жаль, гэта адзінага ўскоснае сьведчаньне пра Францішка Скарыну. Іншы першадрукара й найбуйнейшага гуманіста Літвы й Беларусі ў Стоўнавай манаграфіі адсутнічае. Няма ў ёй нічога пра выданьне Лявом Сапегам беларускамоўнага Статуту 1588 і пра патрыятычныя словы канцлера пра русінскую мову. Я няма і іншых зьвестак пра “залаты век” старабеларускай культуры.

**канчаўніка ў з Усходу ўжываецца тэрмін “гатары” альбо “манголы” гатары”. Усьлед за сусьветнай гістарыяграфіяй мы выкарыстоўваем больш карэктнае навуковае паняцьце “манголы”.**

**12**
**Абмяжуемся імёнамі полацкага шляхціца-пратэстанта Васіля Цяпінскага, аўтара патрыятычнай праграмы ратаваньня роднай мовы ад палянізацыі ў прадмове да першага беларускамоўнага**

**выданьня Новага Запавету (ля 1580 году), а таксама шляхціца Яна Казімера Пашкевіча зь ягоным панэгірыкам беларускай мове (1617 год) як вызначальнай мове Літвы (насуперак польскай у Польшчы), занатаваным аўтарам на палёх беларускамоўнага выданьня Статуту ВКЛ.**

Старонкі 137—139 прысьвечаныя Берасьцейскай уніі 1596 году. На думку аўтара, хоць шмат праваслаўнай шляхты і месьцічаў адмовіліся прызнаць гэтую унію, яна вырашыла ўнутраныя праблемы царквы, бо русіны атрымалі новыя генэрацыі адукаванага сьвятарства. У адрозьненьне ад клясычнай польскай гістарыяграфіі, якая, апісваючы падзеі ўнійнай вайны XVII ст., зазвычай гаворыць толькі пра ўдзел у ёй праваслаўных месьцічаў, Стоўн слушна падкрэсьлівае таксама заангажаванасьць праваслаўнай шляхты.

Чаму ж значная частка некаталіцкай шляхты ВКЛ не падтрымала уніі? Як вядома, некаторыя магнаты (такія, як Хадкевічы ці Палубінскія) адразу навярнуліся да каталіцтва, іншыя (слуцка-біржанскія Радзівілы, Статкевічы, Агінскія, Мяшчэрскія, Мірскія, Пузыны) захоўвалі вернасьць пратэстанцтву і нелегальнаму (да 1632 году) праваслаўю. Яснага адказу на гэтае фундамэнтальнае пытаньне ў сынтэзе

Стоўна, напісаным на падставе ўжо назапашаных крыніц ды апублікаваных прац, няма, бо ў гістарыяграфіі бракуе спэцыяльнага дасьледаваньня гэтае тэмы.

У разьдзеле *“Адам Кісель і русінскае пытаньне”* (б. 156—158), грунтуючыся на англамоўнай манаграфіі канадзкага гісторыка ўкраінскага паходжаньня Франка Сысіна[13], аўтар апавядае пра лёс аднаго з апошніх праваслаўных сэнатараў Кароны ад Украіны, кашталяна кіеўскага і пазьней ваяводы чарнігаўскага Адама Кісяля (1600—1653). Русінская сьвядомасьць, гордасьць за мінуўшчыну Русі і сваё няпольскае паходжаньне не перашкодзіла Кісялю дасягнуць найвышэйшых пасадаў РП. Тым ня менш, русінская этнічнасьць стварала дылему для яго палітычнай дзейнасьці, якая прыпала на часы “патопу” — вядомага канфлікту паміж дзьвюма палітычнымі элітамі тагачаснай Украіны: шляхтай і казацтвам. Кісялёў прыклад як найлепш дэманструе важнае месца ўкраінцаў-русінаў у гісторыі элітаў РП, а таму вельмі важны для ўкраінскай гістарыяграфіі. Татальная адсутнасьць працаў пра беларускіх праваслаўных магнатаў ВКЛ XVII ст. не дазволіла Стоўну выявіць на беларускім матэрыяле гэты важны для нас аспэкт гісторыі РП. Між тым два магутныя кланы ВКЛ — князі Агінскія і Статкевічы — захоўвалі русінскую сьвядомасьць да канца XVII ст. Старабеларускія кніжнікі лічылі іх “стаўленіцкай веры”. У моцна спалянізаваным асяродзьдзі магнатаў і шляхты ВКЛ XVII ст. прадстаўнікі гэтых родаў адназначна ўспрымаліся як “русіны”[14]. Толькі брутальныя войны сярэдзіны XVII ст. зьмянілі іх лёс, а разам з гэтым паклалі канец іх старабеларускай (выразна адрознай ад “польскай” і “літоўскай”) сьвядомасьці. Напрыклад, праваслаўны сэнатар, кашталян Наваградку Самуэль Статкевіч (†1660) супрацоўнічаў з расейцамі, падчас акупацыі Літвы ў 1655 годзе склаў прысягу маскоўскаму цару. За гэта кароль Ян Казімер абвясьціў яго здраднікам і пазбавіў яго ўсіх “маёнткаў у Літве й на Русі”. Іншы Статкевіч, кашталяніч наваградзкі Міхал (†1656), як пасол Мсьціслаўскага ваяводзтва падпісаў генэральную канфэдэрацыю РП 1648 году з патрабаваньнем абароны “ўсходняй грэцкай веры”, а ў 1654 годзе добраахвотна супрацоўнічаў з Багданам Хмяльніцкім. Ягоная сястра Алена Статкевіч была жонкаю генэральнага пісара Ўкраінскага гетманату, вызначальніка тагачаснай замежнай палітыкі

**13. Susyn, Frank. Between Poland and the Ukraine: the dilemma of Adam Kysil, 1600—1653. Cambridge, Mass.: Harvard Ukrainian Research Institute, 1985.**

Ўкраіны Івана Выгоўскага. Міхал Статкевіч таксама быў абвешчаны здраднікам. З расейцамі супрацоўнічаў і клан Агінскіх. У выніку пасьля вайны і перамогі РП праваслаўе сярод яе эліт канчаткова дыскрэдытавала сябе як здрадніцкая вера. Апошнія праваслаўныя шляхцічы хутка навярнуліся на каталіцтва і спалянізаваліся. Іх новая нацыянальная сьвядомасьць, дарэчы, ніяк не аспрэчвала іх русінскага паходжаньня (“gente Lithuanus (Ruthenus), natione Polonus”). Апошні праваслаўны сэнатар РП Аляксандар Агінскі памёр у 1667-м. Ягоны сын, князь Марцыян Агінскі, каб атрымаць сэнатарскую пасаду, быў вымушаны прыняць у 1669 годзе каталіцтва. Але й пасьля гэтага ён працягваў дапамагаць праваслаўнай царкве, ганарыўся слаўнай мінуўшчынай Русі[15]. Пра гэта сьведчыць інтэрмэдыя “На Гербоўную Браму Яснавяльможнага Ягамосьця Пана Канцлера”, пастаўленая навучэнцамі езуіцкай калегіі ў Менску ў 1689 годзе з нагоды прыезду Марцыяна Агінскага. Акурат ад “Глеба і Барыса, княжат рускіх, мучанікаў Хрыстовых”, па простай лініі, як сьцьвярджалася ў інтэрмэдыі, паходзяць князі Агінскія, іх герб ня што іншае, як родавы герб, успадкаваны ім ад тых князёў[16]. На жаль, гэтых фактаў і імёнаў у працы Стоўпатыя Значыцца, постаці праваслаўных беларускіх магнатаў патрабуюць сур’ёзнага дасьледаваньня, у тым ліку ў сваімі гістарыёграфамі. Толькі так можна навукова давесьці ўсіх паноўных у сусьветнай гістарыяграфіі дагматычных поглядаў на ролю продкаў беларусаў у гісторыі ВКЛ і РП.

**14 Галенченко, Григорий “Шляхетская демократия” в Великом княжестве Литовском XVI–XVIII вв.// Белоруссия и Россия: общества и государства. Москва, 1998.**

**15 Lulewicz, Henrik. Skład wyznaniowy senatorów świeckich Wielkiego Księstwa Litewskiego za panowania Wazów // Przegląd Historyczny. 1977. T.LXVIII, Z.3. S.443.**

**16 Гл: Марзалюк, Ігар. Гістарычная самаідэнтычнасць насельніцтва Беларусі ў XI—XVII стст. // Беларускі гістарычны альманах. 2000. Т.5.**

Нацыяналістычна-аматарскі дыскурс ВКЛ як беларускага гаспадарства — гэта таксама тупіковы шлях. Насамрэч ВКЛ было палітычным утварэньнем эліты трох этнічных супольнасьцяў: літоўскай, русінскай і жмудзкай[17]. У сярэдзіне XIX — пачатку XX ст. мясцовыя нацыянальныя рухі на грунце адзінай гістарычнай традыцыі ВКЛ ды на розных этнічных асновах — балцкай і ўсходнеславянскай — запазычалі ідэі і мадэрныя нацыянальныя праекты: беларускі і літоўскі. Нашчадкі гістарычных ліцьвінаў (шляхты літоўскага, русінскага ці жмудзкага паходжаньня), маючы на мэце роўныя правы на палітычную спадчыну ВКЛ, бралі ўдзел у іх рэалізацыі.

У разьдзеле *“Праваслаўнае адраджэньне і русінскае нацыянальная сьвядомасьць”* (б. 225—229) шмат цікавых роздумаў пра лёс русінаў у XVII ст. Згодна з аўтарам, Люблінская унія 1569 году стварыла выразны падзел паміж русінскай шляхтай Літвы і Ўкраіны, якая зьмяшалася з польскай шляхтай, засвоіла польскія культурныя ўзоры і тым самым займела адрозную ад старабеларускай сьвядомасьць: “Адрыў ад праваслаўнай Беларусі стварыў базыс для разьвіцьця асобнай украінскай сьвядомасьці, адрозьнівалася ад супольнай русінскай этнічнасьці”. Ён падмацоўвае гэтую тэзу прыкладамі, што грунтуюцца на ўкраінскіх рэаліях, а таксама трымаецца спрэчнай у сучаснай ўкраінскай гістарыяграфіі, згодна зь якой цэнтрам украінскай культуры на пачатку XVII ст. пасоўваецца зь Вільні ў Кіева. Не аспрэчваючы важнасьці Кіева, Пятра Магілы і праваслаўнага

**17 Згодна з заканадаўствам ВКЛ, яго палітычны народ складаўся з трох этнічных супольнасьцяў: ліцьвінаў, русінаў і жмудзінаў. Жмудзкая шляхта мела ўласную адміністрацыйную сыстэму. Кіеўскі Літоўска-Рускі мітрапаліт Жмудзкай мітрапаліі не падчыняўся.**

калегіюму, зазначым, што гэта не зусім так. Да войнаў сярэдзіны XVII ст. і свайго зруйнаваньня Вільня ВКЛ ўніла Кіевам заставалася цэнтрам праваслаўнага адраджэньня, местам, дзе, згодна з статыстыкай, была надрукаваная большасьць кніг на старабеларускай мове, дзе пражывалі ўдзеле шляхты і месьцічаў дзейнічала праваслаўнае брацтва, дзе вучыліся, жылі й працавалі русінскія асьветнікі, у ўкраінскага паходжаньня. На жаль, навуковага дасьледаваньня гэтай супэрважнай тэмы няма. Таму прычынаю адсутнасьці ў тэксьце Стоўна аспэкту праваслаўнага адраджэньня XVII ст. у ВКЛ ёсьць не яго недагляд, але крыза й слабасьць сучаснай беларускай гістарыяграфіі. Разам з тым працы бачыць гісторыка праваслаўнай царквы Антона Міранові, а дагэтуль пецярбурскага гісторыка кніжнай культуры ВКЛ Мікалая Нікалаева паказваюць, што зрухі да лепшага ёсьць. Расчаравала частка *“Асьветніцтва ў Літве”* (б. 328—329). Аўтар імкнуўся паказаць гэты рух на прыкладзе літоўскай культураў: польскай, літоўскай і старабеларускай — і пачаў з таго, што на працягу стагодзьдзяў “літоўская мова ня мела аніякага ўплыву на шляхту ВКЛ, якая карысталася русінскай (беларускай) мовай”. У 1697 годзе спалянізаваная за постлюблінскі пэрыяд літоўская шляхта пайшла на татальную замену ў справаводзтве старабеларускай мовы польскай. Прычынай гэтага, апроч павольнае палянізацыі шляхты, быў паваенны заняпад кірылічнай пісьмовай культуры і школьнай адукацыі. У часе маскоўскай навалы 1654—1667 гг. усе цэнтры праваслаўнай і ўніяцкай культуры былі або зрабаваныя, або зруйнаваныя. Пісьменная частка беларускага насельніцтва панесла вялізныя страты як палеглымі, так і вывезенымі ўглыбкі Маскоўшчыны. Шляхта зрабілася амаль татальна каталіцкай і зьнеахвочанай у адраджэньні асяродкаў праваслаўнай культуры. Аднак там, дзе яны захаваліся, назіраецца працяг старабеларускай традыцыі. Напрыклад, у Магілёве яшчэ ў 1709 годзе магістрацкія кнігі пісаліся па-беларуску кірыліцай. Заўважым, што і па 1697 годзе кожны шляхціц-ураднік ВКЛ мусіў добра ведаць кірыліцу і беларускую мову, бо тэксты, напісаныя на ёй, як і раней, мусілі цытавацца і перапісвацца на мове арыгіналу. Хоць Стоўн правільна характарызуе польскамоўную культуру ВКЛ як *“польскамоўную літоўскую культуру”*, прыведзеныя ім шматлікія прыклады

**існаваньня ВКЛ ўніла выраўняныя адміністрацыйныя межы і асобную адміністрацыйную структуру (старасты, падзеленыя на цікунствы), а таксама мову, якая дагэтуль вельмі розьніцца ад літаратурнай літоўскай.**

адраджэньня літоўскай культуры ў XVIII ст. ня маюць навуковага сэнсу, паколькі не датычаць гісторыі ўласна Рэчы Паспалітай XVIII ст. Аўтар некрытычна паставіўся да схемаў літоўскіх гісторыкаў і ўсьлед за імі для абгрунтаваньня літоўскай культурнай прысутнасьці ў РП ужывае факты зь літоўскай культуры Прусіі, якая ад 1657 году была незалежным ад РП гаспадарствам. Таму агляд гэтай культуры ня мае дачыненьня да заяўленага зьместу й назвы манаграфіі.
У адрозьненьне ад гэтага, старабеларуская культура ВКЛ не атрымала належнага разгляду. Згадкі пра *“русінскага грамадзяніна ВКЛ”* навукоўца Юзафа Нарановіча-Наронскага (†1678) для гэтага замала. Як вядома, беларуская мова ў ВКЛ працягвала ў XVIII ст. ужывацца перадусім ува ўніяцкай і праваслаўнай рэлігійнай практыцы ды зьвязаным зь ёй культурным жыцьці (друк, школа й г.д.). Нельга казаць, што на яе зусім забылася шляхта. Захаваліся вершы, якія хадзілі нават у магнацкіх асяродзьдзях. Разьвівалася драматургія. Паўнейшы агляд беларускай культуры і літаратуры XVIII ст. можна знайсьці ў працах Адама Мальдзіса і Францішка Сяліцкага[18].

**18 Мальдзіс, Адам. На скрыжаванні славянскіх традыцый: літаратура Беларусі пераходнага перыяду. Менск, 1980. Sielicki, Franciszek. Literatura białoruska do końca 18 wieku. Wrocław, 1985.**

У заключэньні аўтар разважае пра значэньне гісторыі РП у лёсах народаў, якія выступаюць яе спадкаемцамі. Падкрэсьліваецца, што Рэч Паспалітая не была польскай дзяржавай, і прапануецца разглядаць яе як супольную спадчыну палякаў, літоўцаў, беларусаў і ўкраінцаў. Згодна з Стоўнам, доўгае гістарычнае быцьцё русінаў у РП выпрацавала ў русінскай эліты адрозную ад расейцаў палітычную і культурную ідэнтычнасьць і абумовіла ў канчатковым выніку ўзьнікненьне адрозных ад расейскай мадэрных украінскай і беларускай нацыяў. У канцы XVIII ст. два этнасы — украінцы і беларусы — пачынаюць рухацца ў бок нацыянальнай сьпеласьці.

Стоўн справядліва заўважае, што беларускі досьвед нацыятварэньня ў параўнаньні з украінскім дагэтуль менш адрэфлексаваны. Тлумачыцца гэта, на нашу думку, перадусім адсутнасьцю ў беларускай гістарыяграфіі грунтоўных, зробленых на падставе сучасных заходніх мэтадалёгіяў (і пажадана на заходніх мовах) працаў наконт таго, як беларуская

этнічная супольнасьць станавілася нацыяй. З аднаго боку, гэта адцяняе крызысны стан беларускай гістарычнай навукі. Зь іншага боку, само ўсьведамленьне крызы дапамагае вызначыць стратэгічную важнасьць вывучэньня ролі нашых продкаў у палітычнай гісторыі ВКЛ. Рацыянальны пошук лепшы за будаваньне мітаў. Цікавая і грунтоўная манаграфія Даніэля Стоўна, не прадукуючы мітаў, паказвае, як можна сумясьціць навуковасьць і зычлівавасьць у дасьледаваньні русінскага аспэкту гісторыі РП. Гэта сьведчыць, што заходнія калегі чакаюць нас. Ці ня час заняць сваё месца ў гісторыі?

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **2003/12/14**
[image]

# Андрэй Казакевіч Вялікае Княства Літоўскае як ідэалягічная рэальнасць

**АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ (нар. у 1980 у Менску) — палітолаг, культуролаг. Скончыў аддзяленьне паліталёгіі юрыдычнага факультэту ВДУ (2002). Апошняя публікацыя — аналіз тэкстаў палітычнай ідэалогіі ВКЛ XVI ст. (на матэрыяле хронікі Быхаўца) («Палітычная сфера», 2/2002).**

Гэты тэкст ёсць практыкаваннем у метадзе — метадзе палітычнага аналізу гістарычнае веды і яе залежнасці ад сучасьнасьці. Перш за ўсё нас цікавіць гэтая залежнасць, і мы не будзем ставіць пытанне пра “гістарычную праўду” і тым больш імкнуцца да выкрыцця “лжэнавуковых стратэгіяў”, як гэта звычайна робяць гісторыкі ды папулярызатары гісторыі. Гэты тэкст — погляд на праблему даследавання Вялікага княства Літоўскага з зусім іншых — дысцыплінарных рамак палітычнае навукі, што дазваляе нам адчуваць сябе вольным ад рамак навукі гістарычнае.

*Гісторыя як палітычная дысцыпліна.* Без сумневу, цяжка знайсці дысцыпліну, настолькі звязаную ў сваёй практыцы з часам і часам, як гісторыя. Ніводная навука (акрамя, можа, паліталогіі ці сацыялогіі) не з’яўляецца настолькі палітычнай, дакладней сказаць, палітызаванай. Да таго ж гісторыя выконвае ролю палітычнай навукі “традыцыйна”[1], у той час як паліталогія ды сацыялогія — у значнай ступені новыя навукі. Такія ўласцівасці гісторыі звязаны са значэннем тае веды, якую яна вытварае, — веды-пра-мінулае. Веда пра генеалогію дзяржаўнасці, шматвяковую культурную традыцыю, войны ды інкарпарацыі

фармуе нацыянальую (этнічную, культурную і да т.п.) ідэнтычнасць, дапамагае здабыць *права* (на уладу, тэрыторыю), а гэта значыць, з'яўляецца неабходным элементам палітычнага ландшафту.

Калі звярнуцца да першапачатковага значэння грэцкага слова Historia, то, акрамя шэрагу іншых канатацыяў, яно мае значэнне *расследаванне*, што лепш за ўсё адлюстроўвае сэнс і змест палітычных практыкаў гісторыка. Выкананне палітычнае задачы (напрыклад, фармаванне агульнанацыянальнай свядомасці) патрабуе следства над мінулым і адпаведнага прысуду ў адносінах да яго. Гэты прысуд (як і любы іншы прысуд), натуральна, залежыць не столькі ад права, колькі ад правасвядомасці. Але гісторык не выносіць рашэнняў у адносінах да мінулага, ён следчы, які наўпрост збірае доказы, аналізуе факты, замаўляе экспертызы ды робіць папярэднія вывады, рыхтуючы "справу" да суду, які ўвасабляецца ў інстытуцыях палітыкі і ўлады[2].

Гістарычная веда існуе як *гістарычная,* толькі калі яна легітымаваная ўладаю. Але такая веда не мае цэласнасці, у грамадстве яна распадаецца на некалькі моцна ізаляваных узроўняў. Гістарычная веда, якая цыркулюе ў акадэмічным асяроддзі, і веда, якая спажываецца паспалітай свядомасцю, вельмі розняцца як у змесце, так і ў палітычных функцыях, якія ім даюцца ў іншых уласцівасцях. Гісторык у сваёй вытворчасці навукі моцна абмежаваны акадэмічнымі рамкамі: выкарыстанне ўмоўна-даўгі метадалогіі, імкненнем да праўды, звяртаннем ўвагі на аргументацыю апанентаў, верыфікацыяй уласных высноў і г.д. — усё гэта звычайна не могуць быць катэгарычнымі. У зусім іншых сітуацыі знаходзіцца аўтар папулярнай кнігі па гісторыі (цалкам магчыма, што гісторык-навуковец і гістарык-папулярызатар супадаюць у адной асобе): ён не **моцна з ёй** "навуковых" рамак і павінен арыентавацца на патрабаванні спажыўца ці замоўцы (які, хутчэй за ўсё, мае пэўныя матывы ды інтэнцыі). Прынцыпова іншыя патрабаванні да гістарычнае веды мае сфера адукацыі: школьны падручнік у большай ступені сродак фармавання свядомасці, чым крыніца інфармацыі.

[1] **Палітычныя навукі** — **гэта моцна развіваюцца ў межах навукі гістарычнае** — **або была моцна з ёй звязана. Дастаткова** — **гэта** — **дасследчыя практыкі ў СССР, дзе палітычныя даследаванні дысцыплінарна**

**мімікравалі пад гістарычныя, ці прыгадаць палітычна-навуковую дзейнасць Н.Мак'явелі, чый унёсак у развіццё палітычнае тэорыі ў значнай ступені засноўваўся на гістарычным матэрыяле.**

**[2] Калі мы кажам тут "улада", то маем на ўвазе любую палітычную ўладу, неабавязкова дзяржаўную.**

Чым ніжэйшая навуковасць і, адпаведна, вышэйшая даступнасць, тым большае палітычнае значэнне атрымоўвае гістарычная веда. Палітыка — мастацтва магчымага, і чым менш веда звязана патрабаваннямі "навуковасці", тым

шырэйшыя яе “windows of opportunity”[3]. У сацыяльнай прасторы гістарычная веда структуравана ў палітычную іерархію, што складаецца з трох аўтаномных узроўняў, кожны з якіх фармуецца з уласных тэкстаў, інстытуцыяў і выконвае розныя палітычныя функцыі. На вяршыне іерархіі знаходзіцца ідэалагічная і ідэйна-сімвалічная веда пра гісторыю, якая надаецца для спажывання шырокімі коламі грамадскасці. Веда канцэнтруецца ў рознай якасці сацыяльнай міфалогіі, ідэалогіях, школьных падручніках ды нацыянальнай (дзяржаўнай) сімволіцы і ўтварае інтэграваную частку палітычнае прасторы.

[3] “Вокны магчымасцяў” (англ.).

Наступны ўзровень фармуе навукова-папулярная веда, разлічаная на спажыванне вузкімі грамадскімі коламі: настаўнікамі, студэнтамі, тымі, каго раней называлі “інтэлігенцыя”. “Цела” гэтае веды ўтвараюць навучальныя курсы, гістарычныя часопісы, навукова-папулярная літаратура, TV-праграмы і г.д. Другі ўзровень цікавы для палітыка настолькі, наколькі ён уплывае на свядомасць “эліты”, у розным значэнні гэтага слова.

У самым нізе палітычнае іерархіі гістарычнай веды знаходзіцца акадэмічная навука. Яна мае даследчую аўтаномію і права на “незалежнасць погляду”, але вымушана плаціць за гэта сацыяльнай ізаляцыяй. Галоўны сімвалічны (палітычны) капітал акадэмічнае веды — менавіта яе высокі ўзровень легітымнасці, пабудаванай на “праўдзівасці” і “сапраўднасці” — найбольш цікавіць палітычныя суб’екты. Калі акадэмічная веда адпавядае інтэнцыям улады, яна мае шанец трапіць у верхнія слаі палітычнае іерархіі, калі не — хутка апынаецца ў ізаляцыі, не маючы магчымасцяў для росту і прасторавае экспансіі.

Наша даследаванне прысвечана пераважна ніжняму ўзроўню палітычнае іерархіі — гістарычнай навуцы. Дакладней, таму, якім чынам палітычныя стратэгіі і інтэнцыі адлюстроўваюцца ў гістарыяграфіі на прыкладзе даследаванняў Вялікага княства Літоўскага ў розных нацыянальных традыцыях. Веда-пра-Вялікае-Княства больш за стагоддзе была важным элементам гістарычнае свядомасці ў краінах Усходняй Еўропы і, адпаведна, важным элементам ідэалагічнага супрацьстаяння. Палітычнае значэнне гэтае веды захоўваецца да нашага часу, асабліва ў Беларусі і Літве.

**Вялікае княства Літоўскае як палітычная і навуковая праблема**

Канструяванне Вялікага княства Літоўскага як навуковай праблемы і аб'екта даследавання непарыўна звязана з палітычнымі падзеямі XIX — пачатку XX стагоддзя і перш за ўсё расійска-польскім супрацьстаяннем ды стварэннем беларускага і літоўскага (у меншай ступені ўкраінскага) нацыянальна-вызваленчых рухаў. Калі прааналізаваць гістарыяграфію Вялікага княства Літоўскага XIX — пачатку XX ст., то тут мы можам заўважыць шэраг радыкальных трансфармацыяў, якія былі, выкарыстоўваючы тэрміналогію Т. Куна, сапраўднымі навуковымі рэвалюцыямі[4]: фармаванне Вялікага Княства як аб'екта самастойнага даследавання, фармаванне расійскае парадыгмы, пазней — літоўскае і беларускае і, нарэшце, радыкальны пераход расійскае гістарыяграфіі да савецкае парадыгмы, навеянай польскай гістарыяграфіяй. Патлумачыць такія радыкальныя трансфармацыі веды пра Вялікае Княства на працягу апошніх 200 гадоў можна толькі адным: найбольш відавочнымі прыкладамі рэвалюцыяў у гістарыяграфіі (а магчыма, і ў гуманітарных навуках увогуле) з'яўляюцца тыя знакамітыя эпізоды, за якімі замацавалася назва рэвалюцыяў Т. Куна. Ніякія падзеі ў даследаванні мінулага — адкрыцці ў архівах, даследаванне архіваў, археалагічныя знаходкі — не змянялі настолькі веду пра Вялікае княства Літоўскае, як паўстанні 1830—1831, 1863—64 гадоў, рэвалюцыя 1905—1907, першая сусветная вайна, разам з грамадзянскай 1914—1920 гг., і, нарэшце, распад СССР. Гісторыкі маглі дзесяцігоддзямі не заўважаць ці ігнараваць гістарычныя *факты*, і тады палітычныя падзеі "раптам" расплюшчвалі ім вочы, выносячы на паверхню тое, што да гэтага паслядоўна сублімавалася.

Усё гэта дазваляе нам казаць пра залежнасць дынамікі гістарычнае веды пра Вялікае Княства ад дынамікі палітычнай сферы і, як вынік, прысутнасць палітыкі ў гістарычных канцэпцыях, тэорыях і парадыгмах. На якіх жа прынцыпах грунтуецца палітычная арганізацыя гістарыяграфіі Вялікага княства Літоўскага? Аналіз нацыянальных гістарыяграфій паказвае, што такіх прынцыпаў тры: генеалогія, прысутнасць і

[4] Нагадаем, што мы выкарыстоўваем тэрмін Т. Куна толькі ў адносінах да навуковых рэвалюцыяў, але не да палітычных. Гісторыкі могуць не заўважаць ці ігнараваць гістарычныя факты, і тады палітычныя падзеі "раптам" расплюшчвалі ім вочы, выносячы на паверхню тое, што да гэтага паслядоўна сублімавалася.

ўлада (дакладней, характар улады). Менавіта фармуляванне гэтых прынцыпаў вызначае *прыналежнасць*[5] Вялікага Княства, а значыць, і *права* на яго спадчыну.

*Генеалогія.* Палітычна вельмі цяжка вызначаць прыналежнасць спадчыны без легітымацыі яе ў мінулым, менавіта таму тэма генеалогіі Вялікага княства Літоўскага была і застаецца важным элементам палітычна-навуковага супрацьстаяння. Праблема генеалогіі, якую мы тут разумеем як сукупнасць звестак пра паходжанне, вельмі сур'ёзна ўспрымалася і ўспрымаецца ў асяроддзі гісторыкаў. Вырашэнне праблемы, ці Літва заваявала ў XIII ст. Беларусь, ці наадварот, мае палітычнае значэнне, якое добра ілюструе роля беларусацэнтрычнае канцэпцыі Вялікага княства Літоўскага ў разбурэнні савецкае ідэнтычнасці ў канцы 1980-х.

*Прысутнасць.* Натуральна, што нацыянальныя прэтэнзіі на дзяржаўную і культурную традыцыю не могуць абысціся без апеляцыі да "нацыянальнай прысутнасці" ў гэтай традыцыі, дзяржаве. Роля апеляцыі да прысутнасці тым больш узрастала, чым большую ролю ў палітычным жыцці пачыналі адыгрываць "масы" і ідэі пра нацыянальную волю, дэмакратыю і г.д., легітымнасць якіх і была пабудавана на прысутнасці, у супрацьвагу феадальнай легітымацыі па "крыві". Для расійскай гістарыяграфіі вельмі важна было сцвердзіць рускую прысутнасць праз атаесамленне яе з русінскай традыцыяй і падкрэсліванне таго, што духоўная сувязь паміж Масквою і Заходняй Руссю ніколі не перарывалася. Польскія гісторыкі гаварылі пра масавыя перасяленні этнічных палякаў у Вялікае Княства на працягу ўсяго Сярэднявечча і непарыўнасць культурнае і палітычнае традыцыі ВКЛ з культурнай і палітычнай традыцыяй Польшчы, асаблівую ўвагу надаючы мінімізацыі колькасці русінаў у насельніцтве Княства. Менавіта для вызначэння прысутнасці розныя гістарыяграфічныя традыцыі вынаходзілі "нацыянальныя", ці этнічныя, маркеры, кшталту каталік-літовец, каталік-паляк, праваслаўны-рускі і г.д.

*Сутнасць улады.* З палітычнага пункту гледжання значэнне княства Літоўскае мае найбольшае значэнне як **вызначэнне** дзяржаўнасці. Для нацыянальных рухаў пачатку **"XX нацыянальнага"** вызначыць сваю дзяржаўную традыцыю значыла знайсці **характару з'яў** "гістарычнай" нацыяй, што легітымізавала рух за **мінулага. Пры**

[5] **Вызначэнне прыналежнасці** — **Вялікага княства** — **Літоўскага**

незалежнасць. Дзяржаўная традыцыя — гэта традыцыя ўлады, досвед нацыянальнае супольнасці ў панаванні на пэўнай тэрыторыяй, насельніцтвам і г.д. — у адваротным выпадку супольнасць ператвараецца ў аб'ект панавання для эксплуатацыі. У адпаведнасці з гэтым для літоўскага гістарыяграфіі было вельмі важна паказаць этнічны характар улады ў Вялікім Княстве: літоўскае паходжанне дынастыі, большасці шляхты, прыярытэт інтарэсаў літоўцаў у палітычных справах і г.д., што паступова вяло іх да апісання ВКЛ як літоўскае "нацыянальнае" дзяржавы. Беларускія даследчыкі, натуральна, займалі зусім іншыя пазіцыі і апелявалі да беларускага характару і ўлады, і панавання ў Вялікім Княстве.

Гэтыя тры прынцыпы, на нашу думку, з'яўляюцца асновай палітычнай арганізацыі гістарыяграфіі Вялікага княства Літоўскага, але, перад тым як перайсці да аналізу нацыянальных гістарыяграфій, ізноў вернемся да канструявання Вялікага княства Літоўскага як аб'екта даследавання ў гістарычнай навуцы.

Тэрыторыя былога Вялікага княства Літоўскага на працягу практычна ўсяго XIX стагоддзя выступала як прастора, веда пра якую ўтварала інструмэнт расійска-польскага палітычнага супрацьстаяння. "Рэгіянальныя асаблівасці" гэтае тэрыторыі ўтваралі навуковую праблему (як польскай ускраіны ды расійскай правінцыі адначасова), але не самастойны аб'ект даследавання. Беларусь і Літва была для гісторыкаў толькі прасторай паміж варожымі метраполіямі. Веда, якую яны вытваралі, магла цалкам ігнараваць "мясцовыя" асаблівасці[6]. Пэўным выключэннем з мэйнстрыму была школа гісторыі, якая склалася ў Віленскім універсітэце першай трэці XIX ст. і зрабіла гісторыю Беларусі ды Літвы асобным прадметам даследавання, за што яе часам называюць першым эпізодам беларускага і літоўскага "адраджэння". Даследчык гісторыі права І. Даніловіч, прыхільнік аднаўлення незалежнасці Вялікага княства Літоўскага, адзначаў самакаштоўнасць статутаў ВКЛ і выступаў за яе адраджэнне, славіў Літву як "адкрыў" цэласнасць старабеларускай літаратуры і навуковы зварот постаць Ф. Скарыны, гісторык І. Лаба сцвярджаў неабходнасць комплекснага вывучэння

[6] Падрабязней гл.: Кушнер І. А. Гістарыяграфія Беларусі ў XIX — пачатку XX ст. // Гуманітарныя навукі. № 1. С. 6.

http://fraberaty.kinihi.com/

Літвы як інтэграванага цэлага. **11kazakievich.htm).**
Лёс “ліцвінскае” школы (як навуковага феномену) яшчэ раз пацвярджае цесную сувязь паміж уладай і гістарычнай ведай. Праз тое што “ліцвінская” школа не знайшла палітычнай легітымацыі, яе канцэпцыі былі выціснуты ў глыбокую перыферыю і былі наноў адкрытыя толькі дзякуючы разгортванню беларускага і літоўскага нацыянальных рухаў. Канцэпцыі “ліцвінскае” гістарыяграфіі сталі анамаліяй, якую польскія і расійскія даследчыкі мелі за найлепшае не заўважаць, пакуль іх да гэтага не прымусілі палітычныя падзеі другой паловы XIX — пачатку XX стагоддзя. Да гэтага часу асноўным прынцыпам даследчае стратэгіі польскіх і расійскіх гісторыкаў становіцца вызначэнне *прыналежнасці* тэрыторыі (культурнае і дзяржаўнае спадчыны) ВКЛ да расійскага ці польскага палітычнага (культурнага) поля. Для Расіі гэта значыла падкрэсліванне славянскага, русінскага (рускага), праваслаўнага характару Вялікага Княства. Для палякаў, наадварот, — польскае, каталіцкае і нерусінскае прыроды ВКЛ.

**Geneza Państwa Litewskiego:**
**польская традыцыя XIX — пачатку XX ст.**
Доўгі час адной з характэрных прывілеяў польскае гістарыяграфічнае традыцыі была манаполія на веду пра Вялікае княства Літоўскае. Гэта манаполія была “традыцыйнай”, умацаванай ідэалогіяй польскае шматэтнічнае (першапачаткова) палітычнае нацыі і сталых палітычных практык, якія налічвалі не адно стагоддзе. Сваё дамінантнае значэнне польская традыцыя захоўвала да сярэдзіны XIX ст., ці, каб быць больш дакладным, да паўстання 1863—64 гг., калі ў яе з’яўляецца моцны, легітымізаваны расійскімі імперскімі ўладамі канкурэнт.
Расійска-польскае супрацьстаянне абумоўлівала палітычную аснову даследчых стратэгіяў польскіх гісторыкаў — максімальнае зніжэнне ролі русінскага элементу ў гісторыі Княства. Сублімацыя русінскасці значыла сублімацыю Масквы і адхіленне яе прэтэнзіяў на гістарычную спадчыну Вялікага княства Літоўскага, што адначасова стварала веду пра гісторыю, вельмі прыдатную для літоўскага нацыянальнага руху.
*Генеалогія.* Стандартам польскае гістарыяграфіі, што тычыцца

генеалогіі Вялікага княства Літоўскага, была канцэпцыя літоўскае заваёвы Русі (традыцыя пачата яшчэ з тэкстаў Я. Длугаша). У адрозненне ад больш позніх варыянтаў гісторыі Вялікага Княства, факту далучэння рускіх княстваў да літоўскае дзяржавы надавалася прынцыповае і вырашальнае значэнне ў фармаванні ВКЛ. Менавіта гэтае далучэнне (заваёва) і ёсць актам стварэння новае дзяржавы, у той час як літоўская і савецкая гістарыяграфіі былі схільны звязваць генеалогію ВКЛ са стварэннем адзінае літоўскае дзяржавы, якая далей ажыццяўляла экспансію на поўдзень. Пэўныя даследчыкі (у прыватнасці Ю. Ляткоўскі) былі схільны пашыраць часавыя рамкі літоўскай экспансіі і датаваць літоўскую заваёву шэрагу русінскіх земляў XII стагоддзем, але гэта не мяняла сутнасці. Іхным канцэпцыям была ўласцівая пасіўная роля русінскіх земляў, якія былі толькі аб'ектам знешняе экспаніі, хоць часткова і прызнаваўся факт уплыву Русі на фармаванне дзяржаўных інстытутаў новае дзяржавы. Вывады польскай генеалогіі Вялікага Княства былі адназначныя: гэтую дзяржаву стварылі не русіны.

*Прысутнасць.* Агульная стратэгія польскае гістарыяграфіі, накіраваная на мінімізацыю ролі русінскага элементу ў гісторыі Вялікага княства Літоўскага, вымушала пэўным чынам апісваць дэмаграфічную і культурную сітуацыю ў ім. У пачатку XX ст. Я. Якубоўскі (і гэты выпадак надзвычай красамоўны), даследуючы літоўскі этнічны элемент у дзяржаве, прыйшоў да высноваў, што ў сярэдзіне XVI стагоддзя ён складаў каля паловы насельніцтва[7]. Іншы вядомы польскі гісторык Г. Лаўмянскі даводзіў, што этнічныя літоўцы складалі не больш за 20% насельніцтва, але затое каля 60% рыцарства (гэта значыць "эліты")[8]. Так ці інакш, у польскай версіі гісторыі Вялікага Княства літоўскі этнічны элемент утвараў значную дэмаграфічную сілу. Больш за тое, польскія гісторыкі надавалі схільны ігнараваць асіміляцыю балтаў русінамі, шмат увагі працэсам паланізацыі (самапаланізацыі) русінскіх. Асобная ўвага надавалася польскай прысутнасці ў гарадах, паходжанню мясцовых палякаў. Значная колькасць даследчыкаў пачатку XX ст. пісала пра масавыя перасяленні палякаў у Сярэднявеччы на русінскія землі. Этнічныя палякі з'яўляліся ў Вялікім княстве Літоўскім як ваенна-служылая (XII

[7] **Jakubowski J. Studia nad stosunkami społeczno-gospodarczymi na Litwie przed Unią Lubelską. Warszawa 1912. S. 6.**

—XIV стст.), а пасля Люблінскай уніі распачалася добраахвотная міграцыя на неасвоеныя землі княства. Асобнае месца ў гістарыяграфіі займала тэма польскай культуры ва Украіне, прысутнасці і звязаны з ёй працэс паланізацыі. Сцвярджэнне тэзісу літоўскае і беларускае гістарыяграфіі пра прымусовае апалячванне эліты ВКЛ польская гістарыяграфія адмаўляе, лічачы тэзіс добраахвотнае самапаланізацыі. Польскія даследчыкі рабілі вывад пра значную польскую прысутнасць у княстве, зазначаючы вялікую ролю польскага элементу ў культурным жыцці, што павінна было пацвярджацца і на гэтую тэрыторыю.

Трэба заўважыць, што тэзіс пра масавыя перасяленні палякаў у Сярэднія вякі на беларускія і літоўскія землі быў ужо даўно адкінуты польскай гістарыяграфіяй (хаця яго даволі можна сустрэць у тэкстах беларускіх палякаў), а вось тэзіс пра добраахвотную паланізацыю шляхты Вялікага Княства ўжываецца ў ёй сваю значнасць.

*Улада.* Сутнасць улады ў Вялікім Княстве, з пункту гледжання польскіх гісторыкаў, адлюстравана ў тым, як яны яго называлі, — Літоўская дзяржава. Літоўскае этнічнае панаванне звязвалася і з дамінаваннем дэмаграфічным, генеалогіяй і, нарэшце, з цывілізацыйнай маладосцю літоўцаў у параўнанні са славянамі (Г. Лаўмянскі). Такое апісанне сутнасці улады, аднак, характэрна толькі для першага, даўнейшага перыяду існавання Княства[10]. Унія значыла стварэнне палітычнага і вайсковага саюзу, што непазбежна змяняла характар “чыста” дзяржаўнае ўлады. Пытанне пра тое, чым была “унія” — федэратыўным утварэннем альбо практычна адзінай дзяржаваю, — было дыскусійным, аднак бясспрэчным з’яўляецца тое, што з гэтага часу ўлада ў Вялікім Княстве ставіцца польскай палітычнай (шляхецкай) нацыі, заснаванай на адданасці рэспубліканскім свабодам і супольнай шляхце[11]. Адпаведна змянялася і сутнасць улады — будучы спачатку палітычна польскай, яна паступова стала польскай у “нацыянальным” сэнсе. Акрамя таго, значная колькасць польскіх даследчыкаў не адрознівала феномену Княства палітычнае нацыі Сярэднявечча і сучаснай для іх польскай нацыі, пабудаванай на лінгва-культурных прынцыпах. Тое, што на пачатку было этнічна літоўскай дзяржаўнасцю, хутка стала “нацыянальна” польскай і такой заставалася да самага канца

8 Łowmiański H. Uwagi w sprawie podłoża społecznego i gospodarczego unii Jagiellońskiej // Księga pamiątkowa ku uczczeniu 1-ej rocznicy wydania 1-go Statutu litewskiego. Wilno. 1935. S. 247.

9 Свяжынскі А. Пачатак і сацыяльны фенамен // Беларускі гістарычны часопіс. 2000. № 1. С. 154–155.

XVIII ст. — натуральна, што размова пра ВКЛ як форму дзяржаўнасці русінаў не вялася.

Змест польскае гістарычнае веды пра Вялікае княства Літоўскае меў дзве асновы: гістарыяграфічную традыцыю, якая практычна не перарывалася з Сярэднявечча, і прынцып выцяснення русінскага элементу. Гэта ў значнай ступені прадвызначыла яе лёс: традыцыя забяспечыла навуковую легітымнасць, сублімацыя русінскага элементу — жыццяздольнасць у розных палітычных кантэкстах.

Польская гістарычная веда пра ВКЛ была хутка адаптавана літоўскім нацыянальным рухам і стала важнаю часткаю літоўскай нацыянальный гістарыяграфіі. Неўзабаве стратэгія польскае традыцыі, накіраваная на сублімацыю русінскага элементу, была перанята савецкай гістарыяграфіяй, калі паўстала палітычная неабходнасць прымяншаць беларускую традыцыю дзяржаўнасці, у якой Вялікае Княства займала цэнтральнае месца.

І апошняе: польская традыцыя апісання Вялікага княства Літоўскага з усіх гістарыяграфій рэгіёну найбольш схільна ігнараваць беларускі элемент Вялікага Княства. Калі для літоўскіх даследчыкаў вызначэнне культурных і палітычных межаў з беларусамі з'яўляецца сталаю праблемаю, а для савецкае гістарыяграфіі тэма "прыгнёту беларусаў і ўкраінцаў" была ці не цэнтральнай, для палякаў часта дастаткова азначэння ВКЛ як літоўскае (літоўска-польскае) дзяржавы, што дазваляе ў большасці выпадкаў успрымаць беларусаў толькі як фон.

**[10] Пытанне пра тое, з якой Уніі (Крэўскай, Гарадзельскай ці Люблінскай) пачаўся "зрух улады", было дыскусійным.**

[11] **Валіцкі А. Інтэлектуальныя эліты і зьменлівы лёс “вымысьленае нацыі” ў Польшчы // Фрагмэнты. №7. С.159.**

**Літоўска-Руская дзяржава: расійская традыцыя (другая палова XIX — пачатак XX ст.)**

Падкрэсленая нелаяльнасць палякаў і шляхты былога ВКЛ да Расійскай імперыі, што выявілася ў вайне 1812 г., паўстаннях 1830—31 і 1863—64 гг., значна паскорыла працэс стварэння альтэрнатыўнае *расійскае* веды пра мінулае Вялікага княства Літоўскага. Стратэгія расійскіх даследчыкаў была тут цалкам супрацьлеглая: яны грунтаваліся не на польскай гістарыяграфічнай традыцыі, а на ўласна русінскіх гістарычных дакументах. Агульнай стратэгіяй было максімізаваць ролю русінскага (рускага) пачатку ў ВКЛ і ролю русінаў у палітычным і культурным жыцці гэтай краіны. Новая гістарычная веда была часткай стратэгіі ў асваенні тэрыторыі, якая некалькі стагоддзяў здавалася спрадвечна польскай, і павінна была дэлегітымізаваць польскія прэтэнзіі на спадчыну Вялікага Княства. Гэтая трансфармацыя, якая пачалася на павароце ад XVIII да XIX стагоддзя і канчаткова аформілася ў другой палове XIX стагоддзя, адкрывала дарогу мноству іншых зменаў у бачанні гісторыі Беларусі і Літвы, якія з гэтага часу набываюць зусім іншы “нацыянальны” характар дзяржаўнае традыцыі.

Вялікае княства Літоўскае перастае быць польскаю (літоўска-польскаю) дзяржаваю і становіцца “Литовско-Русским государством”. Назва “Літоўска-Руская дзяржава” вызначае не столькі нацыянальны характар Княства (кшталту “беларуска-літоўская дзяржава” ў сучаснай айчыннай гістарыяграфіі), але яго афіцыйную назву, эквівалентную назве “Вялікае княства Літоўскае”. Легітымацыя такога наймення знаходзілася ў поўнай афіцыйнай назве дзяржавы: “Вялікае княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае”. Назіралася таксама тэндэнцыя, якая пазней будзе цалкам перанята беларускай гістарыяграфіяй,

ужываць назву “Вялікае княства Літоўскае” замест дамінантнага ў польскім навуковым звароце “Літоўская Дзяржава”[12].

У адпаведнасці са сваімі навуковымі і палітычнымі мэтамі расійская гістарыяграфія распрацавала новую інтэрпрэтацыю прынцыпаў вызначэння *прыналежнасці* Вялікага Княства.

*Генеалогія.* Ужо адзін з першых расійскіх гісторыкаў ВКЛ У. Антановіч падкрэсліваў шчыльнае ўзаемадзеянне паміж русінскім і літоўскім элементамі пры ўзнікненні Вялікага Княства. Менавіта з Руссю ён звязваў палітычную і вайсковую моц, што дазволіла Міндоўгу авалодаць усёй Літвою і стаць паўнаўладным гаспадаром[13]. Іншы буйны даследчык М. Дашкевіч паставіў пад сумнеў стэрэатыпную тэзу пра заваёву Наваградку Літвою і вызначыў месца старажытнае Літвы ў вярхоўі Нёману. Самы значны расійскі гісторык ВКЛ пачатку XX ст. М. Любаўскі[14] вызначаў Вялікае княства Літоўскае як тэрытарыяльнае, а не этнічнае ўтварэнне, што дазволіла яму зрабіць вывад пра літоўска-рускае (русінскае) паходжанне дзяржавы[15]. Такім чынам, генеалогія Княства набывала зусім іншы змест, у якім славянскі элемент займаў роўную (калі не дамінантную) з балтамі пазіцыю.

*Прысутнасць.* Для расійскіх даследчыкаў русінскае (а гэта практычна заўсёды значыла рускае, расійскае) дамінаванне ў Вялікім Княстве не падлягала сумневу. Вывады афіцыйнай гісторыкаў пра дэмаграфічную значнасць этнічнага літоўскага элементу не ўспрымаліся сур’ёзна, рускі характар княжацтва дзяржавы падаваўся відавочным і не патрабаваў доўгага аргументацыі. Яшчэ больш упэўненыя пазіцыі расійскай гістарыяграфіі займала ў пытанні вызначэння культурнага характару Княства. Вялікае княства Літоўскае мела прыналежыць ўсходнеславянскую культуру, якая, не маючы балцкай альтэрнатывы, не проста дамінавала, але доўгі час адзінай уплывовай у гэтай дзяржаве. Гэта была культура, дзе развіваліся русінскія літаратура, права, летапісанне, грамадская думка і асвета і, нарэшце, дамінавала старабеларуская мова (у тэрміналогіі расійскіх гісторыкаў — “западнорусский язык”) як мова культуры і ўлады. У прынцыпе, традыцыя вызначала культурны вобраз і характар эпохі, выціскаючы ўсе астатнія культуры на перыферыю. У XVI—XVII стст. пачынаецца працэс заняпаду беларускай

[12] Ужыванне афіцыйнай назвы “Вялікае княства Літоўскае” замест дамінантнага ў польскім навуковым звароце “Літоўская Дзяржава” прыцягнула ўвагу беларускіх гісторыкаў (асабліва ў 60-х гадах XX ст.) і стала прадметам спецыяльнага даследавання.

якая паступова саступае сваю жыццёвую прастору жываторы польскай.

**ўжываюць назву “Статуты Вялікага княства Літоўскага” замест “Літоўскія статуты”.**

**[13] Антонович В. Очерки истории Великого Княжества Литовского до половины XV столетия. Киев, 1878. С.16—18.**

**[14] Вывады Любаўскага адносна гісторыі Вялікага княства Літоўскага захавалі сваё дамінантнае значэнне да канца 20-х гадоў XX ст., калі склалася савецкая гістарычная традыцыя.**

**[15] Любавский**

**М. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского статута. Москва, 1893. С.2—4.**

*Улада.* Новае разуменне генеалогіі, разам з культурным і дэмаграфічным дамінаваннем русінаў, дазволіла пераадолець польскае разуменне ўлады ў Вялікім Княстве і надаць яму прынцыпова іншы сэнс, тым больш што прыкладаў удзелу русінаў у палітычным і вайсковым жыцці Княства было больш чым дастаткова. Улада ў Вялікім Княстве (у першыя стагоддзі яго існавання) інтэрпрэтавалася як літоўска-руская, заснаваная на перманентнай барацьбе літоўскага і рускага элементаў за ўладу (М. Антановіч)[16]. М. Любаўскі звяртаў увагу на тое, што сам факт літоўскае “заваёвы” не можа значыць выключна літоўскага характару дзяржаўнасці, якая, без сумневу, мела літоўска-рускі змест. Расійскія даследчыкі шмат увагі надавалі ўдзелу русінаў у палітычным жыцці краіны, іх ролі ў вызначэнні дзяржаўнае палітыкі і вызначалі іх як адну з супольнасцяў, далучаных да ўлады. Заняпад дзяржаўнасці ВКЛ звязваўся звычайна з каталіцкай экспансіяй, рэлігійнай у 1596 году і прымусоваю паланізацыяй эліты.

Такім чынам, Вялікае Княства — гэта сутнасна літоўска-руская (паступова ўсё больш і больш руская) дзяржава, якая ў выніку знешняе экспансіі стала пераважна польскай, з чаго тыя рабіліся прымальныя для расійскай імперскай улады палітычныя вывады.

Лёс расійскае гістарыяграфіі, як і яе палітычнае характэрнай дастаткова нечаканы. Цягам практычна ўсяго XIX стагоддзя да русінскай і няпольскай традыцыі Вялікага Княства ў расійскім адпавядала імперскай стратэгіі трыадзінага рускага народу.

**[16] Увогуле падкрэсліванне літоўскага і рускага чалавечага супрацьстаяння можна лічыць характэрнай асаблівасцю расійскае гістарычнае**

Але ўжо на пачатку XX ст. гэтая стратэгія дае збой, што ў якасці палітычнага суб'екту фармуецца беларускі нацыянальна-вызваленчы рух, які ў Вялікім Княстве беларуцкім досвед уласнае (аўтаномнае ад Расіі) дзяржаўнасці. У беларускім дыскурсе расійская гістарычная веда пра Вялікае Княства вельмі хутка беларусізуецца, сам назоў дзяржавы змяняецца з літоўска-рускага на літоўска-беларускую, што не супярэчыла гістарычным фактам і дзіўным чынам супадала з палітычнымі інтэнцыямі беларускіх лідэраў.

Цікава, што аўтары канцэпцыі руска-літоўскай дзяржаўнасці сталі настаўнікамі заснавальнікаў нацыянальных беларускіх і ўкраінскіх гістарыяграфій альбо самі прынялі ўдзел у нацыянальна-вызваленчым руху. Так, вучнямі У. Антановіча сталі М. Грушэўскі і М. Доўнар-Запольскі, вучнем М. Любаўскага — У. Пічэта, а М. Дашкевіч сам стаў адным з пачынальнікаў украінскае гістарыяграфіі. У той жа час, частка расійскага грамадства значна больш ахвотна прымала канцэпцыю шматвяковага літоўскага ды польскага панавання ў Беларусі і ва Ўкраіне.

Актуалізацыя русінскай (беларускай) прыроды Вялікага княства Літоўскага ў новых палітычных умовах пачала граць супраць ідэі "ўсходнеславянскага адзінства", таму, калі ў СССР канца 1920-х гадоў ізноў вяртаюцца да ідэі русацэнтрызму, пра адраджэнне старое расійскае гістарыяграфіі размова не ідзе. Новая палітычная рэальнасць патрабавала новае гістарычнае веды, і яна, як гэта ні парадаксальна, была знойдзена ў былым апаненце з яго стратэгіяй сублімацыі і практыкай "прыгнёту" русінскага элементу ў Вялікім княстве Літоўскім.

**Савецкая гістарыяграфія:**
**"рэвалюцыйны" паварот канца 20-х гадоў XX стагоддзя**

Адразу пасля рэвалюцыі 1917 году пачалася эмансіпацыя гістарыяграфіяў нерасійскіх народаў Расійскай імперыі, якая замацоўваецца палітыкай "карэнізацыі" ў СССР 1920-х гадоў. Але ўжо пачынаючы з канца 1920-х сітуацыя хутка мяняецца, савецкая цывілізацыя становіцца русацэнтрычнаю, што карэнным чынам змяняе палітычна-навуковыя стратэгіі. На працягу 1934—1954 гг. была створана па сутнасці антымарксісцкая (нягледзячы на ўсе дэкларацыі) схема інтэрпрэтацыі мінулага нерасійскіх народаў СССР[17], сярод

галоўных прынцыпаў якой можна вылучыць тры:
1) русацэнтрызм, ідэя апекі Расіі над палітычным і культурным развіццём нерасійскіх народаў; 2) гісторыя нерасійскіх народаў ёсць гісторыя прыгнечаных масаў; 3) ацэнка палітычных лідэраў і гістарычных падзеяў ставіцца ў залежнасць выключна ад іх карыснасці для Расіі. Для Беларусі гэта значыла адраджэнне ідэі ўсходнеславянскага адзінства і адмову ад традыцыі несавецкае дзяржаўнасці. Тэрмін "літоўская беларуская дзяржава" для вызначэння Вялікага княства Літоўскага бясследна знікае ў канцы 1920-х. Прынцыповай розніцаю ў палітычных стратэгіях расійскага савецкае гістарыяграфіі было тое, што першая вызначала прыналежнасць земляў Вялікага княства Літоўскага, а вызначэнне іх няпольскасці — гэтага было дастаткова, каб даказаць іх "рускасць". Калі дарэвалюцыйныя імперскія гісторыкі практычна не мелі патрэбы ў рэдукцыі беларускае суб'ектнасці дзеля яе слабасці і палітычнай неакрэсленасці, то для савецкае ж улады гэта стала жыццёвай неабходнасцю. Перад савецкай гістарыяграфіяй стаяла задача ўжо не выяўлення русінскасці Вялікага Княства, але рэдукцыі беларускае нацыянальнае суб'ектнасці, таму досвед Вялікага Княства павінен быў выглядаць як гісторыя "прыгнёту беларускага народу". Парадаксальным чынам у новых палітычных абставінах актуалізацыя польскасці ды неславянскасці Вялікага Княства забяспечвала ўсходнеславянскае адзінства і жыццяздольнасць савецкага русацэнтрызму, пабудаванага на недзяржаўнасці нерасійскіх народаў. Адпаведна змянілася і лексіка: Вялікае Княства зноў пачало называцца Літоўскаю дзяржаваю, а Рэч Паспалітая — Польска-літоўскай, што павінна было выразна адлюстроўваць іх "нацыянальную" сутнасць.

Канон савецкае генеалогіі Вялікага княства Літоўскага канчаткова аформіўся ў працах У. Пашуты, перш за ўсё ў яго манаграфіі "Ўтварэнне Літоўскае дзяржавы", выдадзенай у 1959 годзе. Канцэпцыя, выказаная ў гэтай кнізе, на некалькі дзесяцігоддзяў акрэсліла кірунак развіцця гістарыяграфіі ВКЛ у СССР і яго сатэлітах[18]. Асноўнаю ўласцівасцю савецкага канону генезы Вялікага Княства стала ідэя пра стварэнне аб'яднанае літоўскае дзяржавы яшчэ да захопу земляў Русі. (Тым самым пачала дамінаваць чыста літоўская версія стварэння ВКЛ.)

[17] **Величенко С. Перебудова та минуле нерусских народів // Український історичний журнал. 1992. №4. С.93.**

Палітычны лад Літвы перажыў эвалюцыю ад канфедэрацыі земляў, іх саюзу і нарэшце аформіўся ў раннефеадальную манархію[19].

Савецкая гістарычная навука не адмаўляла дэмаграфічнага дамінавання беларусаў у Вялікім Княстве, але пры гэтым зводзіла іх статус да рэпрэсаванай супольнасці, апантанай неспатольным жаданнем уз'яднацца з Маскоўскай Руссю. Беларуская прысутнасць у ВКЛ была станам маўклівага "фонавага" існавання, а сацыяльная гісторыя беларусаў зводзілася да гісторыі сялянства. Культурная традыцыя беларускага сярэднявечча прызнавалася, але ніколі не выглядала як нешта цэласнае, завершанае і апісвалася ў выглядзе асобных, не звязаных паміж сабою фрагментаў. Савецкая даследчая стратэгія паслядоўна падзяляла этнічныя і культурныя супольнасці Вялікага Княства на "ўладныя" і "падпарадкаваныя" герметычныя класы. Уладныя ўтваралі палітычную прастору Княства, прыгнечаныя — адчужаную ад дзяржавы супольнасць, якая была вымушана развівацца ў чужым і варожым асяроддзі, пад "властью і гнетом" літоўскіх феадалаў.

Яшчэ адной асаблівасцю палітычнае арганізацыі савецкае гістарычнае навукі было існаванне фактычнае забароны на беларускую веду пра Вялікае Княства як *дзяржаву*. Беларускія гісторыкі займаліся вывучэннем толькі сялянаў у ВКЛ, даследаванне ж імі палітычных інстытутаў ВКЛ, яго сацыяльнае структуры і г.д. забаранялася. Вялікае княства Літоўскае проста не магло быць аб'ектам *беларускае* гісторыі ў кантэксце дамінавання ў БССР сялянскай канцэпцыі беларускага нацыя(этна-)генезу і дэкларавання поўнае адсутнасці продкаў беларусаў сярод "паноўных" класаў.

Лёс савецкае гістарычнае веды пра ВКЛ непарыўна звязаны з эвалюцыяй савецкай улады, дзякуючы якой яна і была створана. Ужо напрыканцы 20-х гадоў XX стагоддзя [illegible] крывавая саветызацыя беларускай гістарыяграфіі, [illegible] скончылася прыняццем гістарычнае парадыгмы, [illegible] новай палітычнай сітуацыі. Савецкая дзяржаўная [illegible] блакавала развіццё разнастайнасці канцэпцый [illegible] доўгі час такія канцэпцыі развіваліся толькі ў [illegible] гісторыкаў-эмігрантаў, якія адназначна не прымалі савецкае версіі гісторыі ВКЛ. Распад СССР у значнай ступені пахіснуў

[18] **Краўцевіч А. Стварэнне Вялікага Княства Літоўскага. Rzeszów, 2000. С.55.**

савецкую гістарыяграфічную традыцыю і даў штуршок узнаўленню нацыянальных гістарыяграфій у большасці постсавецкіх краінаў. Тым не менш яе рэшткі захаваліся ў уплыў, у прыватнасці на беларускую афіцыйную гістарычную навуку.

**[19] Пашуто В. Образование Литовского государства. Масква, 1959. С.364.**

**Генеалогія беларусацэнтрычнасці**

Пачынаючы з першай сусветнай вайны, Беларусь, як і ўвесь усходнееўрапейскі рэгіён, зазнае глыбокія палітычныя змены. Традыцыйная веда-пра-мінулае, пабудаваная на польскай дзяржаўнай традыцыі ці русацэнтрычнасці, пачынае занепадаць пад уплывам новай палітычнай сітуацыі. Фармуецца новая веда, якая мае за сваю місію вытвараць, памнажаць, прымушаць да росту нацыянальна-палітычныя рухі. Ідэі адраджэння шматнацыянальнага Вялікага княства Літоўскага ці федэратыўнай Рэчы Паспалітай хутка трансфармуюцца ў палітычную практыку пабудовы монанацыянальных дзяржаваў. Адбываецца фармаванне заснаванай на этна-лінгвістычных прынцыпах нацыянальнай ідэнтычнасці беларусаў, палякаў, літоўцаў ды ўкраінцаў. Менавіта развіццё гэтай ідэнтычнасці становіцца галоўнай палітычнай функцыяй гістарычнае навукі. Палітычная рэвалюцыя значыла рэвалюцыю ў гістарычнай навуцы: пачалося фармаванне незалежнай ад суседніх нацыянальных традыцыяў беларускае веды пра Вялікае Княства. Палітычным “целам” новае-старое веды стаў нацыянальна-вызваленчы рух, які паслядоўна рэпрэсаваўся ўладамі Польшчы і СССР.

Не атрымаўшы палітычнай легітымацыі, погляд на Вялікае Княства як беларускую дзяржаву сутыкнуўся з шэрагам палітычных праблемаў. Пэўным чынам ён здолеў праіснаваць у БССР да канца 1920-х і ў Польшчы да 1939 году, але пасля меў магчымасць развівацца толькі на эміграцыі[20]. Узнаўленне беларускае гістарычнае веды пра Вялікае княства Літоўскае стала зноў магчымым толькі з распадам савецкае палітычнае сістэмы.

Беларуская версія гісторыі Вялікага Княства на пачатку XX ст. зыходзіла з расійскай традыцыі, з яе практыкай дэканструкцыі польскасці і актуалізацыяй русінскасці (у новай тэрміналогіі —

беларускасці) гэтай дзяржавы. Можна казаць пра фармаванне на пачатку XX ст. пераходнай, расійска-беларускай версіі развіцця Вялікага Княства, найбольш паказальным прыкладам якой з'яўляецца "Кароткая гісторыя Беларусі" В. Ластоўскага, выдадзеная ў Вільні ў 1910 годзе[21]. В. Ластоўскі, яшчэ моцна звязаны ў сваім наратыве з расійскай гістарыяграфічнай традыцыяй і тэрміналогіяй, апавядае пра літоўскіх князёў (а не пра літоўска-беларускіх князёў ці князёў ВКЛ), літоўскую дзяржаву, літоўскае войска, хаця і ўкладае ў слова Літва не этнічнае, але тэрытарыяльна-гістарычнае значэнне. Вялікае Княства В. Ластоўскі называе ў рэчышчы расійскай традыцыі *Літоўска-Рускім гасударствам*[22]; толькі зрэдку сустракаюцца азначэнні кшталту "літоўска-беларускія баяры, паслы" і г.д. Пасля краху Расійскай імперыі адбываецца вызваленне беларускае гістарыяграфіі ад расійскае традыцыі. "Агульнасці дзяржаўнасці Беларусі" М. Доўнара-Запольскага, "Кароткія нарысы гісторыі Беларусі" У. Ігнатоўскага (абедзве кнігі ўпершыню выдадзены ў 1919 г.) маюць цалкам іншую тэрміналогію, а разам з тым і палітычна-сімвалічную арганізацыю, якая выразна кантрастуе з "Гісторыяй" В. Ластоўскага[23]. Вялікае княства Літоўскае называецца "Літоўска-Беларускім гаспадарствам", "Літвой і Беларуссю", у тэкстах ідзе размова пра літоўска-беларускае войска, літоўска-беларускіх магнатаў ды князёў і г.д. Такая тэрміналогія захоўваецца да канца 1920-х гадоў.

[20] **Поўны рост актыўнасці прадуктавання ведкі пра ВКЛ як беларускую дзяржаву назіраецца ў 1940-я гады падчас нямецкай акупацыі.**

[21] **Гэта быў**

першы агляд гісторыі Беларусі на беларускай мове.

[22] Само ўжыванне тэрміну “гасударства” (не дзяржава альбо гаспадарства) добра адлюстроўвае пераходнасць наратыву В.Ластоўскага ад расійскай да беларускай традыцыі.

[23] Нягледзячы на тое, што Ігнатоўскі некалькі “паніжае” беларускую ролю ў стварэнні ВКЛ.

Адбываецца і паступовая “беларусізацыя” генеалогіі Вялікага Княства. Яшчэ В. Ластоўскі гаварыў пра змяшанае этнічнае беларуска-літоўскае паходжанне насельнікаў старажытнай Літвы[24] і што менавіта полацкія князі-выгнанцы далі пачатак літоўскай дзяржаве, якую, зыходзячы з нацыянальнасці яе жыхароў, трэба называць Літоўска-Крывічанскай або Літоўска-Рускай[25]. У сваю чаргу М. Доўнар-Запольскі адмаўляў тое, што беларускія землі былі заваяваны літоўскімі князямі[26], і сцвярджаў, што ад свайго пачатку Вялікае княства Літоўскае было літоўска-беларускай дзяржавай.

Тое, што беларусы не толькі спрычыніліся да стварэння, але і занялі ў новай дзяржаве дамінантныя пазіцыі, што яны складалі большасць насельніцтва, прысутнічалі ў дзяржаўным апараце і ад пачатку абумоўлівалі палітычную практыку Вялікага княства (натуральна, не толькі як прыгнечаныя сяляне), — усё гэта для беларускіх гісторыкаў таксама не выклікала сумневу. Асаблівая ўвага надавалася літоўскіх старабеларускае культурнае традыцыі Вялікага Княства — у прыватнасці, М. Доўнар-Запольскі сцвярджаў, што старабеларуская мова была не толькі моваю спрактыкаванага, але і гутарковай нават для этнічных балтаў[27]. У такіх поглядах нават пэўнае “паніжэнне” пазіцыяў В. Ластоўскага У. Ігнатоўскім (апошні прытрымліваўся канцэпцыі Русі Літвою) не запярэчвала беларускае (літоўска-беларускае) сутнасці Вялікага Княства.

Наступным лагічным крокам стала афармленне беларусацэнтрычнае парадыгмы стварэння і развіцця Вялікага Княства, якая, з аднаго боку, была вельмі патрэбная беларускаму нацыянальна-вызваленчаму руху, але, значыла толькі больш паслядоўную “беларусізацыю” гістарычных традыцыяў. Беларусацэнтрычная версія гісторыі Вялікага Княства стваралася ў 1930—1940-я гады, калі беларускі нацыянальны рух перажываў не найлепшыя часы, гісторыкам М. Шкялёнкам і папулярным лінгвістам Я. Станкевічам (у папулярызаванай форме). Зборнікі гістарычных твораў абодвух былі нядаўна выдадзены асобнымі кнігамі[28].

У новай гістарычнай парадыгме генеалогія Вялікага княства Літоўскага ад самага пачатку мела беларускую прыроду. М. Шкялёнак[29] вызначыў князя Міндоўга як гаспадара

[24] **Ластоўскі В. Кароткая гісторыя Беларусі. Мінск, 1992. С. 11.**

[25] **Адпаведна, дынастыя вялікіх князёў літоўскіх Кейстутавічы — у разглядацца як вядомая полацкае княскае дынастыі Русі**

[26] **Доўнар-Запольскі М. Асновы дзяржаўнасці Беларусі. Мінск, 1994. С. 9.**

крывіцкага княства, якое пазней пачало экспансію на ўсход, поўнач і поўдзень, прычым крывіцкія землі далучаліся да новай дзяржавы добраахвотна, а жмудскія — сілаю. Дынастыю вялікіх князёў М. Шкялёнак назваў балцка-полацкай з паходжання, іх балцкі элемент меў мясцовае, субстратнае паходжанне, таксама як і чынам не звязанае з жмудзінамі (продкамі літоўцаў).

Я. Станкевіч займаў яшчэ больш радыкальную пазіцыю[30] — прычыну стварэння Вялікага Княства ён бачыў у імкненні да аб'яднання беларускіх земляў. З пункту гледжання этнічнага паходжання ён лічыў ВКЛ "гаспадарствам крывіцка(беларуска)-лятувіскім", але з таго гледзішча, хто гэтае гаспадарства стварыў, які яно насіла нацыянальны характар, было яно толькі крывіцкім (беларускім)[31]. Я. Станкевіч таксама называў Міндоўга беларускім князем і бачыў у Наваградскай зямлі асяродак, з якога пачалося пашырэнне новае дзяржавы.

У якасці дадатковае аргументацыі на карысць беларускае генеалогіі ВКЛ Я. Станкевіч называў знаходжанне сталіцы Княства ў "крывіцкім" горадзе Вільні, славянскае паходжанне гербу "Пагоня", ужыванне беларускай дзяржаўнай і палітычнай тэрміналогіі.

Так ствараласа сіметрычна супрацьлеглая савецкай версіі канцэпцыя генезісу Вялікага Княства, якая канчаткова аформілася ў 1950-х гадах у творах У. Пашуты. Згодна з ёй, сутнасць улады таксама была беларуская, бо менавіта інтарэсы беларускіх земляў былі асновай палітыкі вялікіх князёў літоўскіх (беларускіх). З гэтае прычыны М. Шкялёнак прапаноўваў лічыць нацыянальнымі героямі не Свідрыгайлу ды Казакаў, а тых, хто з імі змагаўся, адстойваючы ідэалы беларускай дзяржавы, — Жыгімонта I і Яна Радзівіла III. Ён таксама падкрэсліваў, што гаспадарамі беларускіх земляў былі не польскія каралі, але вялікія князі літоўскія (беларускія)[32]. Я. Станкевіч для вызначэння беларускасці ўлады ў ВКЛ апеляваў да панавання беларускага элемента, ўспрымання беларусамі гэтае дзяржавы як сваёй. У 1960-х гадах ён вырашыў, што "беларускі" (вялікалітоўскі) перыяд ВКЛ павінен быў стаць асновай нацыянальнай ідэалогіі і прапанаваў перайменаваць Беларусь у "Вялікалітоўскую".

[27] **Там самае.**

[28] **Шкялёнак М. Беларусь і суседзі. Гістарычныя нарысы. Беласток, 2003.**

[29] **Гістарычная Станкевіч Я. Гістарычныя творы. Менск, 2003.**

спадчына М.Шкялёнка досыць вялікая, але цэнтральнае месца займае серыя артыкулаў “Да мэтадалёгіі гісторыі Беларусі”, якая была надрукавана ў газеце “Раніца” ў 1942—1943 гг.

30 Адмаўляючы назву “Беларусь” як каланіяльную, ён імкнуўся замяніць яе квазігістарычным назовам “Крыўя”, “Крывія”.

31 Станкевіч Я. Цыт. выд. С.145.

**[32] Шкялёнак М. Цыт. выд. С.143.**

**Літоўская гістарыяграфія**

Для грамадства, ідэнтычнасць членаў якога заснаваная на этналінгвістычных прынцыпах — а менавіта такой была абвешчаная ў 1917 годзе Літоўская Рэспубліка, — вялікае значэнне мае этнічная аснова ўласнае палітычнае традыцыі. Нягледзячы на пэўны інтарэс літоўскага нацыянальнага руху да ідэі шматнацыянальнага Вялікага княства Літоўскага, у аснову ідэі новае літоўскае дзяржаўнасці была пакладзена этналінгвістычная супольнасць. У адпаведнасці з гэтай дзяржаўнай ідэяй склалася новая гістарыяграфія, пакліканая ачысціць палітычную традыцыю ВКЛ ад славянскіх (перш за ўсё русінскіх) элементаў.

Сітуацыя для літоўскай гістарыяграфіі значна палягчалася тым, што літоўскае дамінаванне ў ВКЛ у польскай гістарыяграфіі

было ў той час калі не догмай, то пашыраным уяўленнем. Як бясспрэчная гістарычная веда прымалася формула, лаканічна сфармуляваная Г. Лаўмянскім у 1935 годзе: “Паноўнай [у Вялікім Княстве] была этнічная літоўская супольнасць, і яе належыць ідэнтыфікаваць з дзяржаваю; у яе руках знаходзілася палітыка, а яе інтарэсы былі для вызначэння палітыкі вызначальнымі”. Гэтая формула як найлепш падыходзіла да нацыянальнае літоўскае дзяржавы, фармулюючы ўсю сутнасць разумення *ўлады* ў ВКЛ. Улада была *этнічна* літоўская, палітыка ажыццяўлялася ў імя этнічных літоўцаў, русінскі элемент — толькі рэсурс для літоўскага этнічнага дамінавання. Натуральна, што русінскія землі былі захоплены літоўцамі, а дынастыя літоўскіх князёў мела балцкае паходжанне. Дзякуючы таму, што ў час далучэння Літвы да СССР у 1940 годзе савецкая гістарыяграфія прызнавала выключна літоўскі характар Вялікага княства Літоўскага, гэтая версія веды пра мінулае практычна без зменаў праіснавала да аднаўлення незалежнасці Літвы ў пачатку 1990-х.
Яе важнай уласцівасцю трэба лічыць ацэнку літоўскімі гісторыкамі этнічнага літоўскага элементу ў ВКЛ не менш за 1/3 ад агульнага складу насельніцтва. Заснаванне Вялікага Княства літоўскім этнічным элементам таксама не выклікала ў іх сумневу (асабліва прыдатнай была савецкая версія генезісу ВКЛ), спробы некаторых даследчыкаў змясціць Літву ў вярхоўі Нёмана нічога не мянялі, бо гэта тэрыторыя прызнавалася этнаграфічна літоўскай.

Троху іншай была рэцэпцыя гісторыі пасля 1596 году. Тут польская гістарычная веда разыходзілася з палітычнымі патрабаваннямі творцаў новае літоўскае ідэнтычнасці. Найперш літоўскія гісторыкі не прымалі ўнітарнай інтэрпрэтацыі Рэчы Паспалітай, калі федэратыўны характар гэтае дзяржавы або ігнараваўся, а яна сама атаясамлівалася з Польшчай, або сцвярджалася страта ВКЛ сваёй дзяржаўнасці пасля Уніі 1569 году, бо нібыта ад 1569 году польска-літоўская дзяржава ўяўляла сабой адно цэлае[33]. Літоўскія гісторыкі зазначалі аўтаномны характар развіцця ВКЛ пасля Уніі 1569 году і паслядоўна апелявалі да традыцыі “ліцвінскага сепаратызму”, які красаваў нават у сярэдзіне XVIII ст. і чыя традыцыя дапамагала падоўжыць гісторыю літоўскае

дзяржаўнасці на некалькі стагоддзяў.

Літоўская гістарыяграфія негатыўна ставілася да рэвалюцыі польскай палітычнай нацыі і бачыла ў ёй сродак паланізацыі эліты Вялікага Княства, самі палякі ў ёй практычна на працягу ўсяго XX ст. трактаваліся як чужая і варожая сіла. Паланізацыя, адпаведна, насіла прымусовы і агрэсіўны характар. Пры інтэрпрэтацыі культурнае спадчыны Вялікага Княства літоўскія гісторыкі схільны называць усё гісторыкае літоўскім. Само Вялікае Княства вызначалася як шматкультурная і шматнацыянальная, але не як шматпалітычная дзяржава, і ўсе этнасы ў ім, акрамя літоўскага, разглядаліся як нацыянальныя “меншасці”[35]. У адпаведнасці з гэтым літоўская дзяржава выступала апякункай і фундатаркай русінскае культурнае традыцыі, якая здолела развіцца толькі дзякуючы гэтай спрыяльнай палітыцы. Што тычыцца старабеларускае мовы, то яе прынята называць “gudų kanceliarinė kalba” (русінская канцылярскаая мова), “senoji slavų kalba” (стараславянская мова) ці “kanceliarinė slavų kalba” (канцылярская славянская мова)[36]. Найбольш распаўсюджаныя апошнія два варыянты зводзяць яе да безасабовага lingua franca кшталту лаціны.

Яшчэ адной прыкметаю літоўскае гістарыяграфіі з’яўляецца яе “дзяржавацэнтрычнасць”, што праяўляецца ў інтэграцыі гісторыі этнасу (нацыі) і гісторыі дзяржаўнасці[37]. З маляўнічых звязана ўстойлівае атаесамленне паняткаў Літвы і Вялікага княства Літоўскага. Такая моцная сувязь гісторыі з інстытутам дзяржавы з’явілася ў пачатку XX ст. і, напэўна, генетычна ўзыходзіць да польскае гістарыяграфіі ВКЛ.

Увогуле гісторыя Літвы выглядае наступным чынам: Старажытная Літва — Вялікае княства Літоўскае (XIII—XVIII стст.) — этнаграфічная Літва (куды ўключана паўночна-заходняя частка Беларусі разам з Гародняй) у складзе Расіі — незалежная Літва 1917—1940 гг. — Літоўская СССР — сучасная Літоўская Рэспубліка. Усе пералічаныя дзяржаўныя і тэрытарыяльныя ўтварэнні з’яўляюцца такімі ж літоўскімі, як і сучасная Літоўская Рэспубліка.

[33] **Бардах Ю. Кравец Люблін. З праблемаў польска-літоўскае уніі // Штудыі з гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Менск, 2002. С. 68.**

[34] **Смалянчук А. Цыт. выд. С. 149.**

[35] **Нацыянальныя меншасці ў адпаведнасці са сваім**

**статусам, а не колькасцю.**

**[36] Гл., у прыватнасці: Антонаў А. Беларусь і беларусы ў літоўскіх школьных падручніках гісторыі // Беларускі гістарычны агляд. Т.8. 2001. Снежань.**

**[37] Гэта сітуацыя выразна адрозніваецца ад беларускай, бо для беларускай гістарыяграфіі гісторыя — гэта перш за ўсё гісторыя "народу".**

**[38] Нацыянальная прыналежнасць у такім выпадку размываецца, і ВКЛ ці яўстае як беларуска-**

**Вялікае княства Літоўскае і палітычная рэальнасць**

Вялікае княства Літоўскае знікла з палітычнае мапы Еўропы ў канцы XVIII ст., але яго палітычная гісторыя на практыцы не скончылася, у канцы 80-х г. XX стагоддзя яно зазнала сапраўднае адраджэнне свайго палітычнага капіталу. "Адраджэнне" памяці пра Вялікае Княства стала адным з сродкам разбурэння беларускае савецкае ідэнтычнасці і займала значную ролю ў аргументацыі нацыянальна-

канца 1980-х — пачатку 1990-х. Практычна ўся **польская** сімволіка беларускага нацыянальнага руху, ад гісторыі “Пагоні” да бітвы пад Оршаю, так ці інакш была ўгрунтавана на гістарычны досвед Вялікага Княства. Гісторыя як сродак атрымання веды-пра-мінулае заўсёды адлюстроўвае “дух эпохі”, але робіць гэта ў субяктыўнай і часта непазнавальным выглядзе. Як і любая навука, яна дзяржава праўды і гэтым прымушае пэўным чынам маскаваць уласную палітычную прыроду.

**ўкраінска-расійска-габрэйска-… і так**

**званая бясконцасці дзяржава**

Вялікае княства Літоўскае як гістарычны вобраз, што мы ўжо зазначалі, было элементам палітычнае свядомасці і эвалюцыянавала разам з ёй. У часы польска-расійскага супрацьстаяння Вялікае Княства паўставала як арэна бясконцае барацьбы каталікоў і праваслаўных. Цяпер, калі палітычным стандартам стала талерантнасць, у палітычнай гісторыі ВКЛ шукаюць і знаходзяць эталон рэлігійнае цярпімасці. У першай палове XX ст., калі паўставалі нацыянальныя рухі і ім неабходна была сцвердзіць сваю самастойнасць, дзяржаўнасць і нават “імперскасць” (што дадавала нацыянальнаму руху гонару), фармаванне Вялікага Княства выглядала як шэраг заваёваў і гвалтоўных экспансіяў, вайны за жыццёвую прастору. Калі ж палітычныя адносіны паміж краінамі стабілізаваліся і канфрантацыя змянілася размовамі пра еўрапейскую інтэграцыю ды добрасуседства, пачалі пашырацца канцэпцыі сінтэзу, сімбіёзу, згоды ды ўзаемнай выгады як асновы існавання Вялікага княства Літоўскага.

Разам з палітычнай модай на мультыкультуралізм з’яўляюцца канцэпцыі Вялікага княства як ідэальнай шматкультурнай дзяржавы Сярэднявечча[38]. Асаблівую ўвагу звяртаюць на дэмакратычную традыцыю Вялікага Княства, якая на пачатку XX ст. успрымалася хутчэй як “шляхецкае бязладдзе”. Вобраз Вялікага Княства быў заўсёды розны і заўсёды адлюстроўваў “дух часу” ці “дух прасторы”, якія яго стваралі.

Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае мы ведаем як Літоўскую, Літоўска-Рускую, Літоўска-Беларускую, беларуска-літоўскую і, нарэшце, беларускую дзяржаву. Кожны з адзначаных вобразаў Вялікага Княства адсылае да ўласнага палітычнага кантэксту і гістарычнага навуковага канону. Мы паспрабавалі глыбей зразумець гэтае адрозненне, але ні ў якім разе не вырашыць, наколькі яно правамерна. На гэтым шляху ў

нас стаіць разуменне гісторыі як веды палітычнай, дакладней — палітычна значнай. Няма палітычных практык — няма і кагнітыўных. На жаль, на працягу ўсяго свайго развіцця гістарычная навука значна больш залежала ад геапалітычнага ландшафту сучаснасці, чым ад фактаў мінулага, якія яна даследуе.

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **2003/12/14**
[image]

# Даніла Жукоўскі Ерусалімскі лёс

**ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ (нар. у 1969 у Горадні) — публіцыст, крытык літаратуры. Выпускнік Ленінградзкага тэхналягічнага інстытуту імя Ленсавету. Сталы аўтар “ARCHE”. Апошняя публікацыя ў часопісе — “Погляд сьпераду і погляд ззаду” (№3 за 2002 г.).**

Выданні, якія абмяркоўваюцца ў артыкуле:

Tomas Venclova. Wilno. Przewodnik.
— Vilnius: R. Paknio leidykla, 2002.

Tomas Venclova. Eseje. Publicystyka.
— Sejny: Pogranicze, 2001.

Jurgis Kunčinas. Tula.
— Sejny: Pogranicze, 2002.

Los Wilnianina w XX wieku.
— Wilno: Wydawnictwo polskie w Wilnie, 2002.

Ёсць гэткі стэрэатып пра апошнюю вайну, быццам праўда пра яе ўсё яшчэ не выказаная. Хутчэй за ўсё, гэта насамрэч так: вайна занадта страшная, каб існавала праўда пра яе, бо праўда ёсць форма ісціны, з якой грамадства ў стане пагадзіцца, а пагадзіцца з сусветнаю вайною сучаснае грамадства, на шчасце, не ў стане.

У гэтым сэнсе Вільні пашанцавала больш: праўда пра гэты горад, хай сабе ў завуаляванай форме, знайшла ўвасабленне ў метафарычным выразе “Літоўскі Ерусалім”. Паўстаўшы недзе ў васемнаццатым стагоддзі як увасабленне росквіту габрэйскага

рэлігійнага жыцця на землях ВКЛ, не ў апошнюю чаргу дзякуючы постаці віленскага Гаона, алегорыя, што залатой ніткаю праходзіць праз знакаміты “Przewodnik” Томаса Венцлавы, давяла з часам сваю ўніверсальнасць для ўсіх насельнікаў краю.
Ганаровая назва — прыгожа, прыемна, паліткарэктна! Калі, аднак, не быць загадзя запраграмаваным адно на пошук міжнацыянальнай згоды й гармоніі, метафара ўспрымаецца не толькі як сімвал мультыкультурнага росквіту. Вызначэнне Вільні як фокусу духоўных памкненняў шматлікіх народаў адначасна падкрэслівае падабенства з Ерусалімам у іншым: горад над Вяллёй ёсць сэрцам невырашальнай культурнай праблемы. Вільня й Віленшчына адыгрываюць немалую ролю ў міфалогіі нацыянальнай дзяржаўнасці палякаў, беларусаў і летувісаў. Але ж сакральны статус Ерусаліму таксама мае і зямное, палітычнае вымярэнне.

Дзве асаблівасці Венцлавага “Przewodnika” гавораць на карысць таго, што праблематыка лёсу Віленшчыны жывая, нягледзячы на гучныя заявы палітыкаў пра ейную вычарпанасць. Першая асаблівасць шматлікімі фактамі размывае грунт пад монаэтнічна летувіскім вобразам Вільні, другая паказвае, што гэткая непрыемная для патрыёта Летувы рэч не засталася па-за ўвагаю аўтара.
Сумленны й закаханы ў Вільню даследчык міжвольна выяўляе мізэрную прысутнасць у яе культурнай гісторыі ейных цяперашніх гаспадароў. Кніга поўніцца прозвішчамі выдатных дзеячоў выразна славянскага паходжання, без якіх культурная гісторыя гораду проста немагчымая. Праглядаючы, дзякуючы выдатным ілюстрацыям (высокай якасці паліграфія ды майстэрства фатографаў не пакінуць абыякавым анікога) і празрыстаму, дакладнаму тэксту, дом за домам, вуліцу за вуліцаю, чытач увачавідкі бачыць горад у чатырохмернай прасторы-часе. Час матэрыялізуецца ў прозвішчах, падзеях, архітэктурных дэталях будынкаў… Хто ж вінаваты, што сучасная Вільня — а пад гэтым словам тут трэба разумець ці не ўсё ХХ стагоддзе — нагадвае плямы бензіну на паверхні любай сэрцу аўтара старажытнай крыніцы? І хто вінаваты, што летувіскі складнік гораду ледзьве не цалкам апынаецца ці то на самым дне, у муле далёкіх дахрысціянскіх стагоддзяў, ці то

ў гэтых нешматлікіх плямах на паверхні!
Другое — Венцлава старанна мінімізуе беларускую прысутнасць у горадзе і ўсяляк падмацоўвае тэзу, згодна з якой летувіская нацыя на галаву апярэджвала ў развіцці нацыю беларускую, а беларускі нацыянальны рух ствараўся пазней за летувіскі і на ягоны ўзор. Дарэчы, Францішак Скарына тут фігуруе як бацька беларускае літаратуры, быццам прафесар філалогіі ніколі не чуў пра, прыкладам, Кірылу Тураўскага.
І ўжо зусім натуральнаю можна лічыць традыцыйную гульню, калі словы “Litwa”, “litewski” ўжываюцца гэтак, быццам іх значэнні сёння й тры—чатыры стагоддзі таму абсалютна аднолькавыя.
Гэтыя, відавочна, палітычна матываваныя памылкі і недакладнасці сведчаць, што калі Венцлава не ўспрымае ўсур’ёз “польскай пагрозы” для дзяржаўнага быту Літвы, то беларуская, скажам асцярожна, неабыякавасць да сталіцы ВКЛ была б для яго лагічным вынікам развіцця беларускай дзяржаўнасці (пры ўмове, дадамо, што гэтае развіццё адбудзецца). Стрыманасць і нацяжкі Венцлавы ў асвятленні беларускага жыцця ў Вільні могуць быць нават крыніцаю аптымізму: у нашу здольнасць стварыць краіну вераць нашы суседзі.
Але беларуская тэма сапраўды займае нязначнае месца, чаго не скажаш пра тэму польскую. Пазіцыю Венцлавы ў гэтым пытанні можна з пэўнымі засцярогамі пазначыць як баэцыянскую. Праваабаронца й чалец Хельсінскае групы Томас Венцлава парадаксальна паўстае ў сваіх тэкстах як *чалавек Імперыі*. Перш за ўсё гэта тычыцца тому публіцыстыкі, які змяшчае артыкулы 1979—1998 гадоў, але адчуваецца й на старонках “Przewodnika”.
Венцлава горача бароніць права суседніх нацый карыстаць з таго культурнага багацця, якое са знікненнем СССР і набыццём ягонай радзімай незалежнасці ён ужо не мог без засцярогаў лічыць сваім уласным. Ён усяляк пратэстуе супраць праяваў нацыянальнае абмежаванасці, пыхі, аўтаркіі, самазакаханасці. Ён не жадае адмаўляцца ад карыстання высокімі дасягненнямі польскае ці расейскае культуры, не цешаць яго (хутчэй раз’юшваюць) нязграбныя нацыяналістычныя міфы пра добрых летувісаў, якім увесь час шкодзілі дрэнныя суседзі (“Пра праблему летувіскага стэрэатыпу”), ці спробы летувіскіх

палітыкаў апраўдаць кожны свой крок (“Сакралізацыя памылак”).
Іншая справа, што, у адрозненне ад Баэцыя, Венцлаву лучаць з гаспадарамі віленскіх пагоркаў этнічныя сувязі, моц і натуральнасць якіх ён аніколі не ставіць пад сумнеў. І таму, нягледзячы на сваё захапленне высокай культурай цывілізацыі, якая існавала ў Вільні да палітычных і этнічных зменаў, што прынесла XX стагоддзе, Венцлава вітае культурную эмансіпацыю Вільні ад магутнай польскай культуры.
У “Przewodniku” гэта асабліва заўважаецца ў ягонай зачараванасці словам *гатычны*: прапорцыя да слова “барочны” выразна не адпавядае прысутнасці гэтых стыляў у архітэктурным абліччы гораду. Готыка тут — сімвал велічы Вільні далёкага перадунійнага часу, пазнака глыбіні традыцыяў еўрапейскасці, што сягаюць у часы цалкам самастойнага палітычнага існавання. Як бачым, ізноў пошук “залатога веку”.
У сваёй публіцыстыцы Венцлава паслядоўна праводзіць тэзіс, што вага нацыі вызначаецца ейнаю спеласцю, а тая, у сваю чаргу, адназначна вымяраецца гатоўнасцю несці адказнасць за кожны ўчынак, зроблены чальцамі нацыі ў імя нацыі. Заклікаючы суайчыннікаў прызнаць віну ў адносінах да габрэяў у часы другой сусветнай вайны ды “перагіны” нацыянальнай палітыкі перадваеннай і постсавецкай Летувы перадусім у дачыненні да палякаў, Венцлава намагаецца вывесці грамадскую думку з зачараванага кола ўзаемных прэтэнзіяў — і замацаваць “на вечныя часы” status quo ў дачыненні да сталіцы краіны. І сам аўтар гатовы прызнаць, што для здзяйснення гэтага прыгожага плану і самім летувісам няблага было б дасягнуць адпаведнага ўзроўню спеласці.

У рамане Юргіса Кунчынаса “Тула”, які летувіская крытыка ахарактарызавала як “адно з найважнейшых дасягненняў сучаснае летувіскае літаратуры”, Вільня займае даволі месца, каб далучыць яе да гэтага разгляду. Сюжэт “Тулы” — рамантычнае каханне бяздомнага бадзягі-алкаголіка да нешчаслівай жанчыны з складаным лёсам. Фон — савецкая Літва эпохі “развітага сацыялізму”. Жыццё, што паўстала, паводле слоў Венцлавы (“Дыялог пра Вільню”), на руінах Вільні Чэслава Мілаша. Раман гучыць надзіва ў унісон з голасам Венцлавы, хаця напісаны ён зусім не па-баэцыянску.

Застаючыся ў межах метафары, можна назваць яго *варварскім* творам.
У тэксце ўсяго крыху зашмат, кавалкі не зусім шчыльна і гарманічна прылягаюць адзін да аднаго. Даўгаваты ўступ, дзе галоўны герой, ён жа апавядальнік, баламутна выкладае свае пачуцці да Тулы, увесь час блытаючы рэчаіснасць і трызненне, і ўяўляе сябе кажаном, каб у чытача не засталося сумненняў у прычыне гэтага трызнення — алкагалізме.
Пасля заблытанага і павольнага пяцідзесяцістаронкавага пачатку, здольнага нават знеахвоціць нецярплівага чытача, ёсць шанцы не без цікавасці прачытаць сярэдзіну — рамантычную гісторыю са шматлікімі трапнымі дэталямі савецкага побыту: рэалістычны, даволі дынамічны і стрыманы тэкст, які пераходзіць у сентыментальны фінал у стылі бразільскага тэлесерыялу. Да гонару аўтара, усё гэта неяк trzyma się kupy, але адметна, што неаднароднасць тэксту не выглядае наўмысным звышсучасным літаратурным прыёмам. Хутчэй праявай варварскай непасрэднасці.
Прачытаўшы “Тулу”, не хочацца гаварыць пра прэтэнцыёзнасць, злоўжыванне мастацкімі сродкамі, парушанае адзінства як пра недахопы (ці як пра вытанчанасць). Гэта асаблівасці стылістыкі, красамоўныя асаблівасці, якія адназначна сведчаць пра кароткі радавод эстэтычнай сістэмы аўтара. Кунчынас не выглядае спадкаемцам доўгай і вышуканай літаратурнай традыцыі Сарбеўскага, Гусоўскага, Міцкевіча, нават у выглядзе Сарбеўскаса, Гусаўскаса й Міцкявічуса. Нашмат больш ён падобны да пісьменніка маладой нацыі, які наноў адкрывае для супляменнікаў тое, што больш цывілізаваныя народы даўно прайшлі. І гэта вяртае нас да тэмы Вільні.
Вільня Кунчынаса пазбаўленая чацвёртага вымярэння. Герой, нягледзячы на прэтэнзію на інтэлігентнасць, жыве адно тым імгненнем між мінулым і будучым, якое, паводле вядомае песні, адно толькі й мае права звацца жыццём. Надзелены з прычыны лайдацкага ладу жыцця неабмежаванаю колькасцю вольнага часу, ён не прысвячае амаль ніякае ўвагі справам мінулых дзён, хаця ведае пра іх. Ягоная Вільня ёсць тут і цяпер, і гэта не выпадковасць. Старая Вільня можа быць патрэбнаю летувісу, які адчувае сябе чальцом народу й субудаўнічым краіны, але аніяк не абыякаваму да ўсяго маргіналу. Прывіды старой Вільні не трымаюцца ў ягонай свядомасці, калі на тое

няма прагматычнае патрэбы.
У XX стагоддзі летувіская нацыя захапіла/атрымала/засяліла/прыдбала/вярнула/здабыла/ўкрала Вільню й Віленшчыну — называйце гэтыя гістарычныя падзеі як хочаце. Але яна дагэтуль не авалодала местам настолькі, каб знік падзел паміж Горадам і ягонымі "новымі" жыхарамі, і гэтая мяжа адчуваецца ў "Туле". Ейныя героі жывуць у Вільні — але яны не жывуць Вільняй. Нешта падобнае заўважаецца ў Санкт-Пецярбурзе, дзе патомныя жыхары ўвесь час наракаюць на варварскія звычкі й беспамяцтва новапрыбылых. *Старыя віленчукі* непараўнальна больш малалікія за *старых пецярбуржцаў* — але, з усяго відаць, не лічбаю вызначаецца моц гарадское душы (прынамсі, у літаратуры гораду над Нявой аналагічны канфлікт выглядае нашмат менш вострым і сур'ёзным — бо, у адрозненне ад віленскага, яго не спрабуюць замоўчваць, але адначасна не адчуваецца й ягонай пагрозлівай усюдыпрысутнасці).

Замоўчванне й маўклівую ўсюдыпрысутнасць можа патлумачыць зборнік "Лёс віленчука ў XX стагоддзі", выдадзены ў кніжнай серыі "Магазыну Віленьскага" — віленскага польскамоўнага выдання. Аўтары гэтай кнігі, сярод якіх пераважаюць польскія і беларускія прозвішчы, як лёгка здагадацца, могуць шмат апавесці на памянёную тэму, і ўспаміны гэтыя будуць утрымліваць значна больш сцэнаў гвалту, чым хацелася б бачыць адказнаму грамадзяніну Летувы. Яны склаліся ў ладны том на 550 старонак, і рэдакцыя абяцае працяг серыі.
Гэта сумная кніга. Яна крок за крокам апісвае знікненне *старых віленчукоў*. Рэпатрыяцыя, літуанізацыя, рэпрэсіі савецкай улады — і жывыя носьбіты традыцыі няўхільна саступалі першынство *носьбітам інфармацыі* — кнігам, будынкам, творам мастацтва. Але нават у гэткім выглядзе традыцыя застаецца досыць уплывовай.
Пагартаўшы гэткую кніжку, паглядзеўшы на фотаздымкі, лепей разумееш пачуццё няпэўнасці, якога не могуць пазбавіцца летувіскія інтэлектуалы. Віленская цывілізацыя не знікла, і яна моцна розніцца ад таго, што лічыцца на сёння аўтэнтычна летувіскім. Інтэлектуал заўжды будзе адчуваць перавагу погляду, які бачыць фігуры рыцараў на вулках, над поглядам, які сузірае адно зараснікі лопуху (хай сабе сапраўды выдатныя,

трэба пагадзіцца) на пустках Зарэчча.

Венцлава робіць спробу дапоўніць нацыянальны летувіскі светапогляд багатымі культурна-гістарычнымі традыцыямі з мінулага Віленшчыны, Кунчынас выяўляецца кансерватыўным песняром летувіскай самадастатковасці, але непакой застаецца — бо ў абодвух выпадках рэчаіснасць паспяхова супраціўляецца: супраць інтэлігенцкага сінкрэтызму Венцлавы нацыяналісты-прагматыкі, стваральнікі гэткіх дзівосных выразаў, як “канцылярская славянская мова” замест “старабеларуская мова”; супраць летувіскае самазамкнёнасці — носьбіты віленскае культурнае традыцыі: кнігі, будынкі і ўсё менш шматлікія *старыя віленчукі*.
Застаецца пытанне, у якой ступені гэты малюнак летувіска-віленскіх дачыненняў з’яўляецца прадуктам уласна летувіскага светаадчування, а ў якой — вынікам селекцыі польскіх перакладчыкаў і выдаўцоў. Польская нацыянальная свядомасць, вядома, нашмат лягчэй пагодзіцца з партрэтам летувіса-віленчука, не пазбаўленага пэўнага святарнага замірання перад вялікімі папярэднікамі, ледзь заўважнага местачковага комплексу ды трошачкі недавытанчанага пачуцця прапорцыі і гармоніі.
Гэткі партрэт будзе ў суладдзі з польскай нацыянальнай міфалогіяй і не выйдзе за межы паліткарэктнасці: гэтага краіны — кандыдаткі ў Еўрасаюз дазволіць сабе не могуць. Да ўсяго, у гэтай немудрагелістай канструкцыі ёсць прыемны абодвум бакам паяднаўчы элемент — беларусы: яшчэ большыя варвары, культурна слабейшыя і палітычна больш адсталыя, але — во нахабства! — таксама лічаць Вільню сваім Ерусалімам.
Ідэі Венцлавы, як гэта бывае з праўдалюбцамі на ўсім свеце й ва ўсе часы, ёсць супрацьвагай больш пашыраных і адначасна нашмат прагматычней пабудаваных поглядаў. Венцлава заклікае да безумоўнага шанавання свабоды, імкнення да ісціны, цвярозага стаўлення да нацыянальнай міфалогіі ды мацавання патрыятычнага пачуцця адказнасці за здзейсненае тваім народам, у тым ліку за ганебныя ўчынкі кшталту вынішчэння габрэяў падчас другой сусветнай вайны. Значыць, нехта, на яго думку, прапагандуе супрацьлеглае. “Тула” гарманізуе з засцярогамі Венцлавы, узятымі з адмоўным знакам. І са свайго боку вельмі добра прылягаюць да гэтага

супрацьлеглага ўспаміны віленчукоў пра XX стагоддзе. Тры кавалачкі puzzle'у ўкладаюцца навокал невідочнага чацвертага. Але наўрад ці ахапляюць яго цалкам.
Паміж тымі кавалачкамі існуе напружанне, якое гэтак прабіваецца ў уступных словах Венцлавы да ягонага апісання гораду над Вяллёй:

"Перад Летувою вольнаю й дэмакратычнаю стаіць задача фармавання новай ідэнтычнасці сталіцы з захаваннем усіх складнікаў ейнае культурнае й гістарычнае спадчыны. Злучаючы досвед мінулага з новым культурным патэнцыялам, Вільня робіцца сталіцаю еўрапейскаю, годнаю сваіх заснавальнікаў і сваіх найлепшых грамадзянаў".
Пафас гэтых словаў, скіраваны, як можна здагадацца, не столькі да польскамоўных чытачоў, колькі да сучасных летувіскіх насельнікаў віленскіх пагоркаў, можа быць дарэчы толькі ў адным выпадку: Вільня застаецца Ерусалімам. З усім, што з таго вынікае, — прыемным і не вельмі.


Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **2003/12/14**

# Чэслаў Мілаш Вільня

**ЧЭСЛАЎ МІЛАШ (нар. у 1911 на Віленшчыне) — паэт, эсэіст, літаратуразнаўца. Ляўрэат Нобэлеўскай прэміі (1980). Эсэ «Вільня» друкуецца з ласкавай згоды аўтара.**

**У** Эўропе няшмат гарадоў, якія б падпадалі пад такую міталягізацыю, як Вільня. Пад міталягізацыямі я маю на ўвазе гістарычныя легенды, неабавязкова адпаведныя фактам. Гісторыя гэтага гораду такая дзіўная, што проста пераносіцца ў казку. Так здаралася неаднойчы, і легенды зьмяняліся ў залежнасьці ад таго, хто іх апавядаў: летувісы ці палякі, габрэі ці беларусы.

Я мушу прызнацца, што лічу магчымым існаваньне гістарычнай праўды, хай сабе і ў пэўных межах, і што яна вельмі патрэбная. Прафэсія гісторыка акурат на тым і палягае, што ён павінен верыць у магчымасьць знайсьці аб'ектыўную праўду, адрозную ад мітаў, што нарасьлі на фактах. І, рыючыся ў архівах, ён шукае гэтую праўду. Але ў такой самай сытуацыі, як гісторык, знаходзіцца паэт ці празаік, калі ён піша на тэмы, узятыя з гісторыі гораду, бо ягоны твор не зажыве паўнакроўным жыцьцём, ня маючы апоры ў рэчаіснасьці.

На жаль, высьветліць, "як гэта было сапраўды", вельмі цяжка. Людзі, якія жылі калісьці, і іхныя справы не адыходзяць у нябыт раз і назаўсёды, а няспынна пастаўляюць матэрыял для розных наўмысных ці ненаўмысных маніпуляцыяў у інтарэсах жывых людзей. У такім горадзе, як Вільня, гэта перадусім інтарэсы этнічных ці моўных групаў.

Мне восемдзесят дзевяць гадоў. Я вырас тут, у гэтым горадзе. І я прызнаюся, што Вільня — гэта мой цяжар. Ад мяне, відаць, віленчукі чакаюць, што я буду казаць толькі прыемныя рэчы, нікога не абражаючы. Але я не дыплямат, хаця, відавочна, я выступаю за добрыя стасункі між Польшчай і Летувой. На жаль, прыязджаючы ў Вільню, я заўсёды адчуваю, што тут трэба хадзіць як па тонкім лёдзе і што тут недастаткова быць чалавекам, бо абавязкова запытаюць: летувіс я ці паляк, габрэй ці немец. Быццам бы панурае XX стагодзьдзе, стагодзьдзе этнічных падзелаў, і далей трывае тут без усякіх зьменаў. Паколькі я неаднаразова бараніў інтарэсы незалежнай Летувы, польскія палітыканы ня маюць да мяне сымпатыі й кажуць, нібы я раблю так таму, што я летувіс. Мушу сказаць пару словаў на гэтую тэму.

Я нарадзіўся ў самай сярэдзіне Літвы й меў бы большае права напісаць “Litwo, Ojczyzno moja”, чым мой вялікі патрон Адам Міцкевіч. Цягам шматлікіх гадоў, праведзеных у Амэрыцы, сіла маёй паэзіі была ў вернасьці маім каранём, што з Кейданскага павету. Аднак мае продкі ўжо ў XVI стагодзьдзі гаварылі па-польску. Я хадзіў у польскую школу. Калі ў 1940 годзе я ў Летуве атрымаў пашпарт, у графе “нацыянальнасьць” стаяла “lenkas” (паляк). Як польскі паэт, я павінен быў выбіраць між устаноўкамі, прапанаванымі польскай культурай, і рана выбраў непрыманьне польскага нацыяналізму. Гэта ня значыць, што мне падабаўся летувіскі нацыяналізм, але я ставіўся да яго з большым разуменьнем і талерантнасьцю. Аднак тое, што ў пашпарце была графа “нацыянальнасьць”, без сумневу, было праявай нацыяналізму даваеннай, з сталіцаю ў Коўне, Летувы. Ідэалёгіяй той дзяржавы быў міт пра летувіскую Вільню, і маладыя пакаленьні летувісаў былі ахвярамі адпаведнай прапаганды. Калі пасьля дзяльбы Польшчы Гітлерам і Сталіным маладыя летувісы пачалі прыязджаць у Вільню, яны пераканаліся, што набытыя ў школе веды пра летувіскасьць Вільні не адпавядаюць рэчаіснасьці, бо працэнт летувісаў у горадзе быў мізэрны — насельніцтва складалася пераважна з габрэяў і палякаў.
Да 1939 году польская Вільня й Вільня габрэйская існавалі побач, але амаль не кантактавалі міжсобку, таму што гэта былі, па сутнасьці, два розныя гарады, дзьве культуры. Для паляка

Вільня застаецца калыскаю рамантызму, то бок найважнейшага ў польскай гісторыі руху, значнасьць якога перасягае межы літаратуры. Але ён таксама меў вялікі сэнс і для гісторыі Летувы. Безь перабольшаньня можна сказаць, што Летуву як мітычную краіну адвечных лясоў і паганскіх багоў стварыла ўяўленьне польскіх пісьменьнікаў, асабліва рамантыкаў. Ужо ў XVI стагодзьдзі Мацей Стрыйкоўскі выдаў сваю вялізарных памераў “Літоўскую хроніку”, якая праз пару стагодзьдзяў стала крыніцаю тэмаў ягоных спадкаемцаў. Пачуцьцё летувіскай нацыянальнай ідэнтычнасьці фармавалася дзякуючы чытаньню такіх твораў, як “Гражына” й “Конрад Валенрод” Міцкевіча, “Міндоўг” Славацкага, “Паята, дачка Лізьдзейкі” Бернатовіча. Альбо нават на такіх кур’ёзах, як таўшчэзная паэма Юзафа Ігнацага Крашэўскага “Віталяраўда”, выдадзеная ў 1840 годзе, дзе мы знаходзім цэлы пантэон паганскіх багоў, якія паводзяць сябе як багі грэцкай міталёгіі. Рамантычнае паходжаньне мае таксама “Старажытная гісторыя літоўскага народу” Нарбута, дзевяць тамоў якой зьявіліся ў Вільні паміж 1837 і 1841 гадамі. Міталягізаваная паганская Літва выконвала ў літаратуры, напісанай па-польску, прыблізна тыя самыя функцыі, што і старажытная Шатляндыя ў літаратуры ангельскай. А той факт, што летувіская нацыянальная сьвядомасьць знаходзілася пад уплывам рамантычных ідэяў, не прайшоў дарма і для твораў летувіскіх гісторыкаў, якія маюць схільнасьць да ідэалізацыі некаторых колішніх уладароў і магнатаў.

Чароўнасьць геаграфічнага становішча й архітэктуры гэтага гораду мае ў сабе нешта магічнае. Тут лёгка забыцца, што мы стаім над труною блізу ста тысяч габрэяў. Хоць усё шчэ лунае жуда гэтага масавага забойства, жывыя стараюцца пра гэта ня памятаць. Для габрэйскіх гісторыкаў Вільня ўсё роўна застаецца “Паўночным Ерусалімам”, адным з найважнейшых у сьвеце цэнтраў габрэйскай культуры. Я рос у польскай Вільні й няшмат ведаў пра мінулае Вільні габрэйскай, што сьведчыць пра мэтады нацыяналістычных падручнікаў, якія падрэтушоўвалі пэўныя факты. Напрыклад, тое, што здарылася ў гэтым горадзе ў 1749 годзе, было прыкра для польскага каталіцызму і таму патрабавала затушоўваньня. Тады жыўцом спалілі ератыка. Гэта быў граф Валянцін Патоцкі, які, калі вучыўся ў Амстэрдаме, навярнуўся на юдаізм і, нягледзячы на

катаваньні, не вярнуўся назад у хрысьціянства. Віленскія габрэі і ў мае школьныя ды ўнівэрсытэцкія гады шанавалі магілу гэтага пакутніка, але я пра гэта тады нічога ня ведаў. У пэўным сэнсе я мог бы паслужыць прыкладам дэфармацыі ідэяў шляхам выхаваньня ў нацыяналістычным духу, ад якога я пазьней зь цяжкасьцю мусіў вызваляцца сам. Вось перасьцярога для маладых летувісаў, каб не паддаваліся новым дэфармацыям, гэтым разам — летувіскім.

Цяпер мае веды пра габрэйскую Вільню паходзяць пераважна з кніжак, нават аб справах, што адбываюцца тут, побач, на адлегласьці выцягнутай рукі. Хаця трэба прызнаць, што наша літаратурная група “Żagary”, спрабуючы перамагчы нацыяналізм, падтрымлівала прыязныя стасункі з групай паэтаў левай арыентацыі, што пісалі ў “Jung Vilne” на ідыш. З гэтай групы Галакост перажылі паэты Абрам Суцкевэр, Качаргінскі і Хаім Градэ (апошні пасьля вайны пісаў у Нью-Ёрку прозу пра жыцьцё габрэйскіх мястэчак на Віленшчыне). На думку шматлікіх чытачоў, якія ведалі ідыш, Нобэлеўскую ўзнагароду належала даць не Башэвісу Зынгеру, а Хаіму Градэ…

Цяпер я зь зьдзіўленьнем думаю пра назаўсёды згубленую габрэйскую Вільню. Гэта быў горад вялізарнай сканцэнтраванай энэргіі, сталіца выдавецтваў, што друкавалі кніжкі на ідышы і іўрыце, асяродак літаратурных часопісаў і тэатраў. З гэтага гледзішча зь Вільняю мог канкураваць адно Нью-Ёрк. Няма чаго дзівіцца, што сярод амэрыканскіх габрэяў найбольш шануецца паходжаньне зь Вільні, і, як мне з гумарам апавядала Сьюзан Зонтаг, яе дзед прыпісаў сабе такое паходжаньне, хоць напраўду паходзіў зь мястэчка на Віленшчыне.

Габрэйская Вільня гаварыла й пісала пераважна на ідыш. Дзеля захаваньня й вывучэньня народнай культуры Вільні й навакольных *shtetl* у горадзе заснавалі Габрэйскі гістарычны інстытут. Яго працяг — *JIVO* ў Нью-Ёрку, інстытут, які захоўвае ўратаваныя віленскія архівы свайго папярэдніка.

У палітычнай гісторыі гэтай часткі Эўропы важкую ролю адыгрываў Бунд. Габрэйская сацыялістычная партыя Бунд была заснаваная ў 1897 годзе і ў царскай імпэрыі спаборнічала з бальшавікамі й эсэрамі. Для мяне слова “Бунд” асацыюецца

не з далёкім мінулым, а з постацямі шчэ жывымі. Напрыклад, з Маркам Эдэльманам — бундаўцам і адным з правадыроў паўстаньня ў варшаўскім гета, які застаўся верным ідэалёгіі сваёй партыі й пасьля вайны не эміграваў у Ізраіль. Цягам значнай часткі майго жыцьця Бунд існаваў у маёй сьвядомасьці як сацыялістычная партыя, настолькі ненавісная Сталіну, што той загадаў арыштаваць і расстраляць яе лідэраў. У часе другой сусьветнай вайны бундаўцы, супрацоўнічаючы з польскімі сацыялістамі, арганізавалі актыўны супраціў у віленскім, беластоцкім і варшаўскім гетах. Адным з герояў маёй маладосьці ў Вільні быў студэнт і сацыялістычны дзяяч Лешак Раабе, які быў расстраляны гітлераўцамі за тое, што, хаця й ня быў габрэем, працаваў сувязным паміж Бундам віленскага гета й Бундам гета варшаўскага.
Думаю, што разьвітаньне з прамінулай Вільняй як “Паўночным Ерусалімам” — цяжкае й балючае, але непазьбежнае, калі мы хочам, каб духі памерлых пакінулі нас у спакоі.
Я хацеў бы зьвярнуць увагу на пэўную асаблівасьць Вільні. Гэта горад сэмантычных непаразуменьняў. Калі Вільню называюць гістарычнай сталіцай Летувы, гэта недакладна, бо цягам некалькіх стагодзьдзяў яна была сталіцай Вялікага Княства Літоўскага, а гэта ўжо вельмі адрозны ад нацыянальнай дзяржавы палітычны арганізм. Згадайма, што насельніцтва гэтага краю было пераважна праваслаўным і карысталася не літоўскай, а старабеларускай альбо стараўкраінскай мовай, і гэта не магло не паўплываць на сталіцу. Мне здаецца, што гісторыкам цяжка ўявіць сабе Вільню як сялібу праваслаўных купцоў зь вялікай колькасьцю праваслаўных цэркваў.
У гісторыкаў, як польскіх, так і летувіскіх, можна заўважыць жаданьне паменшыць усходні элемэнт. І гэтаму цяжка дзівіцца, бо расейская прапаганда любіла падкрэсьліваць адвечную славянскасьць гэтага гораду. Але, безумоўна, сіла прыцягненьня ўсходняга элемэнту была значнаю, паколькі жыцьцё й гандаль віленскіх купцоў рэгуляваў усходні каляндар і да XVII стагодзьдзя гарадзкая Рада складалася напалову з праваслаўных, а напалову з прыхільнікаў заходняга календара, то бок каталікоў і пратэстантаў.

Вільня — горад памежны, бо збудавалі яго на мяжы бізантыйскай і рымскай цывілізацый. Вялікае Княства,

а пазьней і польска-літоўская Рэч Паспалітая доўга
й эфэктыўна супрацьстаялі Маскве. Аж да пералому, які, на
маю думку, адбыўся ў 1655 годзе. Тады на тэрыторыю Польшчы
накінуліся швэды, а з усходу рушыла маскоўскае войска
й заняло Вільню. Маскоўцы падпалілі горад і ўчынілі масавую
разьніну жыхароў. Толькі ў 1661 годзе іх выгналі зь Вільні.
Гэтыя падзеі можна лічыць пачаткам экспансіі Расейскай
імпэрыі, чарговыя хвалі якой прынесьлі ў Вільню русіфікацыю.
На жаль, у гэтай частцы Эўропы прызвычаіліся раскідвацца
паняткамі “палянізацыя”, “русіфікацыя”, “літуанізацыя”.
Я памятаю аповеды майго бацькі, які хадзіў у Вільні ў гімназію.
Усе заняткі былі на расейскай мове, уключна з заняткамі
з рэлігіі. Але ксёндз не рабіў гэтага, і толькі на выпадак
інспэкцыі патрабаваў вывучыць на памяць колькі сказаў
зь Сьвятога Пісьма, і выкліканы вучань уставаў, гладка
цытуючы заўсёды адно й тое самае: “Авраам сидел в своей
палатке…”.
Можна зразумець летувіскую настойлівасьць у літуанізацыі
Вільні, хаця тут супраць пэўнага мітычнага ўяўленьня
выступаюць некалькі стагодзьдзяў гісторыі. Калі ў 1939 годзе
Летува атрымала Вільню, у горадзе дзейнічаў Унівэрсытэт
Сьцяпана Батуры, мая *alma mater*. Ён ганарыўся сваім
паходжаньнем зь езуіцкай акадэміі, статус якой пацьвердзіў
сам кароль Сьцяпан Батура, і ад слыннага ўнівэрсытэту часоў
рамантызму, які быў зачынены расейскімі ўладамі пасьля
паўстаньня 1831 году. Я такі абавязаны гэтаму ўнівэрсытэту,
што было б няўдзячнасьцю, калі б я не паважаў яго прафэсараў.
Вось жа, на маю думку, ліквідацыя гэтага ўнівэрсытэту
ў 1939 годзе адміністрацыйным загадам уладаў перадваеннай
Летувы была памылкаю. Бо менавіта асяродак прафэсараў
захоўваў сувязь з традыцыямі Вялікага Княства і супрацьстаяў
польскаму нацыяналізму, паводле якога Вільня была
звычайнай часткай Польшчы. У гэтым выпадку абстрактная
ідэя як мага хутчэйшай літуанізацыі сутыкнулася з арганічным
гарадзкім рытмам, які нагадваў шматмоўную мазаіку. Калі б
унівэрсытэт і далей існаваў, ён, напэўна, спрычыніўся б да
духоўнай інтэграцыі Вільні з усёй Летувой, абуджаючы
летувіскі патрыятызм незалежна ад нацыянальнасьці.
Відавочна, такія “калі б” губляюць вагу ў сувязі з падзеямі, якія
насталі пазьней, — савецкай акупацыяй.

Магу дапусьціць, што Гюнтэр Грас, шматкроць прыязджаючы ў Гданьск, адчувае тое самае, што я ў Вільні, бо гэта адначасова ягоны й не ягоны горад. І думаю, што польскія літаратары, якія жывуць у Гданьску й пішуць пра яго, ёсьць для Граса тым самым, што для мяне летувіскія літаратары ў Вільні. У нашай частцы Эўропы жыцьцё многіх людзей зьмянілася дзеля масавых дэпартацыяў насельніцтва, што адбываліся пры канцы вайны. На загад Сталіна Польшча пасунулася на захад. Нямецкі народ зусім выганялі зь вялікіх гарадоў: Гданьску, Уроцлава, Шчэціна; а ў ацалелыя дамы сяліліся выгнаньнікі з Усходу — зь Вільні і Львова. Дастаткова трохі ўяўленьня й спагады, каб ацаніць выключнасьць і драматызм гэтых змушаных перасяленьняў, якім па колькасьці перасяленцаў не было роўных у гісторыі.
З тых часоў прайшло паўстагодзьдзя, але мы ўсё жывём псыхалягічнымі наступствамі тых дэкрэтаў, якія для нас, навучаных досьведам Босьніі й Косава, насілі ўсе рысы этнічнай чысткі.
Як дасьледнік польскай літаратуры, я заўважыў, што як у паэзіі, так і ў прозе дагэтуль трывае траўма выгнаньня з родных месьцінаў, нават калі пра іх згадваюць успаміны бацькоў альбо дзядоў. Побач выступае зьява, цяжкая для тэарэтычнага вытлумачэньня, складаная й эмацыйна заблытаная. Гэта спроба знайсьці ўласныя карані ў новым месцы, праз наладжаньне мысьленчага кантакту зь людзьмі мінулага, якія некалі хадзілі па гэтых вуліцах. Паляк у Гданьску, напрыклад, адчувае повязь зь нямецкай культурай, што фармавалася тут цягам стагодзьдзяў і цяпер прысутнічае ў кожнай архітэктурнай дэталі. Добра, калі ён аматар Шапэнгаўэра, тады за стрэлку компаса, што паказвае на мінулае, можна ўзяць бацькоўскі дом філёзафа. Ці зрабіць так, як зрабіў Стэфан Хвін у рамане “Ганэман”: уявіць сабе пасажыраў апошняга карабля, што пакідае нямецкі Данцыг і які патапляе савецкая падводная лодка.

Мінулае, пра якое я казаў на пачатку, мінулае, якое на кожным кроку нагадвае пра сябе старымі камянямі Гданьску ці Вільні, просіць у нас спагадлівай дапамогі, то бок прамаўленьня праўды, калі мы думаем і пішам пра тое, што было. Гэта палегчыла зьнікненьне камуністычнай Польшчы, якая

карысталася прапагандысцкімі лёзунгамі пра “вернутыя адвечна польскія землі”. Палякі, якія называюць сябе жыхарамі Гданьску ці Ўроцлава, бо ў гэтых гарадох прайшлі іх дзяцінства й маладосьць, ужо нічога не спрабуюць даводзіць і вучацца паважаць спадчыну, якую атрымалі дзякуючы працы шматлікіх пакаленьняў немцаў.

Ня ведаю, што думаюць цяпер віленскія летувісы, у прыватнасьці паэты й празаікі. Яны тут, акрамя нешматлікіх выняткаў, прыхадні. І таму, напэўна, не пазьбягаюць пэўных пытаньняў, што датычаць іх уласнай ідэнтычнасьці. Я сьвядома кранаю цяпер вельмі рызыкоўныя тэмы. Сантымэнтальны патрыятызм схіляе летувісаў да радасьці й трыюмфу, бо яны атрымалі старадаўнюю сталіцу Літвы. І яны шукаюць сьлядоў летувіскасьці, схаваных пад тынкам палянізацыі, і ганарацца летувіскім паходжаньнем архітэктара Гуцэвіча. Але яны ведаюць, што гэта — павярхоўнае, словы для публічнага ўжытку. Але кожны зь іх павінен змагацца ў самім сабе з найцяжэйшай праблемаю: як уявіць сваёй усю гэтую спадчыну, як уліцца ў повязь пакаленьняў гэтага гораду. Гэта можна зрабіць, толькі шукаючы праўды, і ня толькі праўды пра даты й падзеі, але й эмацыйнай праўды асобных людзей, якія жылі тут. Можа, апраўданьнем была б здольнасьць да эмпатыі й напісаньне, дзякуючы ёй, напрыклад, біяграфіі нейкага праваслаўнага купца XVI стагодзьдзя ці сябра масонскай лёжы “Руплівы ліцьвін” 1820 году.

І на заканчэньне прывяду прыклад, які паказвае, як цяжка зразумець праўду, калі гэта чужая праўда, праўда іншага чалавека. Ёсьць карціна, намаляваная віленскім мастаком, якая мяне ўражвае. Яе аўтар, Людамір Сьлядзінскі, быў адным з найбольш вядомых мастакоў міжваеннага пэрыяду. Пэўны час ён вучыўся маляваць у маёй школе, потым кіраваў сваёй майстэрняю ўва ўнівэрсытэце. Ён быў карэнным віленчуком і належаў да дынастыі мастакоў — мастакамі былі ягоны бацька й дзед. Дык вось, Сьлядзінскі, пакідаючы ў 1945 годзе Вільню, намаляваў амаль казачны партрэт гораду: фэерыю касьцельных вежаў і аблокаў. Назваў ён гэта “Араторыяй”. Карціна захоўваецца ў музэі Сьлядзінскага ў Беластоку.

Я назваў бы “Араторыю” хвалебным гімнам у гонар віленскай архітэктуры й адначасова песьняй-жальбай. Гэты плач выгнаньніка назаўсёды застанецца ў гісторыі гораду, нават

тады, калі ніхто ўжо ня будзе памятаць пра падзел на пераможцаў і пераможаных.

*Пераклала з польскай Марына Шода*
*паводле: “Tytuł”, №4, 2001*.

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **2003/12/14**
[image]

# Віталь Зайка Літоўскі Ерусалім: ужо нябачны простым вокам…

*Ты — псальма з цэглы і жалеза,*
*І ў муры кожным тваім — песьня,*
*Малітва — ў кожным камяні.*

Мойшэ Кульбак

Гістарычная Літва (сёньняшні абшар Рэспублікі Беларусь, Віленшчыны й Дзьвіншчыны) ёсьць старадаўняй бацькаўшчынай як беларусаў (колішніх ліцьвінаў), так і гэбраяў-літвакоў. Як і для беларусаў, для гэбраяў на беларуска-літоўскіх землях Вільня была фокусам вялізнага абшару і сэрцам магутнага цела, якое і да сёньня яшчэ тоіць нездзе ў сваіх глыбінях памяць пра гэты край.

Вільня, Вілнэ, Вільно… Здаўна-давён, стагодзьдзямі, горад гэбрайскі, польскі й беларускі — літаральна за некалькі дзесяцігодзьдзяў змутаваў, перакінуўся ў горад літоўска-расейскі, Vilnius/Вильнюс, з дамешкам “інстынктыўнай” польскасьці, у якую і зь якой людзі свабодна ўваходзяць і выходзяць.

Гэбраі зь Вільні й ваколіцаў, якія перажылі вайну, засталіся,

**ВІТАЛЬ ЗАЙКА (нар. у 1961 у Лагойску) — дасьледнік беларуска-габрэйскіх дачыненьняў. Скончыў фізфак БДУ. Супрацоўнік нью-ёрскага “Цэнтру гэбрайскай гісторыі”. Апошняя публікацыя — “The Self-Perception of Lithuanian-Belarusian Jewry in the Eighteenth and Nienteenth Centuries” (POLIN: Studies in Polish Jewry. Volume 14. Oxford-Portland,**

напэўна, на ўсё далейшае жыццё ў шоку ад страты майго пракаветнага “этнічнага” асяродзьдзя, пра што казала прадстаўніца Нью-Ёрскай арганізацыі віленчукоў-гэбраяў “Нусах Вілнэ” на ўгодках зьнішчэньня Віленскага гета: “Ад нашай Вільні не засталося нічога. Гэта сёньня горад-прывід, адно толькі рэльеф і тапаграфія якога нагадваюць горад нашага дзяцінства і юнацтва. Аканіцы ягоныя абыякава глядзяць, не пазнаючы нікога”.
Безумоўна, да такога адчуваньня непапраўнае страты дадаецца тое, што было страчана ўжо пасьля вайны, — зруйнаваньне і забудова большай часткі старажытнага гэбрайскага кварталу, улучна зь Вялікай сынагогай, зьнішчэньне могілак на Сьніпішках і Антокалі, адсутнасьць за Саветамі гэбрайскіх грамадзкіх арганізацыяў, эміграцыя гэбрайскіх жыхароў Вільні. Сёньня ў Вільні існуе Гэбрайскі музэй, школа і пара іншых культурных установаў, улучна Інстытутам гэбрайскай культуры пры ўнівэрсытэце, але ад гэтага ненашмат весялей.

Разбурэньне гэтага этнічнага асяродзьдзя, а таксама традыцыйнага дамадэрнага грамадзтва пачалося прыкладна на стагодзьдзе — паўтара раней. За часоў Вялікага Княства Вільня зрабілася цэнтрам гэбрайскага жыцьця і гэбрайскай навукі — Літоўскім Ерусалімам[1]. Разьвіцьцё гэбрайскага грамадзкага жыцьця, рабіністычнай навукі і традыцыйных рэлігійных навучальных установаў нават пасьля падзелаў Вялікага Княства зрабіла Вільню роўнай, а ў нечым і вышэйшай за старыя асяродкі гэбрайскай культуры, як Бэрлін і Варшава. Рапарт зрабілася фокусам фармаваньня, крышталізацыі і падбнай галіны эўрапейскага гэбрайства — літвакоў[2]. Гэта субэтнас, “племя” ашкенаскага гэбрайства, з усімі ягонымі рысамі — сваёй сталіцай, тэрыторыяй, мовай, этасам, культурай, рэлігіі, асобным стэрэатыпам аб сабе ўваччу навакольных гэбрайскіх субэтнасаў (“полакаў”, “галіцыянэраў”, “румынаў”). Фармаваньне гэтага асобнага субэтнасу было спрычыненае яго існаваньнем у межах і пад юрысдыкцыяй Вялікага Княства, і канчаткова выкрышталізавалася ў часы хасыдзкага наступу, калі Вільня зрабілася цэнтрам супраціву новай плыні ў юдаізьме (хасыдызму), што акцэнтвала ролю эмацыйнага асабістага кантакту з Богам пры пасярэдніцтве праводніка-цадыка, у супрацьлегласьць традыцыйнай рабінічнай мадэлі

[1] Існуе цэлы корпус старыя матэрыялаў пра гэбрайскую Вільню, створаны на розных мовах і ў розны час. Kalkstein I. Toledot ha-Yehudim be-Vilna (1837); Cohen I. Kehilla ha-Ivrit be-Vilna (1938); Klausner I. Toledot ha-Kehilla ha-Ivrit be-Vilna (1938

ўзаемадзеяньня з Богам праз выкананьне ўсіх абрадаў і вывучэньне сьвятых кнігаў ды спадарожнай літаратуры ад кіраўніцтвам рабінаў — традыцыйных экспэртаў у пытаньнях рытуалу[3].

Супрацьстаяньне хасыдызму (яно звалася “місноґід” у ашкенаскім вымаўленьні старагэбрайскай мовы) літоўскай, стрыжнем адмысловай літоўска-беларускай, “літвацкай” ідэнтычнасьці, а самая назва “місноґід” (апанэнт хасыдызму) часта ўспрымалася як сынонім да “літвака”.

Сутнасьць “місноґідзкай” рэлігійнай нормы доўга заставалася ў цені, калі параўнаць з грамадзкай цікавасьцю да паспрабаваў колькасьцю працаў, напісаных пра розныя яго асьвятліць. Нядаўна выйшлі некалькі ўзорных працаў — Алтэта Надлера “Місноґідзкая вера” й Імануіла Эткеса “Адзіны ўпытаньне ў”, што часткова запаўняюць гэтую лякуну[4]. Рацыянаваім літвацкага тэалягічнага дыскурсу стварыў для ліквідаваў ляччу суседзяў — гэбраяў польскіх і ўкраінскіх земляў. Гэта стратып эмацыйна стрыманай, крытычнай, нават чэрствай, якая нічым ня грэбуе дзеля пошуку доказаў, каб у нечым пераканацца. Гэтая апошняя рыса спрычынілася да мянушкі “цэйлэм-коп” (крыжагаловы): лічылася, што вучоны ў так можа лёгка перакінуцца ў хрысьціянства, каб толькі задаволіць сваю цікаўнасьць. Верагодна, што гэтаму паспрыяла распаўсюджаньне гэбрайскай асьветы (Гасколы) на беларуска-літоўскіх землях, а таксама гэткія вядомыя выхрасты, як арыенталіст Даніла Хвольсан (вядомы сваёй фразай “Лепей быць прафэсарам у Пецярбургу, чымся мэламэдам у Эйшышках”) і авантурыст Якуб Брафман (аўтар антысэміцкага трактату “Кніга кагалу”), што паходзілі зь іх.

**History of the Jews in Vilna (1943); Аграновский Г., Грузенберг И. Литовский Иерусалим (1992).**

**2. Я паспрабаваў асьвятліць гэтае пытаньне ў сваім артыкуле: The Self-Perception of Lithuanian-Belarusian Jewry in the Eighteenth and Nienteenth Centuries // POLIN: Studies in Polish Jewry. Volume 14. Focusing on Jews in the Polish Borderlands. Oxford-Portland, 2001. P.19—30.**

[3] Wilensky Mordechai. Hasidic-Mitnaggedic polemics in the Jewish Communities of Eastern Europe: The Hostile Phase // Essential Papers on Hasidism, ed. by G.Hunder. New York: NYU Press, 1991.

[4] Nadler Allan. The Faith of the Mithnagdim: Rabbinic Responses to Hasidic Rapture. Baltimore and London: The Johns Hopkins University Press, 1997;

**Etkes Imanu'el. Yahid be-doro: ha-Ga'on mi-Vilnah: demut ve-dimui. Yerushalayim: Merkaz Zalman Shazar le-toldot Yi'sra'el, [1998], in English: The Gaon of Vilna: the man and his image // Etkes Immanuel; translated by Jeffrey M.Green. Berkeley: University of California Press, 2002.**

**5. Stampfer Shaul. Ha-Yeshivah ha-Lita'it be-hithavutah // Shaul Stampfer. Yerushalayim: Merkaz Zalman Shazar le-toldot Yi'sra'el, 1995. Выдаленне ангельскага перакладу заклянавана на 2005 г.**

Для супрацьдзеяньня хасыдзкім уплывам, якія ўсё ж праніклі на беларуска-літоўскія землі пераважна ў выглядзе ільна-ХаБаД ("любавіцкага толку" або беларускага хасыдзкага, больш рацыяналісцкага за польска-ўкраінскі), а таксама да ўмацаваньня традыцыйных рабіністычных дактрынаў сярод адукаванай эліты грамадзтва рабіністычныя вярхі літоўска-беларускага гэбрайства стварылі навучальныя ўстановы. Пачала разьвівацца сыстэма ешыботаў (ешываў), ці сэмінарыяў з больш-менш адвольнай праграмай, дзе галава ешыботу (рош-ешыва) вырашаў усе пытаньні згодна з ягоным уласным разуменьнем навучальнага працэсу. Значныя нарматыўны ўплыў мелі навуковыя працы і зборныя рабінскіх рэспонсаў (рытуальных рэгуляцыяў). Дзяржава таксама імкнулася рэгуляваць навучальны працэс, яскравым прыкладам чаго было закрыцьцё Валожынскага ешыботу ў адказ на адмову ягонага кіраўніцтва ўвесьці ў навучальную праграму такія сьвецкія дысцыпліны, як матэматыка і расейская мова, а

таксама адукацыйны цэнз для кіраўніцтва й выкладчыкаў. Адной з найноўшых працаў у гэтай тэме ёсьць кніга Шаўла Стамфара “Ўзьнікненьне літоўскіх ешываў” (на іўрыце)[5]. Да ўмацаваньня адмысловасьці беларуска-літоўскага гэбрайства спрычынілася і мэтадалёгія вывучэньня талмуду: *пілпул* і *мусар*. Яны мелі вялікі ўплыў на стыль мысьленьня эліты грамадзтва і праточваліся на самы ніз, дзе апошні ваданоша ці шавец вечарамі зьбіраліся ў сынагогах ці малітоўных дамох дзеля вывучэньня *геморы* (талмуду) або камэнтароў да Сьвятога пісьма. Дарэчы, такія таварыствы мелі назву *хаўрусэ* (найбольш верагодная крыніца паходжаньня беларускага слова “хаўрус”). Павага да пісанага і друкаванага слова, наагул вялікая сярод гэбраяў, дайшла ў выпадку літвакоў да абсалюту, улучна з рабінскімі адозвамі шанаваць і не карыстаць нягодна любыя паперы з напісанымі ці надрукаванымі літарамі, бо там ёсьць літары, якімі пішацца імя Бога. Гэта, дарэчы, параўнальна з практыкай іншага народу старажытнай культуры — кітайцаў, у якіх знойдзеныя на вуліцах паперкі, напрыклад, абрыўкі газэтаў, спальваліся, бо гіерогліфы лічыліся рэччу сьвятой.

Імкненьне да ведаў, знаёмства з сучаснай не-гэбрайскай літаратурай (што часам вывучалася ешыботніка[6]) і, нарэшце, сьвецкая адукацыя вялі да вальнадумства, атэізму, г.зн. да таго, на што, так бы мовіць, “нам[7] хасыды, даючы літвакам мянушкі кшталту “крыгаміяд” (г.зн. вальнадумцы, якім нічога ня значыць навяртацца ў хрысьціянства) або “трэфныя (нячыстыя) літваки”. Лібэралізацыя стаўленьня афіцыйных расейскіх уладаў да гэбраяў у 1860—1870-х гадох і стварэньне мадэрнізаванай сярэдняй клясы гэбрайскіх лекараў, настаўнікаў, адвакатаў адчыніла пэрспэктывы да інтэграцыі ў грамадзтва дзесяткам тысяч новых шукальнікаў лепшае долі. Ім была ўласьціва прага да ведаў і някепская адукаванасьць, яны былі заняты ў хедэрах і талмуд-торах (традыцыйных пачатковых школах). Этас пашаны да вучэньня, высокі ўзровень пісьменнасьці (працэнт гэбраяў, якія ўмелі пісаць па-расейску, паводле перапісу 1897 году, быў значна вышэйшы за такі ў беларусаў, і гэта пры тым, што пераважная большасьць гэбрайскіх мужчынаў была пісьменная па-гэбрайску і/або на ідыш).

[6] **Пра Бунд гл., напрыклад: Mishkinsky Moshe. Regional Factors in the Formation of the Jewish Labor Movement in Tzarist Russia (YIVO Annual, Vol. 14. New York, 1969.**

Падвышэньне адукацыі, эмансыпацыя гэбрайскага насельніцтва выклікалі рост сацыяльнай, а пазьней і палітычнай актыўнасьці. Пад узьдзеяньнем суседніх нацыянальных рухаў стаў ствараццa гэбрайскі нацыянальны рух ці, лепей, — рухі, зь якіх асноўнымі зрабіліся сіянізм, бундызм і аўтанамізм. Да стварэньня ўсіх трох літвакі мелі самае непасрэднае дачыненьне. У Вільні ўзьнік протасіянісцкі рух “Хібат-Цыён”, што стаў арганізацыйнай асновай для палітычнага сіянізму Тэадора Герцля. Там жа была заснаваная гэбрайская сацыял-дэмакратычная партыя — Бунд (у 1897 годзе ў Вільні адбыўся першы зьезд Бунду). Зь Вільняй зьвязанае ўзьнікненьне й разьвіцьцё руху за тэрытарыяльную аўтаномію (нацыяналізму дыяспары). Бундызм і аўтанамізм на пэўных этапах можна нават лічыць зьявамі ў пераважнай ступені “літвацкімі”[6]. Эмансыпацыя мела свой адваротны бок — эрозію й зьнікненьне традыцыйнай гэбрайскай культуры. Дзеці, народжаныя ў эмансыпаваных сем’ях, у пераважнай большасьці рабіліся суб’ектамі не-гэбрайскай культуры. Зразумела, былі й выключэньні, як у выпадку Ўладзімера Мэдэма, што паходзіў зь менскай асымільванай сям’і, дзіцем быў ахрышчаны ў праваслаўе, а пасьля стаў адным зь вядучых дзеячоў Бунду, вывучыў у сталым узросьце ідыш і ўсяляк прапагандаваў яго ўжываньне. Ёсьць усе падставы лічыць, што большасьць гэбрайскай інтэлігенцыі канца XIX стагодзьдзя і першых дзесяцігодзьдзяў XX на беларускіх землях была акультурызаваная ў расейскае грамадзтва. Віленская інтэлігенцыя хіба дала найбольш яскравы прыклад: нягледзячы на добрае валоданьне польскай мовай ды ідышам, у якасьці прэфэрэнцыйнай мовы зносінаў у гэбрайскіх культурных колах Вільні (па-за адмыслова “ідышысцкімі” або “гэбраісцкімі” асяродкамі) ажно да верасьня 1939 году і “першых Саветаў” яна ўжывала мову расейскую (мовай шырокіх гэбрайскіх масаў заставаўся ідыш). Гэтыя зьмены мелі вынікам тое, што стэрэатып “літвака” зьмяніўся і сярод польскіх гэбраяў на мяжы XIX і XX стагодзьдзяў самое слова “літвак” набыло адмоўнае адценьне, азначаючы асобу расейскамоўную й фанабэрыстую, якая ня дужа пільна выконвае правілы рытуальнай чысьціні ежы (*кошар*) і суботняга адпачынку (*шомрус шабас*).

Немцы падчас першай сусьветнай вайны прызналі мову ідыш,

разам зь беларускай, польскай і літоўскай, афіцыйнай мовай у Вільні і на ўсіх прылеглых абшарах пад сваім кантролем. На ідыш былі выраблены пашпарты, друкаваліся афіцыйныя аб'явы ды іншыя дакумэнты, праводзілася навучаньне ў школах. Падзеі таго часу і першых дзесяцігодзьдзяў XX стагодзьдзя апісаныя ў кнізе Гірша Абрамовіча "Зьніклыя постаці"[7].

У 1919 годзе, ужо за польскай уладай, адбыліся выбары кіраўніцтва адноўленай Віленскай гэбрайскай грамады (*кегілы*), якая стала, бадай, першай дэмакратычнай у горадзе структурай самакіраваньня. Грамадзкае жыцьцё ў Вільні разьвівалася і дасягнула свайго росквіту міжваеннае дваццацігодзьдзе. У Вільні быў створаны інстытут гэбрайскіх дасьледаваньняў (YIVO), які прэтэндаваў на ролю гэбрайскай акадэміі навук, існаваў шэраг школаў, грамадзкіх, адукацыйнае таварыства "Вільбіг", ПЭН-клюб, выходзіла дзясяткі гэбрайскіх публікацыяў у абедзьвюх мовах, працавалі некалькі гэбрайскіх тэатраў (у тым ліку славутая "Вільненская трупа"), існавалі літаратурныя суполкі. Выдавецтвы Кальмана, Ром, Розэнкранца ды іншыя выпускалі кнігі на ідыш, гэбрайскай, што разыходзіліся па ўсім сьвеце (канцэпт віленскага талмуду з друкарні ўдавы й братоў Ромаў быў нават знойдзены ў Багдадзе, у штаб-кватэры сакратара партыі Садама Хусэйна). Гэбраі ў міжваенны час мелі дастаткова кантакт зь іншымі нацыянальнымі групамі, у тым ліку зь беларусамі. Антон Шукелойць, старшыня Галоўнай управы Беларуска-Амэрыканскага Задзіночаньня, успамінае, як у часы вучэньня ўва ўнівэрсытэце Сьцяпана Батуры ў Вільні гэбраі-беларусы й гэбраі разам праводзілі супольныя акцыі супраць антысэміцкай палітыкі польскіх уладаў. Беларускія і гэбрайскія салідарнасьці займалі *лавы жыдофске* — месцы ў аўдыторыі, якія рэакцыйны рэктарат адводзіў для гэбраяў.

Беларуская й гэбрайская моладзь плячо ў плячо змагалася ў шэрагах эсэраў і капэзэбоўцаў. У трохтамовым мэмарыяльным альбоме "Літоўскі Ерусалім у ілюстрацыях і дакумэнтах", выдадзеным Лейзарам Ранам[8], трапляюцца дакумэнты, што сьведчаць аб актыўных кантактах паміж гэбраямі й беларусамі ў Вільні. Шэраг дакумэнтаў можна знайсьці таксама ў Інстытуце гэбрайскіх дасьледаваньняў "YIVO" ў Нью-Ёрку[9]. Калі над гэтым сьветам, над гэтым асяродкам цывілізацыі

[7] **Abramowicz Hirsz, Profiles of a Lost World: Memoirs of East European Jewish Life before the Holocaust. Wayne State University Press, 1999.**

апусьцілася заслона фашыстоўскага генацыду, гэбраі складалі каля трэцяй часткі насельніцтва Вільні. Было створанае гета, але яшчэ да гэтага 35 тысяч чалавек былі расстраляныя ў Панарах ля Вільні. Агульная колькасьць гэбрайскага насельніцтва на пачатак вайны складала каля 80 тысячаў чалавек* (дадзеныя з: Encyclopaedia Judaica, Jerusalem, 1971. Vol.16, p.148, right column [VILNA. Holocaist Period]).

**[8] Jerusalem of Lithuania in illustrations and documents, collected and arranged by Leyzer Ran. New York, 1974 (на чатырох мовах); ёсьць у Нацыянальнай Бібліятэцы ў Менску.**

Падзеі з жыцьця гета, і ня толькі, былі адлюстраваныя ў дзёньніках загінулых бібліятэкара Германа Крука і літаратара Зэліка Калмановіча[10] ды ў дзёньніку супрацоўніцы жаданай бібліятэкі, літоўкі Оны Шымайтэ. Падзеі, зьвязаныя з выратаваньнем часткі гэбрайскіх архіваў і бібліятэк у Вільні, апісаныя ў брашуры Д. Фішмана “Вугольле з агню: Выратаваньне гэбрайскіх культурных каштоўнасьцяў у Вільні”, а таксама ў ранейшай кнізе на ідыш Шмерке Качэргінскага “Паміж сярпом і молатам”[11]. Адысэя культурных каштоўнасьць віленскіх збораў, што былі вывезеныя ў Нямеччыну, а таксама пераехалі ў Нью-Ёрк, пераказаная ў кнізе Люсі Давідовіч “З таго месца і часу: успаміны, 1938—1947”[12]. У кнізе Давідовіч прыводзяцца таксама цікавыя замалёўкі з жыцьця Вільні ў 1939 годзе аж да самага пачатку вайны. Д. Давідовіч, амэрыканка, што год вучылася ў асьпірантуры “YIVO” ў Вільні, прыводзіць дэталі, якія яе ўразілі, але мясцовымі жыхарамі, напэўна, лічыліся нявартымі ўвагі, і таму не данесьлі,

[9] **Mohrer Fruma, Web Marek. Guide to the YIVO Archives. New York — Armonk — London, 1998. Гл. таксама мой артыкул “Інстытут гэбрайскіх досьледаў IBO ў Нью-Ёрку і матэрыялы ў ягоных зборах, зьвязаныя з гісторыяй Беларусі” (“Запісы БІНІМ”, №26, 2003).**

[10] **Інакш у тэксьце Аляксандра Фрыдмана. — Рэд.**

[11] **Kruk Herman. The Last Days of the Jerusalem of Lithuania. Chronicles from the Vilna Ghetto and the Camps, 1939—1944. New Haven and**

наколькі мне вядома, ніякімі іншымі мэмуарамі і кнігамі “першых Саветаў” у 1939 годзе сталі культурніцкія і грамадзкія гэбрайскія лідэры Залман Рэйзін і Ёсіф Чэрнікаў (Даніэлі), у гэты ж час беларусы страцілі Антона Лукашэвіча, Янку Пазьняка, Аляксандра Ўласава, якія зьніклі ў нашчы НКВД.

Бадай найбольш унікальнае дасягненьне Вільні ў гісторыі гэбрайскай культуры — гэта тое, што яна стала нарадзом ідышысцкага руху, гэбрайскай сэкулярнай ідышмоўнай культуры. Пры высокай канцэнтрацыі гэбрайскага насельніцтва, а таксама навучальных установаў — гімназіяў, школаў і сэмінарыяў, дасьледчых цэнтраў гэбрайскай культуры — Інстытуту “YIVO”, Навуковага Таварыства імя Аніскага, бібліятэкі Матыяса Страшуна — Вільня зрабілася вялікім цэнтрам вывучэньня ўсходнеэўрапейскага гэбраіства. У гэтым Вільня складала моцную канкурэнцыю Менску і Кіеву, дзе таксама камуністычнымі ўладамі з “устаноўкамі на “клясавасьць” і “вывучэньне пралетарыяту” былі створаныя навуковыя цэнтры, пакуль ня зьніклі ў другой палове 1930-х гадоў.

**London: Yale University Press, 2002; Kalmanovich Zylia. Yoman be-geto Vilna ve-ktavim min ha-izavon she-nimtsa be-harisot. Tel Aviv, 1977.**

**[11] Fishman David E. Embers Plucked From The Fire: The Rescue of Jewish Cultural Treasures in Vilna. New York: YIVO Institute for Jewish Research, 1996; Качаргінскі Шмерке. Цвішн гамэр ун сэрп. Цу гешыхтэ фун дэр ліквідацыэ фун дэр ідышэр култур ін Совэтн-Русланд (на ідыш). Парыж, 1949.**

**[12] Davidowicz**

Вільня была таксама мастацкай і літаратурнай гэбрайскай сталіцай. Пачынаючы ад часоў гэбрайскай Асьвеціцкай школы, у горадзе працавалі многія пісьменьнікі — Мардэхай Гакоэн Гінзбург, бацька й сын (Адам Гакоэн і Міха Ёсэф Бэрдычэўскі), Айзік-Меір Дык, Калман Шульман, Ягуда-Лейб Гаакаэн, Эльёкум Цунцар, Яшуэ Штэйнберг, Леў Ляванда, Ёшуа Фін. Тут зьявілася першая тыднёвая газэта па-гэбрайску “Га-Кармель”. У Вільні ўпершыню па-гэбрайску зьявіўся пра свой горад, “Кір’я нэймана” Ш. Фіна, што задаў тон і вызначыў шлях для такога кшталту публікацыяў. Пра гэбрайскую Вільню пісалі таксама дасьледнік Сяргей Бяршадзкі й пісьменьнік Ігнацы Крашэўскі.

На пачатку XX стагодзьдзя ў Вільні працавалі літаратары Шмуэл Нігер, Бал-Махшовэс, Айзік-Меір Вайтар (Дзевяніскі), Лейб Іофэ, Мойшэ Тайч, Залман Рэйзін (пасьля — рэдактар газэты на ідыш “Вілнэр Тог”). У часопісе “Ідышэр Вэлт” друкаваліся артыкулы Антона Луцкевіча пра беларусаў. Найбольш выдатнай постацьцю на віленскім Парнасе быў паэт, драматург і празаік Мойшэ Кульбак, які спалучаў у сваёй творчасьці традыцыйныя гэбрайскія матывы (фальклёр, Кабалу) з мадэрнісцкімі рысамі. Ягоная паэма “Райсн” (Беларусь) застаецца непераўзыдзеным гімнам беларускай зямлі й ейным людзям (Кульбак паходзіў з Смургоняў, пераехаў зь Вільні ў Менск разам зь літаратуразнаўцам Максам Эрыкам, загінуў у сталінскія часы). У канцы 1920-х гадоў была заснаваная літаратурная суполка “Юнг Вілнэ”, у склад якой увайшлі Хаім Градэ, Аўром Суцкевер, Шмерке Качаргінскі, Шымшон Каган, Мойшэ Левін, Лейзар Вольф, Элхонан Воглер, Гірш Глік. Гэтая суполка зрабіла значны ўнёсак у літаратуру і культуру ідыш. У стварэньні суполкі браў удзел вядомы гэбрайскі рэлігійны мысьляр Аўром-Ешуе Гешаль, які напісаў пра Вільню: “Гэбрайская Вільня была асяродкам, дзе муры, скляпеньні, завулкі дыхалі ўспамінамі пра вялізны інтэлект,

**Lucy. From That Place and Time: A Memoir, 1938—1947. New York, 1989.**

**13 Kaplan Edward, Nelson Dee Ann, Sanders Seth L., Abraham Joshua Heschel: Prophetic Witness. New Haven and London: Yale Un. Press, 1998. P. 87, 95.**

памяццю пра самаахвярнасьць у імя гэбрайства, пра шанаваньне Бога і людзей, пра цноту і прагу да ведаў... Мне пашчасьціла ўвабраць дух гораду, у якім нават самыя гаротныя беднякі былі носьбітамі выкшталцонасьці й духовай узьнёсласьці”[13]. Віленскія вобразы й выявы жывуць у творах Аўрома Суцкевера і Аўрома Карпіновіча, апошніх песьняроў гэбрайскай Вільні.

Некалі ў “Нашай Ніве” прачытаў я, здаецца, у Сяргея Паўлоўскага, што Вільня мае нейкую нявыказаную таямніцу, пра якую гаворыць кожны, хто там бываў. І што на самай справе таямніца гэтая — беларускасьць Вільні. Гэбрайскасьць Вільні робіцца, зрабілася сёньня гэткай жа таямніцай. Мусім жа берагчы яе, бо бяз тых таямніцаў гэты горад — ужо ніякая ня Вільня.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/12/14**
[image]

# Андранік Антанян Зьніклая Вільня

**АНДРАНІК АНТАНЯН (нар. у 1974 у Дыліжане, Армэнія) — журналіст. У 1997 годзе скончыў Віленскі пэдагагічны ўнівэрсытэт. У 1999 годзе атрымаў ступень магістра філялёгіі Віленскага ўнівэрсытэту. Апошняя публікацыя — напісаны ў суаўтарстве з Алесем Белым артыкул "Панамі будзеце, панамі!" (у Спадчына №4/2002).**

Штодня ходзячы вуліцамі Вільні на працягу апошніх гадоў так 10, занадта часта лаўлю сябе на думцы, што Горад, якім я быў зачараваны, зьнікае без папярэджаньняў і тлумачэньняў. Гэты тэкст — толькі спроба зрабіць аўдыт маёй памяці. Для гісторыі Вільні, магчыма, ня так і важна, дзе знаходзілася тая ці іншая кропка грамадзкага харчаваньня альбо месца масавага адпачынку працоўных. Але гэта не гісторыя места, гэта толькі нясвоечасовы мэмуар, дзе прыватныя, ні да чога не абавязваючыя назіраньні важнейшыя за дакладнасьць і выверанасьць фактуры.

Прыметнік "зьніклая" ў дачыненьні да Вільні ўжываецца гэтак жа часта, як перад вымаўленьнем сталіцы Італіі цяжка ўстрымацца ад таго, каб не дадаць "вечны". У кожнага зьнікае свая Вільня, і кожны з нас па-свойму схільны разумець Вечнасьць.

Пісаць пра Вільню для чытача, які ніколі не перасякай беларуска-літоўскай мяжы, куды лягчэй, чым здаецца. Асабліва калі гэты чытач быў узгадаваны на савецкай кінаіндустрыі, якая ў 70—80 гадох мінулага стагодзьдзя актыўна выкарыстоўвала дэкарацыі рупліва адрэстаўраванага Старога Места. На скрыжаваньні Жыдоўскай і Шкляной вуліцы зьняты не адзін эпізод блякбастэру "Беларусьфільму" "Бурмін".

## Жыве ў Вільні.

У “Прыгодах Шэрлака Холмза і доктара Ўотсана” Бобкін-стрыт з блакітнага экрану мы бачым Дамініканскую вуліцу. Сэрыялы пра жыццё Захаду, якімі захапляліся савецкія гледачы, — “Багач, бядняк”, “Амэрыканская трагедыя” — былі зьнятыя на “Літоўскай кінастудыі” з выкарыстаньнем падручных дэкарацыяў: Палацу ў Вярках, гатэлю “Летува” і да т.п. “Прыгоды Электроніка” таксама здымаліся тут. Ультрасучасная школа, у якой Электронік выяўляў свае фэнамэнальныя здольнасьці, знаходзіцца ў мікрараёне Лазьдзінай. Гэтая мікрага ў 70-я гады лічылася ўзорам савецкай архітэктуры. Магчыма, у савецкіх пастаноўшчыкаў усіх кінастудыяў было цяжка з фантазіяй, а можа, Вільня была адзіным горадам, які адпавядаў іх уяўленьню пра казку, сярэднявечча і замежжа адначасова.

Робячы занатоўкі для гэтага тэксту, я злавіў сябе на думцы, што ў горадзе нічога не засталося на сваім месцы. Усё ўстала дагары нагамі, альбо наадварот. Часта лаўлю сябе на тым, што мармычу сабе пад нос, быццам горад з кожным днём траціць тое, што мяне ў ім зачароўвала які дзясятак гадоў таму, — свой флёр, які ён атрымаў напрыканцы 50-х гадоў мінулага стагодзьдзя — тады, калі пачалося аднаўленьне віленскага Старога Гораду яго новымі (а можа, і чарговымі) гаспадарамі. Па заканчэньні гэтай працы візытоўкай Вільні сталі, як гэта ні дзіўна, вуліцы колішняга жыдоўскага гета. Вуліцы, якія ні ў XIX, ні ў пачатку XX стагодзьдзя не выклікалі асаблівага захапленьня ў віленчукоў. Тагачасныя турысты наогул стараліся не хадзіць тымі крывымі, вузкімі і бруднымі вуліцамі, што сёньня зьяўляюцца самай дасканалай дэкарацыяй для нашага ўяўленьня пра Сярэднявечча.

Мой знаёмы Пранас Моркус кажа, што тыя зьмены, якія руйнуюць горад, адбываюцца таму, што літоўцы ня любяць Вільні. Маўляў, калі Вільню атрымалі ў свае рукі, як гэта звычайна бывае, атрымалі зусім ня тое, пра што марылі на працягу 1919—1939 гадоў. Баюся, пачуцьці тут мала вінаватыя — проста Вільня ўпершыню за многія стагодзьдзі стала-такі сталіцай паўнавартаснай краіны і горад стаў выконваць зусім іншыя функцыі і адпавядаць зусім іншым уяўленьням. Зь ціхага і вельмі сымпатычнага закутку імпэрыі Вільня ператварылася ў горад, які мусіць рэпрэзэнтаваць краіну.

**Тутэйшыя / палякі**
Я кажу — горад сёньня мала пазнаецца, бо мне часам здаецца, што карэнным чынам зьмяніўся склад яго насельніцтва.
10 гадоў таму адзінай мовай, якой паслугоўваліся віленскія паліцэйскія, быў паўночна-заходні дыялект беларускай мовы. Працаўнікі віленскага таксапарку як адзін паходзілі зь вялікай Віленшчыны, як і абсалютная большасьць цырульніц.
Прадавачкі ў крамах у вольную хвілінку маглі пахваліцца тым, што паходзяць з Ашмянскага (Воранаўскага, Смаргонскага і г.д.) раёну Гарадзенскай вобласьці. Такое ўражаньне, што гэтыя людзі проста зьніклі з этнічнай мапы гораду. Але калі верыць сацыёлягам, вялікай іміграцыі сярод жыхароў Вільні ды краю не было і за 10 гадоў этнічны склад гораду ня так ужо й зьмяніўся. Проста з надыходам капіталізму найбольшыя зьмены дазналі тыя сфэры дзейнасьці, якія за савецкім часам кантралявалі тутэйшыя.
Манаполія віленскага таксапарку скончылася недзе ў сярэдзіне 90-х гадоў, калі кожны чалавек, які валодаў іншамаркай на хаду і ня меў сталай працы, ахвотна папаўняў шэрагі таксістаў.
Маленькія крамкі ў цэнтры гораду замянілі крамы самаабслугоўваньня, якія належаць вялікім (у тутэйшых мерках, натуральна) гандлёвым сеткам. Якія адзначаюцца ня толькі ўніфікацыяй асартымэнту тавараў, але і вялікай цякучкай кадраў. Твары прадавачак, якія працуюць у суседняй краме, запомніць немагчыма.
Таксісты (разам з афіцыянтамі, швайцарамі і прадаўцамі гастраномаў) з эліты савецкай рабочай клясы перайшлі ў разрад нізкакваліфікаванай рабочай сілы.
Польскую прысутнасьць у горадзе можна заўважыць хіба ў нядзелі на Дамініканскай вуліцы, каля ўваходу ў касьцёл Сьвятога Духу, дзе адбываюцца набажэнствы па-польску.
У пачатку 1990-х гадоў на сьценах дамоў на вуліцы Мастовай рэгулярна зьяўляліся графіці “Wilno Nasz” і т.п. Але ўжо гадоў сем, як і іх не відаць.

**Цішыня**
За гэтыя гады горад стаў больш сталічным, мітусьлівым і адпаведна шумным. Да гэтай сталічнасьці спрычынілася і постсавецкая аўтамабільная рэвалюцыя. Ня ведаю, ці

засталася хоць адна вуліца, па праезнай частцы якой можна было б спакойна прайсьціся, напрыклад, а 21 гадзіне ў пятніцу (аўторак, чацьвер), як дзесяць гадоў таму. Сёньня ўжо немагчыма ўявіць, што нядзельныя званы Катэдральнага касьцёлу можна было пачуць у радыюсе 2—3 кэмэ. Сталічнасьць на Вільню звалілася даволі нечакана. Калі ўжыць спартовую тэрміналёгію, то можна сказаць, што горад выйшаў у вышэйшую лігу. І калі працягваць фармуляваць свае думкі моваю газэты “Прессбол”, трэба дадаць: “Зь пераходам у вышэйшую лігу трэнэры мусілі пазбавіцца шэрагу гульцоў, якія мелі прыхільнікаў сярод публікі, але чыя гульня не адпавядала таму ўзроўню гульні, што дэманструюць новыя супернікі каманды”.
Вось сьпіс-мартыралёг таго, што не знайшло сабе месца ў новай сталіцы.

**“Antaris”**
Невялічкі бар на адну стойку, які знаходзіўся ў сутарэньні аднаго з дамоў Мастовай вуліцы. Працаваў у 1993—1995 гадох. Пры бары ў суседнім пакоі быў аддзел продажу алькаголю на вынас і пункт абмену валюты. У пачатку 1990-х абменьнікі даволі часта дзялілі дах з барамі і невялічкімі крамамі. Рэдакцыя тагачаснай “Нашай Нівы” знаходзілася за 50 мэтраў ад гэтай установы (канечне, калі ісьці дварамі). Супрацоўнікаў “НН” вабілі ня толькі ціхі бар зь мінімумам незнаёмых кліентаў, за якім стаяў самы добры і вясёлы віленскі афіцыянт Саўлюс, але і пункт абмену валюты, якім загадваў былы мент (а мо пажарны) Тадзік. Прыцягальнасьць Тадзіка-валютчыка была ня столькі ў тым, што ён гаварыў па-беларуску, але ў тым, што ён браў у абмен самыя мурзатыя амэрыканскія купюры, хай і па курсе, крыху ніжэйшым, чым у банках. У пачатку 90-х віленскія банкі адмаўляліся браць амэрыканскія купюры ня першай сьвежасьці, а менавіта такімі — зацёртымі, пакрэмзанымі надпісамі на арабскай, кітайскай і пэрсыдзкай мовах, плаціў нам колішні выдавец газэты Павал Жук. Усё гэта рабіла “Антарыс” любімым месцам правядзеньня вольнага часу супрацоўнікамі тады не адзінай у Вільні беларускай газэты.

Асартымэнт бару быў хоць на сёньняшнія меркі і небагаты, але вельмі пярэсты. Там былі і дарагія французскія каньякі,

баўгарскія брэндзі, нейкія араматызаваныя дэсэртныя віны, якіх ні да таго, ні пасьля таго я ня бачыў, ну а тым больш не рызыкаваў пакаштаваць. Зь неалькагольных напояў у мэню фігуравалі сокі і кава. Закускі таксама не вызначаліся разнастайнасьцю: ні салатаў, ні сьвіных адбіўных, толькі гарачыя канапкі. Адсутнасьць у мэню гарбаты і піва раздражняла мяне і майго тагачаснага кампаньёна Дзёню Р. Але за штодзённую вернасьць "Антарысу" мы ад бармэна Саўлюса мелі шэраг паблажак, а менавіта:
а) нам дазвалялася прыносіць з сабою піва, якое мы набывалі ў суседнім гастраноме "Šalna";
б) Саўлюс у мікрахвалевай печы гатаваў нам ваду для гарбаты;
в) у тыя дні, калі тагачасны выдавец "Нашай Нівы" П. Жук у чарговы раз забываўся пра існаваньне нашага калектыву і зацягваў з выплатай заробкаў (а такіх дзён было нямала), бармэн наліваў нам напавер, пазычаў грошы на піва і г.д. "Антарыс" спыніў сваё існаваньне ў 1995 годзе. Працоўны калектыў газэты "Наша Ніва" перабраўся ў кавярню гатэлю "Žaliasis Tiltas", якая таксама ў мінулым часе знаходзілася на рагу Кальварыйскай і Зыгмунтоўскай. Наш любімы бармэн Саўлюс працаваў пазьней у розных, але звычайна ў "прашмотных" кавярнях, куды кожны дзень не паходзіш. Пазьней ён пераквалiфікаваўся ў выкладчыка на курсах падрыхтоўкі кіроўцаў. Тадзіка-валютчыка пасьля закрыцьця кавярні я ня бачыў. Хаця Вільня — горад маленькі. Выйдзеш у горад і заўсёды сустрэнеш каго трэба, а яшчэ часьцей — каго ня трэба.

**"Ledainė"**
Кавярня. Знаходзілася на Замкавай вуліцы паблізу ад скрыжаваньня Замкавай і Сьв. Яна. Я трапіў туды ўпершыню ў 1991 годзе, калі прыехаў у Вільню разам з сваім аднакурсьнікам-віленчуком на мянушку Клім. Кавярня існавала недзе зь сярэдзіны 1970-х. Прынамсі, гэтак казалі яе заўсёднікі. Праверыць, ці праўда гэта, — нескладана, але ў гэтым няма ніякай патрэбы. Памяшканьне было вельмі маленькім, 3 х 6 мэтраў, ня больш, зь вельмі нізкай стольлю. Прылавак у глыбіні залі і 8 высокіх сталоў-стоек. Асноўная публіка — дзіўна апранутыя студэнты філфаку і гістфаку Віленскага ўнівэрсытэту ды іншая багема. У сувязі з тым, што

курыць у залі не дазвалялася, а ў пачатку 1990-х малады чалавек, які не паліў тытуню, лічыўся альбо хворым, альбо проста нейкім ненармальным, курцы выходзілі з кавай на сьвежае паветра і прыладжваліся на падваконьнях вокнаў першага паверху суседніх дамоў абапал галоўнай вуліцы Віленскага Старога гораду. Сёньня Замкавая — цэнтральная вуліца сталічнага кічу, з процьмай кавярняў, гандляроў, польскіх і японскіх турыстаў, таму месца для небагатых студэнтаў на ёй больш няма. Цяпер гэта здаецца неверагодным, але ў пачатаку 90-х можна было, не напружваючы галасавых зьвязак, перамаўляцца з знаёмым, які стаяў на другім баку вуліцы.

**“Neringa”**

“Час у Вільні сыходзіць скрозь дзьверы кавярні”, пісаў ляўрэат Нобэлеўскай прэміі І. Бродскі ў вершы “Neringa”. Кліентура складалася з прадстаўнікоў акадэмічнай ды творчай інтэлігенцыі, а таксама з тых, што лічылі сябе такімі альбо ім спачувалі, і вызначалася маніякальнай вернасьцю сваёй любімай кавярні на працягу без малога 30 гадоў. Жыцьцё ў гэтай кавярні пачынала вірaваць ужо а 8-й раніцы, калі за сваімі столікамі зьбіраліся тыя пастаянныя кліенты, што мелі добрую завядзёнку пачынаць чарговы дзень жыцьця зь філіжанкі кавы ды кілішку каньяку і нясьпешлівага назіраньня праз шырокае сьветлае акно за мінакамі, што сьпяшаліся на працу. Часам раніцай заходзіў сюды і я. Бо а 8-й раніцы ў гэтай частцы гораду нельга больш нідзе атрымаць гарачага сьняданку за разумныя грошы.

Сёньня мала хто здагадваецца, што п’яны дэбош, учынены галоўным героем раману Рыгора Семашкевіча “Бацька ў калаўроце”, здарыўся акурат у “Нерынзе”.

Усе рамонты, зьмены ўладальнікаў і іншыя трасцы мала адбіліся на інтэр’еры “Нерынгі”, і ён захаваўся ў аўтэнтычным выглядзе. Калі я быў там апошні раз, дык фантан, у якім Дзядзька мыў натруджаныя ногі, яшчэ біў. Адно што афіцыянткі больш ня ходзяць у “кофточках из батиста”, дый мясцовыя футбалісты ўжо не карыстаюцца такой папулярнасьцю, як у часы Бродзкага.

**“Вочіų”**

Гэты бар знаходзіўся на рагу Сьв. Ігната і Татарскай. У сваіх успамінах “Жыцьцё і ўзьнясеньне Ўладзімера Караткевіча” Адам Мальдзіс згадваў, што падчас сваіх віленскіх выправаў сябры любілі зайсьці ў гэты бар, і прыводзіў двухрадкоўе У. Караткевіча, якое ілюстравала гэтую любоў:

Па дарозе ў “Бочу”
Нікуды ня збочу.

У адрозьненьне ад У. Караткевіча і А. Мальдзіса, я быў у гэтай кавярні ўсяго пару разоў. У 1994—1995 гадох гэты бар быў аблюбаваны “мэталістамі”, і там раз на тыдзень праходзілі вечарыны “цяжкой” музыкі, на якія, уласна я і прыходзіў. Хутка ў бару зьмяніліся ўладальнікі, якія сьцямілі, што ад аматараў цяжкога року вялікага прыбытку ня будзе, і з бару зрабілі дарагую рэстарацыю, вядомую сёньня пад назвай “Stiklių Bočiai”.

**“Ansamblis”, “Šunparkis”, “Meninkų Rumai”**

Зьнікненьне любых месцаў масавага адпачынку з мапы Вільні ўспрымаецца вельмі часта як непазьбежнае наступства эканамічнага разьвіцьця. Аднак да зьнікненьня гэтых трох кропак, што месьціліся ў колішнім губэрнатарскім палацы, прыклаў руку адзін чалавек — аматар гістарычнай сымболікі, апошні першы сакратар кампартыі ЛССР і першы прэзыдэнт Літоўскай Рэспублікі Альгірдас Міколас Бразаўскас, які палічыў, што лепшага за Мураўёўскі палац месца для такой значнай установы, як прэзыдэнтура, не знайсьці. Магчыма, ён меў рацыю.

Адным махам горад пазбавіўся: а) Дому мастакоў і кавярні пры ім; б) кавярні “Ansamblis”, якая атрымала назву ў гонар ансамблю народнага танцу “Lietuva”, што разьмяшчаўся ў гэтым палацы; в) ціхага і прыгожага парку, у народзе вядомага пад назвай “Šunparkis” (“сабачы парк”).

У Дом мастакоў я заходзіў рэдка, толькі каб паслухаць сучасную авангардную музыку (Райх, Штакгаўзэн, Глас, Кейдж і да т.п.). У тамтэйшай кавярні бываў яшчэ радзей. Часьцей даводзілася бываць у “Ансамблізе”, куды як магнітам цягнула студэнтаў і выкладчыкаў Віленскага ўнівэрсытэту. У якасьці магніту гаспадары кавярні выкарыстоўвалі нізкія цэны на каву,

гарбату і канапкі. Паліць у кавярні не дазвалялася, алькаголь не прадаваўся. Магчыма, гэта было мінусам. Але штовясну ўва ўнутраны дворык выносіліся сталы з попельніцамі.
Алькаголь студэнты спажывалі ў дагэтуль дзейнай кавярні “Aliuminatas” і на лавачках “Сабачага парку”. Праўда, ніколі ня бачыў, каб там выгульвалі сабак.
Пасьля таго як тут атабарылася прэзыдэнтура, Дом мастакоў пераехаў у іншы гістарычны будынак — Ратушу, а кліенты кавярні “Ansamblis” пацягнуліся ў кавярню зь вельмі сымбалічнай назваю “Morgas”, што знаходзіцца побач з касьцёлам Сьв. Яна ўва ўнівэрсытэцкім дворыку.

**Кафэтэр у Цэнтральным гастраноме і інш.**
Гаворачы пра віленскія кавярні, варта таксама ўзгадаць і пра кафэтэр, які быў на другім паверсе віленскага Цэнтральнага гастраному. Тут бізнэс-турысты зь Беларусі, што ў пачатку і сярэдзіне 90-х гадоў прыяжджалі прадаць на тутэйшых базарах пару бутэлек гарэлкі і колькі слоікаў маянэзу, часта пілі сваю каву. Цэнтральны гастраном згінуў безь сьлядоў, захапіўшы з сабою і кафэтэр.
Даволі ўтульны быў бар у сутарэньнях Акадэмічнай бібліятэкі. Дарма што ён працаваў пры дзяржаўнай установе — там чамусьці налівалі піва. Цяпер там гей-клюб з строгім фэйс-кантролем. Калі верыць пагалоскам, яго трымае каханак майго аднакурсьніка.

**Кіно**
Пра даваенныя кінатэатры Вільні шмат інфармацыі можна знайсьці ў віленскіх дзёньніках Максіма Танка. Ніводзін з кінатэатраў, у якіх народны паэт-сынэмафіл пакідаў свае грошыкі, так і не дажыў да нашых дзён. Адзіным мастком паміж кінатэатрамі 90-х і 30-х служыў “Геліяс”, кінатэатар зь дзьвюма залямі на Вялікай вуліцы праваруч ад віленскай Ратушы, назва якога фігуруе ў дзёньніках народнага паэта. Аднак аўтар “Ліскоў календара”, відаць, тут так і не паглядзеў кіно.
Віленскім кінатэатрам я абавязаны ў першую чаргу тым, што даволі хутка навучыўся чытаць па-літоўску. Рэч у тым, што разгорнутыя анонсы фільмаў, якія ішлі ўва ўсіх віленскіх кінатэатрах, друкаваліся толькі ў адной газэце “7 Meno dienos”

і хоця-няхоця я мусіў чытаць гэтыя анонсы па-літоўску. Першым арыкулам на гэтай мове быў нэкралёг Фэдэрыка Фэліні. Здарылася гэта ў бары кінацэнтру “Planeta”, які называецца ўжо “Skalvija”.

Большасьць кінатэатраў не дажыла да нашых дзён. Мадэрнізаваная “Латэрна магіка” слаба вабіць сучасную моладзь, дый паход у кіно на дваіх каштуе як добры абед зь віном. Адышоў у нябыт кінатэатар “Vilnius”, якому я абавязаны знаёмствам з галівудзкімі фільмамі “Legends of the Fall”, “The Pelican Brief”. Хто цяпер памятае пра гэтыя фільмы? На “Восеньскую баляду” схадзіў за кампанію разам зь першай жонкай Сяргея Харэўскага, а на справу з пэліканамі мяне зацягнуў Дзёня Раманюк, каб я яму дапамагаў разьбірацца зь літоўскімі тытрамі. Праўда, карысьці ён зь мяне меў няшмат, бо я так дагэтуль і не зразумеў, пра што гэты фільм. Падазраю, што пра нейкую змову. Апошні фільм, які мне давялося паглядзець у гэтым кінатэатры, быў “Белы кот, чорная котка” Эміра Кустурыцы.
У кінатэатры “Геліяс”, у якім так і не атрымаў асалоды ад кінамастацтва М. Танк, я і сам быў усяго два разы. Першы раз вадзіў туды М. Б.; фільм, як цяпер памятаю, — нейкі рэмэйк на сюжэт “Трох мушкетэраў”. Праўда, у дажджлівыя дні дзяўчат вялі ў кінатэатры не абавязкова для таго, каб паглядзець фільм. Другі і апошні раз у гэтым кінатэатры я быў у 1999 годзе, і… вы будзеце сьмяяцца, але фільм, які я там глядзеў, называўся… “Белы кот, чорная котка”.
У кінатэатры “Aušra”, які знаходзіўся на Замкавай, фільму Эміра Кустурыцы я ня мог паглядзець з той простай прычыны, што гэты кінатэатар спэцыялізаваўся на паказе старых індыйскіх стужак. Я неаднаразова зьбіраўся паглядзець на аматараў творчасьці бамбэйскіх эйзэнштэйнаў, але не пасьпеў. “Аўшра” памерла ціха і непрыкметна. Проста зьнікла з апошняй паласы тыднёвіка “7 Meno Dienos”.
Не паглядзеў я фільмаў Кустурыцы і ў кінатэатрах “Pergalė”, “Tėvynė” і “Draugystė”. Таму можна спакойна лічыць, што яны зьніклі без майго непасрэднага ўдзелу.

**“Plokštelės”**
Музычная крама знаходзілася на Мастовай вуліцы. Прадаваўся

там вініл, тады яшчэ экзатычныя і вельмі дарагія кампакт-дыскі ды пірацкія касэты, прадукаваныя фірмай “Zaraza Records”, якую ўзначальваў вядомы віленскі “мэталіст” на мянушку Papa Jonas. Дарэчы, абаронцы правоў гігантаў гуказапісу не дэманстравалі ніякай цікавасьці да яго падкрэсьлена пірацкай дзейнасьці. Але гэта ўжо іншая гісторыя.
Гэтая крама мела найбольш шырокі выбар вінілавых дыскаў як вытворчасьці літоўскай / савецкай, так і фірмаў з краінаў былога сацлягеру. У абедзены перапынак я любіў сюды заходзіць, каб паўгадзінкі пакорпацца ў вінілавых джунглях. Актыўным пакупніком у гэтай краме я ніколі ня быў.
У сярэдзіне 90-х здавалася, што аналягавыя носьбіты гуказапісу дажываюць апошнія дні, дый грошай на іх не было.
У 1998 годзе “Plokštelės” назаўсёды зачынілася на пераўлік.
А аматары вінілу папаўняюць свае калекцыі ў краме “Thelonious” на вуліцы Шкляной.

**“Antikvarinė Knyga”**
Букіністычная кнігарня на Вялікай Пагулянцы, таксама вядомай як “Basanavičiaus”, прымала на камісійны продаж кніжкі, якія, на думку загадчыка крамы, мелі хоць нейкі попыт сярод калекцыянэраў-бібліяфілаў. Бібліяфілы — народ малапрадказальны, таму на паліцах гэтай кнігарні можна было знайсьці выданьні Міністэрства беларускіх спраў, а таксама камплекты віленскіх беларускіх часопісаў.

Заходзіў я ў гэтую краму часта, хаця ніводнай кніжкі там так і не набыў. Я зусім не абыякавы да бібліяграфічных рарытэтаў, але пэрспэктыва ператварыць сваю кватэру ў філіял бібліятэкі імя Ўрублеўскага мяне ніколі ня вабіла. Лепей маркі зьбіраць. Яны і месца менш займаюць.

**Начныя крамы**
У 1993—94 гадох былі ці ня ў кожным двары. Асартымэнт мелі звычайна небагаты: піва, моцныя алькагольныя напоі, няхітрыя закускі, печыва. Пасьля таго як заканадаўства, што рэглямэнтуе продаж алькаголю, стала больш жорсткім, яны вокамгненна зьніклі з далягляду. Адзіная кропка, якая, нягледзячы на ўсе заканадаўчыя пературбацыі апошніх 10 гадоў, гандлявала і гандлюе круглыя суткі алькаголем, знаходзіцца на

скрыжаваньні Кальварыйскай і Юзапавічаўс. Будзеце ў Вільні — зазірніце. Там мала што зьмянілася з тых вясёлых часоў. Шапікі, якія засталіся літоўскай сталіцы ў спадчыну ад каапэратыўнага руху СССР, былі зьліквідаваныя гарадзкімі ўладамі параўнальна нядаўна. Ліквідавалі іх з эстэтычнай прычыны, бо гарадзкім уладам надакучыла глядзець, як іржавыя мэталічныя канструкцыі паскудзяць абрысы вуліцаў. Самы заўважны зь іх быў на праспэкце Гедыміна каля офісу літоўскага агенцтва навінаў ELTA. Працаваў 7 дзён на тыдзень усю пару.
Калі Вы спытаецеся, дзе ж у Вільні сярод ночы ў цэнтры гораду можна набыць пушку запалак, — я не знайду што Вам адказаць.

Мартыралёг мой далёка ня поўны. Не пра кожнага нябожчыка ў патрэбны момант можна знайсьці ў сабе сілы сказаць добрае слова.

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **2003/12/14**
[image]

# Сакрат Яновіч
# Вільня — сталіца слабых

**САКРАТ ЯНОВІЧ (нар. у 1936 у мястэчку Крынкі на Віцебшчыне) – пісьменнік, публіцыст, сталы аўтар „ARCHE”. Выдаў селета чарговых выпускаў альманаху „Annus Albarutenicus”.**

Вільня ўяўляецца мне самым няшчасным стольным горадам у Эўропе. Знаходзіцца на сутыку ажно трох этнасаў, якіх ніводзін ня можа пахваліцца трывушчым патэнцыялам. У гэтым сэнсе можна правесьці паралель з Рэччу Паспалітай. Аб абодвух Народаў, хоць, на думку шмат якіх гісторыкаў, няшчасьцем і катастрофаю Польшчы было глынаньне ёю Вялікага Княства Літоўскага, што адцягвала яе ад заходняга разьвіцьця. Вільня — славянская выспа ў Сярэднявеччы на разьлівах балтаў” — ад першых сваіх гарадзкіх пачаткаў сталіца беларускай імпэрыі, неўзабаве ад мора да мора і ад заходняга славянства да падмангольскага Прымаскоўя. Што і загубіла яе, валадарку пустых прасторaў, якія ўсяляк высмоктвалі яе цывілізацыйную базу. Гляньце на мапу гістарычнай Літвы і зьвярніце ўвагу, як густа гарадоў у арэале цяперашняй Беларусі ды як рэдка іх на поўдзень ад Палесься, на ўсход ад Воршы з Смаленскам. Польскае Каралеўства было малым тэрытарыяльна, але моцным матэрыяльна, затым і духоўна. Нешта накшталт сёньняшніх малюткіх Нідэрляндаў, бюджэт якіх такі ж, як і ўсёй кантынэнтальнай Расейскай Фэдэрацыі. Спаборніцтва Вільні з Масквою за імпэрскасьць мусіла ў пэрспэктыве закончыцца жахлівай катастрофаю ў выглядзе акупацыі ў палове сямнаццатага стагодзьдзя. Проста нарошчаныя

магутнасьці аказаліся ўжо непараўнальнымі, хоць мэнтальна ліцьвіны тым часам дастаткова пачужэлі ад стагодзьдзямі асобнага лёсу.
Польскі саюзьнік, безь якога не ўяўляўся паратунак, дамінуючы мілітарна і культурна, пераўтвараў Княства ў правінцыю, а Вільню — у другую сталіцу (ад Люблінскай уніі ў 1569 г.). Другая сталіца, натуральна, прыпадабнялася да першае, пераўтвараючыся з часам у польскамоўны горад. Віленская канцылярыя бойка пераймала лацінскія літары; тэксты кшталтам Еўлашэўскага ўсё меней адрозьніваліся ад польскае мовы сынтаксысам, лексыкай, асабліва юрыдычнай.

Разам зь пераўтварэньнем Вялікага Княства Літоўскага ў другую польскую дзяржаву, урэшце ліквідаваную Трэцямайскай канстытуцыяй, Вільня апускаецца ў малазначнасьць. Гэтая яе польскасьць, нават ува ўмовах імпэрыі Аляксандра I, незвычайна расквітнела Віленскім унівэрсытэтам; яму падлягала асьвета на тэрыторыі былога ВКЛ (пра ўстанаўленьне расейскага школьніцтва ў тую пару нават пецярбурскія міністры ня думалі; ім духоўная Польшча пачыналася ад Віцебску).
Вільня зрабілася гігантам польскае культуры, але карлікам палітыкі. Рэгіёнам, эканамічна адсталым ад прывісьленскага басэйну прыблізна ў тры пакаленьні. Тут жылі вельмі бедна і адначасна вельмі культурна. Гэта не парадокс, гэта дзеяньне закону інэрцыі ад мінулых часоў, калі ў Вільні яшчэ вырашалася нешта важнае для краю. Даволі зноў зірнуць на мапу, у гэты раз разьмяшчэньня лясных “партыяў” у Студзеньскае паўстаньне. У Царстве Польскім яны сядзелі па ўсёй тэрыторыі адна каля аднае. У той жа час Кастусь Каліноўскі камандаваў усяго парай дзясяткаў атрадаў, зь якіх літаральна некалькі дзейнічалі далей ад Вільні, між Менскам і Дняпром; рэшта — у Панямоньні ды на Паазер’і.
У міжваенны пэрыяд, калі Пілсудзкі ня даў асталявацца ў Вільні Літоўскай Рэспубліцы, горад вёў жальнае існаваньне глыбокае правінцыі. Ён ажыў разам зь вяртаньнем яму стольнасьці, на жаль, пад плач этнічных чыстак (у акупацыю вынішчэньня жыдоў, а ў пасьляваеньне — антыпольскіх сталінскіх рэпатрыяцыяў). У выніку насельніцтва Вільні, у мінулым шматэтнічнае, наглядаецца цяпер як монаэтнічнае,

завезенае сюды пераважна з Жмудзі. У Вільні некалі было чуваць на тратуарах пяць моваў: найчасьцей жыдоўскую і польскую, але зусім нярэдка расейскую, нямецкую, і паўсюдна ў кірмашныя дні — беларускую. Нядаўна быў я ў Вільні — акрамя сучаснай літоўскай я толькі пару разоў пачуў расейскую і адзін-адзінюткі раз польскую (маю на ўвазе сам горад, а не яго пэрыфэрыі). Прычым жмудзкая сталічнасьць надта паздаровілася urbi Вільні: зьнікае правінцыйная занядбанасьць.



Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/12/14**

# Алесь Аркуш
# Паўгоду ў скуры віленцука

**АЛЕСЬ АРКУШ (нар. у 1960) — пісьменьнік, выдавец. Выдаў сёлета кнігу паэзіі “Прывід вясны”. Жыве у Полацку.**

**Я** некалькі разоў у сваім жыцьці быў не ў сваёй скуры. Аднойчы — нават у скуры дыктатара невялікай афрыканскай краіны. А здарылася гэта так.

Быў 1988 год. У Заслаўі менскія талакоўцы ладзілі агульнабеларускае купальле. Згодна з усімі правіламі, традыцыямі і запаветамі. Зразумела, на такім мерапрыемстве мусілі быць усе нацыянальныя героі і правадыры: пачынаючы з Пазьняка, Арлова, Марачкіна і канчаючы Вячоркам, Івашкевічам, Вітушкам ды Сысом. Ня мог прамінуць такой падзеі і новапалачанін Сяржук Сокалаў-Воюш. З Наваполацку ў Заслаўе прыкаціў “Ікарус”, сярод пасажыраў якога былі і я з жонкай.

Невялікі аматар фальклёрных ігрышчаў, я бязмэтна аціраўся ў беларускамоўным натоўпе. Тут было багата маладых літаратараў з “Тутэйшых”, і я час ад часу спыняўся, сустрэўшы чарговага паплечніка зь літсуполкі. Пасьля кожнай размовы я набрыньваў сталічнымі навінамі. Мая жонка, выхаванка сталічнага парнату, бавіла час з сваімі аднакашнікамі, якія і ўтваралі касьцяк тагачаснай менскай “Талакі”. Начаваць у ваколіцах Заслаўя мне, па шчырасьці, зусім не жадалася. Пагатоў, мая Тацяна была цяжарная.

Высьветлілася, што дахаты неўзабаве мусілі вяртацца Арлоў з Пазьняком. Мая просьба прагучала амаль як зварот аб

паратунку. Арлоў патлумачыў: вольнае месца ў машыне толькі адно, маўляў, Тацяну могуць забраць, але мяне — не. І тут нечакана Пазьняк камандным голасам заявіў: “Бярэм дваіх, ён (Зянон кіўком галавы паказаў на мяне) паедзе ў багажным аддзеле”. Дагэтуль я ніколі ня езьдзіў у аўтамабільным багажніку, але ўзрадаваўся неверагодна.
Шостым пасажырам “Нівы” скульптара Алеся Шатэрніка быў мастак Алесь Марачкін. Я здолеў уціснуцца ззаду ў багажны аддзел. Па дарозе да Менску Пазьняк кінуў мне: “Ты ў нас як дыктатар невялікай афрыканскай краіны, якога таемна вывозяць за мяжу”. За мяжу ў 96-м давялося таемна зьехаць самому Зянону Станіслававічу. А я да сёньня шчыра ўдзячны яму за незвычайны падвоз.

У Вільні ж у 2001 годзе я апынуўся ў скуры сьпікера беларускага парлямэнту на выгнаньні. Няхай сабе й часткова. Мяркуйце самі.
Улетку таго году Сяргей Дубавец запрасіў мяне ў крывіцкую Мэкку папрацаваць на “Балтыйскіх хвалях”. Нічога пільнага мяне ў Полацку не трымала, і я пагадзіўся. Прыехаў разам з Тацянай і пачаў шукаць часовае жытло. На першыя дні нас прытуліў калега з “хваляў” Сяргей Харэўскі. Пасьля марных самастойных пошукаў я зьвярнуўся па дапамогу да свайго старога знаёмага, Алега Мінкіна. А ён і кажа: ёсьць тут адна кватэрка ў Фабіёнішках — тры пакоі, усе выгоды, у ёй Шарэцкі зь сям’ёю жыў. Якраз напярэдадні майго прыезду ў Вільню Сямён Шарэцкі, былы старшыня Вярхоўнага Савету XIII скліканьня, пакінуў Літву, перабраўшыся ў Штаты. Паехалі глядзець. Гаспадыня кватэры Тэрэза, прыязная беларуска з Астравеччыны, з прыемнасьцю пагадзілася здаць яе новаму кватаранту. “Тут спаў ахоўнік, — паказала яна на канапу, якая неяк нязвыкла стаяла ў невялікім калідорчыку ля ўваходных дзьвярэй. — Вы ўжо прабачце, не было каму прыбраць. Калі не замінае, дык няхай і застаецца”. — “Няхай застаецца”, — пагадзіўся я.
У нас любяць мянціць языкамі пра беларускую страту тысячагодзьдзя — Крывіч-гораду. І прыплятаць сюды Гедыміна, Барбару Радзівіл, Івана ды Антона Луцкевічаў, “Нашу Ніву” зь “Вянком” Багдановіча… Згодны, гэты горад моцна зьнітаваны з шматлікімі культурнымі дасягненьнямі беларусаў. Але ўсё гэта

ў мінулым.
Інтэлектуальна кволы й колькасна малалікі беларускі рух на пачатку XX стагодзьдзя ня мог стаць у Вільні ўплывовым. Мяне заўсёды бянтэжыла, калі я чытаў у мэмуарах дзеячоў беларускага адраджэньня часоў Луцкевічаў—Ластоўскага, як у іх апісвалася знаёмства ў Вільні зь іншымі беларусамі: як прыгода, як нешта нечуванае. Трэба было пажыць багата часу ў гэтым невялікім горадзе, каб аднойчы выпадкова натрапіць на гэтых таемных “гаспадароў” места... Шчыра прызнаемся, беларуская прысутнасьць у Вільні была мізэрнай. А тое, што на тамтэйшых кірмашох скрозь гучала беларуская мова… дык у Бешанковічах гучыць да сёньня. Вось толькі дзе там тая беларушчына?
Затое ў сёньняшняй Вільні, як і сто гадоў таму, паўсюль чуваць польская мова — у транспарце, на вуліцы, у крамах, зь дзіцячых вуснаў. Віленскія палякі маюць дзясяткі польскамоўных школаў і садкоў. Вельмі часта ў віленскіх крамах, пачуўшы ад кліента беларускія словы, гандляркі адказваюць па-польску. А прыканцы 90-х у Вільні зьявіўся шыкоўны цэнтар польскай культуры, на будаўніцтва якога Польшча выдаткавала некалькі мільёнаў даляраў. У горадзе ёсьць польская мастацкая галерэя, FM-станцыя, выходзяць польскія газэты і нават літаратурны часопіс. Беларусам Літвы нават марыць не выпадае пра такія рэчы.
Прыемна пашпацыраваць па Вільні зь Сяргеем Харэўскім, які ведае ў старым месьце кожны дом і можа распавесьці сотні гісторыяў пра яго. Тут месьцілася рэдакцыя “Нашай Нівы”, у гэтай вязьніцы сядзеў Каліноўскі, у гэтым доме выдаваў свае кнігі Францішак Скарына, тут жыў зь сям’ёй Вацлаў Ластоўскі, тут месьціўся беларускі музэй, а ў гэтым храме за часамі фашыстоўскай акупацыі перахоўваліся найбольш каштоўныя экспанаты музэю… Пасьля сьмерці Лявона Луцкевіча Харэўскі, бадай, самы дасьведчаны ў гэтай справе.
Упершыню Вільню я наведаў у 1986 годзе, калі вучыўся на перадапошнім курсе наргасу. У сваю “камэрцыйную” вандроўку мяне ўзялі дзяўчаты-аднакурсьніцы. У віленскіх кавярнях я па-беларуску замаўляў для ўсіх сьняданак, і гэта гарантавала прыязнае абслугоўваньне. Цяпер капіталізм згладзіў (або глыбока схаваў) нелюбоў літоўцаў да ўсяго расейскага. Можаце замаўляць стравы нават на тамбоўскай фені — абслугоўваньне

будзе выдатнае. Час ад часу па цяперашняй Вільні ездзіць адмысловы турыстычны аўтобус бяз даху, які любяць фрахтаваць кампаніі вясёлых рабятаў з РФ — блатныя песьні далёка разносяцца над Вяльлёй.

Этнічныя славяне (беларусы-расейцы-ўкраінцы) ды самі літоўцы зь нізкіх сацыяльных слаёў любяць Беларусь і добра адгукаюцца аб Лукашэнку. Аднойчы пачуў ад таксіста-славяніна крык душы: “Гары яна гарам, такая свабода!” Я яму тлумачу “перавагі” нашага жыцьця, а ён слухаць ня хоча, пытаецца: “У вас працуюць заводы?” — “Працуюць”, — адказваю. “Ну дык памаўчыце, у нас нават дворнікам немагчыма ўладкавацца, а ўсё гэтае, што навокал, стракатае-бліскучае — шкляныя пацеркі для абарыгенаў”.
Памятаю грандыёзную па колькасьці ўдзельнікаў акцыю перапахаваньня парэшткаў Івана Луцкевіча на віленскіх могілках Роса ў 1991 годзе. Сёньня ж на Літарацкай горцы, дзе пахаваныя браты Луцкевічы, Францішак Аляхновіч, Казімер Сваяк, Лявон Вітан-Дубейкаўскі і інш., пануе занядбаньне. Добра дагледжана толькі супольная магіла Луцкевічаў (сочаць сваякі). Надмагільны помнік Аляхновіча нахіліўся, як Пізанская вежа, фарба на ім аблупілася (прынамсі, я такім яго пабачыў увосень 2001 году). На Дзяды нікога зь беларусаў на Літарацкай горцы я не сустрэў. Праўда, колькі сьвечак усё ж знайшоў на сьціплых капцах. Але ці параўнаеш гэта з тым вялікім полымем, якое шугала над гранітнай плітой, пад якой пахаваныя маці і сэрца Пілсудзкага?
На тле відавочнага згасаньня беларускага руху ў Вільні ў 2001 годзе тут усё ж адбылася адна значная, можна сказаць, гістарычная падзея. Дубавец і Харэўскі дакладна высьветлілі месца пахаваньня Кастуся Каліноўскага. Ка́ты разумелі, што магіла “бунтаўніка” абавязкова з часам ператворыцца ў аб’ект паломніцтва, таму цела нескаронага Кастуся разам зь некалькімі закатаванымі польскім паўстанцамі таемна зарылі ў зямлю на тэрыторыі расейскага вайсковага гарнізону на Замкавай гары. Так-так, парэшткі Каліноўскага ляжаць каля вежы, якая прысутнічае на кожнай другой віленскай паштоўцы. За палякамі на месцы пахаваньня нават стаяў памятны-крыж аўтарства скульптара Антона Вівульскага (у Вільні ёсьць вуліца ягонага імя). Літоўцам беларус Каліноўскі на такім

стратэгічным месцы, якое зьяўляецца сымбалем Вільні і дамінуе над усім горадам, быў не патрэбны. Магіла зарасла дзёрнам. Тацяна Сапач паказала сюжэт пра адкрыцьцё месца пахаваньня Каліноўскага на дзяржаўным канале LRT. Вянок на магілу героя нёс я. Празь нейкі час у адной зь віленскіх кавярняў кельнэрка мне кажа: “А я вас вчера видела по телевизору”. “А пра што была перадача?” — спытаў я, нібыта здымаюся на тэлебачаньні штодзень і мне цяжка згадаць учарашнюю праграму. “А вы там с цветами ходили по Замковой горе”.
У царкве сьв. Мікалая, дзе штотыдзень у суботу адбывалася служба па-беларуску, зьбіралася ня больш за 10–15 чалавек. Заўсёднікамі на ёй былі Тацяна Сапач і Сяргей Вітушка. Зрэдку тут можна было сустрэць Алега Мінкіна ці Зьмітра Бартосіка. Сёньня беларускія службы перапыніліся. Няма паствы.
Пра Вільню ў Полацку мне штодзень нагадвае мой партрэт, які напісаў вядомы мастак Алесь Поклад. Ягоны сын Янка, нашчадак па матчынай лініі славутых Луцкевічаў, разам з бацькамі сустракаў са мной Каляды 2001 году ў кватэры Шарэцкага. Ён любіць гуляцца ў машынкі і марыць стаць гоншчыкам “Формулы–1”.

*жнівень, 2003*

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **2003/12/14**
[image]

# Мікола Нікалаеў Вільня і Літва ў расейскім друку

**МІКОЛА НІКАЛАЕЎ (нар. у 1955 у Шчучыне) — супрацоўнік Расійскай нацыянальнай бібліятэкі, сябра вучонай Рады РНБ. Сцяга пераклаў на беларускую мову, зрэдагаваў і выдаў у Пецярбургу манаграфію Грыбы Гурэвіч. Летапісны Новгородок — старажытнарускі Наваградак.**

Як тэма Вільні гучыць цяпер у расійскім друку? Спроба напісаць на замову “ARCHE” агляд апошніх 10 гадоў пачалася з анекдоту. Самага смешнага — габрэйскага. Кампутэр Расійскай нацыянальнай бібліятэкі на маё запытанне знайшоў толькі два выданні, у назве якіх было імя патрэбнага гораду. Яны называліся “Евреи в Вильно” і “Литовский Иерусалим”. Больш нічога.

Хочаш смейся, а хочаш плач — акрамя гэтых вельмі добрых для сваёй тэмы выданняў трапіліся толькі шматлікія кніжкі савецкага перыяду — відавыя альбомы, праваднікі па горадзе, мастацкія творы і цяпер рассакрэчаны, а раней спецхоўскі суперпадрабязны “Пашпарт гораду Вільнюсу” 1972 га году, паасобнік №43.

Няўжо праз дзесятак гадоў пасля перабудовы ніхто не напісаў па-расійску пра Вільню? Не, такі вынік сведчыць толькі пра непрыдатнасць прамалінейнага пошуку для вывучэння цікавай нам тэматыкі. А яшчэ пра тое, што ніхто акрамя габрэяў не змог спакойна і ўпэўнена сказаць пра гэты горад: “Наша Вільня”. Ні расійцы, ні літоўцы, ні беларусы. Праўда, літоўцам лягчэй. Цяпер, калі гэты горад — сталіца іх новай маленькай

дзяржавы, “літоўская Вільня” ўспрымаецца як нешта само сабою зразумелае. “Вільнюс” — не толькі па-літоўску, але і на амаль усіх мовах свету.
Сталіца беларуска-літоўскага гаспадарства, культурная сталіца Беларусі, адміністрацыйная сталіца Літоўскай Савецкай Сацыялістычнай рэспублікі і постсавецкай Летувы/Літвы ў гістарычных і культуралагічных штудыях — асобны сюжэт. Вільня была сталіцай дзяржавы, якая на працягу амаль паловы тысячагоддзя аб’ядноўвала ўсе беларускія землі, а потым бясследна знікла з палітычнай карты Еўропы. Ужо адна гэтая акалічнасць можа тлумачыць, чаму для беларускага інтэлектуала цяжка паставіцца да гэтай тэмы без некаторай прадузятасці.
Гісторыя, лёс, культурная спадчына Вялікага княства Літоўскага і яго апошняй (“вечнай”, як сказаў Антанас Тыла) сталіцы не толькі прыцягвалі і прыцягваюць да сябе ўвагу гісторыкаў, філолагаў, мастацтвазнаўцаў, але і накладаюць выразны адбітак на грамадскую думку, ідэалагічныя канструкцыі і навуковыя працы, нават — палітычнае жыццё. Гэта ў пэўнай ступені немінуча — пакуль не пераходзіць мяжы, за якой пачынаюцца фантазіі і, адпаведна, заканчваецца навука. Напрыклад, адзін з сучасных беларускіх даследчыкаў бачыць у Вялікім княстве і ў яго культуры ўзор канстытуцыйнага ладу, грамадзянскіх свабодаў, нават прававой дзяржавы, інакш кажучы — чыстую “залатую сярэдзіну” паміж заходняй нецярпімасцю і ўсходнім дэспатызмам, а другі, не менш вучоны гарадзенскі прафесар лічыць галоўнай заслугай ВКЛ захаванне свядомасці этнічнага адзінства ўсходніх славян, якая быццам патрэбная (і да сёння!) для паспяховага супраціўлення польскай і ўвогуле заходняй культурнай экспансіі. Пры ўсёй ідэйнай супрацьлегласці гэтых поглядаў метадалагічна яны тоесныя, паколькі іх аўтары ў роўнай меры зыходзяць з неабходнасці, калі можна так сказаць, мабілізацыі гістарычнага матэрыялу для актуальных патрэбаў дня і, галоўнае, не ўсведамляюць небяспекі, якая чакае гісторыка на гэтым шляху: звужэння далягляду, адвольнага падбору крыніц, іх некрытычнага ўспрымання і да т.п.

Падобныя метадалагічныя падыходы ўласцівыя не толькі беларускай інтэрпрэтацыі спадчыны ВКЛ. У гістарыяграфіі Расіі

— заваёўніцы Вялікага княства з усёй яго тэрыторыяй, насельніцтвам, матэрыяльнымі рэсурсамі і культурнымі помнікамі — да яго заўсёды прысутнічала нейкае хваравітае стаўленне. Яшчэ ў 1816 годзе Мікалай Карамзін [1] сумесі “ўдаванай прыязнасці” і “натуральнай, узаемнай нянавісці” паміж Літвой і Расіяй[1], праз сто гадоў Уладзімір Праснякоў напіша аб “непазбежнай варожасці” Усходняй і Заходняй Русі[2], і ў нашы дні знакаміты маскоўскі гісторык Валянцін Янін амаль паўторыць гэтую думку, характарызуючы (у прадмове да манаграфіі сваіх малодшых калегаў) маскоўскія дачыненні да Літоўска-Рускай дзяржавы як да “ўтварэння роднаснага, хоць і пастаяннай крыніцы ваеннай небяспекі”[3]. Калі дарэвалюцыйных гісторыкаў хвалявала нязгода і апазіцыя да Масквы з боку дзяржавы, у масе сваёй праваслаўнай і славянскай[4], то аўтараў савецкай эпохі, якія нарадзіліся і насцярожвала, галоўным чынам, нацыянальная прырода ВКЛ, больш дакладна — відавочная адсутнасць такой, больш дакладна — прынцыповая немагчымасць суаднесці яго гісторыю з якой-небудзь канкрэтнай савецкай рэспублікай. Апошнім часам было шмат крытыкі ў бок савецкага даследчыка Ўладзіміра Пашуты за наданне ім Вялікаму княству, на пачатковым этапе існавання нацыянальнага літоўскага характару. І ў гэтай крытыцы шмат слушнага[5]; толькі не будзем забывацца, што іншы падыход для савецкага гісторыка быў амаль што немагчымы, бо паноўная ідэалогія жорстка рашуча спыняла спробы выхаду нацыянальнай гісторыі за думкі за межы адведзеных ёй “рэспубліканскіх кліцей” (возьмем хоць бы гісторыю з кнігай Алжаса Сулейменава, “Аз і я” альбо памянёны Алесем Краўцэвічам факт “забароны ў 70-я гады выдання зборнай працы пра Беларусь у складзе ВКЛ”[6]). Апошнія гады паказалі, што, вызваліўшыся ад ідэалагічных шораў, нацыянальная гістарыяграфія можа адрадзіцца ў новых. Так, сучасныя даследчыкі-кнігазнаўцы Ігар і Дайва Нарбуты пішуць у прадмове да свайго грунтоўнага каталогу лацінскамоўных кніг ВКЛ: “Даміноўнай дзяржаўнай мова і мноства з ёю звязаных нерэалізаваных грамадскіх магчымасцяў закладзеныя ў культуры XVII стагоддзя”[7]. У самой гэтай фразе не было бы нічога дзіўнага, калі б тут прысутнічала тлумачэнне, пра якую сучасную дзяржаву і якую дзяржаўную мову ідзе гутарка —

1 **Карамзин Н.М. История Государства Российского. Т.6. Москва: Наука, 1998.**

2 **Пресняков А.Е. Образование Великорусского государства. Москва: Наука, 1998.**

3 **Александров Д.Н., Володихин Д.М. Борьба за Полоцк между Литвой и Русью в XII–XVI веках. Москва: Аванта, 1994.**

4 **На думку М. Кромера, вядучымі рысамі падданасці ВКЛ да Расіі з'яўляліся палітычная і рэлігійная.**

польскую, беларускую ці такі літоўскую. Класці ў аснову навуковага даследавання пэўную нацыянальную ідэю — справа рызыкоўная. Нават калі вучоны, як Вячаслаў Чамярыцкі, заявіў аднойчы пра “ўзаемную непрымальнай з’яўляецца іх (беларуска-літоўскіх — **Аўт.**) назва “заходнярускія”, ужыванне якой па сутнасці адмаўляе існаванне беларускага народу ў XV—XVIII стагоддзях са сваёй адметнай культурай”[8]. Мусім пагадзіцца, што “заходнярускі” адносна летапісаў сапраўды ў чымсьці ўмоўны; але якое гэта мае дачыненне да “існавання беларускага народу”? І нават калі мае, што за злачынства — ігнараваць існаванне таго ці іншага этнасу ў канкрэтны гістарычны перыяд? У сярэдзіне XIX стагоддзя расійскі гісторык правазнаўца Канстанцін Кавелін выказаў тое, што ўсведамлялі ў навуцы ўсе, але ніхто не ўмеў альбо не адважваўся выказаць адкрыта (у гістарыяграфіі сустракаецца нярэдка): падчас складання “першага летапісу” велікарусаў як “галіны рускага племя” не існавала[9]. Аднак таго, хто на гэтай падставе паліць Кавеліна лібералам і заходнікам, чакае моцнае расчараванне: ужо на суседняй старонцы ён шчыра гаворыць, што “Русь — адзіная свабодная славянская дзяржава” і пра “спрадвечную несамастойнасць Заходняй Расіі, яе няздольнасць стаць моцнай адзінай магутнай дзяржавы”[10]. Мы тут не будзем абмяркоўваць такі погляд па сутнасці — гэта проста прыклад таго, як незлучальныя навуковыя высновы і нацыянальныя та патрыятычныя афекты.

Аўтар гэтых радкоў за метадалагічную аснову лічыць Вільні гістарычна-культурнай працы прапануе лінейную пасылку: і ў Віленскі, і ў Наваградскі, і ў Троцкі гісторыі Вялікае княства Літоўскае было дзяржаўнай культурай, цывілізацыяй, якая загінула і ніколі не адна з дзяржаў і нацый, што ўзніклі ў яго каліш Адэкватна зразумець такі культурны феномен можна, адхіліўшыся ад якой бы там ні было ідэалізацыі мадэрнізацыі гістарычнага мінулага. Гэта не азн абыякава ставімся да беларускай мінуўшчыны а адмаўляем уплыў культурнай спадчыны ВКЛ на культуры нашага рэгіёну ў XIX—XX ст., — мы т

**поліканфесіянальнаг**
**ўтварэння”,**
**якое пасля**
**“аўтанні**
**1863–1864 гг.**
**мянялі**
**XVI стагоддзі**
**не бясспрэчным**
**прыкладам**
**для народаў**
**імперыі**
(Кром М.М.
**Между Русью**
**и Литвой.**
**Западнорусские**
**земли в**
**системе**
**русско-**
**литовских**
**отношений**
**конца XV –**
**первой трети**
**XVI в.** Москва:
**Археографический**
**центр, 1995**).
**Гэта**
**абсалютна**
**правільна, але**
**зусім іншая**
**гісторыі**
**нацыі,**
**значна больш**
**старая, чым**

пазбавіцца ад непатрэбных прымхаў і стэрэатыпаў. Зразумела, нашага чытача — аўтары разгледжанай вышэй публікацый сваё слова ўжо сказалі.

**ў Зеі 1863 г. Дый чым быў славуты “заходнерусізм” XIX ст., як не адчайнай спробай апраўдацца, даказаць сваю “рускасць”, праваслаўе, адным словам, непадзельнасць з метраполіяй, а ўсё іншае абвясціць інтрыгамі альбо подступам з боку ворагаў.**

**[5] Гл., напр.: Ермаловіч М.І. Старажытная Беларусь. Полацкі і новагародскі перыяды. Менск: Навука і тэхніка, 1990; Ён жа. Старажытная Беларусь. Віленскі перыяд. Менск: Беллітфонд, 1994; Краўцэвіч А.К. Стварэнне**

Вялікага княства Літоўскага. Менск: Беларуская навука, 1998.

6 Краўцэвіч А.К. Цыт. выд.

7 Narbutienė D., Narbutas S. XVII a. Lietuvos lotyniškų knygų sarašas. Vilnius, 1998. P.25.

8 Чамярыцкі В.А. Беларускія летапісы як помнікі літаратуры: Узнікненне і літаратурная гісторыя першых зводаў. Менск: Навука і тэхніка, 1969.

9 Кавелин К.Д. Наш умственный строй: Статьи по философии русской

**истории и культуры. Москва, 1989. С.183.**

**[10] Тамсама. С.184.**

На эмоцыях і прымхах будуюцца разважанні ў найлепшай кнізе з віленскай тэмай — кнізе **Томаса Венцлавы “Свобода и правда”** (Москва: Издательская группа “Прогресс”, 1999). Венцлава — сын вядомага пісьменніка, у савецкія часы дысідэнт, пасля выгнаннік, паэт, выкладчык прэстыжнага амерыканскага Йельскага ўніверсітэту — напісаў кнігу пра Вільню, дзе паказаў — найперш для сябе, але і для ўсяго свету — вынікі супастаўлення нацыянальных памкненняў і прыярытэтаў з агульначалавечымі вартасцямі. Раздзелы ягонай кнігі называюцца: “Габрэі і літоўцы”, “Расійцы і літоўцы”, “Вільня як форма духоўнага жыцця” (тут дыялог з інтэлектуалам-віленчуком Чэславам Мілашам), “Палякі і літоўцы”, “Незалежнасць”. Беларускай Вільні, сталіцы беларуска-літоўскага гаспадарства, у гэтай кнізе месца не знайшлося — яна неактуальная і непрадуманая. Старажытная Вільня для Венцлавы напоўненая рускімі, жмудзінамі і палякамі, якія чамусьці гавораць, пішуць і друкуюць кнігі на старабеларускай мове. Аднак яго мудрыя словы стасуюцца і да нас:

“Для мяне росквіт і нават само выжыванне нацыі — сумнеўная радасць, калі яе даводзіцца купляць коштам нянавісці да чужога, задушэння “варожых элементаў”, коштам канфармізму і маны. Нацыя дарагая мне настолькі, наколькі яе звычаі, гісторыя, сучаснасць увасабляюць праўду і свабоду — вартасці больш высокія, чым яна сама. І паколькі так ужо здарылася, што я паводле нараджэння і выхавання належу да той, а не да іншай нацыі, мой абавязак — прыносіць пасільную долю гэтых вартасцяў у яе сучаснасць, у яе штодзённы побыт.
Аднак, гаворачы так, я не хачу забываць і другое. Так, нацыяналізм у нашых краях мацнейшы, чым на Захадзе, але гэта таму, што мы не мелі магчымасці перажыць і пераадолець яго ў нармальных заходніх формах. Тое, што адбываецца цяпер,

— не заўсёды вяртанне да цёмных часоў племянной варожасці. Гэта хутчэй імкненне да таго, што даўно маюць і не заўсёды цэняць еўрапейскія народы, — да цывілізаванага нацыянальнага існавання, якое выражаецца ў формах незалежнай дзяржаўнасці".

Расійскія інтэлектуалы свайго часу прыслухаліся да Венцлавы і Мілаша. Дыялог аб Вільні друкавалі і абмяркоўвалі маскоўскія перыёдыкі "Синтаксис" (1981, №9) "Литературное обозрение" (1999, №3), "Старое литературное обозрение" (2001, №1).

Іншы полюс літоўскага абмеркавання праблемы Вільні ўяўляе сабой кніга **"Восточная Литва в прошлом и настоящем"** (пераклад, арыгінальнае выданне выйшла ў 1993 г. — **Аўт.**) прафесара ўніверсітэту імя Капсукаса **Зігмаса Зінкявічуса** (Mokslo ir enciklopedijų leidykla, Vilnius: 1996).

Парадокс гэтай кнігі палягае ў тым, што напісана яна ў "контрпрапагандысцкім" жанры, але аўтар — вядомы лінгвіст — дадаў так шмат аб'ектыўных і цікавых звестак, што адразу адхіліць гэтую ёмкую (387 старонак) працу не выпадае.

Пачынаецца кніга "Словам да чытача!" — на канцы звароту стаіць клічнік. Стаіць сімвалічна — відаць, таму, што аўтар прадмовы да кнігі Зінкявічуса Антанас Тыла хоча паведаміць расійскамоўнаму чытачу: "Віленскі край — гэта зямля, дзе былі першыя сталіцы літоўскай дзяржавы — Кернаў, Трокі і пазней — вечная сталіца Вільня" (с.5.). Ні наваградскі перыяд гісторыі ВКЛ, ні ковенска-летувіскі ў такую кароткую схему не ўпісваюцца, а таму і не называюцца. "Складаная грамадска-палітычная гісторыя гэтай зямлі — гэта няволя і жорсткі расійскі, пасля савецкі прыгнёт, пераследы літоўцаў пры акупацыйнай уладзе Польшчы ў 1919—1939 гадах". Тыла рэкамендуе кнігу для папаўнення ведаў аб самой Літве, якая павінна стаць больш зразумелай і блізкай. А далей гаворыць аўтар, які паўсюль у тэксце выступае ад імя літоўскага народу, хаця на вокладцы кнігі стаіць толькі яго імя. У "Прадмове" ён прыгадвае прыказку старажытных рымлянаў: "Homines historiarum ignari semper sunt puere" — "Людзі, якія не ведаюць гісторыі, назаўсёды застаюцца дзецьмі". Пасля ён абвяшчае, што мэта кнігі — пазнаёміць "недастаткова абазнаных у гісторыі чытачоў" з мінуўшчынай, якой яна была на самай справе (неістотна, падабаецца гэта камусьці альбо не падабаецца). І пачынае выкладаць гісторыю ў такой

інтэрпрэтацыі, што не застаецца сумневу — чытачы павінны застацца дзецьмі, якія моўчкі прымаюць погляды прафесара Зінкявічуса.
Пасля кароткіх “Слова да чытача” і “Прадмовы” ідзе выклад гісторыі ад мяжы II—I тысячагоддзяў да новай эры да пачатку 1990-х гадоў. Напісана пра пасяленні старажытных балтаў і пра старажытных літоўцаў. Акрэсленыя межы і кантакты балтаў з усходнімі славянамі, станаўленне і развіццё Вялікага княства Літоўскага, бегла пераказаныя падзеі XVI—XVIII стагоддзяў, улучна з заняпадам Рэчы Паспалітай. Шмат пра літоўскую і іншыя мовы ў “Старажытнай Літоўскай дзяржаве”. Шмат патэтычнай лаянкі ў раздзелах “Пад уладай царскай Расіі” і “Ўсходняя частка Літвы пад уладай Польшчы”, шмат нараканняў на “один трудно излечимый гнойник — город Висагинас…” (с.377), на пабітыя шыбы ў вёсцы Пялеса і штраф за гэта ў 30 рублёў (с.379), на вывад варожага войска з Віленскага епіскапства (с.381) і да т.п.

Але калі сур’ёзны чытач захоча праясніць для сябе сур’ёзныя пытанні, напрыклад, ці была пры Вітаўце альбо ці пры панаванні Вазаў супольная для Вялікага княства Літоўскага культурная прастора, адназначнага адказу ён не атрымае. Самастойнасць асобных земляў Вялікага княства ў далёкім мінулым замацоўвала іх культурныя асаблівасці. У розных частках дзяржавы карысталіся сваімі дыялектамі “рускай”, ці “літоўскай” мовы (прусы і жмудзіны разумелі балцкія гаворкі з-пад Ліды і Крэва не больш, чым палачане палякаў). Хрысціянства не забараняла “тутэйшай” мовы ці дыялекту, але прывучала маліцца на мове агульнацаркоўнай. Адным з важных і да сёння нявывучаных пытанняў культурнай гісторыі ВКЛ застаецца пытанне аб ужыванні “рускай” мовы ў каталіцкім касцёле. Ахрышчаная ў каталіцызм Літва стала дзвюхмоўнай: ведаючы свой родны (балтыйскі) дыялект, феадалы балцкага паходжання на публіцы і ў побыце карысталіся старабеларускай мовай — асабліва тыя, хто трымаў маёнткі на славянскіх землях, хто парадніўся з русінскімі баярамі або польскімі шляхціцамі. Касцельнае набажэнства на лацінскай мове вымагала ад святароў ведання лаціны, але не больш за тое. Якая мова мае абслугоўваць унутрыкасцельнае жыццё (казанне, дакументацыю і да т.п.),

павінны былі вырашаць самі вернікі. Рымска-каталіцкі касцёл у дачыненнях культуры (мастацтва, мовы, музыкі) быў сістэмай гнуткай і адкрытай (пра гэта сведчаць, напрыклад, кірылічныя надпісы і фрэскі візантыйскага стылю ў касцёлах Кракава і Любліна часоў Ягайлы). Захаваныя шматлікія касцельныя паперы на старабеларускай мове віленскіх і наваградскіх касцёлаў, пратэкцыя каталіцкага епіскапа першадрукару Францішку Скарыну гавораць пра тое, што на пачатку XVI стагоддзя ў касцёле ВКЛ адбывалася ваганне паміж "пальшчызнай" і "русчызнай".

Зігмас Зінкявічус шмат аддае ўвагі праблеме мовы. Як і абсалютная большасць іншых літоўскіх гісторыкаў, ён заклікае замяніць навуковы тэрмін "старобелорусский язык" — "…этот письменный язык использовался исключительно в государственной канцелярии и исчез, как только был заменен польским языком" (с.78), — "больш карэктным" "канцылярская славянская мова Літоўскай дзяржавы". На якой мове гаварылі віленчукі часоў пачынаючы ад дзейнасці друкарні Мамонічаў альбо выдавецтва Свята-Духаўскага манастыра і да канца другой сусветнай вайны, аўтар не піша нічога.

Сам пераклад "Восточной Литвы в прошлом и настоящем" — вельмі характэрны прыклад літоўскай экспансіі ў расійскую моўную культуру. Геаграфічныя назвы і імёны вялікіх князёў літоўскіх перакладчык падае толькі з канчаткамі "-us" і "-as": Міндаўгас, Гедымінас, Альгердас, Вітаўтас і г.д. Тое, што расійская мова ведала аб гэтых асобах яшчэ ў тыя часы, калі літоўскай пісьмовай мовы не існавала (у XIII—XV стст.), і выкарыстоўвала для іх менавання формы Міндоўг, Гедымін, Альгерд, Вітаўт… перакладчыка не хвалюе. Даходзіць да кур'ёзных выпадкаў, калі вядомага пісьменніка XVI стагоддзя Міхалона Літвіна па-расійску называюць "Михаил Литовец". Урэшце, гэта не першая і не апошняя кніга з падобнай "расійскай" мовай. За гады такой ненавіснай Зінкавічусу бальшавіцкай акупацыі літоўцы не толькі атрымалі гістарычную сталіцу Вялікага княства Літоўскага, але і прывучылі большасць савецкіх людзей (у тым ліку расійцаў) да яе жмудскай назвы — Вільнюс. Не да канца, не ва ўсім, але традыцыя, што ідзе ад наўгародскіх, пскоўскіх і маскоўскіх летапісаў да велізарнай расійскай гістарычнай літаратуры XIX і XX стагоддзя, была перарваная.

У кароткім аглядзе бракуе месца для падрабязнага разгляду кожнага з раздзелаў гэтай эмацыянальна напісанай кнігі, дзе ацэнкі патрабуе кожны факт — ад 1705 году, які “…условно можно считать годом исчезновения письменного языка вильнюсцев” (с.126) да 1939 году, калі “большевики готовились провести выборы в местные органы “власти”, после чего Вильнюсский край включить в состав Белорусской ССР и “начать строительство коммунизма” (с.226). Тагачасныя палітычныя гульні прывялі да таго, што Вільня адышла да Літоўскай ССР, і па вайне жменька нацыянальна свядомай беларускай інтэлігенцыі змагла знайсці ў ёй прытулак. Так, прынамсі, выпускніца Пражскага ўніверсітэту, выдатная настаўніца-матэматык Настасся Сланеўская пасля 1949 году вымушана была выехаць з Навагрудку ў Салечнікі, дзе спакойна дажыла да пенсіі, — беларускія праблемы яна працягвала зацікаўлена абмяркоўваць толькі ў перапісцы з менскім пісьменнікам і мовазнаўцам Фёдарам Янкоўскім. Выдатны беларускі мастак Пётра Сергіевіч да смерці працягваў сваю творчасць у сацыялістычнай Вільні… — колькасць прыкладаў можна доўжыць.
Паклаўшы ў аснову навуковага даследавання літоўскі нацыяналізм, Зігмас Зінкявічус стаў на рызыкоўны шлях выкарыстання дзвюх супрацьлегласцяў — навуковых (гістарычных, тапанімічных, лінгвістычных) высноваў і нацыянальна-патрыятычнага афекту. Яны не столькі кампраметуюць адно аднаго, колькі існуюць у розных вымярэннях — у розных метадах і катэгорыях вывучэння навакольнай рэчаіснасці і ў розных вобразах міфалогіі. Прапагандысцкая танальнасць кнігі разбурае аўру прафесійнай навукі. Аўтар падае сябе трыбунам, які пасля доўгай адседкі выйшаў да народу. Аднак шмат хто быў несправядліва рэпрэсаваны — гэта само па сабе не дае права (хай сабе і дзеля росквіту ўласнай нацыі) распальваць нянавісць да “варожых элементаў”. Дарэчы, прадавалася кніга Зінкявічуса затанна: відаць, мела чыюсьці датацыю.

Неўзабаве пасля выхаду літоўскамоўнага арыгіналу кнігі Зінкявічуса пра існаванне дыяметральна іншай — польскай — візіі “праслаўнага” гораду нагадала Масква кнігаю **Ежы Рэмера** (Jerzy Remer) **“Wilno. Pierwszemu marszałkowi Polski**

**Józefowi Piisudskiemu w 15-tą rocznicę odzyskania Wilna”** (Москва: Алиал, 1995). Гэтае факсімільнае перавыданне даведніка 1935 году выдавецтва “Алиал” падрыхтавала сумесна з выдавецтвам “Гутенберг-Принт”, якое мае філію ў Варшаве. Выдавецтва не стала шукаць нават новага аўтара ўступнага слова і проста тыражом у 15 тысяч асобнікаў (!) якасна ўзнавіла арыгінальны тэкст Ежы Рэмера і фатаграфіі прафесара Віленскага ўніверсітэту, урадзімца беларускай вёскі Асташына Яна Булгака. Цудоўныя краявіды Вільні і ваколіцаў, фотаздымкі народных тыпаў (асабліва характэрныя — прадаўцы велікодных вербаў і смургонскіх абаранкаў), здымкі інтэр’ераў культавых будынкаў і партрэты тагачасных генералаў, уключаючы Люцыяна Жалігоўскага, — гэтае польскае бачанне віленскай гісторыі пададзена пасля эпіграфу Аляксандра Фрэдра: “To Polska — to ojczyzna nasza”.

Воляй лёсу Вільня ўжо ў XVIII стагоддзі заставалася толькі культурным цэнтрам. Яе палітычнай сталіцай спачатку была Варшава, пасля — Санкт-Пецярбург. Аб прычынах і спосабах паступовага “перацякання” творчай інтэлігенцыі ў расійскую сталіцу, аб важнасці культурных кантактаў з Вільняй для пецярбургскай Акадэміі мастацтваў і аб адваротных працэсах — руху мастакоў з класічнай адукацыяй на беларускія землі напісана мастацтвазнаўчая манаграфія: **Свирида И. “Между Петербургом, Варшавой и Вильно. Художник в культурном пространстве. XVIII — середина XIX в.: Очерки”** (Москва: “ОГИ”, 1999).

Новыя падыходы ў расійскай гістарыяграфіі да Вільні акрэсліліся на пачатку 90-х. У 1994 годзе ў Маскве выйшаў першы том новай гістарычнай энцыклапедыі **“Отечественная история. История России с древнейших времен до 1917 года”** (Москва: Большая Российская Энциклопедия, 1994), дзе артыкул пра Вільню напісаў гарадзенскі гісторык Дзмітрый Караў. У ягоным нарысе развіцця гораду адсутнічае літоўскі сантымент, але разам з ім — і ацэнкі значэння нацыянальных рухаў у гэтым горадзе для станаўлення культуры новых нацыянальных дзяржаў у XX стагоддзі: польскай, беларускай, літоўскай і габрэйскай.

Адначасова з’явілася праца пецярбуржца, супрацоўніка Пушкінскага дому **Алега Творагава “Древняя Русь. События и люди”** (СПб.: Наука, 1994). Першы тыраж гэтай навукова-

папулярнай кнігі імгненна разышоўся, і ў тым жа годзе было дадрукавана яшчэ пяць тысячаў асобнікаў, а праз год зроблена перавыданне. Добры знаўца рускіх летапісаў, А. Творагаў пабудаваў сваю кнігу як хроніку — пагадовы выклад найважнейшых падзей з кароткімі характарыстыкамі і тлумачэннямі таго, што адбывалася. Літоўская Русь, якую ад даўніх часоў расійская гістарыяграфія ўспрымала як неад'емны аб'ект сваіх даследаванняў, была вынесена за межы працы. Вільня ўспамінаецца толькі двойчы, у сувязі з вайной Карла X, Яна Казіміра і Аляксея Міхайлавіча. Паведамляецца пра захоп расійскім войскам гораду ў 1655 годзе. На гэтай жа старонцы аўтар паказвае, што Ворша, Магілёў, Смаленск, Вільня, Коўна і Горадня былі для расійцаў польскімі (!) гарадамі. Каментуючы незалежніцкія памкненні Вялікага княства Літоўскага (разрыў па ініцыятыве Януша Радзівіла уніі з Польшчай і ўкладанне уніі са Швецыяй), Алег Тварагоў адзначыў: "Асобныя прадстаўнікі польскай адміністрацыі падпісвалі сепаратныя пагадненні, перадаючы пад пратэктарат Швецыі значныя абсягі краіны…". Пашыраны сярод расійцаў стэрэатып — не бачыць паміж Польшчай і Расіяй іншай нацыі і дзяржавы — аказваецца надзіва трывалым!

Тым часам выкладчыкі гістарычных факультэтаў дзяржаўнага і еўрапейскага ўніверсітэтаў Санкт-Пецярбургу Андрэй Дварнічэнка і Міхаіл Кром зацікавіліся працэсам утварэння беларуска-расійскай мяжы, у выніку чаго з'явіліся кнігі: **Дворниченко А. "Русские земли Великого Княжества Литовского (до начала XVI в.)"** (СПб., 1993); **Кром М. "Между Русью и Литвой. Западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV — первой трети XVI в."** (Москва: Археографический центр, 1995). Грунтуючыся на дакументальных крыніцах, аўтары падрабязна апісалі, як паводзілі сябе тагачасныя насельнікі Смаленскай і Бранскай земляў — хто з іх застаўся служыць беларуска-літоўскай дзяржаве, хто пайшоў на службу маскоўцам. Вільня паўстае ў гэтых працах як полюс, супрацьлеглы Маскве, але гісторыкі не ацэньваюць полюсы знакамі "плюс" альбо "мінус". Галоўнае для іх — лёсы памежных земляў і іх насельнікаў.

Абапіраючыся на гэтыя два даследаванні, маскоўская даследчыца **М. Бычкова** ў сваёй кнізе **"Русское государство и Великое Княжество Литовское с конца XV ст. до 1569 г.**

**Опыт сравнительно-исторического изучения политического строя”** (Москва: Издательский центр Института российской истории, 1996) прыходзіць да высновы, што “ў Вялікім княстве Літоўскім у граніцах адной дзяржавы жылі розныя народы са сваімі палітычнымі і культурнымі традыцыямі”.

Кніга М. Бычковай прысвечана памяці аднаго з самых таленавітых гісторыкаў ВКЛ нядаўняга часу — заўчасна памерламу Эгідзюсу Банёнісу. Беларускае трактаванне ВКЛ як шматмоўнай і шматканфесійнай гістарычнай фармацыі тут не стала прадметам разгляду — можа, з прычыны недастатковай распрацаванасці тэмы самімі беларускімі даследчыкамі. Зрэшты, сама аўтарка прызнаецца, што яе “назіранні маюць хутчэй пастановачны характар і накіраваныя на тое, каб стымуляваць далейшае вывучэнне праблемы”.

Абставінам стварэння ВКЛ і складання новай палітычнай карты Усходняй Еўропы прысвечаны шэраг працаў маскоўскага даследчыка **Дзмітрыя Аляксандрава**: **“Южная, юго-западная и Центральная Русь в XIII—XIV вв. и образование Литовского государства”** (Москва: Гармония, 1994); **“Галицко-волынская земля в XIII—XIV вв.”** (Москва, 1997); **“Смоленская земля в XIII—XIV вв.”** (Москва, 1998). Кожная адна кніга напісана ў суаўтарстве з **Валадзіхінымі Дзьмітрыем** і **Кацярынай Каліноўскай**: **“Борьба за Полоцк между Литвой и Русью в XII—XVI веках”** (Москва: Аванта, 1994);

Дзмітрый Аляксандраў упершыню пасля Ўладзіміра Пашуто стварыў цэльную карціну гістарычнага працэсу на тэрыторыі будучага Вялікага княства Літоўскага, а таксама паспрабаваў асэнсаваць яго палітычную гісторыю, прычым яго высновы заснаваны не толькі на вывучэнні крыніц, але і на ведах гістарыяграфіі. Беларускага чыннік у палітычнай гісторыі ВКЛ аўтар не бачыць — можа, таму, што беларуская гістарыяграфія традыцыйна аддае справу асэнсавання і інтэрпрэтацыі гісторыі Вялікага княства Літоўскага гісторыкам мовы і літаратуры, а таксама літаратарам. Апрача гэтага, калі беларускія зацікаўленні да перыяду паўстання ВКЛ былі абазначаныя працамі Міколы Ермаловіча і Алеся Краўцэвіча, то Віленскі перыяд жыцця і функцыянавання нашай колішняй дзяржавы застаецца яшчэ — для нас саміх — terra incognita.

11 **Для тых, хто не ўразумеў,** **Дзмітрый Іванавіч Валадзіхін** (1940–1993), **амерыканскі гістарык** **Кацярына Барысаўна Каліноўская** (1948–2008) — **Валадзіхіны Дзьмітрый і Кацярына** — **муж і жонка**

Для звычайнага расійскамоўнага турыста дастаткова інфармацыі пра Вільню можна знайсці ў турыстычным даведніку з серыі “Свет вакол нас” выдавецтва “Эдиториал УРСС”, што ўваходзіць у маскоўскі выдавецкі дом “Симон-пресс”. Ён распачаў серыю кніжак пра чарнаморскае ўзбярэжжа Каўказу, Наўгародскую, Пскоўскую, Цверскую, Архангельскую вобласці, Карэлію, Крым. Дзевятая кніга ў серыі — яна ж першая пра замежную дзяржаву: **Фридман В., Шапошников М., Буланов С. “Литовская республика. Вильнюс. Каунас. Шауляй. Путеводитель”** (Москва: Эдиториал УРСС, 2000).
Тут ёсць гістарычны нарыс з растлумачэннем, хто такія Вітаўт і Альгерд, Сметона і Чурлёніс, план цэнтральнай часткі Вільні са спісам рэстаранаў, кавярняў і музеяў, пералік гістарычных цэркваў, касцёлаў і сінагог ды шмат іншых карысных звестак, уключаючы філалагічныя — некалькі самых неабходных слоў па-літоўску. Гасцям Вільні прапануюць агледзець новыя, пастаўленыя ўжо ў паслясацыялістычны час помнікі Гедыміну на Цэнтральнай плошчы (1996 г.) і Фрэнку Запу на вуліцы Каліноўскага (1995 г.)[11]. Праўда, аўтары заблыталіся з касцёламі, назваўшы касцёл Святога Міхала касцёлам Міколаса, а Вострую Браму — “Медининкские ворота”. Часам так і хочацца перакласці тэкст даведніка на беларускую мову, каб замест “Главная артерия Старого города состоит из улиц Пилес, Диджёйи и Святых Ворот (1,4 км)” загучала: “Галоўная артэрыя Старога гораду складаецца з вуліц Замкавай, Вялікай і Вастрабрамскай (1,4 км)”. Спадзяёмся, што гэта некалі зробяць беларускія турыстычныя фірмы.

Вільня — культурны цэнтр беларусаў, які застаўся па-за межамі нашай сённяшняй дзяржавы. Ці гэта значыць, што не трэба звяртаць на гэты горад спецыяльнай увагі? Мы так не лічым. Рэктар Віленскага ўніверсітэту Рамуальд Павілёніс у інтэрвію “Независимой газете”[12] ахарактарызаваў постсавецкую прастору як прастору няісную: “Цяпер увесь свет постсавецкі. Проста нейкая частка дзяржаваў была ў межах савецкага лагеру, а нейкая была ў стасунках (хай варожых) з гэтым жа лагерам. Свет ужо даўно змяніўся”. Павілёніс прапануе не адступаць назад, а ісці далей. Згода. У гэтай сваёй вершы ірду да Вільні.

**[12] Павилонис Р. Весь мир сегодня —**

1. Я іду да Вільні.
2. Мы ідзём да Вільні.
3. Яны ідуць да Вільні.

Навошта чытачы кніг імкнуцца да Вільні? Адказ на гэта пытанне можна пашукаць у дзіцячай гульні “Вільня”, якую этнолагі запісалі ў канцы XIX стагоддзя ў вёсцы Аўдзеевічы Нягневіцкай воласці Навагрудскага павету: на роўным месцы капаецца ямка 3 вяршкі ўглыбкі, столькі ж у дыяметры. Яна называецца “Вільня”. Дзеці па чарзе б’юць палкай вялікі драўляны цвік, заганяючы яго ў цэнтр ямкі. Хто першы дастане да “Вільні”, той лічыцца яе заснавальнікам. Ён атрымлівае права прызначаць пакаранне тым, хто “Вільні” не дастаў[13]. Насуперак гістарычнай праўдзе, сёння расійскамоўныя выданні не называюць беларусаў заснавальнікамі і карэннымі насельнікамі Вільні. Тым часам загнаць у ямку свае драўляныя цвікі — напісаўшы *свае* кнігі пра Вільню, у тым ліку і па-расійску, — ніхто нам не забараняе.

**постсоветский.// Независимая газета. 1997. 20 снежня.**

**[13] Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т.3. СПб., 1902. С.202.**

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/12/14**
[image]

[image]
A R C H E
П а ч а т а к
№ 5 (28) – 2003
[image]



**Віленская інтэрвія**

ВІЛЕНСКАЯ АНТЭРВІЯ
аналізыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

# Аляксандр Фрыдман Жыццё і смерць Віленскага гета

**АЛЯКСАНДАР ФРЫДМАН (нар. у 1979 у Менску) — гісторык. Скончыў гістарычны факультэт БДУ (2001). Сёлета ў часопісе “Мишпоха” апублікаваў артыкул “Знаменитые потомки легендарного брестского талмудиста: карл Маркс и Сэр Бенджамин Филипс”.**

Мая хроніка павінна бачыць, павінна слухаць, павінна зрабіцца люстэркам і сумленнем вялікай катастрофы.
**Герман Крук**
*Harschav, Benjamin (Ed.): The last days of the Jerusalem of Lithuania. Chronicles from the Vilna ghetto and the camps 1939—1944. New Haven CT: YIVO Institute for Jewish Research, 2002.*

**Герман Крук: плоцкі фатограф і варшаўскі бібліятэкар**
**19** мая 1897 году ў сям’і бухгалтара плоцкай вопатнай фабрыкі Гейнера Крука (Heiner Kruk) нарадзіўся сын Герцэль (Герман). Першая сусветная вайна пазбавіла Германа магчымасці атрымаць вышэйшую адукацыю. Ён рабіў фатографам, а таксама падзарабляў на нямецкай кансэрвавай фабрыцы.
У пачатку 1920-х ён перасяліўся ў Варшаву, дзе пачаў працаваць у розных культурных установах Бунду і яго моладзевай арганізацыі “Цукунфт”. У 1930 годзе ён узначаліў варшаўскую “Grosser-Bibliothek” і ператварыў яе ў найлепшую яўрэйскую народную бібліятэку польскай сталіцы. Бібліятэчны цэнтр варшаўскай яўрэйскай культурніцкай арганізацыі “Kultur-Lige” (Культур-Ліга) пад яго кіраўніцтвам стаў

навучальным і метадычным цэнтрам для амаль 400 яўрэйскіх бібліятэк Польшчы. У 1936 годзе Крук заняў пасаду сакратара “Kultur-Lige”.

**Верасень 1939-га: “Уцёкі ад вайны”**
1 верасня 1939 году нямецкія войскі ўвайшлі на тэрыторыю Польшчы. Польская армія не здолела спыніць ворага, і ўжо праз некалькі дзён урад, генштаб, кіраўніцтва партыяў, дзеячы культуры і іншыя вымушаны былі пакінуць сталіцу. 5 верасня 1939 году Герман Крук разам з групай яўрэйскіх журналістаў уцёк з Варшавы. Трохі раней Варшаву пакінуў ягоны брат Шмуль (вядомы ў Варшаве пад псеўданімам Пінхас Шварц).
17 верасня 1939-га савецкія войскі ўвайшлі на тэрыторыю Заходняй Беларусі і Ўкраіны. Праз 10 дзён нацысты акупавалі Варшаву. Незалежная Польшча знікла з карты Еўропы.
“Уцёкі ад вайны” — такую назву атрымалі нататкі Германа Крука (1940), у якіх падрабязна апісаны ягоны шлях з Варшавы на Ўсход. Шварц і Крук меркавалі далучыцца на Ўсходзе да частак адступалай польскай арміі, але 10 кастрычніка 1939 году апынуліся ў Вільні.
У той жа дзень СССР падпісаў з Літвой пагадненне аб узаемадапамозе. Літоўцы атрымалі Вільню і Віленскі край, Чырвоная Армія — вайсковыя базы ў Літве. Так у жыцці Германа Крука пачаўся віленскі перыяд — найцяжэйшы.

**Вільня: Літоўскі Іерусалім**
**пры канцы 1930-х – на пачатку 40-х**
Пры канцы 1930-х у Вільні жыло больш за 55000 яўрэяў. Сам горад быў вядомы ў свеце як цэнтр ідышысцкай культуры. У ім працавалі яўрэйскія тэатры, школы, малітоўныя дамы, тут змяшчаўся Інстытут яўрэйскіх даследаванняў YIVO, у бібліятэцы Страшуна захоўвалася найбуйнейшая ў свеце калекцыя кніг на мове ідыш. Яўрэйскую вуліцу Вільні ўпрыгожваў велічны будынак Вялікай Сінагогі.
Крук працаваў прэсавым рэферэнтам у віленскім аддзяленні яўрэйскай дабрачыннай арганізацыі TOZ/OZE, супрацоўнічаў з Цэнтральнай яўрэйскай школьнай арганізацыяй (CYSHO), а таксама з часопісам “Volksgesunt”.
Увосень 1939 — у пачатку 1940 году Вільня прыняла каля

15000 яўрэйскіх уцекачоў. У 1940 годзе “Volksgesunt” змясціў на сваіх старонках нататкі Г. Крука пра жыццё яўрэйскіх уцекачоў у Вільні — варшаўскіх рабочых, пінскіх ешыботнікаў (навучэнцаў духоўнай семінарыі), катавіцкіх гандляроў, пісьменнікаў, інжынераў, дактароў, якія страцілі родных і маёмасць. Дапамога віленскай яўрэйскай грамады і міжнародных яўрэйскіх арганізацыяў не змагла істотна палепшыць іхняга бядотнага становішча. Яны спалі на лаўках і партах (яўрэі з Чэхаславакіі, напрыклад, атабарыліся ва ўніверсітэцкім квартале Вільні), на падлозе сінагог і ешыботаў, бадзяліся па віленскіх вуліцах у пошуку хоць якой працы. Большасць польскіх уцекачоў не збіралася заставацца ў Вільні. Яны бамбардавалі ўрады ЗША, Палестыны, Аргенціны і іншых краін тэлеграмамі з заклікамі аб дапамозе. Велізарныя чэргі стаялі каля будынкаў замежных прадстаўніцтваў. Пакінуць Вільню планавалі таксама Герман Крук са сваім братам. Перш за ўсё, яны паспрабавалі выцягнуць з акупаванай немцамі Варшавы свае сем’і, каб потым разам накіравацца ў ЗША. А калі Пінхасу пашанцавала, то Герману — не. У снежні 1940 году савецкія памежнікі затрымалі на савецка-літоўскай мяжы Полу Крук, а таксама жонку і сына П. Шварца. П. Крук правяла год у ашмянскай турме, а потым разам з іншымі польскімі ўцекачамі была вывезеная ў Сібір. (Герман Крук сваёй жонкі больш ніколі не пабачыў.) Сям’ю Шварца савецкія памежнікі адпусцілі, і яна дабралася да Вільні.

15 чэрвеня 1940 году пачалася савецкая акупацыя Літвы.

21 ліпеня была абвешчаная Літоўская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, якая 3 жніўня ўвайшла ў склад СССР. Яўрэйскія палітыкі і культурныя дзеячы разумелі, што чакае іх пад савецкай акупацыяй. Разумелі гэта і іх сябры за мяжой. Камітэт яўрэйскіх рабочых ЗША здолеў выбіць амерыканскія візы для шэрагу функцыянераў яўрэйскіх партый і пісьменнікаў з Вільні. У гэты спіс, які складаўся з 6500 асобаў, патрапілі імёны Г. Крука і П. Шварца. У верасні 1940-га на віленскім вакзале браты развіталіся. Пінхас з сям’ёй накіраваўся праз Маскву і Ўладзівасток у ЗША, а Герман застаўся. Ён паспеў даслаць брату сабраныя матэрыялы па гісторыі яўрэйскай бібліятэчнай справы, якія збіраўся апрацаваць ужо ў Амерыцы.

24 чэрвеня 1941 году Крук адзначыў у сваім дзённіку, што

савецкія ўлады пагадзіліся дазволіць яму выезд толькі пры ўмове супрацоўніцтва з спецслужбамі. Крук мусіў стаць савецкім інфарматарам у польскіх узброеных фармаваннях у Канадзе, але адмовіўся.
22 чэрвеня 1941 году Германія распачала вайну з СССР. У той жа дзень нямецкія самалеты бамбардавалі Вільню. 23 чэрвеня Чырвоная Армія пакінула горад. Разам з чырвонаармейцамі памкнуліся на ўсход і многія віленцы. Каля 3000 яўрэяў здолелі ўцячы. Тое ж самае меўся зрабіць і Г. Крук, але ў апошні момант застаўся. 23 чэрвеня 1941-га ён напіша: “Я прымаю рашэнне: я пакідаю сябе на літасць Бога; я застаюся… Зразумела, што немцы возьмуць Вільню. Яны зробяць горад фашысцкім. Яўрэяў загоняць у гета. — Я буду ўсё гэта натаваць” (с.47).

**Другая палова 1941 году: яўрэйская Вільня ў рэках крыві**
З першых дзён Крук імкнецца пісаць хроніку падрабязна і аб’ектыўна. 24 чэрвеня Крук пазначыць: “…Мы — закладнікі Германіі. Гэта пачатак новай эры, магчыма, найцяжэйшай у маім жыцці” (с.49).
Пад нямецкай акупацыяй жыццё віленскіх яўрэяў імкліва ператвараецца ў пекла: яны мусяць зрабіць сабе нашыўкі з жоўтай зоркай Давіда, ім забараняецца хадзіць па тратуарах і шэрагу вуліц, уступаць у шлюбы з неяўрэямі, для іх уводзіцца каменданцкая гадзіна, ім дазволена набываць тавары толькі ў адпаведных крамах і ў спецыяльна вызначаныя гадзіны. Рабункі, знявагі, арышты і забойствы яўрэяў літоўскімі калабарантамі (т.зв. іпацінгамі, ад літ. Ipatingas Buris — “выбраныя”) зрабіліся паўсядзённаю з’явай.
28 чэрвеня 1941 году Крук адзначыць, што салідарнасць народаў, якую прапагандавалі бальшавікі, знікла разам з адыходам Чырвонай Арміі. У дагэтуль нечуваных памерах у людзях прачнулася нянавісць.
4 ліпеня 1941 году абылося паседжанне прадстаўнікоў віленскай яўрэйскай грамадскасці, якім было загадана абраць Юдэнрат. Апісваючы паседжанне, Крук цытуе доктара Гершна Гершуні (1860—1941): “Мы меркавалі, што Літоўскі Іерусалім пазбегне пераследу, бо тут знаходзяцца пахаванні Гера Цэдэка і Віленскага гаона. Але гэтага не адбылося. Мы павінны

стварыць Юдэнрат” (с.53). Юдэнрат узначалілі Шауль Троцкі і Анатоль Фрыд.
Яўрэйскае насельніцтва было накіравана на прымусовую цяжкую фізічную працу. Г. Крук на працягу дзесяці тыдняў хаваўся і ўхіляўся ад яе, але 27 жніўня мусіў пайсці працаваць. 26 жніўня 1941-га ён пазначыў: “Заўтра я стану рабом Гітлера” (с.75).
Знішчэнне віленскага яўрэйства пачалося ўжо ў ліпені 1941 году. Тады нямецкая Айнзацкаманда-9 сумесна з літоўскімі іпацінгамі знішчыла ў Панарскім лесе каля 5000 мужчын. “Акцыя” 31 жніўня — 3 верасня забрала жыцці яшчэ 8000 віленскіх яўрэяў. У пачатку верасня нацысты стварылі ў Вільні два гета. Усё насельніцтва Вільні назірала за гэтым з супярэчлівымі пачуццямі. Крук пазначае, што некаторыя дапамагалі сваім яўрэйскім сябрам і суседзям, другія ж скарысталіся з нагоды танна набыць чужыя рэчы і чужую маёмасць (с.99).
30.000 яўрэяў былі накіраваныя ў Гета-1, прыкладна 9000—11000 — у Гета-2. Астатнія 6000 былі забітыя ў Панарах (Панарскі лес, дзе падчас вайны было знішчана 70.000—100.000 мірных жыхароў, упершыню ўзгадваецца Круком 4 верасня). У Юдэнрат першага гета ўвайшоў былы кіраўнік віленскай камунальнай гаспадаркі Фрыд, а таксама прадстаўнікі галоўных палітычных плыняў (у т.л. сіяністаў і Бунду). Былы афіцэр літоўскай арміі, кіраўнік літоўскай арганізацыі сіяністаў-рэвізіяністаў “Brit ha-Hayal” Якаў Генс быў прызначаны шэфам яўрэйскай паліцыі.
15 верасня 1941 году нямецкія ўлады распачалі сартаванне насельнікаў гета. 3000 уладальнікаў т.зв. жоўтага пасведчання (г.зн. прызнаных годнымі да працы) разам з жонкай і двума дзецьмі да 18 гадоў (бацькоў уносіць у жоўтыя пасведчанні было забаронена) атрымалі дазвол перасяліцца ў Гета-1. Усё астатнія мусілі застацца ў Гета-2. Рызыкуючы ўласным жыццём, Крук унёс ва ўласнае “жоўтае” пасведчанне жонку аднаго з стваральнікаў Бунду, дэлегата I з’езду РСДРП у Менску Аркадзя Крэмера Паці Крэмер.
У першыя два тыдні (6—20 верасня) свайго жыцця ў гета Крук не мог пісаць. 20 верасня ён пазначае: “Апошнія два тыдні былі для мяне не тыдні, але гады… Усё, што мы перажылі і прайшлі — дзіцячая забаўка ў параўнанні з апошнімі 14 днямі” (с.100).

На пачатку кастрычніка 1941 году эсэсаўцы і іпацінгі правялі т.зв “Jom-Kippur–Aktion”: 1—2 кастрычніка былі знішчаны 3300 чалавек, 3—4 кастрычніка яшчэ 2000. Наступныя акцыі адбыліся 15—16 і 21 кастрычніка. Другое гета спыніла сваё існаванне.
Паміж 24 кастрычніка — 22 снежня ў Гета-1 быў праведзены шэраг ліквідацый (24, 29 кастрычніка, 3 лістапада, 3—4, 15 снежня, 20—21 снежня). Вязняў гета расстрэльвалі ў Панарах літоўскія “выбраннікі”.
У пачатку 1942 году ў гета засталося каля 20.000 яўрэяў, прыкладна 3500 чалавек здолелі ўцячы і схавацца ў навакольных гарадах і вёсках.

**Як ствараўся Дзённік Віленскага гета**

У параўнанні з іншымі вязнямі гета Герман Крук знаходзіўся ў прывілеяваным становішчы. Як супрацоўнік Юдэнрату (кіраўнік бібліятэкі) ён жыў у адмысловым блоку, як супрацоўнік штабу “Einsatzstab Reichsleiter Rosenberg” (створаны ў кастрычніку 1940 году пад кіраўніцтвам Альфрэда Розенберга з мэтай рабавання культурных каштоўнасцяў на акупаваных Германіяй тэрыторыях) атрымаў магчымасць весці даследаванні па-за межамі гета, у тым ліку карыстацца фондамі бібліятэкі Віленскага ўніверсітэту. Крук чытаў прэсу — легальную польскую, нямецкую, літоўскую, да яго траплялі нелегальныя выданні, улёткі. Пра падзеі на фронце і ў свеце Крук і ягоны сябар, прадстаўнік Бунду ў Юдэнраце Рыгор Яшунскі даведваліся з перадачаў ангельскага, савецкага і польскага радыё (27 снежня 1942 году яўрэям было загадна здаць прыймачы, але Крук і Яшунскі гэтага не зрабілі).
Крук атрымліваў інфармацыю ад Яшунскага, кіраўніцтва партызанскай арганізацыі гета FPO (Fereinikte Partisaner Organisatzije, Аб’яднаная партызанская арганізацыя) і нават кіраўніка паліцыі Якава Генса. Ён выкарыстоўваў матэрыялы статыстычнага аддзелу гета, пратаколы судовых паседжанняў, размаўляў са сведкамі падзеяў (уцекачом з баранавіцкага гета, ковенскім чыгуначнікам і г.д.). Таму ў дзённіку Крук не абмяжоўваецца падзеямі ў Віленскім гета, а дае звесткі аб знішчэннях яўрэяў Баранавічаў (у снежні—сакавіку 1943 году ён стварыў хроніку “Трагічны канец яўрэяў у Баранавічах”),

Ліды, Ашмянаў і іншых мест. Аўтар распавядае таксама пра падзеі ў Велічанах, Троках, Горадні, Глыбокім, Воранаве, Радуні, Беластоку, шматлікіх польскіх гарадах і мястэчках, апісвае ўмовы ўтрымання вязняў Менскага гета. Ён сачыў за тым, як гінула Варшаўскае гета, а значыць, сям'я яго сястры Голды Торнэр. Яму таксама было вядома, як дзеюць газавыя камеры ў Трэблінцы.

Па-за межамі гета Крук здабыў шмат сяброў, якія перадавалі яму каштоўную інфармацыю. Так, цёплыя адносіны склаліся ў яго з бібліятэкаркай Віленскага ўніверсітэту Онай Шымайтэ, якая выратавала шмат яўрэяў (пераважна дзяцей), а таксама яўрэйскія культурныя каштоўнасці. Крук падтрымліваў сувязь з прадстаўніком Польскай сацыялістычнай партыі Клеменсам (ён жа — М. Рынзол (M. Rinzol)), праз якога віленскія бундаўцы мелі выхад на Захад.

Кожны дзень увечары Герман Крук зачыняўся ў сваім пакойчыку ў бібліятэцы і надыктоўваў сакратарцы, Рахелі Мендэльсунд-Кавярскай, хроніку гета. У гета было вядома тое, што Крук піша дзённік, але на гэтую тэму асабліва не гаварылі, бо інфармацыя магла дасягнуць немцаў. Дзённік ствараўся ў трох экзэмплярах, адзін з якіх Крук хаваў у бібліятэцы, другі — у польскага святара, а трэці — у схованцы ў гета.

Становішча, у якім ствараўся дзённік, тлумачыць моўныя памылкі і няяснасці ў крукаўскім тэксце. Выпраўленні, перакрэсліванні і дапісванні сустракаюцца амаль на кожнай яго старонцы. Крук планаваў перагледзець тэкст, але не паспеў гэта зрабіць.

Чым зрабіўся дзённік для Германа Крука? 30 верасня 1942 году ён пытае сам сябе, а ці мае сэнс яго жыццё нават тады, калі ён здолее выратавацца з Віленскага гета? Які сэнс будзе мець яно, калі ўсяго, што было яму родным і блізкім, па чым можна было плакаць і шкадаваць, ужо не існуе (с.371)? Сэнс жыцця Герман Крук знойдзе ў пісанні свайго дзённіка. Ён неаднаразова паўтарае, што дзённік — гэта адзінае, што яшчэ прымушае яго жыць. На адваротных лістах Крук пакінуў просьбу перадаць у выпадку яго смерці тэкст брату Пінхасу ў Нью-Йорк.

**1942: год няспраўджаных надзеяў**

1942-гі быў "найлепшым" годам у гісторыі Віленскага гета. У той год нацысты ўстрымаліся ад акцыяў знішчэння і таму

было дастаткова спакойна. Яўрэі жылі адзінай надзеяй — надзеяй на вызваленне.

**Палітычная барацьба ў гета і ўсталяванне паліцэйскай дыктатуры**

У барацьбе за ўладу ў гета перамагла паліцыя пад кіраўніцтвам Я. Генса. Кіраўнік Юдэнрату Фрыд патрапіў у залежнасць ад Генса і яго паплечнікаў — літоўскіх сіяністаў-рэвізіяністаў. Прафесійны вайсковец Генс здолеў наладзіць працу паліцыі, у якой былі створаны крымінальны аддзел, агентурная сетка, сакрэтная і жаночая паліцыя.

“Дучэ” Я. Генс (словы Крука) абяцаў, што пад паліцэйскім кіраўніцтвам гета здолее перажыць вайну. Бундавец Крук асуджаў і востра крытыкаваў генсаўскую “паліцэйска-ваенную” дыктатуру (с.140). Генс пагражаў сваім палітычным апанентам, а таксама ўсім, хто адмовіцца выконваць яго распараджэнні, дэпартацыяй у Панары і смяротным пакараннем. Тым не менш, у 1942 ён не перайшоў ад пагрозаў да адкрытага пераследу. Камуністы, бундаўцы, сіяністы працягвалі сваю дзейнасць і ў сценах гета. Першыя засяродзіліся на падпольнай працы, другія дасягнулі значнага ўплыву на працоўных гета. І камуністы, і бундаўцы вялі прапаганду з дапамогай улётак.

Вынікам сумеснай працы камуністаў, бундаўцаў, а таксама розных сіянісцкіх партыяў стала стварэнне ў пачатку 1942 году FPO. Кіраўніцтва паліцыі спярша паставілася да FPO даволі лаяльна. Канфлікты паміж паліцыяй і партызанамі разгарэліся толькі ў 1943 годзе.

Крук неаднаразова падкрэслівае ў сваім дзённіку, што Юдэнрат і паліцыя карысталіся выключна благой рэпутацыяй у гета. Ва ўстановах Юдэнрату, што ў гета атрымаў мянушку “Yidn-farat” (яўрэйская здрада), панавала карупцыя. Фрыд і ягоныя паплечнікі выкарыстоўвалі свае пасады для паляпшэння ўласнага дабрабыту. Яўрэйская паліцыя супрацоўнічала з немцамі, сваволіла, рабавала, хабарнічала, старанна і дакладна выконвала карныя загады нацыстаў, выкрывала нелегальныя схованкі ў гета падчас т.зв. хапуноў (“khapunes”), гвалтам прымушала яўрэяў працаваць.

Матэрыяльна паліцэйскія былі добра забяспечаны: калі ў гета галадавалі, яны бавілі вольны час з жанчынамі, гарэлкай і

аркестрам. 29 снежня 1942-га Крук пазначыў, што “яўрэйская паліцыя больш нямецкая, чым самі немцы” (с.187).
Загадам Гестапа ад 11 ліпеня 1942 году Юдэнрат быў распушчаны, а кіраўніцтва гета было ўскладзена на Генса. Фрыд атрымаў пасаду намесніка па адміністрацыйных пытаннях, а сябар студэнцкай сіянісцкай рэвізіянісцкай групоўкі “Хасманеі” Салек Дэслер (Salek Dessler) узначаліў паліцыю.
Пад новым кіраўніцтвам віленская яўрэйская паліцыя ўдзельнічала ў шэрагу акцыяў знішчэння. 17 і 23 ліпеня паліцэйскія дэпартавалі з гета 84 старых, якія потым былі расстраляны літоўскімі іпацінгамі ў Панарах. 23 кастрычніка ў Ашмянах віленская яўрэйская паліцыя падрыхтавала да дэпартацыі і знішчэння больш за 400 старых, жанчын і дзяцей. Іх знішчылі эсэсаўцы разам з літоўскай паліцыяй. Генс бычыў у такім супрацоўніцтве з немцамі адзіную магчымасць захаваць Віленскае гета.

**Гандаль і сфера паслугаў у гета**
Яшчэ ў 1941 годзе ў гета адчынілася пошта. Яўрэі атрымалі дазвол слаць пошту, праўда, толькі на нямецкай мове. З розных куткоў свету ў гета прыходзілі лісты, многія з якіх сваіх атрымальнікаў ужо не знайшлі. У снежні 1942 году адчынілася лазня. Вуліцы ператварыліся ў цэнтр гандлю і абмену прадуктамі харчавання, якія, нягледзячы на забарону, праносіліся ў гета. Вязні наладзілі гандлёвыя сувязі з сялянамі і “арыйскай” часткай гарадскога насельніцтва. Мяса, хлеб, яйкі, бульба, цыгарэты, цыгарэтная папера, запалкі, сахарын, цыбуля, пірожныя, шакалад, рыба, птушка, мёд, гарэлка — усё гэта і шмат іншага можна было набыць на вуліцах Віленскага гета. Гандаль імгненна прыпыняўся, калі на тэрыторыю гета ўваходзілі нямецкія афіцэры.
У сакавіку 1942 году ў гета адчыніліся невялікія крамы з больш ці менш прыстойным асартыментам тавараў: аддзеннем і абуткам, газетамі і цыгарэтамі, хлебабулачнымі вырабамі.
У Віленскім гета працавалі некалькі рэстаранаў і начных клубаў, што прапаноўвалі разнастайныя стравы і напоі. На працягу 1942 году паліцыяй былі выяўленыя два бардэлі.
У пачатку 1943 году ў віленскім гета адчыніўся гатэль.

Такім чынам, калі адны вязні хварэлі і паміралі ад голаду, неслі апошнія рэчы ў ламбард, другія хадзілі ў рэстараны і бардэлі.

**Адукацыя, культурнае жыццё, спорт**

Культурны феномен віленскага гета — гэта сетка адукацыйных устаноў, што паўстала ў 1942 — пачатку 1943 году: тры пачатковыя школы, вышэйшыя школьныя групы, мужчынская і жаночая школы-інтэрнаты, музычная і тэхнічная школы і г.д. Заняткі ў школах вяліся на ідыш. Сярод прадметаў трэба вылучыць арыфметыку, гісторыю культуры, прыродазнаўства, гігіену, рамёствы, спевы, гімнастыку, маляванне і іншыя. Тэхнічная школа рыхтавала слесараў, электрыкаў і г.д. Найлепшыя вучні тэхнічнай і музычнай школаў атрымлівалі стыпендыі. Школам хранічна не ставала абсталявання, сшыткаў і падручнікаў.

У сакавіку 1942 году адчыніліся дом сіротаў і медыцынскі цэнтр для дзяцей і падлеткаў, які павінен быў спрыяць іх інтэлектуальнаму развіццю і ўмацоўваць псіхічнае здароўе. Увосень 1942 году ў гета пачалі працаваць курсы будаўнікоў, цесляроў, краўцоў, зваршчыкаў і г.д.

17 снежня 1942-га ў гета з'явіліся абвесткі, якія запрашалі ўсіх ахвочых наведаць падрыхтаваны паліцыяй і групай артыстаў канцэрт. Кампанія байкоту прызначанай імпрэзы (бундаўскія ўлёткі заклікалі "не рабіць тэатру на могілках") не здолела яе сарваць. На канцэрт былі таксама запрошаны немцы, у гонар якіх спявачка Люба Лявіцкая выканала нямецкія песні. Зборы ад продажу квіткоў былі аддадзеныя галадуючым. 26 снежня 1942 году паліцыя зноў запрасіла на канцэрт віленскіх катаў — нямецкіх афіцэраў і іх літоўскіх сяброў. Яўрэі забаўлялі сваіх забойцаў.

Арганізаваная 20 снежня 1942 году Асацыяцыя пісьменнікаў, аўтараў і артыстаў гета ставіла сваёй мэтай стымуляванне культурнага жыцця, падтрымку творцаў, публікацыю твораў жывых і памерлых пісьменнікаў. Асацыяцыя правяла шэраг лекцый, чытанняў (напрыклад, прысвечаныя Шалом-Алейхему), ладзіла вечарыны і выставы.

8 лютага 1942 году ў гета была ўтворана асацыяцыя юрыстаў, а праз два дні — Саюз прафесійных музыкантаў. Прафесійныя аб'яднанні былі арганізаваны лекарамі, настаўнікамі, свой

гурток арганізавалі шахматысты. Рэлігійныя сіяністы (мізрахі) чыталі лекцыі па яўрэйскай гісторыі. У двух ешыботах гета вывучаліся Тора і Талмуд, планавалася стварэнне хедару (пачатковай рэлігійнай школы для хлопчыкаў). Ідышысцкі і іўрыцкі хары ладзілі канцэрты.
Падлеткі і моладзь стварылі клубы, пры якіх адчыніліся літаратурныя, гістарычна-культурныя і іншыя гурткі. Акрамя таго ў гета дзейнічалі матэматычны, фізічны, хімічны, лінгвістычны, філасофскі і іншыя гурткі. Пры хімічным гуртку мелася лабараторыя, а пры філасофскім — секцыі этнаграфіі, этналогіі і фальклору. У кастрычніку 1942 году хімічная лабараторыя наладзіла вытворчасць вітаміну D, які разам з вітамінам B распаўсюджваўся сярод хворых дзяцей.
26 красавіка 1942 году пад акампанемент сімфанічнага аркестру адбылася першая пастаноўка Тэатру віленскага гета. Пазней адчыніўся лялечны тэатр. Рэцэнзіі на тэатральныя пастаноўкі, афіцыйная хроніка і іншыя звесткі змяшчаліся на старонках газэты “Geto-yedies”.
У маі 1942 году адчынілася кнігарня, што гандлявала галоўным чынам дзіцячымі кніжкамі. 13 мая таго ж году ў доме Генса адбылося першае паседжанне палітычнага клубу. Прысутныя слухалі паведамленні на актуальныя палітычныя ці нацыянальныя тэмы, пасля чаго адбывалася дыскусія. У ліпені 1942-га Генс выступіў з ініцыятывай заснавання літаратурных прэміяў. Імі былі адзначаныя паэт А. Суцкевер (за паэтычную творчасць) і Г. Крук (за літаратуру і журналістыку). У той самы час пачала сваю дзейнасць група мастакоў, якія меліся ствараць карціны з жыцця Віленскага гета (фатаграфаваць у гета было забаронена).
Канфузам скончыўся 25 жніўня 1942 году канцэрт, на які кіраўніцтва гета запрасіла немцаў і літоўцаў. Крук паведамляе, што за 15 хвілін да пачатку імпрэзы палкоўнік Гестапа загадаў яўрэйскай паліцыі ачысціць памяшканне ад немцаў (с.346), палічыўшы, напэўна, што прысутнасць на яўрэйскім мерапрыемстве ганебная для прадстаўнікоў “вышэйшай расы”.
У красавіку 1943 году кіраўніцтва гета паспрабавала карэнным чынам змяніць кірунак культурнай палітыкі: на думку Генса, усе жыхары гета павінны былі стаць нацыяналістамі. Кіраўнік культурнага аддзелу Леа Бернштэйн запатрабаваў унесці неабходныя змены ў сістэму адукацыі: увесці ў якасці

абавязковага прадмету ва ўсіх школах іўрыт, уключыць у спіс прадметаў геаграфію Палестыны і яўрэйскую гісторыю, вывучаць Талмуд. Падчас т.зв. “гебраізацыі” ідышысцкай Вільні выраслa колькасць культурных мерапрыемстваў, якія праводзіліся на іўрыце.
Летам 1942 году Я. Генс арганізаваў спартовую пляцоўку, на якой адбываліся спаборніцтвы ў бегу (найлепшыя атлеты былі адзначаны ўзнагародамі — напрыклад, першы прыз склаў кілаграм цукру), гімнастыцы, скачках удоўжкі і ўвышкі, спаборніцтвы ў гандболе, валейболе і футболе.

**Судовая сістэма**
Правасуддзе ў Віленскім гета чыніў суд, які складаўся з суддзяў, пракуроraў, абаронцаў і сакратароў. За час свайго існавання суд вынес рашэнні па розных справах — у тым ліку па крадзяжах і забойствах. Суд прысуджаў грашовыя пакаранні, караў вінаватых арыштамі (у гета існавала ўласная турма), некалькі разоў выносіў смяротныя прысуды (за забойства). Пазней у гета быў створаны апеляцыйны суд.

**Бібліятэка гета і яе чытачы**
У верасні 1941 году Юдэнрат даручыў Г. Круку стварыць на базе заснаванай у 1911 годзе віленскай “Mefitse Haskalah” бібліятэку гета. 15 верасня бібліятэка адчынілася. Праз год, у верасні 1942 году Крук падрыхтаваў справаздачу “Бібліятэка ў гета і чытачы ў гета”. Падчас захопу Вільні немцамі “Mefitse Haskaläh” страціла каталог і прыкладна пятую частку сваіх фондаў, але ўжо праз месяц працы колькасць выданых чытачам кніг перавысіла даваенны ўзровень. Паводле звестак на 15 верасня 1942 году, 4700 вязняў Віленскага гета былі чытачамі бібліятэкі. Разам з акцыямі знішчэння бібліятэка траціла сваіх чытачоў і супрацоўнікаў.
5 мая 1942 году адчыніла свае дзверы чытальная зала, якая хутка ператварылася ў месца сустрэч інтэлігенцыі. Калі большасць чытачоў бібліятэкі складалі жанчыны, то сярод карыстальнікаў чытальнай залы дамінавалі мужчыны. Тут ствараліся навуковыя творы, вяліся дыскусіі, ладзіліся вечарыны. У памяшканні бібліятэкі бундаўцы збіраліся на нелегальныя сходы, тут адбываліся паседжанні FPO. У гета, дзе

на кожнага жыхара прыпадала прыкладна 70 см жылой плошчы, чытальная зала стала фактычна адзіным месцам, дзе можна было знайсці спакой, пасядзець у цішыні ва ўтульным крэсле.
Крук падкрэсліваў, што ў гета чыталі больш, чым у даваенныя часы. Кніга стала для віленскіх яўрэяў наркотыкам, які дазваляў хоць на хвіліну забыцца пра рэальнае жыццё з яго страхамі. Не выпадкова пасля кожнай акцыі знішчэння колькасць выданых на рукі кніг значна ўзрастала.
Якая літаратура карысталася попытам у гета? Крук адзначае, што чытачы амаль не звярталіся да сур'ёзнай літаратуры. Жанчыны аддавалі перавагу дэтэктывам польскіх і расійскіх аўтараў, а таксама "жаночым" раманам (напрыклад, "Знесеным ветрам" М. Мітчэл). Моладзь захаплялі прыгодніцкія раманы. У інтэлігенцыі карысталіся папулярнасцю раманы Ражэ Мартэна, Якаба Васэрмана, Марка Алданава і іншых аўтараў. Сярод чытачоў, якія аддавалі перавагу сур'ёзнай літаратуры, першае месца займала "Вайна і мір" Л. Талстоя. Не змяншаўся попыт на творы пра вайну — кнігі Э. М. Рэмарка, Я. Гашака, Э. Заля і інш. З другогу боку, раманы Дастаеўскага, Горкага, Флабэра ці Ралана ўвогуле не знаходзілі чытача.
Не затрымліваліся на бібліятэчных паліцах творы па яўрэйскай гісторыі (у т.л. па гісторыі пераследу яўрэяў у Сярэднявеччы), гістарычныя раманы. Сярод яўрэйскіх аўтараў чытачы аддавалі перавагу творам Шалома Аша і Ізраіля Зангвіля, моладзь ахвотна чытала "Юдэйскую вайну" Язэпа Флавія.
Чытач віленскага гета быў пераважна польскамоўным чытачом. 60% выдадзеных кніг было на польскай мове, 20% — на ідышы, 15% — на расійскай мове і толькі 2% — на іўрыце.

**Einsatzstab Reichsleiter Rosenberg: рабаванне віленскіх яўрэйскіх каштоўнасцяў**

У лютым 1942 году Крук атрымаў загад ад Штабу Розэнберга стварыць адмысловую рабочую групу для т.зв. праекту "Judenforschung ohne Juden" (вывучэнне яўрэяў без яўрэяў). У яго рамках даследаваліся фонды Yivo, бібліятэк, музеяў і архіваў Вільні, а найбольш каштоўныя матэрыялы вывозіліся ў Германію. Перад групай быў пастаўлены шэраг канкрэтных задачаў: падрыхтаваць выставу яўрэйскіх і савецкіх кніг, якая

павінна была пацвердзіць тэзу гебельсаўскай прапаганды пра тоеснасць усяго яўрэйскага і бальшавіцкага; знайсці доказы супольнага паходжання зоркі Давіда і Чырвонай Зоркі; апрацаваць тэму “Антысемітызм сярод балтыйскіх народаў”; стварыць падрабязную карту Вільні з пазначэннем будынкаў, якія належалі яўрэйскай грамадзе, і г.д.
У сакавіку 1942 году Крук быў уключаны ў склад рэдакцыйнага камітэту па стварэнні гісторыі яўрэяў гета, якую загадала напісаць віленскае Гестапа. У тым жа месяцы Крук быў прызначаны кіраўніком архіву, а ў жніўні 1942-га — музэю гета.

**Святы ў гета**

У віленскім гета адзначалі розныя святы: юдэйскія, сацыялістычныя (камуністы і бундаўцы і ў гета спраўлялі Першамай), супольныя (Новы Год). Але якім бы ні было свята, пажаданні заставаліся аднолькавымі: выжыць, выйсці з гета, сустрэцца з роднымі і сябрамі, дачакацца мірнага часу, апавесці свету пра перажытае.
Пурым у Віленскім гета ў 1942 годзе суправаджаўся шэрагам вечарынаў і імпрэзаў. На Пасху выдавалі мацу. Адкрытае святкаванне Першамаю было забароненае, але камуністы і бундаўцы правялі-такі святочнае паседжанне. На яўрэйскі Новы Год — Рош-ха-Шана — малітоўныя дамы запоўніліся вернікамі. Яшчэ больш людзей было на малітве Кол-Нідрэ, з якой пачалося свята Йом-Кіпур. Зялёныя буданы, атрыбут свята Сукот, можна было пабачыць і ў Віленскім гета. Святкаванне ў гета Ханукі 3 студзеня 1943 году пачалося з вялікай імпрэзы, якую падрыхтавала паліцыя.
У першай палове 1943 году ў гета таксама будуць спраўляць святы, а апошні Пэсах у красавіку 1943 году перасягне мінулагодні па размаху і колькасці мерапрыемстваў.

**Забойцы і ахвяры**

Хроніка гета — гісторыя катаў і ахвяраў. На старонках дзённіка Крук паказвае “герояў” вайны з яўрэямі: акруговага камісара Ганса Хінгста, яго намесніка па яўрэйскіх справах Франца Мурэра, афіцэраў СС, якія кіравалі масавымі забойствамі. “Прадстаўнікі вышэйшай расы” былі не ў стане перамагчы ў вайне і маглі толькі цешыцца перамогай над бяззбройнымі

яўрэямі.
З другога боку былі тыя, каго “вышэйшая раса” загнала ў гета і метадычна знішчала з дапамогай літоўскіх калабарантаў: старыя, жанчыны, дзеці, яўрэі-каталікі, яўрэі-праваслаўныя, яўрэі-баптысты, адукаваныя і невукі, багатыя і бедныя, камуністы і сіяністы. Усе яны вінаватыя ў тым, што яны яўрэі, а значыць, і лёс у іх аднолькавы: Панары.

**Сусветная супольнасць і знішчэнне яўрэяў**
5 снежня 1942 году Крук ставіць у дзённіку пытанне, а ці ведае сусветная супольнасць пра тое, што адбываецца ў Віленскім гета (с.157). На працягу 1942 — пачатку 1943 году ён занатоўвае паведамленні пра міжнародную рэакцыю на знішчэнне яўрэяў ва Ўсходняй Еўропе. Сусветная супольнасць пачынае пратэставаць толькі пры канцы 1942 году, калі дажывае апошнія дні Варшаўскае гета, калі знішчаныя сотні гета ў Польшчы, Беларусі, Літве, калі шэраг гарадоў і мястэчак ужо абвешчаны “Judenrein”, калі нямецкае вырашэнне “яўрэйскага пытання” ўваходзіць у апошнюю стадыю. Свет нарэшце прачнуўся: саюзнікі асудзілі пераслед яўрэяў, лонданскае радыё перадало памінальную малітву па забітых. 14 мая 1943 году аўтар адзначае, што хутка павінен быць адчынены другі фронт, але чым больш саюзнікі будуць марудзіць, тым меншымі робяцца шанцы гета на ўратаванне (с.539).

**Чаму яўрэі?**
Хроніка Віленскага гета складаецца не толькі з падрабязнага апісання падзеяў, але і іх асэнсавання аўтарам, спробы знайсці адказ на пытанне, чаму яўрэйскі народ перажывае трагедыю, адшукаць параўнанні і аналогіі ў гісторыі. Крук параўноўвае Гітлера з егіпецкім фараонам (5 лютага 1942 году), узгадвае крыжовыя паходы (15 студзеня 1942-га), пагромы ў Польшчы і на Ўкраіне ў 1910-х—1920-х, але не знаходзіць адказаў на пытанне.

**1943: знішчэнне Віленскага гета**
Нягледзячы на чуткі пра хуткае знішчэнне гета, што актыўна распаўсюджваліся ў першыя месяцы 1943 году, Генс заклікаў

вязняў сумленна працаваць. Ён быў упэўнены, што гэта адзіная магчымасць падоўжыць існаванне Віленскага гета. 30 студзеня 1943 году Крук пазначыў, што адбылася размова паміж новым кіраўніком Віленскага Гестапа Рольфам Нойгебауэрам (Neugebauer) і Генсам. Першы запэўніў, што пасля перамогі Германіі ў вайне яўрэі атрымаюць недзе ў свеце свой “куток” (“a corner of the world somewhere”), на якім змогуць жыць. У выпадку нямецкай паразы яўрэяў, паводле Нойгебаўэра, чакае знішчэнне.

Генс не здолеў супакоіць гета. Апошнія надзеі ў яго насельнікаў зніклі 5 красавіка 1943 году, калі ў Панарах былі расстраляныя больш за 4000 яўрэяў з Ашмянаў, Міхалішкаў, Свянцянаў, Смаргоні і іншых мястэчкаў. Пасля гэтай акцыі ў гета ўспыхнула паніка, яго насельнікі кінулі працаваць, бо зразумелі, што іх хутка будуць знішчаць. Моладзь накіравался ў лясы. Напрыклад паўстанцаў Варшаўскага гета арганізацыя FPO пачала рыхтавацца да ўзброенага супраціву.

16 красавіка 1943 году некалькі вышэйшых афіцэраў Гестапа ўвайшлі на тэрыторыю гета і запатрабавалі выдаць дзіця, якое яўрэі нібыта скралі ў жонкі аднаго з іпацінгаў, каб потым забіць. Гестапаўцы запатрабавалі ад кіраўніцтва гета афіцыйных тлумачэнняў і пагражалі жорсткім пакараннем. Праз некаторы час дзіця было знойдзена па-за межамі гета. FPO актыўна назапашвала зброю, яе сябры наладзілі цесную сувязь з партызанскімі фармаваннямі ў навакольных лясах. Якаў Генс, які лічыў, што акцыі FPO ставяць пад пагрозу існаванне гета, загадаў паліцыі распачаць канфіскацыю зброі. У чэрвені FPO прыняла рашэнне выступіць супраць паліцыі, калі вышук зброі і арышты сяброў арганізацыі не будуць спыненыя. 12 чэрвеня сябар FPO застрэліў паліцэйскага. У адказ Генс асабіста расстраляў забойцу.

28 чэрвеня Генс пазбавіў сяброў FPO усіх кіраўнічых пасадаў у гета. 13 ліпеня ён ізноў запэўніў насельніцтва, што гета нічога не пагражае. А на наступны дзень Герман Крук спыніў свой віленскі дзённік.

15 ліпеня паліцыя арыштавала лідэра FPO Іцыка Вітэнберга. Партызанская арганізацыя адбіла яго ў паліцыі. СС запатрабавала яго выдаць назад і прыгразіла знішчыць гета ў выпадку адмовы. Вітэнберг здаўся і зрабіў сабе смерць.

4 і 24 жніўня, 2, 4, а таксама 23 і 24 верасня 2500 яўрэяў былі

накіраваны ў працоўны лагер Вільні, каля 3700 чалавек — у працоўныя лагеры ў Эстонію і Латвію, а астатнія — на смерць у Панары і Сабібор. Заклік FPO да ўзброенага супраціву быў фактычна праігнараваны, але большасць сяброў партызанскай арганізацыі здолела ўцячы ў лес і далучыцца да партызанскіх фармаванняў. 14 верасня Якаў Генс, імкнучыся выратаваць гета, здаўся Гестапа і ў той жа дзень быў расстраляны.
24 верасня 1943 году віленскае гета спыніла сваё існаванне. Калі 13 ліпеня 1944 году Чырвоная Армія вызваліла Вільню, выявілася, што толькі 2000—3000 віленскіх яўрэяў здолелі перажыць Катастрофу.
Сам Г. Крук трапіў у эстонскія лагеры Клоога і Лагеды, дзе працягваў весці свае запісы. Ён не дажыў толькі адзін дзень да вызвалення. 18 верасня 1944 году нацысты спалілі яго разам з іншымі вязнямі лагеру Лагеды.

**Публікацыі Дзённіка**
У 1961 годзе хроніка была ўпершыню апублікаваная на ідыш (Togbukh fun Vilner Geto). Праз тры гады былы вязень Віленскага гета і актыўны ўдзельнік FPO Аба Коўнэр выдаў дзённік на іўрыце. Пабудаваная на дзённіку Крука п’еса “Гета” (1984) прынесла ізраільскаму драматургу Іошуа Собалю сусветную вядомасць.

Гісторыя Германа Крука — гэта гісторыя чалавека, які, страціўшы ўсё — родных, сяброў, надзею, усвядоміў, што павінен данесці да людзей пабачанае, пачутае і перажытае. Ён не пісаў для таго, каб выжыць, а выжываў для таго, каб пісаць, каб свет даведаўся пра яго асабістую трагедыю, пра трагедыю тысячаў вязняў Віленскага і іншых гета, каб пачуў імёны забойцаў і не забыўся пра ахвяраў.
Тое, што мы ведаем праўду пра жахлівую гісторыю знішчэння віленскіх яўрэяў, — заслуга Германа Крука.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
**№ 5 (28) – 2003**

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **2003/12/14**
[image]

# Кшыштаф Чыжэўскі Духоўнасьць Вільні

**КШЫШТАФ ЧЫЖЭЎСКІ — эсэіст, рэдактар часопісу “Краснагруда”. Апошняя ягоная публікацыя ў “ARCHE” — эсэ “Томас Вэнцлава — чалавек зь іншага боку” (№6, 2001). Пераклад друкуецца з ласкавай згоды аўтара.**

Вільня 90-х гадоў, мая Вільня, Вільня канца другога тысячагодзьдзя, Вільнюс. Музэй атэізму, што зноў ператвораны хрысьціянскаю сьвятыняй. Тоўсты слой савецкага налёту сьціраны ўпарта й да мазалёў на руках, штодня робіцца танчэйшым. Чэслаў Мілаш, зь якім я іду па старым горадзе, беспамылкова згадвае кожную вулачку й завулак. “Я яшчэ памятаю кожны завулак Вільні; я мог бы прайсьці праз гэты горад з завязанымі вачыма, думаючы пра нешта сваё, але ўсё роўна знайшоў бы там усё”, — гэтыя словы, запісаныя ў Амэрыцы, належаць ня Мілашу, хаця, без сумневу, маглі б належаць і яму. Чаму іх аўтар, Томас Вэнцлава, выхаваны ўжо ў паваеннай Вільні, у дыялёгу зь Мілашам упарта сьцьвярджаў, што гэта “два зусім розныя гарады” і што нават Варшава, “нягледзячы на страшныя разбурэньні”, зьмянілася меней? Мяне ж пачынае цікавіць абсалютна іншае: надыходзіць час абеду, мой спадарожнік выгаладаўся, а тут выяўляецца, што ў гэты час усе рэстарацыі зачыніліся на абедзенны перапынак. Празь некалькі нэрвовых хвілінаў пошуку мы сядаем на высокія ўслоны ў малочным бары і ямо пельмені. Мы шчасьлівыя, як савецкі чалавек на прапагандысцкім плякаце.

На Лукішках ужо няма Леніна. У доме Шуры на завулку Краж’ё стары бацька вывучаў габрэйскую й памятаў ідыш, але з дачкой

гаварыў расейскаю. Яна ж із сваімі дзецьмі гаворыць выключна па-літоўску. А мяне прысаромлівала надзвычайнай ведаю польскае. Цяпер яна вучыць ідыш, яе дачка — польскую, а сын ажаніўся зь беларускаю польскага паходжаньня. Цяпер у Вільні гучыць радыё “З-над Вяльлі”, гучыць па-літоўску, польску й расейску, ці — можна было б паўтарыць Іосіфа Бродзкага — на ўсіх трох родных мовах Томаса Вэнцлавы.
Паблізу ад дому Шуры цягам некалькіх год пасьля памятнага сьнежня 1991 году тырчэлі бэтонныя загароды, што абаранялі літоўскі парлямэнт. Я пабачыў улётку, якую раскідвалі ў тыя драматычныя дні заўзятага ходаньня за незалежнасьць, — малітву пілігрыма з мэсіянскіх “Кнігаў польскага народу й польскага пілігрымства” Міцкевіча, у якой слова “Польшча” было замененае словам “Літва”. Ідучы ўрадавым калідорам да кабінэту Вітаўтаса Ландсбэргіса, я ўбачыў мяшкі зь пяском, зь якіх Літва рабіла барыкады, адгароджваючыся ад — цяпер у гэтым ужо ніхто не сумняецца — чужога акупанта.

Савецкасьць — гэта ўсё-такі ня тое самае, што расейскі элемэнт у Вільні, які мае старажытныя карані й паходзіць з шляхетнага матэрыялу. Мяне заўсёды прыцягвала навакольле Вострае Брамы, якога мы — палякі й літоўцы — неяк ня здольныя засвоіць, мяне цікавіла старая царква, у сутарэньнях якой дыхае старадаўні подых праваслаўя. Паміж базыльянскім кляштарам, царквою й Востраю Брамай знаходзіцца адзін з найважнейшых чакрамаў* Вільні, моц якога вынікае з сутыку Ўсходу й Захаду, Бізантыі й Рыму. Моц гэтая аслабела, калі ў горадзе зьявіўся Навасільцаў, калі загадам цара альбо першага сакратара СССР адна за другой пачаліся высылкі ў Сібір. Стварыўся магнэтычны антыполюс, што адпіхваў ад нас Усход зь імем Расея. Тым ня менш адной з радасьцяў кожнага падарожжа ў Вільню было набыцьцё расейскіх кніжак, купіць якія ў Польшчы пасьля зьнікненьня расейскіх кнігарняў ужо даўно стала немагчыма.
Цяпер мы ідзём з Вайдатасам Даўнісам праспэктам Гедыміна ўніз, да катэдры. Ён мне тлумачыць, адкуль імя гэтага гораду, чыім патронам ёсьць сьвяты Хрыстафор. Ён вечна ідзе зь берагу на бераг, з гэтым вялікім дарам ён заўсёды паміж. “Бо слова робіцца імем, калі бераг кліча бераг. Калі чалавек кліча чалавека. Калі народ кліча народ”. Іншыя чакрамы Вільні —

гэтаксама сутыкі. Мы стаім ля сутокаў трох рэкаў, паміж гарою Гедыміна й катэдраю. Асьвячэньне сьцяга прэзыдэнта Літоўскае Рэспублікі ў 1993 годзе адбылося спачатку на гары Гедыміна, дзе чальцы “Ромувы” спраўлялі абрады згодна з паганскім рытуалам, а пасьля ўсе пайшлі ў віленскую архікатэдру на сьвятую імшу й каталіцкае асьвячэньне сьцяга. Праз два гады літоўскі Сойм перавагаю літаральна ў пару галасоў скасаваў закон, што прызнаваў за паганствам статус традыцыйнае рэлігіі.
З пэрспэктывы 90-х гадоў пытаньне пра духоўнасьць Вільні ня ёсьць лёгкім. Што важна ў гамане гістарычных пераменаў і інфармацыйнае рэвалюцыі? Дагэтуль трывае ціхая спрэчка зь беларусамі пра спадчыну Вялікага Княства Літоўскага. Галасьнейшаю была спрэчка пра польскі ўнівэрсытэт. Нягледзячы на яе, Альгіс Каледа настойліва будуе з нуля катэдру польскае філялёгіі пры Віленскім унівэрсытэце. Караімы робяць кар’еры ў дыпляматыі. Тутэйшы тэатар робіцца адным з найлепшых у сьвеце. Ажываюць духі стваральніка “Флюксусу” Мацкюнаса* і Віленскага Гаона. Не сьціхае памяць пра Галакост. Раскрываюцца чарговыя невядомыя старонкі найноўшае гісторыі — гераічная партызанка й карысьлівая калябарацыя. Пранасу Моркусу дагэтуль не ўдаецца паставіць помнік літоўскім ахвярам Арміі Краёвай у Дубінках і польскім ахвярам літоўскіх паліцаяў у Глінцішках: няма згоды мясцовых жыхароў. Чэслаў Мілаш і Томас Вэнцлава працягваюць дыялёг. У Доме “Адкрытай Літвы” цягнуцца дыспуты пра Цэнтральную Эўропу…

“Кажуць, што сучасная цывілізацыя стварае ўніфармісцкую нуду й зьнішчае індывідуальнасьць. Калі так, дык на гэтую яе загану я ня меў нагоды паскардзіцца”, — пісаў у “Роднай Эўропе” Мілаш, згадваючы Вільню. У гэтым выпадку мінулае дазваляе нам наноў расшыфраваць гарадзкую сучаснасьць. Шукаючы адказу на пытаньне пра духоўнасьць Вільні, можна было б пайсьці сьцяжынаю мінулага, занурыцца ў лябірынт нязвыклае архітэктуры, выкарыстаць пісьмовыя сьведчаньні, у прыватнасьці шэдэўры літаратуры, паспрабаваць абудзіць духі вялікіх постацяў, што сьпяць ува ўнівэрсытэце… Усё гэта, безумоўна, накладаецца на атмасфэру стольнага гораду Літвы. Аднак сапраўдная духоўнасьць, калі яна яшчэ жывая, павінна

выявіцца на сутыку з сучаснай рэчаіснасьцю, з аўтэнтычным асяродзьдзем людзей, якія яе атрымалі ў спадчыну, і з усім кантэкстам, у які яна беспасярэдне занураная. Інакш яна робіцца музэйным помнікам, шкатулкаю зь мінулага, у якой сядзяць настальгікі.

Таму — хоць мы хадзілі па Вільні з Чэславам Мілашам, хоць прывялі мяне ў гэты горад яго кнігі, а таксама ягоны дыялёг з Томасам Вэнцлавам — ня толькі адзін Чэслаў Мілаш адкрыў мне духоўнасьць Вільні. І ня толькі старыя клясыкі. Разам зь імі зрабілі гэта мае раўналеткі, што пераехалі ў горад Гедыміна зь літоўскае правінцыі, каб наноў вывучыць гэты горад, прачытаць і вымавіць ягонае імя. Адным зь іх быў трагічна загінулы Вайдатас Даўніс. Апавесьці пра яго — гэта трапіць у сфэру мітаў, сьмелае думкі, якая — нават самотная, утапічная й зьняважаная рэалістамі — у канчатковым выніку вызначае духоўнасьць свайго часу, выціскаючы на ім сваю густую пляму. Як казала бабуля Грыгора Кановіча, імя якога назаўсёды застанецца ў памяці віленчукоў, любы цукар саладзейшы ў думках, чымся ў вуснах: у вуснах ён растае, у думках — ніколі.

“Ты ж ня проста так вяртаешся ў гэты горад, ты вяртаешся, каб падняbеньне яшчэ раз пачула дрыжаньне складу”. Даўніс вяртаўся ўвесь у напружанай увазе, усьведамляючы, чаго ён хоча. Ён быў адным з тых амаль 70% жыхароў сучаснае Вільні, што не нарадзіліся ў літоўскай сталіцы. Большасьць зь іх пераехала сюды зь вёскі. Сымбалічны зачын гэтаму зыходу зь вёскі даў на пачатку XIX стагодзьдзя літоўскі гісторык Шымонас Даўкантас, які *per pedes apostolorum* пераехаў у Вільню.

Цяпер гэтыя людзі ствараюць спэцыфічную групу, якую Леанідас Донскіс назваў “яшчэ-не-гараджанамі-ўжо-не-сялянамі”. Яна стварыла характэрны клімат гораду, прыфарбаванага вёскаю. “За пяць хвілінаў хады на пехату ад Вострае Брамы людзі жывуць як у вёсцы: урабляюць гародчыкі, дзяржаць куры, росьцяць пладовыя дрэвы… Некалькі сотняў мэтраў ад будынку Парлямэнту, на другім баку Вяльлі, сярод брэжнеўскіх блёчных будынкаў хаваюцца драўляныя дамы… аточаныя пунямі, хляўкамі й паветкамі”, — пісала Катажына Кажанеўская. Гэты стан падвешанасьці паміж вёскаю й горадам быў балючы й цягнуў за сабою драматычныя наступствы. Пра

гэта згадваў філёзаф А. Шлёгерыс: “Усе мы прыйшлі зь вёскі ў горад, цэлае пакаленьне літоўскіх інтэлігентаў і неінтэлігентаў… І ўсе добра ведаем, які цяжкі быў гэты пераход. Шмат людзей вялікага духу пражыло яго як вялікую (можа, найбольшую) унутраную нацыянальную трагедыю. Шмат хто заплаціў за яго найбольшую цану: горкімі бяссоннымі начамі, бязьмежным жалем, тугой, скептыцызмам, іроніяй, безнадзейнасьцю, уцёкам у дурманны напой Цырцэі, псыхіятрычнымі лякарнямі, разьбітымі сем’ямі й шмат яшчэ”. Але гэты шлях, шлях пераходу, гэты нацыянальны зыход літоўцаў зь вёскі ў горад, ня быў шляхам Вайдатаса Даўніса. Ён вяртаўся ў Вільню. Вяртаўся ў “горад бязь імені”, каб знайсьці гэтае імя й прамовіць наноў. Вяртаўся ў горад, якога магло ня быць, у якім адбыўся апакаліпсыс. Колькі ж разоў Вільні, той сапраўднай духоўнай Вільні, давялося ўжо зьнікнуць з паверхні зямлі? Хаця б у XVIII стагодзьдзі, калі пачалася другая швэдзкая вайна, пасьля — набег маскоўцаў і жудасныя пажары. Юзаф І. Крашэўскі тады пісаў: “Мы дарма шукаем вачыма формаў, якія б перанесьлі нас у мінулае. Правячы, няўмелая рука наклеіла на дахах узоры і аздобы, якімі забіла характар будынкаў. Пасьля панаставілі шмат прыгожых дамоў, але ранейшая, ягелонская Вільня, аскепкі якое яшчэ былі перад апошнім пажарам, зьнікла назаўсёды”. Хаця горад кожны раз паўставаў, як Фэнікс з попелу, здавалася, што прадказаны віленскімі катастрафістамі апакаліпсыс Другой сусьветнай вайны канчаткова зьнішчыць ягоны дух. Сьведчаньне гэтаму даваў сам Мілаш:

Я расьцёр у пальцах цагляны пыл. Вось
што засталося
Ад вялікай любові да родных мясьцінаў…
Прэч. Усе прэч...
…ня буду вяртацца назад і аднаўляць…
Апусьцелыя катэдры хай наведвае кот,
Пабліскваючы зрэнкамі на алтарах.
“Разьвітаньне”

Пра паваенную Вільню Томас Вэнцлава ў дыялёгу зь Мілашам пісаў як пра зусім іншы горад: “Мы ведаем неаднолькавыя Вільні; нават можна сказаць, што гэта два зусім розныя гарады.

(…) Усё новае. Канечне, засталося неба, Вяльля (што называецца Нярыс), нават пясчаныя мелі ў месцы, дзе ў Вяльлю ўпадае Вялейка ці Вільнэле; засталіся некаторыя дрэвы — шмат дрэваў; але што яшчэ? Безумоўна, засталася архітэктура”.

Даўніс вярнуўся ў горад з “каменю, што валодае сэрцам”. Разам з прыяцелямі ён будаваў тут Regnum, або Каралеўства. Арвідас Юзайтыс пісаў у часопісе зь менавіта такою назваю: “Цяпер, калі мы ўжо ўрасьлі сюды каранямі, мы баронім Вільню, як бароняць гонар — з унутранага боку муроў”. Таксама яны добра памяталі фразу Альгірдаса Грэймаса пра Вільню, у якой муры й вуліцы зьмяняюць людзей, а ня людзі дапасоўваюць да сябе муры й вуліцы. Яны хутка вучыліся гэтаму гораду, вырасталі, абярняся зьяўляліся ўсё новыя і новыя часопісы, таварыствы, выдавецтвы… Яны быццам бы баяліся, што ня здолеюць дастаткова моцна вымавіць імя свайго гораду. “Ня ўся Літва прасяклася духам нашае сталіцы, — пісаў Юзайтыс. — Часам здаецца, што ўзьдзеяньне Вільні малее, што Віленская Літва ніколі ня стане вялікаю”.
Для Мілаша й Вэнцлавы, як, здаецца, і для Міцкевіча, Вільня была этапам вандроўкі з правінцыі ў вялікі сьвет. Таму адсюль хацелася даць лататы. “Я шчасьлівы, — пісаў Вэнцлава, — чуць званы Вэнэцыі й ведаць, што празь пяць хвілінаў магу ўбачыць Сан Джорджа Маджорэ — можа, найпрыгажэйшы ў сьвеце фасад. Я не хацеў бы вярнуцца ў цяперашнюю Вільню, я б ня мог там вытрываць”. У памянёным дыялёгу пра Вільню Мілаш акрэсьліў гэтае пачуцьцё шчэ трапней: “Правінцыйнасьць Вільні. Яна мяне вельмі прыгнятала, і я прагнуў вырвацца ў сьвет. (…) Прымусовы ад’езд у Варшаву я ўспрыняў з палёгкаю. Бо Вільня была глухменьню…”
Для Даўніса ды яго прыяцеляў Вільня была “вызваленьнем ад вузкага патрыятызму й правінцыяналізму”. Яна была іх лёсам і акном у сьвет. Гэта ўжо не этап на лінейным жыцьцёвым шляху, гэта акружная дарога лёсу, якой вяртаешся ў Каралеўства. Прычым гэтае Каралеўства існуе тут і цяпер, адроджанае ў канкрэтнай рэчаіснасьці постсавецкай Вільні. Каралеўства ёсьць пытаньнем жыцьцёвай практыкі. І гэтым яно сур’ёзна адрозьніваецца ад вяртаньня, што адбылося ў творчасьці Міцкевіча ці Мілаша, ідэальнага вяртаньня празь літаратуру ў краіну маленства.

Каб вымавіць імя свайго гораду, трэба расьпячатаць памяць. “Я кажу — значыць, памятаю. (…) Памятаем — значыць, мы ёсьць”, — пісаў Даўніс-паэт і Даўніс — грамадзянін Каралеўства. Як далёка сягала іх памяць? Да якой традыцыі яны зьвярталіся?

Для Мілаша памяць пра Вільню ішла ад часоў рамантызму й велічы ўнівэрсытэту. “У нашым унівэрсытэце пераемнасьць адчувалася больш, чым у іншых польскіх унівэрсытэтах за выняткам Ягелонскага. Бо пэрыяд ягонага закрыцьця пасьля паўстаньня 1831 году неяк скарачаўся, зьнікаў, і ўсюдых лунала аўра філяматаў. Гадавацца ў Вільні значыла належаць толькі ў пэўнай ступені да XX стагодзьдзя, галоўным чынам пасярэдніцтвам кіно. Часам цяпер у маёй галаве блытаецца “Акадэмічны Клюб Валацугаў”, а менавіта “Клюб Старэйшых Валацугаў”, з “Таварыствам Нягоднікаў”*, у якое ўваходзілі выкладчыкі маладога Міцкевіча”.

Для Вэнцлавы, паколькі падчас яго жыцьця ў Вільні на міжваенную пару было накладзена табу, бліжэйшаю традыцыяй быў горад Міцкевіча й Даўкантаса. Падчас навучаньня ён зь сябрамі на ўзор “нягоднікаў” нават заснаваў гурток, “што было рызыкоўна, калі згадаць пра ўсёведны КГБ…”

Вільня сучасных грамадзянаў Каралеўства ўжо ня ёсьць Вільняю Міцкевіча ці нават Мілаша. Шмат у чым дзякуючы кніжкам гэтых творцаў яны накіроўваюцца значна глыбей у слаі часу. Вяртаньне Даўніса значна даўжэйшае, чымся дарога, якая аддзяляе вёску ад гораду, ці дыстанцыя, якая аддзяляе сталіцу Літоўскае рэспублікі ад гораду філяматаў ці гораду ўдзельнікаў “Жагараў”**. Гэта вяртаньне літоўца, які вядзе свой шлях ад тых часоў, калі даліна Вялейкі называлася шчэ далінаю Сьвентарога. Яго вяртаньне ў Вільню — гэта від інкубацыі, падарожжа да сакральнага цэнтру. Адбываецца яно дзякуючы абраду засынаньня на магілах продкаў, вынікам чаго бываюць сьненьні-відзежы. Гінтарас Берасьнявічус, чарговы жыхар Каралеўства й вядомы этноляг, згадвае, што менавіта такі характар мела падарожжа Гедыміна на месца сутокаў трох рэкаў: сон на магілах бацькоў і відзежа жалезнага ваўка, якую галоўны жрэц Лізьдзейка расшыфраваў як знак на ўзьвядзеньне стольнага гораду. Важна, што ўжо ў першапачатку Вільні было зьліцьцё двух полюсаў. “Два гарады ў гэтым горадзе

аб’яднаныя міжсобку, як спалучаныя судзіны. (…) Нарута стаяла на гары, там, дзе сьвятло сьвету краналася каралеўскае кароны. І хаця ня можа зьнікнуць горад, распасьцёрты на гары, — гэты горад прапаў, згінуў. Вільня выросла з даліны, зь ценю (…). І хаця ня можа сасьпець горад, які пасеяны быў у цені, — гэты горад рушыў угору й вытрываў” (Даўніс).

Гэты дуалізм філёзаф Шлёгерыс пераносіць на апазыцыю двух найважнейшых гарадоў Літвы — Вільні й Коўны: “Коўна ёсьць “часовай” (то бок зямной, перахаджалай) сталіцай, горадам дзялкоў, зямной восьсю, гэта нашыя сапраўдныя Атэны, з культам нашага паганскага ідэалу — Вітаўта Вялікага і ўнівэрсытэтам ягонага імя. Вільня ёсьць “вечнаю” сталіцаю, горадам разбэшчаных жрацоў — інтэлігентаў, нябеснай восьсю, гэта наш Вечны Ерусалім, з Маці Божай Вастрабрамскай (яна адначасова і Барбара Радзівілянка) і зь езуіцкім унівэрсытэтам, заснаваным палякамі”.

Такою таксама ёсьць Вільня маладых літоўцаў, што вяртаюцца да Каралеўства. Расшыфроўваючы ягонае імя, выкарыстоўваючы традыцыю сынкрэтызму (“першаснаю ёсьць разнастайнасьць, дзякуючы якой Вільня раскрываецца сьвету. Габрэі, караімы й татары, а таксама немцы — ня кажучы ўжо пра літоўцаў і славянаў — утваралі сапраўдную аснову існаваньня Вільні, дынамікі яго разьвіцьця й багацьця… Этнічная разнароднасьць зрабілася ня толькі пажаданым, але й абароненым законам ладам жыцьця, што стварыў традыцыю культурнай і рэлігійнай талерантнасьці”), а таксама ўнівэрсалізму (“Гэта жыцьцё, што перасягае межы этнічных, культурных і рэлігійных супольнасьцяў… Унівэрсальны чалавек вырастае не ў культурна маналітным асяродзьдзі, а ў сынкрэтычным зьліцьці культураў”, — пісаў Юзайтыс). Жадаючы вымавіць імя гэтага гораду, Вайдатас Даўніс “чуе шапаценьне ўсялякіх словаў. Але адначасова намацвае тое адно-адзінае. Тут ёсьць і літовец, і грэк, і габрэй, і паляк, і прус, і караім, і татарын. Але адначасова тут няма ні грэка, ні юдэя… Толькі адзінае слова, якое, калі яго вымавіць, робіцца імем”.

Вымаўляецца імя гораду, выбудоўваецца Каралеўства, музэй атэізму ператвараецца ў храм; горад, які перажыў апакаліпсыс, застаецца нязьменным, ягелонскім, як хацеў Крашэўскі; прынцыпам застаецца зьліцьцё розных элемэнтаў; сьвяты

Хрыстафор вечна сягае ад берагу да берагу, паэт з заплюшчанымі вачыма знаходзіць вуліцы й завулкі, хаця гэта зусім іншы горад, ня той, які ён ведаў; літовец кружным шляхам вяртаецца ад сутокаў трох рэкаў, відзежа гораду прыходзіць у сон таго, хто сьпіць на магіле бацькоў, духоўнасьць жыве сілаю дзеяньня й памяці.

*Пераклала з польскай Марына Шода*

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/12/14**
[image]

# Вільня. Анталёгія беларускай паэзіі XX ст.

**В**ільня ў беларускай паэзіі — непараўнальная. Няма іншага такога ўласнага імя, чый вобраз злучаў бы найлепшыя вершы ў прадстаўнічую і дастатковую анталёгію нацыянальнае паэзіі. Вільню ў гэтым сэнсе можна параўнаць хіба што з абсалютнымі вобразамі роднага слова, вёскі, маці або самой Беларусі. Прычына такое ўвагі да старое сталіцы адшукваецца ў народнай творчасьці, дзе Вільня часта губляе сваю прадметнасьць і выступае ў ролі места наогул, гэтаксама, прыкладам, як Дунай згадваецца ў нашых песьнях не як пэўная рака, а як рака наогул. “Рабі пільна, і тут будзе Вільня” — кажа беларуская прымаўка. А яшчэ: “Не адразу Вільня будавалася”, “Язык да Вільні давядзе”...

Такая Вільня досыць шырака адлюстраваная ў казках і ў песьнях (“Дачка-птушка”, “Маладая малодачка зь Вільні ішла”, “Ой, у Вільні, Вільні”...), але злучыць іх — задача іншае анталёгіі. Асобнае анталёгіі вартыя і сярэднявечныя хваласьпевы Вільні на лаціне (Мацей Казімер Сарбеўскі, Марцін Флашчыцкі, Язапат Хяльмоўскі...), спэцыфіка якіх — ува ўсхваленьні тагачасных уладцаў, дзе сама Вільня выступае ўдзячным тлом для магнацкіх гімнаў.

Прадметныя рысы вобраз гораду зноў набывае ў вершах паэтаў

XIX ст. (у польскамоўных творах Яна Чачота і Ўладзіслава Сыракомлі, беларускамоўных — Арцёма Вярыгі-Дарэўскага, Рэніера Мамэрта, Адама Гурыновіча, Францішка Багушэвіча). Але толькі ў XX ст. Вільню пачалі апяваць не як горад наогул і не як проста горад, а з усьведамленьнем яе месца і ролі ў гісторыі і культуры Беларусі.

Цяперашняя Анталёгія складзеная паводле храналягічнага прынцыпу і з улікам таго, што храналёгія паэзіі заўсёды крыху ссунутая наперад адносна астранамічнага часу. Інакш кажучы, паэтычнае стагодзьдзе пачынаецца крыху пазьней і сканчаецца крыху пазьней, бо паэзія — эстэтычная рэфлексія, і час, зь якога яна рэфлексуе, павінен пачацца і ўжо ісьці, і яшчэ ісьці, і скончыцца заўсёды раней за рэфлексію. Мэта храналёгіі — адлюстраваць зьменлівасьць гораду ў часе праз эстэтычны водгук і такім чынам убачыць гісторыю Вільні, якой яна была на працягу стагодзьдзя, — праз паэзію, і ўбачыць паэзію — праз гісторыю старой сталіцы.

На працягу XX ст. у Вільні дзясятак разоў зьмянялася ўлада (расейская царская і расейская савецкая, польская, нямецкая першай і другой сусьветных войнаў, беларуская савецкая — некалькі тыдняў у 1939-м, літоўская “буржуазная”, савецкая і незалежная...), зьмяняліся мова, назвы вуліц і насельнікі (падчас галакосту з гораду зьнікла асноўнае насельніцтва цэнтральных вуліц — жыды, фактычна іх месца занялі літоўцы, іншыя “неславяне” ў славянскім атачэньні), але нязьменнай засталася сама Вільня — яе ляндшафт і галоўныя помнікі архітэктуры — носьбіты спракаветнага духу.

Апроч храналягічнага, існуе і ўнутраны, ня вылучаны мною, але заўважны падзел. Усе творы могуць быць разьмешчаныя паводле ўмоўнага пункту гледжаньня:

— Жывучы ў Вільні... Гэта — “акварэлісты”, якія ўзнаўляюць адмысловы віленскі настрой: Максім Багдановіч, Натальля Арсеньнева, Уладзімер Жылка, Максім Танк, Алег Мінкін...

— Наяжджаючы ў Вільню... Гэта — “эпікі”, падарожнікі, што апісваюць горад і свой маршрут у ім: Якуб Колас, Міхась Машара, Пімен Панчанка, Максім Танк...

— Згадваючы Вільню... Гэта — “тэматысты”, якія мэтава пішуць уласна “вершы пра Вільню”, яе ролю, значэньне, яе помнікі. Такіх аўтараў большасьць сярод паэтаў эміграцыі і нашых сучасьнікаў.

Апроч вершаў, у гэтую Анталёгію ўключаныя і два непаэтычныя тэксты, якія прысьвечаныя аналізу тэмы Вільні ў беларускім кантэксьце ды Вільні ў беларускай паэзіі (артыкулы Антона Луцкевіча) і ўжо сталі літаратурнымі помнікамі. Найважнейшае ў гэтай публікацыі — прынцып адбору і разьмяшчэньня вершаў. Няма сумневу, што ў новых выданьнях Анталёгія можа быць істотна дапоўненая, а таксама дарэчна праілюстраваная творамі беларускіх мастакоў ды фатографаў.

1909. Цётка
З чужыны

І душна, і цесна, і сэрца самлела
Мне тут на чужыне, здалёк ад сваіх...
Як птушка на скрыдлах, ляцець бы хацела,
Як хваля па моры, плыла бы да іх!

Ўзьнялася б, здаецца, расінкай на хмары,
А хмары бы ветрам сказала я гнаць
Далёка, далёка, дзе сьняцца мне чары,
Дзе боры густыя над Нёмнам шумяць;

Дзе пацеркай белай Вяльля прабягае,
Дзе Вільня між гораў гняздо сабе ўе,
Дзе кожна дарога і крыж мяне знае,
Дзе ўсё, усё чыста вярнуцца заве!

Там я нарадзілась і вырасла ўволю,
Там першыя словы вучылась казаць.
За тое сягоньня ляцела б стралою
Там зь імі, з усімі Год Новы спаткаць!

Ой мілыя, мілыя, сьнегам пакрыты
Загоны, лясочкі, дарожкі мае!
Эх, як вы у сэрцы маім не забыты,
Як часта абраз ваш у думцы ўстае!

А вы, бледны твары, панураны ў працы,
І ты, друг мой, смутак зь іх сьлёзных вачэй,

Прыміце сягоньня прывет мой гарачы,
Каб жыць нам было ў гэтым годзе лягчэй!
*Кракаў, 1 студзеня*
**Цётка**, Алаіза Пашкевіч (1876—1916). Скончыла віленскую 7-клясную вучэльню Веры Прозаравай (1901), пра што ў “Маіх успамінах” піша Юліяна Вітан-Дубейкаўская. У 1904 працавала ў Нова-Вілейскай псыхіятрычнай лякарні, арганізоўвала рабочыя гурткі, пісала і распаўсюджвала праклямацыі (сёньня ёсьць вуліца яе імя ў Новай Вільні). Эмігравáўшы, прыяжджала ў Вільню, дзе ўдзельнічала ў выданьні “Нашай Долі”, пра што ёсьць успаміны Аляксандра Ўласава і Якуба Коласа. У 1911 выйшла замуж за літоўскага сацыял-дэмакрата Сьцяпана Кайрыса, які таксама пакінуў пра яе ўспаміны. У 1914 была сястрой міласэрнасьці ў салдацкім тыфозным бараку ў Вільні. У лісьце да Браніслава Тарашкевіча (1916) хворая на сухоты Цётка паведаміла свой апошні віленскі адрас: “Вільня, Зьвярынец, Сасновая, 11”.
Верш “З чужыны” напісаны ў часе навучаньня на філязофскім факультэце Ягелёнскага ўнівэрсытэту ў Кракаве. Упершыню надрукаваны ў “Нашай Ніве” 9 студзеня 1909 г. (№ 2), подпіс: Ц-тка. Друкуецца з нашаніўскае публікацыі і з кн.: Цётка. Творы. — Менск, 1976. С. 89. У апошнім выданьні (Цётка. Выбраныя творы. — Менск: Беларускі кнігазбор, 2001) у камэнтарах дапушчаныя памылкі — няслушна названы нумар “Нашай Нівы” зь першай публікацыяй і псэўданім аўтаркі. Першы верш Анталёгіі сымбалічна набліжае нас да Вільні з вышыні птушынага палёту. Вобраз места тут удала перадае яго разьмяшчэньне паміж стромых узгоркаў. Зь якога боку ні трапляеш у горад, гэта заўсёды — доўгі, на два-тры кілямэтры спуск.

1909. Янка Купала
“Шуман”
(Зь віленскіх абразоў)

Ці то летам, ці зімою
Сып да “Шумана”, друг мой! —
Там расстанецца з нудою,
Хто з кішэняй непустой.
“Шуман” — Вільні кроў і косьць,

Быў і будзе, як і ёсьць.

Рэжа музыка ахвоча,
Песьні, гоман — заадно,
Страва, карты, хто што хоча,
Льлецца рэчкаю віно.
“Шуман” — Вільні кроў і косьць,
Быў і будзе, як і ёсьць.

Там сабой таргуюць дзеўкі.
Бацька, сын купляе іх;
Там хватаныя капейкі
Пераводзяцца уміг.
“Шуман” — Вільні кроў і косьць,
Быў і будзе, як і ёсьць.

Цешся, горад! Што там знача
Вёска з голадам, зь бядой?
Хтось там стогне, хтось там плача —
Плюй, махай на ўсё рукой!
“Шуман” — Вільні кроў і косьць,
Быў і будзе, як і ёсьць.

Хто ў казіны рог ня зьехаў,
Хто з сумленьнем — справу знай:
Гэй, да “Шумана” на ўцеху —
Ўтапіць долю, славу, край!
“Шуман” — Вільні кроў і косьць,
Быў і будзе, як і ёсьць.

**Янка Купала**, Ян Луцэвіч (1882—1942). Працаваў бібліятэкарам у віленскай бібліятэцы Барыса Даніловіча (з 1908), супрацоўнічаў зь Беларускім Выдавецкім Таварыствам і газэтай “Наша Ніва”, якую рэдагаваў у 1914—1915 гг. Зь Вільняй зьвязаная большая частка творчага даробку Купалы ў дасавецкі час.

Верш “Шуман” упершыню апублікаваны ў часопісе “Полымя” ў 1929 (№ 3). Гаворка ідзе пра рэстаран на вул. Віленскай, 32 (гл.: Справочная книжка о телефонном сообщении г. Вильны на 1910 год. — Вільня, 1910. С. 100). Чаму гэты саркастычны твор не зьявіўся ў свой час на старонках “Нашай Нівы”? Альбо паэт

быў наведнікам рэстарану і, яўна гіпэрбалізуючы пачуцьці, пісаў “для сябе”; альбо публікацыя такога вершу магла пашкодзіць сувязям тагачаснай беларускай грамады, што гуртавалася вакол “Нашай Нівы” і, верагодна, мела камэрцыйныя кантакты з “Шуманам” ці кімсьці блізкім да яго. Тут друкуецца з Поўнага збору твораў (Т. 2. С. 99).
Янка Купала — бадай, адзіны ў гэтай Анталёгіі аўтар, які пісаў пра Вільню саркастычна, легкаважна, часам зьдзеклівa і па-ёрніцку. Прычым ня толькі пра рэстараны, у якіх, паводле ўспамінаў Паўліны Мядзёлкі, быў заўсёднікам, але і пра сам горад ды ягоныя помнікі і прыкметнасьці, пра што, у прыватнасьці, сьведчыць наступны прыклад.

1910. Янка Купала
Замкавая гара
(Зь віленскіх абразоў)

Над Вяльлёй-ракой,
Па гары крутой
Туман сьцелецца;
Ні то лом-ламок,
Ні то дом-дамок
Там віднеецца.

Слаўны Гедымін,
Князь Літвы — літвін,
Душа чынная,
Многа лет таму
Ў гэтым жыў даму,
Жыў з дружынаю.

Горда мур глядзеў
На зямлю, як леў,
Сьцяной крэпкаю;
Не адной бітвы
Тут сыны Літвы
Былі сьведкаю.

Сышоў век, другі,
І князі, багі,

Ўсё літоўскія,
Уцяклі зь зямлі,
І дзянькі пайшлі
Не такоўскія.

Як катух ля кур,
Дрэмле пусткай мур,
Цэгла валіцца;
Нават гнёзды віць
Птушка не ляціць, —
Знаць, пужаецца.

Адно йдуць сюды
З гарадзкой нуды
Адказеліцца
Бедната і “знаць” —
Віды аглядаць,
Што ў ног сьцелюцца.

Ды як згасьне дзень,
Ночкі ляжа цень
Над дамочкамі,
Людзкіх шэптаў тут
Повен кожны кут
Пад кусточкамі.

А сівою мглой
Па гары крутой
Туман сьцелецца;
Ні то лом-ламок,
Ні то дом-дамок
Там віднеецца.
Заўважу, што менавіта на вяршыні Замкавай гары, апроч руінаў Гедымінавага замку, знаходзіцца братняя магіла паўстанцаў 1863 году, у тым ліку і Кастуся Каліноўскага. Верагодна, Купала нічога ня ведаў пра гэта, бо ў 1910, за расейскаю ўладай, там усё яшчэ стаяў вайсковы гарнізон, на тэрыторыі якога і былі таемна пахаваныя паўстанцы. У міжваенны час, за польскай уладай, на магіле быў усталяваны крыж працы архітэктара Антона Вівульскага. Аднак гэты помнік зьнік у часе

мінулае вайны і пасьля не аднаўляўся. Сёньня магіла каля замкавых муроў зноў ніяк не пазначаная.
*Друкуецца паводле Поўнага збору твораў (Т. 2. С. 199).*
Апісваючы Замкавую гару, нічога ня ведаў пра магілу паўстанцаў і Якуб Колас.

1911. Якуб Колас
Новая зямля

XXVIII. Дзядзька ў Вільні
.....
Машына стала. Валіць валам
Люд у тунэлі пад вакзалам,
А зь ім і дзядзька цісьне збоку,
Ад шэрых сьвіт непадалёку.
.....
Дзівіўся дзядзька тут нямала,
Йдучы тунэлем да вакзалу.
Як хітра, мудра збудавана!
Як чыста, хораша прыбрана!
А колькі вулачак і ходаў,
Палітураваных усходаў!
Там, угары, над галавою,
Ідуць вагоны чарадою!..
О, хітры сьвет, на штукі здаўся!
Тунэль тым часам разьдзяляўся,
І вал сярмяжнага народу
Ідзе да правага праходу.
Паны налева важна садзяць,
Дзе іх сярмяжнікі ня здрадзяць
Ні пахам дзёгцю, ні карчагі,
Ні відам латанай сярмягі.
Як выйшаў дзядзька наш з вакзалу,
Яму аж моташна нейк стала:
Такое пекла — шум страшэнны,
Застой паветра і дух дрэнны;
Народ таўчэцца каля конкі,
Па бруку б'юць падковы звонка,
Грымяць павозкі, буды, колы,
Аж проста глушаць балаголы —

І гэта процьма ўсякіх зыкаў
Зьлілася ў гул адзін вялікі,
Дзе зь непрывычкі вуху цяжка,
Дзе б'юць па сэрцы яны важка.
Снуе народ, як на пажары,
Пад ім аж гнуцца тратуары.
Эй, божы люд! Якая сіла
Цябе віхрамі закруціла?
.....
Няма ў тваіх вачах прывету,
Як бы ня рады сонцу, сьвету,
Ідзе народ, як хвалі мора,
Як хмары ў небе на прасторы,
Адны другім усе чужыя.
Ідуць старыя і малыя,
Ідуць, шнуруюць чарадою,
Заняты кожны сам сабою.
І дзядзька з гэтым людам зьліўся,
Як зерне ў зернях, загубіўся.
Быў дзядзька ў пушчах, у барох
І расчытаць іх голас мог,
І з старасьвецкімі дубамі
Каротка знаўся, як зь сябрамі.
А тут — адзін, бо ўсе чужыя,
Ня знаеш, хто яны такія,
І сам для іх ты чужаніца.
На камяніцы камяніца,
Ня згледзіш неба край за імі,
І ціснуць сьценамі сваімі.
Ідзе так дзядзька і па бруку
Адзін за дзесяць робіць груку.
А дзе ж той банк? — карціць пытаньне,
Так правандруеш да зьмярканьня,
А сам туды не пападзеш
І толькі дзень дарма зьвядзеш.
.....
Тут дзядзька кроку падбаўляе
І пана з цэшкай наганяе;
Ступіў яшчэ ён колькі крокаў,
Да пана коціцца ён бокам;

А пан ня бачыць ці ня хоча
Глядзець, як дзядзька наш клапоча
І ў ім патрэбу дужа мае,
Ідзе і палачкай махае.
Тут дзядзька трошачкі прыгнуўся,
Рукою пана дакрануўся:
— Скажы, паночку, як далёка
Зямельны банк? — Пан кінуў вока
На дзядзьку скрыва так і строга:
— Спытай аб тым гарадавога! —
Сказаў і кроку пан прыбавіў,
Як бы пытаньнем абясславіў
Яго наш дзядзька прад панамі,
Прад тымі вось капелюшамі.
“Ото завіў, настроіў лыжы,
Як бы чарцяка той ад крыжа”, —
Антось сабе сам усьміхнуўся
І на ўсе бокі азірнуўся,
Як бы хацеў сказаць: “Глядзеце,
Якая цаца зьзяе ў сьмецьці!”
Памалу стаў ён разглядацца.
Э, што! няма чаго баяцца!
Ідзе вальней, глядзіць сьмялей.
На сэрцы стала весялей,
І трохі карк ён падымае,
На крамах вывескі чытае —
Нядарма ж дзядзька быў у школе,
Навуку ведаў ён даволі.
Ды перабраў тут дзядзька меру:
На слуп узьбіўся, на халеру,
Ды так аб падлу штурхануўся,
Што сьвет яму перавярнуўся,
На брук зьляцеў ён з тратуару,
Перакруціўся разоў пару
І так у брук бядак загасіў,
Траха манеркі не расквасіў.
Ды дзядзька борзьдзенька схваціўся,
Зьнячэўку ён ашаламіўся,
Як той шчупак, папаўшы ў нерат.
Ня знае ён, дзе зад, дзе перад.

— Бадай цябе агні спалілі!
На які чорт слупоў набілі? —
Гаворыць дзядзька сам з сабою,
Пыл абіваючы рукою.
І тут ён толькі азірнуўся,
Глядзіць — у кут глухі упхнуўся,
Сьцяна прад ім і сьцены збоку,
Ўпярод ня ступіш ані кроку —
Прапала вуліца, ды годзе!
Таўчэцца дзядзька, як у бродзе
Той сом, прыціснуты плытамі,
Што ў бухце век жыў пад карчамі.
“Бадай ты спрахла! дзе ж дарога?
Нагвалт крычы гарадавога!
Куды нялёгкая загнала!”
Аж проста дзядзьку страшна стала
І зь перавулачка глухога
Ідзе шукаць гарадавога,
Ідзе і горад праклінае;
Падшыбла злосьць яго такая,
Што каб прымеў бы, ўзяў саломы
Ды падпаліў бы ўсе харомы,
Бо ўсе дарогі загрузілі
І сьвет яму тут зачынілі.
Мінут праз колькі зь перавулку
На сьвет ён выбіўся, дзе гулка
Нясьліся зноў страшэнна зыкі,
Дзе горад гуў многаязыкі.
Цяпер наш дзядзька не чытае,
А больш пад ногі паглядае
Ды кіне вока, ці ня блісьне
Жаданы шнур, ды далей цісьне.
Шукае дзядзька наш, як Бога,
Ў людзкой галдзе гарадавога.
А вось і ён! стаіць плячысты
І погляд кідае празрысты;
Стаіць, як той пастух над статкам,
І наглядае за парадкам —
На тое ж горад і губэрня.
Тут з тратуару дзядзька верне,

Ідзе, за брыль здалёк бярэцца,
“Дзень добры” кажа, як вядзецца,
Яшчэ крок бліжай падступае,
Аладку-шапку падымае.
— Скажыце, як мне ў банк папасьці?
Мне па зямельнай трэба часьці.
— А вось як пойдзеш, чалавеча,
Таму касьцёлу насустрэчу,
Там будзе вуліца направа, —
Пачаў казаць служака бравы, —
Ты правай вуліцы трымайся,
А там другога запытайся,
І скора банк той будзе блізка.
Скланіўся дзядзька яму нізка,
Бо надта ж добрым паказаўся,
І так ён дзядзьку спадабаўся,
Што калі будзе ўсё шчасьліва,
То вып’е зь ім хоць пару піва
І зьесьць зь ім разам кусок сала;
І весялей зноў дзядзьку стала.
Зрабіўшы два-тры павароты,
Людзей спытаўшы раз мо ў соты,
Спыніўся дзядзька каля банку,
Дзе ўсходы чыстыя, як шклянка,
Шырокі крок яго стрымалі
І ў душу страх яму нагналі.
Стаіць наш дзядзька ў задуменьні,
Ня сьмее ўзьняцца на ступені:
Баіцца ён мужычым ботам,
Прапахлым дзёгцем, здорам, потам,
Тут насьлядзіць або наплямiць,
Лепш іх ня знаць, няхай іх цяміць!
.....
Ды дзядзька страх перамагае,
Ён шапку загадзя зьнімае,
Па ўсходах чыстых, як мурашка,
Паўзе ўгару, ступае цяжка.
Забіты дух яго вякамі
Ўжо чуе страх перад панамі.
Ў прасторнай, чыстай, сьветлай залі

Паны туды-сюды снавалі,
Разьвязна, моцна гаманілі,
Цыгары доўгія курылі,
А дзе каторы шарганецца,
Каля яго прыслужнік трэцца
І падае яму адзеньне,
А сам — пакора і жычэньне;
А пан той руку ткне ў кішэню,
Яму “дзесёнтку” суне ў жменю;
Прыслужнік, ну, чуць не прысядзе,
Аж сьмех бярэ, на гэта глядзя.
Але й паны ня ўсе тут роўны:
Адны зь іх круглыя, як броўны,
Ідуць спаважна, ўперавалку;
Другія выпетрылі ў палку;
Адны трымаюць нос высока,
Другія ў дол спускаюць вока.
Апроч паноў, у гэтай залі
І мужыкі ў кутках стаялі,
І людзі простага больш званьня
Таўкліся ў банку ўжо ад раньня.
Між імі гоман ціха вісьне,
Туды і дзядзька Антось цісьне.
Прыйшоў, суседзяў зьмерыў вокам
І да сьцяны прыпёрся бокам.
— Сядай, мой мілы, мой харошы,
Бо за “пастой” ня плацяць грошы, —
Сказаў сярмяжнік дабрадушна.
На лаўку дзядзька сеў паслушна,
Ўздыхнуў, падзякаваў суседу,
Ўжо пажылому, чуць ня дзеду.
Пайшлі пытаць адзін другога,
Хто ён, адкуль, сяла якога,
Губэрні, воласьці, павету.
— Прыехаў я сюды з-за сьвету,
З-пад самых Стоўпцаў — чулі, можа?
— Не, не здаралася, нябожа.
— А самі скуль вы? — Я з-пад Ліды,
Зь сяла Вялікія Дзяміды
(Ён Грышкам Верасам назваўся);

Яшчэ са ўчора затрымаўся.
……
XXIX. На Замкавай гары

……
Сябры ўстаюць, ідуць спавагу
І на праспэкт нясуць сярмягу,
Дзе панства ўсякага багата
Ідзе і едзе, як у сьвята.
І скуль набраліся яны?
І ўсё важнецкія паны,
І так адзеты, так убраны,
Што той Ракоўскі надзіманы —
Няхай яго там возьме боль —
У параўнаньні зь імі — ноль —
Ну, проста так, звычайны Лыска:
І не стаяў каля іх блізка!
Зірнеш і ўнікнеш: прад табою
Мо князь з графіняю якою!
Так далікатна спацыруюць
І не гавораць, а варкуюць!
Або спаткаеш генэрала, —
Яго ўся Вільня, пэўна, знала:
У мэдалях уся грудзіна!
І што за погляд! што за міна!
Ну ж і паноў! ня дай ты Божа!
Антось стрымацца ледзьве можа —
Няхай ім дрэннае прысьніцца, —
Каб тым панам не пакланіцца.
Ды Верас зь дзядзькі тут сьмяяўся.
— Ты не ўважай, што ён убраўся,
Гальштук павесіў і манішку,
А каб разьдзець яго, брацішку,
То пэўна ходзіць без кашулі,
На ланцужку — кусок цыбулі.
Па віду пан і ходзіць панам,
А сьпіць напэўна пад парканам,
Таго й глядзіць, каб што ўварваць…
Такіх паноў — хоць гаці гаць!
Чым болей дзядзька разглядаўся,

Ён тым мацней тут захапляўся.
Які тут рух і беганіна!
Як зьзяюць вокны магазынаў!
І колькі тут дабра, багацьця!
А колькі сьлёз у ім, пракляцьця?
Якія брычкі і карэты!
А для каго ўся роскаш гэта?
.....
— Ото, брат, горад! от дамішчы,
Ото дзе сыпалі грашышчы!
Якія вежы і касьцёлы!
Як толькі іх трымаюць долы!..
Зірні, зірні: гара якая!
На ёй і будка цагляная...
Ото б адтуль зірнуць на горад! —
Забыўся дзядзька і пра голад
І падбівае сябра Грышку
Ўзысьці на тую гару-вышку.
Яна так пышна, так высока
І так ласкае тваё вока!
А гэты скат такі зялёны!
Там каштаны, там ліпы, клёны
Глядзяць здалёк адным кустом,
Адным вялізарным шатром.
Праспэкт, касьцёл сябры мінулі
І ў сквэр зялёны павярнулі.
Ў цяньку разьвесістых галінак
Дарожкі ўюцца між расьлінак,
Такія чыстыя, аж міла.
І люду мноства тут хадзіла,
Найболей моладзь гарадзкая
Ды худасочная, благая,
Ўсё панічы-зухі, паненкі,
А станік іх, бы ў восак, ценкі;
Ідуць, шнуруюць па дарожках,
А чаравічкі на іх ножках
Так і паскрыпваюць, сьпяваюць,
Нібы капыцікі мільгаюць;
Ідуць, спусьціўшы вачаняткі,
На погляд ціхі, як ягняткі.

А панічы снуюць стрыжамі,
Ў паненак цэляцца вачамі,
Так от і льнуць, як рой да грэчкі,
Як матылі на тыя сьвечкі.
На доўгіх лаўках пажылыя
Сядзяць паны, як бы сьвятыя,
Багата ўсе яны адзеты,
Чытаюць кнігі ды газэты.
Антось на ўсё глядзіць уважна,
І сам ідзе ён трохі важна,
Крыху асвойтаўся з панамі,
Ідзе, пагруквае нагамі.
Сябры тым часам сквэр мінулі,
Налева ўгору павярнулі;
Тут з будкі стораж іх спыняе:
— Куды йдзяце? — сяброў пытае.
— Куды ж? на гору, ёсьць вядома.
— А ці вам правіла знаёма,
Што безьбілетным ход запынен?
Хто йдзе на гору, той павінен
Білет купіць на права ўходу.
Сябры спынілісь — грошай шкода;
Ў чупрыны рукі запускаюць,
Аб гэтай справе разважаюць:
За што плаціць? пустая справа...
Але ж ізноў — зірнуць цікава,
Як там з гары ўсё выглядае.
І дзядзька стоража пытае:
— А колькі той білет каштуе?..
Ніяк у Вільні не шанцуе!
— Ўсяго шэсьць грошаў. Заплацеце,
Тады сабе, здаровы, йдзеце.
— Дзе наша, брат, не прападала:
Каб наша ліха не даждала! —
Гаворыць дзядзька наш разважна,
Ў кішэню лезучы адважна.
Сябры білеты пакуплялі
І на гару пашыбавалі.
— Ото, гара, як печ, крутая!
І вось чаму дарожка тая,

Бы шрубка, ўецца па-над бокам:
Узьлезь, папробуй, простым крокам!
Ну, брат, гара, аж ногі млеюць. —
Сябры ідуць і весялеюць.
— Ці то яе такая ўрода?
Рукою, мусібыць, народу
Яна насыпана спрадвеку...
Ото, мой Божа: чалавеку
Заўсёды мала, не хватае, —
Антось уголас разважае.
.....
Сябры на верх гары ўзьняліся,
Аж упацелі, засапліся,
І ногі іх спынілісь самі.
А слаўны від перад сябрамі
З гары высокай адчыняўся!
Хто відам тым не любаваўся?
Ўнізу гары ляглі прыгожа,
Як бы разоркі паміж збожжа,
Дарожкі роўныя, крывыя.
Над імі дрэвы маладыя
Ў сваёй пакоячай цішы
Сплялі жывыя салашы.
Агромны горад, цесна зьбіты,
Ўвесь блескам сонейка заліты,
Займаў узгоркі і нізіны;
Дамы стаялі, як віціны,
То ўдоўж, то ўпоперак радамі,
То закрываліся садамі
Або дзе ўзгоркам крутабокім;
А дзе васпанам адзінокім,
Расьцерабіўшы сабе пляц,
Як горды пан, стаяў палац.
Будынкі цесна ў рад стаялі,
Як бы адны другіх трымалі
У часе нейкай небясьпекі
І асталіся так навекі.
А між высокіх дамоў-градак,
Свой пэўны маючы парадак,
Віліся вулачкі так-гэтак

Густою тканьню цёмных клетак.
Ўгары, высока над дамамі,
Пазалачонымі крыжамі
Блішчалі цэрквы і касьцёлы,
Узьняўшысь к небу галавамі,
На сонцы зьзяючы вярхамі;
І гоман іх званоў вясёлы
Ў паветры гуў таемна, злучна
І замірaў дзесь мілагучна.
Налева, між гор крутабокіх,
У берагах сваіх высокіх,
Па камянях, бы тая зьмейка,
Вілася шумная Вялейка
І, закруціўшыся дугою,
Зьнікала зараз за гарою.
А справа ўніз свабодным махам
Лягла другая рэчка шляхам,
Як бы сталёвая пружына;
То Вілія, Літвы дзяціна,
Няслася пышна між абрываў
Бліскучай стужкай гожых зьвіваў,
Як бы жывое срэбра. Хвалі
На сонцы песьцілісь, дрыжалі.
Так майскім днём дрыжыць лістамі,
Абліты сонейка агнямі,
Зялёны клён і пышна зьзяе,
На сонцы лісьцікі купае.
Па левым беразе ў шнурочак
Зялёных дрэў пралёг радочак,
Як стрэлка, роўненька, пад меру,
Як тыя буквы на паперу.
Дамы, каменныя грамады,
Палацы, пышныя пасады,
Крутыя горы з жоўтым скатам,
Пяскамі, глінаю багатым,
Ўвесь правы бераг абступалі,
У рэчцы цені іх дрыжалі.
І адбіваліcь, бы ў люстэрцы,
У Віліі хмурынак перцы,
Што вісьлі белай чарадою

Высока ў небе над зямлёю.
А там, за горадам, так здатна
І так прыгожа, так прыятна
Узгоркі леглі ў сіняй далі;
Па іх адложыстых уклонах
Любоўна ветры па загонах
Жытцо, ярынку чуць гайдалі,
Як нянька добрая ці матка
Ў калысцы гойдае дзіцятка.
Палоскі нівак йшлі абрусам,
Гаі, лясочкі здольным вусам
Ў палях то тут, то там чарнелі,
Як бы на сонейку гарэлі.
І ў абразах тых самавітых
Палёў, задумаю спавітых,
Пачулісь родныя павевы
І дарагія сэрцу сьпевы
Для мужыкоў, сыноў заўзятых
Палёў, лясоў, лугоў багатых;
Там іх душа і там іх думы,
Ім далей хочацца ад шуму
Траскучых вуліц, перавулкаў,
Ад пылу, смроду закавулкаў,
А на гары было спакойна.
Чуць далятаў сюды нястройна
Далёкі шум і той зьмякчаўся,
Сюды нейк боязна ўрываўся.
Гара спакойна пазірала,
Маўклівасьць важную хавала,
Як сьведка той вялікай справы,
Што для пустой людзкой забавы
Ніколі вусн не раскрывае
І моцна тайнасьць ахраняе.
— Ну, што, Антоні: надзівіўся? —
Ад думак Верас абудзіўся. —
Ці не пара б пасілкавацца,
Бо трубіць чэрава, прызнацца?
— Так, час ісьці, глядзець даволі,
Бо не нагледзішся ніколі.
Сябры назад з гары зьвярнулі,

Шырокім крокам сьціганулі.
— Пастой! а там што? — Там — гармата.
— Чаму ж няма пры ёй салдата? —
Пытае дзядзька. — Мо старая,
А мо фальшывая якая, —
Ня буду спрэчвацца заўзята. —
З такой гаворкай да гарматы
Прыйшлі яны і важна сталі,
Гармату доўга разглядалі,
Глядзелі ззаду і з бакоў,
Аб ёй сказалі колькі слоў.
Калёсы дзядзька разглядае
І бліжай-бліжай падступае,
Хацеў яе яшчэ пагладзіць.
— Ой, не чапай, а то рассадзіць!
Няхай яна, брат, лепей спрахне!
Зачэпіш, падлу, ды як гахне!
І вочы высмаліць, і кішкі
Шпурне, глядзі, аж на Лукішкі.
О, зь ёю, брат, такія штукі! —
Спужаўся дзядзька, борзда рукі
Рвануў назад, як ад гадзюкі,
Ды так, што Грышка стаў сьмяяцца.
— Хадзем, брат, лепей сілкавацца!

**Якуб Колас**, Канстанцін Міцкевіч (1882—1956). Працаваў у “Нашай Ніве” (1907).

Паводле камэнтароў у Зборы твораў (1974. Т. 6. С. 478), гэтыя два разьдзелы (тут — скарочаныя) датуюцца сакавіком—траўнем 1911 і спачатку ўваходзілі ў вершаванае апавяданьне “Як дзядзька езьдзіў у Вільню і што ён там бачыў” (першая публікацыя: Вольная Беларусь, 1918). Упершыню цалкам паэма “Новая зямля” друкавалася ў 1923. У гэтай Анталёгіі абраная дата 1911 — час стварэньня. Што да часу апісаных падзеяў, дык Андранік Антанян (які зрабіў рэканструкцыю маршруту дзядзькі Антона ў Вільні) прапануе лічыць ім 1900—1901 (зыходзячы з адлюстраванае ў паэме біяграфіі Коласавага роду, калі набывалася зямля) і 1906—1907 (зыходзячы зь першых візытаў у Вільню самога Коласа, калі адбыліся “здымкі з натуры”).

1912. Янка Купала
“Лірнік Вясковы”

*Памяці Ул.*
*Сыракомлі*

Над Вяльлёй, дзе сталіца была Гедыміна,
На магілках, што Роса завуцца,
Курганок там убачыш, пакрыты дзярнінай,
Над дзярнінай бярозкі трасуцца.

Сумна шэпчуць галінкі зімою і летам
Аб жыцьці, пахаваным пад імі;
Людзі ходзяць маліцца над насыпам гэтым,
Пасьвянцаці сьлязамі жывымі.

Пяцьдзясят раз у зелень вясна спавівала
Ніву нашу і насып жвіровы, —
Над курганам тым сэрцаў мільёны шаптала:
Дай Бог рай табе, Лірнік Вясковы.
Гэта фрагмэнт вершу, напісанага на 50-я ўгодкі сьмерці Ўладзіслава Сыракомлі. Купала згадвае тут могілкі Роса, дзе на “літаратарскай” горцы магіла Сыракомлі суседзіць сёньня з магіламі некалькіх дзеячоў беларускай культуры і літаратуры (К. Сваяка, Ф. Аляхновіча, Л. Вітана-Дубейкаўскага і іншых). Друкуецца паводле Поўнага збору твораў (Т. 3. С. 89).
1912. Максім Багдановіч
Касьцёл Сьв. Ганны ў Вільні

Каб загаіць на сэрцы раны,
Забыцца долі горкі глум,
Прыйдзеце да касьцёлу Ганны!
Там зьнікнуць сьцені цяжкіх дум.

Як лёгка дагары, як красна
Узносіць вежы ён свае!
Іх вырыс стройны ў неба ясна
Заломам строгім устае.

А гастрыні іх так высока,
Так тонка ў вышу неба тнуць,

Што міг адзін — і бачыць вока —
Яны між сіні ў выш плывуць.

Як бы расстаўшыся зь зямлёю,
Каб у нябёсах затануць,
Сьвятыня лёгкаю ступою
Ў блакіце пракладае пуць.

Глядзіш — і ціхнуць сэрца раны,
Далёка долі горкі глум.
Прыйдзеце да касьцёлу Ганны!
Там нікнуць сьцені цяжкіх дум.

**Максім Багдановіч** (1891—1917). Сьведамае жыцьцё пражыў у Расеі. У 1911 гасьцяваў у Вільні ў рэдакцыі “Нашай Нівы”. Пасьля гэтага паэт піша цыкл вершаў “Месту” — першы ўрбаністычны цыкл у беларускай паэзіі, як адзначаюць камэнтатары Збору твораў паэта. У гэтую Анталёгію ўключаныя толькі некаторыя вершы цыклу.

Верш “Касьцёл Сьв. Ганны ў Вільні” ў цыкл “Месту” не ўвайшоў. Друкуецца з кн.: Максім Багдановіч. Вянок паэтычнай спадчыны. — Нью-Ёрк — Мюнхен, 1960. С. 60.

Пасьля М. Багдановіча гатычны касьцёл Сьв. Ганны апявалі многія беларускія паэты, зрабіўшы яго адным з галоўных сымбаляў Вільні.

1912. Максім Багдановіч
* * *

Вулкі Вільні зіяюць і гулка грымяць!
Вір людзкі скрозь заліў паясы тратуараў,
Блішчаць вокны, ліхтарні ўгары зіхацяць,
Коні ймчацца, трамваі зьвіняць,
І гараць аганьком вочы змучаных твараў!

А зьвярні у завулак — ён цесны, крывы;
Цёмны шыбы глухіх старасьвецкіх будынкаў;
Між каменьнямі — мох і сьцяблінкі травы,
І на вежы, як круглае вока савы,
Цыфэрблят — пільны сьведка мінулых учынкаў.

Ціша тут. Тут маўкліва пасталі — і сьняць
Ў небе купалы, брамы, байніцы і шпіцы;
Грук хады адзінокай здалёку чуваць,
Часам мерныя ўдары звана задрыжаць
І замоўкнуць, памкнуўшы ад старай званіцы.

Спамяні, маё сэрца, даўнейшыя дні!
Па загадзе бурмістра усе, як належа,
Зачынілі ўжо вокны; загасьлі агні...
Варта вулкай прайшла... І ня сьпім мы адны —
Я ды чорны кажан, што шнуруе ля вежы.
*Друкуецца паводле: Максім Багдановіч. Вянок паэтычнай спадчыны. — Нью-Ёрк — Мюнхен, 1960. С. 110.*
1912. Максім Багдановіч
У Вільні
*(Санэт)*

Ліхтарняў блеск у сіняй вышыне...
Вітрынамі зіяючыя крамы...
Кавярні... мора вывесак... як плямы,
Анонсы і плякаты на сьцяне.

Кіпіць натоўп на жорсткім вулак дне!
Снуюць хлапцы, суючыя рэклямы,
Разносчыкі крычаць ля кожнай брамы...
Грук, гоман, гул, — усё ракой імкне.

А дальш — за радам кас, лямбардаў, банкаў —
Агні вакзалу... павадка хурманкаў...
Віры людзей... сіпячы паравоз...

Зялёны сэмафор... пакгауз... склады...
Заводаў коміны пад цьмой нябёс...
О, гораду чароўныя прынады!
*Друкуецца паводле: Максім Багдановіч. Вянок паэтычнай спадчыны. — Нью-Ёрк — Мюнхен, 1960. С. 111.*

1913. Зьмітрок Бядуля
Касьцёл Сьв. Ганны

Сярод пэрлямутру у небе
Льле месяц сярэбныя хвалі,
У люстры Вялейкі бурлівай
Свой воблік увесь адбівае.

Сьпіць Вільня. Адзін паглядаю
На цудны касьцёл Сьвятой Ганны —
Красуецца контур прыгожы
У гладзі блакітнага неба.

Узор, барэльеф і арнамэнт —
Малюнак да казкі-царэўны.
Гатычныя конусы, башні
У высі шыбаюць да зорак.

Бы сон хараства, гмах зьявіўся,
Як геній казаў: “Няхай будзе!”
Людзей адароных душою
Ён кліча на шчыру малітву.

Ўжо век, як тут быў карсыканец,
Дзівіўся на гэты храм Божы.
Казаў: “Кабы мог, перанёс бы
Ў Парыж як найлепшу здабычу!”
**Зьмітрок Бядуля**, Самуіл Плаўнік (1886—1941). З аўтабіяграфіі (1928): “Першае апавяданьне… было надрукаванае ў “Нашай Ніве” ў 1912 годзе. І вось пасьля надрукаваньня гэтага апавяданьня адбылася вельмі вялікая падзея ў маім жыцьці: рэдакцыя газэты “Наша Ніва” запрасіла мяне ў Вільню на сталую працу. Я, вядома, адразу згадзіўся… Сапраўдную школу самаадукацыі я праходзіў у Вільні, у асяродзьдзі сваіх сутаварышаў — супрацоўнікаў “Нашай Нівы”…” (Пяцьдзесят чатыры дарогі. — Менск, 1963. С. 82.) Паводле Збору твораў Бядулі (Т. 1. Менск, 1985. С. 397), верш не датаваны аўтарам. У творчым даробку Зьмітрака Бядулі шмат вершаў пра Вільню — на асобную ладную кнігу. Гэта буйныя аб’ёмам імпрэсіі “Віленскія помнікі”, “Жалезны воўк”... і меншыя, напісаныя ў гэткай самай манеры “На замкавай гары”, “...А людзі, як тыя мурашкі”, “На беразе Вяльлі”, рыфмаваныя (“Паходні”) і эсэістычныя (“Сьвятое гэта месца!..”)

ды іншыя. Для Анталёгіі абраны адзін верш, які дае ўяўленьне пра эстэтыку астатніх твораў.

1914. Андрэй Зязюля
Малітва да М. Б. Вастрабрамскай

О Маці Божая, што ў слаўнай Вострай Браме,
Як зорка ясная, нам сьвеціш заўсяды,
Нам, што атрымалі па прашчуру Адаме
Ў адвечнай спадчыне зьдзек, гора і бяду.

К Табе, прачыстая лілея, ўдзень і ўночы
Ўзіраюць нашыя заплаканыя вочы.
Матухна Божая, пакрыўджаных Уцечка,
К Табе мы йдзём з пакорнаю мальбой:
Ўпрасі нам згоду, хай загіне сварка, спрэчка,
Выклікана народных праў дзяльбой.

К Табе, Заступніца, мы ўздых свой у пакоры
Шлём: барані Ты нас ў народным цяжкім горы.
О Маці міласьці прыгожае, пазнаньня
І Багабойнасьці, Крыніца праўд і цнот!
К Табе мы грэшныя ў час пробы і загнаньня
Нясём учуцьцяў звой і мысьлі нашых сплёт.

Прымі, Ласкавая, ад нас, гаротных, дары,
Што тут кладзём пры Браме на аўтары.
О Міласэрная, паўнюсенькая ласкаў,
О Маці нашая! Ў трывожны гэты час,
Калі празь цемру ледзь блішчыць луч новых бляскаў
Сярод змаганьня з злом, ня кінь бязьсільных нас!

К Табе мы грэшныя, бяздольныя ўсклікаем,
Ратунку, помачы Тваей усе чакаем.
Пачуй наш плач на гэтым сьлёз падоле,
Ў змаганьні з злом агульным памажы.
Хай згіне ўжо граху, пагард няволя,
Ты сьцежку міласьці усім нам пакажы.

Не выпушчай нас з Матчынай Апекі

Свае цяпер, заўсёды і навекі.
**Андрэй Зязюля**, Аляксандар Астрамовіч (1878—1921). Быў сьвятаром. Верш датаваны паводле зьвестак Ірыны Багдановіч. Узяты з кн.: Андрэй Зязюля (Кс. Ал. Астрамовіч). З роднага загону. — Вільня, 1931. С. 31.
Вострая Брама — адна з уязных брамаў места, у якой зроблена капліца і месьціцца цудатворны абраз Маці Божай, што шануецца і каталікамі, і праваслаўнымі. Яшчэ ў XIX ст. ў сваіх “Паляўнічых акварэльках з Палесься” Янка Лучына згадвае гэты абраз менавіта ў кантэксьце праваслаўнай традыцыі — на покуці (“Гаспода вось. На градцы посуд. Чыста ў хаце. // Абраз з выявай Божай Вастрабрамскай Маці // На покуці ў вянку”). Вострая Брама і цудатворны абраз — самыя частыя вобразы ў гэтай Анталёгіі. Але ўключаць у яе ўсе вершы, у якіх толькі згадваецца Вастрабрамскі сьвяты абраз, няма сэнсу: далёка ня ўсе гэтыя творы пра Вільню. Згадаю, да прыкладу, “Варожбу” — Засьцянковую аповесьць Алеся Гаруна (Вольная Беларусь, 1917), дзе распавядаецца пра сіротку Эмілю: “Страшна і ўспомніць далёкі той год // (Чорным яго называе народ), — // Пожасьць з касою па сьвеце хадзіла, // Панну Эмілью сіроткай зрабіла, // Родных, сямейку зямлёю пакрыла. // Доля, няйначай, — ў яе ўсё руцэ: // Ўзялі паны гадаваць пры дачцэ. // Ўстане, паходзіць і сядзе ізноў, // Б’ець у галоўку гарачая кроў; // Нейкія ў сэрцы парваліся тамы, // Твар то збляднее, то зробіцца ў плямы... // Стане прад маткай сьвятой з Вострай Брамы, // Просіць: “Прачыстая, згінуць ня дай, // Гора адкінь, ад бяды захавай!”

1915. Янка Купала
На вуліцы

Блудзіў па вуліцы я тэй, дзе сустрачаў яе,
Яе — ня ўцямлю — шчасьце ці сваё няшчасьце…
Час быў такі, калі ўжо першы певень устае,
А злодзей сьмела зь лёжа выпаўзае красьці.

На небе месяц бледны, як нябожчыкавы твар,
З-над воблакаў сьцікаўся, быццам бы ён шляху
Свайго ня мог знайсьці паміж расплаканых там хмар,
Ці, каб стуль не зваліцца, блукаўся так са страху.

Паволі горад на сябе ўскладаў аковы сну,
Сьвятло ў акнах адно ўсьлед за адным канала;
Дзе-недзе ржавы ключ пужаў скрыготам цішыну
Ды спозьнена павозка дзіка ляскатала.

У дроце, што паміж слупамі віўся густа ўдоўж,
Як бы напяты былі там людзкія жылы,
Гудзеў, заводзіў вецер, бы па дроце рэзаў нож;
Як вісельнік, выў, вырваўшыся з-пад магілы.

Здалёку ад чыгункі данасіўся сьвіст-выцьцё,
Ўпіваючыся ў сэрца вытачанай стальлю,
Як бы з тым сьвістам адлятала шчасьце і жыцьцё.
Ці гінуў нехта наймілейшы там — за дальлю.

Аб сьцены рэха стукалася ад хадзьбы маей, —
Цагляны мур сачыў за мною безупыну;
Цень ад ліхтарняў мой ўсё то даўжэй, то карацей
Выцягваўся, дваіўся, то зусім дзесь гінуў.

Лічыў за крокам крок я й пазіраў ўвакруг, як здань,
На заміраючы да заўтра горад грэшны,
І чуўся я, як здрадай схопленая ў клетку лань, —
Такі бясьсільны, пазабыты, безуцешны!

За думкай думка джалам сьвідравала галаву:
Што ёсьць, няма, — судзіў суды і перасуды,
І думаў ўсё: за што, нашто сябе на часьці рву,
Калі за гэта маю толькі камняў груды?

Так сноўдаўся па вуліцы і сам згараў ў сабе…
…Іду і чую: тут з-за муру, ў сутарэньні,
Рагоча музыка, як сумашэдшая ў кляцьбе,
Пад музыку — бражджаньне ног, грудзей хрыпеньне…

І жудка стала!.. Ёсьць жа яшчэ людзі на зямлі,
Што могуць дзіч сабой зьмяніць і весяліцца,
Ня бачачы сваіх бяспутнасьцей, што іх змаглі
І душаць адусюль, як зьмеяў навальніца!

Зь нявольніцай нявольнік тут танцуе на забой,
Пад зьдзекам рабскія свае сагнуўшы шыі,
А там, на акрываўленых палёх крывёй людзкой,
Нявольнік для нявольніка грабніцу рые.

Стыд спанаваў мяне, што я на вуліцы тэй быў
І аддаваўся нейкай візьі ўсёй душою, —
Тым горкім думам аб сабе і сэрцу тым, на зьдзіў
Так заўладаўшым маім сэрцам-сіратою.
*Вільня, 15 лютага*
Друкуецца паводле Поўнага збору твораў (Т. 4. С. 16).
У камэнтарах сьцьвярджаецца, што паэт мае на ўвазе рэстаран “Зялёны Штраль”, але гэты рэстаран ня быў у сутарэньнях. Тут гаворка магла ісьці і не пра рэстарацыю, а пра прыватную кватэру ці нейкі клюб.

1916. Максім Багдановіч
Пагоня

Толькі ў сэрцы трывожным пачую
За краіну радзімую жах,
Ўспомню Вострую Браму сьвятую
І ваякаў на грозных канях.

Ў белай пене праносяцца коні, —
Рвуцца, мкнуцца і цяжка хрыпяць.
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разьбіць, не спыніць, не стрымаць!

У бязьмерную даль вы ляціце,
А за вамі, прад вамі — гады.
Вы за кім у пагоню сьпяшыце?
Дзе шляхі вашы йдуць і куды?

Мо яны, Беларусь, панясьліся
За тваімі дзяцьмі уздагон,
Што забылі цябе, адракліся,
Прадалі і аддалі ў палон?

Біце ў сэрцы іх — біце мячамі,
Не давайце чужынцамі быць!
Хай пачуюць, як сэрца начамі
Аб радзімай старонцы баліць...

Маці родная, Маці-Краіна!
Не усьцішыцца гэтакі боль...
Ты прабач, Ты прымі свайго сына,
За Цябе яму ўмерці дазволь!

Ўсё лятуць і лятуць тыя коні,
Срыбнай збруяй далёка грымяць...
Старадаўняй Літоўскай Пагоні
Не разьбіць, не спыніць, не стрымаць.
*Друкуецца паводле Збору твораў (Т. 1. С. 314).*
1918. Антон Навіна
Два цэнтры
За апошнія паўтраця году Вільня й Менск — гэтыя два галоўныя цэнтры Беларусі — жылі ў зусім розных варунках — як палітычных, так і агульных... Вільня за час вайны аказалася цэнтрам беларускай культурна-нацыянальнай працы, а Менск — палітычным цэнтрам…
У Вільні шырэйшая палітычная работа ў грамадзянстве блізка зусім спынілася: затое ўсе беларускія чынныя сілы пакіраваліся на работу культурную — будаваньне школаў, апрацоўваньне школьных кніжак і ўсяго, што патрэбна дзеля школы, ладжаньне навуковых, культурна-нацыянальных і эканамічна-дабрачынных таварыстваў і ўстаноў…
У Менску ўтварылася й першае краёвае прадстаўніцтва Беларусі — Рада Беларускай Народнай Рэспублікі, утварыўся першы выканаўчы орган краёвай улады — Народны Сакратарыят. І ў Менску адбыўся акт апавяшчэньня Беларусі незалежнай дзяржавай.
“Вільня ці Менск”. Пытаньне, якое з нашых местаў мае быць цэнтрам Беларусі, нам даводзілася чуць ня раз — асабліва ад тых спаміж нашых суседзяў, якія мелі ахвоту ўзяць Вільню сабе. Але й сёньня, хоць літвіны аб’явілі Вільню за сталіцу незалежнай Літвы, даць адказ на гэтае пытаньне нялёгка: бо культурныя цэнтры не заўсёды разьвіваюцца там, дзе ёсьць цэнтар адміністрацыйны (напр., Кракаў у Польшчы, Львоў у

ўкраінцаў). І незалежна ад таго, ці між Беларусьсю і Літвой будзе праходзіць дзяржаўная мяжа, ці Вільня апынецца з аднаго ці з другога боку гэнае мяжы, гэты старадаўні цэнтар культурнага жыцьця ўсяго Беларуска-Літоўскага краю будзе заўсёды прыцягваць да сябе культурныя сілы ўсіх краёвых нацыянальнасьцяў, як архіў мінуўшчыны, як “пільны сьведка мінулых учынкаў”. Тут складзены вялізныя скарбы беларускай культуры, незвычайна багатыя помнікі нашага старога пісьменства. Тут беларусы здаўна закладалі і закладаюць свае навуковыя ўстановы. І калі думка беларускага палітычнага дзеяча зьвяртаецца сёньня да Менску, думкі вучоных плывуць да Вільні.
“Вільня ці Менск?” Гэтае пытаньне, бясспрэчна, разьвяжа толькі будучыня. Але здаецца, што разьвязка тут можа быць толькі кампрамісная: Вільня пры ўсялякіх варунках павінна абслугоўваць абодва народы, для якіх гэтае места было калыскай у часах нарадзін іх культуры.
*3 красавіка*
**Антон Навіна**, Антон Луцкевіч (1884—1942). З 1906 жыў і працаваў у Вільні. Палітык, пэдагог, літаратурны крытык, аўтар артыкулу “Вільня ў беларускай паэзіі” (гл. у гэтай Анталёгіі). Артыкул “Два цэнтры” быў зьмешчаны ў віленскай газэце “Гоман”.
У гэтым творы, які можа разглядацца і як імпрэсія, упершыню адкрыта гаворыцца пра культурна-гістарычнае значэньне Вільні для Беларусі, пра тое, “чый” гэта мусіць быць горад у будучыні, а таксама пра суадносіны дзьвюх сталіц — старой і новай, Вільні і Менску. Твор пісаўся ў красавіку, пасьля абвешчаньня БНР у Менску, куды сама ідэя незалежнасьці была прывезеная і адстаяная там віленчукамі. Моцны эмацыйны пачатак і вобразная аргумэнтацыя дазваляюць разглядаць гэты тэкст у асяродку паэтычных твораў, тым больш што ён многае тлумачыць у настроях іншых аўтараў Анталёгіі.

1919. Францішак Аляхновіч
Ты, Вільня, мяне ўзгадавала

Ты, Вільня, мяне ўзгадавала,
Тут сьніў я дзіцячыя сны!..
Хоць мне была мачыхай Ты,

Душы маёй боль задавала,
З-за вугла каменьне кідала
Зь нязнанай, мо братняй рукі,
І чару ад вусн адбірала,
Хаця умераў я ад смагі,
І ў чару ту горыч ўлівала
І піць мне яшчэ падавала, —
Хоць мачыхай мне была Ты,
У сэрцы маім шмат любві...
Люблю за тваю Цябе долю,
Што сумная страшна была...
Ты пражыла шмат многа болю,
Ты сама няшчасна, як я.
Ня раз круганоў чорны хвалі
Ты бачыла, Вільня мая,
Як лапаталіся ўдалі,
Ажно дрыгатала душа...
Ты — бедная родная маці,
У сэрцы тваім боль-туга...
Уцеху калі нам спазнаці?
Калі згіне гора-бяда?..
За ўсе твае мукі нядолі
Люблю Цябе я яшчэ болей...
За радасьць вясеньніх усьмехаў,
Як сонейка блісьне з-за хмар, —
Мінуўшчыны прожытых рэхаў,
Што думы нам веюць на твар, —
За долю-нядолю тваю,
За коратку ўцеху вясны, —
Хоць мачыхай мне была Ты, —
Цябе, мая Вільня, люблю!..

**Францішак Аляхновіч** (1883—1944) нарадзіўся ў Вільні. Найбольш ведамы як драматург і аўтар кнігі “Ў кіпцюрох ГПУ”. Жыцьцё і дзейнасьць Аляхновіча шчыльна зьвязаныя зь Вільняй. Загінуў ад рукі невядомага забойцы. Пахаваны на могілках Роса.

Дата напісаньня вершу меркаваная. Паэт кажа пра Вільню то “мачыха”, то “маці”, маючы на ўвазе месца беларусаў у тагачасным горадзе. Пазьней гэты матыў Вільні-мачыхі паўторыць Міхась Машара.

*Друкуецца паводле “Хрэстаматыі новай беларускай літаратуры” Ігната Дварчаніна (Вільня, 1927).*

1920. Алесь Гарун
Дні
Жыву на чацьвёртым паверсе ў гатэлі, саўсім не выходжу, бо чуюся хвора, праседжую дні прад вакном у фатэлі, — сягоньня... учора... заўчора...
Ні дум, ні пачуцьцяў. Праз дым цыгарэткі за шыбамі вочы ўвесь дзень на папасе: ў тумане там ловяць касьцёлаў сыльвэткі, дым з комінаў, часам — сход галак на дасе; драты тэлеграфу вісяць у паветры, між імі калмацяцца тучкі капрызна; запаў небасхіл ў алавяныя нетры, далёка, над грудай Панараў вялізнай.
...Часьцей за усё пападаецца воку насупраць вакно ад гары, стыль “бароку” крыху непакоіць... Наогул жа дніны праходзяць прыемна: някрыўдна, няўцешна. Сяджу у фатэлі, занятак ядыны — шаптаць: “Усё добра, ўсё добра!..” Хоць... сьмешна!.. Так... Людзі ж... Зьяўляецца зрана дзяўчынка:
— Прыбраць пан пазволіць?
— Так... Але, прыбраць!
— Гарбаты прынесьці? З цытрынай?
— З цытрынкай! І потым газэты...
— Газэт жа шмат браць?
— Дзьве возьмеш...
Праз хвілю гатова гарбата, празь пяць хвіль звычайна прыходзяць “кур’еры”, праз квадранс прыбрана. Ці ў будні, ці ў сьвята, — у дзесяць за ёй зачыняюцца дзьверы, і больш не трывожаць да самай вячэры. Ніхто не трывожыць... Так добра... Бязь меры!..
**Алесь Гарун**, Аляксандар Прушынскі (1887—1920). У Вільні быў незадоўга да сьмерці ад сухотаў.
У вершы згадваюцца Панары — чарада ўзгоркаў на захадзе Вільні, якія пасьля будуць апетыя і іншымі паэтамі.
Друкуецца паводле: Алесь Гарун. Сэрцам пачуты звон. — Менск, 1991. С. 193.
1921. Ігнат Канчэўскі
Верасьнёвае пано

Ў Бэрнардынскай прысадзе шапочуць пажоўклыя лісьці,
Ледзь прыкметны на сьцежках бліскучыя скуркі каштанаў,

І вада у Вяленцы ад зімна сіней і празрысьцей,
Гаманіць з камянём аб працёкшых гадох без устану...

...І выходзіць між дрэў ў патаёмную вечара пору
Князь апошні Літвы, ў хвалях гаснучых зыбкага сьвету,
З барадой кучаравай — дасьпелых каштанаў калёру,
Са струсёвым пяром, што як воблак над чорным бэрэтам.

І, суваючысь крокам павольным па сьцежынках саду,
Ён усходзе на гору, падходзіць да вежы цаглянай
І, апершысь рукой пад плашчом на злачоную шпаду,
На прыціхшае места глядзіць аж да самага рана.

І чакае... пакуль не засмуціцца ноч над ракою,
Над вадой пабялеўшай прытуляцца сонныя мары,
І ў празрыстай імгле паплывуць лебядзі чарадою,
А над іскрамі росаў праблысьне апратка Барбары.
**Ігнат Канчэўскі** (1896—1923) нарадзіўся ў Вільні, тутсама памёр ад сухотаў. Найбольш вядомы сваім філязофскім эсэ “Адвечным шляхам”, якое выйшла пад псэўданімам Ігнат Абдзіраловіч. Верш “Верасьнёвае пано” падпісаны псэўданімам Ганна Галубянка.
*Друкуецца паводле копіі аўтографу з архіву Андраніка Антаняна.*

1921. Натальля Арсеньнева
***

Сьветла, спакойна, лёгка бяз конца,
Грэе і лашчыць вясеньняе сонца.
Сінія далі ў імгле негустой,
Лес прад вачмі вырастае сьцяной.
Сьнег між кустамі, між пнямі бялее,
Ветрык вясеньні, жартуючы, вее
З поля, дзе густа чарнее зямля,
З поля, дзе сёньня пануе вясна.
Там, дзе з блакітам зьліваюцца далі,
Горы палоскаю сіняю ўсталі,
Места там недзе між гор залягло,
Ў дымцы хавае сваё харство.
Звоняць у Вільні ледзь чутна, і гукі

Сэрца чапаюць знаёмаю мукай.
Ціха... а тут, паміж соснаў старых,
Ўецца дарога да елак густых,
Ўецца, зьнікае, ізноў выбягае,
Поле і сьнег у кустох агібае,
Ўецца лагчынкай, дзе цені ляжаць,
Сосны дзе ў сіняе неба глядзяць.
Ціха, ўсё ціха... Заплюшчыўшы вочы,
Тут бы, на сонцы, сядзела да ночы,
Твар прылажыла б да цёплай зямліцы,
Слухала б грукат вясеньні крыніцы,
Слухала б тое, што ветрык пяе,
Ўсё, што гаворыць душы аб вясьне...
Сьветла, спакойна, лёгка бяз конца,
Грэе й ласкае вясеньняе сонца!

**Натальля Арсеньнева** (1903—1997). З маленства жыла ў Вільні, скончыла тут беларускую гімназію і ўнівэрсытэт. Пасьля другой сусьветнай вайны эміграваля ў ЗША.

Верш узяты зь першага зборніка: Натальля Арсеньнева. Пад сінім небам. — Вільня, 1927. С. 22.

1921. Натальля Арсеньнева
Восень у Вільні

Клёны апалі, і золата й фарбы
крыюць зямлю дарагім дываном.
Поўныя жмені лістоў тых узяў бы,
восеньскім сплёў бы іх пышным вянком.

Таюць аблокі у небе высокім,
хвалі туману над Вільняй стаяць.
Места мярэсьціцца ўнізе, далёка,
вежы касьцёлаў у неба глядзяць,
цэркваў блішчаць залатыя галовы,
цёмнымі плямамі дрэвы ляглі,
сіняй палоскаю бор нат хваёвы
ледзь, а відаць за істужкай Вяльлі...

Чуюцца, чуюцца восені чары
ў фарбах, у тонах лісьця і нябёс,
лёгкім дрыжэньні кляноў у пагары,

сьвежасьці йльдзістай, што вецер прынёс...
*Друкуецца паводле: Натальля Арсеньнева. Між берагамі. — Нью-Ёрк—Таронта, 1979. С. 15.*

1924. Казімер Сваяк
Вастрабрамска Маці Божа

Вастрабрамска Маці Божа
Краска чыстая, прыгожа.
Міласэрдзе Твае волі
Сьвеціць Вільні у нядолі.

Ў краі нашым Ты у чэсьці,
Нясеш зь неба добры весьці!
Шчасьце для нашага краю
Даеш нам ад Бога з раю!

Ўся Цябе Русь славіць Бела,
І Літва, і Польшча цэла,
Бо Ты маці міласьціва,
Сваім дзеткам дабратліва. —

Іх у смутку пацяшаеш,
Слабых, хворых папраўляеш!
І хто толькі к Табе прыйдзе,
То бяз радасьці ня выйдзе.

Ты так кожнаму дагодзіш,
Што надзею ў сэрцы зродзіш;
Празь Цябе усе правіны,
Даруюцца ў Бога Сына!
**Казімер Сваяк**, Кастусь Стаповіч (1890—1926). Нарадзіўся на Віленшчыне, скончыў Віленскую духовую сэмінарыю (1914), быў сьвятаром. Пахаваны ў Вільні на могілках Роса.
*Дата напісаньня вершу меркаваная. Друкуецца паводле: Голас Душы. — Рым, 1949. С. 261.*
1924. Міхась Чарот
Атаман

І застукала сэрца улана:

На зямлі нашай — больш не яздок...
Паглядзеў — мужыкоў як наслана!..
Чуе грозны загад атамана:
“Менск і Вільня, а там — Беласток!..”

Эх, пайшлі!.. Зварухнулася сіла,
Толькі рэхаю стогне абшар...
Хоць сягоньня яшчэ і ня ў Вільні,
Але тут вось мужык гаспадар!
**Міхась Чарот**, Міхась Кудзелька (1896—1938). Жыцьцём і творчасьцю зь Вільняй ня зьвязаны.
Гэты ўрывак прыведзены як ілюстрацыя “новага кантэксту” Вільні ў беларускай паэзіі — ужо савецкай. Падобныя згадкі старой сталіцы ў міжваенных вершах менскіх паэтаў частыя. Цэлы пласт савецкіх твораў распавядае пра бальшавіцкія атакі, рэвалюцыйны парыў камунараў, пра камсамольцаў на Лукішках і падобнае. Тутсама і падкрэсьленая сацрэалістычная бесканфліктнасьць. Вось чаму, да прыкладу, ніколі не патрапіць у падобныя анталёгіі верш Уладзімера Дубоўкі “Камсамолка Ганна” альбо “Сёмая гадавіна” Паўлюка Труса зь яе ўтапічнай сусьветнай рэвалюцыяй: “Прыйдзе час, і пад сьцягам свабоды // Павянчаецца зь Нёманам Вісла // І над Вільняй зазьзяе пагодай, — // Хай панурыя хмары ня віснуць!..”
*Друкуецца паводле: Міхась Чарот. Выбранае. — Менск, 1982. С. 45.*

1925. Уладзімер Жылка
Вершы аб Вільні
I.

Калі сябры нас гудзяць згубаю
І ворагі прарочаць скон, —
Тады к Табе, о Вільня любая,
Прыводзяць згадкі у палон.

Ў маіх лятунках ты — ўладарная,
Пануеш ты, харашыня:
Завулкаў сон і ціш кляштарная,
Вяльлі празрыстай глыбіня;

Вялікай вуліцы экзотыка,
Тэатры, кіно, шпіталі;
І маліцьвенна ўзносіць готыка
Да неба тонкія шпілі;

Сьвятая Ганна — сьпеў, напеўнасьцю
Салодка ўзрушаны ўсягды;
А поруч зь бізантыйскай пэўнасьцю
Царква прысела ля вады;

У вечар за гарой трохкрыжнаю
Палае захаду пажар,
Як знак, што веліччу аблыжнаю
Яна ня выкліча ахвяр;

І плюск Вялейкі, хвалі ветрыка
Люляюць Бэрнардынскі сад;
І мігаціць праз ноч электрыка,
Ў зацёмках мескіх — шалы чад;

Плыве па вулках пыха панская,
Распуста, блуднасьць і мана;
І ярасьць жорсткая, паганская
Бліскае ў вочах літвіна;

Ў жыдоўскім гета — дробязь клопаты
І аб Сыёне сны ў туман;
І гэткі ж сум, і тыя ж допыты
Вядуць таполі Базылян;

А там — па-над мурамі даўнымі,
Дзе места ўсенькае відно,
Руіна думамі дзяржаўнымі
Гадае там: чыё яно?

Але ўжо лёс рукой няўхільнаю
Загад вызначвае зь вякоў:
Усё магутней б'е пад Вільняю
Прыбой нямоўкнучы з палёў.

Ўсё пераможней нестрыманае
Стыхіі шум і бурны круг...
О, места роднае, каханае,
Цябе зальле крывіцкі рух!
II.

О Вільня, крывіцкая Мэкка!
О места — ўсё цуд, харaство!
Дзяржаўная думнасьць павекаў,
Узьнята рашуча брыво!

Абліччам пад ветры і буры,
Туды — у разлогі палёў,
Дзе гоняў рунелыя суры,
Ўзіраешся, поўная сноў.

Чытай жа, чытай жа празь цемень,
Праз гэты бяздольля туман —
Там дзеці жаданьнем, бы крэмень,
Кляліся на новы каран.

Там дзеці (твае яны дзеці!)
З-пад сьлепых, закураных хат...
Вітай жа — ў часы ліхалецьця
Змагарскі іх блішча пагляд.

Ім кажуць прапасьці са сьвету,
Ў парожнасьць расьсеяцца, ў дым;
Ды думкай, бы выш мінарэту,
Стаяць яны ў ветрыску злым.

Ім доля дала паніжэньне,
Ды Бога кром Бога няма;
І Бог іх адзін — вызваленьне,
І зьненавісьць іх да ярма.

Руіна замчышча — Кааба —
Ім прошча ўздыханьняў і дум.
Салодкіх лятункаў — прываба,

Ў сваім запусьценьні — іх сум.

У крыўдзе і горы пякельным
Пагудкі, як клічу малны,
Чакаюць наўкол непадзельна,
Каб рушыць разводзьдзем вясны.

Ўжо ў песьнях зьвініць перамога
І крокамі курыцца шлях...
Але ці там чуеш сьвятога?
Ці вее прарокавы сьцяг?

Ці ён, паганяты, няўзнаны,
Душой шчэ згарае між нас, —
Хоць месяц мінуў Рамадана,
І вызначан тэрмін і час?

Ці сэрца гартуе да чыну?
Ці ў модлах да бога свайго?
Між тых, хто ўцяклі да Мэдыны,
Ці бачыш, ці бачыш яго?

І ты ці чакаеш пад зьдзекам,
Што бомкне ўрачыстая медзь?
О Вільня, крывіцкая Мэкка!
Ці варта прарока ты стрэць?
*Прага*

**Уладзімер Жылка** (1900—1933). Першыя публікацыі і кнігі выйшлі ў Вільні. Ягоны лёс, кароткае жыцьцё і вершы дазваляюць бачыць у Жылку праўдзівага спадкаемцу Максіма Багдановіча. Хіба што ў Багдановічавым жыцьці болей расейскіх адрасоў, а ў Жылкавым ёсьць яшчэ і Прага, навучаньне ў Карлавым унівэрсытэце. Праўда, памёр Жылка ўсё ж у Расеі, куды быў сасланы за свае перакананьні, — у далёкім горадзе Ўржуме.

Вершы друкуюцца паводле віленскага часопісу “Студэнцкая Думка” (1925), дзе былі апублікаваныя як цытаты ў артыкуле Антона Навіны “Вільня ў беларускай літаратуры”. А пісаліся яны ў праскім прадмесьці Радоцін, дзе жыў паэт. Як вынікае зь лістоў Жылкі да Антона Луцкевіча, тамсама, у Радоціне, паэт

пісаў і “Аповесьць аб Вільні”, якая не захавалася.

1925. Антон Навіна
Вільня ў беларускай літаратуры
О, места роднае, каханае!
Цябе зальле крывіцкі рух!
*Ул. Жылка*
Што можа быць мілей чалавеку за родны кут, дзе ён радзіўся, узрос, перажыў усе радасьці і трывогі дзіцячае й юнацкае пары? І ці дзіва, што думкі паэта, асабліва калі ён на чужыне, ірвуцца да роднай зямлі зь нязьведанай сілай і даюць яму найвышэйшыя мамэнты натхненьня і творчасьці?
Бо ж звычайна прадметам паэзіі зьяўляецца іменна тое, што найбольш захоплівае пачуцьцё і выабражэньне паэта. Дык зусім натуральна, што і нашая адраджэнская паэзія, твораная бадай выключна сынамі вёскі, захопліваецца перадусім жыцьцём вёскі, апявае яе красу і... нядолю.
Адраджэньне беларускага народу — гэта адраджэньне, галоўным чынам, беларускае сялянскае масы. І наша новая паэзія на гэтай падставе ня толькі па зьместу, але і па сваёй ідэалёгіі зьяўляецца паэзіяй вясковай. Жыцьцё места, дзе беларусы займаюць — сярод масы чужацкага насяленьня (да таго — чужацкае інтэлігенцыі) — зусім малы і неадпаведны лічэбнасьці іх куточак, ад самага пачатку беларускага руху адбівалася ў нашай паэзіі вельмі слаба.
Навет такі пісьменьнік-інтэлігент, як Вінцук Дунін-Марцінкевіч, хоць і правёў палову жыцьця на мястовым бруку, толькі ў адным месцы рысуе жыцьцё места Магілёва (у “Гапоне”), дый то толькі звонку, A vole d’oisean. Абуховіч у сваіх мэмуарах пакідае таксама толькі мімалётны абраз Менску, не ўваходзячы ў яго ўнутранае жыцьцё. А Мацей Бурачок дык адносіцца да места прост непрыхільна, навет варожа.
[...]
Зь местам зьбліжае беларускую паэзію толькі рэвалюцыйны 1905 г.: так, найбольш яркая прадстаўніца тагачасных настрояў беларускіх, без пары памёршая Аляізія з Пашкевічаў Кейрысовая (“Цётка”), дала цэлы рад вершаў, пасьвячоных рэвалюцыйным падзеям 1905 году на мястовым грунце (“Хрэст на свабоду”, “Чырвоны штандар” і інш.). Але другія

пісьменьнікі таго часу, хоць настроеныя таксама рэвалюцыйна, пераносяць свой рэвалюцыянізм выключна ў вёску (Купала, Колас і інш.).
Першы ўнікнуў глыбей у жыцьцё места, захапіўся ім да глыбіні душы і знайшоў у ім дастойную апяваньня красу — Максім Багдановіч. Дый ня дзіва: здаецца, ад двох гадоў веку ён жыў у месьце (Ніжні Ноўгарад, Яраслаўль) і толькі студэнтам убачыў сваімі цялеснымі вачыма беларускую вёску, якую перш аглядаў з аддаленьня толькі вачыма душы. Характэрна, што *чужыя* месты, дзе ён жыў, не давалі Максіму Багдановічу натхненьня: толькі ў Вільні — духова *родным* месьце — "зьвярнуў яго Пэгас на вулкі з прывольных палявых дарог", толькі тут да яго душы прамовіла краса, укрытая ў месьце.
За Багдановічам ідуць: Колас, Зьмітрук Бядуля, Аляхновіч (драматычныя творы), далей — цэлы рад наймаладзейшых нашых паэтаў, вырасшых на грунце сацыяльнае рэвалюцыі. Адны зь іх, як Якуб Колас, бачаць вонкавае харство места — вачыма селяніна, якога *паражае* веліч гэтае нябачанае масы гмахаў і вуліц; другім места апавядае аб даўно *мінулых* часох (Багдановіч, Бядуля); трэціх захопліваюць праблемы сучаснага *мяшчанскага жыцьця* (Аляхновіч); іншыя бачаць у месьце арэну, на якую, кажучы словамі Міхася Чарота ("Беларусь лапцюжная"),

Па бруку гораду,
Бач, рухае,
Рухае горда
Лазою падплецены лапаць,

бачаць арэну, дзе творыцца новая беларуская кузьня сацыяльнае працы (А.Гурло: "Званы працы" ў зборніку "Барвенак"), — куды, як у Мэкку, цягнуцца й вочы беларускіх адраджэнцаў-нацыяналістаў (Ул. Жылка: "Вершы аб Вільні"). Ды ня кожнае места мае такую прывабную сілу для тварцоў нашае адраджэнскае літаратуры: навет Менск, сучасная сталіца Беларускае Радавае Рэспублікі, прымушаны ўступіць тут месца спрадвечнай сталіцы Беларусі — Вільні. Прымушаны ўступіць месца Вільні, бо ня мае таго, што мае Вільня: ня мае жывое дагэтуль *600-гадовае гістарычнае традыцыі*, ня мае *відавочных памятнікаў даўнае культуры і мастацтва*, а галоўнае — ня мае сваёй асаблівай *Душы*, якую мае надвялейская сталіца і якая

вызірае з кожнае вулкі старых кварталаў Вільні.

* * *

Хаця храналягічна першым пяўцом Вільні зьяўляецца ў нас бясспрэчна Максім Багдановіч, мы пачнем наш агляд не зь яго, а — з Коласа. Справа ў тым, што паэтычныя творы, пасьвячоныя Вільні, дзеляцца зусім выразна на дзьве групы: тыя, што малююць вонкавае харaство Вільні (гэтых менш), і тыя, якія захопліваюцца ўнутраным жыцьцём гэтае нашае адвечнае сталіцы — “Душой” места і яго людзьмі. У першай групе перадусім зварачвае на сябе ўвагу апісаньне Вільні Коласам у яго паэме “Новая Зямля”.
Запраўды, дадзены Коласам абраз Вільні — высока мастацкі. Гэта — від места з Замкавае Гары, від, які рэдка можна знайсьці ў вялікшых местах Эўропы наагул. І тым цікаўнейшым зьяўляецца гэтае апісаньне, што яго робіць верны сын вёскі, які першы раз папаў сюды і здумеўся, гледзячы на незвычайную для яго, запраўды высокую красу Вільні. У сваёй ацэнцы Вільні з вонкавага пункту гледжаньня Колас ужывае прыраўнаньняў і абразоў зь вёскі і яе жыцьця, якія для яго бясспрэчна прадстаўляюць найвышэйшую меру красы:

А слаўны відак прад сябрамі
З гары высокай раскрываўся!
І зусім ня дзіва, што Коласаўскі герой, які першы раз папаў сюды з свайго глухога лесу, шчыра залюбаваўся гэтым відам:

Ўнізу гары вілісь прыгожа,
Як бы дарожкі паміж збожжа,
Дарожкі чыстыя крывыя;
Над імі дрэўкі маладыя
Свае галінкі раскідалі.
[...]
І адбіваліcь, як ў люстэрцы
У Веліі хмурынак перцы,
Што вісьлі белай чарадою
Высока ў небе над зямлёю.
І ўсё ж сэрца вяскоўца не магло да канца захапіцца гэтым прыгожым абразом: краса вёскі аказалася для яго больш прывабнай! І растаялі нашы дзядзькі, як той воск на сонцы,

калі з той жа Замкавай Гары — за морам дамоў і вуліц — угледзелі яны так знаёмыя і родныя ім абразы ніў, палёў і лясоў:

А там — за горадам — так здатна
І так прыгодна і прыятна
Палоскі нівак шлі абрусам...
[...]
Запраўды, нейкай тайнай прадстаўлялася Коласу *ўнутранае* жыццё ўсіх гэных гмахаў і муроў, і яго наш паэт зусім не закрануў... Вільня так і асталася для яго нейкай *“незнаёмай красуняй”*.
* * *
Побач з вонкавай красой у Вільні ёсьць шмат такога, што з красой ня мае нічога супольнага ды што, як у кожным іншым вялікім месьце, і тутака б’ець па нэрвах, наводзіць нуду, зьнямогу і выклікае жаданьне — як у Коласавых дзядзькоў — вырвацца некуды на вольны прастор, адпачыць ад аднастайнасьці вуліц і камяніц, ад банальнасьці іх аздоб, ад багацьця крамных вітрын... Адчуў гэта ўжо Колас, а йшчэ лепш — у васьмі толькі радкох! — прадставіў Максім Багдановіч у адным зь вершаў “Вянка”:

Ад сьпёкі пышуць дахі і асфальт.
На вуліцы уецца пыл і грукаціць хурманка.
“Каробушку” пяе дзіцячы альт,
І надрываецца абрыдлая шарманка.
Хаця бы крыху часу адпачыць!
Мо на бульвар пайсьці, сесьць на далёкай лаўцы,
Здрамнуць, газэту сьвежую купіць
І прачытаць усё да імені выдаўцы?
Места, наагул, не дае Багдановічу сьветлых настрояў, бо ў месьце

...няма прастору
Дзеля прыроды буйных сіл,
бо яно

Прабіла сьцежку мору гора
Палёў, лясоў, капцоў магіл.
Але Максім Багдановіч ведае дзьве Вільні. Адна — гэта тое

шаблённа-банальнае места, падобнае да ўсіх іншых сучасных мест, якое наш пясьняр рысуе ў пасьвячоным Вільні санэце:

[...]
А поруч з гэтымі “чароўнымі прынадамі” сучаснага места, аб якіх Багдановіч так іранічна гаворыць, пясьняр наш бачыць і другую Вільню, якой ня ўбачыш пры мімалётным праезьдзе з вагзалу і йзноў на вагзал, якой ня бачаць мо й вельмі многія сталыя жыхары гэтага места. Гэта — Вільня мінулага — Вільня Скарынаў, Бабічаў, Брагаў і інш. — Вільня, якая на вечныя часы захавала сваё аблічча ў сваіх адвечных крывых вулках, у старадаўных будоўлях, касьцёлах, царквох... Як хораша прадстаўлена гэтая другая Вільня ў вершу Багдановіча, навеяным яму першай і, здаецца, апошняй бытнасьцяй яго ў гэтым месьце ў 1912 годзе і знаёмствам зь віленскімі памяткамі мінуўшчыны:

Вулкі Вільні зіяюць і гулка грымяць!
[...]
Хто не перажываў настрояў, якія з такім мастацтвам адтварае Багдановіч у гэтым вершу, — той ня ведае Вільні і не разумее яе — *і яе Душы*... Багдановіч выкрыў у Вільні гэтую старую яе Душу і зачарпнуў з гэтае крыніцы поўнай жменяй натхненьне да сваёй творчасьці, калі пісаў сваю знамянітую візію “Пагоні”:

[...]
* * *
Ад *Вільні мінуўшчыны*, Вільні, дух якое лунае над штодзённым банальным жыцьцём гэтага места, усё больш губляючы сваё арыгінальнае аблічча, — пераходзе да *Вільні сучаснасьці* Францішак Аляхновіч.
Паскольку другія нашы паэты прыходзілі да Вільні, прывабленыя яе красой, *звонку* — з палёў і лясоў неаб’ятнага прастору Беларусі, — пастольку Аляхновіч зьяўляецца наскрозь *віленцам*, неадродным сынам Вільні. Ён — інтэгральная частка віленскага грамадзянства, хоць і рознаязычнага, але псыхалягічна даволі аднароднага. “Знамяніты” віленскі жаргон — так званая “пальшчызна” — найлепшы гэтаму доказ. І Аляхновіч, творачы радам сваіх драматычных твораў, узятых зь віленскага жыцьця, як быццам паэму аб *людзях* Вільні —

людзях *учорашняга* (даваеннага) *дня*, знамяніта адтварае індывідуальныя рысы тыповых віленцаў. У “На Антокалі” і ў “Шчасьлівым мужу”, “Маньцы” і ў “Страхах жыцьця”, урэшце — у “Няскончанай драме”, якая зачапляе і беларускую праблему, — усюды б’ецца пульс віленскага даваеннага жыцьця, сьпісаны прост абразкі і тыпы з натуры! Агульная безыдэйнасьць і маральная нястойкасьць побач з імкненьнем да матэрыяльных выгад і карысьцяў — вось той агульны фон, на якім глохнуць і гібнуць вышэйшыя парываньні душы — да хараства, да творчасьці, да самаахвярнасьці дзеля ідэі. І запраўды “ценямі” здаюцца тыя ідэйныя адзінкі, якія праходзяць праз гэтае банальнае, пустое жыцьцё таўпы і — гібнуць... А якой праўдзівай прадстаўляецца ў такой атмасфэры тая духовая драма, каторую перажывае беларускі адраджэнец Васіль (“Няскончанай драме”), які ўрэшце ўцякае зь Вільні — у Менск!.. Дарма шукалі бы мы нейкае духовае красы, хараства ў віленскай таўпе, якую так па-мастацку, так праўдзіва, не ўкрываючы нічога, апісвае Аляхновіч. І як праў быў Багдановіч, стаўляючы, як антытэзу, побач з сучаснай Вільняй — шаблённа-банальнай — Вільню старую, поўную дум вялікіх і творчае сілы, авеяную рамантычным туманам, зьвязаную зь вялікімі гістарычнымі падзеямі і традыцыямі!

Але побач з гэтымі дзьвюма Вільнямі існуе яшчэ й *трэцяя Вільня*. Вось аб ёй мы спэцыяльна пагаворым.

* * *

Вільня, якую малявалі ўсе разгледжаныя намі песьняры, — гэта ўсё йшчэ сталіца колішняе Беларуска-Літоўскае дзяржавы, гэта — сэрца абшырнага краю зь яго чатырма нацыянальнымі групамі — беларусамі і літвінамі, як аўтахтонамі, і жыдамі ды палякамі, як прымакамі. Вільня, якую нам дагэтуль прадстаўлялі, гэта — сынтэз культурных і ідэйных уплываў усіх нацыянальнасьцяў, пакрыты зьверху пакостам даваеннае маскоўшчыны. Так прадстаўляецца Вільня і Максіму Гарэцкаму, які ў “Антоне” дае нам кінэматаграфічны абразок віленскага жыцьця — на фоне кавярні “Зялёнага Штраля”. Але Вільня мае сваё *пачэснае месца і ў беларускім руху да адраджэньня*. Як у XVI і XVII сталецьцях білася тутака беларускае сэрца, змагаючыся з паланіўшай яго чужой культурай, так б’ецца яно тут і сяньня. Тут вырас ідэйна Ян Чачот і Сыракомля, пакінуўшыя ў беларускім пісьменстве

значны сьлед у першую пару нашага нацыянальнага адраджэньня; тут працаваў і злажыў сваю галаву паўстанец-беларус Костусь Каліноўскі, “дыктатар Літвы”, які мо першы разглядаў Беларусь як палітычную катэгорыю; тут не адзін матыў пэўне зачарпнуў да сваёй творчасьці Мацей Бурачок, тут расьцьвіла і творчасьць Цёткі; і, як у часох Скарыны першая кніга, так ад 1906 году выходзіць у Вільні першая беларуская легальная газэта, ды з таго часу Вільня зьяўляецца галоўным цэнтрам беларускага руху, кузьняй беларускае адраджэнскае ідэалёгіі — *сэрцам Новае Беларусі*. І побач з масай чужога нам насяленьня расьце з году ў год лічба сьвядомых беларусаў — актыўных культурных і палітычных беларускіх дзеячоў, якія гуртуюцца ў Вільні, знаходзячы для сябе тутака найлепшыя варункі дзеля працы. Вільня цяпер вабіць беларускіх песьняроў ужо ня толькі беларускай мінуўшчынай ці міжнародавай сучаснасьцяй, але і сваёй *сучаснай беларускасьцяй*, як месца творчае працы і змаганьня *жывых беларускіх сіл*.
Толькі зьлёгка — і мо, здаецца, не зусім сьвядома — падыйшоў да гэтага ў сваёй “Няскончанай драме” Францішак Аляхновіч. Затое зусім сьвядома глядзяць на вагу і значэньне беларускага культурна-нацыянальнага цэнтру ў Вільні два нашы навейшыя паэты — Зьмітрок Бядуля (ці Ясакар) і Ўладзімер Жылка. Бядуля, папаўшы ў Вільню, вельмі добра адчуў Душу гэтага места і даў сваю даніну мінуўшчыне Вільні. Мы маем тут на думцы тыя вершы Бядулі, пасьвячоныя Вільні, дзе пясьняр наш перапрацоўвае легенду аб зялезным воўку і заснаваньні места ды інш. Але адначасна Бядуля бачыць і гэтую новую беларускасьць Вільні, захопліваецца жывой творчай працай, якая кіпіць тутака ад 1905 году, схіляе галаву перад тымі жывымі людзьмі, што тут, на віленскім грунце, выкоўвалі першыя беларускія культурныя цэннасьці.
Бядуля будуе *жывы мост паміж Вільняй мінуўшчыны і Вільняй сучаснай*.
У 1912 годзе Бядуля, першы раз прыехаўшы ў Вільню і пазнаёміўшыся з галоўным цэнтрам беларускага руху даваенных часоў — рэдакцыяй “Нашай Нівы”, пражыў вельмі глыбака навеяныя яму тут уражаньні. Можна сьмела сказаць, што *Вільня аканчальна вызначыла Бядулі яго жыцьцёвы шлях*. Бядулю паразіла тут у роўнай меры як адраджэнская работа, так і тая спадчына па далёкай мінуўшчыне беларускага народу,

каторую ён убачыў у постаці бясцэнных памятак старасьвеччыны, хаваных у той час с. п. Іванам Луцкевічам у памяшчэньні рэдакцыі “Нашай Нівы”. І сынтэз усяго гэтага прадставіўся Бядулі як “Сьвятое мейсца”, якое пясьняр наш апісаў у кароценькай імпрэсіі, ахвяраванай Івану Луцкевічу (гл. зборнік у памяць Ів. Луцкевіча, Вільня, 1920 г.):

[Ноч. Ціха... (...) “Сьвятое гэта месца...”]
Так колькінаццаць гадоў назад пісаў Бядуля аб *галоўным вогнішчы беларускасьці ў Вільні* — тэй Вільні, якую ў іншым месцы ён называе “беларускім Сыёнам”. Бядуля як быццам *туманна прадбачыць тую будучыню* Вільні, аб якой другі наш паэт — пясьняр нашага нацыянальнага самаўяўленьня Ўладзімер Жылка гаворыць ужо *зусім канкрэтна* ў сваіх недрукаваных яшчэ дагэтуль “Вершах аб Вільні”, напісаных сёлета ў Празе Чэскай і пасьвячоных “старому віленцу Антону Луцкевічу”. Што паміж думкамі-летуценьнямі Бядулі і Жылкі існуе цесная сувязь, на гэта паказуе хаця бы тое, што за motto дзеля сваіх “Вершаў аб Вільні” Жылка ўзяў гэтыя вось словы Бядулі, скіраваныя да далёкае цяпер ад іх абодвух Вільні:

“Сумуе душа па Табе, Беларускі Сыёне!”
Падаем “Вершы аб Вільні” Жылкі ў цэласьці:

[...]
Запраўды, *Мэккай* выдаецца беларускаму песьняру тая *Вільня*, зь якое сяньня беларуская Ідэя аказалася прымушанай уцячы ў *Мэдыну — Менск*, скуль — верыць Жылка — яна, гэтая Ідэя, як некалі Магамэт у Мэкку, вернецца йзноў у Вільню ўва ўсёй сваёй велічы і славе. І сваёй незвычайна чуткай душой паэт прачувае разьвязку споркі аб Вільні, бо вуха яго ловіць ужо гул таго “прыбою”, што “ўсё мацней б’е пад Вільняю” — зь *беларускіх палёў*!
Гэта й ёсьць тая трэцяя Вільня — *Вільня будучыны*.
* * *
У паэзіі — у самай аснове яе — ёсьць бясспрэчна элемэнт прадбачаньня, вешчаваньня. Паэт — запраўды ў пэўнай меры прарок, і прадбачаньне ім будучыны мае пад сабой моцны грунт: бо жыцьцё далёка не заўсёды разьвіваецца *рацыянальна* — згодна зь лягічнымі меркаваньнямі чалавечага розуму. І вось

якраз паэт сваёй чуткай душой умее часам улавіць тое, што, аб'ектыўна разважаючы, звычайныя людзі лічаць немагчымым — *ірацыянальным*.

Мо сяньня такім ірацыянальным будзе здавацца летуценьне Ўладзімера Жылкі аб *будучай Вільні* як аб *месьце беларускім*: запраўды, трудна даць веры таму, каб такія магутныя тут сяньня ўплывы, як польскі і жыдоўскі, уступілі месца беларускім уплывам. Але, але ўся гісторыя Вільні, колішняй *сталіцы Літвы*, стаўшайся *галоўным асяродкам беларускае культуры* ад самага свайго заснаваньня, пасьля абярнуўшайся ў *рассаднік польшчыны* і — у "*русскую твердыню*", а цяпер ізноў аберненай у "*czysto polskie miasto*", — усе гэтыя зьмены ясна паказуюць, што нішто вечным лічыцца тут ня можа... І хто ведае, ці летуценьні-сны Жылкі не бліжэй да праўды, чым вера сучасных гаспадароў Вільні ў тое, што места, *збудаванае потам і крывёй беларускага і літоўскага народаў*, можа вечна працівіцца і адбіваць "*прыбой зь беларускіх палёў*"?!..

*6 чэрвеня, Вільня*

Атрымаўшы гэты артыкул у праскім прадмесьці Радоцін, Уладзімер Жылка піша Антону Луцкевічу ліст: "Галоўнае, што радуе ў Вашым артыкуле, гэта тое, што мы адзінакава гледзімо на Вільню. Ваша аўтарытэтнае слова яшчэ болей пераконвае мяне, што к вырашэньню "Віленскага пытаньня" прыйдзем толькі нашым шляхам. І яшчэ — веру: зьдзейсьненьне сапраўднае сувэрэннасьці нашага народу, сапраўднае незалежнасьці адбудзецца толькі ў Вільні ці... нідзе. Менск — этап у разьвіцьці і поступе нашае ідэі" (Уладзімер Жылка. Выбраныя творы. — Менск, 1998. С. 274).

1927. Хведар Ільляшэвіч

***

Сіняе, сіняе неба,
Хмарак кудравенькіх раць.
Радасьцю поўныя грудзі —
Я хачу вершы ствараць.
Зьнекуль, здалёка, ў прасторы
Прагрыміць гулкі гул...
Зноў шумам места я хворы,
Быццам сомнабул,

Бачу я Вільні завулкі
У зьзяючых іскрах сьвятла...
Я часта рабіў там прагулкі,
Шукаючы сэнсу жыцьця.
Сьняцца мне бледныя твары
З адбіткам штодзённых клапот...
Газэтчыкі... крамы... тавары
І брудны рабочы капот.

**Хведар Ільляшэвіч** (1910—1948) нарадзіўся ў Вільні, дзе скончыў беларускую гімназію і ўнівэрсытэт.

Верш друкуецца паводле кн.: Недапетая песьня. Жыцьцё і літаратурная спадчына Хведара Ільляшэвіча. — Нямеччына: Вехі, 1982. С. 52.

1927. Хведар Ільляшэвіч

* * *

Вільня,
Рух і шум.
Гудкі і грукат...
Мінуўшчыны, як не было!
такі узрост!
ці думаў твой прапрадзед,
што па бруку тваім памчацца
песьні паравоза...
Зьзяе Вяльля ў электрыкі сьвятле.
Людзкі натоўп і сьціск.
І не на жарты —
Я веру ў тваю будучнасьць,
Цябе калісь абазначаць
на геаграфічных картах!

*Верш друкуецца паводле: Недапетая песьня. Жыцьцё і літаратурная спадчына Хведара Ільляшэвіча. — Нямеччына: Вехі, 1982. С. 62.*

1929. Хведар Ільляшэвіч

Места вагнявокае

* * *

Тысячай сонцаў у шыбах разьліўся заход.
На радыё-дроце...
вароны спраўляюць вячэрню...

Сьвежасьць навейвае вулачны мрок —
Места вячэрняе.
Ў іскрах, што ліжуць блакіт языкамі ракет,
Ў моры людзёў, неўгамонным ніколі...
Чую я нейкі сусьветны прывет —
Вечнае Волі...
*Верш друкуецца паводле: Недапетая песьня. Жыцьцё і літаратурная спадчына Хведара Ільляшэвіча. — Нямеччына: Вехі, 1982. С. 62.*
1929. Хведар Ільляшэвіч
* * *

Вуліцы! Вуліцы! Вуліцы!
Тыя, што давалі мне рытм...
Я хачу сягоньня расчуліцца,
Бо ўспомніў вас, быццам міт.

Доўга вас ня бачыў, замкнёны,
Доўга марыў, марыў я,
Сьнілісь мне шумы і звоны,
Паводка электрычнага сьвятла...

Сягоньня быў шчасьцем абліты я...
Шчасьце — лебядзіны пух...
Бачыў вулкі, калі з паліцыяй
Шоў па бруку, скаваны ў ланцуг.
*Лукішкі*
Верш напісаны ў віленскай турме на Лукішках, дзе па некалькі гадоў сядзелі многія беларускія паэты. Многія і пачыналі пісаць вершы менавіта ў часе свайго арышту. Скажам, Алесь Салагуб толькі ў гэтай турме і быў паэтам, бо пасьля вызваленьня таемна перайшоў мяжу ў БССР, дзе яго схапілі і расстралялі. Характэрная і назва зборніка яшчэ аднаго лукіскага вязьня Валянціна Таўлая -— “Пілую вершам краты”. Падрабязна гэты тагачасны віленскі турэмны “парнас” апісаны ў паэме Міхася Машары “Падарожжа”.
*Друкуецца паводле: Недапетая песьня. Жыцьцё і літаратурная спадчына Хведара Ільляшэвіча. — Нямеччына: Вехі, 1982. С. 62.*

1933. Уладзімер Жылка

Тэстамэнт
27

Бывай, мой ранак срэбраросы!
Бывай, мой дзень клапот, пакут!
Прайшоўшы сьвет разьдзетым, босым,
Пара падумаць і пра кут:
На могілках зацішных Росы
Хачу спачыць ад каламут.
Сачыцьмуць мой спакой найпільней
Муры старой, каханай Вільні.
Гэты фрагмэнт завяршае паэму пажаданьнем паэта памерці ў Вільні і быць пахаваным на могілках Роса. Сьледам за Жылкам спадзеў застацца ў Вільні навечна выкажуць Натальля Арсеньнева і Максім Танк. Аднак ува ўсіх трох выпадках пажаданьне ня зьдзейсьніцца. Жылка пахаваны далёка ў Сібіры, Танк — у роднай вёсцы ля Нарачы, а Арсеньнева — у Амэрыцы.
1933. Міхась Машара
З цыклу “Месту”
* * *

О Вільня! Тваім камяніцам,
Асфальту і бруку твайму
Прыйшоў я ўзноў пакланіцца,
Ізноў табе песьню пяю.

Прыйшоў я з далёкіх ваколіц
Асьнежаных вёсак і ніў,
Дзе вецер-прыблуда сваволіць,
Сьпяваючы сумны матыў.

Тваім хадніком і вітрынам,
Людзям і палацам тваім
Прынёс я Прывет ад Краіны,
Замоўкшай ў чаканьні нямым.

З трывогай глядзяць яе вочы
Туды — у туманную муць,
Дзе казкай сьвятлянай уночы
Агні твае ў неба плывуць.

.....

Па бруку тваім, Вільня, знову
Я гонка стаўляю шагі.
Здаўна мы ўжо крыху знаёмы, —
Табе не зусім я чужы...

Нішто не затрэць успамінаў
З гасьцінных “Лукішак” тваіх...
О, колькі затрулі часінаў
Яны з маіх дзён маладых!

І сяньня, праходзячы міма
Ля гэтых маўклівых муроў,
Ў душу маю сьцюжай магільнай
Дыхнула няволя ізноў.

Я з дрожжу агіды страсаю
З душы гэты сумны налёт
І неяк жахліва хаваюсь
Ў рухлівы людзкі карагод.

Ўваходжу ў рухомае мора
Рэклямы, людзей і машын
Я, сын неабмежных прастораў,
З задумай вясковых пуцін.

Захоплены местам ў няволю,
Па вуліцах шумных брыду
І сьню пра маўклівае поле —
Вясновы спакой маіх дум.
*6 лютага, Таболы*

**Міхась Машара** (1902—1976). Як паэт і літаратар раскрыўся ў міжваенным часе ў Вільні. Друкавацца пачаў у 1927 г. у часопісе “Заранка”. У пачатку 1927 рэдагаваў у Вільні газэту “Наша воля”, быў зьняволены ў гарадзкой турме на Лукішках, дзе праседзеў больш за чатыры гады. У Вільні выдаў зборнікі вершаў “Малюнкі” (1928), “На сонечны бераг!” (1934), “Напрадвесьні” (1935), “З-пад стрэх саламяных” (1937), паэмы

“Вясельле” (1933), “Сьмерць Кастуся Каліноўскага” (1934), п’есы “Вось тут і зразумей” (1933), “Лёгкі хлеб” (1936), “Чорт з падпечча” (1938).
З прыходам савецкае ўлады ў 1939 Машару ўдалося пазьбегчы рэпрэсіяў і выгнаньня, пайшоўшы на шчыльнае супрацоўніцтва з новай адміністрацыяй. Быў дэпутатам так званага Народнага сходу Заходняй Беларусі. За савецкім часам пісаў пераважна прозу пра віленскае жыцьцё міжваеннага часу (раманы “Крэсы змагаюцца”, “Сонца за кратамі”, “Лукішкі” ды інш.).
Міхась Машара быў адным з паэтаў-фаварытаў у міжваеннай Вільні — разам з Н. Арсеньневай і М. Танкам. У ідэйным пляне паміж гэтымі нацыяналісткай і камуністам ён займаў прамежкавую пазыцыю, вагаўся.
*Верш узяты з пэрыёдыку “Родны край”, 25.03.1933.*

1934. Міхась Машара
З цыклу “Падарожжа”
IV

Ўжо блізка Вільня — горы, горы,
Пакрыты густа хвайніком;
Адна з аднэй, як хвалі ў моры,
Бягуць, каб стрэцца зь цягніком.

А між гарамі хаты-цацкі,
Вузкія вулкі і муры,
Як бы з прыгожай нейкай казкі
Абраз, узяты кімсь сюды.

Па вузкіх сьцежках і дарожках,
Куды ні глянь, — што тых людзей!
І пільна кратаецца кожны
Хутчэй пачаць свой новы дзень.

Чуваць настрой і пульс мястовы
Такі рухлівы і жывы,
Зусім адменны ад палёвай
Задумы ў шолаху травы.

Сачу сквапліымі вачамі

За схілам кожнае гары
І бачу — ў далі, між гарамі,
Растуць фабрычныя муры;

І каміны ў вышы над імі —
Плюець у неба хмарай дым,
І чую, ў сэрцы б'е прылівам
Размах юнацкі і уздым.
V

Прадмесьце — хаты, хаты...
Гароды, клюмбы і кусты
Прыбраў зялёны май багаты
І бельлю ўсьпеніў ўсе сады.

Сьвісток! Цягучы і глыбокі
Ў задуму-ціш маўклівых гор.
Вітае нас чырвоным вокам
Ўгару падняты сэмафор.

І замільгалі камяніцы,
Касьцёлы, вежы і муры,
Гара Замковая са шпіцам
І гістарычных тры крыжы.

За вулкай вуліца праходзіць
Зь вясновай раніцай на бруку,
І коскі сонца ў карагодзе
Танцуюць ў скочным рытме руху.
VI

Ляскот гамульцаў па калёсах...
І стаў, задыхаўшысь, цягнік.
Яшчэ раз, Вільня, давялося
Таптаць нагамі твой хаднік.

Уходжу ў вір жывы, кіпучы,
Ў натоўп людзей, паміж валіз,
І, зьліўшысь ўсе рухомай кучай,
Плывём ў тунэль па сходах ўніз.

Гудзіць тунэль адзвонным рэхам —
І шум, і гом, і срыбны сьмех;
Бубняць шагі ў пасьпешным бегу, —
Ідзём ізноў па сходах ўверх [1].

[1] Верагодна, ужо рымскай нумарацыяй разьдзелаў Машара хацеў “зьвязаць” сваё “Падарожжа” з Коласавай “Новай зямлёй”. Як і Колас да яго і Панчанка пасьля, Машара распавядае пра наведаньне Вільні, пачынаючы ад прыезду. Як і ў Коласа, у Машары ўвесь час гарадзкія рэаліі параўноўваюцца з зразумелымі і блізкімі вясковымі.
Віленскі вакзальны тунэль уразіў яшчэ Коласавага дзядзьку Антося. А дачка віленскай мэмуарысткі Зоські Верас спадарыня Галіна Войцік кажа, што, па вялікім рахунку, з даваенных часоў тыя тунэлі мала зьмяніліся. Падобнае ўражаньне перажывае сёньняшні віленец, які ўпершыню трапляе ў менскае мэтро.

VII

А вось і брук твой шэры, Вільня,
Асфальты, цэмэнт і муры...
Узор рэклямы каляровай,
І шум, і гул, і рух жывы.

Таксоўка ластаўкай па бруку
Сноуе з праходу у праход;
А вазьнікі стаяць бяз руху:
Чакаюць сумна на чарод.

І людзі йдуць, праходзяць міма,
Усе з павагай, як адзін.
І зьзяе сонца пералівам
У люстрах вокан і вітрын.

Я — сын бязьмежных даляў поля,
Вясковай цішы і задум —
Іду да места, у няволю,
Лавіць яго рытмічны шум [2].

[2] Вяскоўца Машару, як і дзядзьку Антося, уражвае “павага”, зь якой трымаюцца гарадзкія людзі. Выходзячы на віленскі

вакзал, Машара ў найлепшых традыцыях тагачаснай беларускай паэзіі складае сваю дэкларацыю Вільні — амаль так, як сёньняшні беларус зь Беларусі запаўняе памежную паперыну пра тое, з чым ён сюды едзе.

VIII

О, Вільня, ты для нас ня матка!
І мы як пасынкамі тут:
З тваіх муроў — палацаў гладкіх
Займаем мы апошні кут.

І хоць мы кутнікі у хаце,
Зь якіх сьмяецца гаспадар,
Але тут маем шмат багацьця
І Зьніча нашага аўтар.

І ты сама зь мінулай процьмы,
Ты помніш нас, беларусоў:
Каменнымі сваімі вочмі
Глядзіш на нас зь сівых часоў!

Мы не прыйшлі сюды з-за мора,
Твой воўк жалезны з нашых пушчаў
Забрыў прарочыць гэтым горам, —
Што ты тут вырасьцеш магучай.

Цябе карміла наша поле
І будавалі мазалі.
Ўсе нашы радасьці і болі
Калісь супольнымі былі…

Цяпер ты іншай стала, іншай,
Глядзіш на нас, як на прыблуд.
Мы непатрэбнаю і лішняй
“MniejszoSciA” сталі табе тут.

Але ці хочаш, ці ня хочаш,
Ці як глядзі, ці не глядзі, —
Яшчэ пабачаць твае вочы,
Як будзем тут і мы людзьмі.

Прыліў сялянскі із-за гораў
Ў твае муры прыбоем б’е…
О, Вільня! Мы яшчэ паспорым
Ня раз — з табой і за цябе [3].

[3] Матыў “прэтэнзіі”. У паэтаў ранейшага часу — да 1920-х гадоў — такога матыву яшчэ не было, бо месца Вільні ў беларускім нацыянальным самасьцьверджаньні яшчэ толькі асэнсоўвалася. Тэзы Антона Луцкевіча (“Два цэнтры”), верагодна, яшчэ ўспрымаліся як аўтарскія, суб’ектыўныя. І слова “Вільня” не пісалася яшчэ шырока на беларускіх нацыянальных сьцягах. Першымі гэта зробяць Уладзімер Жылка і Міхась Машара. Праўда, калі ў Жылкі прэтэнзія на Вільню спалучаецца з асабістым жаданьнем жыць у Вільні і быць пахаваным у Вільні, дык для Машары гэта чысты лёзунг і прэтэнзія на Вільню перамежваецца ў яго з шчырым жаданьнем вырвацца з гораду, вярнуцца ў вёску. Пазьней, разам з гвалтам над нацыянальным рухам, разам з сталінскім генацыдам гэты матыў з матыву наступу і прэтэнзіі ператворыцца ў матыў жалю і шкадаваньня па “страчанай Вільні” альбо ўвогуле зьнікне зь беларускай паэзіі.

IX

Хачу спагнацца з рытмам места,
Шагі прысьпешаны мае.
О, людзі! як вам тут ня цесна,
Ў мурох… і нежывой красе?

Каменныя карыты вуліц
Мігцяць, прачнуўшыся, жыцьцём.
Каштан да муру ціха туліць
Зялёны дах над хадніком.

І ўсё ў цьвяту… Каштан і вішня
Ў задуме белай пры муры.
Здаецца мне — прыкрасай лішняй,
Як заблудзіўшысь тут яны [4].

[4] У гэтым месцы Галіна Войцік пратэстуе. Не было на шляху ад вакзалу да Вострай Брамы, куды кіраваўся паэт, ані каштанаў,

ані вішняў:
— Гэта ўжо чыстая паэтыка, — кажа спадарыня Галіна. — Каштанаў не было, галаву даю. А вішняў — тым больш.
У горадзе былі адны ліпы. Каштаны былі ў Бэрнардынцы над Віленкай, і яны ў 39-м вымерзьлі (зіма 39-га/40-га году была вельмі марозная) — ды на Каштанавай вуліцы — яна і цяпер так называецца — там старыя-старыя, вось гэтыя і цяпер яшчэ растуць. Гэта цяпер у горадзе маса розных дрэваў, а тады былі ліпы, адны ліпы…

Там, дзе муры з жалезам дружаць,
Дзе дым, ласкот і гул машын,
Там не жыве, а цяжка служыць
Прастораў вольных вольны сын.

І хочацца сказаць мне гэтым
Каштанам, вішням і людзям,
Засьмягшым тут на бруку летам:
Ідзіце ў поле — воля там!
X

Іду далей… вось Востра-брама.
Зьнімаю шапку (трэба тут).
Малітвай раньняю сабраны,
Каля муроў таўпіцца люд [5].
(…)
[5] Сяргей Харэўскі кажа, што колісь Вострая Брама выглядала зусім ня так, як цяпер: “За часоў Машары яна была пафарбаваная чыста набела. Быў крыж, які зусім нядаўна зьнялі. Літоўскія рэстаўратары адкрылі там абраз Хрыста. Вострая Брама пабудаваная ў 1514 годзе. Мела два абразы: у бок Беларусі абраз Хрыста, а ў бок Вільні быў абраз Маці Божай. Цяпер усё, што мы бачым, зусім іншае. Часта пытаюцца — што там за выява, што за чалавечак, што за тварык пад гзымсам. Гэта выява Гермэса, апекуна гандляроў і зладзеяў. Чаму Брама называецца Востраю? Калі б мы праляцелі над старымі вуліцамі на самалёце, дык пабачылі б, што ўсе яны ўтвараюць абрыс сэрца. І гэты абрыс сэрца — як у картах масьць бубна — упіраецца вострым канцом у гэтую браму”.

XI

А вось старыя Базыльяны, —
Царква й вядомыя муры —
Зь сьвятою надпісьсю над брамай
І ў ёй абраз якісь стары.

За брамай ціш... Настрой вясьняны...
Схіліліс дрэвы над муром.
Дуронік-вецер расьпяяны
Шуміць, паспорыўшы зь лісьцём.

А на крыжох царквы — вароны
Спраўляюць раньнюю імшу.
І са сьцяны Хрыстос стамлёны
Глядзіць пытаньнем мне ў душу.
(...)
XII

Саджусь на лаўцы каля муру,
Кармлю душу спакоем дрэў,
А за мурамі ў даль разгулам
Нясецца места шумны веў.

Спляліся штучныя дарожкі
У засень дрэў каля царквы.
Пясочак жоўценькі, прыгожы,
А на пяску чыесь сьляды.

Калісь хадзіў па гэтых сьцежках
З душой бунтуючай адзін —
Адам Міцкевіч — волат вешчы
Палёў тваіх, о Вільня, сын.

Пяяў тут гімны “прамяністым”
І оды вечна маладым.
Задумай топаль срыбналісты
Шумеў, схіліўшыся над ім.

І вы — старыя Базыльяны —

Яму вязьніцаю былі
І дух натхнёна-расьпяяны
Гасілі краты і муры.
XIII

Цяпер тут ходзяць гімназісты,
Сыны мужыцкае сям'і;
І на пясочку гэтым чыстым —
То пэўна іх відаць сьляды.

Усьцяж іх болей; з кожным годам
Ідзе з палёў прыліў сюды:
Надзея прышлая народу, —
Мы верым ім ужо згары.

Хоць будзе зь іх і рэнэгатаў,
І здраднік, пэўна, не адзін,
Але ў сям'і жыве й гарбаты,
А ў маці ён — нат любы сын.

Цяпер іх дух кіпуч і сьветлы
І сэрца чыста, як крыштал.
Шукаюць: сэнс, дарог і мэты,
Ва ўсім і ўсюды — ідэал.

І ўсё ж на іх надзея наша,
На перамогу ў барацьбе:
Ўсіх душ ня струціць жадна каша,
Бо згіне — зломак і слабы.
(...)
XVI

— Музэй Луцкевіча Івана, —
Чытаю надпісь на дзьвярох,
Жалезам дзьверы акаваны
І ганак крыты у мурох [6].

[6] Гэта яшчэ адзін эпізод, які апратэставала Галіна Войцік. Надпісу на дзвярох не было:
— Не на дзьвярох, а на сьцяне. Дзьверы там былі жалезныя, а на сьцяне там яшчэ і цьвік ёсьць цяпер, на каторым вісела

шыльда.

Званю...
Мне адчыняе дзьверы тыя
Наш знаны крытык — Навіна
(Ня бойся, муза, мы — малыя:
Малых — малая ж і віна) [7].

[7] Навіна — літаратурны псэўданім Антона Луцкевіча, які на той час быў дырэктарам музэю. У апошніх двух радках перададзена пэўная “няёмкасьць” аўтара. Рэч у тым, што А. Луцкевіч на той час быў ушчэнт зганены ў менскім друку як нацыянал-фашыст і лідэр “беларускай санацыі”. Адначасова Машара ведаў, што гэта — паважаны беларускі дзяяч і навуковец, адзін з пачынальнікаў нацыянальнага адраджэньня нашаніўскае пары, прызнаны літаратурны крытык і выкладчык літаратуры. Вось жа два процілеглыя матывы — аўтарытэт камуністычнага Менску і аўтарытэт Луцкевіча — спляліся ў гэтую няёмкасьць.

І прывітаўшысь зь дзядзькам ветла,
Ідзём гуторачы далей.
Ў душы і радасна і сьветла
(Уходжу першы раз ў музэй) [8].

[8] У колішнім Беларускім музэі цяпер кельлі манахаў-уніятаў з Украіны. Па закрыцьці ягоныя экспанаты былі падзеленыя паміж музэямі Літвы. Быццам прадчуваючы страту, Машара зафіксаваў найважнейшыя экспанаты ў сваёй паэме:

Бібліятэка... Колькі кніжак!
Малых, вялікіх і таўстых.
Пяшчу рукой; падхожу бліжай —
Ўсё гэта мудрасьць дзён старых,

Сьляды мінуўшчыны багатай,
І дум, і творчасьці дзядоў;
Жыцьцё і быт — ад шэрай хаты
Да пышных княжацкіх муроў.

Ўсё аб Табе — мой Край каханы!
У кожнай кнізе і радку

Багацьці дум і звон баянаў
Ляжаць, сабраныя ў кутку.

XVII

Пакой другі... На першым пляне,
На століе лапці і гаршкі
(Хаця і сёньнека сяляне
Яшчэ ад лапцяў не ўцяклі).

Там на сьцяне дуда, цымбалы
Спакойна ціхімі вісяць;
Іх час прайшоў,
І сэрцаў сьмелых і удалых
Яны ўжо больш не весяляць.

Каля сьцяны у рад — фігуры,
У рознай постаці, Хрыста:
Сваю душу і лёс пануры
У іх адбіў народ-мастак.

А на стале, з гаршкамі радам,
За тапаркамі — там пад край —
Ляжаць вясельныя прылады
І быццам зь печы “каравай”.

Супроць сьцяна зьмясьціла зброю
Тых слаўных рыцарскіх часоў,
Калі Пагонь была жывою
Ў дружыне вольных Крывічоў.

XVIII

Далей пакой... Зусім другое:
Статут Літоўскі, абразы
І ў шафцы шклянай пад сьцяною
Вісяць Слуцкія паясы;

Князёў пярсьцёнкі і манэты
І шаты, тканы серабром;
Ля іх — здаецца, майго дзеда —
Сівая сьвітка пад акном.

А вось і Твой куток, Іване!
Твой бюст, партрэты на сьцяне
Знайшлі ціхое тут прыстаньне —
Тут часьць душы Тваей жыве.
(...)
XX

Іван, Іван, Сяйбіт вялікі!
Прынёс Табе паклон я свой!
Адзін я з тых, якіх Ты клікаў,
Адзін з адроджаных Табой.

Ля абраза Твайго з пашанай
Стаю ў музэі Тваім тут.
Наш гэты скарб, Табой сабраны, —
Сьляды і славы, і пакут.

Разьбіў Ты ўпорна і трывала
Абраз магутнасьці яе,
І мукай творчай сумавала
Твая душа. — Ці аджыве? —

Спакойным будзь, о Дух Вялікі,
Ня згасім мы Твой творчы зьніч, —
Нядарма Ты будзіў і клікаў:
Яна жыве — і будзе жыць!
XXI

Бывай, музэй! мне трэба далей.
Бывай, Іван і Навіна!
Удзячны я, што паказалі
Мне, як калісь жыла Яна.

Цяпер пайду глядзець другую,
Сачыць сьляды ў віры жыцьця.
Шукаць, прачнуўшыся, — жывую,
З-пад заняпаду-небыцьця.

Іду па вуліцах. Нанова

Зьвіняць асфальты пад нагой;
Як тая хваль да даляў новых,
Плыву і я ў таўпе — з таўпой [9].

[9] Галіна Войцік катэгарычна пратэстуе супраць “асфальтаў”:
— Не было! Пры паляках не было асфальту. Быў брук усюды гэты самы. На праспэкце была пакладзеная чорная базальтавая костка — таксама не асфальт. А вуліца Вялікая Пагулянка — гэта Басанавічаўс цяпер — там гранітная костка, яна і цяпер ляжыць. Гэтая костка вельмі моцная, гэта сапраўдны граніт, грубы такі, толькі што яна досыць сьлізкая, для машынаў дрэнна. Але тады й машынаў не было. Пару аўтобусных ліній было...

Куды, куды ты варушышся,
Ручэй нястрымана-жывы?
Празь дзень, праз два, як ні імкніся —
Дагоніць нас чарвяк малы.

І непатрэбнымі уляжыць
Ў грудзёх і радасьць, і мана,
І як тады камусь адкажам,
Чаго прыходзілі сюда.

XXII

Вось рэстаран — “Зялёны Штраль”,
Каля сталоў “эліта” ўся.
Яны так пэўны, што пазналі
І сэнс, і радасьці жыцьця.

Вакно адчынена... Я бачу
Тлустых аголеных жанчын.
Няшчыры сьмех... Джаз-банд зьвінячы...
Зь юрлівым рогатам мужчын.

І заля пышна так прыбрана:
Каўры, крыштал і серабро...
А колькі красак растаптаных
Тут умірае, — пад сталом!

Ля вокан з вуліцы таўпіцца

Таўпа працоўная людзей:
Глядзяць, — як можна весяліцца;
І дзеці тут —
Ах, адвядзіце ж хоць дзяцей!
(...)
XXVI

Куды цяпер? — Махнём да “Шляху”,
Паклон Язэпу занясём.
Мы пад яго гасьцінным дахам
Ня раз былі ужо гасьцём.

Прыбаў жа шагу крыху, муза!
Шырок і гладак тратуар.
Набок!.. з дарогі! таўстапузы...
Ідзе тут з музай пралетар [10].

[10] “Шлях моладзі” — часопіс, у якім друкаваліся і левыя, і правыя паэты, належаў, тым ня менш, хрысьціянскім дэмакратам, хадэкам. Хадэкамі былі і ўсе супрацоўнікі. Камуністычныя выданьні зьяўляліся і зьнікалі, а хадэцкія выходзілі гадамі. Тым ня менш, у віленскім грамадзтве панаваў стэрэатып, што беларус — ледзьве не сынонім бальшавіка, які не адварочваючы галавы пазірае на чырвоны ўсход. Згадвае Галіна Войцік:
— Самая моцная партыя былі хадэкі. Яны і найдаўжэй выдавалі свае часопісы. Іх менш канфіскоўвалі. І “Крыніца”, і “Калосьсе” — яны ж да 39-га году выходзілі. Было шмат ксяндзоў-беларусаў, прычым беларусаў сьвядомых. А з праваслаўных сьвятароў быў адзін-адзіны Коўш, які змагаўся за беларускасьць…

— Здароў, Міхась! — і бачу... Хведар
Сьмяецца ярка ў вочы мне.
— Здароў, братко!.. ах, каб ты ведаў,
Як я жадаў спаткаць цябе!
— Ці ты адзін? — А дзе там... з музай!
— А разагналісь так куды?
— Ну бачыш, гэта вось трылуза
Вядзе да “Шляху Маладых”.

А што чуваць там на Парнасе?
Ці рушыў “Нёман”? Як “Куток”?
— Кішэнь дзіравы, бачыш, ў Стася,
А наш “Куток” —
Загналі ў самы кут, браток.

Й нічога ў хвалях не відацца,
Як кажуць нашы пэсымісты,
Дык як пяяць? —
І грэх сьмяяцца...
Эх, брат!
Давай — зайдзём, ды вып’ем чыстай.

Бо так жывём!..
Як бы гарох той прыдарожны,
І сум кругом.
— Спакінь яго!..
Ня кратай боль.
Прыпомні наш “Парнас” вастрожны.
— Ты харкаў кроў... —
А быў вясёл?!..

— У нас ў грудзёх ёсьць многа веры
І сілаў знойдзем шмат яшчэ:
І будзень наш — сягоньня шэры,
Хаця ня хоча — расьцьвіце!
XXVII

Давай лепш сьвісьнем на Пэгасаў
Ды зноў да крат махнём туды...
Там часьць душы засталась нашай
І многа дум — за тры гады.

Мінаем, бачыш, пляц базарны,
А вось і гэты мур закляты,
Грамадзкі сорам нашых дзён!
Стаіць пад сумна-жоўтай шатай
Нічым ня ўзрушан і сьцюдзён.

У вокнах краты, краты, краты —

Худыя твары везьняроў...
О людзі!
Навошта гэткі бой зацяты
І столькі мук... і мук братоў?
XXVIII

О ты, вастрог!
Ў сьцянах тваіх панурых,
У час даўгой, даўгой начы,
Вучыўся я змагацца з бурай
І крыльлі тут расьціў душы.

Тут рос мой дух... мацнела вера,
Ў тваіх мурох пазнаў сябе,
І песьню першую нясьмела
Тут прапяяла муза мне...

Вось ён ізноў, сымболь няволі,
Прыют бунтуючых душой.
Я веру — з мук тваіх і болю
Засьвеціць сьвет душы людзкой.

Мне сьмешны вы — о людзі, людзі!
Што ваш вастрог і старажы,
Калі ён вольным вечна будзе —
Ён — Дух!..
І несьмяротны, і жывы.
XXIX

Гэй, гэй! скрылаты наш Пэгасе,
Яшчэ нам службу саслужы!
Узмах адзін — мы на Парнасе,
На тым вастрожным, як тады.

Тут па-старому ўсё, як трэба:
Наўкола мур і будкі дзьве,
Кусочак сіні-сіні неба —
Вартоўнік збройны на сьцяне.

Гарод прыгожых красак... траўка.

Вузкая сьцежачка кругом.
Наўзбоч алька... Пад ею лаўка,
І тры таполі над муром.

Па два у рад, па сьцежцы гэтай —
Як мы калісь — адзін за адным
Усьцяж ідуць да нейкай мэты,
Усьцяж таруюць шлях другім.
XXX

А вось і кут наш гэны слаўны!
І тая “цэль” ў канцы муроў,
Дзе мы, натхненьнем ўсхваляваны,
Ляпілі звонкіх “жаўрукоў”.

І “Веснапесьні” тут радзіліс,
І “Зорны шлях” сьвяціў сюды,
Часамі мы тут весяліліс,
Часамі плакалі з нуды.

Далей “Шанхай” і лёхі тыя,
Дзе спатыкаліся з табой
І думы нашы маладыя
Кармілі песьняй і красой.

Вось на муры, у самым куце,
Мой верш няскончаны відаць:
Якаясь думка аб пакуце, —
Майго пабыту тут пячаць.
XXXI

Стаім...
А міма, доўгаю чаргою,
Праходзяць дні, загінуўшыя тут:
Ціхія, бурныя парою,
Зь сьлядамі ўздымаў і пакут.

Іх многа, многа з шэрым зьместам
І нат бязь зьместу ёсьць зусім —
Калі вастрог бываў так цесным,

Што задыхалісь мы у ім...

За днямі — поступ'ю нясьмелай,
Начэй зь бяссоньніцай паход;
За імі: сум, туга, зьнявера
І дум, і мрояў карагод.

Праходзьце, цені, ў процьму далі!
Мінулі вы... Ўспамін — маўчы!
Навошта кратаць боль і жалі,
Што ўсьцяж крывавяцца ў душы.
XXXII

Але ўжо час далей нам рушыць.
Бывай, вастрог!
Бывай — Парнас!
Істрыць Пэгас ў чаканьні вушы,
Назад, мой пес, вывозь жа нас!

— Бывай, Міхась! — Куды ты, Федзя?
— Выбач, братко, да ўчобы трэ —
І так з табой, Міхась, заезьдзіў
Я тут гадзіны пэўне дзьве...

Бывай, Пэгас!
Ты волен, братка,
Цяпер мы з музай удваіх
Пайдзём далей па вулцы гладкай,
Туды — да "Шляху Маладых".

Адведаць мне прыемна надта
Цябе, Язэпе, дружа мой!
Ў тваім кутку люблю я, братка,
Спачыць і целам, і душой [11].
[11] Сяброўскія радкі Машары пра Хведара Ільляшэвіча і Язэпа Найдзюка выклікалі рэўнасьць Максіма Танка (пра што я скажу ніжэй).

Твае трывогі мне знаёмы,
І хворы мы аднэй бядой.

Чакай! — убачым Яе дома —
І незалежнай, і жывой!
XXXIII

Завальна, — вуліца такая,
Пры гэтай вуліцы ёсьць дом...
Яна гняздо сабе зьвівае,
Вось там —
Пад першым нумаром [12].
[12] Трохпавярховы дом № 1 на Завальнай цяпер не існуе, на яго месцы — сквэр з помнікам літоўскаму пісьменьніку Пятрасу Цьвірку. У міжваенным часе ў прылеглых да гэтага скрыжаваньня будынках месьцілася шмат беларускіх установаў.

І нат ня толькі ў гэтым доме
Відацца тут Яе сьляды:
Іх знойдзем шмат, па месьце цэлым
Растуць, як з дожджыку грыбы.

Хоць мы, наогул, бедны зьместам,
Але ня формай устаноў
(Калі жадаеце, дык, зрэшты,
Іх палічыць я ўжо гатоў):

“Нац-Камітэт” і “Культ-Прасьвета”,
І “Тэ.Бэ.Ша.” —
“Крыніца”, “Край” і “Бел-Газэта”,
І “Самапомач”, і “Пчала”.

Кнігарні тры (хоць кніжак мала),
“Шлях Маладых” і “Інстытут”,
І іншых цэлая навала,
Нат не пералічыш усіх тут.
XXXIV

Друкарня імені Скарыны,
Пакой налева № 3,
Станкі... наборы... стук машыны,
І хварбай пахнуць друкары.

Ня першы раз сюды прыходжу,
Тут ўсё знаёма крыху мне.
Ізноў цябе, Язэп, знаходжу
Ў кутку, за працай, пры вакне.

— Здароў, Язэп!
— Адкуль ты, братка?
— Як бачу, госьць я нечаканы?
— Але жаданы —
Заўсёды ты, Міхась, між намі. —
І я, як трэба, па парадку
Вітаюсь ветла з друкарамі.

— Ну што чуваць?
Ці ёсьць навіны?
І як далей ідзе ваш “Шлях”?
— Брыдзём тэй самай каляінай,
Нялёгка робім кожны шаг.

Але затое саматугам
І незалежны ў працы мы.
— Вяліка ваша, брат, прыслуга
І Ёй — і Маладым.
XXXV

А дзе ж рэдакцыя? Рэдактар?
Куток мне гэны пакажы,
Дзе часта муз якісь аматар
Нас расьпінае на крыжы.

“Мяцежны” зьменіць на “гульлівы”,
І ўсё “зігціць”, “блішчыць” — уміг
І так паправіць “стыль”, матывы,
Што не пазнаеш дум сваіх.

— А вось туды, праз тыя дзьверы,
Калі цікавішся — пайдзём.
Каморка цесна... Сьцены шэры.
Два крэслы, стол,

і кош вялізны пад сталом.

Ах, гэты кош... Кош рэдакцыйны!
Ён мне знаём, — знаём здаўна.
Страшней за чорта, ён праціўны
Для маладога песьняра.

А колькі тут надзей схавана
І думак, кінутых мадзець!
І часам ліра абарвана,
Заледзь пачаўшая зьвінець.
XXXVI

Нясець Язэп мне тэчку з куту,
Вялізна... вагай, можа, з пуд:
— А вось, браток, мая пакута,
Вось колькі вершаў вашых тут.

Саджуся я
І разглядаю матар'ялы...
А колькі тут сабрана іх!
Вяршоў, паэмаў, песьняў, драмаў,
Прыгожых, моцных і слабых.

У кожнай драме, вершу, прозе
Усьцяж Яна — і для Яе,
Яшчэ хтось кажа, што ня зможам
Мы нашых бед у барацьбе.

Вось наймалодшы з нас — Бярозка
І шмат другіх яго гадоў;
Іх песьні — сьветлая дарожка
Паміж расквечаных палёў.

Далей:
Казлоўшчык, Жук, Улад-Ініцкі,
Язэп Вількоўшчык і Бартуль.
Ў запале шчыра паэтыцкім
Кідаюць град скрыдлатых куль.

І Хведар часам тут зьмяшчаець,
Як ў прыстань “Гмахаў-Караблі”,
І шмат другіх... ўсе апяваюць
Яе разгон і рытм жывы.
XXXVII

Але разгледзець па парадку
Язэп ўсяго мне не дае:
— Ты не абедаў, пэўна, братка?
Дык, калі ласка, да мяне...

У кут ізнова гэту тэчку.
— Абедаць? Добра, я — гатоў!
(Ня варта, бачыш, рабіць спрэчку
За пару чарак і бліноў.)

— — — — — — — — — — —
Я апяваць абед ня стану,
Хоць не сакрэт, але ляпей
Ня робіць ім гэтай рэклямы:
Не адаб’юцца ад гасьцей!

— — — — — — — — — — —
І па абедзе як найлепей
Я на тапчан спачыць саджусь,
І доўга гутарым зь Язэпам
Пра працы люд і Беларусь!

— — — — — — — — — — —
XXXVIII

Тапчан зялёны — на пружынах —
Сваей выгодай мне знаём.
(Ужо ня раз я спаў на нём.)
І рыцар гэны без дружыны
(Што мы Пагоняю завём)
Над тапчаном
Таксама добра мне знаёмы
(Работы жонкі Найдзюковай).
XXXIX

Спачыць прыемна — кожны знае,
Хто кончыў працу і зьнямог,
А наш спачынак нас чакае
На узьбярэжжу перамог.

Дык разьвітаемся зь Язэпам
І зноў далей ў вандроўны пуць.
Бязьдзейнасьць ёсьць вялікім грэхам,
А за спачынак — асьмяюць.

Далей, ізноў далей мы рушым;
Адведаць трэба і другіх.
Мы толькі Ёй — працоўнай — служым;
Ня знаем лепшых і благіх.

Ня знаем мы:
Нац-дэмаў і хадэкаў,
Ніякіх “філаў”, ані “ізмаў”,
Усьцяж шукаем чалавека,
Што служыць скрыўджаным і лішнім.

Яму жадаў бы быць я братам
На кожнай сьцежцы і шляху —
І праз жыцьцё ішоў бы разам
І па гарэ, і па лагу.

Але далей!
Вось “Тэ.Бэ.А.” —
Кіруй жа, муза, як прасьцей,
Ты там таксама ўжо была,
І знаеш мейсца і людзей.
XL

Мястовы сад... Нам па дарозе.
Зайсьці? — ну як тут не зайсьці!
Здалёк ён надта ўжо прыгожы,
І томна дрэміць май ў лісьці.

Наўкол прыгожай абгародкай
Зялёны сад абняў тынок,

І дрэмле ціха і салодка
Ў лісьці вясьняны вецярок.

Дарогі, сьцежачкі, дарожкі;
У кожны кут, на ўсе бакі
Пясок ірдзіцца ў сонца косках,
І залаціcты, і мяккі.

І кожны куст пакрыты бельлю,
На кожнай клюмбе красак рой.
Пад дрэвы сьцеліцца мяцельлю
Каштанаў пышных цьветабой.

Людзей няшмат: паненак крыху,
Два-тры студэнты каля іх.
Адных дзяцей тут ёсьць бязь ліку:
І з мамкай, зь нянькай, і самых.

Усе прыбраны надта ладна,
Вясёл іх сьмех і галасы.
І так прыгожы і павабны,
Як краскі гэтыя вясны.

Усе вясёлы і шчасьлівы;
Жыцьцё іх радасьцю зьвініць.
А праз паркан на іх пужліва
Хлапец аборваны глядзіць.
(...)
XLII

Ўжо сонца нізка... У паветры
Ліcткі прахладаю шумяць.
Гадзіньнік звоніць на катэдры —
Гадзіну пятую чуваць.

Далей!
Завернем каля рэчкі,
Праз мост — да “Тэ.Бэ.А.” — туды.
Тут Вільня простае мястэчка,
Гняздо працоўнай беднаты.

Няроўны брук і вузкі вулкі.
Бяз лоску мур... Хаднік — аршын.
І рух ня той — ціхі, ня гулкі,
А крамкі брудны — безь вітрын.

Вось паварот і вулка тая.
Лічу парадкам нумары
І шапкай ветліва махаю
Акну адкрытаму ўгары.

Бягу па сходах... разглядаю
На дзьверах надпісы здалёк:
— Тут “Тэ.Бэ.А.”, — далей чытаю, —
І “Родны Край”, і “Літ. Куток”. —
XLIII

Чуваць, гамоняць за сьцяною,
Бяз спынку гутарка плыве.
Так ручаёк бруіць вясною
І ў даль ваду сваю нясе.

Скрыпнулі дзьверы — мы ў пакоі.
Заціхла гутарка на міг,
І я ківаю ўсім паволі —
Пераглядаючы усіх.

Якраз, чаргой сваёй, паволі,
Як трэ паседжаньне ідзе:
Пытаньні, гутарка, прамовы,
І без чаргі, і па чарзе.

Апошні я ужо пытаю
(Пытаньні скончаны усе):
— Дзядзькі!
А як жа там, у “Родным Краю”,
“Куток” наш рушыце ці не?

Бо песьняроў мы маем многа,
Ім трэ прытулак дзе-нібудзь;

Яны — сьвятляная дарога
У гушчу цёмную і жуць.

Мне абяцаюць “генэралы”
Паправіць лёс “Кутка” і быт.
Ды абяцаюць неяк вяла,
Хоць я таргуюся, як жыд.

Але канчаецца сабраньне,
Дзядзькі гуторачы ўстаюць.
І разьвітаньні — й пажаданьні,
Пара і нам далей у пуць.
XLIV

Далей, далей! — жыцьцё ёсьць рухам!
І так кароткі нашы дні.
Здаўна вядома: той быў зухам,
Хто не праспаў сваёй вясны.

Ўжо ноч на вуліцы мястовай,
Брыду з таўпой па хадніку.
Агні рэклямаў каляровых —
Цьвіцяць, як краскі ў цьвятніку.

Таўпа вясёла і жывая;
Пульсуе бурна рытм жыцьця.
І толькі тут адна чужая
Мая тужлівая душа...
XLV

О, муза!
Ты разбадзялася па Вільні,
А нам далей ў дарогу час.
Чакаюць там нас надта пільна;
Ня верыш — Вось наказ.

На “бачнасьць” хутка, братка, станем
І рукі выцягнем, як трэ,
І перад маленькім “kapralem”
Нічым пачуем мы сябе.

Пайдзём вучыцца быць жаўнерам,
Вучыцца — біць і забіваць.
Так сёньня ёсьць на сьвеце цэлым,
Хаця Хрыстос вучыў кахаць.
*Таболы*

*Друкуецца ў скароце з часопісу “Калосьсе”, 1936, № 1, 2 (5, 6).*

Максім Танк у “Лістках календара” 20/VIII.1936 занатоўвае: “Як і можна было прадбачыць, разгарэлася палеміка з хадэкамі ў сувязі з надрукаваньнем у “Нашай волі” маіх двух крытычных артыкулаў на машараўскае “Падарожжа”. “Шлях моладзі” адклікнуўся досыць правакацыйным адказам Я. Найдзюка, які ўзяў пад абарону М. Машару...”

26/VIII.1936: “Напісаў паштоўку М. Машару пра нашы літаратурныя справы і пра тое, што яго сапраўдныя сябры — не на той старане, дзе арудуюць званары зь “Беларускай крыніцы”, “Хрысьціянскіх думак” і “Шляху моладзі”.

27/VIII.1936: “У “Нашай волі” надрукаваны артыкул Віча (Р. Р. Шырмы). У ім аўтар здорава высьцебаў Я. Найдзюка, які, здаецца, зноў зьбіраецца супраць мяне друкаваць новую сваю піліпіку. Ну і ёлупень!”

4/IX.1936: “Атрымаў пісьмо ад М. Машары. Адчуваецца, што крытыка “Падарожжа” вельмі глыбока яго закранула. Звар’яцеў чалавек на пункце “вольнага паэта”. З гэтай даўно абанкручанай пазыцыі і далей адстойвае сваю паэму. Гаварыў з Паўлікам (Самуіл Малько — кіраўнік камуністычнага падпольля. — **С. Д.**). Пазнаёміў яго зь пісьмом М. Машары. Паўлік крыху пажурыў мяне за востры тон маёй рэцэнзіі. Дамовіліся, каб я ў сваім пісьме запрапанаваў М. Машару прыехаць у Вільню і дагаварыцца зь ім аб супрацоўніцтве ў нашых друкаваных органах.

— Калі сустрэнемся, — гаварыў Паўлік, — мы яго ўгаворым пераехаць жыць зь яго глухіх Таболаў у Вільню. Тут лепшыя будуць умовы для яго творчага росту.

Паўлік ужо гаварыў на гэту тэму зь некаторымі хадэкамі, прапанаваў ім нават пакрыць кошты пераезду, кватэры. Але апошнія нешта ўпіраюцца. Відаць, баяцца, каб паэт, які і так часта бунтуецца супраць іх і бога, зусім ня вызваліўся з-пад іх апекі”.

27/IX.1936: “Ад гаспадыні даведаўся, што заходзіў Міхась

Машара. Шкада, што мы разьмінуліся. Хоць бы сказаў, дзе яго шукаць ці ў каго ён спыніўся”.
30/IX.1936: “Адзначылі нейкі юбілей М. Машары. Я ня быў на гэтай урачыстасьці, якая, здаецца, адбывалася ў цесным хадэцкім асяродзьдзі. Чуў толькі, што М. Машара здорава перасварыўся з арганізатарамі гэтага вечара, а ў рэдактара “Калосься” запусьціў пустой бутэлькай. Беларус поўнай бутэлькай ня кінецца. Трэба будзе пры сустрэчы запытацца ў самога юбіляра. Толькі ўсё ніяк не магу яго злавіць”.

1935. Натальля Арсеньнева
Месячнай ночай

Ноч срэбным пальцам ціха водзіць
па стромкіх пнёх гатыцкіх вежаў
і топіць фрэскі ў белым лёдзе,
і вокны бляскам белым рэжа...

Стаю ў туманным срэбры ночы...
за мною горад празаічны,
няспынны горад плюшчыць вочы —
кругі ліхтарняў электрычных,
цяжарам кол зялезных крышыць
сьлізкі асфальт, дзікія брукі
і сьніць аб месяцы і цішы
пад хрыплы хор мястовых гукаў...
Галосіць радыё ў кавярні,
нястройна енчаць кляксафоны,
клубіцца змрок густы і парны,
мігціць рэклямаў пыл чырвоны,
у нежывым нэонным блеску
плывуць сыльвэткі самаходаў,
у змрочных вулак пералесках
шукаюць дробнае прыгоды...

А ноч... Ноч срэбным пальцам водзіць
па стромкіх пнёх гатыцкіх вежаў,
ноч топіць фрэскі ў белым лёдзе,
вітражы бляскам белым рэжа.
Ноч цягне месячныя зьзяньні,

сплятае ў мост хісткі, узьлётны,
каб ім завесьці ў неба сяньня
натхненна выцягнены готык...
*Вільня*
*Друкуецца паводле: Натальля Арсеньнева. Між берагамі. — Нью-Ёрк — Таронта, 1979. С.67.*
1936. Максім Танк
Вільня

Анучай хмара сьцёрла сонца,
вясеньні першы дождж заплакаў;
на стрэхах і на шэрай гонце
разьліўся вечар сінім лякам.

І ноч прыйшла з прадмесьця вуліц,
палезла на званіцаў вышкі;
сабакам чорным вецер скуліць
пад шэрым мурам, пад лукіскім.

Агні, агні ў вялікіх вокнах
і крык газэтчыкаў, рэклямы,
ды на вясеньнім бруку мокнуць
ад ліхтароў жывыя плямы.

А на пліце цяжкой бэтоннай
дождж гразьзю прозьвішчы заплёскаў...
Баляду віселіц сьцюдзёных
гавора зь ветрам Каліноўскі...

Мо расказаць табе пра нашы
пра барыкады і удары,
пра тых байцоў, што палі ў маршы,
мо расказаць табе, таварыш?

Мо расказаць табе пра заўтра,
пра песьні-сны, што былі ў казках?..
Цішэй!.. ідзе бульварам варта,
і ходзе дождж па бруку гразкім.

Іду, а дрэвы штось гавораць...

аблеплен гразьзю, мокрым сьнегам...
ну дзе ж сягоньня, родны горад,
мяне прытуліш без начлегу?

**Максім Танк**, Яўген Скурко (1912—1995). У міжваенным часе браў актыўны ўдзел у віленскім літаратурным і грамадзкім жыцьці.

*Верш друкуецца паводле: М. Танк. На этапах. — Вільня, 1936, С.45 (Разьдзел "Акварэлі") і М. Танк. Збор твораў. Т. 1. — Менск, 1978. С.98.*

У міжваеннай Вільні статыстычная колькасьць беларусаў і літоўцаў ледзьве сягала некалькіх працэнтаў. Сын Антона Луцкевіча Лявон згадваў, што ня памятае сваіх дзіцячых кантактаў зь літоўскімі дзецьмі, бо іх не было. Не было такіх кантактаў і паміж беларускімі ды літоўскімі правымі. Затое шчыльна супрацоўнічалі беларускія і літоўскія камуністы. Максім Танк быў адным з завадатараў такога супрацоўніцтва, што трымалася на глебе лявацкіх поглядаў і нянавісьці да польскіх уладаў. Згадвае дачка тагачаснага літоўскага віленскага актывіста Ўладаса Дрэмы Гражына:

— Бацька зь сябрамі належаў да левай плыні. Яны ўтварылі групу аднадумцаў — там былі літоўцы, беларусы, колькі палякаў. Самы блізкі сябра Дрэмы, галоўны ягоны паплечнік — Максім Танк. Былі яшчэ мастакі, паэты, пісьменьнікі — Альбінас Жукаўскас, Ёзас Кекштас, Ёнас Каросас, Она Міцутэ, Ян Шутовіч. Друк тады быў вельмі абмежаваны, дык яны рабілі хітра — выдавалі "аднаразовыя" часопісы, якія з кожным наступным нумарам зьмянялі назву. Там была і паэзія, і літаратура, і праблематыка. Дрэма рабіў для іх вокладкі, і таксама пісаў свае артыкулы, і заўсёды дадаваў свае ілюстрацыі — адну, другую. Вось адзін такі нумар — "П'ювіс"… "П'ювіс" па-беларуску — "Серп". Даволі падрабязна пра гэты альманах кажа ў сваім дзёньніку Максім Танк. Запіс 28 чэрвеня 1938 году:

"Ад Ё. Каросаса атрымаў часопіс "Пювіс". Увесь нумар прысьвечаны заходнебеларускай літаратуры. У перакладах В. Жвайгждраса, І. Кекштаса і А. Жукаўскаса надрукавана вялікая падборка вершаў, артыкул В. Русакайтэ аб маёй творчасьці і нарыс У. Дрэмы пра беларускае мастацтва, некалькі рэцэнзіяў І. Кекштаса і Ё. Каросаса… Агулам, нумар "Пювіса" — харошы братэрскі падарунак ад нашых літоўскіх

сяброў і яшчэ адна прабоіна ў сьвет — прабоіна ў сьценах нашай адзіночкі".
Апісаньне Танка сьведчыць пра тое, што натаваў ён гэта або з надта даўняе памяці, або з поўнага неразуменьня літоўскае мовы, або зь нечага пераказу. У "П'ювісе" няма артыкулу аб ягонай творчасьці. Уладэ Русакайтэ падае пераклад імпрэсіі "Шляхамі і вёскамі" самога Танка. Няма тут і "некалькіх рэцэнзіяў" Кекштаса і Каросаса, а ёсьць толькі адзін водгук — на кнігу Оны Міцутэ, якая, дарэчы, пераклала большасьць беларускіх вершаў у "П'ювісе", але Танк яе сярод перакладчыкаў не называе. Хоць саму Міцутэ і яе кніжку ён добра ведаў і згадваў у дзёньніку неаднаразова. Затое нумар адкрываецца артыкулам Вітаўта Тумаша — у будучыні буйнога эмігрыйнага навукоўца, якога Танк у савецкай публікацыі дзёньніка згадаць ня мог. А гэта даволі грунтоўны агляд беларускай літаратуры ў тагачаснай Польшчы. З падобных прычынаў ня згадвае Танк і вершу Натальлі Арсеньневай, які пераклала Она Міцутэ.

1936. Вінцук Адважны
На магілу Сваяка
(Задушкі на Росе ў Вільні ў 1936)

Памёр Сваяк: ўсе летуценьні
Забраў з сабой. Тут — толькі цені...

А над магілай дрэвы шумны,
А на магіле камень сумны, —
Дый у магіле адзінока
Ляжыць наш Лірнік — сьпіць глыбока.
Ён сьніць тут пра зямельку родну.
Сваяцкі дух, аднак, свабодны —
Хваробай цяжкай не зламаны
І ў путы сьмерці не скаваны;
Жыве, красуецца — ён вечан —
Магільным каменем ня згнечан.

Але ў ціхі асеньні вечар,
Калі ледзь-ледзь калыша вецер
Лісткі пажоўклыя бярозы;

Калі зь ліcткоў расінкі-сьлёзы,
Як сьветлячкі, як зоркі зь неба,
Зьлятаюць ціха, — тады трэба
Прыйсьці на Росы...

То не ліcткі нам тут гамоняць —
То струны слаўнай “Ліры” звоняць.
Не салаўіны пералівы —
То Сваяковы песьні-дзівы —
Тых псальмаў гутарка павабна —
Зьвіняць так мякка, так ядвабна.
А то арганам загалосяць;
Або, як скрыпка, ласкі просяць;
Або як звон — зямля трасецца —
Заціх ён — толькі рэха льлецца...

*

Гэй, падарожны, падзівіся —
Стань тут, глыбока пакланіся!

*

Хоць цьвёрды камень спарахнее,
Пагінуць дрэвы, цела стлее,
Хоць Росы будуць зь зямлі зрыты,
А людзі слаўныя — забыты, —
Сваяк, мой Друг, ляжыць бясьпечна,
Бо “Ліра” граці будзе вечна!

**Вінцук Адважны**, Язэп Германовіч (1890—1978). Скончыў Віленскую духовую сэмінарыю, быў сьвятаром. Верш прысьвечаны паэту-сьвятару Казімеру Сваяку, што пахаваны на могілках Роса.

*Друкуецца паводле: Вінцук Адважны. Байкі. — Лёндан, 1973.*

1936. Янка Купала
Якубу Коласу

Ды веру: хутка, незадоўга,
У непрымушанай ахвоце,
З табой нябеснаю дарогай

Мы паляцім на самалёце.

Мы паляцім над Нёман сіні,
Над бор, ад князя ўжо свабодны,
Заглянем, хто жыве ў хаціне,
Дзе жыў ты, брат, з жыцьцём нязгодны.

Стуль паляцім мы і да Вільні,
Дзе хлеб і соль дзялілі спольна,
І ўсё агледзім вокам пільным
У Вільні, ўжо савецкай, вольнай.
*Кастрычнік*
Фрагмэнт вершу, дадзены як узор сацрэалістычнай паэзіі.
Друкуецца паводле Поўнага збору твораў (Т. 5. С. 88).

1937. Максім Танк
У Панарах

Недзе плачуць калёсы за бродам,
Нізка зьвіс неба сіні дыван.
Цераз ноч на агонь мой з усходу
Драмадэраў ідзе караван.

Ён мінае даліны сівыя,
Каб шлях зорны з вачэй не згубіць.
І ўдаль цягнуцца доўгія шыі,
І чарнеюць крутыя гарбы...

— Гэй, з усходу ўжо шлях залаціцца!..
Не мінуць вам да сонца граніц!
Беларускіх зямель і крыніцаў!
Ці ж ня лепш затрымацца, спачыць?..

Вось палае ўжо золак пажарам,
І на месцы, дзе быў караван,
Бачу я — верхавіны Панараў
Выступаюць праз шэры туман.
*Друкуецца паводле: М. Танк. Збор твораў. Т. 1. — Менск, 1978. С. 237.*
1938. Хведар Ільляшэвіч

Прыяцелю

Помніцца вечар той сіні...
Вецер вясеньні нам словы размыў —
Ў вулках маленькіх Вільні
Гаварылі да поўначы мы.
Места, дзе сны адцьвіталі нам,
Мачыхай злоснай здалося тады...
Хутка так ніклі хвіліны,
Як на станцыі ўсхмараны дым.

У хвалях кіпучага сьвету
Ты на чужыне, няведамы, зьнік...
Ды ў далёкіх прасторах,
Як і тады ў акне цягніка —
Прыязьні нашай задорам
Перапоўнена так жа рука.
*Публікацыя з кнігі: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С. 53. Верш прысьвечаны Алесю Салагубу.*
1939. Янка Купала
Еду сягоньня я ў Вільню...

Менск, Маладэчна, Вільня...
Як жа знаёмы шлях гэты!
Зьмерыў яго я калісьці,
Як шукаў шчасьця па сьветах.

Колькі ж ні ехаў туды я,
Ці то ў мароз, ці ў разводзьдзе,
Царскі жандар мяне тупа
І спатыкаў, і праводзіў.

*

Ехаць прыйшлося нядаўна,
Год таму тры ці чатыры, —
Тыя ж убогія хаты,
Тыя ж ля хат камандзіры.

Бачыў, як тамка пасьліся
Сьвіньні ў чужым агародзе.

Польскі жандар мяне тупа
І спатыкаў, і праводзіў.

*

Еду сягоньня я ў Вільню
Сьледам за арміяй нашай, —
Царскім і польскім жандарам
Думак дарога ня страша.

Сум недзе згінуў кашмарны,
Жудасьць па хатах ня бродзіць,
Кветкамі дзеці й дзяўчаты
Нас спатыкаюць, праводзяць.

*Верасень*

Гаворка ідзе пра “вызваленчы паход Чырвонай арміі”, у выніку якога адбылося ўзьяднаньне Заходняй і Ўсходняй Беларусі, а Вільня была перададзеная “буржуазнай” Літве. Яшчэ адзін сацрэалістычны верш з Купалавага даробку.

*Паводле Поўнага збору твораў (Т. 5. С. 156).*

1943. Натальля Арсеньнева
Вечар у Вільні

Расплёў, разьмёў віхор пярэстых хмараў дым...
Дзень адпаўзае ў зьмерк вузкіх завулкаў лазам...
І вее на мяне з кутоў, з муроў рудых
Сівым, як даўніна, даўно забытым сказам.
Мне чуецца ці сьмех, ці плач, ці штось яшчэ
ў сымфоніі ціхой вячорных гукаў места.
Лязом мяча Вяльля спрабуе заблішчэць,
і полымя зары Пяркуна хорам песьціць.
Над дахамі, у выш узьняўшы бель крыльля,
стаіць, усё ў вагні, Трохкрыжжа на старожы,
і кленчыць перад ім лясоў лілёвых шлях
ды налітыя ймглой далечы бурых пожняў...
Як тут люблю я ўсё:
чырвоны вулак брук
і залатым пяском асыпаныя дахі...
Манюся тут сваю апошнюю зару
я сустракаць,

адсюль —
пайсьці адвечным шляхам.
Але пакуль жыву — хоць дзе, — цяжкім каўшом
хачу я піць жыцьця і мёд, і навет дзёгаць.
Хачу, каб лёс мяне на шумных кірмашох
вадзіў,
вадзіў,
вадзіў,
як лерніка сьляпога.
Верш напісаны перад эміграцыяй у Нямеччыну, адкуль паэтка пераехала ў ЗША.
*Друкецца паводле: Натальля Арсеньнева. Між берагамі. — Нью-Ёрк—Таронта, 1979. С. 133.*
1943. Алесь Салавей
Францішак Скарына

У месьце Вільні, у цішы ад бруку,
у шэрым замку, думна-самавітым,
ў пакоі сьціплым, даўніной спавітым,
я зь ім спаткаўся без размоў, бяз гуку.

Стагодзьдзі пылу я страсаю з друку,
між літар бачу зрокам прагавітым,
як людзям простым, людзям паспалітым
зы словам нёс ён праўду і навуку.

Зь бязьмежнай прорвы тхленнага зьмярканьня
падняў радзіму дух яго глыбінны...
Гартай балонкі мудрага выданьня:

Радкоў чырвоных краскі і галіны,
паўмесяц, сонца — як вянок адзіны,
як непагаснасьць вечнага сьвітаньня!
***Алесь Салавей**, Альфрэд Радзюк (1922—1978). Верш напісаны перад эміграцыяй у Нямеччыну, адкуль паэт пераехаў у Аўстралію.*
*Паводле: Алесь Салавей. Нятускная краса. — Нью-Ёрк—Мэльбурн,1982. С. 75. Фрагмэнт трыпціху “Гуманізм”.*
1943. Міхась Козыр
Замак Гедыміна

Грозна, думна з гары пазіраюць муры —
Помнік слаўных часоў Гедыміна,
Шмат пражыў чалавек. Не адзін мінуў век,
Сьлед пакінуў на шэрых руінах.

Засьцілае туман у падножжа твой стан,
Вецер дрэўца нясьмела калыша,
Бачыў войнаў ты шмат, ды ня ведаеш, брат,
Што дваццаты ў гісторыю ўпіша.

Кажны вогнены час, калі доля ад нас
Пажадае ахвяр для змаганьня,
Мы ўпрыгожым крывёй, — будзе сьведкаю той,
Чыя слава як сымбаль нам стане.
*19 лістапада*
**Міхась Козыр,** Аляксандар Качан (1926), больш знаны як Кастусь Акула. Камэнтатар ягонае творчасьці паведамляе: “Юначыя вершы друкаваныя ў беларускіх газэтах у 1943—1944 гадах, калі ў Аляксандра Качана зьявіўся першы літаратурны псэўданім — Міхась Козыр. Тады ж ён упершыню даведаўся, што такое цэнзура. Калі ў “Беларускім голасе”, які лацінкаю выдаваў Францішак Аляхновіч, быў апублікаваны верш Козыра “Прывітаньне Вільні”, ён прынёс сямнаццацігадоваму аўтару ня ўсьцеху, а горыч: нямецкі або летувіскі цэнзар зьняў цэлую страфу:

Прывітаньне табе, Вільня!
Слаўны горад Крывічоў, —
Места памятак магільных
Нашых прадзедаў, дзядоў”.
Верш “Замак Гедыміна” напісаны перад эміграцыяй на Захад. Друкуецца паводле: “Баявая Ускалось”. — 1949. №1 (ліпень).

1944. Алесь Салавей
Сад
(Да 25-годзьдзя Віленскай беларускай гімназіі)

Раней за нашай вёскаю быў сад...
Ніколі так ягоных строяў шаты
ня ўшчульвалі мяне і мой пагляд,

як у адну вясну, калі на сьвяты

я ў вёску завітаў. І чуў — ад хат
плыў гоман; ён мае пачуцьці кратаў:
“Сад гэты дваццаць пяты год падрад
вясной цьвіце, і дасьць ён плод багаты...”

Расьцьвіў і ты у дваццаць пяты год,
навукі сад, глыбокай веды цьветам.
Багаты будзе дваццаць пяты плод

і верны ўзгадавальным запаветам.
Ён панясе для ўжытку і для ўцех
сьвятло навукі да крывіцкіх стрэх!
*20 студзеня*
*Паводле: Алесь Салавей. Нятускная краса. — Нью-Ёрк—Мэльбурн. — 1982. С. 21.*
Віленская беларуская гімназія была створаная ў 1919 і праіснавала 25 гадоў. Яна стала адным з найбольш плённых нацыянальных праектаў у ХХ стагодзьдзі. Напрыканцы другой сусьветнай вайны яна і Віленскі беларускі музэй імя Івана Луцкевіча былі апошнімі беларускімі ўстановамі ў Вільні. Пасьля іх закрыцьця арганізаваная прысутнасьць беларусаў у горадзе перапынілася больш чым на сорак гадоў. Інтэлігенцыя, на якой трымалася адраджэнская праца, была дачыста вынішчаная або высланая ў ГУЛАГ. Тыя, каго выпадкова абмінула хваля рэпрэсіяў і каму пашчасьціла выжыць у часе вайны, падаліся ў эміграцыю. Лічаныя адзінкі, што засталіся ў горадзе пасьля вайны, былі пазьбіраныя новаю хваляй бальшавіцкага перасьледу.
1944. Алесь Салавей
Ля Войстрай Брамы

І прашчуры схілялі тут галовы...
Мінаю я праход Яе сьвяты,
а вусны шэпчуць дабравесьця словы:
— Сьвятая Ты!

За Ёй — і старадаўная сталіца
мае радзімы ў чарах пекнаты.

Ізноў табе прыехаў пакланіцца:
— Сьвятая Ты!
*5 сакавіка, Вільня*
*Паводле: Алесь Салавей. Нятускная краса. — Нью-Ёрк—Мэльбурн. — 1982. С.76.*
1944. Алесь Салавей
Вільня

Пазалаціў сутункі зьзяньнем зь неба месяц — медны звон.
Прыціхла Вільня. Змоўклі, сьцятыя струшлівым часам, вулкі.
У небе — іхны гаспадар. Здалося, скалыхнуўся ён,
наўкольле зварухнуў ягоны гоман валадарны й гулкі.

Сьвятыні Вільні ўзрушылі спакой. Загаманіла ціш.
У кажным хораме — мне чутна — водгук векапомны звоніць.
І тупат конскіх ног ад брукаў места думна ўзьняўся ў выш,
гул неўгамонны ажывіў сьляды сугоннае Пагоні.

Найдаўны сьлед ня сплыў з улеваю часоў і не сплыве,
і не зацьміць яго руіны дым — цяпершчыны аблічча.
Дзе ні ступні, куды ні глянь — яна, мінуўшчына, жыве,
сугоднай прозьвесьцяй званоў і вабіць да сябе, і кліча.
*12 красавіка, Вільня*
*Паводле: Алесь Салавей. Нятускная краса. — Нью-Ёрк—Мэльбурн. — 1982. С.77.*

1944. Уладзімер Дудзіцкі
Вільні

Упершыню сустрэў твае муры,
крутыя вулкі, вуліцы, сьвятыні...
Ў душы ня стлее ўцеха, не згарыць —
абудзіцца мацней і сьлед пакіне.

З драбніцай кожнаю ураньні, уначы
маліўся срэбру зорнаму і небу.
І гэта быў душы мае спачын,
спачын душы, пітво і солад хлеба.

І ціш сівое Вільні, і вятры,

густыя, кволыя заўжды такія,
усьцешаць прышласьць іншае пары
і сьлед у сэрцы, у душы пакінуць...
*Травень, Вільня*
**Уладзімер Дудзіцкі**, Уладзімер Гуцька (1911—?). Верш напісаны перад эміграцыяй на Захад. Пасьля вайны паэт выехаў зь Нямеччыны ў Вэнэсуэлу, дзе яго сьляды губляюцца.
*Першая публікацыя: Biełaruski Hołas. — Vilnia. 1944. 12 tr.*
*Друкуецца паводле: Ул.Дудзіцкі. Напярэймы жаданьням. — Нью-Ёрк, 1994. С. 77.*
1945. Максім Танк
Вільнюс

Я гэты горад знаю з даўніх дзён,
Дзе дрэмлюць замку гордыя руіны,
Дзе ўзьняў густое вецьце ясень, клён
Над сном акамянелым Гедыміна;
Дзе пад аркадамі сівых муроў
Праходзяць цені вулкамі вузкімі:
Пясьняр Літвы, наднёманскіх палёў,
У падарожным плашчы пілігрыма,
І Каліноўскі, і таварышы...
Я чую голас іх у змроку шэрым,
Я чую, як Вяльля ў начной цішы
Бароў прадвечных падмывае бераг.

І хоць навіслых камяніцаў сінь
Начэй нямала беспрытульных туліць,
А ў збуджаным напеве — успамін:
Яшчэ ня ўсё балючае заснула,
Яно на кожным кроку устае,
Гарыць у верасьнёвай пазалоце,
Дзе вецер песьні першыя мае
Рваў на Лукіскім, на калючым дроце, —
Усё ж люблю я гэтых вуліц гул,
Граду Панар, высокі золак раніц
І маладосьць, абвітую ў тугу,
Якой у вочы можна сьмела глянуць.

Я гэты горад знаю з даўніх дзён.

І кожны раз мне новыя старонкі
Суровай былі адкрывае ён,
Запісанай на камні вежаў звонкіх.
І я чытаю пыльныя радкі,
Ў якіх вітае сьветлы дух Скарыны,
І устаюць мінулыя вякі
І слаўныя краіны гадавіны.
Вось абэліск узьняўся, як прамень,
Над Чарняхоўскім, над магілай паўшых,
І словы Сталіна палаюць ноч і дзень
Аб дружбе брацкай і аб славе нашай.

Я гэты горад знаю з даўніх дзён.
І каб ня хвойны пах бацькоўскай хаты,
І каб не нарачанскай хвалі звон
Ля курганоў, ля сосен расахатых, —
Хацеў бы я, каб мой апошні сьпеў
Тут, сярод гэтых незабыўных вулак,
Дзе ўпершыню ён гулка празьвінеў,
Знайшоў спакой і вечны свой прытулак.
*4 сьнежня*

Пасьля другой сусьветнай вайны Танк стаў пасьлядоўна называць Вільню Вільнюсам. Але ў цэлым у беларускай паэзіі такое “перайменаваньне” не прыжылося. Назва “Вільнюс” па-беларуску мела каляніяльны характар, бо ў часы БССР была ўзятая з “мэтрапольнае” расейскае мовы і адмаўляла ўласную гістарычную традыцыю. Такую назву прынялі ўсе народы, якім гэты горад генэтычна чужы. Палякі, да прыкладу, ніколі не адмаўляліся ад свайго найменьня “Wilno”. Зрэшты, і літоўцы ніколі не зьмянялі сваіх уласных назваў беларускіх гарадоў: Горадню завуць “Gardinas”, Наваградак — “Naugardukas”. І толькі беларусы з усіх народаў, якім належыць віленская спадчына, праз тое “перайменаваньне” апынуліся сярод тых, якім яна... не належыць. Яшчэ можна зразумець, чаму так было за савецкім часам, пад прымусам. Але сёньняшняе адмаўленьне — добраахвотнае і разбуральнае для нашай культуры. Да прыкладу, Іван Шамякін бяз задняе думкі піша, што Янка Купала з Чурлёнісам жылі ў адным доме “ў Вільнюсе”. Насамрэч гаворка ідзе пра той час, калі слова “Вільнюс” яшчэ не было і калі самі літоўцы называлі горад Вільняю. Чэслаў

Мілаш зьвяртае ўвагу на тое, што літоўская назва “Vilnius” упершыню зьявілася ў 1918 годзе.
У Танкавым вершы зьмененая назва гучыць парадаксальна ў зьвязку з апошнімі радкамі. Аўтар нібы падкрэсьлівае, што “Вільнюс” — горад чужы, а ў апошніх радках выказвае вельмі патрыятычнае паводле інтанацыі жаданьне менавіта тут знайсьці свой вечны спачын.
У пазьнейшых выданьнях Танк прыбраў згадку пра Сталіна. Аднак у гэтай Анталёгіі падаецца першапачатковы варыянт — як храналягічна і эстэтычна адпаведны часу напісаньня.
*Друкуецца паводле: Максім Танк. Выбраныя творы. — Менск, 1952. С. 162; Збор твораў Т. 2. С. 33.*

1946. Пімен Панчанка
Сустрэча зь Вільняй
1

Працуеш, спрачаешся, ходзіш, жывеш,
Стаіш у чарзе за пайком —
І раптам няскончаным кідаеш верш
І свой абыдзённы дом.
Захопіш блякнот, папяросы, ручнік,
Ускочыш на грузавік;
Пакінуўшы цень у люстэрках вітрын,
Мінуўшы піўныя ларкі,
Нырнеш з галавой у густыя вятры,
У мора бяроз і ракіт.
І стане адразу душа маладзей,
І сэрца заб’е гарачэй.
І, ўбачыўшы першы наіўны ручэй,
Адчуеш сябе шчасьлівейшым зь людзей.
Дарога ляжыць для цябе аднаго.
І сонца гарыць для цябе аднаго.
Ты весела дзівішся кветцы малой,
Як літары першай у школе,
І пэцкаеш пальцы салодкай смалой,
Сарваўшы галіну з таполі.
Прасторна, зялёна і хораша так,
Што ты, маладосьцю багаты,
Глядзіш абы-як на раструшчаны танк

І з хваляваньнем — на новыя хаты.
Ня шкода ні сіл, ні крыві, ні гадоў,
Што недзе на фронце пакінуў,
Абы толькі бачыць між ніў і садоў
Вось гэткай шчасьлівай краіну.
Імчышся па звону сякер і бяроз,
Па травах, расе, пілавіньню, —
Пакуль разматае клубок доўгіх вёрст
Твой шофэр маўклівы і скажа: “Прывёз!”,
І ты апынешся у Вільні.
2

Уражаньням гэтым ніколі ня выліняць,
Як зорам ня выліняць і праменьням.
Даволі сказаць мне, што бачыў я ў Вільні, —
І шапкі вы здымеце ад захапленьня.

Тут зьбеглася многа дарог і стагодзьдзяў,
Трагедый, і славы, і ярасных спрэчак.
Тут нашы народы — суседзі — знаходзяць
Свае успаміны і прадзедаў рэчы.

Вось дом, дзе Мамоніч наладзіў друкарню.
Тут “Наша Ніва” цьвіла. Вунь “Лукішкі”,
Дзе ў песьні надзей белапанскія карнікі
Кулямі білі з турэмнае вышкі.

Вось плошча, якая адна памятае
Апошні удар Кастусёвага сэрца.
Вось Вострая Брама, па казцы — сьвятая,
А там Вілія пад мастамі нясецца.

Над ёю, як нейкаму Богу падзяка,
Гара з Гедымінавым замкам ўзьнялася.
Сюды на экскурсію Коласаў дзядзька
Ў мінулым стагодзьдзі, як я зараз, лазіў.

Сьлядоў тут нямала пакінуў народ наш,
І кожны у Вільню ўлюбёны па праву —
Літоўцы завуць яе песьняю роднай,

Сваёю сталіцай, і сэрцам, і славай.

Ня будзем спрачацца за камні і вежы:
Мы зьвязаны дружбай і доляй супольнай.
Аб нашай і вашай пішу свае вершы,
Аб Вільні вялікай, бясьсьмертнай і вольнай.

Стаў родным і будзе да скону гадоў мне
І воблік яе незабыўны, і колер.
Я здолеў бы выдумаць горад цудоўней,
Але вось такі — прызнаюся, ніколі.
3

Ледзь занімаецца зара,
Гудкі яшчэ маўчаць.
Я ўстаў і вырашыў: пара
Мне Вільню вывучаць...

Гадзін пятнаццаць вывучаў.
Ды крыўдна за адно:
Што горад з раніцы пачаў
Вадзіць мяне за нос.

Як толькі спадзяваўся: ну,
Тут, пэўна, цудаў шмат, —
Мне Вільня ставіла сьцяну —
Гані хутчэй назад.

Калі ж я думаў: тут пуда,
Зноў нейкая сьцяна, —
Якую шыр, якую даль
Паказвала яна.

Як прыгажуня, пакрысе
Свой раскрывала твар
І абяцала: шчэ ня ўсе
Табе паднесла ў дар

Свае я цуды. Сам бяры,
Ня злуй і не гаруй...

Ляпей за ўсё відаць з гары —
Палезу на гару.

Мінуўшы тысячы аркад,
Дзе рэха, нібы гром,
Убачыў: пеніцца рака,
Выдатны вадаём!

Над ёй гара. Узьлез. Вось тут
Жыў знаны Гедымін.
Ну й будаваў. Сьцяна — зь вярсту
Утоўшч. Нібы ад мін

Ці бомбаў думаў захаваць
Мінуўшчыну сваю.
На вежы, што зусюль відаць,
Як Гедымін, стаю.

А навакол такі прастор!
Ды разьбірае злосьць:
Касьцёлаў, цэркваў, пэўна, сто
На дзьвесьце вуліц ёсьць.

І хоць няма да іх мне спраў,
Але глядзі, ня злазь —
Дзе Пётра І будаваў,
А дзе літоўскі князь.

Вунь Трохкрыжовая гара.
І як ты ні кружы —
На ёй пад промнямі гараць
Дакладна тры крыжы.

Гатычных вежаў не зьлічыць,
Таму й здалося мне,
Што Вільня ціха, мірна сьпіць
Ў гісторыі на дне.

Але ўсё гэта толькі зман
І мімалётны сон:

Растаў мінуўшчыны туман
Пад сонцам нашых дзён.

Яно аднолькава гарыць
Над Вільняй і Масквой.
Мае літоўскія сябры
Адновяць горад свой...

Ну, думаў, вывучыў дарэшт,
Ды трапіў у Закрэт.
І Вільня з гэтых слаўных мест
Раскрыла зноў сакрэт.

Такіх магутных гонкіх хвой
Нямнога на зямлі.
Адна дастала галавой
Да сонца. І плылі

(Я падлічыў) сто дзесяць хмар
Паміж яе гальля.
Раскошы гэтакай няма,
Відаць, і ў караля.

Бо з ласкі шчодрае зямлі
Тут кожны атрымаў
Па сто хваін, па дзесяць ліп,
Па моры чыстых траў.

Рака імкнецца у прасьцяг,
Сьвідруючы віры.
І я убачыў зноўку сьцяг
На Замкавай гары.

А Вільня нейкі ўжо другі
Паказвала свой бок,
Яшчэ больш слаўны, дарагі.
Прыгожа, далібог!

Глядзіш і верыш: на зямлі,
Ўсім скептыкам на злосьць,

Мадагаскар і Самалі
Абавязкова ёсьць.
4

Вулка вузкая, крывая,
Запалоненая бэзам.
Тут вільнянка пражывае.
Значыць, стой, машына. Зьлезу.

Гэтак чыста, гэтак ціха,
Чынна, сонна, старажытна,
Хоць ты рухайся на цыпках,
Грукнуць ботам сьцеражыся.

Хмель на сьценах. Бэз калматы
Мірна сьвеціць на гародах.
Тут бы нашым добрым маткам
Дажываць сівыя годы.

Толькі мне незразумела
(На цябе ледзь не абуран),
Як сюды ты заляцела
Са сваёй натурай бурнай.

Мне б у дзьверы стукнуць моцна,
Каб хутчэй ты з хаты выйшла,
Толькі боязна спалохаць
Старамоднае зацішша.

А сустрэўшыся са мною,
Ты зламала ўсе законы
Праснаватага спакою,
Ідылічнасьці зялёнай.

Ці ад слоў тваіх гарэзных,
Ці ад выразаў дасьціпных —
Праясьнелі вочы бэзу,
Хаты ў цень адбеглі сьціпла.

Уступіла месца зорам

Па сваёй ахвоце сонца.
Загадала ноч у горах
Салаўям сьпяваць бясконца...

Я ня знаю, ці кахаю.
Пэўна, не. Але тады
Паблукаў я побліз раю
Першы раз за ўсе гады.

Мне б сказаць табе той ноччу
Нешта шчырае да мукі;
Цалаваць да болю вочы,
Вусны піць і лашчыць рукі.

Ды таму, што месяц таяў
Вельмі соладка ў тумане
І былі усе дэталі
Запазычаны з раманаў,

А пэйзаж начы клясычнай
Выхваляўся добрым густам, —
Па сваёй звычайнай звычцы
Гарадзіў я толькі глупства.

Нам, напэўна, не спаткацца,
Ды яно і не патрэбна.
Толькі душны пах акацый,
Сонны шолах ліп і вербаў

Адгукнецца, знаць, у вершах
Невыразнаю тугою...
Быць табе з другім і лепшым,
Быць мне з горшаю, з другою.
5

Я сто гадоў ня езьдзіў на рамізьніках
І думаў — яны здадзены ў музэй.
Ды давялося вось: мяне вязе
Кульгавы конь, якому сена трызьніцца.

Вазьніца, хваравіты і стары,
Змрок сьцёбае ляніва чорнай пугай.
Ледзь-ледзь падзьме — і сыпяць белым пухам
Каштаны на скупыя ліхтары.

А Вільня сьпіць. Падковы гулка цокаюць.
І мне здаецца, быццам еду я
Ў той даўні век, калі яшчэ Баян
Пускаў пад зоры стаю песьняў-сокалаў.
6

Не трымаю у сакрэце
(Кроў хвалюецца у жылах):
Над Вяльлёю у Закрэце
Мне цыганка зваражыла,

Быццам я дзяўчыне нейкай
Абяцаў багацьця рэкі,
А на справе — ручаіны
Я ня вырыў для дзяўчыны.

І цяпер дзяўчына тая
Па грыбы ў адчаі ходзіць.
Далібог не памятаю
Я аб гэтакай прыгодзе.

Наманіла ты, цыганка,
Пра мяне. У кожным разе,
Я падобнай абяцанкай
Шчэ нікога не абразіў.
(...)
7

Аб гэтым вясноваю ноччу прысьніцца,
Пракоціцца ў памяць песенным рэхам.
На віленскі бэз, на віры, на званіцы
Цярушацца зоры рубінавым сьнегам.
Мне заўтра на золаку зноў у дарогу.
Пара адпачыць, ды чамусьці ня сьпіцца.

Праўдзіваю думай, няяснай трывогай
Хацеў бы я, Вільня, з табой падзяліцца.

Заўсёды, як гляне даўніна сівая
У вочы, нібыта настаўнік суровы,
Свой сэнс першародны тады набываюць
І фарбы, і гукі, пачуцьці і словы.

Мне дзён не ставала зрабіць справаздачу,
А тут я падумаў — як зроблена мала.
Прайшла маладосьць вадаспадам гарачым,
Гады прашумелі нястрымным абвалам.

Я шчодры і буду такім да магілы,
І ўсё ж адчуваю: бясконца ўсім вінен.
Ці ўдасца стварыць мне, паклаўшы ўсе сілы,
На радасьць людзей хоць маленькую Вільню?

Шчэ многа пабачыць мне суджана сьвету,
Але застанешся ты ў сэрцы адзінай —
Затканая зорамі, лісьцем і цьветам,
Пявучая Вільня — літоўскае дзіва.

**Пімен Панчанка** (1917—1995). Твор вылучаецца з кантэксту тагачаснае беларускае савецкае паэзіі вольнасьцю паводзінаў і думак лірычнага героя. Чым гэта растлумачыць? З тэксту вынікае, што Панчанка езьдзіў у Вільню як карэспандэнт. У 1946 ён і сапраўды працаваў у часопісе “Вожык” пасьля дэмабілізацыі з савецкага вайсковага кантынгенту ў Іране. Аднак мэту віленскай паездкі ані гэты твор, ані факты біяграфіі не раскрываюць. Варта мець на ўвазе, што, паводле жыцьцяпісу, яшчэ ў 1939 годзе Панчанка браў удзел у “паходзе савецкай арміі ў Заходнюю Беларусь”, і тады, будучы карэспандэнтам, верагодна, наведаў Вільню ўпершыню. У “Сустрэчы зь Вільняй” у перадапошняй страфе нечакана ўсплывае матыў Вільні як абсалютнага вобразу, як мэтафары плёну і жыцьцёвага даробку чалавека. Словамі “стварыць мне Вільню” аўтар сьвядома ці несьвядома перафразоўвае народную прымаўку “Рабі пільна — і тут будзе Вільня”.

*Друкуецца паводле: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С. 225—234.*

1948. Максім Лужанін
Вільнянка

На зялёнай Піліме,
На Завальнай калішняй,
За сяброўства пілі мы
Старасьвецкім кілішкам.

І размова ня ціхла,
Ня моўкла,
Ня гасла,
І віталася песьня
Са сьціплай
Сяброўкаю
Казкай.

Веснавая паводка гула наўкруга за сталамі,
Покуль гэты туман не залопаў над рэчкай крыламі,
І за ім наўздагон, тонкай дзідай працяўшы сасоньнік,
Скочыў першы прамень, нецярплівы завоблачны коньнік.

Галасьней,
Заласьней
Паплылі,
Загулі,
Заігралі
Пакручастай Вяльлі
Выгінастыя хвалі.

А калі ад сяброў —
Зачараваны восеньскім ранкам —
Я цішком адышоў
І падаўся на ўсход Пагулянкай —
Там у шэрай жакетцы такая красуня стаяла,
Што ніколі
На гэтым
На белым
На сьвеце
Зямля не трымала.

Калі глянуў у вочы (ці ж можна казаць на іх — зоры!) —
Пра іх чыстую праўду дзяўчатам сам-насам гавораць, —
Калі глянуў на косы (ці ж можна казаць на іх — пасмы!),
Я збаяўся загінуць у сьветлым гушчары дачасна.
Калі глянуў на постаць (ці ж можна назваць яе тонкай!),
Мне здалося, па бруку ідзе маладая сасонка.

**Максім Лужанін**, Аляксандар Каратай (1909—2001). Пасьля вайны быў сакратаром Якуба Коласа, ад якога, відаць, шмат даведаўся пра Вільню.

Верш перагукаецца з паэмай Пімена Панчанкі матывам раптоўна сустрэтага фантастычнага каханьня. Абодва творы пісаліся ў адзін час, пасьля наезду ў паваенную Вільню, дзе Лужанін, як выглядае, браў удзел у нейкай пісьменьніцкай сустрэчы. Увогуле, паводле пашыранага меркаваньня, віленскія жанчыны ў цэлым саступаюць у прыгажосьці кабетам зь іншых мясьцінаў Беларусі. Тым, відаць, мацнейшае ўражаньне робяць на паэтаў раптоўна сустрэтыя прыгажуні. У 1962 гэты матыў з памяці ўзновіць яшчэ адзін паэт — эмігрант Міхась Кавыль.

*Паводле: Шыпшына. 1948. № 7.*

1955. Натальля Арсеньнева
Прошча

Выходжу й гукаю,
гляджу, выглядаю — нямашка...
У ходзішча шчырбах каштанавы тае сьнег.
Праз дошкі кастрывыя
крыва ўсьміхаюцца крамы.
(На яве ўсё гэта? У сьне?)
Чыйсь крок невясёлы і важкі.
— Дзе Войстрая Брама?
— Нямашка.
Імкну, як няўверны Тамаш,
свае пальцы пакласьці у раны.
Паўз мулкасьць завулкаў,
праз строму... Прачуўся? Зманіў?
Вось.
Вочы ня хочуць — “няма!”
Забралі, раструшчылі Прошчу.
Зьнік коньнік на сьміглым кані.

Тулюся да плітаў стаптаных.
Малюся у мітусь, у пошчак
за дні на выгнаньні...
За Прошчу...
За раны...

За заўтра — ня сьмею,
ня ўмею так прагна, так пільна.
Зярнём урастаю ў каменьне —
каменьне гудзе.
Дзесь
звончаць мячы, капытамі комчаць хвойнікі коні,
йдзе сонца мячом насустрэчу... і дзень.
На веча!
Стаконна,
стамечна,
стамільна
йрве
зь ветрам
Пагоня
у
Вільню.

*Друкуецца паводле: Натальля Арсеньнева. Між берагамі. — Нью-Ёрк—Таронта, 1979. С. 256.*

У сваіх эмігранцкіх вершах прызнаная віленская акварэлістка радыкальна зьмяняе ранейшую “акварэльную” інтанацыю на патэтычную, ірваную, надта падобную да бурапенных экспэрымэнтаў “Маладняка”.

1956. Натальля Арсеньнева

З цыклу “Прывіды”

Заміж прадмовы

Дзівосы сьвету мы адно да іх умільна
раўнуем, сочачы із прагай цьмень:
— Зусім як і у нас!
Вось так было і ў Вільні!
Вось гэткі ж клён калісь і ў Менску мне шумеў...
Завулак

Сьцень — ад сьценаў да сьценаў...

Скуль тут гэткі завулак?
Крок б’е ў бубен, а рэха ня ўпросіць.
Боль пакорпаў цагляны
мур, у шчырбах ён, ранах...
І — ужо успамінаў ня зьдзену:
рэха, гэткае ж рэха старэчае чула
я, малая, із коскай
радзенькаю,
мулкай,
прабягаючы вулкаю
Росай.
Дамок

Дамок дзераўляны... Пад гонтай...
А побач, як бор, небасягі
каменнымі пнуцца камлямі.
Устала б зь зямлі Пакагонта —
ізноў бы сканала ад смагі
па тым, што і сны ўжо ня пляміць...
Дамкі... Небасягі — адно ёй,
зязюлі зь зялёных гушчараў...
А мне —
зноў няма мне спакою:
я знала калісь на Панарах
дамок гэткі,
з гэткай страхою...
Готык

Готык непераможаны!
Готык імклівы, вечны!
Келіх лялеі божае!
Наквець грамнічнай сьвечкі!
Выраслы з твані шэрае
грэшных Садомы й Гаморы
веры прамень над няверaю,
гвалтам,
пагардай,
пакорай!
Стрэла цябе я, аздобнае
дзіва — й адкрылася рана:

сёстры вы, сёстры вы родныя
з краскай
зыркой —
Сьвятой
Ганнай!

*Друкуецца ў скароце з кн.: Натальля Арсеньнева. Між берагамі. — Нью-Ёрк—Таронта, 1979. С. 257.*

Беларуская Вільня ў 50—60-я гады мінулага стагодзьдзя выглядала вымерлым горадам, асабліва ў параўнаньні з 20-мі і 30-мі. Тут не засталося ня тое што памяткі — аніводнага чалавека, які мог бы апавесьці пра колішняе бурлівае жыцьцё. Дзівам ацалела ў сваёй Лясной хатцы ў Панарскіх гарах паэтка і грамадзкая дзяячка Зоська Верас. Менавіта ў яе сталі зьбірацца тыя, хто вяртаўся з сталінскіх лягераў. А былі гэта або дзеці колішніх адраджэнцаў, як, да прыкладу, браты Лявон і Юрка Луцкевічы, або тыя, хто па маладосьці далучыўся да нацыянальнага адраджэньня толькі ў часе вайны (Зоя Каўшанка, Кастусь Шышэя ды іншыя). Згаданы пэрыяд азначаны ў беларускай паэзіі пра Вільню толькі вершамі эмігрантаў. Тутэйшае прыгожае пісьменства ў гэты час маўчала.

1960. Міхась Кавыль
Вільня

На захад з торбай суму, гневу
Ішоў я Гострай Брамы міма.
Абрушваў вечар зор улеву
На Вільні шэрыя кілімы.
Ня спала Вільня. Сны трывожыў
Адгук глухі грымотаў блізкіх.
Ціша зьвінела ў настарожы
Паміж крыжоў і абэліскаў.
Зырэла зарыва ў аддалі,
Дзесь агрызаліся “гэвэры”.
Адны разбойнікі ўцякалі,
Другія стукаліся ў дзьверы.
Ў абдыме стомы і самоты
Ня я адзін, прагнаны рыцар,
Схаваўся ў могілак цянёты

Пра незабыўнае забыцца.
На грудзях прашчураў далёкіх —
Няхай даруюць: бязь іх згоды —
Адчуў я зноў спакою дотык,
Ліствы зялёнай цёплы подых.
Ды сон ня йшоў. Блукаў ён дзесьці
Па Менску вогнішчах, руінах.
А тут, у гэтым ціхім месьце,
Вадзіў яго Францішак Скарына.
Ішоў ён думны па Антоклі
І мерыў літарамі зоры.
Вунь там, дзе хмары ў сіньцы змоклі,
Няпоўны месяц цяў вузоры.
Першадрукар рукой умелай
За словам клаў сьвятое слова...
Мой сон, як сьвечка дагарэла,
Пайшоў па пляцы Мураўёва.
Не затрымаўся каля “шышкі”:
Абрыдла з бронзы морда ката.
Сьпяшаўся трапіць на Лукішкі,
Дзе адбывалася расплата.
І валасы ўзьняліся дыбам:
На склютам зраненыя дошкі
Ўзышла нязьмераная глыба —
Кастусь Сямёнаў Каліноўскі.
Вяроўка сьвіснула у мыле,
І галава на грудзі ўпала...

* * *

Каб Беларусь не задушылі,
Загаласіў Янка Купала.
І сон падаўся на курганы,
Каб прыслужыцца там прароку...
Так я у Вільні незабранай
Пачуў краіны роднай крокі.
Ужо й на золак занялося,
І далеч невядзі ня страшыць.
А тры крыжы — мо так здалося? —
Мне наўздагонкі: “Вільня наша!”
*4 сакавіка*

**Міхась Кавыль**, Язэп Лешчанка (1915). Верш напісаны на эміграцыі, у ЗША.
*Друкуецца паводле: Міхась Кавыль. Міжагнёўе. — Нью-Ёрк, 1990. С. 107.*
1962. Міхась Кавыль
Вяльляначка

Танга
Сасоначкі і бярозкі заспаныя
Туманамі ля бурлівай Вяльлі
Цябе, вяльляначка мая каханая,
Ў сады прысьнёныя са мной вялі.

Усьміхалася сінім сьмехам заранка,
Ты прасіла мяне: “Пачакай, пастой...”
Разьвіталіся мы з табой, вяльлянка,
Каля Трох крыжоў на гары сьвятой.

А на золку дзесь за Войстрай Брамаю
Рассыпаўся, быццам зоркі, твой сьцень.
Неўпрыкметкі і сьцяжынкай тэй самаю
Падагнаў мне коні белыя дзень.

Углядаўся я гэтак доўга і пільна
На знаёмы сад, што даўно пажоўк.
Разьвіталіся мы з табою у Вільні,
На гары сьвятой каля Трох крыжоў.

Сасоначкі і бярозкі зялёныя
Шумяць, шасьцяць, быццам хвалі Вяльлі.
Цябе, вяльляначка мая каханая,
Ў сады — няродныя — сны прывялі.

Усьміхалася ты, як тая заранка,
Дарыла мне вуснаў сьпелых віно...
Разьвіталіся мы з табою, вяльлянка,
А хто скажа, згадае, ці стрэнемся ўзноў...
*20 траўня*
*Першая публікацыя: Конадні, Нью-Ёрк—Мюнхен, 1963. № 7. С. 85.*

*Тут друкуецца з кн.: Міжагнёўе. — Нью-Ёрк, 1990. С. 152.*
1962. Міхась Кавыль
Песьня пра Вільню

О, Вільня, Вільня!..
Места сноў маіх юначых,
Гастрабрамскіх званоў,
Базылянскіх муроў.
О, Вільня, Вільня!..
Бы цымбальныя струны,
Гэта слова адно
Грэе, пеніць мне кроў.

О, Вільня, Вільня!..
Кожны дзень піў я трунак
Шчабятлівых садоў,
Беларускіх двароў.
О, Вільня, Вільня!..
Бы цымбальныя струны,
Гэта слова адно
Грэе, пеніць мне кроў.

О, Вільня, Вільня!..
Кут мой мілы, гарунны.
Ты ня срэбра, ня медзь
Дзеля царскіх дароў...
О, Вільня, Вільня!..
Бы цымбальныя струны,
Гэта слова адно
Грэе, пеніць мне кроў.

О, Вільня, Вільня!..
Шыхты войнікаў юных
Пранясуцца віхурай
Ля жмудзкіх муроў...
О, Вільня, Вільня!..
Бы цымбальныя струны,
Гэта слова адно
Грэе, пеніць мне кроў.
*22 траўня*

*Друкуецца паводле: Міхась Кавыль. Міжагнёўе. — Нью-Ёрк, 1990. С. 155.*

1968. Уладзімер Караткевіч
Вільня ў дождж

Вільня ў дождж, як старая гравюра у “Тэцы Віленьскай”:
Праз завесу дажджу — кожны дах у штрыхах, як страха,
Крадуць даль туманы. Ўсё у зьвівах, нібы на паперы вяленевай,
Ўсё з шматлікіх штрыхоў, ўсё ў касых характэрных штрыхах.

Ўсё з дакладнай штрыхоўкі гравёра: завеса туману,
Пляма вежы, забытай у дождж на вяршыні гары,
І акрэсьлены контур званіцы вялікага Яна,
І, ля ног яго, пастка зь цямноцьця і цэглы — Муры.

Я ня ведаю, дэман які над гравюрай пануе пахмура?
І чые гэта вочы халодныя ў віслых мяшках
Разглядаюць яе? І чыя гэта крэсьліць крыжамі гравюру,
З жыл-вяровак, старэчая, злая, сухая рука?
**Уладзімер Караткевіч** (1930—1984). Часта бываў у Вільні, апісваў яе ў сваіх празаічных творах і эсэ. У 1968 Караткевіч завяршыў працу над раманам “Каласы пад сярпом тваім”.
*Друкуецца паводле Збору твораў. Т. 1. С. 233.*
1970. Натальля Арсеньнева
Тваё імя
*Маці родная, маці-краіна,*
*Не усьцішыцца гэтакі боль.*
М. Багдановіч

О, Беларусь,
о, Беларусь мая!
Імя тваё — такі пякучы сымбаль болю!
Ды шчыра ўсьцяж яго
багаслаўляю я:
ізь ім я —
чалавек,
у долю і ў нядолю.
Пранізанае ім, маё жыцьцё брыдзе,
маўляў, мяжой ціхой,

ярамі вуліц змрочных,
і не баліць мне, што вітае дзень
мяне чужою мовай,
а чужымі снамі — ночы...
Дзіўны ён, гэты боль,
і дзіўна лёгка зь ім:
прысыпаўшы пяском друз прагі і завісьці,
ён
раньнямі мяне ды мескай мітусьні
няспынную кіпень
мяккой лагодай хрысьціць.
Ён зьмеркамі зь мяне пясьціва ўмее зьняць
важкую стому, кроў
зайскрыць узноў да працы,
зьняверу, там, на дне,
даўкія крыўды дня
пайрваць,
каб ім і мне як разам не зыйгрaцца.
І сны —
мне явай скрозь,
а сяньня явы — сон,
ссыпаецца з душы лушпіньне людзкай зьвягі...
Імкліваю Вяльлёй пяе сівы Гудзон,
Мурамі Вільні таюць неабсягі...
І ўскласьці я хачу на струны,
як Баян,
шнур пальцаў — лебядзёў,
і граць,
і граць з жадою,
О, Беларусь,
о, Беларусь мая,
паўз боль пякучы граць
Табе,
Табою!

*Друкуецца паводле: Натальля Арсеньнева. Між берагамі. — Нью-Ёрк—Таронта, 1979. С. 286.*

У 70-я гады віленская тэма зноў ажывае ў беларускай паэзіі. Але гэта ўжо творы не тутэйшых паэтаў, а тых, што прыяжджаюць зь іншых беларускіх гарадоў. Яны зьбіраюцца ў Зоські Верас, Лясная хатка якой паступова ператвараецца ў

месца праўдзівага паломніцтва, яны працуюць у літоўскіх архівах, дзе захоўваюцца бібліятэка і архівы колішняга Беларускага музэю, яны проста на дзень прыяжджаюць у Вільню на шпацыр, каб набрацца таго роднага старадаўняга духу, якога зусім не засталося ў Менску.

1971. Рыгор Семашкевіч
Інтэрнат

...Зь якою, бацькаўшчына, меркай
Нас выпраўляла ў іншы сьвет?

Яе натруджаныя рукі
І даўніны бунтоўны дух
Нам сьведчылі, што у навуках
Ня толькі Вільня, Пецярбург.

Казала прыказка нам:
Пільна
Вядзі свой рэй праз новы сьвет,
Табе і ў хаце будзе Вільня.
Такі быў даўні запавет.
**Рыгор Семашкевіч** (1945—1982). Нарадзіўся на гістарычнай Віленшчыне. У часе напісаньня паэмы (тут — урывак, паводле: Лічыла дні зязюля. — Менск, 1987) вывучаў гісторыю беларускае літаратуры пачатку XX ст. і ў зьвязку з гэтым часта бываў у Вільні.
1975. Павал Марціновіч
***

Цягніка грукочуць колы,
Вось і Вільні камяніцы.
Нібы макавае поле,
Усплывае чарапіца.

Паглядзі з акна вагона,
Ледзь зацепліцца дасьвецьце, —
Вільня грэецца лагодна
У аранжавых суквецьцях.

Варта зрокам дакрануцца
Да тых вуліц і будынкаў —
Рысы часу пазнаюцца,
Як на вечным фатаздымку.

Тут блукалі ранкам гулкім
І Скарына, і Купала...
Як на скроні, на завулкі
Сівізна вякоў апала.

І вясна, і друз магільны,
Перамогі і няўдачы...
Колькі колераў у Вільні
Наша сэрца можа ўбачыць!
*Павал Марціновіч (1954).*
*Друкуецца паводле: Павал Марціновіч. Прадвесьне. — Менск, 1975. С. 49.*
1976. Максім Танк
У Вільнюсе

Ня знаю, што магло расчуліць
Мяне між вільнюскіх муроў.
Мо тое, што тут столькі вуліц
З імёнамі маіх сяброў?

Ну як жа іх не пераведаць?
І я за ценем сваіх дум
Па пераходах, пераездах,
Знаёмых вуліцах іду.

Званю. Мне дзьверы адчыняюць.
Не застаю сяброў былых,
І шмат хто, зьдзіўлены, пытае:
Няўжо іх знаў і помню іх?..

Няўжо іх знаў, няўжо іх помню?
Чаго ж бы ў дзьверы грукаў я,
Чаго ж бы кожны раз у поўнач
Блукала песьня тут мая?
*Паводле: М. Танк. Збор твораў. Т. 5. — Менск, 1980. С. 8.*

1978. Максім Танк
Мікалай Дворнікаў

Я — пяро.
Завуць мяне “Пэліканам”.
Фірму гэту
Сустрэнеце побач з другімі
У Парыжы і ў Рыме,
У Нью-Ёрку і Тэгеране.

Шмат маіх
Вастраносых сясьцёр
Спрадвеку
Працуе у міністэрствах,
Банках,
Канторах,
Падпісваюць маніфэсты,
Чэкі,
Прыгаворы.

Як я ім зайздросьціла
Заўсёды!
Асабліва
Лежачы за вітрынай пыльнай
На Вастрабрамскай у Вільні
Гэтай вясной трыццаць пятага году.

Аднойчы прыйшоў клерк.
Спрабаваў, як пішу:
“Dum spiro, spero”.
Быў ён нейкі разгублены,
Хворы.
Пасьля хацеў
купіць матэматык.
Напісаў розьніцу квадратаў
Дзьвюх лічбаў.
Не спадабаўся мой колер.

Тут, неспадзявана,
Хтось яшчэ зацікавіўся мной,

Праверыў на цьвёрдасьць:
“Віхры варожыя...”
Прызнацца,
Ня чула я песьні такой,
Хоць знала, можа, я
Больш як іншыя шлягераў:
“Мой каханак — злачынец”,
“Месяц на Таіці”,
“Пантэра”...

Хто ж ён такі?
Калі ў бок Ратушы
Пайшоў нацянькі,
Думала — камэрсант,
Калі мінаў унівэрсытэт,
Думала — карпарант,
А спыніўся ля афішы
“Парнэля балет”...

Тут ён рамізьніка
Раптам паклікаў
І пачаў пятляць па вуліцах
Бакшце, Вялікай,
Быццам кагосьці шукаў
Ці ад некага сам уцякаў.

Хто ж ён такі?
На рынку Лукіскім
Зашыўся ў натоўп,
Для гаспадаровай
Маленькай дачкі
Казюковае зь перніка сэрца
Знайшоў.
Якое вялікае,
Размаляванае сэрца!
Такога яна
Не каштавала, здаецца.

А сам
У пакойчыку

З вокнамі зацененымі
Чытаў Маркса, Леніна,
Пісаў адозву...

Дык вось
З кім здружыў мяне лёс!
*Урывак з паэмы.*
*Друкуецца паводле: М. Танк. Збор твораў. Т. 5. — Менск, 1980. С. 135.*

1980-я. Зьніч
Сталіца

Дзякуй Богу, што Вільню забралі,
Бо — каб н а ш а й сталіцай была —
У магілах бы храмы ляжалі
На пагосьце бэтону і шкла.

Толькі й страціўшы с ь в е т, не скарыцца
мой народ. Як шляхотны Кастусь.
Т а м нашчадкаў Скарыны сталіца,
дзе д у х о ў н а
Жыве Беларусь!
**Зьніч**, Алег Бембель (1939).
*Друкуецца паводле аўтографу з архіву ўкладальніка.*
1986. Зянон

Калі б спыталі:
— Дзе сэрца Беларусі?
Я б адказаў:
— У Вільні.
Калі б спыталі:
— Дзе сьвятасьць Беларусі?
Я б адказаў:
— У Браме Вострай.
Калі б спыталі:
— Дзе доля Твая,
Марыська чарнаброва,
Галубка мая?..
Але ніхто не пытае.

**Зянон**, Зянон Пазьняк (1944).
*З кнігі: Зянон. Глёрыя Патрыя. — Вільня, 2000.*
1986. Зянон
Яблыні

Пілуюць яблыні старыя,
Кідаюць гольле у агонь.
Дзе мае леты маладыя —
Прайшлі, сплылі, зьляцелі ветрам.
Мільгнуў у хмарах белы конь.

Каму цікавы лёс мой бедны,
Карціны памяці, гады.
Ральля пад цьветам палавее,
І сьняцца замкі-гарады.

Вось на Завальнай воз грукоча.
Ў маім мястэчку Вільні звон.
Пілуюць яблыні старыя,
Кідаюць гольле у агонь.
*З кнігі: Зянон. Глёрыя Патрыя. — Вільня, 2000.*
1987. Зянон
Фатаграфуе Ян Булгак

На патэфоне
Гучыць вясёлы пасадобль.
Што там у садзе Бэрнардынскім?
Цырк шапіто? Мадам Фурэ?
Ах, вішні расьцьвілі?
О, Божа, колькі жабракоў
На плошчы перад катэдрай...
Якія бледныя ў іх твары.
Як рукі з голаду дрыжаць...
Мая Зямля,
Хоць крываточаць Твае раны,
Ты йшчэ багата Боскім Духам,
Бо моляцца ж, бо моляцца
За ўсіх.
*20 верасьня*
*З кнігі: Зянон. Глёрыя Патрыя. — Вільня, 2000.*

1987. Зянон
Факстрот

Загучэў стары факстрот.
Ах, Вільня! Вільня прад вайной!..
Кудысьці “чорна Ядзя”
па вуліцы прайшла.
Ці жыве яна яшчэ?
Дзе-небудзь.
*З кнігі: Зянон. Глёрыя Патрыя. — Вільня, 2000.*

1980-я. Яўген Гучок
* * *

Сярод
беларускіх
казак
Адна з
прыгажэйшых
—
Вільня.

* * *

Спачатку мы
страцілі Бога,
А потым мы
страцілі мора,
А потым мы
страцілі
Вільню...

* * *

Калі у тваіх
малітвах
Будзе месца
для Вільні,
Заўжды яе
сынам ты
будзеш.

*Друкуецца паводле: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С. 125.*
1980-я. Сяржук Сокалаў-Воюш

Песьня пра Вільню

Ажываюць крокі твае
У цішы начной,
І лятарня кідае сноп
Промняў залатых,
І, здаецца, ёсьць на зямлі
Толькі мы з табой,
Твой стары, як сьвет, лябірынт
Вулачак пустых.
Вільня заснула зноў,
Ды ў яе вачах
Не пагас агонь,
Тут, ля старых муроў,
Запаліла кроў
Мне яе далонь.
І гучыць паўсюдна матыў
Даўняе імшы,
І на бітву клічуць званы,
Страціўшы спакой,
І гараць надзеі агні
У маёй душы,
Жалю і спагады няма,
Больш няма у ёй.
Вільня заснула зноў,
Ды ў яе вачах
Не пагас агонь,
Тут, ля старых муроў,
Запаліла кроў
Мне яе далонь.
***Сяржук Сокалаў-Воюш*** *(1957).*
*Друкуецца паводле: Сяржук Сокалаў-Воюш. Кроў на сумётах. — Менск, 1989. С. 45.*
На мяжы 80-х і 90-х беларускія вершы пра Вільню зноў пачынаюць пісацца ў самой Вільні. У старой сталіцы ствараюцца беларускія грамадзкія арганізацыі, сярэдняя і вышэйшая школы, зьяўляюцца тэле- і радыёперадачы. У 1991 у Вільні аднаўляецца выданьне “Нашай Нівы”.
1990. Рыгор Барадулін
Гуляньне падчас блякады

Гліняныя званочкі
На лузе брукаваным
Зьвіняць вясёлым звонам.
Каб не ўцякалі ўпрочкі,
Прывязваюць каханым
І ўсім мужам шалёным.

Дзіцятка, як цялятка,
Зьвініць-зьвініць, і мама
Яго ў натоўпе чуе.
Над плыньню часу кладка
Яшчэ зь вячніц Адама
Дрыжыць,
Бяду вяшчуе.

У Вільні вольна духу.
Сівеюць вежаў скроні.
Плывіце, хмары, міма!
Пакапыціўшы скруху,
На Вострай Браме коні
Лятуць у верш Максімаў.
**Рыгор Барадулін** (1935).
Верш зь “Віленскага трыпціху”.
*Друкуецца паводле: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С. 115.*
1990. Рыгор Барадулін
Вечная

У Вільні —
Гняздоўі крывіцкага духу —
Душой супыніся
Ля Вострае Брамы.
Даверыўшы ксты крыжавітаму руху,
Падвыш свайго подзіву
Мройныя храмы.

Учуй,
Як падковамі крышаць каменьне
Ярылы ці Вітаўта гордыя коні.
Памкненьне гардыні
Пастаў на калені

У дольным паклоне
Прачыстай іконе.
Верш зь “Віленскага трыпціху”.
*Друкуецца паводле: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С. 116.*
1990. Данута Бічэль
У Вострай Браме

Шляхі зьбягаюцца ў Вільню.
Ня будзем дзяліцца болем,
пешкі ў Вострую Браму
пойдзем да сьвят.
На ўсходках Вострае Брамы
стаіць на каленях воля
перад Абразом Цудатворным —
ня змог яе кат.
Сышліся чорныя хмары
і неба запаланілі.
Сьмяротны чарнобыльскі цмок
над сьветам лятаў.
Сьпіць Беларусь у магіле,
Літва заснула ў магіле,
паўвека спала ў магіле...
Ускрэсла Літва!
На вулках і пляцах — воля!
О, незалежная Вільня!
Вораг і Янка-дурань
за плотам точаць лязо —
па горле вострай касою
Цябе сьцебануць ім пільна...
Узброена ж воля ў Вільні
дзявочай касой!
**Данута Бічэль** (1938).
*Друкуецца паводле: Данута Бічэль, Алесь Чобат. “Ты не самотны...” — Горадня, 1997. С. 23.*

1991. Людміла Рублеўская
Вільня
*Віктару*

У горадзе мінулага жыцьця

Ты пазнаеш абрысы цёмнай вежы,
Што ў снах так часта над табой ляцяць
І пахаванай памяці належаць.
Ты ведаеш, як можа пахнуць брук,
Калі ляжаць на ім з апошняй ранай.
І кожны мост напомніць крокаў грук,
І бляск паходняў — кожны мур цагляны.
Ты раптам зразумееш, дзе зручней
Ад вершніка ўцякаць, якім завулкам.
Дзьве зоркі раптам скоцяцца з вачэй,
Калі каменны крыж пагладзяць рукі.
Вось гэтае акно дарыла сум,
А тыя дзьверы —
Памятаюць шчасьце
І дзіўны водар страчаных парфум,
І шоргат пазалочанага плацьця.
У горадзе мінулага жыцьця
Ты сустракаеш твары, як маланкі,
Што асьвятляюць нешта зь небыцьця,
Дзе тэлевежу не вартуюць танкі.
Тут нават вецер — смаку таямніц.
Тут могілкі імя маё хаваюць.
Цяпер цяжэй, напэўна, будзе жыць,
Так бессаромна агаліўшы памяць.
Але лягчэй, напэўна, памірацъ,
І сэнс жыцьця знаходзіць не ўсьляпую,
І гэты горад назаўжды кахаць,
І ў вечнасьць узірацца напрамую.
**Людміла Рублеўская** (1965).
*Друкуецца паводле: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С. 249.*
1991. Тацяна Сапач
У Вільні

Блукаю па вузкіх вулках
старога роднага места
(Чаму ты ня тут, не са мною,
вялікі крывіцкі род?) —
І кожны мой крок паўтарае
акорды жалобнай мэсы,
так, кожны мой крок,

асьцярожны крок.

О, хваля харалу,
гатовая ўздыбіць дах
і зьмесьці,
што помняць і славу, і здраду,
сьцены!..
З найлепшага цеста, мой Бог,
табою зьлеплены Бах.
Але, я прашу,
гавары са мною
на мове Шапэна.
**Тацяна Сапач** (1962). Жыве ў Вільні.
*Друкуецца паводле “Нашай Нівы”, 1991.*
1991. Тацяна Сапач
* * *

Калі павернецца час, і на бруку вулак
ад грукату ботаў ня здасца бясконцым
дзень,
і зь дзіўнае высі сарвуцца актавы забытых музык,
на вузкія рукі пагаслае срэбра
надзенем...
Хай собіць спаткацца нам у Зялёным
Штралі
аднойчы пасьля бескалёрнай, нямой зімы.
Тут нашыя цені адныя, бяз нас,
блукалі,
Тут нашыя цені і зараз жывыя.
Хоць мёртвыя мы.
*Друкуецца паводле “Нашай Нівы”, 1991.*

1991. Алег Мінкін
У старой Вільні

Акно расчынена.
Гайдаецца фіранка.
Гладзь падваконьня
мройна льсьніцца глянцам.
Сп’янелыя ад сонечнага ранку,

Буркуюць галубы на дворыку цагляным.

Даўней тут гнезьдзіўся
стваральны Дух Дзяржавы,
А зараз — спрэс музэі ды магільні...
Пара ўставаць, духмянай выпіць кавы
І патануць
у гулкасонных нетрах Вільні.
**Алег Мінкін** (1952). Жыве ў Вільні.
*Друкуецца паводле "Нашай Нівы", 1991.*
1991. Алег Мінкін
* * *

Вострая Брама. Атвор
у нязвыклую глыб,
дзе нэафіт пачувае сябе
як на Марсе,
ну, а заўсёднік
утульных кавярняў, прынамсі,
можа сядзець за ажурнымі
кратамі шыб,
каву смакуючы і пазіраючы на
шыльду насупраць,
якая цямнее на муры
помніка вельмі далёкае
архітэктуры,
і, не стрываўшы,
міжволі ўздыхнуць
— даўніна...
*Друкуецца паводле "Нашай Нівы", 1991.*
1992. Алег Мінкін
* * *

Калі скрыгатаньне, і грукат,
і хрумст малацільні,
Што нашым завецца жыцьцём,
дастае да нутра,
Адно застаецца —
нырнуць у абдоймы да Вільні,
У плынь яе вулак,

у ціхую завадзь двара,
І мроіць, што скрыгат далёкі
нічога ня значыць,
Хадзіць па кавярнях і крамках
някідкіх цішком,
Пах кавы ўдыхаць, слухаць
водгульле крокаў і бачыць
Бурштынавых пацерак
цёплае зьзяньне за шклом.
*Друкуецца паводле “Нашай Нівы”, 1992.*

1992. Анатоль Дэбіш
* * *

Вулкі старыя, самотныя сьпевы аргана.
Вострая Брама. Ледзь чутныя крокі. І — змрок.
Поўня згарэла ў нябёсах. Да ніткі прамок.
Недзе — цягнік... Ёсьць квіток. Ды вяртацца зарана.

Нібы жабрак, завітаю пад сховы касьцёлу.
Слухаю сьпевы... Між хору дзяўчат і мужчын
Твар свой заўважу — збуджаны, сьветлы, вясёлы.
І пасьміхнуся: як добра, што я не адзін!

Вулкай пакрочу. І дождж будзе гнацца за мною,
Чорны асфальт, і дамы, і людзей цалаваць.
Вострая Брама. Вакзал. Недзе там, за сьпіною,
Цень мой блукае, ня можа мяне адшукаць.
*Друкуецца паводле: Дзень паэзіі-93/94. — Менск, 1994. С. 41.*
1992. Тацяна Сапач
* * *

Праз дні і ночы нас пільнуе страх:
на вулках Вільні, і ў тваіх вачах —
там толькі ён, заместа рэк і мораў.
У мілым доме песьняў не пяюць,
а цягнуць нэндзу новую сваю —
пра сьмерць і хлеб,
і зноў пра сьмерць гавораць.
Я выйду ў ноч, пакуль сабе ня веру,

я выйду — асьцярожным,
чуйным зьверам,
каб у дарозе збыць жуду-нуду...
І набяжыць з чужых краёў старожа,
сказаць пра ўсё —
паверыць і паможа,
ды я ад страху словаў не знайду.
*Друкуецца паводле “Нашай Нівы”, 1992.*
1993. Тацяна Сапач
* * *

Мы крочым праз вострыя брамы,
якія ўтварае пара дарагая,
мая залатая пара.
Але нас ня золата вабіць,
што ўрэшце абернецца
бруднай іржою і гноем,
а готыка голых таполяў,
што рукі скрыжоўваюць
недзе ля самага шэрага, шэрага,
шэрага неба.

Мы рушым праз новыя
вострыя брамы старыя,
як некалі, поруч,
і вера вяртаецца нам,
і нешта нам кажа,
што мы не адзіныя ў сьвеце.
*Друкуецца паводле “Нашай Нівы”, 1993.*
1995. Тацяна Сапач
* * *

Калі ўдача цябе пакіне,
і жана дарагая, і дочкі,
за гарой застанецца Вільня,
за гарою прачнешся аднойчы

у пакоі, між мяккіх цацак
і вясёлых, з карункамі, кніжак.
Нешта можа заўжды заставацца

для жывых. І для іншых.
*Друкуецца паводле “Нашай Нівы”, 1995.*
1996. Уладзімер Мароз
Разьвітаньне зь Вільняй

Тут чужыя ня ходзяць, сваім забракуе ў кішэнях,
Смутны “Локіс” чакае, што вернемся мы ў маладосьць,
Сходы клічуць уніз, дзе прыбраны сталы ў сутарэньнях,
Дзе ў паўцемры бруіцца забытая ўжо весялосьць.

Піва пеніцца ў куфлях, старое, як гэтыя зводы,
Пад крывавае мяса бурштынная “Старка” цячэ.
Гаманкая сябрына яднае на вечар народы,
Баль нязмушана рупіцца з кожнаю хвіляй званчэй...

Ненадзейныя згадкі — былога жыцьця ані згуку,
Золкі ранак бязьлюдзьдзя адно адаб’ецца ў вачах.
Сумна слухае Вільня, як цішацца крокі па бруку,
Як зьнікае зусім іхны пошум у даўніх мурах.

І нарэшце заплача, самотная, на разьвітаньне
Безнадзейна-адчайным ля Вострае Брамы дажджом.
Горад свой, а чужы, калі тут не сыходзіць адхланьне,
Беларускі мой шлях, мацярынскі наш страчаны дом...
*Друкуецца паводле: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С. 222.*
1997. Данута Бічэль
Падыме цокат Пагоні

Прачнуся ранютка-рана
на першы цягнік сьпяшацца.
У Вільні Вострая Брама,
усходкі замест ружанца.

Паеду — расой прыбрана,
дарога вядзе праз горкі.
У Вільні Сьвятая Ганна,
заместа ружанца зоркі.

О, Вільня, Божая хвала...
Чужая даўно сталіца.

Забыўся касьцёл Міхала
па-беларуску маліцца.

Вайна яшчэ нас дагоніць.
Кіруй намі, Матка Боска.
Сядлайце, Паэты, коні,
апроч нас няма тут войска.
*Друкуецца паводле: Данута Бічэль, Алесь Чобат. “Ты не самотны...” — Горадня, 1997. С.32.*

1997. Алесь Чобат
* * *

У Вільні — як у Вільні. Цэлы сьвет.
Старыя брукі. Цесна ад касьцёлаў.
Аблокі нізкія над вежай Гедыміна.

За ўласнаю душой ступаю сьлед у сьлед.
За палянэзам восені мясцовай.
За пахам вапны, бітуму і дыму.

Кавярня. Сорак нацыяў кругом.
Каньяк і ром ў пустой вітрыне бару.
Скупыя кроплі зьзяюць, як чмялі.

Тут, як у сьне, — далёкі родны дом.
Пад ліпаю прытуленая пара.
Ах, Вільня, Вільня... Месца на зямлі.
*Друкуецца паводле: Данута Бічэль, Алесь Чобат. “Ты не самотны...” — Горадня, 1997. С.56.*
1990-я. Алесь Разанаў
* * *

Блукаю па Вільні.
На даўніх мурах
новыя назвы, —
**Алесь Разанаў** (1947).
*Друкуецца паводле: Алесь Разанаў. Рэчаіснасьць. — Менск, 1998.*
1990-я. Адам Глёбус
* * *

Вільня, ціхі двор,
пад шэраю сьцяною
папараць расьце.
**Адам Глёбус**, Уладзімер Адамчык (1958).
*Друкуецца паводле: http://www.avanhard.narod.ru/kirylica/choku/hlobus05.html*
1990-я. Лера Сом
Здані

Па дарозе зь Вільні на Полацак
Уцякаем ад навальніцы…
Нам маланкі б'юць наўздагонку,
Нам грамы разьдзіраюць вушы…
Па дарозе зь Вільні на Полацак,
Са сталіцы і да сталіцы,
Мкнуцца нашыя абалонкі —
Ненадзейны прытулак душаў.

Па дарозе зь Вільні на Полацак
Шаты дрэваў, крыжы і дахі —
Часткі вечнага краявіду,
Непаўторныя і ў падобным…
Па дарозе зь Вільні на Полацак
Адыходзяць начныя жахі,
Тыя, што працінаюць дзідай
Розум хіжы і самаробны.

Па дарозе зь Вільні на Полацак
Назаўсёды імчацца дадзена…
Можа, нехта за нас памоліцца,
Да дзівацкіх учынкаў схільны…
І дарога зь Вільні на Полацак —
Вось адзінае, што ня скрадзена…
Нам ня трапіць ніколі ў Полацак,
Нам ніколі ня ўбачыць Вільні.
*Друкуецца паводле аўтографу з архіву Алеся Аркуша.*
1999. Віктар Шніп
Мне сьнілася Вільня

Як кветак букет на шляхецкай магіле,

Зноў Вільня маім уладарыла сном,
Калі мяне ў Вільню, бы ў Храм, не пусьцілі,
Нібы гандляра, што гандлюе віном.
…Я спаў і прачнуўся, і ўбачыў дарогу,
Якой мне да Вільні ісьці і ісьці,
Нібыта адвечнай дарогай да Бога,
Нібыта агню па апалым лісьці
Да сьвечак у Храме, які шчэ ствараем,
Якога няма і ці будзе зусім…
Мне сьнілася Вільня, як Храм перад раем,
Мне сьнілася Вільня, як Ерусалім.
**Віктар Шніп** (1960).
*Друкуецца паводле: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С.259.*

1999. Сітніца Рыгор
* * *

Пакінуўшы целу банальнае права на сон,
Ізноўку душа мая пойдзе, нібы беспрытульніца,
Блукаць у самоце па вузенькіх віленскіх вуліцах;
І часу падвода павернецца і перакуліцца,
І брук зацярушыць аскепкамі колішніх дзён.

І клопатаў тлумных прыспаўшы натомлены шал,
З каханаю Вільняй да ранку пабудзе душа.

Ля Вострае Брамы спаткае Максімаў пагляд,
І цень Кастусёвы прывеціць каля Базылянаў;
У дворык Скарынавы зойдзе, і сьлед Палуянаў
Пазнае на бруку ля Ганны Сьвятое ці Яна,
І гляне з гары Гедымінавай за далягляд.

О, Вільня каханая — страта мая паміж страт!
О так… О канечне… Ды ўсё ж пагаджуся наўрад
З вар'яцкім — забраная, позна, ня наша, чужое…
Што шнар на душы называюць дзяржаўнай мяжою,
Што край захварэлы нібы разьядае іржою…
О, Вільня каханая — страта мая паміж страт!
Ты — Госпада Бога пярсьцёнак у безьліч карат.
А значыць, ня страчана ты і журыцца ня трэба,

Бо межамі Бог ні зямлю не шматкуе, ні неба...
О Вільня! Згадаю — і зноўку сьвятлее пагляд.
І ледзьве прымружу я стомлены смутак павек, —
Зноў памяць клубок успамінаў паволі разматвае...
І шэпча душа: “Хай заўсёды сьвяціцца Імя Тваё...
Цяпер і навек”.
*Друкуецца паводле: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С.254.*
2001. Рыгор Барадулін
Вільня ў нашых душах
Вільня.
Вольна ўздыхнула вечнасьць, зірнуўшы на ранішнюю веліч хараства, якое ацаліла яна, пакінула хараство, каб грэць сваю халаднаватую душу.
Вятры — пастухі збродлівых часінаў пасьнедалі ўсьмешкаю, выдыхнуўшы віракружнае найменьне — Вільня.
Вільня — гэта вышыня аратайнай, ваярскай і дойліднай моцы, якая панавіта запрасіла жывыя камяні на момант застыгнуць і задумацца, ці яны вырасьлі зь зямлі, ці прыляцелі, як апалыя зоркі.
Вільня — гэта глыбіня крывіцкага духу прадоннага, як неба, неспасьціжнага, як само жыцьцё.
Вільня — гэта вільчак аблачыстай страхі, дзе віюць гнёзды свае ластаўкі вёснаў, што прылятаюць, каб маладзіць і знадзейваць даўніну, шчабятаць па-ўнучынаму дзядулю Космасу пра забытае.
Некалі Напалеон, пабачыўшы касьцёл Сьвятое Ганны, ашаломлена сказаў: “Каб мог, панёс бы яго на сваёй далані ў Парыж...”
Кожны крывіч, кожны беларус носіць Вільню ў сваёй душы.
А ўсё, што жыве ў душы, не разбураецца, не руйнуецца, яно непадлеглае нават бязьлітаснаму часу.
...Некалі гасьцяваў я ў Геворга Эміна, у аднаго з самых любімых паэтаў Арменіі. З акна ягонага ўтульнага жытла добра відаць Арарат — сьвятарная гара армянскага народу. Як жывая. Здаецца, можна прыпасьці да падножжа, адчуць вольніцу вятроў і халадэчу сьнягоў. А даводзіцца толькі позіркам кунежыць вяршыню, чыстую й высакачолую...
І так якое ўжо засмучанае пакаленьне мілуе вачыма Арарат, жывіць душу напамінам і сподзевам...
А мне адразу ўсплыла Вільня — пупавіна нашае самаснасьці,

калыска беларускай дзяржаўнасьці, радзіма беларускага друкаванага слова, тая гара, якая высіць нас у Эўропе.
Вільню чуе наш слых, Вільню бачыць наш успамін, Вільняй б'ецца крывіцкае сэрца.
Для любові няма дзяржаўных межаў. Вільню ў нас ніхто ня змог забраць, ніхто ня здолеў адлучыць нас ад Вільні, бо яна жыве ў нас.
І летувісы прызналі нашую Вільню за сваю. Бо ад дабра дабра не шукаюць. Усьцешна, што летувісы ганарацца нашай Вільняй, называючы яе сваёй, мянуючы яе Вільнюсам. Вільні на ўсіх хопіць!
Любоўю й пакланеньнем трываляцца сьвятыя месты ў вячніне.
І пакуль стаяцьме Вільня, у беларусаў будзе што ўспамінаць будзе, па чым сумаваць. Будзе жыць сподзеў!
*1 сакавіка*
*Друкуецца паводле: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С. 21.*

2001. Квяткоўская Ядвіся
* * *

Горад Вяльможны,
нясьпелае раньне.
Кроплі расы на бухматай герані.
Вецер гартае пажоўклую кнігу
Аб каралеўскім каханьні Ядзьвігі...
Птушкай тутэйшай ступаю па бруку
Вузкае вулачкі.
Ціша, ні гуку...
Крыжык бурштынны ў далоні сьціскаю —
Вусны прашэпчуць:
— О, Ганна Сьвятая,
У Вільню вярнуся па Божае Волі
Зноў пілігрымкай,
турысткай — ніколі.
*11 сакавіка*
*Паводле: Бацькаўшчына. — Менск, 2001. С. 167.*
2001. Алесь Аркуш
Рэха між камяніцаў

скрозь Вострую Браму

мінаем, як скрозь магічнае
шкло, і трапляем
у іншы сьвет

ня ведаю, ці выпадзе
нам сустрэцца ў
тым іншасьвеце

бо ты намагаешся
яго ўбачыць,
нібыта сьвет толькі тое,
што можна ўбачыць

а я спрабую пачуць,
нібыта гук больш трывалы
за камень

беспрытульнае рэха
нястомна блудзіць
між камяніцаў,
зазіраючы ў вокны,
толькі рэха

* * *

сказаць два словы:
гаворыць Вільня —
і ведаць,
што цябе пачулі
ў родным Полацку

**Алесь Аркуш**, Аляксандар Козік (1960). Пэўны час жыў у Вільні.

*Друкуецца паводле аўтографу з архіву ўкладальніка.*

2001. Алесь Аркуш
Віленскія трохрадкоўі

* * *

Няўжо і ты,
Вільня,
спадзяешся на
літасьць

лёсу ў год
каня?
Вось і ноч
скончылася,
а над Вільняй
ня гаснуць
зоркі.
Нічога не
пакінуў Вільні
—
толькі цьмяныя
сны,
толькі мроі.
Гукні мяне,
Вільня, —
я пачую,
я адгукнуся.

На Замкавай гары
пад нагамі турыстаў
шукаю магілу героя.
* * *
* * *
* * *
* * *

*Друкуецца паводле аўтографу з архіву ўкладальніка.*
2001. Алесь Аркуш
* * *

на Літарацкай горцы
на могілках Роса
Аляхновіч абдумвае
новую п’есу

пра што тая п’еса?

пра вечнасьць
якая кіруе
зорамі на небе

пра сум
які незварушна
пільнуе магілу

пра час
які бязьлітасна
нахіляе да зямлі
помнік
*Друкуецца паводле аўтографу з архіву ўкладальніка.*

2001. Славамір Адамовіч
Радкі зь віленскай кавярні “Грамута”

Гэта цёмнае шкло бутэлькі,
за якім таямнічы шартрэз;
гэты цень, гэты бляск пастэлькі,
гэты сумны мясцовы Крэз;
карбанат і салата з морквы,
два па сто і таматны сок... —
і крыніца сяброўскай гаворкі
забруяла ў віленскі змрок.
*1 кастрычніка*
*Паводле “Нашай Нівы”, 2001.*
2002. Адам Глёбус
Менск і Вільня

У Вільні сьнег. У Вільні цішыня.
У Вільні ўтульна і выдатна сьпіцца.
Мне Беларусь заўсёды ў Вільні сьніцца
заможная, свабодная, мая…

У Менску дождж. У Менску мітусьня.
У Менску тлумна і няма спакою.
Тут не знаходзіш згоды сам з сабою.
Ды толькі ў Менску на Радзіме я.
*11 жніўня*
*Паводле Litara.net.*
2002. Тацяна Будовіч
* * *

у дрыготкім паветры Вільні
у прадоннай нябеснай сіні
смутак мой
супакой
і адчай паглынае душу
і сьлязьмі неадольна душыць
мой адчай
не карай
зграі скончылі паляваньне
толькі позірк на разьвітаньне
позірк твой
ты са мной
хай балююць да часу зграі
мы сустрэнемся ў іншым краі
*Паводле: Тацяна Будовіч. Дуэль паглядаў. — Менск, 2002.*
2003. Адам Глёбус
У нашай Вільні

Мароз у Вільні. Дзень цудоўны.
Мой сябра беларускамоўны
п'е брэндзі. Я гарбату п'ю.
У рэстарацыі шыкоўнай
гаворым ціха і тактоўна
пра Вільню, кожны пра сваю.
Ён любіць вежы і касьцёлы,
шынкі — дзе дух заўжды вясёлы,
архіў і універсытэт.
А я люблю ў царкве анёлаў,
кірмаш, вакзал і грукат колаў,
калі ў кішэні ёсьць білет.

Мароз і сонца. Дзень сапраўдны.
Мы п'ем: я — брэндзі, сябра — каву.
Дап'ем і пойдзем спаквaля.
У Вільні нас чакаюць справы.
Яму налева, мне направа,
бо Вільня ў кожнага свая.
*16 лютага*
*Паводле Litara.net.*
2003. Адам Глёбус

Разьвітаньне

Не сумуй безь мяне,
мая любая Вільня.
Праплыве, праміне
час нуды і бясьсільля.

Праляціць, прабяжыць
час гаркоты-маркоты.
Я вярнуся, каб жыць
доўга і бестурботна.

Ты маўчыш у адказ,
маім словам ня верыш.
Ты стаіш, як абраз.
Што мінула, ня вернеш.
*19 лютага*
*Паводле Litara.net.*
Пачатак XXI стагодзьдзя адзначыўся ў беларускай паэзіі новым усплёскам вершаў пра Вільню. З аднаго боку, ён справакаваны недаступнасьцю места, патрапіць у якое зь Беларусі стала складана. З другога — гэтая міражная прывіднасьць аднаго з галоўных паэтычных вобразаў у нацыянальнай традыцыі выглядае на паратунак самое паэзіі. Новая сытуацыя, у якой апынулася старая сталіца, зрабіла яе зноў прыцягальнай у сваёй недасяжнасьці і “чыстай красе”, чаго не адбылося пакуль з абсалютнымі вобразамі роднага слова ці Бацькаўшчыны-Беларусі, сытуацыя якіх застаецца пакуль і ня новай, і не зразумелай.
Паказальная тут гісторыя Адама Глёбуса. У 1997-м ён зьмяшчае ў “Нашай Ніве” эсэ “Мая Вільня”, якое пачынаецца словамі “Ня пішуцца вершы пра Вільню” (што трэба чытаць як “увогуле вершы ня пішуцца”) і канчаецца фразай “Напішуцца вершы пра Вільню”, а ўжо ў новым стагодзьдзі ў сваім інтэрнэт-форуме “Лірыка” публікуе шмат твораў, якія мусяць сьведчыць пра тое, што вершы “запісаліся”, і ладная частка між іх — менавіта пра Вільню. А побач з карыфэем Глёбусам свае віленскія вершы складаюць зусім маладыя паэты, якія, можа быць, і ня ведалі Вільні “прадметнай”, прынамсі, спазнаць яе так, як пакаленьне Глёбуса, не маглі.

Усё гэта дазваляе зрабіць дапушчэньне, што менавіта вобраз Вільні беларуская паэзія абірае дзеля свайго ўратаваньня і натхнёнага старту на новым храналягічным вітку. Але гэта ўжо гаворка пра паэзію новага, дваццаць першага стагодзьдзя.
*Укладаньне і камэнтар Сяргея Дубаўца*

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**


Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне**: **2003/12/14**
[image]

# Міхал Вівэг
# Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі

---

Заканчэньне. Пачатак у № 4/2003.

VII

**1.**— Дык што, — прамовіла яна праз хвіліну, агледзеўшыся, — ці спраўджвае гэта твае мяшчанскія ўяўленьні пра *дзявочы пакойчык*?

Я ўпершыню ў жыцьці бачыў у яе на твары сапраўдную ўсьмешку.

— Не. Але гэта спраўджвае маё ўяўленьне пра вызваленчае ўзьдзеяньне *пародыі*.

— А ты адпавядаеш маім уяўленьням пра *прынца-вызваліцеля*.

Я назіраў за ёй, нямала ўражаны: усьмешка рабіла зь ейным абліччам дзівосныя штукі.

Ейныя вочы зазьзялі:

— У Барсэлёне я купіла табе падарунак, — *удзячна* сказала яна.

— У аднаго *букініста*.

Яна падала мне рупліва запакаваную кнігу.

— Пэсталёцы, — выказаў я здагадку. — Ці мо Русо?

— Комэнскі, — ухвальна адказала Бэата. — Ты быў досыць блізка.

Яна пачынала мяне прыемна зьдзіўляць.

Яна трымалася небывала ласкава — нават змусіла сябе да *мяшчанскага* пытаньня, як я маюся. Я ёй крыху распавёў пра Порэч, пра Пулу і пра Ўмаг. Яна была поўная добрае волі й відавочна не хацела сварыцца, але, калі я згадаў пра расфарбаваны цягнічок, што злучае Ўмаг з курортным мястэчкам Котар, яна ня вытрымала:
— Расфарбаваны цягнічок? — паўтарыла яна насьмешліва. — Трымайце мяне.
— Так, — сказаў я крыху чапурыста. — *Расфарбаваны цягнічок*. Езьдзіць прыкладна кожныя дваццаць хвілінаў. Гэта вельмі… практычна.
— Божа мой! *Расфарбаваны цягнічок*!
— Што ты маеш супраць расфарбаваных цягнічкоў?
— Толькі тое, што ён абсалютна *фальшывы. Несапраўдны*.
— Ну і? — зноў сказаў я ўжо крыху звадліва.
Звадлівасьць — апошняя магчымая абарона супраць пажады.
— Што супольнага мае расфарбаваны цягнічок з *рэальным жыцьцём*?
— А што такое *рэальнае жыцьцё*?
Яна не адказвала.
— Не сварыцеся, — сказала Агата.
— Маеш на ўвазе шпіталі, вар'ятні ды разводныя кансультацыі?
— Можа, і так.
— Я жыву рэальным жыцьцём цэлы год, — сказаў я. — Цэлы год хаджу на працу, на пахаваньні, дыхаю смогам, наведваю цешчу, гляджу навіны… Я што, не магу на сем дзён забыцца?

Яна паглядала на мяне зь невыказнай пагардай.
— А што ты? Што *ты* рабіла ў Гішпаніі? — спытаў я. — Спадзяюся, ты там хаця б заснавала Лігу барацьбы супраць раку…
— Хадзіла на карыду, — паскардзілася Агата. — З адным амэрыканцам.
Мяне слаба кальнула пад грудзінай, але я засьмяяўся.
— Карыда *праўдзівая*, — запярэчыла Бэата.
— Божа мой, — сказаў я. — Да ўсяго яшчэ адвар з Гемінгуэя!
— Ты быў калі-небудзь на карыдзе? — баранілася яна.
— Ня быў.
Гэта прагучала больш рэзка, чым я хацеў.

Раптам яна схілілася нада мной.
— Дык ты ж *раўнуеш*… — сказала яна зь неўдаваным зьдзіўленьнем.

Я адвёў гаворку. Спачатку мы размаўлялі пра мэблю і ўвогуле пра жытло (як прыгадваю, я вёрз нешта пра тое, што *кожны інтэр'ер — гэта адбітак чалавечай душы*), а потым я пацікавіўся, як працягваецца Бэаціна пісаньне. Яна адказала няпэўна.
— Ты напісала што-небудзь? — спытаў я тады ў лоб.
Яна кіўнула.
— Можна мне гэта пачытаць?
— Не.
Інтанацыя не пакідала шанцаў.
— Як жа наш курс?
Яна не адказвала.
— Калі мне памяць ня здраджвае, за гэта мне й плацяць…
— Глядзі, каб ты гэтымі грашыма не абасраўся! — жорстка сказала яна, але, калі мы ўсталі, каб сысьці ў кухню, дзе Агата гатавала нам клубнічны кактэйль, яна выцягнула зь пісьмовага стала празрыстую тэчку з караценькім, на дзьве старонкі, апавяданьнем "Тата і я". Калі яна мне яго працягнула, я заўважыў у ейных вачох нейкую *мяшчанскую* слабасьць.
— Дзякуй, — сказаў я.
Яна хацела, каб назаўтра я ёй прынёс рукапіс "Цудоўных гадоў сабаку пад хвост".
Хто б паверыў.
У кухні ўжо Агата з намі засталася. Мне не хацелася яе выстаўляць (рызыкуючы, што яна зноў на некалькі дзён пакрыўдуе), апроч таго, я адчуваў, што ейная прысутнасьць дапамагае нам з Бэатай наладжваць момантамі яшчэ зьбянтэжаную гаворку.
Так нас, прыйшоўшы, і засьпеў Крал. Да васьмі яшчэ было далёка, і я трохі пабойваўся, як ён паглядзіць на такую нетрадыцыйную форму навучаньня. Аднак калі ён пабачыў, што колішняя жрыца смутку вясёла папівае малочны кактэйль, ён прыняў надзвычай задаволены выгляд, а калі затым Бэата (на маё немалое зьдзіўленьне) прэзэнтавала яму некалькі маіх больш-менш выпадковых папярэдніх заўваг пра выгады дахавых вокнаў як *наш супольны праект агульнай перабудовы ейнага*

*пакою*, ягоная радасьць з чагось такога *канструктыўнага* ня ведала межаў. Хапатліва ківаючы, ён паклікаў жонку і радасна пераказаў ёй нашу задуму. Захапіўшыся сам, ён падаваў нам усё новыя ідэі, абдымаў абедзьвюх дачок за плечы і ўрэшце зьбегаў у свой кабінэт па ноўтбук, зь якога нам трыюмфальна счытаў назвы, адрасы, тэлефоны й нумары рахункаў *найлепшых*, *найбольш апэратыўных* і *самых салідных* будаўнічых і мэблевых фірмаў у Чэскай Рэспубліцы. Агата праз хвілю з сумным выглядам пакіравала з кухні, а Бэата тым часам пільна сачыла за маім тварам; калі яна шукала на ім сьляды нейкай іроніі, гэта быў марны занятак, бо я быў апошні, хто б не зразумеў, наколькі радаснаю палёгкай можа быць раптоўны пераход ад духоўнага да рацыянальнага, або — у выпадку ейнага бацькі — перамяшчэньне з тонкага лёду *мэталёвай псыхадэліі* на трывалую глебу *будаўнічага нагляду*.

— Заўтра вы б маглі зазірнуць у “Ікею”, — марыў уголас Крал.
— Там прадаюцца *шыкоўныя рэчы*.
— У нас гэта ў плянах, — адказала Бэата. — Але *маэстра* пра гэта пакуль што ня ведае.
— Заўтра *калі*? — спытаў я.
— Заўтра з *раніцы*, — падкрэсьліла Бэата. — Тата заплаціць табе звышурочныя.
Мы ўсе з гэтага пасьмяяліся.

**2.** Бэаціна апавяданьне я ўзяў у рукі з шчырай цікаўнасьцю. Я прачытаў яго дома яшчэ ў той самы вечар (з пэўным узрушэньнем, яшчэ далёкім ад той апрыёры скептычнай апатыі, зь якой — пасьля году працы ў выдавецтве — я бяру ў рукі незнаёмыя рукапісы цяпер). Я ня маю намеру ўдаваць, што гэтае апавяданьне *ключавое* ці *кідае абсалютна іншае сьвятло* на Бэату, тым ня менш я вырашыў яго сюды ўлучыць, бо ягоны сьвежы рэалізм быў для мяне пасьля ўсіх Бэаціных выкрыкаў пра *сапраўднае мастацтва* прыемнай нечаканасьцю. Да таго ж з розных гледзішчаў яно мне падаецца цікавым, нарэшце, не ў апошнюю чаргу яно — побач з маімі шматстаронкавымі рэфэрэнцыямі з другіх рук — адно зь нямногіх сапраўды аўтэнтычных сьведчаньняў пра *трагічна пагіблую Б.К.* Апавяданьне я перадрукоўваю даслоўна, толькі зь некалькімі дробнымі пунктуацыйнымі выпраўленьнямі:

ТАТА І Я

*Дамоў, дамоў? — вітае мяне ад стырна спадар Пасьпіхал. І вось я ўжо зноў сяджу ў аўтобусе і еду дамоў. Побач — зусім чужы мужык у штанах з задзірыстым клятчастым узорам (кажу задзірыстым, бо чалавек заўсёды вымушаны прасочваць, як гэтыя краткі разьбягаюцца ў розныя бакі); а віной усяму — гэтыя неверагодна бесцырымонныя квіткі, дзякуючы якім нават абсалютна чужы чалавек можа без адзінага слова ўсесьціся каля вас і з абсалютнай безумоўнасьцю, за якую б ён заслугоўваў пары аплявух, адчыніць гэты свой неверагодны дыплямат, выцягнуць свой неверагодна важны штодзёньнік і нібыта ў ім нешта шукаць (не разумею, як у канцы дваццатага стагодзьдзя нехта можа такое рабіць з сур'ёзным тварам!). Цяпер ён, вядома, штодзёньнік загортвае, ён ужо сябе паказаў, так што цяпер можа й падрыхнуць і (як я мяркую) класьці пры гэтым сваю мазгаўню мне на плячо ды чапляцца сваёй гнюснай шчэцьцю за мой швэдар. Цяпер ён, да таго ж, спакойна паглядзеў збоку мне ў твар, дык каб жа проста паглядзеў, але ж ён так апухла залыпаў і заплюшчыў вочы. Мне мо здаецца — толькі зірнеце: ён сапраўды дрыхне! У маёй прысутнасьці.*

*Ах, божа мой, вось і родны засьценак, белая цыдула з чорнымі літарамі, графічна выглядае страшэнна, але вы нават слова сказаць не пасьпееце, і вось ужо вясковы пляц, як у "Прададзенай нявесьце"*[1]*, і тата, мой тата ў спэцоўцы. Усё, што я калісьці любіла, цяпер мне раптам здаецца недалужным. Мужык побач прачнуўся, так што, зразумела, бачыць гэтую задніцу сьвету, у якой я выходжу. Здароў, раве тата, чаму ён заўсёды гэтак раве?, і ўсе ў аўтобусе бачаць, як ён падае спадару Пасьпіхалу замарожаныя бычыныя яйцы ў поліэтыленавых мяшэчках, а спадар Пасьпіхал дае нашаму тату поўную прыгаршч "Бруфэнаў", а ў таго адна гэтая срэбная пласьціна падае за халяву, і тата — божа мой, не! — разуваецца й паказвае ўсім пасажырам за вокнамі аўтобуса гэтыя свае аранжавыя хемлонавыя шкарпэткі, якія вытрымаюць больш, чым сама нага, а другая пласьціна ў яго падае проста пад кола, і, калі тата нагінаецца да шыны, спадар Пасьпіхал дзеля пацехі крыху папаедзе. Стой, каб цябе! — крычыць тата, у яго храскае нешта ў сьпіне, і ён з намогай выпросталяецца, а спадар Пасьпіхал гукае: Вазьмі, бля, Бруфэн! Я гляджу ўбок. Здароў, кажа нарэшце тата, ну ў цябе й выгляд, і паглядае на мой барэт і мой парыскі*

*пінжак, але відаць, што я яму падабаюся, ён няўклюдна мяне цалуе і гладзіць даланёй, поўнай трэсак зь лесу (аднойчы я ўвагнала сабе стрэмку проста зь ягонай далоні), і глядзіць на мяне, і я раптам бачу, як ён шкадуе, што я кінула вучыцца, у першы раз ён мяне праводзіў да інстытуту праз парк перад вакзалам, гэта была досыць прыемная частка дарогі, тыя каштаны, сьцяг бразыльскай амбасады, на які я заўсёды глядзела, а потым зьявіўся той жахлівы падземны пераход пад магістраллю — але ж паспрабуйце каму сказаць, што вы кінулі вучыцца празь нейкі сраны падземны пераход, — і раптам ён кажа: Вяруна сёньня замуж выходзіць, ведаеш?*

**[1] Опэра Бэдржыха Смэтаны (1824—1884).**

*Ён адчыняе свой новы БМВ. Хочаш за стырно? — пытаецца ён у мяне, а я гляджу на каробку перадач, дзе ў яго замест падважніка прыкручана налякаваная карчажына, і кажу: Гэтым хуткасьці пераключаць? Лепш ужо лес карчаваць… а тата сьмяецца і наўмысна правакуе: Што скажаш на гэта? — паказвае ён на стырно, новаабцягнутае цялячай скурай, і я бачу, што яму хочацца, каб я была ягонай дасьціпнай разумнай дзяўчынкай, і таму кажу: Жах — гэта ты ажно так сумаваў па той карове, на якой яшчэ данядаўна езьдзіў? Хрэна сумаваў,*

*сьмяецца тата задаволена. Ніякага ня хрэна, адказваю я, табе гэта кожны псыхіятар скажа. Псыхіятры, сьмяецца тата, могуць мне сраку пацалаваць! Сьмяюся і я. Аднак я стамілася. Ня бойся, кажа тата, калі гэтыя бандзюгі тое поле купяць, аддам табе Гольфа. Я яго пачынаю жучыць за бруд у прыскрынку, дзе ляжаць касэты, але ён ужо паглядае на пляцоўку перад мясцовай студняй. Што там дзеецца? — пытаецца ён сам сябе, вось ён іх ужо пазнае: А-а, Зэман, кажа ён. І ягоныя мэлёды бойз, падумаю я сабе ўжо зь нейкім сумам. І ягоныя мэлёды бойз, кажа тата, а я сьмяюся. Так ня пусьціць, гаворыць тата, мо ў цябе драбяза ёсьць? Не даваць жа мне ім пяць соцень. Я выцягваю дзьве стокронавыя купюры для Вяруны ды ейнага жаніха, вось яны нас ужо спыняюць, кожны мой прыезд — гэта пастка, у Зэмана блазенскі клятчасты пінжак, зноў у нейкія задзірыстыя краткі, зноў мяне нехта прымушае піць, зноў мне трэба ўсьміхацца, калі я не хачу, зноў мне нехта збоку пазірае ў твар, мой тата, чужы чалавек з квіткам на суседняе месца.*

**3.** З раніцы я нёс Бэаце як ейнае апавяданьне, так і свой рукапіс, але яна, на маё зьдзіўленьне (я быў цалкам ахвотны ўрэшце наш курс сапраўды распачаць), пра літаратуру размаўляць не схацела.
Ейныя думкі луналі, відавочна, недзе далёка. Я да сёньня не зусім разумею, як гэта сталася, і тым ня менш: Бэата ўсёй сваёй істотай захапілася ідэяй пераабсталяваньня свайго пакою. За адну ноч каля ейнага ложка вырас мэтровы стос часопісаў “Дом”. Хапіла ночы, каб сьвежанароджаную думку яна пачала выдаваць за свой *даўні, так і не ажыцьцёўлены намер* і каб у ейным слоўніку зьявіліся выразы кшталту *гармонія формаў*, *натуральнае асьвятленьне* ці *пласьцінныя пераборкі*.
— Пласьцінныя пераборкі аптычна разьдзяляюць памяшканьне і спрыяюць лепшаму яго праветрыванню, — прыкладам, казала яна.
Тым ранкам яна, маўляў, рабіла прабежку і *зьбегам акалічнасьцяў* спынілася ля вітрыны мясцовай мэблевай крамы. Большасьць выстаўленых узораў, маўляў, была ці то *адборны шырспажыў*, ці то вечныя *псэўдарустыкальныя вычварэньні*, але нібыта там было і абсалютна беззаганнае крэсла-гайданка *гнуты бук*. Дарогай дадому яна яшчэ, як сказала, трохі думала

пра завесы — нібыта яна вагалася паміж *пяшчотна-ружовай* і белай гармоніяй *тон у тон*. Я спрабаваў ейнае захапленьне сунімаць (натуральна баючыся за ягоную *даўгавечнасьць*), але вынікі маіх намаганьняў былі вартыя жалю. Хоць я й прымусіў яе хоць бы абмераць пакой і намаляваць плянік, але ўсе мае заклікі да *канцэптуальнага роздуму над магчымымі варыянтамі вырашэньня інтэр'еру* (ня кажучы ўжо пра маю прапанову наняць кватэрнага архітэктара) яна з пагардаю адрынала.
— Навошта? Дзеля чаго? — не пагаджалася яна. — Тут будзе жыць архітэктар ці я?
Да гандлёвага дому "IKEA" мы дабраліся яшчэ да яго адкрыцьця. А за раніцу мы, паводле складзенага Кралам сьпісу, які я ў машыне — на манер аўтагоншчыкаў — трымаў на каленях, бы вопіс трасы, наведалі (наколькі я памятаю) яшчэ тры гандлёвыя цэнтры, два антыкварыяты, салён дацкай мэблі *"Scanecо"*, некалькі спэцыялізаваных крамаў з дыванамі, некалькі салёнаў плеценай, бамбукавай і ратанавай мэблі, крамы фірмаў *"Кратахвіл"* і *"Triant"* ды выстаўны салён фірмы *"Europa Möbel"* (я падумаў, ці ня варта мне тут падкрэсьліць, што ніводная зь фірмаў, што згадваюцца ў гэтай кнізе, *не паспрыяла* ейнаму выданьню сваёй спонсарскай дапамогай). Цягам прыкладна чатырох гадзінаў мы купілі трохдзьверную шафу і тры паліцы на кнігі з чорнага ясеню, кантэйнэр чорных разборных столікаў, два трубкавыя фатэлі з ружова-фіялетавым *тэкстыльным сядзельнам* 1931 году выпуску, ружова-фіялетавы ваўняны дыванок *высокі волас* і чорны кош для паперы маркі *"Trend"*. У краме *"Майстэрня"* нам удалося адшукаць цяжка апісальны чорны шкляны прадмет, які зь першай хвіліны выклікаў ува мне агіду праз сваё яўнае падабенства з аб'ёмным рэнтгенаўскім здымкам вавёркі, тым часам як Бэату ён, наадварот, прыцягнуў *сваёй няўлоўнасьцю* і *здольнасьцю шматразова раскладаць сьвятло так званай сапраўднасьці*. Нам не ўдалося хіба знайсьці шпалераў зь неабходным малюнкам, ложка і люстры.
Асноўныя абрысы канцэпцыі, якую я назойліва патрабаваў ад Бэаты, складаліся ў яе проста ў машыне падчас пераездаў паміж асобнымі крамамі, а канчатковы выгляд набывалі, калі яна, стоячы каля касы, шукала ў сваёй сумцы чэкавую кніжку. Мая роля палягала галоўным чынам у марных спробах зьмераць адпаведны прадмет раней, чым Бэата за яго

заплаціць, за што на зваротнай дарозе яна мне шырокім жэстам прапанавала ўзяць што захачу з старой абстаноўкі пакою. Уявіўшы, што абсталяваньне нашай *мяшчанскай гасьцёўні* я б мог папоўніць, скажам, расьпілаваным напалам нафтабакам, я, не стрымаўшыся, усьміхнуўся.

Бэата абражана дадала газу.
— Калі можна, я папрасіў бы стаматалягічны фатэль, — сказаў я пасьпешліва.

Насуперак пэрыядычным (але зь цягам часу, на шчасьце, усё больш фармальным) жончыным пратэстам, ён да сёньня стаіць у маім кабінэце, закансэрваваны ў такім выглядзе, які проста змушае да мэдытацыяў. Першапачатны сьветлы скуразамяняльнік абцяжкі быў ужо значна зьлінялы і ў некалькіх месцах прадраны, а таму я папрасіў сваю бабулю-кушнерку, каб яна пашыла які-небудзь чахол; дзякуючы таму, што яна скарыстала на гэта рознакаляровыя акраўкі, фатэль страціў свой строгі характар і цяпер некаторыя мае госьці часта нават не здагадваюцца пра ягонае колішняе зьверскае прызначэньне. (Зрэшты, я раблю тое самае: шыю вясёлыя накідкі, каб закрыць імі сырую рэальнасьць болю.)

Па вяртаньні з Прагі Бэата найперш маланкава праінспэктавала свой пакой, пасьля чаго без ваганьняў скіравалася да тэлефона, каб выказаць бацьку сваё зьдзіўленьне зь няўцямнага факту, што хаця ўжо гадзіна дня, у ейных апартамэнтах дагэтуль *няма* неабходных дахавых вокнаў. Крал, відавочна, паабяцаў імгненна ўсё выправіць, бо ў канцы размовы яна зусім недвухсэнсоўна ў слухаўку цмокнула.
Запрашэньне на абед я, як саламяны ўдавец, прыняў з удзячнасьцю.
Агата перакуліла толькі адну шклянку.
Пасьля абеду Бэата пераапранулася ў *працоўнае адзеньне* (чорнае японскае кімано з драконам на сьпіне і ядвабную хустку на галаве), і мы ўзяліся за ачыстку памяшканьня. Калі прабіла тры, у браму ўехаў пікап фірмы *“Velux”*. Пяць мужчын у аднолькавых чырвоных камбінэзонах насілі ў мансарду начыньне, драбіны, дошкі, бляху, аконныя рамы, шыбы, дахоўку й шклавату, а іхнае дзяўбаньне, якое пачулася

сьледам, безь перабольшаньня зьнемагчыміла наша знаходжаньне ў доме. Бэата вырашыла, што час, які мы будзем вымушаныя правесьці на дварэ, мы скарыстаем на тое, каб спаліць *старое барахло*, пад чым разумелася некалькі драўляных скрынак, да сёньня схаваных пад ейным ложкам. Тым часам як мы з Пэтрыкам выносілі іх на двор, Агата на старым вогнішчы ў садзе за домам расклала агонь.
Бэата адчыніла найменшую з скрынак, якая ўтрымлівала пераважна сувэніры зь лістапада 1989-га: ручна маляваныя транспаранты *“Хто, калі ня мы?”*, *“Калі, як не цяпер?”* і *“Зранку зноў праўду!”*, палоску тканіны з паведамленьнем пра тое, што страйк у радацінскай гімназіі працягваецца, сушаныя коркі ад памаранчаў, пашарпаныя асобнікі трыкалёру, фатаздымкі Вацлава Гаўла, Вальтэра Камарка, Мілаша Зэмана ды кардынала Тамашка, а таксама некалькі значкаў з надпісам *“Дубчака на Град!”*. Яна корпалася ў гэтым шмацьці зь відавочнай агідай, там-сям нешта выцягвала, але ўрэшце высыпала ў агонь усё зьмесьціва скрыні.
За спадара прэзыдэнта я б рукі не пашкадаваў, але выцягваць з полымя ягоную фатаграфію мне падалося залішнім. Пэтрык весела ўхмыляўся.
— Пляваць на рэвалюцыю? — кінуў я ў бок Бэаты.
Яна толькі рукой махнула — а што адказваць? Гэта быў учорашні дзень.
Насуперак гэтаму зьмест другой скрыні Бэату літаральна *праняў*; з *хваляваньнем* яна брала ў рукі зжаўцелыя малюнкі й пакамечаныя часопісныя выразкі, з *замілаванасьцю* выцягвала — і чытала — нейкія машынапісныя вершы, *асьцярожна* разьвязвала стосы лістоў, перавязаныя выцьвілай стужкай, *моўчкі* глядзела на фатаздымкі маладых мужчын (якія ў палітыку, пэўна, увайсьці не пасьпелі), прынюхвалася да корка з-пад шампанскага й гладзіла спартаўскі хакейны швэдар з нумарам 22.
Ейнае кімано дало той эфэкт, што момантамі ўсё навокал перада мной паўставала, бы ў кінадраме Акіра Курасавы.
— Пайду зраблю сабе кавы, — сказаў я нарэшце.
— Пачакай, — схапіла яна мяне за руку.
З выразам чалавека, які наважыўся *парваць усе путы*, яна ўкінула ў агонь дыплём за другое месца на раённых спаборніцтвах у кросе і наўлечку зь пячаткай гатэлю

“Кршывань”. Аднак гэта толькі ўзмацніла маё пачатковае ўражаньне, што сваю мінуўшчыну яна насамрэч хоча не паліць, а толькі дэманстраваць.
З выглядам люнатыка яна мне сунула нейкую фатаграфію:
— Гэта ён…
Сучын сын, здагадаўся я.
Я задумаўся, гледзячы на яго асаблівы выраз твару, — ён пазіраў прыкладна так, як калі б толькі што туды й назад пераплыў Ля Манш і пры тым пагарджаў і плаваньнем, і каналам, і фатаграфаваньнем. Калі я павярнуў фатаздымак, на ягоным адваротным баку я знайшоў алоўкам перапісаны Гінзбэргаў верш пра тугую задніцу нейкага мёртвага бэйсбаліста.
Я кінуў яго ў агонь; на ім павыскоквалі дробныя бурыя пухіркі, і жар адразу ж яго скруціў.

Агата спалохана зірнула на сястру.
Тая была белая, як гейша, але не сказала нічога.
Пэтрык зь цікаўнасьцю паглядаў збоку.
Я падкінуў яшчэ пару рэчаў. Спартаўскі швэдар з наўлечкай гарэлі слаба.
— Хочаце спаліць усё *як сьлед*? — спытаў Пэтрык.
— Даверым гэта яму, — сказаў я Бэаце. — Думаю, у яго багаты досьвед чыстак.
Ён зь сьмехам пагасіў амаль патухлы агонь, накідаў незгарэлыя рэшткі назад у скрыню і адбег у гараж. Праз імгненьне ён вярнуўся і з хвіліну поркаўся ў скрыні, нешта майструючы.
Я адвёў сёстраў крыху ўбок.
Бэата трохі нібы зьдзервянела, але ўвогуле не ўпіралася.
— Трымайце капялюшыкі, — з асалодай выгукнуў Пэтрык. — Зараз трошкі рване.
— Кракатыт[2], — сказаў я.
Абняўшы абедзьвюх дзяўчат за плечы, я ўласнай вагой прыціснуў іх да зямлі.
Іхныя валасы пахлі дымам.
Нашы з Бэатай абліччы дзяліў адзіны пучок травы — і гэта мяне зьлёгку нэрвавала. А то ж: з такой блізіні ў мяне відаць расьцягненыя сітавінкі.
Мінуўшчына Бэаты Кралавай выбухнула агнявым шугавіньнем бэнзынавых выпарэньняў.

Вось так.

**4.** Другі дзень закупаў быў, так бы мовіць, *днём спатканьняў*: хаця час адпачынкаў і блізка яшчэ ня скончыўся, цягам нашых паходаў па ўнутранай Празе мы напаткалі адразу колькіх знаёмых.

Першае з гэтых спатканьняў адбылося на Доўгай вуліцы, і акрамя ўсяго іншага яно несла ў сабе тую мараль, што мінуўшчыны нельга пазбыцца, спаліўшы пару лістоў з фатаздымкамі.

— Буда! — выгукнула Бэата.

На дагэтуль нязьнішчанай частцы ейнай мінуўшчыны матлялася барада да самага пасу, прапацелая вышываная кашуля была расшпіленая аж да магутнага жывата, а неймаверна брудныя ногі насілі скураныя адкрытыя сандалі.

— Бэатка! Пустэльная красачка! — выгукнуў апрануты, як бамж, грэнь бізнэсмэн Прагі-1. — Ану, хуценька бяжы пацалаваць мяне ў бараду. Ён яе ўсю абсьліняў, але ёй гэта бог вед чаму спадабалася.

— Куды дзьмеш, вятрыска? — падзівіўся ён. — Куды ляціш, лісточак?

Яна завагалася:

— Цягаемся…

— Ах, пацягушкі? — усьміхнуўся ён *загадкава*. — Пацягушкі-пацягушкі?

— Ну так, — сказала Бэата. — Проста цягаемся.

— Шукаем шпалеры, — удакладніў я ахвотна. — І люстру.

У яго быў такі выгляд, нібы я гэта сказаў па-фінску. Здумлёным позіркам вялікага гнома, які памылкова заблукаў на нейкі тэнісны матч, ён бегаў вачыма з Бэаты на мяне і назад.

— Не брашы! — агаломшана сказаў ён нарэшце.

Бэата выпусьціла цыгарэтны дым.

— Ну так, — сказала яна *містычна*.

— Бабло, значыць? — *па-змоўніцку* сказаў ён. — Сотак пяць, скажы?

— Будзь пэўны, — сказала Бэата *значэнна*.

Ён упершыню павярнуўся да мяне:

— Дык што, саліднае бабло?

Я крадком зірнуў на Бэату, але яна адвяла вочы.

— Ну так, — сказаў я нарэшце, разважыўшы, што вымавіць

2
**Фантастычнае выбуховае рэнэсанс аўтабіяграфічнае ўдзячнасьці адзінаймённым рамане Карла Чапка.**

уголас слова “бабло” для мяне было б гэтаксама праблематычна, як, напрыклад, *“Восьмая “Б”, сюды”*.
Ён працягваў мяне вывучаць:
— Бабкі-бабачкі?
І дасьведчана падмірґваў.
Зь мяне было досыць.
— Магчыма. Магчыма, і так можна сказаць. На слэнгу, — сказаў я незадаволена.
Ён паадступіў і схіліўся да самага майго твару. Потым адскочыў назад:
— Што за сранюка ты з сабой цягаеш?
Я назваўся.
— Што гэта за сранюк?! — гукаў ён, *ня цямячы*.
Бэата моўчкі пагладзіла яму спацелую скронь.
— Ня будзем вас больш затрымліваць, — сказаў я. — Мяркую, вы ўсё адно сьпяшаеце на аўтастоп?
Бэата засьмяялася, і нават на мяне зірнула.
Гэта было міла.
— Які, бля, аўтастоп? Што гэта, бля, за сранюк? — енчыў ён здраджана.
— Ну, тады вы, відаць, сьпяшаеце на нейкі *раўт*.
Ён пакрыў мяне сэрыяў мацюгоў.
Мне было сапраўды прыемна.

На стаянцы на Карлавым пляцы — усё яшчэ бязь люстры, але ўжо абцяжараныя тузінам шпалерных ролек — мы спаткалі сямейнага сябра і майго аднаклясьніка з гімназіі інжынэра Давіда Шульца. Я пазнаёміў яго з Бэатай з пэўным задавальненьнем, бо *ягоныя* ногі ў скураных сандалях былі чыстыя. Бэату я азначыў за сваю *сяброўку*.
— Куды зь сяброўкай кіруеце? — пацікавіўся ён.
— Шукаем зь сяброўкай люстру, — паведаміў я яму асьцярожна.
Ён кіўнуў — маўляў, зразумела, — не адчуваючы неабходнасьці далей гэта неяк камэнтаваць.
Для ўмацаваньня нашага сяброўства ён у той момант ня мог зрабіць больш.
— І ложак, — дадала Бэата. — Маэстра дапамагае мне яго выбраць — ён у ложках сапраўдны спэц…
Яна *ўдзячна* пацалавала мяне ў шчаку і *ўздыхнула*.

Я быў вымушаны адзначыць сабе, што наш узаемны двубой дасьпеў да крыху небясьпечнай, але надзвычай прыемнай стадыі.
Інжынэр Шульц засмучона паківаў галавой, пры гэтым высоўваючы падбародак трохі наперад (апошнім разам гэты пакорлівы жэст я бачыў некалькі год таму, калі ў Сазаве я зусім нечакана перайграў яго ў настольны тэніс).
— Магчыма, — сказаў ён задуменна, — мне таксама трэба было пісаць.

І трэцім разам, у Збраславе, калі мы на Бэаціна жаданьне выйшлі *на ўсялякі выпадак* каля мэблевай крамы, мы натрапілі на каляжанку Таўфэраву.
— Гэтая *прыгожая жанчына* ці не Бэатка Кралава? — усклікнула яна *зь недаверам*.
Шмат гадоў таму яна ў яе выкладала расейскую мову. Пахваліўшы Бэаціну *цудоўную* летнюю сукенку і *цудоўны* загар, яна нас зьмястоўна паінфармавала пра стан здароўя сваёй старой цёткі, хворай на лейкемію. Пасьля гэтага яна пацікавілася, *што гэта мы нясём*; малюнак на купленых шпалерах яна назвала *вельмі прыгожым*, а выбраны клей *беззаганным*.
Нарэшце яна ня вытрымала:
— А дзе твае дзяўчаткі? — згадала яна.
— Яшчэ на моры, — сказаў я спакойна. — Мне трэба было вярнуцца раней дзеля сякой-такой працы.
Яна ўсьміхалася пафарбаванымі вуснамі.
— Перадавай ім ад мяне прывітаньне.

**5.** Сваёй хуткасьцю, арганізаванасьцю і колькасьцю занятых працаўнікоў рэканструкцыя Бэацінага пакою нагадвала ўзьвядзеньне дэкарацыяў у высокабюджэтным амэрыканскім фільме, у прадусара якога *гарыць тэрмін,* — абодва дахавыя вокны канчаткова ўсталявалі яшчэ ўначы, а за раніцу паклеілі шпалеры й прыбралі, так што адразу пасьля абеду супрацоўнікі фірмы *“Шлейхрт і сын, насьціл падлогавых пакрыцьцяў”* маглі разаслаць ружовы плюшавы дыванок. Нам з Агатай, Бэатай і Пэтрыкам засталося адно нясьпешна пазаносіць у пакой найперш старую, а тады й новакуплёную мэблю — у тым парадку, у якім яе цягам дня паступова прывозілі з розных

крамаў. Трэба сказаць, што, нягледзячы на раней памянёныя адрозьненьні між Бэаціным і маім густам, усё памяшканьне ўрэшце выглядала (нават з старым ложкам і бязь люстры) надзіва міла і ўтульна, а калі я, да таго ж, нафтабак, што дагэтуль перашкаджаў у мансардзе, вынес вонкі й паставіў пад гаражную рыну, я ня мог пазбыцца ўражаньня, што мая рацыяналістычна-аптымістычная місія была не такой няўдалай.

Крал з Кралавай зьявіліся пад сёмую. Іхны прыход засьпеў мяне ў тое імгненьне, калі я сканчаў сыстэматычнае парадкаваньне кніг на паліцах, што салодка пахлі навіной (прычым звычайную *нацыянальную* прыкмету я інтуітыўна камбінаваў з крытэрам, які можна вызначыць як *ступень аўтарскай шызанутасьці*), спрабуючы ўвадначас з дапамогай урыўкавых ведаў творчасьці Фройда растлумачыць сабе *радаснае буркатаньне*, зь якім дзяўчаты складалі Бэаціны майткі і станікі на адну з палічак новай чорнай адзежнай шафы. Праз дахавыя вокны ў пакой трапляла мяккае надвячоркавае сьвятло, якое на ружовым дыванку высьвечвала залацістыя сонечныя плямкі. Крал разуўся:
— Хораша! — зачаравана прамовіў ён.
Спадарыня Кралава пагладзіла мне руку і сказала, што гэта *казка*.
А я, маўляў, *сапраўдны чараўнік*.
Я разумеў, што яна мае на ўвазе, і зь нейкай *вясёлай сьціпласьцю* марна спрабаваў ёй намякнуць на сур'ёзныя рэчы: што сёньня, на жаль, на студні сядзіць не адна злая жаба, якую скінуць няцяжка, і што на месцы адной адсечанай цмачынай галавы часьцяком нарастаюць тры.
Крал у шкарпэтках падышоў да абедзьвюх сваіх дачок і расчулена іх пацалаваў.
Мяне, нягледзячы на мае слабыя пратэсты, ён затым зацягнуў у свой кабінэт, дзе мяне па-мужчынску абняў і ўзнагародзіў шклянкай шатляндзкага віскі *"Glen Deveron"* і дзесяцьцю тысячамі крон.
— Я ведаў, што ты дасі рады, — сказаў ён усхвалявана.

VIII

**1.** Калі, павячэраўшы, мы з Бэатай вярнуліся нагору, на дварэ было цёмна. Так мы даведаліся, што яшчэ адной з выгадаў

дахавых вокнаў ёсьць магчымасьць назіраць за начным небам проста з пакою. Тады мы ўладкаваліся ў фатэлях 1931 году выпуску і глядзелі на зоры, якім былі мільёны гадоў.
— Любата, — сказаў я.
Бэату наша нечаканае адкрыцьцё натхніла на развагі пра *хранатоп*, якія, аднак, сёньня я ўжо ня здолею рэканструяваць нават прыблізна (прыгадваю толькі ейнае цьверджаньне, што ў такім становішчы, маўляў, можна зразумець *ну абсалютна ўсё*, якое выклікала ўва мне ірацыянальную надзею, што, седзячы тут, я б, можа, змог некалі зразумець і раманы Даніэлы Годравай[3]).
— Думаю, чалавек не абавязаны ўсё разумець, — заўважыў я суладна з сваім пераканаьнем і распавёў ёй між іншым пра Ванэгутаў тэрмін *“абарона ад інфармацыі”*.
— *Абаронца ад інфармацыі*, — разважала яна, — гэта цэнзар.
— *Аўтацэнзар*, — падкрэсьліў я. — Гэта розныя рэчы. Нейкай інфармацыі чалавек пазьбягае асэнсавана й добраахвотна — каб захаваць свой душэўны спакой.
— І падманвае самога сябе.
— І *міласэрна* прыхарошвае рэчаіснасьць так, каб яе было лягчэй перажываць.
— Спашліся яшчэ на гэты твой раман, — раптам сказала яна. Радасьць, што яна гэтак хутка прачытала мой рукапіс, зьмешвалася з насьцярожанасьцю, якую выклікала ўжо само словазлучэньне *“гэты твой раман”*.
— Працягвай, — сказаў я мужна.
(*Творцу не патрэбная крытыка, творцу трэба прызнаньне. Калі яму трэба крытыка — гэта ня творца.* Гертруда Стайн)
— Хіба гэта ня тое самае? — яна пахітала галавой. — Гэтая вечная апантанасьць *забаўляць*…
Я паціснуў плячыма:
— Гэта *страх не нагнаць нуды*.
Яна ўхмыльнулася.
— Сабачкі, бабулькі, папугайчыкі… Табе сапраўды гэта трэба?
Я дазволіў сабе з дакорам нагадаць ёй некаторыя стрыжнявыя прынцыпы сваёй паэтыкі, зь якімі я яе азнаёміў яшчэ падчас першай лекцыі, а затым гэтак разабраны матэрыял я дапоўніў сваёй улюбёнай, але не скарыстанай дагэтуль паралельлю, якая параўноўвае мае кнігі зь лістамі франтавіка да сваёй маці:
— Разумееш, — тлумачыў я, — у яго над галавой сьвісьціць

шрапнэль, зьнізу яго грызуць клапы й пацукі і галодны ён настолькі, што зжор бы й кішкі свайго найлепшага сябра, якія вунь вісяць на калючым дроце, але сваёй маці ён кожнага разу піша, што маецца добра і хутка прыедзе… Бо гэтая хлусьлівая вэрсія, *як я лічу*, ягоны сьвяты абавязак, — дадаў я з запалам.

**[3] Даніэла Годрава (1946) — чэская пісьменьніца, тэарэтык раманнага жанру; зазнала значны тэарэтычны ўплыў М.Бахціна.**

— Ты раззлаваўся, — канстатавала яна.
Я адказаў, што, як добраахвотны сувязіст паміж пагарджаным, аднак купляным *чытвом* і паважнай *літаратурай*, якой практычна ніхто не чытае, я, натуральна, мушу лічыцца з тым, што час ад часу на мяне будуць злосна гыркаць з абодвух лягераў. Я спадзяваўся, што гэтую маю бліскучую фармулёўку яна належна ацэніць, аднак, відавочна, у думках яна была ўжо далёка.
— У якім выпадку ты б *напэўна* забіўся? — спытала яна зьнячэўку.
Беспасярэдні паварот гаворкі пра мой раман да разваг пра маё магчымае самагубства мяне пазабавіў.
Аднак яна дамагалася адказу.
— Я б напэўна забіўся, калі б зварыўся аўтагенам.
Зрабіла мне заўвагу, каб я гаварыў сур'ёзна.
Я задумаўся.
— Напэўна? Калі б мая дачка выйшла замуж за *сапраўды*

*страшэннага* чалавека…
— Напрыклад?
— Напрыклад, за Паўла Вітка[4], — сказаў я. — Або за Буду.
Я тэатральна здрыгануўся.
— *Жартачкі*, — сумна сказала яна. — Вось бачыш: ты ўжо нават *ня здольны* гаварыць сур'ёзна.
— Гэта ня жартачкі. Гэта — як напісаў Рамэн Гары — спосаб абясшкодзіць рэчаіснасьць, калі тая наважваецца ўчапіцца табе ў горла.
— Жартачкі і *цытаты*, — удакладніла яна расчаравана і пазяхнула.
Я ўстаў.
— Прапаную мір, — сказаў я. — Давай пакінем убаку нашыя адрозныя *жыцьцёвыя філязофіі* і застанёмся сяброўкамі.
— Ці мы едзем заўтра па гэтую люстру? — спытаў я, сыходзячы (нешта мне замінала сказаць слова *"ложак"*).
Яна расьсьмяялася.
Гэта было тыпова: калі б я ў дзьвярох спытаў пра Туаена, Сартра або гісторыю хрысьціянства, яна б і вокам не павяла, а спытаю пра люстру — яна ледзь дыяфрагму не надарве.
— Едзем з самае раніцы, — сказала яна з вачыма, поўнымі сьлёз. — Ты можаш спакойна начаваць тут.
За дахавым акном ухмыляліся твары фальшывых садоўнікаў, Сучыных сыноў, барсэлёнскіх амэрыканцаў і спартаўскіх хакеістаў.
— У мяне яшчэ дома трохі працы, — сказаў я здушаным голасам.

**2.** Сёньня Ота Карлас прынёс мне праект вокладкі [4] **Паўла Вітэк** *"Навінкі чэскай прозы"* на сёлетні год — у духу пажадлівы чэскі сьпявак, галоўнага рэдактара просты, ніякіх красьлюнкаў — выразны чорны надпіс на аднаколерным тле. "А ~~нядобры~~ Дзень Кантуркавай быў жоўты, "Мыс Добрай Безнадзейнасьці" — Любаміра Марцінка — блакітны.
— Замаўляю сабе ружовы, — сказаў я Оту. — Гэта будзе *love story* з усімі прычындаламі.
Ён узнагародзіў мяне сваёй стрыманай усьмешкай.

Я прачнуўся ў цудоўную сонечную раніцу. Пасьнедаў, узяў складны мэтар і, хутчэй фармальна панаракаўшы на *такі*

*спосаб баўленьня лета*, радасна выправіўся з дому.
Насуперак маім чаканьням, мы паехалі не па ложак і не па люстру, а — як мне з тэрасы пракрычала Агата ў блакітным купальніку — на Слапы[5]. Памахаўшы мне, яна зьнікла ў доме.
— На Слапы? — перапытаў я ў Бэаты, якая мыла ветравое шкло кабрыялета.
— На Слапы, — сказала яна аўтарытарна.
Агата — гэтым разам у зялёным суцэльным купальніку ў вялікія белыя гарошыны — несла ўжо капы і кош зь перакускай.
— У мяне няма плавак, — запярэчыў я.
— Дамо табе татавы, — Бэата падала знак меншай сястры, якая зноў зь сьмехам адбегла, а калі праз хвілю зь імі вярнулася, на ёй былі ўжо залацістыя бікіні, што камічна агалялі яе хударлявую попку. Бэата закаціла вочы. Каб дапамагчы Агаце зноў набыць пэўнасьць (і вызваліць нас ад ейнага далейшага пераапрананьня), я прымусіў сябе з *захапленьнем прысьвіснуць*. Яна ўсьцешана пачырванела і хацела мяне гульліва пляснуць па сьпіне, але, размахнуўшыся, трапіла рукой у люстэрка задняга віду.
— Аў!
Бэата, ссунуўшы бровы, паправіла люстэрка. Тады насадзіла цёмныя акуляры.
— Ну, — спытала яна ласкава, — ці ўжо можна?
Шаша была вольная.
Бэата ехала хутка, але ўпэўнена.
(Баюся, што ад нейкага часу клішэ *“жанчына за стырном”* страціла для мяне свой нібыта дасьціпны зьмест і сёньня значна хутчэй, чым нагоду для дурных анэкдотаў, уяўляе сабой для мяне сурочнае, панаднае спалучэньне эротыкі й сьмерці — і гэта, падкрэсьліваю, ніякая не інтэлектуальшчына.

**5**

**Вадасховішча на Вэлтаве непадалёк ад Прагі.**

Але тады яшчэ не.)
Тады яшчэ цёплы вецер кудлаціў нашыя валасы і абвяваў нашыя твары. Тады мой унутраны супакой каламуціў толькі той факт, што Кралавы плаўкі маюць леапардавы ўзор.
На першым роўным адцінку дарогі я пальцам лёгка дакрануўся да Бэацінага аголенага сьцягна, а другой рукой паказаў на зіхоткую шайбу сонца:
— Бабло, а-а! — празь вецер мне даводзілася крычаць. — Бабкі-бабачкі!
Куткі вуснаў ёй здрадзілі.
У Даўлі Агата запатрабавала марозіва. Мы пацешліва назіралі з машыны, як яна ў невялічкай чарзе праз правільныя пяцісэкундныя інтэрвалы сарамліва абцягвае залацістыя майткі.
— Я паводзіла сябе з табой жахліва, — сказала Бэата раптоўна і павярнулася да мяне. Ейны твар адбіваў нейкую асаблівую незадаволенасьць.
У мяне было адчуваньне, што я яе разумею.
— Я б хацела папрасіць у цябе прабачэньня.
Яна нават зьняла акуляры.

Распрананьне да плавак.
Як праўдзіва і пераканаўча выявіць цялесную прагу і пазьбегчы пры гэтым сьлінявай парнаграфіі? Хоць я й разумею, што ў эпоху “Пэнтгаўзаў”, эратычных рубрык у газэтах і ўсім народам сьпяваных прызнаньняў з *Дэйвіц дзяўчыне, што нікога не адрыне*[6], мне б ня варта было пакутаваць ад нейкіх празьмерных сумневаў, аднак гэта ўсё адно цалкам не пазбаўляе мяне душэўнае роспачы. Пару асьцярожных *эратычных* пасажаў у мяне было і ў папярэднім рамане, але

там я заставаўся схаваны (з чаго цешыўся, бы сапраўдны вуаер) за асобай так званага Квіда, а да таго ж я заўсёды мог вылузацца, спаслаўшыся на *раманную фіктыўнасьць*. Аднак што рабіць тут, у хроніцы падзеяў непрыхавана рэальных? Мне што, сапраўды ў наступным разьдзеле перад вачыма сваёй дачкі, сваёй жонкі, сваёй маці ды сваіх бабуляў расшпіліць прарэх і засунуць гэтага свайго брунатнага рассоўнага кватаранта ў вільготнае ўлоньне дваццацігадовай Бэаты Кралавай? Божа мой!
Як гэта Вацулік такое робіць?[7]

Пасьля дажджоў апошніх дзён трава ў Ждані выглядала вельмі сьвежай. Вада не была млява-цёплай, як тут часта бывае, а абдавала прыемным халадком. Раніца мінала ў адносна рэгулярным чаргаваньні двух звычайных відаў пляжнае дзейнасьці. Калі мы ішлі купацца адразу ўтраіх, не абыходзілася — дзякуючы Агаце — без пранізьлівага віску, пырсканьня й падводнага гарэзаваньня, пры якім вада літаральна *кіпела* (Бэата трымалася ўбаку, але мяне Агата сваімі худымі нагамі абдымала чым далей, тым бессаромней, пакуль я сваёй цяжкой лапай — з удаванай бурклівасьцю старога *леапарда* — не засунуў ейную галоўку пад ваду, пратрымаўшы яе там так доўга, што яна з кашлем і плачам крыўды сама пабрыла на бераг). Калі ж Агаце ў ваду не хацелася або калі яна некуды адбягала з чарговай сяброўкай, люстра вады, якое мы з Бэатай рабацілі па вусьцішна паралельных траекторыях, ледзь хвалявалася.
Падобна было й на сушы: як толькі на капе мы заставаліся адны, *вясёлая балбатня* хутка грузла. Калі гэта **6 Коліш ні гіт гурату** ўпершыню, нейкі час мы ляжалі моўчкі, а потым Бэата спытала:
— Ці сьвяткуеш ты Новы год?
Яе крыху *неактуальнае* пытаньне я палічыў толькі нейкай сымпатычнай адкрытасьцю, нейкім парадыйным прызнаньнем, што і яна ўсьведамляе гнятлівасьць запанавалае цішы, якая па Агаціным сыходзе разьлеглася на нашай капе, але было надзіва падобна, што ёй гэта *сапраўды* цікава. Тады я ўлучыў сябе некуды пасярэдзіне паміж артадаксальнымі прыхільнікамі шампанскага ды пэтардаў і ня менш артадаксальнымі адмаўленцамі якога-колечы навагодняга тлуму.
— Гм, — сказала яна. — А пра што ты думаеш, калі ўстаеш?

**6 Коліш ні гіт гурату** ***“Yo Yo Band”.***

Я аднавіў паўсантымэтровы прамежак паміж нашымі распаленымі плячыма.
— Маеш на ўвазе на Новы год?
— Штораніцы, — удакладніла яна. — Проста што ў цябе ў галаве, калі ты прачынаешся…
Я трывожна ўявіў апошні з тых *гард-сэкс фільмаў*, якія мне тымі днямі нейкі невядомы пажаднік штораніцы праектаваў на вочную сеткавіцу і ў якіх Бэата грала ролю, у акторскім жаргоне называную *прымай*.
— Нічога цікавага, — сказаў я. — Доўга не магу прачухацца.
З раніцы я няздольны на глыбокія думкі.

**7 Людвік Вацулік (1926) — чэскі пісьменьнік, колішні дысыдэнт, кнігі якога вызначаюцца максымальнай дакумэнтальнасьцю.**

Наступныя Бэаціны пытаньні датычылі — прынамсі тыя, пра якія я згадваю, — майго *ўспрыманьня* нашай нацыянальнай гісторыі (здаецца, яго я вызначыў як *зьмяшанае*), маіх *чаканьняў* ад надыходзячай эпохі Вадаліва (*супярэчлівыя*) і *прычынаў*, якія мяне прывялі на дарогу настаўніцтва (я сказаў, што ад нараджэньня адчуваў экзыстэнцыйную ўнутраную неабходнасьць перадаваць іншым гэтую эстафэту радаснага пазнаньня ды годнага гуманізму, а апроч таго мне была пільна патрэбная кватэра). Так мы падышлі да шлюбу: Як доўга я жанаты? Так доўга? Ці ёсьць у нас супольныя сябры? Што робіць жонка, калі я пішу? Як мы пазнаёміліся? Ці мыю я посуд? Што ў шлюбе самае цяжкае? Што прычына разводаў?
— Шлюб, — сказаў я.
Недзе я гэта чытаў.
Я імкнуўся адказваць наколькі магчыма праўдзіва і ўрэшце пачаў баяцца, што перад ейнымі дваццацігадовымі вачыма намаляваў карціну нейкай страхатлівай, *мяшчанскай* пэрспэктывы, аднак яна мяне пахваліла, што не выпрабоўваю на ёй гэты ўбогі трук *“мая жонка, галубка, мяне не разумее”*.
— *Мая жонка мяне разумее* — таксама трук, — заўважыў я.

— Я ведаю, — сумна сказала яна.

Бэаціны пытаньні… Чым бліжэйшымі мы былі, тым іх рабілася больш. Дзеля іхнай клясыфікацыі спатрэбіўся б немалы, рупліва складзены тэматычны рэестар, дзеля аналізу — дасьведчаны псыхіятар. Яна пыталася папросту пра ўсё: пра Апалінэра і бідэрмаер, цэлібат і Дрцікола[8], ксэнафобію і Елаўстоўнскі парк, дзэнбудызм ды жоўтую ліхаманку, і той факт, што на шэраг пытаньняў я ня ведаў адказу, для яе быў крыніцай кепска прыхаванага расчараваньня.
Ці я таксама здаюся сабе *няшчырым*, калі дапамагаю сьляпым перайсьці цераз дарогу?
Ці ў мяне таксама бываюць хвіліны, калі я ненавіджу *абсалютна ўсіх*?
Ці ня ведаю я нейкіх *добрых* антыстрэсавых практыкаваньняў?
Ці мне таксама гэтак *граюць на нэрвах* гульні ў кампаніі?
Што я *насамрэч* думаю пра Фучыка?
Ці *фалякратыя* міт?
Ці я таксама ў касьцёле пачуваюся, як Мэры Пікфард?
Ці я таксама часам плачу, гледзячы на дзяцей, што коўзаюцца на каньках?
Ці мне таксама гэтак агіднае слова *мэнструацыя*?
Ці мне таксама агіднае так званае *рацыё*?
Ці я таксама больш люблю людзей *сталага веку*?
Ці мне не здаецца, што *сумныя* людзі больш шчырыя?
Ці заўтра пайду *сустракаць*?

Вось так. Безь пераходу.

Мы абедалі ўжо папаўдні ў горадзе. І мы адшукалі люстру. І яшчэ ў нас адцягнулі машыну. Бэата сьмяялася, казала, два гады ня езьдзіла на мэтро. Крал таксама сьмяяўся. Ён ніколі не пазваніў, і празь дзьве гадзіны машыну прывезьлі. Я ня ведаю, воплескаў захапленьня на адрас Крала я не далучыў, але й надта не абураўся ад гэтага беспасярэдняга сьведчаньня існаваньне карупцыі ў нашай маладой дэмакратычнай грамадзянская пільнасьць недапушчальна ўпала.
Затое начаваў я дома.

**3.** Праз затрымку на італьянскай мяжы аўтобус турыстычнай

[8] **Дрцікол (1883 — 1961)** — **чэшскі** **фізік** **і мастак.**

фірмы *“Last Minute Travel”* прыехаў з значным спазьненьнем. Чаканьне і ўсё большы свой неспакой я скарыстаў на тое, каб прыгадаць сабе некаторыя *трывалыя каштоўнасьці*, на якія маё жыцьцё дагэтуль абапіралася.
Празь дзьве гадзіны аўтобус нарэшце пад’ехаў да ходніку. Засычэла дзьвярная гідраўліка.
Калі ў гурме чужых загарэлых твараў я ўбачыў сваю жонку, з пэўнай нечаканасьцю я зразумеў, што яна ўсё яшчэ вельмі прыгожая.
— Татка! — выгукнула дачка.
На ейнай смуглявай шыі бліснуў ланцужок.

Недзе празь месяц пасьля майго прызыву ў войска, уначы, за маленькім бляшаным столікам днявальнага вайсковай часьці Браціслава-Вайнары я напісаў *верш* пра сваё стаўленьне да дачкі. Дазволю сабе яго тут працытаваць, нягледзячы нават на тое, што ўжо толькі той факт, што я, насуперак даўняму намеру, пакінуў трывалую глебу прозы, каб стрэліць у бязьмежны космас паэзіі, ёсьць досыць красамоўным сьведчаньнем абсалютнай пачуцьцёвай непрытомнасьці, якая мяне тады ахапіла:

Мая дачка
вечна дакучае
вешаецца на шыю
вось я й задыхаюся
калі на шыі гэтай ейнай пятлі
няма…
Відаць, лепей назад да прозы:
Дарма, што я ў Бэаты за сваё міжвольнае спазьненьне перапрасіў і што старая (*зялёная!*) канапа ў новаабсталяваным пакоі глядзелася больш чым дзіўна, у горад па новую яна ехаць не хацела — сьцьвярджала, што гэтыя *пошукі ложка* яе ўжо пачалі *прыгнятаць*. Мне давялося прыкласьці нямала намогі, каб пераканаць яе, што было б шкада зараз здацца, спыніўшыся перад фінішам.

— Усё адно ўжо позна, — цьвердзіла яна ўпарта.
— Цяпер поўдзень, — пярэчыў я, — у нас мора часу.
Я ня мог пазбыцца ўражаньня, што тым дзьвюм гадзінам, якія

я зранку прабавіў на Апляталавай вуліцы, ходзячы ад аднаго недакурка да другога, ейная фантазія надае крыху іншы зьмест.
Урэшце я яе ўгаварыў, аднак усе мае намаганьні пайшлі на глум, прычым адразу ж у першай мэблевай краме, у якую мы таго дня завіталі. Бесцырымоннасьць і вульгарнасьць яе загадчыка былі неймаверныя: ён нам *па-змоўніцку* падмігваў, рабіў двухсэнсоўныя намёкі і зь нейкім плюгавым *разуменьнем* панукваў выстаўленыя ложкі *безь нічога ніякага апрабаваць проста цяпер*. Я адно надзяліў яго парай *халодна-літасных* поглядаў, але Бэата, на зьдзіўленьне, ягонага націску ўрэшце ня вытрымала і пасіўна апусьцілася на апяваную *двухспальную тахту* — з бледным тварам, з шчыльна сьцятымі вуснамі. Кожны ейны рух суправаджала неміласэрнае шамаценьне поліэтыленавай накідкі.
— Ну як вам ляжыцца? — гоцаў вакол нас загадчык.
Замест адказу яна заплюшчыла вочы.
— Якая гэта асалода — любоў уласнага народу! — прагундосіў загадчык.
Я прысеў побач зь ёй на край ложку.
Яна намацала маю руку і моцна яе сьціснула.
— Ах, якая лафа! — задаволена ржаў загадчык.
Ён нахіліўся, каб зазірнуць ёй пад спадніцу.
— Хадзем кульнём па чарцы, — сказаў я.
Сьціск імгненна ўзмацніўся.
Яна не расплюшчыла вачэй нават тады, калі я —
у суправаджэньні ўжо зусім недвухсэнсоўных воклічаў таго ідыёта — цягнуў яе з крамы на двор.

Спаражніўшы тры чаркі каньяку ў бары гандлёвага дому “Котва”, яна ў аддзяленьні мэблі паверхам ніжэй цалкам спантанна, але зь нейкай урачыстай абраднасьцю апрабавала іх усе: рознакаляровыя двухспальныя тахты, традыцыйныя *белыя спальні*, сучасныя мэталёвыя ложкі з масянжовымі більцамі, раскладныя канапы й *акруглыя сужонскія ложкі з абіўкай “амэрыканскі мікраплюш”*.
Яна ўкладалася на іх з урачыстаю засяроджанасьцю.
Паварочвалася на бок, на сьпіну і на жывот.
Часам гладзіла абіўку.
Дыхала на люстэркавыя сьпінкі.

Абдымала падушачкі.
Націскам пальцаў выпрабоўвала пругкасьць матрацаў.
У камфортным, з чорнай абіўкай, ложку *“Wendy”* за 18 990 крон нават слаба закурняўкала.
Я яе зьлёгку адраджваў, але вельмі няўпэўнена, падлягаючы ейнай падманнай гульні.
— Гэты хачу, — сказала яна.
— У яго прыстаўная падгалоўная частка. Матрац з спружыннай пракладкай, — сказала прадавачка з прыемнаю бесстароннасьцю. — Абіўка здымаецца.
Счакаўшы, пакуль Бэата ўстане, яна нам паказала, як тая абіўка здымаецца.
Бэаціны рукі абвіліся вакол маёй шыі:
— Вось бачыш, — мякка сказала яна. — Гэта так *практычна*!
— У яе шмат месца ўнутры, — сказала прадавачка. Прадэманстравала.
З Бэацінага дыханьня тхнуў каньяк.
— Шмат месца — ты чуеш? — прамовіла яна мякка. — Гэта так *аптымістычна*!
Бэаціны дотыкі былі занадта прыемныя, каб я пайшоў зьмераць ложак.
— Мы яго возьмем, — сказаў я з пэўнай палёгкай.
Яна абдарыла мяне доўгім пацалункам, быццам насамрэч плаціў я.
— Хачу табе купіць нагавіцы, — прашаптала яна, не пасьпеўшы аддыхацца. — Або гарнітур. Зараз жа.

Нічога ня зробіш, так гэта было: не веснавы луг у кветках, не нанятае лецішча з зыркім вогнішчам, а цесная прымерная кабінка аддзяленьня мужчынскага адзеньня, як у найгоршым парнафільме.
Неадменная шчыліна ў зацягнутых завесах.
На вешаку два занадта хутка выбраныя гарнітуры.
Падазроны шэпт прадавачак.
Вялікае люстра майго маральнага ўбоства.
А потым, мілая бабуля, я сьцягнуў зь яе майткі, а Бэата іх сунула ў сумачку.
— Дык як спадару падабаецца?

Жонка мяне за гарнітур пахваліла, сказала, добра зрабіў, што

купіў яго.
Маўляў, нешта такое мне *даўно ўжо трэба было*.
Дарэчы: я ў ім быў на дзяржаўным прыёме з нагоды сьвяткаваньня ўгодкаў Чэхаславацкай Рэспублікі, на перадкаляднай сустрэчы дзеячоў мастацтва з экс-міністрам культуры, на нядаўняй пісьменьніцкай вячэры ў амэрыканскага пасла і, на жаль, на ўрачыстай вечарыне з нагоды пачатку Міжнароднага году сям'і.

*…выхоўваць у вучня ўласнае стаўленьне да сьвету, абуджаць і разьвіваць ягоную стваральную здольнасьць кантакту зь сьветам.*
Атакар Хлуп, Ярамір Копэцкі і інш., *Пэдагогіка*

**4.** Гэта была больш чым радасьць.
Гэта былі радасьць і страх *увадначас*.
Страх, што гэта скончыцца.
Страх, што гэта ня скончыцца.
Сёньня, у 1994 годзе, я не наважаны разводзіць даўжэйшых *развагаў пра каханьне* (заўважце, напрыклад, што вышэйпамянёнае *пранікненьне ў жанчыну я*, цалкам прагматычна, не лічу нават за дастатковую падставу, каб пачаць новы разьдзел), але мушу яшчэ прынамсі прызнаць, што сапраўды *нешта зьмянілася*.

Я пачаў рабіць ранішнюю гімнастыку.
Ледзь толькі вызірала сонца, *я падкормліваў* свой адрыятычны загар.
Пінцэтам я павыдзіраў сабе валасы з носа.
Я купіў сабе пяць новых майткоў, пяць пар шкарпэтак і (упершыню ў жыцьці) зубныя ніткі.
Пра Апдайкаў раман *"Давай пажэнімся"* я перастаў казаць *"банальна, але досыць міла"*.
Зацяганыя шлягеры пад гітару на выходных у Сазаве выганялі сьлёзы з маіх вачэй.
*Пасму залатую крадком састрыгу,*
*пад падушку схаваю, калі пайду спаць…*
Божа мой! — усхліпваў я.
У жыцьці ня чуў нічога праўдзівейшага.

Дома было сапраўды *жахліва*. Час, праведзены ў тыя першыя дні зь сям'ёй, у маёй памяці *ахутаны* амаль раманнай *смугой*. Хіба згадваю, што я гарліва езьдзіў на нейкія экскурсіі (памятаю, напрыклад, што мы былі ў Канапішці, але дакладней нічога сказаць не магу — мо было зачынена?). Дзякуй богу, да іх нічога не даходзіла, бо мае думкі, бывала, і раней луналі ў аблоках.
— Тата *піша*, — лагодна тлумачыла жонка дачцэ.
Гэтая новая таямніца, аднак, сягала ўсіх закуткаў майго цела, запаўняючы яго дарэшты, ажно здавалася, што ў наступнае імгненьне вось-вось вылезе на паверхню. Імкненьне ўтрымаць яе ўнутры ўсякім коштам спарадзіла тое, што ў мяне пачалі трымцець рукі. Я перакуліў і разьбіў больш шклянак, чым Агата. Роспачнае імкненьне не пакрыўдзіць ператварыла мяне ў раба кансьпірацыі. Чым больш назапашвалася ейных лістоў, тым цяжэй для іх было адшукаць сапраўды *надзейную* схованку. Уначы я ўставаў і ўпоцемках схованкі правяраў. Калі мне карцела пабачыць хаця б ейны здымак, я мусіў адцягнуць ад сьцяны сэрвант, што дастаўся мне ад прабабулі.
Нягледзячы на ўсе гэтыя захады, я часам апынаўся ў непрадбачаных сытуацыях, калі маё выкрыцьцё здавалася ўжо зусім немінучым. Ці вам, спадарове, даводзілася ў гасьцёх у цешчы высмаркацца бяз задняй думкі — і адчуць з насоўкі незабыўны водар улоньня вашай каханкі?

На шчасьце, прынамсі для чарнавікоў сваіх уласных любоўных лістоў, а таксама (верце ці ня верце) *вершаў* я неўзабаве перайшоў на абсалютна надзейную схованку: папяровую тэчку, у якую я іх паступова ўкладаў, я падпісаў вялікімі друкаванымі літарамі *"ЛЮБОЎНЫЯ ЛІСТЫ І ВЕРШЫ"* і засунуў у рэзу занатовак да рыхтаванага раману.
Ні ў якім сэйфе яны не маглі быць у большай бясьпецы.

Калі хто пра што й здагадваўся, гэта быў сабака, якога я цяпер выгульваў нязвыкла часта. Як толькі мы зьнікалі з агляду нашых вокнаў, я валок яго да тэлефоннай будкі.
— Каханьне маё, — мармытаў я ў слухаўку.
Сур'ёзна.
Калі я вяртаўся ўвечары ад Бэаты, ён усьцешана абнюхваў мае рукі, круцячы хвосьцікам.

— Адвалі, — адпіхваў я яго.
Учора ўвечары ў ваньне мне да галавы прыйшоў новы выраз для слоўніка каханьня ў кампутарным веку: *чароўна неадфарматаваныя далоні*.

Вечароў у Бэацінай мансардзе нам зрабілася мала (пагатоў што Агаціны магчымыя ўварваньні віселі над намі сталаю небясьпекай, а спадарыня Кралава з сваёй падазронасьцю пачынала небясьпечна нагадваць прадавачак з “Котвы”). Аднак вакацыі яшчэ ня скончыліся, а жонка ўжо хадзіла на працу.
— У мяне сорак хвілінаў, — задыхана гукаў я ў слухаўку, калі дачка па абедзе сыходзіла да сяброўкі. — Максымум пяцьдзясят.
Я чуў, як яна нешта пракаўтнула.
— Спускайся на Страканіцкую, — адказвала яна. — Праз чатыры хвіліны я там.
Яна прыяжджала ў тым, у чым яе засьпяваў мой званок — у халаце, у бацькавай працоўнай кашулі, у футболцы на голым целе. З хуткасьцю каля ста сарака кілямэтраў за гадзіну мы несьліся да першага павароту; перад ім яна рэзка гамавала і з шалёным гудзеньнем сунулася ў правы шэраг. Да *нашай* лясной дарогі адтуль быў хіба кілямэтар.
Калі я тым летам кагосьці ўсёй душой ненавідзеў, дык гэта грыбнікоў.

Гэткі Эд МакБэйн, якога мы ў нашым выдавецтве цяпер так шмат выдаём, найхутчэй напісаў бы прыкладна так: У *той самай машыне і той самай дарогай, па якой яна таго лета езьдзіла па каханьне, годам пазьней — нават крыху менш — яна паехала па ўласную сьмерць*.

Пачуцьце мёртвай каханкі.

**5.** — Дык як там наш курс? — спытаў у мяне Крал аднойчы вечарам прыкладна ў сярэдзіне жніўня. — Як мы *пасоўваемся*?
Гэта гучала дзіўна. Ад Пэтрыка я да таго ж ведаў, што ў яго *не заладзіліся гешэфты*, а таму я мусіў гаварыць з асабліваю асьцярогай.
— Па-мойму, усё значна палепшала, — адказаў я. — Як ні

дзіўна, нават нашы ўзаемаадносіны.
— Я гэта заўважыў.
Я маўчаў.
Ён пазіраў на мяне прымружанымі вачыма.
— А як зь ейным *творчым пісьмом*?
Якраз пра *пісьмо* мы ўжо доўга не гаманілі.
— Пачынае… Тое, што я ўжо чытаў, вельмі нядрэнна.
— Пачынае?
Ён няхораша ўхмыльнуўся:
— Я плачу табе з канца чэрвеня, а яна *пачынае*?
Я паціснуў плячыма:
— А чаго ты чакаў? Што ў ліпені зь яе стане Сарот?
Скарыстаць імя, якога ён ня ведае, было, вядома, памылкай.
— Магу я прачытаць, што яна напісала? — заатакаваў ён у адкрытую.
Я завагаўся: апроч апавяданьня “Тата і я” (якое, вядома, ня бралася пад увагу) Бэата мне больш нічога чытаць не давала.

— Яшчэ не.
— Як гэта не? — ён падвысіў голас.
— Дэнісе, — сказаў я замірэнча, — ува што мы гуляем?
Але ён ужо разьюшыўся.
— Ува што мы можам гуляць? — адказаў ён уцьвелена. — Я проста хачу ведаць, *на што* ўжо трэці месяц даю свае грошы!
— Ты лічыш, што выкідаеш іх на вецер?!
Ён не дазволіў сябе зьбіць:
— Гэта я і спрабую высьветліць!
— Дэнісе, — сказаў я, — згадай, што, калі я сюды прыйшоў упершыню, у той пячоры наверсе жыла нямая пячорная салямандра. Зьбегай паглядзі туды цяпер.
Я зрабіў драматычную паўзу.
— Хіба гэта ня пэўныя *вынікі*? — сказаў я *пераканана*.
Ён нязгодна захітаў галавой.
— Я не сьцьвярджаю, што гэта выключна мая заслуга, — найхутчэй яна б так ці інакш і сама з гэтага вылузалася. Але ж я не гультайнічаў — ці ж не?
Ён насуплена маўчаў.
— Ніякі *сапраўдны* курс творчага пісьма, вядома, ніколі не ажыцьцяўляўся, — прызнаўся я. — Але ж мы гэта ведаем абодва, я ніколі не сьцьвярджаў адваротнага… Праўду кажучы,

ня ведаю, ці ён калі ўвогуле ажыццявіцца.
Ну вось бачыш, казаў ягоны *дакорлівы* позірк.
— Калі ты мне плаціш за *гэты* від курсу — твая праўда, гэта крыху рызыкоўная інвэстыцыя.
Гэтым умоўным сказам я хацеў яму нагадаць, што наша колішняя *дамова аб працы з* самага пачатку зазнала досыць ключавыя зьмены — хіба ён не хацеў сам, каб я яе зрабіў *шчасьлівай*?
Аднак ён гэтага не прыгадваў.
— *Вельмі* рызыкоўная інвэстыцыя, — сказаў ён раздражнёна, але яму не ўдалося схаваць пэўнае задаволенасьці — я сам вывеў гаворку туды, куды ён хіліў.
Дык вось як гэта робіцца, падумаў я не бяз горычы.
— За жнівень я табе яшчэ заплачу, — сказаў ён высакародна.
Ён выцягнуў з кішэні *падрыхтаваныя* банкноты.
Толькі ў гэты момант да мяне дайшло: ён жа мне *паказвае на дзьверы*.
Дык ужо заўтра мяне тут ня будзе? — усьвядоміў я з жахам.
У гэтай цудоўнай кухні? У ягоным цудоўным кабінэце?
У казачным ложку *“Wendy”*?
— Дык заўтра мне не прыходзіць? — спытаў я прыдушана.
— Не, — адказаў ён строга, паглядзеўшы мне проста ў вочы. — Сёньня можаце разьвітацца.
Усё разгортвалася захутка.
— Я не жадаю сабе ніякіх *новых* непрыемнасьцяў, ясна?
Абсалютна.
— *Спадару настаўнік*, — значэнна падкрэсьліў ён.
Раптам!
Раптам ужо настаўнікі не займаюцца сэксам.

Па дарозе ў мансарду ўва мне імкліва нарастала шаленства.
Высмактаць чалавека і вось так проста яго выплюнуць!
А прафсаюзы на гэта, вядома, нічога!
Тым часам, як я гэта Бэаце ўзрушана пераказваў, яна паступова распраналася.
— Ідзі, — сказала яна тады, — адпомсьці дачцэ гэтага гнюснага капіталіста…
Гэта было не мілаваньне — гэта была *сацыяльная бура*.

— Што будзем рабіць? — спытала яна тады. — Дзе мы цяпер

будзем сустракацца?
— На Страканіцкай.
Яна ўспрыняла гэта сур'ёзна:
— А ўзімку?
Я бязрадна паціснуў плячыма.
— Як наконт гатэляў на гадзіну? — прапанавала яна.
— Я ведаю толькі адзін, — адказаў я. — І належыць ён твайму бацьку.
Тая шалёная ідэя прыйшла, вядома, да маёй галавы.
Я агучыў яе, і ўжо немагчыма было свае словы забраць назад.
Я хацеў быць разам зь ёй.
А пасьля нас хоць патоп.
— Слухай, — гучаў той ключавы сказ, — дык ідзі выкладаць да нас у школу…

## IX

**1.** Калі а восьмай раніцы апошняга жнівеньскага панядзелка я ўвайшоў у наш кабінэт, калегі, за выключэньнем каляжанкі Хваталавай-Сукавай, якая нешта старанна шукала ў шуфлядах, сядзелі над фатаздымкамі з адпачынкаў, папіваючы першую каву навучальнага году 1992/1993.
Яны мяне весела прывіталі.
Нашы традыцыйныя правакацыйныя спавешчаньні праз імгненьне перапыніла Хваталава:
— Лібушка, — залямантавала яна, — ці ты нідзе ня бачыла майго *трохкутніка*?
Лібушка, на жаль, ейнага трохкутніка нідзе ня бачыла.
Ярамір, Ленка і Ірэнка яго таксама ня бачылі.
Хваталава-Сукава кінула на мяне погляд, які ясна даваў зразумець, хто ў ейных вачох галоўны падазроны ў *справе зьніклага трохкутніка*.
Ірэнка між тым зьбегала ў настаўніцкую і вярнулася з навіной: маўляў, у нас новы настаўнік ангельскай.
— Ну дык што? — сказала Хваталава. — Па-ангельску кожны ўмее гаварыць.
— Дзе ж ён мог знайсьці ангельца? — засумнявалася Ліба. — Хіба што атрымаў у якасьці *дылерскага працэнту*…
— Або выйграў у *лятарэю*, — дапусьціла Ленка.
Я гаманіў зь імі, але ўвадначас адчуваў нейкую цяжкаапісальную перавагу.

Урэшце я не стрываў.
Яны ня верылі сваім вушам.
— Бэата Кралава? — паўтарала Ірэнка зь непадробным зьдзіўленьнем.
— Так, — сказаў я, каб разьвеяць яе сумневы, і мая перавага ператварылася ў паветраны шар, на якім я ўзьнёсься высока панад галовамі сваіх калегаў.
З гэтай вышыні я пазіраў на іх амаль што насьмешліва.
Што вы, нябогі, можаце пра гэта ведаць! — казаў я сабе.

Пад дзявятую мы перабраліся ў настаўніцкую на першы сход. За сталом было ўжо практычна поўна, і ўтрымаць для Бэаты вольнае крэсла было ня так лёгка. Нарэшце — у кранальна ўрачыстым касьцюмчыку — яна зьявілася ў дзьвярох, роспачна аглядаючы памяшканьне. Я махнуў ёй рукой. Калі яна ўбачыла вольнае месца, на ейным твары зьявілася прыкметная палёгка і яна імгненна скіравалася да мяне. Я ўсьцешана адзначыў, колькі калег і каляжанак на нас азірнулася. Вясёлая гамана на ймгненьне ператварылася ў стрыманае шушуканьне.
— Божа мой, — прашаптала яна.
І ўтаропіла вочы ў арнамэнт на абрусе.
Я нязмушана падцягнуў крэсла бліжэй да стала і паклаў сваю далонь на ейнае аголенае калена. Яна ўся зьдзервянела, у вачах непадробны жах.
Спалохана заміргала.
— Разьнявольцеся, — сказаў я, — спадарычна настаўніца.

Намесьніца Конапна зачытала сьпіс прысутных — з паважнай прычыны адсутнічаў калега Стршыбрны, у якога, як паведамілі лекары, набліжэньне навучальнага году выклікала *маніякальна-дэпрэсіўны псыхоз*, і калега Стыў, у якога пачатак году выклікаў прагу яшчэ на тры тыдні застацца ў Мэксыцы.
— Трохразовае ўра, — зазначыў я.
Як новая настаўніца чэскай, а перадусім ангельскай мовы, якая часова возьме на сябе і частку нагрузкі Стыва, была прадстаўлена Бэата Кралава.
Яна прыўстала.
Я скарыстаў момант, калі глядзець на яе можна было цалкам легітымна, і прагледзеў яе разам з астатнімі. І моўчкі сабе

адзначыў, што нашая новая каляжанка сапраўды пекная. Калега Кіліян нават уражана прысьвіснуў (прадэманстраваць уголас *уражанасьць* яму ніколі не было праблемай — праблемы ўзьнікалі, калі яму гэтаксама публічна выпадала выявіць сваю *нязгоду*).
Вось яна й наша.

На пачатку сваёй уступнай прамовы дырэктар школы выказаў надзею, што мы за вакацыі начарпалі досыць новых сілаў, каб цяпер цалкам засяродзіцца на ўсіх працаёмкіх *выхаўваўча-адукацыйных заданьнях*, якія сёлета нас чакаюць, асабліва — як вынікала з далейшага — на *абкладаньні коміна*, *пабудове гэтак патрэбнага трэцяга парніка* і на *прыстасаваньні дапаможных памяшканьняў дзеля гадоўлі нутрыяў*. Намесьніца Конапна ў гэтай сувязі нагадала, што пры гэтым нельга забывацца на само навучаньне.
— Падобна, сёлета мы яшчэ будзем выкладаць, — прашаптаў я Бэаце. — А я ўжо чакаў, што цяпер мы будзем адно кальрабі вырошчваць.
Яна ад мяне нязгодна адсунулася.
Затым намесьніца зачытала клясных кіраўнікоў асобных клясаў і разьмеркаваньне настаўнікаў па кабінэтах.
— Таўфэрава, Тракаржава, Кралава, — абвесьціла яна між іншым.
Божа вас барані, падумаў я.
Цікаўнасьць змусіла яе зноў да мяне нахіліцца:
— Хто такая Тракаржава?
Я засьмяяўся.
Намесьніца Прахазкава публічна зрабіла мне заўвагу і сказала, што школа без дысцыпліны — як млын бяз жорнаў. Далей яна заклікала своечасова зьяўляцца на заняткі, сумленна ажыцьцяўляць пэдагагічны нагляд на калідорах і вешаць вучнёўскія сумкі на крукі. Чарговым разам яна зьвярнула ўвагу на такое даўняе свавольства, як расстаноўка сталоў ня ў згодзе з намаляванымі рыскамі — сталы такім чынам лягічна вымыкаюцца з радоў і кляса тады выглядае як *не хачу казаць што*. Пасьля гэтага яна адкрыла апошні пункт праграмы першага сходу, якім было *рознае*.
Першай слова ўзяла каляжанка Хваталава-Сукава. Яна пранізала мяне кароткім значэнным поглядам і абвесьціла пра

*крадзеж трохкутніка*, выказаўшы сваё зьдзіўленьне з таго, што сярод нас знайшоўся *нехта*, хто змог *падняць руку на нявінны музычны інструмэнт*. Пасьля гэтага яна заклікала не забываць пры навучаньні на *разьвіцьцё пачуцьцёвага боку асобы вучняў* і выказала меркаваньне, што найлепшым сродкам яго разьвіцьця ёсьць *цудоўная музыка*, галоўным чынам тая, якую вучні маюць магчымасьць чуць на ўлюбёных *пазаклясных канцэртах*.

— Бо музыка, — сказала яна літаральна, — гэта сродак зносінаў.

Аднак ейны выступ не сустрэў вялікага паразуменьня.

— Нават на самую кароткую дарогу на пазаклясны канцэрт і назад, —разважліва прамовіў калега Нэтэйкал, — трэба чатыры квіткі на гарадзкі транспарт. Агулам гэта *шаснаццаць* крон. А шаснаццаць крон — гэта амаль што кошт…

— …ста грамаў, — сказаў нехта з прэзыдыюму.

— …аднаго кіляграма памаранчаў, якія мы дома купляем нашаму Рышу, — працягваў Уладзімір упэўнена. Ягоная аргумэнтацыя відавочна набліжалася да сутнасьці. Я зь цікаўнасьцю чакаў, што пачую далей.

— Большасьць прысутных тут мяне ведаюць і, думаю, ахвотна пацьвердзяць, што я не *скандаліст*, — прамовіў ён мякка, тым часам як большасьць прысутных зь вясёлым чаканьнем ахвотна падтаквалі. — І тым ня менш я хачу абвясьціць, што на разьвіцьцё пачуцьцёвага боку нашых вучняў я буду пляваць датуль, пакуль адукацыйная ўправа не пачне нам аплачваць квіткоў.

Ён заслужыў удзячныя воплескі часткі калектыву і *строгую заўвагу з* боку кіраўніцтва.

Ягоным пакрыўджаным маўчаньнем адразу ж скарысталася каляжанка Тракаржава, якая зьвярнула ўвагу на сталы рост палавых захворваньняў і прапанавала для разгляду пытаньне, ці ня час нам ля школьнага гардэробу ўсталяваць аўтамат на прэзэрватывы.

— Хто гэта? — прашаптала Бэата.

— Тракаржава, — адказаў я.

Няпэўную цішыню, што пасьля словаў каляжанкі Тракаржавай асела ў настаўніцкай, нечакана перапыніў Ярамір, які ейны плян разьвіў прапановай прабіць — *як што мы ўжо будзем рабіць тыя перабудовы* — зь дзявочай распранальні акно на

вуліцу, якое — па ўсталяваньні ў ім фальшывага люстэрка — магло б, з аднаго боку, служыць падвышэньню сэксуальнай асьветы мінакоў, а з другога — прынесла б школе і немалую эканамічную выгаду.
Шмат калегаў на воплескі я не падбіў.
Намесьніца Прахазкава сказала, што *ня надта разумее*, чаму мы перад нашай новай маладой каляжанкай пнёмся паўстаць у найгоршым сьвятле, а таксама што праверка насьценгазэтаў адбудзецца ў пятніцу.
Пасьля чаго абвесьціла, што ўсе вольныя.

*Школа — гэта не ўстанова, школа — гэта дзея.*
Пэтр Піцьга

Пасьля сходу Тракаржава з Таўфэравай адвялі сваю новую сукабінэтніцу з сабой. Я выдаўся ў сваю клясу, дзе пакорліва, але ўсё яшчэ з пэўнай самаадданасьцю прышпіліў да пустога стэнду некалькі фатаздымкаў ды супэрвокладак кніг Віцязслава Галка, Уладзіслава Ванчуры і Карла Міхала, суправадзіўшы іх на хапка і трохі зацята намаляканым сказам *“ЖЫЛІ Ў ЗБРАСЛАВЕ”*… Усе заданьні так званага *падрыхтоўчага* тыдня на гэтым былі мною бяз рэшты выкананы, і цяпер я да самае пятніцы мог папіваць з калегамі каву, гаманіць пра адпачынак і шукаць трохкутнік.

У той панядзелак я вытрымаў прыкладна да адзінаццаці. Затым я пад нейкаю маркай з кабінэту непрыкметна зьнік і лябірынтам злучаных калідораў перабег у другі корпус, дзе знаходзілася кляса, замацаваная за Бэатай. *Ейная* насьценгазэта, як я й чакаў, дагэтуль ляжала на стале — якраз на яе яна ўсім целам налягала, спрабуючы адной з многіх запінак прышпіліць цьвёрды кардон. Пінжак быў перакінуты цераз сьпінку крэсла, рукавы блюзкі закасаныя. Заўважыўшы мяне, яна прыкрыла недароблену насьценгазэту кавалкам сіняй крэпавай паперы.
— Іду табе на дапамогу, — сказаў я.
Яна *асьцярожна* дыхала.
Я азірнуўся: зялёная магнітная дошка была ўжо палепленая каляровымі малюнкамі з ангельска-чэскімі апісаньнямі, а ў нататніку настаўніка, што разгорнутым ляжаў на суседнім

стале, красавалі каліграфічна выведзеныя імёны. Падобную пачаткоўскую заўзятасьць я й сам перажыў свайго часу і таму крыху непакоіўся за ейную *працягласьць*.
— Ці можна зірнуць? — кпліва спытаў я.
— Не!
Абедзьвюма рукамі яна сутаргава трымала крэп, прыціскаючы яго да грудзей.
— *“Пачынаецца восень”*? — паспрабаваў адгадаць я. — Ці мо *“Школа кліча”*?
Я дакрануўся да крэпавай паперы — яна ўхапіла мяне за руку. Я заўважыў, што пад пазногцем указальнага пальца ў яе запяклася кропля крыві.
Я прыцягнуў ейны палец да вуснаў.
Напятасьць аслабілася, але вочы ў яе па-ранейшаму былі заплюшчаныя.
Яна прыбрала левую руку з крэпу — я прыўзьняў яго: суніцы й кошыкі з баравікамі, марскія пляжы і яхты, храмы й мінарэты.
— Божа Ісусе, — засьмяяўся я. — *“Успамін пра вакацыі”*…
— Можа, вам дапамагчы? — пачуўся за нашымі сьпінамі голас каляжанкі Таўфэравай.
Дзякуючы колеру сваёй памады яна была падобная да *злой каралевы*.

**2.** — Яна ў вас *выкладае*?
Жонка выглядала сапраўды зьдзіўленай.
— Я ж табе гэта й кажу…
Аналіз майго паведамленьня запатрабаваў хвіліннага маўчаньня.
— Між іншым: чыя гэта была ідэя?
— Мая, — сказаў я адважна.
— Твая?
— А што тут такога? Я толькі падумаў, што ёй можа пайсьці на карысьць, калі ў яе ня будзе часу думаць толькі пра сябе.
— Гэта праўда, — сказала жонка, *смакуючы* кожнае слова. Сама яна праводзіла на працы ў сярэднім пяцьдзясят гадзінаў на тыдзень.
— Ты ж ведаеш, — сказаў я, — *калі хочаш выратаваць сябе, выратуй іншага…*
— Гм, — адказала жонка з сумневам.

Праз пару дзён у кухні яна прысела насупраць мяне.
Я адклаў “Літаратурку”.
— Добра, у рамках тваёй *аздараўленчай праграмы* яна ў вас выкладае, — сказала яна.
Я кіўнуў і вычэкваў.
— А тое, што яна сілкуецца ў вашым кабінэце, таксама складнік прадпісанага лекаваньня?
Збраслаўская інфармацыйная сетка. Пэўнасьць гарантуецца.
— Тваё пытаньне гучыць крышку *раўніва*.
— А твой адказ крышку *непераканаўча*.
*Адпрэчваць, адпрэчваць, адпрэчваць* (Доктар Плзак).
— Прызнаюся: на вялікім перапынку яна перакусвае ў нас, — сказаў я. — Але прысягаю, што я ёй ні разу ня даў адкусіць!
Нават не ўхмыльнулася.
— У яе ёсьць *свой* кабінэт, з Тракаржавай і Таўфэравай. Чаму яна не перакусвае там?
— Ня ведаю. Ня выключана, што яна ня любіць размаўляць за ядой пра *мэтастазы* і *похвенную сакрэцыю*.
— Што такое мэтастазы? — пацікавілася дачка.
Я нават не заўважыў, як яна зайшла.
— А іншага пытаньня ў цябе няма? — гаркнуў я для прыліку пагрозьліва. — Можа, ты хочаш сказаць, што ўжо ведаеш, што такое похвенная сакрэцыя?
— Вядома, — адказала дачка. — З “Бравічка”.
Жонка ўрэшце засьмяялася.
Гэтым разам мне пашанцавала.

Калі не лічыць вялікага перапынку і пэрыядычных сустрэчаў у сталоўцы, мы спатыкаліся ў школе толькі падчас пераходаў з кабінэту ў клясы. Мы абое стараліся выйсьці *адразу ж* пасьля званка, за што заслужылі ад калегаў не адну іранічную кпіну, але затое мы часам маглі з значнай дакладнасьцю адгадаць, у якім месцы лесьвіцы ці калідору мы спаткаемся. У першыя тыдні Бэацінай працы ў школе гэта былі сапраўды *радасныя* й *поўныя мілосьці* сустрэчы, нягледзячы нават на тое, што мы рэдка калі адважваліся зрабіць больш, як дакрануцца адно да аднаго кончыкамі пальцаў ці пацерціся манжэтамі. Аднак разпораз мной авалодвала нейкая сьляпая, безаглядная адвага: тады я ў апошні момант заступаў Бэаце дарогу і тая хоцькі-

няхоцькі трапляла ў мае абдоймы — яна спалохана ўпіналася, слаба лямантавала і адпіхвала мяне магнітафонам.
Выходныя, асабліва на пачатку, у верасьні, здаваліся несканчонымі. У пятніцу яна заканчвала на гадзіну пазьней, і, калі я хацеў зь ёй разьвітацца, мне даводзілася перапыняць ейныя заняткі.
— Сядзеце, дзеці, — казаў я, заходзячы да пяціклясьнікаў, — вашай спадарыні настаўніцы я нясу сьпешную дэпэшу зь міністэрства.
Дзеці строілі міны.
Кожнага разу яна хутка выпіхвала мяне з клясы, міла пачырванеўшы.
Дзявочы румянец. Найдзяйсьнейшы афрадызыяк.
— Зачыні дзьверы, — шаптаў я.
Яна круціла галавой і спужана азіралася.
Я зачыняў іх сам.
Спадар інспэктар.

Пасьля выходных бывала не нашмат лепш. Звычайна калі ў мяне выпадала фортка, у яе былі заняткі — і наадварот. Але галоўнае — перад верхняй школай мяне штодня чакала дачка. За ўвесь верасень на Страканіцкай мы былі толькі аднойчы.
— Я ў цябе пра нешта хацела спытаць, але зараз забылася, — казала часам Бэата з сумнай іроніяй. — А, успомніла: ці мы яшчэ сустракаемся?

Бы ў фільмах Вудзі Алена, з той толькі розьніцай, што нам было не да сьмеху.

Згадваюцца й некаторыя іншыя эпізоды нашай супольнай школьнай мінуўшчыны.
Насамперш рэальны *здымак* — групавая фатаграфія настаўнікаў (дзякуючы зьніжкам для школ мы фатаграфуемся ажно тройчы на год). На жаданьне фатографа мы ўсім калектывам спрабуем зьмясьціцца на лаўках, вынесеных з спартовай залі на двор. За намі — заспакойлівае зяленіва. Перад намі — школьныя вокны, у якіх крычаць ды блазнуюць вучні. Робім выгляд, што іхных кпінаў ня чуем. Апошнія адгаворкі ды папраўляньне прычосак. Бязраднасьць у Бэаціных вачох: *Кожны паасобку? Побач?* У вочы кінецца і адно, і другое.

З усьмешкай уладкоўваюся ля яе. Вакольныя прыціскаюць нас адно да аднаго.
Сыр.
Абое мы выглядаем жахліва.
Іншая карцінка. Цёплы верасьнёўскі поўдзень. Бабіна лета. Бэата і я на лаўках у чарэшневых прысадах пад Гаўлінам. *Замяняем* працоўнае навучаньне. Вучні ўдзячныя: лепш, чым выціраць пыл з парэнчаў. Асаблівы, выключны спакой. Ніхто не крычыць, нават хлопцы ня лазяць па дрэвах. На суседняй пляцоўцы ціха скрыпіць карусэля. Дзеці сядзяць ці ляжаць на траве вакол нас. Смокчуць сьцябліны і размаўляюць. Міжсобку і з намі. Бэата здымае швэдар і застаецца адно ў чорнай футболцы. Сонца грэе. Цьвінтарны гай — за пару мэтраў пад намі.
— Як што не заслужу ляжаць на Славіне, хацеў бы я застацца тут, — кажу я Бэаце. — Тут файна. Дый не люблю я гэтых змрочных *Страшніц*[9]…
— Згодная, — кажа яна.
Мружыць вочы на сонца.
Ніхто ні пра што не здагадваецца.

*Цьвінтарны гай спраектаваў збраслаўскі жыхар архітэктар Гінэк Свобада. Паркавае рашэньне ён дарэчна дапоўніў скульптурнымі кампазыцыямі з калекцыі Нацыянальнай галерэі. Гэта ўзор для айчынных і замежных спэцыялістаў.*
Прынагодная публікацыя, Збраслаў

**3.** Я ўжо ведаў, што Бэата ня здольная нешта рабіць напалову, але мяне ўсё адно зьдзівіла, што зь яе адразу ж выйшла гэткая добрая настаўніца.
Яна рабіла ўсе тыя слушныя вар'яцкія рэчы, якія робяць настаўнікі-пачаткоўцы. Распрацоўвала кранальна падрабязныя пляны заняткаў, уласнаручна выраблялa вынаходлівыя навучальныя прылады, перапісвала й множыла тэксты ангельскіх песень. Яна гуляла зь дзецьмі ў настольны тэніс, вадзіла іх у кіно і езьдзіла хварэць за іх на ўсе магчымыя спартовыя турніры (калі мог, я езьдзіў зь імі, але выбухаць пасьля кожнага ўдалага кідка або голу афэктаванаю весялосьцю, як гэта рабіла яна, апранутая нібыта на маскарад, я пры ўсім сваім жаданьні ня здужаў бы). Яна чытала

Пэсталёцы, Дыстэрвэга, Гелуса. Вычытаўшы недзе, як Масарык ладзіў бяседы з студэнтамі ў сябе дома, яна ў нас **Сланім ж–** нядзелю запрасіла дваццаць восем сваіх дзяцей **нарабіла** *вечарынку*. Праштудыяваўшы нейкае дасьледаванне **слівутых** ў пытаньні гіпакінэзіі ў дзяцей, яна імгненна перайшла **ураджэнцаў** заняткі ў ангельскамоўны курс аэробікі. Калі ж **яны ўжо** праф. Мацейчака, які ёй даў я, прачытала, што сучасныя дзеці ня маюць павагі да працы між іншым таму, што бацькі за працай сваіх бацькоў, яна пачала ладзіць экскурсіі на прадпрыемствы: *Ага, значыць, вы гэтае вібрацыйнае* *падважнікам вось так нахіляеце і ссыпаеце ўсе гэты* *рамонкі на гэты канвэер? Ці не хацелі б вы, спадар* *вашаму Вашку і ўсім астатнім паказаць яшчэ раз, як* *робіцца?*

**? Сланім ж–**
***нарабіла вечарынку***
**слівутых**
**ураджэнцаў**
**яны ўжо**
**Праф. Мацейчака, які ёй даў я, прачытала, што сучасныя дзеці ня маюць павагі да працы між іншым таму, што бацькі**
**Страшнібыць**
**урэшце на**
**ўсе гэтым**
**Прагуліцца**
**Нажодзінца**
**ягамасцібы**
**з могілкамі.**

Я даў ёй пачытаць *“Дзяцей джунгляў”* і *“Наверх па лесьвіцы, што вядзе ўніз”*, каб хоць крыху падрыхтаваць да расчараваньня, якое пасьля такой пачатковай эўфарыі абавязкова мусіла настаць. На прыкладзе незьлічоных паразаў пратаганістаў абедзьвюх кніг я імкнуўся пераканаць яе ў неабходнасьці пэўнага *пэдагагічнага скепсысу* і *ўсьведамленьня пэўнай дарэмнасьці* як абавязковых складнікаў прафэсійнай аснады найлепшых настаўнікаў — але ўсе мае намаганьні былі марныя.

Я ня мог нічога зрабіць. Яна мусіла ўсё перажыць сама.

**4.** Але, на шчасьце, страта ілюзіяў адбылася не адразу, а паволі, нейкімі тыднёвымі этапамі.

— Я не разумею, — дзялілася яна з намі на вялікім перапынку, — я гэта зь імі тройчы разабрала — а яны ўсё адно слова сказаць не маглі!

— Чаму я павінна прыбіраць клясу за прыбіральніцу? — не разумела яна іншым разам.

— Я выглядаю скамечанай? — хацела ведаць Бэата наступнага разу. — Дык чаму тады дырэктар увесь час дакучае, каб я купіла прас з адпарваньнем?

Ейныя пытаньні сьведчылі пра чароўную неабазнанасьць у галіне чэскага школьніцтва.

— Навошта мне пацьвярджаць пісьмова, што я падпісала клясную ведамасьць?

У ейным голасе ўжо азывалася ваяўнічасьць.

— Чаму мае дзеці мусяць сьпяваць у хоры, калі яны там сьпяваць ня хочуць? — спытала яна аднойчы ў Хваталавай-Сукавай.
Гэта было вельмі нечаканае пытаньне. Цішыню кабінэту парушалі толькі выпадковыя гукі з калідору.
— Як, даруйце?
Хваталава выглядала зусім зьбянтэжанай.
Бэата паўтарыла пытаньне.
Халодна-насьмешлівыя вочы абмежаванай бабкі:
— Дзяўчынка, ці ведаеце вы, колькі гадоў у мяне стаж?
Семдзесят, прыкінуў я.
— Пры чым тут ваш стаж? — запярэчыла Бэата спакойна. — Я ў вас пытаюся, чаму мае хлопцы мусяць сьпяваць, калі ім сьпяваць адназначна ня хочацца?
— Якія хлопцы? Хацела б я ведаць, *хто*?
Бэата ўпершыню завагалася. Яна зірнула на мяне — я адвёў вочы ўбок. Назваць, значыла здрадзіць.
— А вы ня ўмешвайцеся, — накінулася яна на мяне. — Вы толькі псаваць умееце!
Такую самую спрэчку я меў з Хваталавай-Сукавай летась.
— Слухайце, — сказаў я тады адпаведным хлопцам з сваёй клясы, — ці вы любіце сьпяваць?
Яны адчулі падкоп.
— Увогуле так, але ня ў хоры.
— Ня хочаце хадзіць у хор?
— Не.
— Добра, — сказаў я. — Тады не хадзеце.
Наступнага дня Хваталава-Сукава ў беспасярэдняй рэакцыі на гэты *нечуваны бунт* праверыла ўсю маю клясу на веданьне жыцьцяпісу Леаша Яначка. Вынік быў варты запісу ў “Кнігу рэкордаў Гінэса”: дваццаць тры двойкі й адзінкі. Сустрэўшы мяне на калідоры пасьля заняткаў, яна сьмяялася як *Ліса Махлярка*[10]. Тады я зьвярнуўся з скаргаю да дырэктара (сёньня ўжо мне самому здаецца дзіўнай тая мая наіўнасьць), які безь цікавасьці і ахвоты паабяцаў *разабрацца*, але адразу ж пра ўсё назаўсёды забыўся, бо якраз прывезьлі мікрахвалевыя печы і ён мусіў прыняць тавар.

**5.** Учора я таго Мацейчака перачытаў. *Здабываць паразуменьне*, — прыгадаў я.

І яшчэ адна цытата: *Тут гаворка толькі пра тое, каб зноўку ўсплыла звычайная чалавечая цікавасьць да ўзаемаразуменьня* (Ондржэй Гаўзэнблас “Ці вернем мы сэнс заняткам чэскай мовы?”). У гэтай сувязі вось пра што я думаю: Ці я тады, у верасьні, імкнуўся яе *зразумець*?
Ні ў якім разе, у верасьні я імкнуўся зь ёй *пераспаць*.
Аднойчы мне гэта ўдалося.

Да ейнага апавяданьня мы вярнуліся таксама толькі аднойчы.
— Гэткая сабе *пісулька*, — нядбайна адмахнулася яна.

**[10] Гераіня аднайменнай кнігі Рудальфа Цеснаглідка, а таксама опэры Леаша Яначка.**

Чаму ж тады яна выбрала менавіта яго? Маўляў, каб мне растлумачыць свае колішнія паводзіны; апавяданьне добра дакумэнтуе ейнае стаўленьне да *чужых людзей*, але іншай вартасьці ў яго няма. Цяпер, нібыта, яе цікавіць толькі тое, як традыцыйную апавядальную форму зьнішчыць.

— Мяне, у сваю чаргу, толькі тое, як да яе вярнуцца, — адказаў я.

Насамрэч, аднак, у той момант у пісьме яе не цікавіла нічога; адзінай ейнай сапраўднай амбіцыяй — здавалася мне — была прага зрабіцца найлепшай настаўніцай Прагі-5.

А цяпер *мае* амбіцыі:
З журналісцкай прагнасьцю сэнсацыяў паразытаваць на трагічнай гісторыі дваццацігадовай дзяўчыны.
Сьвядома браць у разьлік чытацкі эфэкт *кічавага самаперажываньня* (Ян Лопатка).
Паспрабаваць давесьці, што сучасная літаратура ня мусіць быць, крый божа, толькі *пра тое, як цяжка пісаць літаратуру* (Джон Фаўлз).
Дэманстраваць начытанасьць.
Наталяць схільнасьць да эксгібіцыянізму.
Зьняважыць жонку.
Зьняважыць некаторых былых калегаў.
Скандаліць.
Падаць сыгнал да новай атакі на міністра адукацыі.
Атрымаць чарговую літаратурную прэмію.
Зарабіць яшчэ грошай.
Разьвеяць згрызоты сумленьня.
Напісаць добры раман.
(Непрыдатнае выкрасьлеце.)

*Мае амбіцыі*… Калі я сёньня гэта па сабе прачытаў, я ўпершыню як мае быць усьвядоміў, што, уласна, нарабіў у гэтым сваім рамане: гэты ўзрушлівы гнюс, якім ёсьць кожныя аўтарскія ўводзіны (Сэлінджэр), я разагнаў на цэлую кнігу.

**6.** Напачатку здавалася, што сьвяткаваньне пяцідзясятых угодкаў вахцёра Недзяльнічка станецца проста шараговаю вечарынкай, якіх у школе бывалі дзясяткі. Францішак зьявіўся з густоўна падстрыжанымі вусамі й барадой, пераапрануўшыся з спэцоўкі, безь якой ён амаль не ўяўляўся, у свой найлепшы цёмны гарнітур (у якім штонядзелю пад Гаўлінам разьвейваў па ветры попел памерлых), але настаўнікі, як звычайна, трусілі ў настаўніцкую з значным спазьненьнем і доўга яшчэ па афіцыйным пачатку імпрэзы, схіліўшыся над талеркамі з нарыхтаванымі канапкамі, абмяркоўвалі самыя розныя працоўныя справы, што, вядома, усеагульнай весялосьці не спрыяла.
— *Happy Birthday to You!* — абавязкова засьпявалі мы хорам пры перадачы падарунку, а Бэата, якой я ўжо распавёў пра сваё пачуцьцё моўнай непаўнавартасьці, іранічна прапанавала, што

словы песьні будзе мне перакладаць.
Пасьля сыходу некалькіх цалкам фармальных віншавальнікаў, а таксама дзякуючы надзвычай добраму віну, якога Францішак з нагоды свайго юбілею падрыхтаваў хоць заліся, атмасфэра прыкметна цяплела. Твары каляжанак знаёма пацямнелі, а жэсты набылі мяккасьць. Неўзабаве зьявілася й гітара, і Яраміравы рукі пры знаёмых рэфрэнах пачалі ўзьлятаць угару ўсё часьцей. Нарэшце інструмэнт узяў сам юбіляр, каб пад авацыі гасьцей сыграць сваімі кароткімі апухлымі пальцамі традыцыйны сярдзіты пратэстсонг *“Сядзіць у сваім кабінэце, як муха на кучы гаўна”*. Пасьля чаго прысутнае кіраўніцтва школы дэманстратыўна скіравала да выйсьця, голасна абмяркоўваючы некаторыя карэктывы ў разьмеркаваньні дадатковых прэміяў. Бэата выглядала трохі спалоханай.
— Ты зусім ня п’еш, — падахвоціў я яе.
Насталае ідэалягічнае безуладзьдзе ўмагчыміла нават самым асьцярожным чальцам пэдкалектыву з радасьцю прыгадаць асаблівую мэлёдыку *“Катюши”*, лірычную *“Степь да степь кругом”* і энэргічны харал *“Вставай, страна огромная!”*. Гэтай грамабойнаю весялосьцю скарысталіся калегі фізкультурнікі дзеля таго, каб незаўважна зьнікнуць у сваім кабінэце і вярнуцца ў поўнай зімовай амуніцыі: Іржы Кіліян надзеў драўляныя лыжы, у рукі ўзяў бамбукавыя кіі, што перавышалі яго на некалькі сантымэтраў, а на галаву пачапіў кранальны ружовы каптурок; Гелена Андзелава была ў валейбольнай форме й каньках, гумовыя чахлы якіх пакідалі на лінолеўме шэрыя пісягі. Уладзімір Нэтэйкал зь Сьвятланай Тракаржавай, імкнучыся пераўзысьці посьпех іхнага выступу, абвесьцілі спаборніцтва, хто хутчэй насуне прэзэрватыў на бутэльку з-пад кока-колы.
— Гэта вельмі дзейсны спосаб разбурэньня псыхалягічных бар’ераў! — гукала Тракаржава. Яна спаборнічала першай і паказала выдатны вынік у шэсьць сэкундаў.
Я заўважыў, што Бэацін сьмех не зусім шчыры.
— Нешта ня так? — спытаў я.
Яна закруціла галавой.
Мяне зьдзіўляе, сказаў я тады ёй, што асоба такая нанканфармісцкая, якой яна, безумоўна, ёсьць, дазваляе сябе паланіць крывадушным мяшчанскім уявам пра т. зв. *настаўніцкую беззаганнасьць*, бо ў выніку гэта прыводзіць адно

да таго, што Джэймс Гілтан у рамане “Бывайце, спадар выкладчык” называе *паўзучай сухой цьвільлю старых пэдагогаў*. — Хіба ў настаўніка няма вачэй? Хіба ў яго няма рук, ног, вантробаў, пачуццяў, схільнасьцяў, жарсьцяў? — працягваў я з запалам, парафразуючы “Вэнэцыянскага купца”. — Хіба ў яго не цячэ кроў, калі яго ўкалоць? Хіба ён не сьмяецца, калі яго казычаш? Ці мо ён не памрэ, калі яму намяшаць атруты? — Ну добра, — адказала яна. — Налі мне.

Калі я, працуючы над першай вэрсіяй гэтага раману, згадваў пра ўсе тыя непрыстойнасьці, што дзеяліся затым, я, натуральна, прыгадваў сцэны *па-чытацку ўдзячныя*: уключэньне апоўначы школьнага радыё (з крыху грубаватымі імітацыямі прамоваў дырэктара ды міністра), інструктаж каляжанкі Тракаржавай пра магчымасьці выкарыстаньня *вакуумнай помпы* або любошчы настаўніцкай парачкі на падлозе адной зь цёмных клясаў (ці вы, спадарове, былі ўжо калі пяшчотна абмытыя пасьля гэтага губкай для дошкі?), але ўсе гэтыя вясёлыя карцінкі для мяне да сёньня блякнуць перад адной-адзінаю сцэнай:
Гадзіна ці другая ночы.
Залітыя абрусы й драбінкі ад канапак ды чыпсаў, патаптаныя па лінолеўме.
Агеньчыкі некалькіх сьвечак.
Начныя гіты “Эўропы-2”.
Бэата — бледная ад стомы й выпітага віна — танчыць з Францішкам Недзяльнічкам.
Бэата ў абдоймах сьмерці.
Сцэна як з Арлекіна.

*Сюжэт тады дадуманы да канца, калі ў ім мусіць адбыцца паварот да найгоршага.*
Дзюрэнмат

Тое пэўнае *ўзаемаперапляценьне*, якое, відаць, уважлівы чытач там-сям заўважае, ня ёсьць, на жаль, здабыткам нейкага *кампазыцыйнага майстэрства*, а толькі лягічным вынікам местачковых маштабаў гэтай гісторыі: усе адно аднаго ведаюць, усё з усім зьнітавана.
Маленькі красамоўны прыклад: вуліца За Опусам, на якой

я дагэтуль жыву, ляжыць на самым ускрайку мястэчка. Аўтамабільная звалка, на якой стаіць Бэацін пакарабачаны гольф, знаходзіцца проста насупраць ейнага вусьця (гэта можна лёгка спраўдзіць).
Увесь перад машыны ўвагнуты ў нутро кабіны. Задняя частка, наадварот, амаль не пашкоджаная, адно на задніх дзьвярох — глыбокія драпіны ад хапка эвакуатара. (Толькі вочы ў вочы гэтай рэальнай сьмерці я зразумеў, як штучна эстэтызаванай была фіктыўная сьмерць маладой настаўніцы ў “Поглядах на забойства”: загарэлае *некранутае* цела, што прасьвечвала праз плыткі рачны струмень, *нераструшчаная* грудзіна…)
Калі з жонкай мы едзем міма, я імкнуся глядзець убок.

**7.** *Сярэднеэўрапейскую мэнтальнасьць характарызуюць два асноўныя пачуцьці: маркота й празьмерная весялосьць. Адно без другога наўрад ці магчыма. З мэлянхоліі нараджаецца гратэск, ад гратэску застаецца мэлянхолія.*
Ёзаф Кроўтвар

Удалая вечарынка не абышлася без наступстваў.
Яшчэ а восьмай Бэаты не было ў школе, але зь Ярамірам нам пашчасьціла арганізаваць замену так, што пра яе ведала толькі жменька пасьвечаных. А палове на дзявятую я ўбачыў яе з акна сваёй клясы: ёй было яўна блага, але, нягледзячы на гэта, яна *бегла*. Я хутчэй даў дзецям заданьне і спусьціўся ёй насустрач. Усё ўладжана, паінфармаваў я яе ганарліва.
— А наступныя пяць заняткаў? — задыхалася яна. — Сёньняшні дзень я ўсё адно не перажыву…
— Аддыхайся, — сказаў я. — І многа не размаўляй: як перакіслародзішся — канец.
Я зацягнуў яе ў вучнёўскі гардэроб, дзе мы дачакаліся званка. Потым па запоўненых калідорах я правёў яе ў наш кабінэт.

— Во чорт, — дасьведчана прамовіла Ленка, як толькі яе пабачыла.
— Што зь ёй? — падазрона спытала Хваталава-Сукава. — Гэта не заразна?
— Ёй страшэнна блага, — адказаў я. — Памылкова ўключыла *“Ляскія танцы”* дома[11].

Другім заняткам Бэата мела стылістыку ў шостай клясе.
— Я ў памяшканьні ня вытрымаю, — цьвердзіла яна заклапочана. — Можа, пазьней, але ня зараз.
Яна сапраўды выглядала нядобра.
— Ідзеце на Гаўлін, — прапанаваў я. — *Апісаньне прыроды*.
— Я туды не залезу.
— Мо ў замкавы парк? — сказаў Ярамір. — Тудыдарожка роўная.
— А як мне гэта абгрунтаваць?
— Скульптуры, — сказаў Ярамір. — *Апісаньне мастацкага твору*. Цэлую гадзіну проста сядзіш на лаўцы й глядзіш на Мыслбэка.
Я чакаў яе перад школай, калі яны вярталіся. Яна была зялёная як вадзянік.
— Ну што? — спытаў я клапатліва.
Пачакала, пакуль дзеці пройдуць.
— Ледзь не абблявала Гутфрайнда[12], — прашаптала яна прыгнечана.
На жаль, і сваёй наступнай парадай скарыстаць на занятках падручнік *“Ці правільна мы пішам па-чэску?”* (пятнаццаць асобнікаў якога я ахвотна пазычыў ёй з кабінэту) я Бэаце — падобна як да мяне Ярамір — надта не дапамог. Кніга выйшла ў 1983 годзе, і на бяду Бэата ня ўгледзела, што практыкаваньні, якія яна дзецям дала, утрымлівалі між іншым некалькі *членаў Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай партыі Чэхаславакіі*, адзін сход *народных міліцыянэраў* і адзін *савецкі ледакол “Красін”*.
Затое ўгледзела іх адна з матак, якая з сшыткам свайго *індактрынаванага* сына пасьпяшала на найбліжэйшае паседжаньне Адукацыйнай камісіі.
І шухер быў на сьвеце.

Празаходняй арыентацыі нашае моладзі пагражала сур’ёзная небясьпека.
Ужо празь пяцьдзясят хвілінаў знаходжаньня ў дырэктарскім кабінэце *завуаляваная камуністка* ня здолела стрымаць сьлёз. Шэсьць месяцаў бяз прэміяў і дадатковых даплатаў — узорнае пакараньне дырэктарам школы, які больш за дваццаць гадоў маршаваў у першамайскіх дэманстрацыях перад трыбунай Цэнтральнага Камітэту Камуністычнай партыі Чэхаславакіі.

11 **Музычны цыкл Бэдржыха Смэтаны.**

Я напісаў артыкул у мясцовую газэту.
*“Чэскі штодзёньнік”* прыслаў разабрацца аднаго з сваіх найлепшых журналістаў — дваццацігадовага студэнта геаграфічнага факультэту.
Гей-гоў.

Найпершаю рэччу, якую школьны інспэктар адукацыйнай акругі Прага-5 магістар Іржы Вагенкнэхт учыніў, зьявіўшыся ў нашай школе, было наведаньне заняткаў нібыта завадатара ўсіх гэтых *бунтаў*: я бяз боязі й ганьбы, як згадваю, расказваў нешта пра Грабала (сваю слабасьць да зборніка Скалы *“Вітаю вас, вокны”*[13] я, зразумела, утаіў). Але мне падалося, што інспэктар сапраўды хоча дакапацца да сутнасьці справы, і таму па дарозе з заняткаў я сьцісла азнаёміў яго з нашымі посьпехамі на шляху да эканамічнай самастойнасьці, якіх мы разам з вучнямі імкнёмся дасягнуць найперш дзякуючы продажу караняплодаў на збраслаўскім гарадзкім вояны і распаўсюду лятарэйных квіткоў у збраслаўскіх забаўляльных установах. Далей я яму распавёў, колькі ў нашай школе парнікоў, колькі з школы сышло настаўнікаў, колькі з тых, што засталіся, маюць кваліфікацыю, колькі хвілінаў у сярэднім цягнецца пэднарада і колькі двоек ды адзінак здатная за гадзіну паставіць адна настаўніца. Вядома, я азнаёміў яго і з сваёй вэрсіяй справы *“Савецкі ледакол”*, прычым дзеля аб’ектыўнасьці я зьвярнуў ягоную ўвагу на сваю магчымую перадузятасьць, якая датуецца ўжо пазалеташняю вясной, калі дырэктар школы азначыў маю тэатральную п’еску “Тур у Эўропу, або Весялуха 1990”, якую я зь дзецьмі й інсцэнаваў, як *прыхаваны закід супраць эканамічнай рэформы Клаўса*.
Інспэктар Вагенкнэхт мяне ўважліва выслухаў і некаторыя зьвесткі запісаў.
Потым ён папрасіў у мяне асобнік майго раману “Цудоўныя гады сабаку пад хвост”, які выйшаў якраз тымі днямі.
Наступнага дня ён мне ў адказ прынёс паэтычны зборнік Карла Шыктанца “Чэскі арлой” (напраўду ня ведаю, чаму менавіта гэты).
У справаздачы аб праведзенай *паглыбленай праверцы* ўсе ўзьнятыя праблемы ён акрэсьліў як *спрэчкі пераважна асабістага характару*.

**[12] Ота Гутфрайнд (1889—1927) — чэскі скульптар.**

Паэта Карла Шыктанца я шчыра паважаю.

**8.** Гэтая ідэалягічная псэўдапраблема, на жаль, не была адзіным наступствам удалага сьвяткаваньня вахцёравых пяцідзясяцінаў. Яшчэ ў той самы дзень, калі Бэата змагалася з млосьцю, нехта пазваніў маёй жонцы на працу й паведаміў, што ейны муж сыстэматычна здраджвае ёй з спадарычнай Кралавай.
Я зноў і зноў яе пераконваў, што мае стасункі з Бэатай маюць выключна сяброўскі характар (зважаючы на колькасьць нашых паездак на Страканіцкую гэта, зрэшты, была амаль праўда), і заклікаў яе не дазволіць, каб намі маніпулявала злосьць, варожасьць ды зайздрасьць нашага атачэньня. Аднак на памер ейных сьлёз мае словы ня мелі ніякага прыкметнага ўплыву.

*Паводле дасьледаваньня, якое ажыцьцявіў амэрыканскі "The Washington Post Journal", 97% амэрыканцаў мяркуюць, што іхныя мужы ці жонкі кажуць ім праўду.*

Я падвоіў дагэтулешнія захады дзеля гарантаваньня бясьпекі, што практычна раўнялася разыходжаньню.
Дзевяць дзён мы з Бэатай нават не цалаваліся.
На калідоры мы сустракаліся як *чужыя людзі*.
Калі я браў Бэату за плечы, гэтаму папярэднічала дбайная кансьпіратыўная падрыхтоўка.
На дзясяты дзень я ўбачыў, як Бэата замыкала спартовую залю.
Я запхаў яе ў цёмную камору з спартовымі прыладамі, дзе за сямю матамі й сямю лаўкамі жарсна паваліў яе на батут.
Гэтым разам яна мяне ўпершыню адштурхнула.
Яна гаварыла вельмі доўга.
Між іншым сказала, што я *бясколерны*.
Крытыкавала яна й нашую вінарню ў Горніх Пачарніцах.
Наступнага дня ананім званіў зноў. Удакладніў маёй жонцы, што цяпер мы ходзім *трахацца* на склад спартовага інвэнтару.
Зноў я пераканаўся, што дарэчна выбраная дэталь дадае гісторыі пераканальнасьці.
Рэўнасьць і гнеў нас з жонкай пазбавілі ўсякай абачлівасьці, і мы зноў не пачулі прыходу дачкі.

**[13] Іван Скала лічыцца правадніком камуністычнай ідэалёгіі ў паэзіі і літаратурным функцыянэрам; у 1995 годзе ў перакладзе Хведара Жычкі выйшаў зборнік выбранай паэзіі Івана Скалы па-беларуску, які таксама называецца "Вітаю вас, вокны!".**

Яна, відавочна, пачула даволі.
У ейным пакойчыку я правёў рэшту вечара.
Калі хочаце пачуць, як плача анёл, скажэце дзевяцігадовай дзяўчынцы, што ейны бацька *трахаецца зь іншай*.

Згаданая зацішная вінарня ў Горніх Пачарніцах пачала здавацца мне небясьпечнай. Кельнэр выглядаў як стукач. Мае ранішнія эратычныя фантазіі (якіх, беручы пад увагу сытуацыю, рабілася больш) адбываліся ўжо ані на Слапах, ані ў Бэацінай мансардзе, а ў глухім гатэльчыку на ўскрайку

Рэйк'явіку, прычым *сапраўдную іскарку* ім здолела дадаць толькі ўяўленьне перапыненай авіясувязі з Прагай.

Спаў я кепска.
Галава ў мяне балела часьцей, чым калі-кольвек раней.
І я ўвесь час адчуваў цяжар у страўніку.
Уцёкі ў хваробу.

І ў творчасьць, вядома.
Перажытыя падзеі, якія цяпер былі толькі крыніцай праблемаў, над маім пісьмовым сталом цудам ператвараліся ў адзіную крыніцу маёй радасьці. Такая *story*! — казаў я сабе ў захапленьні. Пісаць пра Бэату было ўзрушальна й бясьпечна адначасова. Рэальнае жыцьцё ніколі не магло даць мне нічога падобнага.
*Усе беды мужчынаў вынікаюць з таго, што яны ня здольныя застацца ў спакоі свайго кабінэту*, горка згадваў я разам з Паскалем.
Над Бэаціным пэрсанажам я часам задумваўся нават у прысутнасьці самой Бэаты.
— Ты хочаш далей дзяліць нават тую няшчасную палавіну цябе, якая мне належыць? — абуралася яна.
— Я пішу пра цябе, — бараніўся я.
— Ну й пішы! Ня буду табе замінаць! — казала яна раззлавана.
— Чэская літаратура мне гэтага, відаць, ніколі не даравала б…

**9.** Канец нашых стасункаў быў хуткі, як нечакана хуткім бывае заканчэньне гульні ў канасту: вы трымаеце ў руках прыстойныя, пэрспэктыўныя карты, вы й блізка яшчэ не павыцягвалі ўсіх казыроў, а гульня, між тым, скончана незваротна.
Адбылося гэта наступным чынам: стоячы ля кабінэту, я з дапамогай цытаты зь Якаба Васэрмана спрабаваў патлумачыць Бэаце, што такое *час мужчыны* (*"Жанчына ніколі не зразумее, што такое час мужчыны. Яна глытае яго, як ліманад: колькі вы ёй яго дасьцё, столькі яна й праглыне, але самой няма калі, як пойдзе мераць капялюш"*), і тут раптам зь лесьвіцы вынырнуў Стыў — загарэлы, усьмешлівы, на голым целе — цагляна-чырвонае понча.
— Чорт, Стыў, — выгукнуў я прыдушана. — Ратуй нас хто

можа!
Я схапіў Бэату за руку, спрабуючы зацягнуць яе ў кабінэт раней, чым ён нас убачыць.
— Ты здурнеў? — заўпарцілася яна. — Мы што, так і будзем заўжды ад усіх *драпаць*?
*Зь неразуменьнем* мяне адпіхнула.
Ён нас ужо ўбачыў. Ашчэрыў бялюткія зубы. Бэата таксама ўсьміхнулася. Я праехаў языком па сваіх амальгамавых плёмбах і пазнаёміў іх аднаго з адным.
— *Hi*, — сказаў Стыў.
Падобна, ён быў усьцешаны.
Бэата сказала, што пра Стыва ўжо шмат чула і што яна сапраўды радая, што цяпер пазнаёмілася зь ім асабіста. Пасьля чаго з *шчырай цікавасьцю* папыталася, як яму спадабалася ў Мэксыцы. Стыў адказаў, што гэта было *absolutely great*. Потым ён пачаў распавядаць пра нейкія караблі, якія яны мусілі ўначы вартаваць. Я адкашляўся й паведаміў, што *unfortunately* мы сьпяшаемся. Бэата спачувальна выслухала мой збраслаўскі акцэнт і сказала, што яна нікуды не сьпяшаецца.
Стыў запрасіў нас увечары да сябе, каб паглядзець сто пяцьдзясят дыяпазытываў і расьпіць дзьве бутэлькі натуральнай тэкілы.
Я сказаў, што прыйшоў бы адзіна ў тым разе, калі б гэтыя лічбы былі адваротныя. Відаць, я нешта наблытаў, бо Стыў нічога не зразумеў. Бэата нешта сказала, чаго не зразумеў я. Стыў засьмяяўся. Я сказаў, што перад тым гэта быў толькі жарт — увечары я *unfortunately busy*. Стыў адказаў, што яму шкада.
Бэата сказала, што яна абавязкова прыйдзе, маўляў, апошнім часам вечарамі яна страшэнна сумуе. Я ў яе спытаўся па-чэску, ці ня хоча яна пасьля ўсіх гэтых савецкіх ледаколаў палепшыць свой кадравы профіль.
Нават не ўхмыльнулася.
Кола замыкалася.
— Давай скончым, — сказала яна. — Гэта ня мае сэнсу.
Кола замкнулася.

## X

**1.** *Як непрадказальныя жаночыя жаданьні.*
Шэксьпір

— Я проста хацела б, каб мы разышліся як два цывілізаваныя чалавекі, — папрасіла Бэата ў адзін з наступных дзён. — Ніякіх гэтых звычайных наўмысьля.
Хоць у мяне з *звычайнымі наўмысьля* не было вялікага досьведу, я рабіў што мог.
— Прывітаньне, Бэата. *Hi, Steve*, — вітаўся я зь імі ў школе на калідоры.
— Прывітаньне, — адказвала Бэата *па-сяброўску*. — Ці ты ня бачыў яшчэ *my new tattoo*?
Адгарнуўшы рознакаляровую футболку (рознакаляровыя футболкі, хусткі, каралі ды понча зь ейнага гардэробу хутка выціснулі ўсе ранейшыя настаўніцкія касьцюмчыкі), яна паказала мне голы жывот. Ейны пупок уяўляў сабой натуральную аснову для вытатуяванай архідэі, зь якой смактала нэктар маленечкая ружовая калібры.

— Гэта… вельмі прыгожа.

Стыў — як і Бэата — таксама пісаў. Дзякуючы гэтаму іхныя зацікаўленьні амаль ідэальна дапаўняліся. Да абеду яны выкладалі ангельскую мову, а пасьля звычайна скіроўвалі ў горад. Пераважна хадзілі з знаёмымі ў *“Макдональдз”*, але ўпадабалі й кавярню “Кіт”, *“FX Café”* ды піцэрыю “Кума”. На мэксыканскую кухню, у якую Бэата — зь яе ўласных словаў — *літаральна закахалася*, яны завітвалі ў *“Jo’s Bar”*. Часам таксама *прыпыняліся* ў рэдакцыях праскіх амэрыканскіх газэт *“Prague Post”*, *“Prognosis”* і *“Yazzyk”*. А ўвечары кахаліся ды пісалі.
Бэата трымалася думкі, што сёньняшняя Прага для амэрыканцаў — Парыж дваццатых гадоў. Маўляў, я яшчэ ўбачу, што з гэтага бесьперапыннага мастацка-інтэлектуальнага кіпеньня, з гэтага *выбуху крэатыўнасьці* ўзыдзе нешта сапраўды вялікае (мне тады падумалася, што гэта, магчыма, ня выбух крэатыўнасьці, а выбух унутранай радасьці ад курсу даляра да кроны, але я маўчаў). І Стывава кніга нібыта *сапраўды выключная*, пераканана сьцьвярджала яна. Дзея адбываецца па чарзе ў Празе, Амстэрдаме, Портляндзе і ў мэксыканскім порце Роза-Рыка-дэ-Ідальга.
— Глябальнае мысьленьне, разумееш?
Я кіўнуў.

Галоўны пэрсанаж, маўляў, — сымпатычны амэрыканскі лектар, які з сваім галяндзкім сябрам, што ў той час таксама жыў у Празе, зьяжджае на вакацыі ў Мэксыку. Той галяндзкі сябра — гісторык, які ўжо некалькі гадоў спрабуе высьветліць некаторыя малавядомыя акалічнасьці забойства Вільгельма І Аранскага, але ў Празе ён вырашае, што памянёная тэма яго больш не цікавіць, часткова таму, што ён, як выяўляецца, хворы на СНІД. Падарожжа праз усю Мэксыку для абодвух маладых мужчынаў стаецца экзыстэнцыйным выпрабаваньнем, але, калі ім у адной вэгетарыянскай рэстарацыі падсоўваюць чалавечыну, упершыню ў жыцьці яны скараюцца зь людзкой доляй. Увесь тэкст, маўляў, наўмысьля парушаецца *хвалямі безьзьмястоўнасьці* (якія, паводле Бэаты, адсылаюць чытача да стогадовага змаганьня галяндцаў з морам), апроч таго, у рытме ягоных сказаў таксама можна пачуць гукі арыгінальных інструмэнтаў мэксыканскіх індзейцаў — ацтэцкай флейты й бразготкі *sonajas*.
— Гэта гучыць цікава, — сказаў я.
— Гэтая кніга абсалютна *free*, — тлумачыла Бэата. — Яна ня зьвязаная зусім *нічым*!
— Так і павінна быць.
Яна яе, маўляў, паралельна перакладае на чэскую.
Запэўнівае мяне, што гэта будзе *бомба*.
Не магу дачакацца, калі яе прачытаю.

Толькі сёньня я прызнаю за сабой тую крывадушную *безумоўнасьць*, тую ўдаваную *пасьвечанасьць*, зь якімі я ад Бэаты спакойна, не міргнуўшы вокам прымаў усе тыя вар'яцкія, шокавыя паведамленьні. Толькі б паказаць, што *я не заангажаваны*!

— Цяпер мы часта ходзім у гэтую амэрыканскую пральню ў Дэйвіцах…
— Праўда!? Гэта файна…
— У сэнсе ня праць — проста так. Там усё так шыкоўна *friendly*.
— Я чуў…
Або іншым разам:
— Думаю, чалавек заўсёды павінен вызначаць для сябе нейкія найбліжэйшыя *тычкі*…
— Адназначна.

— І зусім ня важна, як гэта назваць. Проста нешта, што трэба пераадолець. Для нас з Стывам гэта цяпер скачкі на канаце.
— Божа мілы, і ты не баішся?
— Думаю, што не.
(На шчасьце, паліцыя ім гэта забараніла.)

*Але мала хто так дакладна, як Чапэк, зразумеў, што зьехаць за мора, падацца на вайну, знайсьці скарб, прадацца чорту, забіць цмока ці заваяваць прынцэсу для чалавека ніколі не было найвышэйшай ступеньню аўтэнтычнасьці, — а наадварот, ейнай супрацьлегласьцю, што ўсе гэтыя ўчынкі межавалі ажно зь нейкім парушэньнем і непарадкам… Чым далей, тым горш людзям удаецца напоўніць сваё жыцьцё, быць самімі сабой. Вось і застаюцца ўрэшце адно роспач і сорам за падзеі і ўчынкі, аўтэнтычнасьць якіх вельмі спрэчная.*
Ёзаф Едлічка

**2.** Начамі я ў цемры сядзеў у стаматалягічным фатэлі.
*Ува ўсім бачыць добрыя знакі*, намаўляў я сабе.
Наноў вынайсьці гумар.
Бо МакМэрфі ведае, што чалавек мусіць пасьмяяцца з усяго, што яму баліць, таму што толькі так ён можа захаваць сваю раўнавагу, толькі так можа пазьбегчы таго, каб сьвет давёў яго да шаленства.
Аднак справа пасоўвалася вельмі марудна і спаў я мала.
Дваццаць дзявятага верасьня ў мяне былі імяніны.
Дачка купіла мне пенку для галеньня *“Palmolive”*.
*“Good morning!”* — знайшоў я пад зашчапкай наступнае раніцы.
Fuck you!
Раніцы з маёй дачкой…
Калі я ішоў на працу, яна гатавала нам абаім сьняданак.
Аднойчы — ёй не было й васьмі — я ня мог знайсьці ёгуртаў, што купіў за дзень да таго. Нарэшце я адшукаў іх у сьметніцы.
— Яны старыя, — баранілася дачка.
— Што за глупства? — узьеўся я на яе.
Я шукаў на іх нейкую дату:
*“Тройская малачарня — заснаваная ў 1870 годзе”*, — заўважыў я раптам.
Мая дачка. Мой анёлак.
Але чаму я ўсё гэта кажу?

Яна мне дужа дапамагла. Пісаньне таксама дапамагала. Плюс кульбы штодзённых абавязкаў. Дый стаматалягічны фатэль быў ня надта ўтульны. Інакш кажучы: дапамагло й маё нежаданьне *сапраўды* гараваць.

Па-свойму імкнулася дапамагчы і Агата — яна лічыла абсалютна натуральным, што пяройме эстафэту ад большай сястры. Пачала яна з прыхаваных выклікаў: пільна глядзела мне ў вочы, нібы неўпрыкмет датыкалася да мяне сваімі грудкамі й гладзіла мяне, як хворага трусіка. Затым ёй прыйшло да галавы мне давесьці, што яна ўжо зусім не дзіця, і прыкметна часта яна пачала са мной гаварыць пра свае *даўнія каханьні*. Калі яна запрашала мяне на *прыватнае сьвяткаваньне* свайго пятнаццацігодзьдзя (на шчасьце, у той дзень я якраз мусіў быць у Нямеччыне), ейны погляд выказваў непахіснае пераканаьне, што яна мне будзе гэткай сама добрай каханкай, як і Бэата.

Неяк у “Збраславанцы” я спаткаў ейную маці — мяне ўсьцешыла, як спантанна тая да мяне падышла.
— Чым займаецца муж? — пацікавіўся я.
— *Прадпрымальнічае*, — сказала яна пагардліва. —
У найбліжэйшыя два гады памрэ ад інфаркту.
У бесстароннасьці, зь якой яна гэта сказала, было нешта вусьцішнае.
Яна зьлёгку дакранулася да маёй рукі:
— Каб вы толькі ведалі, у што яны ператварылі ейны пакой…
Вы сабе ўявіць ня можаце!
Я мог сабе гэта ўявіць.
— Гэтая дзеўка — псіх, — сказала спадарыня Кралава. —
А Крал гэта баіцца прызнаць.
Зноў гэтая бесстароннасьць.
— Ну, псіхі мы ўсе патроху, — адказаў я заспакойліва.
— Так, але ж ці да такой ступені? — запярэчыла яна.

Крыху ангельскай мовы:
*start up an engine* — завесьці матор
*step on the gas* — націснуць на газ
*let in the clutch* — пусьціць пэдаль счапленьня

*at top speed* — на ўсёй хуткасьці
*fly-over* — эстакада
*suicide* — самагубства

*Рэальнасьць адкрываецца перад намі дзякуючы таму, што мы пазбаўляемся зношаных формаў аповеду* (Роб-Грые).

І яшчэ адзін зацем што да тэхнікі аповеду (ён прыйшоў мне да галавы ў сувязі з згадкай пра Крала): Чэхаў сьцьвярджаў, што калі ў апавяданьні або ў рамане аўтар згадвае стрэльбу, пазьней зь яе нехта абавязаны стрэліць, карацей кажучы, яна ня можа знаходзіцца там *выпадкова*. Дык вось, я разумею, што калі ў маёй гісторыі Крала ад пачатку суправаджаюць два ўзброеныя целаахоўнікі і ніводны зь іх пры гэтым ня стрэліць, гэтым парушаецца няпісаны закон літаратурнае творчасьці. Мне шкада, але так і было. Часам жыцьцё паўстае супраць законаў літаратурнае творчасьці (вядома, я б мог напісаць, што Крала ўкаюкала пара ўкраінскіх мафіёзі ў сьміхаўскай рэстарацыі “Ў Галубоў” або што яго прыкулі да травэрсы на дне адной з паўднёвачэскіх запрудаў, але нешта не дазваляе мне так абысьціся з жывым чалавекам).

**3.** Сёньня былі Дзяды. На весьнічках цьвінтарнага гаю
я прачытаў аддрукаваную ўлётку Суполкі аматараў крэмацыі:

*Калі маё сэрца ператворыцца ў попел*
*па ветры кіньце яго*
*каб упаў у траву на лугах*
Ня надта.
Свае пяць ружаў я паклаў сярод камянёў на адхоне да згаданага *лужка* — ад учора яны стаялі ў мяне на гаўбцы ў слоіку. Сёньня, выходзячы з дому з букетам, я адцеміў, што мая жонка раўнуе нават да дзяўчат крэмаваных ды па ветры разьвеяных.

Бэата мне паведаміла, што на Каляды Стыў запрасіў яе ў Портлянд.
На Дзень дзячаньня.
— Я б таксама ня супраць паласавацца індыком.

*Проста неверагодна, колькі амэрыканцаў у Празе мігам знаходзяць сабе партнэрку. Амэрыканкі ані блізка такога шчасьця ня маюць і з агідай распавядаюць пра ўсё новыя сувязі, у якіх нібыта “патрыярхальныя амэрыканцы падшукваюць сабе пажадлівых візаві”. Ваяўнічы фэмінізм амэрыканскіх жанчын здолеў адштурхнуць дзясяткі тысяч мужчын, і ўцёклыя амэрыканцы шукаюць партнэрак пераважна толькі ў Эўропе.*
Вера Хасэова, “Літаратурныя навіны”

Год таму, адразу пасьля Дзядоў, Яраслаў Коржан прапанаваў мне напісаць для “Плэйбою” апавяданьне. Таго часу я ўжо зноў залежаў адно ад свайго настаўніцкага заробку, таму ягоную звабліву прапанову прыняў з радасьцю.

— Я напісаў апавяданьне для “Плэйбою”, — пахваліўся я ў школьнай сталоўцы Бэаце.
Яна кпліва паглядзела на мой пах:
— Цікава, пра што?
Затым весела пераклала навіну Стыву.
— Пра цябе. Называецца *“Інтэлектуалка”*.

Апавяданьне выйшла ў красавіку наступнага году.
Я доўга вагаўся, ці ўлучаць яго ў гэтую кнігу, — з аднаго боку, яно відавочна пазначанае імкненьнем дагадзіць запатрабаваньням спэцыфічнай чытацкай аўдыторыі, апроч таго, мая аўтастылізацыя пад ролю *разьведзенага інтэлігента* пасьля ўсяго таго, што я тут пра сябе і свой шлюб казаў, абавязкова падасца камічнай, і, нарэшце, мне й самому здаецца, што падобныя пераходы да абсалютна іншай гісторыі ўносяць у кнігу пэўны дысананс (да прыкладу, я не ўважаю за ўдалае ўлучэньне “Гарпавых” апавяданьняў у выдатны раман Джона Ірвінга “Сьвет вачыма Гарпа”). І калі я ўрэшце, нягледзячы на ўсё гэта, схіліўся на карысьць ягонага ўлучэньня, дык толькі дзякуючы непахіснаму перакананьню, што, насуперак некаторым вонкавым адрозьненьням, я пішу ўсё тую самую гісторыю (а да таго ж я проста *павінен* вам прадэманстраваць сваю геніяльную інтуіцыю, зь якой я ў апавяданьні прадказаў пазьнейшую Бэаціну чыннасьць *экалягічную*).

ІНТЭЛЕКТУАЛКА

*Калі злы лёс або раённы ваенкамат некалі вас прымусяць правесьці адзінаццаць месяцаў у цесным вагончыку сам-насам з адным чалавекам і адной траскучай радыёстанцыяй, вам мусова давядзецца ўзброіцца неабыякою цярплівасьцю. Калі ж да ўсяго гэты вагончык стаіць пасярод бязьлюдных памежных лясоў Шумавы і калі гэты чалавек кожнае раніцы, гучна высмаркаўшыся ў бляшаны рукамыйнік, не праміне з дакорам вам нагадаць, што вас у інстытут прынялі, тым часам як яго не, вы мусіце нават прыкласьці пэўнае намаганьне, каб застацца пры сваім розуме. Аднак калі вы з гэтым чалавекам мусіце дзяліцца ня толькі армейскім часопісам "Атам" з адзінаю крыжаванкай, але й адзінай дачкой досыць дэспатычнага дрывасека з досыць аддаленага хутару, вам не застанецца нічога іншага, як раз і назаўсёды вырашыць: або вы свайму калегу ў сьне прастрэліце галаву службоваю зброяй, або зь ім пасябруеце. Мы з Оскарам, як сьлед узважыўшы выгады й нявыгады першага варыянту, выбралі ўрэшце другі. Калі ж паступова наблізіўся канец нашае супольнае службы, я вымушаны быў сабе канстатаваць, што, хоць без саплёў у рукамыйніку я ў будучыні абыдуся, але самога Оскара, ягонай вясёлай прасьцяцкай балбатні і ягонага кулінарнага далікатэсу — крывавага* стэйку лясного рабочага — *мне, магчыма, будзе крыху неставаць. На шчасьце, у той дзень, калі нашыя дарогі мусілі канчаткова разысьціся, Оскар у рэстаране* "Ў Караля Шумавы" *выпіў якую лішнюю чарку і ў непахісным пераканаьні, што ён сядае ў курцоўскае аддзяленьне прыгараднага цягніка да роднага Глініска, сеў разам з мной на экспрэсны аўтобус да Прагі, дзе ў наступныя дні трывала асеў.*

Рэчы, выкліканыя да жыцьця ў загадным парадку, доўгай жыцьцёвасьці звычайна ня маюць, аднак наша сяброўства з Оскарам, ля вытокаў якога стаялі адразу два прызыўныя загады, сталася тым самым выняткам: старое цёмна-сіняе рэно Оскара вечна паркавалася пад вокнамі маёй кватэры і гэтая самая машына гадамі вазіла мяне ў адпачынкі, на пахаваньні сяброў ды разводы. Да таго ж Оскар пачаў працаваць кіроўцам на прадпрыемстве, дзе працаваў і я, і неўзабаве неафіцыйна зрабіўся маім асабістым шафёрам. Я любіў езьдзіць зь ім, бо ён ведаў клясныя анэкдоты і яшчэ лепшыя матарэсты, а галоўнае, ніяк не абцяжарваў сябе ненатуральнай ветлівасьцю фірмовых

кіроўцаў. Наадварот: у сваіх выразах ён увесь час зьвяртаўся да нашай колішняй сакавітай шумаўскай фразэалёгіі.
— Гэтай я б з радасьцю ўмяшаўся ў ейныя ўнутраныя справы, — казаў ён, паглядаючы на прыгожых дзяўчат у гарадох, празь якія мы праяжджалі, і юрліва ўхмыляўся, зусім як тады, калі — па вяртаньні ад дачкі дрывасека — над бляшаным рукамыйнікам мыліў калені, фіялетавыя ад расьціснутых чарніцаў.
Вось жа, я быў рады, бо мне здавалася, што, калі б мы ад нашага вайсковага слоўніка адракліся зусім, мы б мусілі зрачыся й чагосьці вельмі прынцыповага для нашага сяброўства, якое зараджалася ў часе, калі — кажучы словамі Оскара — нам часам былі ахвотныя даць хіба што лісіцы.
*Аднак потым мы сустрэлі Бэату.*
Ужо праз пару хвілінаў пасьля таго, як я тае дажджлівае раніцы дазволіў яму, насуперак інструкцыям, падабраць гэтую прамоклую аўтастопніцу, я пашкадаваў пра сваё рашэньне. Празь дзьве гадзіны мне ўжо было зразумела, што гэта была памылка, якую з поўным правам можна назваць лёсавызначальнай.
Запэцканыя гразьзю пальцы ў скураных сандалях, уласнаручна пашытая доўгая спадніца, зь якой па ўсім пэрымэтры зьвісалі ніткі, і вялізны чорны цельнік, у расьцягнутым дэкальтэ якога зноў а зноў агаляліся маленькія грудзі. Ангельскі надпіс на цельніку нас прасіў — калі толькі я слушна пераклаў, — каб мы не пасылалі дзявочым душам каляровых паштовак з паездак на верасовішчы. Здымаючы з плячэй мініятурны заплечнік, відавочна поўны кніг, дзяўчына нас па-чэску паінфармавала, што яе зваць Бэатай і што едзе яна ў Шрамкаў Пісэк.
— Шрамэк[14]*? — радасна выгукнуў Оскар.*
Высьветлілася, што ён некалі чытаў “Срэбны вецер”, а з год таму бачыў у тэлевізіі “Месяц над ракой”. Дарма што пастаноўку “Месяца над ракой” Бэата адмовілася камэнтаваць, а “Срэбны вецер” азначыла за няскладна празрыстую бэлетрызацыю палавога высьпяваньня*, гэтая тэма ў іх пратрымалася поўных трыццаць хвілінаў. Оскар — я толькі дзіву даваўся — згадаў нават слова* імпрэсіянізм*, але Бэата яму паблажліва патлумачыла, што гэта толькі* падраны камуфляж*,* які Шрамэк наіўна накідваў на голыя тэзы сваіх сюжэтаў. *Оскар дапусьціў, што з пэўнага пункту гледжаньня*

*так сапраўды магло быць, прычым ягоны ўласны пункт гледжаньня абмяжоўваўся ўяўнай прамой паміж ягонымі блакітнымі вачыма, люстэркам задняга віду і Бэаціным дэкальтэ. Бэата сказала — маўляў, адзінае, што з Шрамка таксяк пераж*ыло, *гэта шэсьць або сем раньніх вершаў і, вядома, “Цела” — яно яе некалі літаральна паланіла. І хоць цяпер ёй раман крыху* пачужэў, *але яна зьбіраецца яго* актуалізаваць як сцэнічную псыхадраму. *Хвіліну падумаўшы, Оскар сказаў, што гэта, магчыма, надзвычай добрая ідэя. Я ўпарта маўчаў. Потым Бэата ў Оскара запытала, ці падабаецца яму ягоная праца кіроўцы. Але ж ён ніякі не кіроўца, адказаў Оскар, ён толькі раздумвае, на што скарыстаць жыцьцё, а ў машыне яму, маўляў, спрадвеку думалася найлепш. Можа, ён сыдзе высока ў горы, а можа, паспрабуе яшчэ вучыцца. Калі ён гэта казаў, ён ужо зусім не трымаўся за стырно, спусьціўшы рукі між ног і мройліва адкінуўшы голаў на падгалоўнік. Ягоная нага на пэдалі ўтрымлівала нязьменную хуткасьць сто дваццаць кілямэтраў за гадзіну.*

**[14] Франя Шрамэк (1877—1952) — чэскі паэт, празаік і драматург, найяскравейшы прадстаўнік генэрацыі “бунтаўнікоў”; у студэнцкія гады жыў у горадзе**

**Пісэк.**

— Глядзі на дарогу, — сказаў я.
— Вам Шрамкава “Цела” не падабаецца? — заатакавала Бэата ў лоб.
— Не, — сказаў я. — Дзеля ягонага цела я б у Пісэк адназначна не паехаў.
Яна спачувальна скрывілася, насамрэч ліхаманкава разважаючы, чым бы мяне найлепей зьняважыць. Урэшце яна вырашыла пазьдзекавацца з майго гальштука. Яна нахілілася да майго сядзеньня і гідліва ўзяла яго кончыкамі пальцаў:
— Божа Ісусе, што гэта такое? — зь недаверам спытала яна.
— Адгадайце, — сказаў я спакойна.
Такі тып мяне ўжо ня здолее ўсхваляваць.
— Даю вам тры варыянты: а) звычайны аксэсуар эўрапейскага мужчынскага адзеньня, называны гальштукам; б) проста выпала мая тоўстая кішка; в) тканевы амулет, што ахоўвае мужчынаў ад інтэлектуалак.
Ані гэтым разам яна не ўсьміхнулася, але мяне гэта не зьдзівіла. Дзяўчаты, як яна, з жартаў сьмяюцца толькі тады, калі наткнуцца на іх у кнізе малавядомага, найлепш англаамэрыканскага аўтара. Гэтая, думаю, не ўсьміхнулася б нават тады, калі б каля яе сядзеў сам Джэймс Тэрбэр.
— Вы маеце нейкі досьвед з інтэлектуалкамі? — наадварот, зьедліва спытала яна. — Дзе ж вы іх знайшлі?
— Толькі з адной, — сьціпла адказаў я і паказаў на ейны пляцак. — На нашым разводзе яна была дакладна з такім самым заплечнікам.
У яе ўсё ж вырваўся кароткі сьмяшок.
— У вас ёсьць зубы! — выгукнуў я зь зьдзіўленьнем.
Яна пагардліва сьціснула вусны.
— Ды не, спакойна сабе іх паказвайце, — сказаў я і апусьціў погляд на ейныя аголеныя грудзі. — Вам няма за што саромецца.
На наступныя пятнаццаць хвілінаў яна пакінула нас у спакоі. Аднак потым абвесьціла, што яна не пасьпела пасьнедаць і што таксама выпіла б кавы. Я наўмысна пакінуў ейныя словы без камэнтару, але Оскар кілямэтраў праз дваццаць завярнуў да прыдарожнай кавярні. Я запытальна ўзьняў бровы, аднак ён гэтага не заўважыў, бо зь небывалаю засяроджанасьцю пачаў правяраць зьвесткі ў дарожным лісьце.

Прыдарожная кавярня, якую я дагэтуль ня ведаў, была нечакана ўтульная — скляпеністая столь, чыста пабеленыя сьцены, вокны й фіранкі колеру мёду, кахля з узорам скуры, масіўныя авальныя сталы, чыстыя палатняныя абрусы, у вазачках з грубай керамікі — жоўтыя сухацьветы. Мэню было ў жоўтай паркалёвай аправе. Гэта крыху палепшыла мой настрой.

— Баюся, — прамовіла Бэата, разгледзеўшыся навокал, — што гэтыя модныя рустыкальныя крэацыі будуць цяпер тэрарызаваць нашыя пачуцьці абсалютна паўсюль.

— Нічога ня зробіш… — згодна пабедаваў Оскар.

Прыйшоў кельнэр. Бэата акінула яго позіркам, які ў бальшыні людзей прызначаны хіба што для выпадковых сустрэчаў зь іншаплянэтнікамі ў дрыгвяністай абалонцы, і замовіла сабе завараную каву з малаком, белы ёгурт, дзьве грэнкі, пячаркавы сыр і адно яйка ўсьмятку, пасыпанае зялёнай цыбуляй. Кельнэр суха ўсьміхнуўся і пайшоў папытацца на кухню. Калі ён праз хвілю вярнуўся, на ягоным сьветлым драўляным падносе было абсалютна ўсё за выняткам пячаркавага сыру — аднак ён адразу ж прапанаваў Бэаце некалькі іншых гатункаў. Бэата ўсе іх паступова адпрэчыла і дадала да замовы ананасны сок. Мною трывала авалодала адчуваньне, што насупраць мяне сядзіць мая былая жонка, і я вачыма выказаў кельнэру ціхае спачуваньне.

— Калі вы так лісьліва паводзіце сябе нават з звычайным бармэнам, не хацела б я бачыць, як вы размаўляеце, напрыклад, з даішнікам… — кінула Бэата ў мой адрас, калі кельнэр сышоў.

Я адказаў, што імавернасьць сустрэчы з дарожным патрулём — беручы пад увагу тое, што Оскар ужо пэўны час тарашчыцца не на дарогу, а выключна на ейнае дэкальтэ, — сапраўды досыць высокая, але што, тым ня менш, я паспрабую ня надта ўлягаць перад праваахоўнікамі.

Падчас Бэацінага сьняданку нам выпала нагода пазнаёміцца і зь іншымі ейнымі поглядамі. Сёньняшнія правыя партыі, маўляў, здаюцца ёй плюгава мэтавымі, левыя партыі, у сваю чаргу, вульгарна, ліпуча папулістычнымі. Палітычны цэнтар — гэта міт, створаны людзьмі, што баяцца ўласных поглядаў. Нашую культуру немагчыма назваць культурай, як немагчыма назваць некалькі выспачак у моры сушай. Школьная адукацыя

вычарпала сябе шматсотгадовым удаваньнем сэнсу перад вучнямі, бацькамі й настаўнікамі. Корак — у сэнсе пакрыцьця падлогі — яна ўважае за прыхаваны снабізм. Гічкок яе страшэнна весяліць, тым часам як дзеці, што коўзаюцца на каньках, зь нейкай ірацыянальнай прычыны наганяюць ёй на вочы сьлёзы. Гандзі мог бы зрабіцца ейным кумірам, каб ня быў такім беспадстаўна няўважлівым. Жаночае цела — гэта капітал, які мужчына прыўлашчвае без кампэнсацыі. Я ўжо па сутнасьці мёртвы, згарэлы знутры чалавек, а Оскар мае ў сабе нешта, пра што яшчэ сам ня ведае.

— Пухліну? — выказаў я здагадку, але яна маю рэпліку не палічыла вартай сваёй увагі. Апошні шанец гэтага сьвету — эмпатыя, *працягвала яна. Усё вырашыцца гадоў за шэсьць, максымум восем. Калі ўсё скончыцца добра, наступнае стагодзьдзе будзе векам пераносу думак. Бо ўсё ёсьць складнікам усяго — можа, і гэтая ваза нясе нам нейкае пакуль невядомае* касьмічнае пасланьне.

— Рустыкальнае *касьмічнае пасланьне, — сказаў я.*

Ужо тады я ведаў, што шчырую дарэмна. Самыя іранічныя кпіны, якія яе перад Оскарам мусілі дэмаскаваць, ня мелі ніякага сэнсу. Сьляпы ані маскі ня бачыць, ня кажучы ўжо пра сапраўднае аблічча. Сьляпы ня бачыць нічога.

— З такімі, як вы, трэба змагацца, — сказала яна мне зь непрыхаванаю антыпатыяй.

— Вось толькі як? — пытаўся Оскар захоплена.

Ён быў страчаны. Я зразумеў гэта раней, чым яна ў Піску, нядобра на мяне паглядаючы, пакінула яму свой нумар тэлефону.

На жаль, наступныя тыдні мяне ў гэтай упэўненасьці толькі ўмацавалі. Оскар перастаў да мяне заяжджаць, пазьбягаў ён мяне і на працы. Калі я ў яго наўпрост пра гэта спытаў, ён адказаў, што ў яго няма часу, бо вечарамі, маўляў, піша вялікае эсэ пра фэномэн хуткасьці ў сучасным сьвеце.

— Эсэ? — паўтараў я, каб пераканацца, што пачуў слушна. — Эсэ? Пра фэномэн хуткасьці?

— Але, — сказаў Оскар. — Бэата мяне папрасіла.

Карацей кажучы, вечарамі ён пісаў эсэ. З часам Бэата да яго пераехала — відаць, каб трохі дапамагчы з пунктуацыяй. Оскар адпусьціў бараду, а на галаве пачаў насіць вышываныя каляровыя хусткі, зрабіўшыся падобным да маладога Ясіра

Арафата. Яны прадалі Оскараву мэблю, а спальню ператварылі ў студыю, дзе шматавалі й пражоўвалі выразкі з часопісаў, старыя афішы, трамвайныя квіткі, Бэаціны цыдулкі ды перадвыбарныя ўлёткі, ствараючы з узьніклай папяровай матэрыі т. зв. прыватнапалітычныя артэфакты. *Яны курылі траву і елі кукурузу. Падабралі бадзяжнага сабаку, двух драздоў, што нібыта выпалі з гнязда, а з дасьледчага інстытуту прынесьлі белага пацука, фрустраванага ад бясконцых экспэрымэнтаў.*
— Ня думаю, каб яму надта палепшала, — сказаў я на тое. Оскар нават не ўхмыльнуўся. Цяпер ён сьмяяўся толькі з таго, з чаго сьмяялася Бэата. Хадзіў толькі на тыя фільмы, на якія яна купляла квіткі. Наведваў толькі тыя выставы, што адбываліся ў нейкім абшарпаным маластранскім склепе або ў абшарпанай маластранскай арцы. Увечары хадзіў пераважна ў "Бункер" *або ў* "Мамма-клюб". *Пра мяне ён сказаў, што я выглядаю як стары бацяня. Ён схуднеў на дзесяць кіляў і засынаў за стырном. Калі ў адзін вечар, вяртаючыся з Страканіц, мы на поўнай хуткасьці зьехалі ў жытнёвае поле, я страціў цярплівасьць. Оскар слаба апраўдваўся, што хацеў толькі нарваць каласкоў на сьняданак, маўляў, думаў, што гэта авёс.*

— Аааааа! — роў я непрытомна, пакуль Оскар заднім ходам выяжджаў назад на дарогу. — Аааааа! Досыць! До!
Рэшту дарогі мы маўчалі. У Збраславе я прымусіў яго павярнуць і заехаць ажно нагору — да касьцёлу на Гаўліне. Я выйшаў, злосна ляснуў дзьверкамі і скіраваў крок да могілак — я ішоў упэўнена, бо ў часы, калі мой шлюб хіліўся да разводу, я бываў тут адносна частым наведнікам. Оскар няўцямна, але паслухмяна ішоў за мной сьледам. Я ня мог на яго глядзець: хустка, што спаўзла на лоб, скамечаная палатняная кашуля, што вылезла з нагавіцаў, стаптаныя індзейскія сандалі, на шыі шкляная ампулка зь нейкаю дзіўнаю вадкасьцю. Цікава, што ў ёй такое? — пытаў я ў сябе гняўліва. — Пасьвечаная вада? Кракадзілавы сьлёзы? Паненская кроў? Спэрма Ладзіслава Клімы[15]*? А, трасца, досыць! — лаяўся я ў думках.*
Перад скульптурай Маржаткі з назваю Інтэлігентнасьць *я спыніўся. Як блізка я яе ведаў! Зьвешаная галава, апушчаныя*

*плечы, невыказная пакута ў змарнелым абліччы. Пад запалымі вачыма векавечны цень. Я схапіў Оскара ззаду за шыю:*
— Добра паглядзі, ідыёце, — крычаў я яму, ахоплены немачным шалам. — Вось так ты скончыш. Дакладна вось так!
Патыліца Оскара працівілася маёй руцэ, але я нацiскаў тым мацней, чым лепей усьведамляў, што людзі ёсьць і будзе неперадавальны.
— Бачыш, да чаго вядзе гэтае яе пазнаньне*! — рэзюмаваў ён.* *— Вось да чаго! Вось да чаго!*
Па сьцяжынцы да цьвінтарнага гаю ішлі дзьве бабулькі.
Я дацягнуў Оскара да найбліжэйшае лаўкі, дзе праляжаў доўгую — на дваццаць хвілінаў — натацыю.
— Ты ўсё бачыш надта проста, — нарэшце сказаў Оскар. — Сьвет не такі просты. А хто робіць выгляд, што такі, сам сабе маніць.
— Тады мані! — *узмаліў я яго. — Няўжо ты не разумееш, што бяз гэтай маны не абысьціся?*
Я зрабіў яшчэ адну спробу, распавёўшы яму пра героя раману Італа Звэва: калі таму чалавеку ягоны кульгавы сябра патлумачыў, што адзін чалавечы крок складаецца зь пяцідзесяці сямі самастойных рухаў цягліцаў і сухажыльляў, ён таксама *пачаў кульгаць.*
— Разумееш! Ці зразумеў ты нарэшце?! — гукаў я сьлёзна.
*Оскар адказаў, што памянёнага раману, на жаль, не чытаў, бо яго, маўляў, — у адрозьненьне ад мяне — у інстытут не прынялі. Потым ён сказаў, што нам варта ехаць, бо яны з Бэатай ды некалькімі* разумнымі *анархістамі ладзяць увечары невялічкі гепэнінг пратэсту.*
У тое імгненьне я канчаткова здаўся. Я нават не пытаўся, супраць чаго яны пратэстуюць.
Недзе праз пару тыдняў падчас адной з службовых выправаў Оскар купіў пераносную школьную дошку. Прыцягнуўшы яе ў машыну, ён хутчэй фармальна спытаў, ці можна яе пагрузіць і адвезьці ў Прагу.
— Рабі што хочаш, — сказаў я расьцьвелена.
Аднак ён адчуваў неабходнасьць патлумачыць мне мэту свайго эксцэнтрычнага закупу і прачытаў невялікую лекцыю. Маўляў, у моры словаў, якімі людзі карыстаюцца, індывід лёгка страчваецца. Бо словы прыходзяць і сыходзяць, як марскія хвалі, і чалавек ня здольны іх затрымаць на такі час, каб

15. Гадзіна нуля

**Клімка (1878–1928) — чэскі пісьменнік і філёзаф, бунтаўнік, які ўрамантычных традыцыях раманаў пісаў пра жыць паводле закону.**

пасьпець зразумець. Таму між людзьмі здараецца столькі непаразуменьняў. Звычайная школьная дошка й кавалак крэйды могуць дапамагчы такіх непаразуменьняў лёгка пазьбегчы.
— Ага, — сказаў я з агідай. Мне ўсё гэта было да жуды знаёма. У часе, калі мы з маёю былою жонкай губляліся ў моры словаў, мы пісалі адно аднаму доўгія лісты. Мая экс-жонка друкавала іх на машынцы. Школьная дошка, на дзіва, ёй да галавы не прыйшла.
Нішто не вычэрпвае гэтак, як марнае шчыраваньне. Я адчуваў, што мне трэба трохі перадыхнуць, і хоць звычайна я не бяру адпачынку ў летнім сэзоне, гэтым разам я ўзяў яго ўжо на пачатку ліпеня. І не пашкадаваў: не пасьпеў аўтобус даехаць да Пулы, як я пазнаёміўся з сваёю маладою суседкай. Яе клікалі Зузанкай, і была яна шыкоўна неадукаванай дзяўчынай. Выдавала на тое, што лёс урэшце вырашыў выплаціць мне прынамсі частку таго, што быў завінаваціўся.
— Што вы думаеце пра коркавую падлогу? — спытаў я ў Зузанкі, так проста, дзеля параўнаньня.
— Гэта прыгожа, — адказала яна прастадушна. — І практычна: даволі проста выцерці…
Ува мне ўсё сьпявала. Пра палітыку мы не размаўлялі, а пра Гандзі яна, думаю, нават ня чула. Мы хадзілі ў маленькую вінарню пад чыстым небам на самым беразе мора. Афіцыянты пад пінжакамі насілі тут паласатыя цяльняшкі, а на трамах віселі штучныя нераты, у якіх зьзялі аранжавыя й чырвоныя папяровыя ліхтарні ў выглядзе марскіх зорак і конікаў. Калі мы трапілі туды ўпершыню, я ўсё ж сачыў за тварам дзяўчыны з пэўнаю асьцярогай.
— Тут прыгожа! — шчыра ўсклікнула Зузанка, разьвеяўшы мае сумневы.
Думаю, я яе сапраўды кахаў. Калі праз пару дзён я без кампэнсацыі прыўласьціў капітал ейнага цела, *яна выглядала амаль удзячна. Звычайна пры канцы адпачынку мне ўжо робіцца трохі нудна, але з Пулы я зьяжджаў без усякае радасьці.*
Сустрэчу з Оскарам, вярнуўшыся, я адкладаў цэлы тыдзень, але ўрэшце я не стрываў і выклікаў яго ў свой кабінэт.
— Здароў. Як адпачыў? — спытаў ён бязь сьледу цікавасьці. Ён выглядаў горш, чым калі раней. Апроч іншага ў яго ледзь прыкметна трымцелі рукі.

— Клясна. Трохі адрыгваю рыбаў з сракамі, але ў астатнім клясна. Патрахаўся як мае быць, — адказаў я яму па-шумаўску. Пры згадцы пра трах *Оскара перасмыкнула, і ён адвярнуў галаву.* Адпачынак скончыўся.
— Што такое? — спытаў я клапатліва.
— Нічога, — адказаў Оскар. — У ложку ў нас нешта ня надта выходзіць.
Наступнага дня нас чакаў арбітраж у Лібэрцы. Оскар паабяцаў, што а шостай раніцы заедзе па мяне дадому. Марна прачакаўшы да паловы на сёмую, я пазваніў у аўтапарк, але ані пра яго, ані пра машыну там нічога ня ведалі. Голас загадчыка гаража гучаў раззлавана. Я з таго не зьдзівіўся.

Абсалютна пасіўна я паехаў да Оскара сам. Службовая машына — відаць, не адзін тыдзень нямытая — стаяла перад домам. Оскар адчыніў толькі пасьля трэцяга званка. Дарма што ён быў у нейкай японскай піжаме, не падобна было, каб уночы ён спаў. Ён зьдзіўлена мружыў на мяне свае счырванелыя вочы з-пад апухлых павекаў. Мяне ўсьцешыла, што ён мяне ўвогуле пазнаў.
— А, ну так, даруй, — перапрасіў ён непрытомна. — Зайдзі, я ўжо іду.
Кватэра выглядала як сакратарыят анархістаў. Шпалеры, якія мы некалі разам выбіралі, былі паабдзіраныя, а з голых сьценаў зьвісалі сотні нядбайна прыклееных газэтных выразак.
З колішняй мэблі засталіся адно дзьве дубовыя шафы, на якіх цяпер паскоквалі й выпаражняліся выратаваныя дразды; затое дадаліся два пісьмовыя сталы й нафтабак, што выконваў функцыю журнальнага століка. Двухспальны ложак з былое спальні быў засоблены блакітным полагам. Блакітны полаг быў засоблены цыдулкай “Я на пошце. Бог”.
*— Госпадзе Божа, — прамовіў я ціха.*
Оскар паціснуў плячыма. Адразу, як я прыйшоў, Бэата дэманстратыўна зачынілася ў ванным пакоі, таму Оскару давялося галіцца ў пакоі; галіўся ён укленчыўшы — бо разэтка знаходзілася ля самай падлогі, а шнур у брытвы быў закароткі, — пры гэтым вольнай рукой безь перастанку адпіхваў назолу-пацука. Уся гэтая карціна мяне трохі расчуліла — падобна як погляд на дзяцей, што коўзаюцца на каньках, расчульваў Бэату, — і я ўважыў за лепшае павярнуцца да Оскара сьпінай. У рагу

перад сабой я ўбачыў знаёмую школьную дошку: “Ты сьцьвярджаеш, што твой аргазм ёсьць функцыяй маёй папярэдняй сардэчнасьці цягам дня”,— *было напісана на ёй.* Почырк быў крыху нэўратычны. Оскар люнатычна выцер дошку. У мяне было адчуваньне, што ён вось-вось рассыплецца ўшчэнт.

Машына была ў падобным стане: апрача сьцёртых шынаў і нядзейнае правае фары досыць праблематычна давалася пераключэньне хуткасьцяў. Я не адважваўся ўпікнуць яго ў гэтым, — у рэшце рэшт, калі нехта клапоціцца пра дразды ды анархістаў, ня можа думаць яшчэ й пра машыну. З чацьвёртае спробы Оскар пасьпяхова завёўся, і мы выехалі. З матору ў салён даляталі не зусім звыклыя гукі.

— Падобна, я імпатэнт, — хрыпла сказаў Оскар праз хвілю.

— Віншую.

Оскаравы вочы, утаропленыя ў далягляд, мокра бліснулі.

— Хочаш мяне расчуліць? Дарма, — сказаў я зацята. — Я цябе папярэджваў.

І я на поўным сур’ёзе падумаў, што час сабе зьмяніць кіроўцу.

— Што ты думаеш пра народных лекараў? — спытаў раптам Оскар.

— Нічога, — адсёк я. — Я пра іх нічога ня думаю. Я нічога ня думаю ні пра каго й ні пра што. Рабі так і ты, і табе не спатрэбяцца народныя лекары!

Ён нічога не адказаў, але перад адным з наступных перакрыжаваньняў прыкметна запаволіў; спытаў дазволу, каб заехаць да нейкага таго народнага лекара. Маўляў, адсюль гэта пару хвілінаў дарогі.

— Ні ў якім разе, — сказаў я рашуча. — Мы й без таго ўжо спазьніліся.

Оскар зьехаў на абочыну і спыніўся.

— Я нікуды не паеду! — стаяў я на сваім.

Оскар выключыў матор.

— Бэата кажа, што гэта адзін з нашых найлепшых псыхатэрапэўтаў, — сказаў ён прыдушана ў насталай цішы.

— Аааааа! — зароў я роспачна і бязрадна. — Аааааа!

Оскар цярпліва вычэкваў.

— Аааааа! — вырываў я зь сябе назапашаны стрэс, і ўсё маё цела ўсьпіналася пад рамянём бясьпекі. Я затарабаніў сьцятымі кулакамі па бардачку, і мне на калені выпала некалькі

цыгарэтных недапалкаў, дазваньня парэзаны часопіс “Акно” і замусоленая картка з раскладам працы богніцкай псыхіятрычнай больніцы.
— Буду адведваць цябе кожную цотную сераду, — паведаміў я Оскару, уважна яе прагледзеўшы. — Пасуе табе?
Ён мне сур’ёзна патлумачыў, што туды яны ходзяць толькі да некаторых лёгкіх пацыентаў, зь якімі спрабуюць інсцэнаваць Кафкава “Ператварэньне”.
— Калі вас застукае нейкі доктар, ён вас заб’е, — папярэдзіў я яго.
Ён сказаў, што дактары ў гэтым удзельнічаюць таксама.
— Вось як, — адказаў я.
Оскар завёў матор.
— Дык можна?
— Едзь! — зароў я. — Едзь куды хочаш! Ідыёт! Ты што, не разумееш, што зь ёй табе аніякі Люрд не дапаможа?
Віла, у якой пражываў народны лекар, дазваляла чакаць, што ейны ўласьнік сапраўды дапамог многім пакутнікам, а тыя, у сваю чаргу, дапамаглі яму. Я адмовіўся пакінуць машыну. Прыём цягнуўся ня больш за пятнаццаць хвілінаў.
— Што? Ужо гатова? — папытаўся я зьдзіўлена, калі Оскар зноў сеў на суседнім сядзеньні. — Калі яму досыць пятнаццаць хвілінаў, каб зрабіць з чалавека зьвера, тады ён і праўда найлепшы.
— Будзе мяне лячыць на адлегласьці, — сказаў Оскар разважліва. — Сёньня ўвечары а дзясятай.
Я вельмі доўга маўчаў.
— Добра, — сказаў я нарэшце. — А цяпер, мілы Оскару, адвязі мяне на гэты чортаў арбітраж. Думаю, я ніколі яшчэ так ня марыў трапіць на звычайны чортаў арбітраж. Едзь. Едзь.
Арбітраж тады насамрэч спраўдзіў тое, чаго я ад яго чакаў: хоць ён і быў надзвычай сумны, расьцягнуты, а прафэсійна кажучы, і напаўнепатрэбны, але ўвадначас дзякуючы яму я на цэлых сем гадзінаў апынуўся ў супольнасьці людзей, якія сваю адукацыю й жыцьцёвы досьвед імкнуцца выкарыстоўваць сабе на карысьць, а не як зброю супраць сябе. Па ягоным сканчэньні я яшчэ з гадзіну туляўся па крамах, хоць мне й ня трэба было нічога канкрэтнага, і з уцехай, для мяне досыць нетыповай, тут і там размаўляў зь некаторымі гаваркімі прадаўцамі і прадавачкамі пра замежныя кавааркі, пра ўгнойваньне

пакаёвых расьлінаў ды праблемы зь сьвідраваньнем бэтонных панэляў. Таму да службовай машыны я вяртаўся на ладныя паўгадзіны пазьней, чым мы з Оскарам дамаўляліся. Выехалі мы ў магільнай цішы, якая, аднак, як мне здавалася, была значна лепшай за ўсё, што мы з Оскарам маглі адзін аднаму сказаць. На шчасьце, неўзабаве мне ўдалося заснуць.
Калі я прачнуўся, я ўбачыў, што мы стаім пры самым канцы працяглага пад'ёму, на нейкай невялікай забалочанай пляцоўцы. Зьлева ў два шэрагі складзены кубамэтры напілаваных дроваў, якія мне зусім засланялі шашу. Між дрэваў на даляглядзе яшчэ праглядалі апошнія рэшткі дзённага сьвятла, але тут, у лесе, была ўжо досыць глыбокая цемра. Оскар нерухома стаяў над адчыненым капотам: апушчаныя плечы, зьвешаная галава. Ягоны цёмны сылюэт нагадваў статую.

Я павярнуў ключык запальваньня, і панэль кіраваньня заліло прыемнае зеленаватае сьвятло. Я ціхенька ўключыў радыё і ўтульна паклаў галаву на падгалоўнік. Мне здавалася, што ў такім становішчы і пры такой ціхай прыемнай музыцы я гатовы прыняць усякую навіну, якую мне лёс прынясе, — хоць бы й навіну пра ўласную сьмерць. Тым менш мяне магла ўсхваляваць нейкая трывожная вестка пра паламаную каробку перадачаў ці карбюратар, і ўжо зусім мяне не маглі ўзрушыць нейкія размовы пра дзяўчыну, чыё сэрца зьбітае з ладу залішнім тэарэтызаваньнем. У каронах елак гуў цёплы вецер. Мне гэта нагадала Шумаву.
Дзьверы адчыніліся. Запахла лесам. Оскар абрынуўся на сядзеньне.
— Больш не магу! — застагнаў ён.
Я ня ведаў, ці ён мае на ўвазе Бэату або рамонт машыны, але мне было збольшага ўсё адно. Жыцьцё, вар'яцкае жыцьцё, казаў я сабе ў думках у нейкай невытлумачальнай эўфарыі.
Оскара тым часам нібыта прарвала. Маўляў, калі ён тушыць лямпу, яна пытаецца ў яго, ці не баіцца ён праўды сьвятла. *Калі пакідае лямпу гарэць, пытаецца іранічна, ці ён насамрэч хоча выставіць свае касмэтычныя вады гэтаму* стоватаваму зьзяньню. *Калі ён павольны, яна папікае, ці ён не заснуў. Калі ён жвавы, сьмяецца, што ён выглядае як зьменшаны Майкл Дуглас. Ці мо яго перасьледуе прывід бацькавага пэніса? Калі ён на яе*

*налягае, яна яму закідае эгаістычную гальлівасьць. Калі не налягае, дакарае яго ў абыякавасьці і халоднасьці. Але ж ён яе кахае. Яна ж яго па-ранейшаму страшэнна ўзрушае! Голас Оскара рабіўся ўсё больш раздражнёны. Чаму больш за ўсё яго заводзіць проста* думка *пра яе? Калі ён уяўляе сабе гэтыя ейныя сісюлькі! Гэтыя крамяныя, маленькія сісюлечкі! У ягоным голасе было нешта, што змусіла мяне зірнуць на яго: заплюшчаныя вочы, дыханьне кароткае, перарывістае. Шчокі ў яго пацямнелі.*
— Яе пізьдзічка! — выгукаў ён. — Гэтая яе баханка! Баханка ейнай пізьдзічкі!
Схуднелыя Оскаравы бакі падаліся насустрач чамусьці нябачнаму. Галава ўсё больш схілялася. Правая рука, што дагэтуль бязвольна спачывала на падважніку каробкі перадачаў, адзіным рухам вызваліла ягоны чэлес з шчымлівага палону.
Я павольна, разважліва зірнуў на гадзіньнік: было пару хвілінаў на адзінаццатую.
Ён выкрыкнуў.
Нахіліўся. Змрокам праляцеў моцны, сьветлы струмень.
Неўзабаве ягонае дыханьне суцішылася.
Оскар заснуў.
Я даў яму паўгадзінкі паспаць, а потым тактоўна пабудзіў. Трэ было рамантаваць машыну і ехаць у сьвет, які па-ранейшаму працівіцца спрошчаным тлумачэньням.

**4.** У лістападзе я зноўку пачаў чытаць, а ў сьнежні напісаў дзясяткі два літаратурных пародыяў, якія аб'яднаў у тонкі зборнічак пад назвай *"Ідэі ласкавага чытача"*.
Паступовае зачарсьцьвеньне свайго сэрца я называў новаадкрываньнем здольнасьці да іранічнага падыходу. Карацей кажучы, жыцьцё павярнула да лепшага.
У выдавецтве "Чэскі пісьменьнік" мне прапанавалі месца рэдактара (мы дамовіліся, што ў школе я дапрацую прынамсі да канца першага паўгодзьдзя, а за новыя абавязкі вазьмуся ў лютым). Выйшлі новыя прыязныя рэцэнзіі на *"Цудоўныя гады"*.
На Каляды я ўжо быў у парадку.
На Шчодры вечар у Сазаву зьехалася ўся сям'я. Сабакі зычна брахалі, бабулі сьпявалі калядкі, дзядуля выбіраў з рыбіны косьці, а трохгадовы сын майго брата-сцэнарыста ўсім

прысутным зноў а зноў пагражаў забойствам, але мне здавалася, што гэта самыя спакойныя Каляды, якія я калі датуль перажыў.
Рухі маёй дачкі ў новай вязанай сукенцы выдавалі амаль дарослую дзяўчыну.
У прыгожых вачох маёй жонкі нарэшце адбівалася толькі сьвятло сьвечак.
Яна падаравала мне атрамантавую асадку маркі *“Parker”*.
Каб я ведаў, дзе маё месца.

Калі пасьля навагодніх сьвятаў я зноў узяўся за працу ў школе, мне сказалі, што Стыў з Штатаў сёлета ўжо ня вернецца.
А Бэата ў Амэрыку нават ня лётала.
За раніцу я колькі разоў згадаў пра яе, але на калідоры мы ані разу не спаткаліся. Пасьля абеду я зайшоў да яе ў кабінэт.
Яна сядзела пад акном па-турэцку, пасёрбвала нейкі гарачы маркоўны сок і чытала *“Другі пол”* Сымоны дэ Бавуар. Калі б яна за сталом піла каву й гартала “Лідавыя навіны”, ні пра што добрае гэта ня сьведчыла б, але гэтак, здавалася, усё як мае быць.
— Відаць, я была зь ім занадта *free*, — патлумачыла яна мне. — Сказаў, што яго *шакавала*, калі я зрабіла сабе *tattoo*…
Яна гаварыла амаль вясёла.
— Мусіць, ты не была *па-славянску паважнай*, — сказаў я з палёгкай.
— “Быць сапраўднай жанчынай — значыць быць няздольнай, дробязнай, пасіўнай, падатлівай”, — прачытала яна мне. Залішняя адукаванасьць ці характарнасьць, маўляў, мужчынаў жахае. Нібыта русявая дурніца заўсёды пераможа інтэлектуалку. Кожнае падкрэсьленьне індывідуальнасьці забірае ў жанчыны жаноцкасьці. Інтэлектуалка ведае, што яна мае быць спантанна прапанаваным суб’ектам, але, калі пачынае граць кволую жанчыну, выглядае ненатуральна.
— “У абліччы, што ўдае наіўнасьць, праблісьне раптам вельмі выразна інтэлігентнасьць…” — жыва цытавала Бэата.
— Дык навошта тады ты гэтую прасьцячку граеш? — спытаў я трохі безуважна.
— Што за ідыёцкае пытаньне? Трасца, ты мяне ўвогуле слухаеш?
Як відаць, яна добра засвоіла *фрывольны цынізм састарэлых*

*жанчын*, вядомы як *вынік падманутага чаканьня*.

XI

**1.** Студзень быў апошнім месяцам майго пэдагагічнага шляху. Я паціху пачаў забіраць з кабінэту кнігі, якія пасьпеў за некалькі год папрыносіць з дому. Падчас заняткаў я праходжваўся сярод вучнёўскіх партаў і, гледзячы на галовы дзяцей, схіленыя над разгорнутымі сшыткамі, вывучаў свае адчуваньні, аднак ці то я залішне падаўляў сваю расчуленасьць, ці то яе ўвогуле не было — я заставаўся не абыякавы, але нейкі ўраўнаважаны. У адны з выходных я праверыў апошнія шэсьцьдзесят вучнёўскіх твораў, гэтым разам на тэму *“Як я спалохаўся”* — ладная палова працаў апавядала пра страхатлівы паход у цёмны склеп, прычым патрабаваны спалох звычайна быў выкліканы нечаканым падзеньнем абрыкосавага кампоту зь верхняй паліцы (*Кроў у мяне проста застыла ў жылах*) або, як варыянт, сабакам Рэкам, які зьнячэўку пацёрся аб нагу жахнутага апавядальніка (*Ад дзікага сполаху я ня мог ані дыхаць*).
Ставіў я выключна чацьвёркі й пяцёркі.

Дзеці адразу пачалі пазіраць неяк урачыста і таямніча.
Я зразумеў, што яны ўжо выбіраюць мне падарунак.
— Толькі ня трэба мне купляць нейкага вялізнага й даражэзнага плюшавага зьвера, — папярэдзіў я іх. — Тады ўжо лепш купеце мне віскі…
Яны разгублена пераглядаліся.
— Ага, — зразумеў я, — відаць, я нешта папсаваў?
Яны з дакорам ківалі.
Урэшце я атрымаў і мядзьведзя, і віскі.
І *я расчулена* запрасіў іх да сябе дадому.
Як Масарык.

Кароткі балянс: за няпоўныя чатыры гады свайго настаўніцтва я зь дзецьмі сваёй клясы правёў няпоўную тысячу гадзінаў. Я напісаў і паставіў два школьныя спэктаклі; канфіскаваў адзін аўтаматычны нож, два капсюлі-дэтанатары і дзьве калоды парнаграфічных картаў. У духу сваёй аптымістычнай натуры мне хочацца верыць, што з гэтага мо які толк і будзе.
Я пражыў чатырох міністраў адукацыі і трох дырэктараў

школы: першага — прызначанага зьверху — я дапамагаў зьняць, другога — абраць; трэці зноў быў прызначаны зьверху. Я браў удзел у няпоўнай сотні пэдагагічных нарадаў, радаў, паседжаньняў, сходаў, ініцыятыўных камітэтаў, устаноўчых канфэрэнцыяў і акцыяў пратэсту ды напісаў дзясяткі два дыскусійных прамоваў, водгукаў, адозваў, пэтыцыяў, газэтных артыкулаў, адкрытых лістоў, а таксама Комплекс захадаў для паляпшэньня функцыянаваньня сыстэмы школьнай адукацыі. Нягледзячы на свой аптымізм, я баюся, што гэта наўрад ці мела якую карысьць.

Гэты раман — мая апошняя *скарга*.

Мы дамовіліся з Бэатай, што разьвітальную вечарынку падрыхтуем разам.
Каб ведаць, колькі месцаў нам замаўляць у вінарні “Котва”, Бэата вывесіла ў настаўніцкай запрашэньне з заклікам запісвацца ўсім, хто хоча прыйсьці. Я крыху хваляваўся за вынік, бо нашыя імёны пад запрашэньнем выклікалі асацыяцыі з апазыцыйным выступам, аднак канчатковая колькасьць ахвочых мяне прыемна зьдзівіла: за парай выключэньняў не ставала толькі тых імёнаў, пра якія я й меркаваў, што іх у сьпісе ня будзе.
Бэата вярнулася да аднаго з сваіх колішніх касьцюмчыкаў. Ён ёй быў вельмі да твару. Гітары брынькалі.
Я піў так, як калі б быў за стырном.
Я з задавальненьнем сабе адзначыў, што мая пільнасьць прадухіліць нейкі *рэцыдыў* пераўзыходзіць Бэаціну.
Канец неабвешчанаму конкурсу на *сяброўскую стрыманасьць* паклала толькі шампанскае — мы селі ўбаку ад калег і праз хвілю нават ажывілі збляклую вабнасьць нашага даўнейшага любоўнага слоўніка.
— Не журыся, дзіця чалавека, — сказаў я. — Калі хочаш, Маўглі, я прынясу табе кветкі памаранчавага дрэва.
— Дзякуй табе, Балу, — пяшчотна адказала Бэата. — Ты і я — мы адной крыві.
І мякка мяне пацалавала.
— Крохкая, як маладыя парасткі бамбуку, — цешыўся я.
Мне запраглася зноўку яе пацалаваць, але, на шчасьце, я своечасова заўважыў Яраміра, які нёс з кухні аб’едкі для

сваёй коткі.
— У мяне ў роце перасохла, — весела гукала Ірэнка.
Калегі дружна ўзяліся камэнтаваць ейны клопат.
Уладзімір не размаўляў, каб не перакісародзіцца.
На пляцоўцы кружлялі ў танцы Тракаржава з Кіліянам.
— Ах, Балу, — зашаптала Бэата. — Навучы мяне галоўным словам для гэтых людзей.
Яна ўжо крыху захмялела.

**2.** З маім сыходам з школы нашыя дарогі, як кажуць, *разышліся*. Хоць я і даў Бэаце нумар тэлефону ў рэдакцыі, але цягам першага месяца яна ні разу не пазваніла. Я даведаўся, што яна пачала сустракацца зь нейкім Якубам з экалягічнага руху *“Вясёлка”* і ўвадначас пачала на рух працаваць.
Мне гэта ўсё падалося сьмешным.
Я заўзята нырнуў у новую працу ў рэдакцыі, не перастаючы радавацца: яшчэ пару дзён таму я абрыдла тлумачыў пабочныя азначальныя сказы, абедаў у школьнай сталоўцы ды лаяўся з Хваталавай-Сукавай; цяпер я рэдагую Івана Кліму, абедаю ў “Манэсе” з Паўлам Когаўтам і дыскутую з Эвай Кантуркавай!
Я ня мог гэтымі зьменамі нацешыцца.
Я нават паляцеў у Нямеччыну.
Чэскі настаўнік ляціць “Люфтганзай”!

Пра Бэату — праўду кажучы — я згадваў няшмат. Яна проста зьнікла з вачэй.
Аднак двойчы яна мне ўскосна пра сябе нагадала.
Спачатку ад Яраміра (а затым і з “Збраслаўскіх навінаў”) я даведаўся, што разам зь некалькімі хлопцамі з фонду *“SOS Animals”* яна ўварвалася ў школу і выпусьціла на волю ўсіх дырэктарскіх нутрыяў.
У другім выпадку высьветлілася, што маладзён, які да нас у рэдакцыю прынёс уласны зборнік вершаў *“Сьцятыя вочы”*, — ейны былы аднакурсьнік зь філязофскага факультэту. Я зварыў яму кавы, і мы перайшлі на ты.
— Якой яна табе здавалася? — пацікавіўся я. — Так *увогуле*?
Сваю цікаўнасьць я яму патлумачыў тым, што доўга вучыў Бэаціну меншую сястру. Ён паціснуў плячыма:
— Яна страшэнна *перайгравала*, — адказаў ён. — Ты ж ведаеш гэтых дзевак, што чытаюць Джойса ў мэтро…

Ён мне быў цалкам сімпатычны.
Але ягоных вершаў я  не разумеў.

Толькі адным марозным надвячоркам у канцы лютага я нарэшце спаткаў яе асабіста — дарогаю з працы перад гандлёвым домам *“K-mart”*, дзе яна зь сябрамі з руху *“SOS Animals”* выступала за правы жывёлаў.
Акрамя Бэаты ў дэманстрацыі ўдзельнічалі яшчэ восем ці дзевяць чалавек. Вакол іх голых целаў былі абматаныя доўгія прасьціны з тэкстамі *“Футра — адзнака забойцы!”*, *“Кажухі вас грэюць, але сэрца ў вас — як кавалак лёду!”* і *“Лепш голымі, чым у футры!”*.
Мінакам была забава.
Гэтаксама, як і двум прысутным паліцыянтам.
Бэата трэслася ад холаду.

Пры поглядзе на ейныя голыя плечы мне захацелася прытуліць яе да сябе, але я ня мог зь ёй нават загаварыць, бо ў мяне былі скураныя дыплямат, боты і рукавіцы.
І я проста пайшоў у мэтро.

Недзе ў сярэдзіне красавіка яна ў цэнтры Прагі шукала ганчарную гліну і таму нарэшце зайшла ў рэдакцыю.
На ёй была палатняная сукня, драўляныя нелякаваныя каралі й сандалі зь пянькі, так што яна выглядала як манэкен з суседняга бутыку *“Дзівосная хатка”*.
У бамбукавай клетцы, якую яна прынесла з сабой, сядзеў хворы дрозд.
Я сказаў ёй, што *бачыў* яе на маніфэстацыі.
Яна мяне *ласкава* заклікала ўсьвядоміць, што на адно норкавае футра трэба 65 норак або 130 шыншылаў.
Я як найхутчэй перавёў размову на іншую тэму.
— Добра выглядаеш, — сказаў я.
Для гэтай пары году яна была добра загарэлая.
Сказала, што яны зь Якубам пару тыдняў правялі ў *перадвясельным падарожжы* па Брдах. Гулялі ў лякрос, пяклі на камянях праснакі. Ежу варылі ў каровіным рубцы. Яна ўжо вярнулася ў Прагу, а Якуб яшчэ на пару дзён сышоў у лес, каб асэнсаваць некаторыя рэчы.
У мяне за плячыма быў ужо пэўны досьвед, таму я брывом не

павёў, аднак прысутныя каляжанкі не ўтрымаліся ад міла зьбянтэжаных усьмешак.
Бэата заклікала, каб і *яны* паспрабавалі зьмяніць жыцьцёвы стыль, бо трапічныя джунглі зьнікаюць з хуткасьцю аднаго футбольнага поля за сэкунду, а адзін амэрыканец за дзень прадукуе столькі сьмецьця, колькі сам важыць.
Гэты антыамэрыканскі выпад узьняў і мае бровы.
Бэаце відавочна прыйшло да галавы тое самае, бо яна імгненна пачала нам распавядаць, як яны *арганізацыяй* ладзілі маніфэстацыю перад “Макдональдзам” на Водзічкавай вуліцы — якраз там, куды прынамсі раз на тыдзень яны завітвалі з Стывам і дзе яна ведала ўвесь пэрсанал.
— Яны не разумелі… — весела казала Бэата. — Трэ было бачыць іхныя твары!
Ейная сымпатычная самаіронія прынесла ў рэдакцыйнае памяшканьне неабходнае разьняволеньне — мы сьмяяліся разам зь ёй.

Зь Якубам — падобна як з Сучыным сынам — я асабіста быў незнаёмы. Паводле лёгікі ім мусіў быць адзін з тых хлапцоў перад *“K-mart’ам”*, але да сёньня не ўяўляю, каторы. У кожным разе ён мусіў быць чулым, ахвярным чалавекам, які без ваганьня мог дзеля руху ахвяраваць сабой, бо, як толькі да яго дайшлі жахлівыя лічбы пра колькасьць вынішчаных кітоў, ён сарваў прызначанае вясельле і зьехаў на год у Нарвэгію.

**3.** *Аднак унутры, у душы гэты чалавек нас абаіх, цётку і мяне, вельмі турбаваў і абцяжарваў, і, праўду кажучы, я ад яго далёка яшчэ не пазбавіўся. Уначы ён мне сьніцца, і я адчуваю, што сам факт ягонага існаваньня да асноваў мяне ўзрушае і зьнепакойвае, хоць я яго амаль палюбіў.*
Герман Гесэ, “Стэпавы воўк”

Складнікам кампутарнай сыстэмы *Windows*, у якой — як я ўжо, здаецца, згадваў — я гэтую кнігу пішу, ёсьць між іншым функцыя так званага *рэжыму чаканьня*. Ягоную працу я магу апісаць толькі па-дылетанцку: калі вы цягам пэўнага зададзенага часу не зварухняце мышшу і не дакраняцеся да клявішаў, тэкст, выяўлены на экране, аўтаматычна зьмяняецца выбранай цёмнай рухомай карцінкай. Дзякуючы таму што

ў выпадку майго кампутара дастаткова трох хвілінаў летуценнай бязьдзейнасьці, каб на маніторы зьявілася застаўка з назвай *“Starfield Simulation”*, цяпер я ўсё часьцей зіркаю на чорны зорны космас.
Але яе там нідзе няма.

*Плача мамка, плача татка:*
*Заблукала іх дзіцятка.*

XII

**1.** Пасьля Стыва й Якуба апошнім Бэаціным хлопцам быў Бог. Аднак спачатку ня надта было зразумела, *каторы*.
Найперш яна пазнаёмілася зь некалькімі сьміхаўскімі *мармонамі*, але ў іх яе раздражняла (так сьцьвярджала Агата), што яны вызнаюць мнагажэнства і што яны амэрыканцы. Пазьней яна прачула пра экалягічную фэрму прыхільнікаў руху *Харэ Крышна* паблізу Бэнэшава і некалькі дзён какетавала з думкай зьехаць туды, але нібыта яе ўтрымала тое, што яны цэлы дзень працуюць у полі і ўстаюць на досьвітку. Таксама яна езьдзіла да аднаго эвангелісцкага сьвятара ў Чорны Мост, але гэта было далёка, сьвятар падаваўся ёй самазадаволеным, а да таго ж у арцы панэльнага дому, дзе ён жыў, да яе шторазу чапляліся нейкія цыганы (або, як казала Агата, *чуркі*). У думках я мусіў сьмяяцца, бо Бэаціна шуканьне Бога нагадвала мне нашыя колішнія пошукі мэблі. Нарэшце, даведаўся я, у Бэаціным конкурсе перамаглі збраслаўскія егавісты — яны былі найбліжэйшыя, у іх былі найлепшыя цэны і Бога яны пастаўлялі проста на дом.

Як відаць, я належу да той шматлікай хеўры невукаў, якія не сумняюцца хіба толькі ў тым, што ёсьць *нешта*, што нас пераўзыходзіць, прычым гэтым нечым не абавязкова мусіць быць Бог (айцец Галік з гэтай нагоды іранічна называе нас *нечысьцю*). Асабіста да мяне Бог зьвярнуўся толькі аднойчы ў жыцьці, а менавіта перад вітрынай гандлёвага дому “Баця” на Вацлаўскім пляцы, дзе ён пасярэдніцтвам плюгавага смуглага пакістанца ў аранжавай футболцы паведаміў мне, што ён мяне *напраўду кахае* (у першае імгненьне, аднак, я меркаваў, што

гэтае паведамленьне неяк зьвязана з цэнамі выстаўленых ботаў). Да таго ж якраз у той час, калі я ад Агаты даведаўся пра Бэаціна наверненьне, я рэдагаваў Когаўтаў раман “Сьняжу” і ня здолеў стрымаць пэўнай агіды да жанчынаў, якія нядзельнаю раніцай пакутліва выбіраюць, пайсьці ім памаліцца ці пакоўзацца на каньках. Насамрэч я не хачу выклікаць на сябе гнеў прэс-сакратара адпаведнай біскупскай рады ці нават Папскае рады ў пытаньні дыялёгу з атэістамі, але, *праўду* кажучы, маё найбольш інтэнсіўнае адчуваньне ад гэтага апошняга Бэацінага пэрыяду найлепш выяўляе блюзьнерская парафраза *“Што чалавек злучыў, бог не падзеліць”*.

**2.** Хуткае чаргаваньне разьдзелаў з мэтай падвысіць напружанасьць.
Канец ужо блізкі. У мяне за плячыма прыкладна пяць месяцаў працы. Першыя тры месяцы я вечарамі і ў выходныя пісаў першую вэрсію, у сакавіку й красавіку за адным заседам адолеў другую. Я ўжо не магу дачакацца, як праз пару старонак пахаваю Бэату і ўрэшце *перадыхну*.

Другі і апошні ліст, які мне калі Крал даслаў, прыйшоў на пачатку ліпеня (я быў адразу падумаў, ці не пасунуць мне ягонае даручэньне — дзеля большага эфэкту — на паўмесяца назад, каб абыграць гэтае казачнае *“калі год з годам сышоўся”*, але ўрэшце мне такое свавольства падалося залішнім і я гэтую ідэю адхіліў). Тон ліста быў *прыязны й нязмушаны*: Крал перапрашаў, што *пасьля ўсяго таго, што мы летась разам перажылі*, ён дагэтуль не адгукнуўся. Аднак, маўляў, ён меў вялікі клопат у працы. Чаму я ніколі *не заходжу*? Ён дачуўся, што ў ліпені я перабываю ў Збраславе, і ў яго такое адчуваньне, што *Бэаце гэта было б зусім не абыякава*. Яна ўжо, *дарэчы*, зноў піша. Напісала нават нешта *вялікае*, але, як я цяпер *такі знакаміты*, яна саромеецца даць мне пачытаць. А што каб паўтарыць той *удалы* леташні курс? Гэта толькі *мімалётная ідэя*, але, магчыма, яна вартая ўвагі. Ці не хачу я калі зайсьці? Як наконт гэтай пятніцы? А палове на шостую? Усе мяне будуць *страшэнна радыя бачыць*.

**3.** *Расповед як зброя супраць бессэнсоўнай, жорсткай рэчаіснасьці.*

Мілан Янкавіч

І мне было ясна, што ў ваньне я быў залішне доўга.
За маімі прыгатаваньнямі жонка сачыла дапытлівым позіркам.
— Ці можна даведацца, куды ты ідзеш? — спытала яна.
Я паведаміў ёй, што падобных фармулёвак не выношу бязмала фізычна, і папрасіў, каб у будучыні яна пастаралася іх пазьбягаць.
— Перастань мяне, калі ласка, выхоўваць! — адказала яна раздражнёна.

Сад быў занядбаны.
Гучыць самаўпэўнена, але Пэтрык, як мне падалося, быў рады зноў мяне бачыць. На ягоным гальштуку красавала выява Барта Сымпсана.
Надзіва, ён быў адзін.
— А дзе твой напарнік?
— У больніцы, — усьміхнуўся ён.
— Дай адгадаю, — сказаў я на тое. — Неасьцярожнае абыходжаньне са службовай зброяй? Ці ўдарам нагі зруйнаваў апорную сьцяну?
— Ды не! — засьмяяўся ён. — Звычайны апэндыцыт.
Агата, наадварот, была не ў гуморы, і яе яшчэ больш уцьвеліла, што я не зьбіраюся дашуквацца да прычынаў.
Я па-сяброўску пакудлаціў ейныя валасы.
— Суціш гармон! — прамовіла яна дзёрзка.

Але зусім не *беспрадметна*.

Крал быў на тэнісе. Кралава выглядала змучанай. Кавы, маўляў, не прапаноўвае, бо яе мне хоча зрабіць *тая манашка наверсе*.
Я суцешыў яе пасярэдніцтвам Гётэ: *Як бы ні брадзіла сусла, а будзе брага ці віно*.
— Каб жа так, — адказала яна з сумневам.
І зусім не *беспрадметна*.

**4.** Сходы ў мансарду зноў былі ахінутыя страхам невядомага. Я баяўся, што зноў увайду ў пануры паўзмрок, дзе бледныя вусны будуць зацята лапатаць пацеры, але я ўвайшоў у заліты

сонцам пакой, што зьзяў неўтаймоўнымі фарбамі: першапачатная чорна-ружовая камбінацыя падчас Бэацінага амэрыканскага пэрыяду ня толькі была дапоўненая парай фіялетавых і зырка-жоўтых аксэсуараў (пераважна перасоўных), але ў такія самыя колеры надзвычай вальнадумна былі пафарбаваныя й шафа, столікі ды кніжныя паліцы. Новыя завесы былі сьлівава-сінія.

Маленькі крыжык вісеў між двух плякатаў Эндзі Ўоргала.

— А што ты думаў пабачыць? — усьміхалася Бэата. — Суровую кельлю кляштарнай служкі?

Яна выглядала добра, але ўсьцешыла мяне найперш тое, што яна ня страціла здатнасьці да іроніі.

— Што заўгодна, — адказаў я шчыра. — Але хутчэй, відаць, прытулак для бяздомных драздоў. Або разьмеркавальны цэх неэкалягічнага сьмецьця…

Яна глядзела мне ў вочы зь нейкай асаблівай паблажлівай перавагай.

Другі крыжык я пабачыў у выразе ейнай лякросавай футболкі і крыху паадступіў.

— Я сьпякла табе калач, — усьміхнулася яна гасьцінна.

Яна насыпала каву ў папяровы фільтар і ўключыла кававарку. Сьвятарова кухарка[16], падумаў я мімаволі.

— Ты сьцьвярджала, што ў касьцёле пачуваешся як Мэры Пікфард, — нагадаў я ёй. — З таго часу нешта зьмянілася?

Я ня мог даць сабе рады. Ува мне ўсё паўставала.

— Вера — гэта дар, — адказала яна спакойна. Маўляў, яна перакананая, што і мне гэты дар некалі адкрыецца, бо я чулы чалавек, да таго ж мы ўсе толькі цагліны ў будынку, цэмэнтам у якім Хрыстос.

Чуць слова *Хрыстос* у гэтым пакоі… З гэтых вуснаў. Абапіраючыся на ўрыўкавыя веды ілюстраванай *“Дзіцячай Біблії”*, якую дачцэ нехта падараваў на Каляды, я пачаў зьедліва зьняпэўніваць увесь гэты *фальклёр*.

— Вазьмі яшчэ калач, — ласкава падахвоціла яна.

— Ты казала, — выбухнуў я, — што ніколі не змагла б зьмяніць погляды, бо так ты зноў сталася б *вучаніцай*! Ты ж сьцьвярджала, што ўжо ня вынесеш ніякіх новых *настаўнікаў*! Маўляў, яна ня сталася вучаніцай. Яна зрабілася галінкаю дрэва, якім ёсьць Хрыстос.

Супакойліва пагладзіла мяне па руцэ.

Я здаўся.

Тады мы правялі вельмі прыемны, хрысьціянскі адвячорак. Мы размаўлялі пра Агату, пра школу, пра пісаньне й выданьне кніг.
На разьвітаньне яна дазволіла пацалаваць сябе ў шчаку і ўжо мерылася перажагнаць мне чало.

**[16] Намёк на гераіню казкі Яна Вэрыха “Сквапная Барка”.**

Яна!

Я шалёна схапіў ейную руку. Некалі яна вырабляла з маім целам страшэнныя рэчы, аднак гэта было занадта.

У ейным поглядзе чыталася спачуваньне.

— Пачакай, — сказала яна.

Яна мне прынесла маленькую кніжку ў сіняй цьвёрдай вокладцы. “Пытаньні маладых людзей. Практычныя адказы”. Яна, маўляў, разумее, што спосаб, якім гэтая кніга напісаная, беспахібна будзе мяне правакаваць, але форма зусім ня важная. Гаворка пра зьмест.
— Гэта нельга проста *рэцэнзаваць*, — сьмяялася яна.
Я пагартаў зьмест: *Чаму трэба шанаваць сваіх бацьку і маці? Наркотыкі і алькаголь. Як я магу наблізіцца да Бога.*
На карэньчыку былі выціснутыя залатыя літары *ПМЛ*.
— ВУМЛ[17] у цёмна-сінім, — зазначыў я.
Дакор у ейных вачох.
Я паабяцаў, што, наколькі магчыма, кнігу *бесстаронна* прачытаю.
— Ну, з Богам, — сказаў я.
Апошні погляд, якім яна мяне пры жыцьці ўзнагародзіла, быў, такім чынам, балюча-пакрыўджаны.
Я й сёньня магу яго аднавіць вельмі *плястычна*.

*Рост гістарычнай сьвядомасьці мае той дзіўны вынік, што людзі пачынаюць уважаць тлумачэньні за жыцьцёвую неабходнасьць.*
Сол Бэлоў, “Герцаг”

**[17] ВУМЛ — Вечаровы ўнівэрсытэт марксызму-ленінізму.**

“Пытаньні маладых людзей” я, насуперак свайму абяцаньню, разгарнуў, толькі калі пачаў рабіць пазнакі да гэтага раману. Між іншым я вычытаў, што *мастурбацыя — гэта нячыстая звычка*, што *алькаголь у завялікай колькасьці можа ўкусіць як зьмяя* і што *вольны час можна скарыстаць на нейкае здаровае захапленьне*. Разьдзел, прысьвечаны літаратуры, быў таксама

натхняльны: *Любоўныя раманы могуць быць напружаныя. Аднак ці даюць яны здаровы погляд на жыццё і на шлюб?*

**5.** Як я спалохаўся (твор):
Калі мы вярталіся з Данii, дык мы вярталіся страшэнна доўга, таму што мы вярталіся празь Нямеччыну, а ў Нямеччыне паўсюль рамантавалі дарогі, па якіх мы вярталіся. Мы прыехалі ўжо позна ноччу, і нешта было ў паштовай скрынцы, дык я пайшоў па ключык, а калі я тую скрынку адчыніў, дык там было, што мая сяброўка Бэата мёртвая. Кроў у мяне проста застыла ў жылах, і ад дзікага сполаху я ня мог ані дыхаць.

Насуперак запэўніваньням хрысьціянскіх адмыслоўцаў, што *асабістае сяброўства з Богам дапаможа перамагчы цяжкую дэпрэсію,* Бэата сваёй дэпрэсіі не перамагла. Хоць яна й ведала — калі дапаможнік напраўду чытала, — што *самагубства — гэта не вырашэньне,* усё адно гэта зрабіла. Яна не пайшла купіць нешта прыемнае, як Мэляні, не паехала на пікнік, як Дэбі, нічога не прыгатавала сабе паводле свайго ўлюбёнага рэцэпту, як Дафна, і нават не ўзялася разгадваць крыжаванкі ў часопісе *“Прачніся!”* — не, яна, як Віўен, не магла ўявіць, што ейная дэпрэсія некалі пройдзе, і села ў свой чорны гольф, і з хуткасьцю блізу ста васьмідзесяці кілямэтраў за гадзіну ўехала ў ім у бэтонную эстакаду на страканіцкай дарозе. І ўжо ніколі не прачнулася.

І ўвесь горад быў агорнуты ў чорны вэлюм.

І ейнае сэрца, ператворанае ў попел, набраў у далоні вахцёр Францішак Недзяльнічак і рассыпаў яго па ветры на лугах цьвінтарнага гаю, якім так ганарацца збраслаўскія жыхары.

*Я пішу раман, каб выратаваць жывых і каб вывесьці з забыцьця мінуўшчыну, нашых нябожчыкаў, каб вывесьці з забыцьця самую сябе. Пакуль я пішу, застаецца яскарка надзеі на дарогу назад, на вяртаньне да жыцьця і прытомнасьці, да волі, да людзкога аблічча.*
Даніэла Годрава

**6.** А ўчора я глядзеў на сваю дачку, як яна прычэсвалася перад

люстэркам у вітальні.
З сваімі валасамі яна ўпраўлялася спрытна, як дарослая жанчына.
Заўважыла мяне:
— Што такое? — спытала яна зь нясьмелай усьмешкай; рукі за галавой, заколка ў вуснах.
Анёлак.
— Нічога.
Я замілавана яе ўшчыкнуў.
Яна страціла раўнавагу, і валасы высьлізнулі зь ейных пальцаў.
— Суціш гармон! — насупілася яна.

Ангельскі пісьменьнік Грэм Грын быў вядомы між іншым тым, што апошнімі сказамі сваіх кніг любіў зьняпэўніць увесь папярэдні зьмест. У выпадку гэтага раману падобнае *грынаўскае* заканчэньне магло б выглядаць прыкладна так:
— Ты зноў *напракудзіў*, — іранічна заўважыла жонка, дачытаўшы рукапіс.
Яна дапытліва назірала, спрабуючы адгадаць, наколькі я сам пачуваюся вінаватым, каб такім чынам вызначыць абсяг і сур'ёзнасьць маіх грахоў. Аднак гэта значыла, што яна толькі вырашае, разгневацца ёй ці не.
— Можа, табе ўсё ж трэ было ўзяць тую працу, — прамовіла яна задуменна.
Я хацеў яе абняць, аднак яна занатурылася.
— Ды супакойся ты, — сунімаў я яе, — не ўспрымай літаратуры гэтак сур'ёзна.

*З чэскай мовы пераклаў Сяргей Сматрычэнка паводле:*
*Michal Viewegh. Výchova dívek v Čechách. Praha: Petrov, 1997*

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі

Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/12/14**
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 5 (28) – 2003

[image]

[image]



[image]

[image] [image] [image]
[image] [image] [image]



# Віталь Сіліцкі Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сэрбіі і Беларусі

[1] Dubravka Stojanovic, “The Traumatic Circle of Serbian Opposition,” in *The Road to War in Serbia: Trauma and Catharsis,* ed. Nebojsa Popov (CEU Press, 2000), p.469.

3

У замкнутым коле — досвед палітычнага самазабойства сербскай і беларускай апазіцыі

Сербская апазіцыя з самага пачатку была падзеленая на партыі і групоўкі, якія паміж сабой канкуравалі не менш, чым з уладай. Галоўнай лініяй падзелу былі супярэчнасці паміж нацыянальна-традыцыйнай і ліберальна-мадэрнізацыйнай плынямі ў яе шэрагах. Галоўным прадстаўніком першай плыні на працягу дзесяцігоддзя заставаўся Сербскі рух аднаўлення (СРА), які ўзначальваў Вук Драшкавіч. СРА паўстаў у 1989 г. як спроба палітычных аўтсайдэраў пагуляць на полі нацыянал-радыкальнага руху, ачоленага Мілошавічам, і, калі атрымаецца, перахапіць у яго ініцыятыву. Галоўным пунктам крытыкі Мілошавіча Драшкавічам заставалася яго малая адданасць ідэям “вялікай Сербіі”, а не мэты і метады “антыбюракратычнай рэвалюцыі”. Галоўным палітычным саюзнікам Драшкавіча ў той час быў пазнейшы лідэр крайне

нацыяналістычнай Сербскай радыкальнай партыі Ваіслаў Шэшаль, з кім яны першапачаткова былі аднапартыйцамі. Ліберальную плынь у апазіцыі ўзначальвала Дэмакратычная партыя (ДП) філосафа, вучня Юргена Габермаса Зорана Джынджыча. Гэтая плынь мела галоўнымі мэтамі эканамічнае развіццё і сацыяльную мадэрнізацыю сербскага грамадства. Калі СРА аддавала перавагу вулічнай палітыцы, ДП рабіла стаўку на “сістэмную” палітыку.
У той жа час, кожная частка апазіцыі імкнулася да таго, каб прыстасаваць свае праграмы да агульнай атмасферы істэрыі і ксенафобіі, якую распальвала тады афіцыйная прапаганда.
У гэтых умовах сербскія апазіцыйныя партыі станавіліся выключна апартунісцкімі і лёгка мімікравалі ад “нацыянал-радыкалізму” да “памяркоўнага лібералізму”. Гэтыя пераходы былі матываваныя таксама памкненнем адмежавацца ад іншых апазіцыйных партый і атакаваць сваіх канкурэнтаў на адным і тым жа кавалку палітычнага поля. Адзінае, што іх амаль заўжды аб’ядноўвала, была апазіцыя да ўлады. Апазіцыйныя партыі часцяком “адмаўляліся ад любых прынцыпаў, палітычнай праграмы, ідэі, а галоўным аб’ектам іх дзейнасці быў Слабадан Мілошавіч. (...) Іх галоўным прынцыпам было “быць супраць”, нават калі гэта патрабавала змянення партыйнай праграмы, расколу ў партыі ці кампрамісу з партыяй вайны ў Пале (сталіцы сербскіх паўстанцаў у Босніі. — **Аўт.**)”[1]. Так, СРА з нацыянальна-радыкальнага лагеру ў 1990—91 гг. у 1992 г. перакінулася ў “партыю міру” (рэзка крытыкуючы Мілошавіча за развязванне ваеннага канфлікту). Аднак у 1997 г. гэта не перашкодзіла Драшкавічу падтрымаць авантуру ў Косаве і праз год нават заняць пасаду віцэ-прэм’ера федэральнага ўраду. Джынджыч, сваёй чаргой, прымкнуў да “партыі вайны” ў 1993—94 гг., калі шукаў кантактаў з баевікамі Караджыча ў Босніі. За гэта ўлады нават дазволілі Джынджычу мець свой тэлевізійны канал.

З непаслядоўнасці і ўнутраных супярэчнасцяў у стане апазіцыі ўмела карыстаўся Мілошавіч, які ўмела ангажаваў асобных лідэраў і нават цэлыя партыі да супрацы ды пазіцыянаваў сябе грамадству як адзіную памяркоўную альтэрнатыву “ўмоўным” (Шэшалю і пэўны час Драшкавічу) і “заходнім наймітам” (ліберальным партыям). Такія паводзіны апазіцыйных лідэраў

[2] **Srecko Markovic, “The Parliamentary Elections of 1990, 1992, and 1993,” in**

таксама зніжалі грамадскі давер да іх з боку грамадзян, якія разглядала іх палітычную дзейнасць выключна як сродак для ўласныя інтарэсы. Адзінымі апазіцыйнымі партыямі, якія не супрацоўнічалі з Мілошавічам, былі Дэмакратычная партыя Сербіі (ДПС) Ваіслава Каштуніцы (памяркоўна-нацыяналістычная партыя, што ў 1992 г. адкалолася ад ДСЕ) і Грамадзянскі саюз Сербіі (ГСС) Весны Пешыч. У выніку непрадказальнасць апазіцыйных палітыкаў (таксама і старанное падсілкоўванне ультрарадыкальнай апазіцыі, асобе Шэшаля) дазволілі Мілошавічу прадставіць сябе як найбольш прадказальнага палітыка і для заходняй супольнасці. Дзякуючы гэтаму Мілошавіч выйшаў фактычна сухім з прайгранай ім вайны ў Босніі ў 1995 г., калі ЗША і Еўрасаюз зрабілі на яго стаўку як на партнёра пры падпісанні дэйтанаўскіх пагадненняў, спалохаўшыся прыходу да ўлады нацыянал-радыкалаў. Мілошавіч займеў імідж міратворца і нават здолеў умацаваць свой рэжым простымі інвестыцыямі з Захаду.

Пачынаючы з першых шматпартыйных прэзідэнцкіх і парламенцкіх выбараў у 1990 г. сербская апазіцыя змагалася з рэжымам на федэральных і рэспубліканскіх парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбарах, а таксама на выбарах у мясцовыя органы ўлады. Апазіцыйныя перадвыбарныя кампаніі звычайна пачыналіся за пару дзён да галасавання, а перадусім партыйныя лідэры доўга высвятлялі, ці трэба ў іх прымаць удзельнічаць, і выстаўлялі рэжыму ультыматумы з заклікам байкоту, калі іх патрабаванні не будуць выкананы. Пасля таго як іх ультыматумы адкідаліся, яны нарэшце пастанаўлялі ўзяць удзел у выбарах удзел, звычайна праводзілі выключна кароткія кампаніі і нарэшце, пасля паразы, пратэставалі супраць фальсіфікацыі выбараў[2].

Адсутнасць унутранага адзінства каштавала апазіцыі моцнага палітычнага ўплыву і прыводзіла да таго, што магчымасці дасягнуць палітычных пераменаў раней за 2000 г. амаль страчваліся. Цікава, што ўжо ў 1993 г. сукупная падтрымка апазіцыйных партый і рухаў, г.зн. склад галасы іх выбарцаў, перасягнула адпаведную падтрымку СПС. Аднак галасы выбарцаў расцярушваліся між некалькімі партыямі і ва ўмовах прапарцыйнай выбарчай сістэмы, заснаванай на рэгіянальных спісах, партыі з найбольшай

*Challenges of Politicization: The Case of Serbia in Early 1990s* (Belgrade: Institute of Social Sciences, 1995), p. 45–68.

[2] **У выбарах па рэгіянальных спісах** кожная партыя **атрымлівае** столькі **мандатаў, якія** яна **атрымала ў адным** з **дзесяці** трох **акругаў. Такім** чынам **партыя** можа **атрымаць** **месцаў у парламенце, нават** калі **парсіць** **перамогі** **ў** **кожнай** **акрузе** **у** **сваёй** **краіне.** **Напрыклад,**

колькасцю галасоў атрымлівалі значную перавагу ў парламенце[3]. А гэтымі партыямі звычайна былі СПС і СРП. Трэба адзначыць, што спробы аб'яднаць апазіцыю рабіліся ўвесь час. Першы апазіцыйны альянс — Аб'яднаная апазіцыя Сербіі — створаны для ўдзелу ў парламенцкіх і галасоўцкіх выбарах 1990 г., распаўся яшчэ да выбараў. Другі, Дэмакратычны рух Сербіі (сербская абрэвіятура ДЭПОС), аб'яднаў толькі блізкія да Дражкавіча партыі і быў праігнараваны Джынджычам. Ён праіснаваў трохі больш за год (1992—1993 гг.). Аднак акурат ДЭПОС даў першы сёння бой Мілошавічу, калі на прэзідэнцкіх выбарах у Сербіі ў 1992 г. яго кандыдат, югаслаўскі прэм'ер і амерыканскі мільянер Мілан Паніч, дасягнуў неблагога выніку.

Першым сапраўды паспяховым прыкладам аб'яднаных сербскай апазіцыі стала стварэнне ў 1996 г. кааліцыі "Заедна" ("Разам") для ўдзелу ў федэральных і мясцовых выбарах у лістападзе таго ж году. "Заедна" ўпершыню аб'яднала дзве найбуйнейшыя апазіцыйныя партыі (СРА і ДП), а таксама мноства меншых апазіцыйных рухаў. Фактычна ўпершыню ў гісторыі Сербіі паўстаў не проста аб'яднаны апазіцыйны рух, але палітычная альтэрнатыва, якая выразна падкрэслівала сваю праеўрапейскую арыентацыю. Гэта не было адназначна прынята грамадствам. "Заедна" прайграла выбары ў федэральны парламент, дзе зноў, другі раз пасля 1992 г., узнікла "чырвона-карычневая кааліцыя", што аб'яднала СПС і СРП, аднак атрымала пераканаўчую перамогу на мясцовых выбарах у амаль усіх буйных гарадах (уключаючы Бялград), дзе была высокая канцэнтрацыя апазіцыйнага электарату. Як бачым, праца на "жорсткі электарат" прынесла плён менавіта на мясцовых выбарах.

**меншая за 20, то для партыі, што набярэ 5 адсоткаў галасоў, гэтага можа быць недастаткова для здабыцця аднаго месца ў рэгіёне. Напрыклад, гэтыя месцы адыходзяць да больш вялікіх партыяў.**

У адказ Мілошавіч зрабіў адну з сваіх найбуйнейшых палітычных памылак: ён паспрабаваў скасаваць вынікі выбараў праз падкантрольную яму Цэнтральную выбарчую камісію пасля таго, як перамога апазіцыі ўжо была афіцыйна абвешчаная. Адказам на гэты крок была масавая і бесперапынная акцыя вулічнага пратэсту, што ахапіла Бялград ды іншыя “апазіцыйныя” гарады і працягвалася некалькі месяцаў, збіраючы толькі ў сталіцы да некалькіх сотняў тысячаў чалавек штодня. Аснову пратэстных складалі маладыя адукаваныя інтэлектуалы і студэнты.

Масавыя пратэсты зрабілі ўплыў на ўсё грамадства. Упершыню Мілошавічу быў кінуты сапраўды магутны выклік як на сістэмным, так і на пазасістэмным палітычным полі (заўважым, што ланцужок “перамога на выбарах — масавы вулічны пратэст” спрацаваў менавіта ў такой паслядоўнасці, якая потым паўтарылася і на прэзідэнцкіх выбарах у 2000 г.), што адбілася ў свядомасці і электаральнага “балота”, і прыхільнікаў рэжыму. СПС за тры месяцы згубіла каля паловы сваіх прыхільнікаў, і адгэтуль яе ніколі не падтрымлівала больш за чвэрць электарату[4]. Урэшце, масавасць і бесперапыннасць пратэсту зрабілі сваю справу, і ўлады прызналі вынікі мясцовых выбараў. Новая гарадская рада Бялграду абрала Джынджыча мэрам сталіцы. Гэта мела вялікія палітычныя і сацыяльныя наступствы. Па-першае, упершыню была даведзеная магчымасць перамогі над рэжымам у сістэмнай палітыцы (маецца на ўвазе сербскі досвед, у сусветным такіх выпадкаў “шокавых выбараў”, калі дыктатары прайгравалі, гуляючы паводле сваіх жа правілаў, не менш за дваццаць)[5]. Па-другое, да апазіцыі перайшоў кантроль за тэрыторыяй (а разам з гэтым і за адміністрацыйнымі, фінансавымі і інфармацыйнымі рэсурсамі), на якой пражывала каля траціны насельніцтва краіны. Мясцовыя газеты, радыё- і тэлестанцыі мелі вялікую долю ў сербскім інфармацыйным полі, і гэта дазволіла прабіць інфармацыйную блакаду, створаную ўладамі. Па-трэцяе,

[4] **Zoran Slavujevic,**

перамога апазіцыі прывяла да імклівага росту сацыяльнай актыўнасці. Мноства няўрадавых арганізацый, што выключную ролю ў падзеях 2000 г., узніклі менавіта пасля лютага 1997 г. Сярод іх можна назваць студэнцкую “Отпор”, што ўзнік годам пазней у студэнцкім асяроддзі ўніверсітэта зімовых падзей у Бялградзе, а таксама аналітычны цэнтр G-17, які на пэўным этапе свайго існавання адыграў ролю “мазгавога цэнтру” дэмакратычнай апазіцыі. Фактычна былі створаныя неабходныя перадумовы для дэмакратычнай трансфармацыі ў Сербіі. Але гэтыя перадумовы *Vladimir Goati* тры гады не выкарыстоўваліся, паколькі новы віток унутранай барацьбы ў апазіцыі адштурхнуў яе далёка назад. Наступным этапам дзейнасці “Заедна” была падрыхтоўка да парламенцкіх і прэзідэнцкіх выбараў у Рэспубліцы Сербскай, што мусілі адбыцца ўвосень 1997 г. Адразу пасля атрыманых вынікаў мясцовых выбараў лідэры кааліцыі дамовіліся, што СРА вылучыць кандыдата на пасаду прэзідэнта, ДП — прэм’ер-міністра, а Грамадзянскі саюз Сербіі — спікера парламенту. Гэта азначала, што пасада прэзідэнта мусіла адысці да Драшкавіча. Грамадзянскі саюз Сербіі, незадаволены такім сабатаваў пагадненне фактычна з моманту яго падпісання, заявіўшы, што Драшкавіч не мае досведу для кіравання дзяржавай. Незадаволеныя пераважалі і ў іншых апазіцыйных групоўках. Тактыкай іх барацьбы супраць Драшкавіча стала абраная адмова ад удзелу ў выбарах. ГСС, ДП і ДПС заявілі ў траўні, што яны прымуць удзел у выбарах толькі ў выпадку, калі будуць выкананыя іх патрабаванні забяспечыць справядлівыя выбары. Джынджыч і Драшкавіч знайшлі сваю палітычную тактыку, што было абумоўлена імкненнем рэалізаваць свае бягучыя палітычныя перамогі. Першы пазіцыянаваў сябе як радыкал, а другі — як “сістэмны” палітык.

“Partijska identifikacija građana pre i posle izbora 2000. godine”, *Partijske scene Srbije posle 5 oktobra 2000, uzroci i posledice* (Beograd: Friedrich Ebert Stiftung i Centar za demokratiju, 2002), str. 211–216.

5. Ел Самюел Хантынгтан, *Трэцяя хваля. Дэмакратызацыя ў канцы XX стагоддзя*, пер. з англ. Ю. Бушуева, Мінск, 2003, с. 216.

“Выборы і авторитарныя рэжымы: фарс ці інструмент для перамогі?”, *Альтэрнатыва грамадства.* 2001. №1(10).

Урэшце сітуацыю выкарыстаў Мілошавіч, які згуляў на падзелах у апазіцыі. Ён правёў сепаратныя перамовы з Драшкавічам і паабяцаў яму, калі той не здыме сваёй кандыдатуры, лібералізаваць інфармацыйную палітыку і запрасіць на выбары міжнародных назіральнікаў. Пасля перамоваў Драшкавіч заявіў аб кампрамісе, дасягнутым паміж “кіраўніком дзяржавы і лідэрам дэмакратычнай апазіцыі”, і

дадаў, што перашкоды для ўдзелу ў выбарах знятыя. За тое, што Джынджыч працягваў настойваць на байкоце, Драшкавіч сіламі сваёй фракцыі і СПС зняў яго з пасады мэра Бялграда. Такім чынам, Драшкавіч перайшоў у лагер Мілошавіча (з якога ён быў выгнаны падчас бамбардаванняў у 1999 г., калі зноў выступіў з крытыкай рэжыму). Аднак яго абвінавачанні ў адрас былых саюзнікаў, “чаму яны цяпер адмовіліся ўдзельнічаць у выбарах, калі ў папярэдніх выбарах згадзіліся ўдзельнічаць на тых жа самых, калі не горшых умовах”[6], мелі пад сабой грунт. Байкот, як паказалі выбары і падзеі, што адбыліся пасля іх, меў згубныя наступствы не толькі для самой апазіцыі, але і для ўсяго грамадства.

Вынікі першага туру прэзідэнцкіх выбараў аказаліся найгоршымі для СПС за ўвесь час яе існавання. Яе кандыдат Зоран Ліліч (Мілошавіч не мог удзельнічаць у выбарах праз канстытуцыйнае абмежаванне тэрмінаў і таму загадзя арганізаваў сваё абранне на пасаду прэзідэнта Югаславіі федэральным парламентам) набраў 35,6% галасоў. Толькі ж, колькі Мілошавіч, калі прайграў выбары ў 2000 г., так і праз частковы байкот выбараў апазіцыяй здолеў набраць толькі 20%. Сапраўдным шокам стаў поспех Шэшаля, які набраў 28% галасоў. Выбарцы, якія не прыйшлі галасаваць (у першым туры ўзялі ўдзел 57% выбарцаў, што азначала, што спробы дэлегітымізаваць выбары праз байкот праваліліся), а таксама значная частка тых, хто прагаласаваў за Шэшаля, былі нявыкарыстаным рэсурсам апазіцыі, які пры яе кансалідаваным удзеле мог прынесці ёй перамогу ўжо ў 1997 г. Шэшаль проста захапіў пратэстны электарат, што праз байкот і грамадскае расчараванне ў апазіцыі застаўся сам-насам з стаўленікам Мілошавіча! Болей за тое, такія ж самыя наступствы меў і байкот федэральных выбараў у 1992 г., якія апазіцыя ігнаравала з прычыны “нелегітымнасці” саюзнай канстытуцыі. Фактычна байкоты пайшлі на карысць самай небяспечнай для дэмакратаў аўтарытарнай палітычнай альтэрнатывы. У другім туры Шэшаль выйграў выбары, якія, аднак, былі прызнаны неадбытымі дзеля недастатковай яўкі (паводле дадзеных цэнтрвыбаркаму, яна склала 48,97%). Падчас перавыбараў з тымі ж самымі асноўнымі ўдзельнікамі (апазіцыя, за выняткам СРА, іх зноў байкатавала) Драшкавіч набраў толькі 15% галасоў, а перамогу ў другім туры атрымаў паплечнік

[6] Thomas, ***Politics in Serbia in the 1990s***, p. 345.

Мілошавіча Мілан Мілуцінавіч, прычым выключна коштам фальсіфікацыі галасоў у Косаве (дзе за яго “прагаласавалі” 300 тысяч албанцаў).
Вынікам выбараў 1997 г. было тое, што Мілошавіч пры дапамозе апазіцыі пазбег падзення свайго рэжыму. Аднак для яго стабільнасці яму была неабходная кааліцыя з СРП. Адроджаная “чырвона-карычневая” кааліцыя (за якую прагаласавала, нават з улікам фальсіфікацый, усяго трэцяя частка ўсіх выбарцаў) вырашыла зрабіць палітычныя ачкі на антыалбанскай кампаніі ў Косаве і распальванні антызаходняй істэрыі ў грамадстве. Апазіцыя апынулася ў разгубленасці. Яе адна частка (ДП і ДПС) была маргіналізаваная, іншая (СРА) — цалкам абсарбаваная рэжымам.
Пачынаючы з 1997 г. у Сербіі склалася сталая антыпрэзідэнцкая большасць, чый памер нават паменшыўся падчас выбараў 2000 г. Такім чынам, сацыяльныя ўмовы для змянення палітычнага рэжыму існавалі ўжо за тры гады да таго, калі гэта насамрэч адбылося.

Падзел у стане беларускай апазіцыі на працягу мінулага дзесяцігоддзя быў абумоўлены некалькімі фактарамі. Першы — супярэчнасці паміж нацыянальна-дэмакратычнымі сіламі, якія сімвалізаваў БНФ, з аднаго боку, і ліберальнымі ды левымі плынямі — з другога. Фактарам падзелу тут было нацыянальнае пытанне (стаўленне да беларускай мовы і незалежнасці), а таксама персанальныя непаразуменні апазіцыйных лідэраў. Прэтэнзія лідэра БНФ Зянона Пазьняка на выключны статус сваёй партыі ў апазіцыйным руху ў сярэдзіне 1990-х гг. абярнулася яе паслядоўнай адмовай супрацоўнічаць з іншымі апазіцыйнымі сіламі. Пасля правалу на парламенцкіх выбарах 1995 г. і адноснага поспеху лібералаў з АГП на давыбарах у тым жа годзе БНФ страціў ролю вядучай апазіцыйнай сілы. Яго стаўка на аднаасобнае лідэрства сярод дэмакратычных сілаў толькі спрыяла ягонаму палітычнаму заняпаду. Тым не менш БНФ з цягам часу здолеў выпрацаваць больш прагматычнае стаўленне да іншых апазіцыйных сілаў (чаму спрыяў рост у іх незалежніцкіх настрояў у другой палове 1990-х гг.), а таксама абнавіў сваю ўласную палітычную стратэгію (выявіў большую раскаванасць ува ўзаемадзеянні з “расійскамоўнымі” партыямі). Сам Зянон Пазьняк пасля

эміграцыі ў 1996 г. страціў уплыў на сваю партыю. Ён адкрыта сабатаваў “альтэрнатыўныя” прэзідэнцкія выбары 1999 г., дарма што раней даў згоду на ўдзел у іх. Болей за тое, пасля ён заявіў, што акурат іх зрыў быў мэтай яго вылучэння. У выніку Пазьняк пазбавіўся пасады старшыні партыі БНФ і мусіў стварыць з рэштак сваіх сімпатыкаў Кансерватыўна-хрысціянскую партыю БНФ (КХП-БНФ), якую нават у апазіцыйным лагеры ніхто не ўспрымаў усур’ёз.
Беларускай дэмакратычнай апазіцыі таксама былі ўласцівыя ўнутраныя падзелы, у прыватнасці на “нацыяналістаў” і “лібералаў”. Акурат гэткі падзел прывёў да разгрому апазіцыі на прэзідэнцкіх выбарах 1994 г. Іншым фактарам, што абумовіў пройгрыш, была яе няздольнасць да супрацы з прагматычна настроенымі прадстаўнікамі дзяржаўнай эліты. Маецца на ўвазе не толькі частка кебічаўскага атачэння, але і функцыянеры накшталт Генадзя Карпенкі, чый рэйтынг падчас прэзідэнцкай кампаніі 1994 г. набліжаўся да першай двойкі. Карпенка пазіцыянаваў сябе так, каб прывабіць “сярэдняга выбарца”, чым выгадна адрозніваўся ад Пазняка з Шушкевічам, чый пік папулярнасці тады ўжо прайшоў. Яшчэ больш катастрафічным быў разгром у першым туры парламенцкіх выбараў у 1995 г., калі апазіцыя зноў падзялілася на “нацыянальны” і “ліберальны” блокі, а “ліберальны”, у сваю чаргу, раскалоўся яшчэ на некалькі плыняў. Тады фрагментаванне дэмакратычных сілаў садзейнічала поспеху камуністаў, аграрыяў і лукашэнкаўскай вертыкалі. Толькі аб’яднанне ў другім туры, які адбыўся дзеля нізкай яўкі ў першым, дазволіла стварыць апазіцыйныя фракцыі ў Вярхоўным Савеце 13-га склікання, але магчымасць дасягнуць “крытычнай масы”, што прадухіліла б рэферэндум лістапада 1996 г., усё роўна была страчаная.
Як гэта ні парадаксальна, але аб’яднанню апазіцыі пэўным чынам спрыяў сам Лукашэнка, чыё імкненне пазбавіць сваіх апанентаў хоць якога ўплыву на палітычны працэс падштурхоўвала да аб’яднання “нацыяналістаў” і “лібералаў”, былых нефармалаў і прадстаўнікоў наменклатуры, левых і правых, нават былых паплечнікаў Лукашэнкі (чый уплыў на апазіцыю з цягам часу зрабіўся надзвычай моцным — дастаткова прыгадаць імёны Ганчара, Лябедзькі, Нісцюка, Захаранкі, Лявонава, Фядуты і іншых) і тых, хто ніколі з ім не

супрацоўнічаў, г.зн., па сутнасці, усіх тых, хто ўтвараў палітычную сцэну краіны да 1994 г.
Такое згуртаванне, безумоўна, было сатканае з супярэчнасцяў, найважнейшае з якіх праявілася падчас падзеяў 1996 г. Новай лініяй расколу ўнутры апазіцыі стала пытанне палітычнай тактыкі, а менавіта — выбар паміж “вулічнай” і “сістэмнай” палітыкай. Каб зразумець крыніцы гэтага расколу, трэба звярнуцца да генезісу беларускай апазіцыі. У адрозненне ад сербскай, якая паўстала ў перыяд “прамога” пераходу ад камуністычнай да посткамуністычнай дыктатуры і не мела перыяду, які вышэй быў азначаны як “дэмакратычны эпізод”, беларуская апазіцыя паўстала і ўсталявалася ва ўмовах імклівай лібералізацыі, што распачалася яшчэ ў часы перабудовы. Сваімі першымі поспехамі яна абавязаная не толькі і не столькі ўласным намаганням, колькі той хвалі дэмакратычных пераменаў, якая захліснула Ўсходнюю Еўропу і аказала моцны ўплыў на палітычныя падзеі ўнутры Беларусі (абвяшчэнне незалежнасці ў жніўні 1991 г. было б наўрад ці магчымым без няўдачы жнівеньскага перавароту ў Маскве, болей за тое, сам апазіцыйны рух у форме БНФ быў фактычна скапіяваны сваімі стваральнікамі з прыбалтыйскіх першаўзораў).

У адрозненне ад Сербіі, якая была абкружаная з усіх бакоў аўтарытарнымі рэжымамі, часам створанымі былымі камуністычнымі функцыянерамі (Румынія, Харватыя, Баснія і Македонія), Беларусь знаходзілася ў адносна лепшым становішчы, і шмат каму здавалася, што лукашэнкаўскі рэжым — прыкрая выпадковасць, якая хутка згіне без астатку. Сярод багата якіх апазіцыйных дэпутатаў пераважала думка, што рэжым персанальнай улады, усталяваны пасля лістападаўскага рэферэндуму, пратрымаецца ўсяго пару месяцаў. Сёння, калі рост антыдэмакратычных тэндэнцый у суседніх “славянскіх” краінах (Расіі і Ўкраіне) стаў відавочным, такая пазіцыя падаецца надзвычай наіўнай. Але пяць—шэсць год таму апазіцыйна настроеная публіка спадзявалася, што эканамічны крызіс і палітычны ціск з боку міжнароднай супольнасці (сюды шмат кім з апазіцыянераў уключалася і Расія) зробяць сваю справу. Чаму менавіта эканоміка і расійскі фактар на працягу пэўнага часу спрыялі, а не пярэчылі мацаванню

лукашэнкаўскага рэжыму, я дэталёва растлумачыў у сваіх папярэдніх публікацыях[7].

Стаўка на “вонкавыя” сілы была выкліканая таксама паразамі ў выбарчых кампаніях, а больш канкрэтна — адсутнасцю самааналізу ўласнай палітычнай стратэгіі, што абумовіла гэтыя паразы, а таксама схільнасцю тлумачыць іх не ўласным палітычным непрафесіяналізмам, а масавымі фальсіфікацыямі выбарчага працэсу і “дрымучай дурасцю беларускага народу”. Дзеля гэтага пэўныя колы апазіцыі перасталі ўспрымаць грамадства як саюзніка ў барацьбе за дэмакратычныя мерамены (вынятак складала грамадска актыўная частка жорсткага апазіцыйнага электарату ў Менску і іншых буйных гарадах, што мела стварыць аснову для ўціску на ўлады). Да таго ж палітычная стратэгія апазіцыі пасля лістапада 1996 г. у асноўным зводзілася да таго, каб, дабіўшыся прызнання еўрапейскай супольнасцю і ЗША рэшткаў Вярхоўнага Савету 13-га склікання як адзінага легітымнага парламенту, забяспечыць вонкавую дэлегітымізацыю Лукашэнкі. Ідэй у “сістэмнай палітыцы” супярэчыў гэтай стратэгіі.

Такім чынам, чыннікамі, што вызначылі “пазасістэмную” палітычную стратэгію беларускай апазіцыі (з двума асноўнымі элементамі — “вуліцай” і “вонкавымі сіламі”) былі і не спраўджаныя спадзяванні на глыбокі эканамічны прыгрэс, што выклікаў бы масавы сацыяльны пратэст супраць рэжыму (і, значыцца, недаацэнка яго сацыяльнай трываласці і пераацэнка пратэстных настрояў у беларускім грамадстве);

2) перабольшанне ролі вонкавых фактараў у беларускім палітычным працэсе (што азначала першынство вонкавай дэлегітымізацыі рэжыму перад разбурэннем яго ўнутранай легітымнасці, якая трымалася на палітычнай культуры той часткі грамадства, што падтрымлівала Лукашэнку менавіта за яго дыктатарскія метады, а таксама на азначаным вышэй “сацыяльным кантракце” рэжыму і грамадства ды няведанні большай часткай “нявызначаных” і пасіўных праціўнікаў рэжыму інфармацыі пра палітычныя альтэрнатывы);

3) паступовае расчараванне грамадства ў Лукашэнку і падзенне яго папулярнасці, што пачалося з 1998 г., памылкова інтэрпрэтавалася апазіцыйнымі лідэрамі як сведчанне росту аўтарытэту апазіцыі і іх саміх. Лідэр АГП Анатоль Лябедзька ў сярэдзіне 2000 г. заявіў, што 30% беларускага электарату ўжо

[7] Гл. мае артыкулы “Эканамічная палітыка Лукашэнкі” і “Палітычная эканоміка беларускай расійскай інтэграцыі” ў зборніку “Беларуская расійская інтэграцыя. Аналітычныя артыкулы” (Менск: Эндыклапедыкс, 2002).

гатовыя галасаваць “нават за слуп, на якім напісаныя дэмакратычныя лозунгі”. Цяжка сказаць, быў гэта самападман ці свядомая гульня, але на самай справе пры 30% “жорсткага” антылукашэнкаўскага электарату толькі трохі больш за 10% падтрымлівалі канкрэтную апазіцыйную альтэрнатыву. Астатняя частка на выбарах прагаласавала б так, як і “балота”, якое, як сведчыць досвед, заўжды крочыць за мацнейшым. Такая пазіцыя, аднак, стварала ілюзію, што сацыяльная база апазіцыі ўзнікне сама сабой і асаблівых намаганняў для яе стварэння ці павелічэння прыкладаць не трэба.

Усё гэта стварыла дзіўную сітуацыю ў беларускай палітыцы. З аднаго боку, Лукашэнка сам паслядоўна выціскаў апазіцыю з палітычнага поля, выпхнуўшы яе лістападаўскім рэферэндумам з “першага” ў “трэці” сектар. Аднак апазіцыя сама свядома зрабіла стаўку на паралельнае грамадства як форму не толькі свайго існавання, але і палітычнай стратэгіі: у ім існавалі свае інстытуты (Вярхоўны Савет 13-га склікання, “паралельны ўрад” у форме Нацыянальнага выканаўчага камітэту і “паралельная” цэнтральная выбарчая камісія на чале з Віктарам Ганчаром), свае палітычныя працэсы (“альтэрнатыўныя” прэзідэнцкія выбары), свае медыі, нават свае святы, мастацтва, музыка і культура. Так арганізоўвалася не этнічная ці культурная, а менавіта палітычная меншасць, якая па логіцы мусіла пашыраць свой уплыў у “афіцыйным” грамадстве. Папросту кажучы, паралельнае грамадства на працягу доўгага часу чакала, што “гара прыйдзе да Магамета”. Аднак палітычнае, арганізацыйнае і ў пэўнай ступені культурнае адасабленне ад асноўнай часткі электарату толькі павялічвала дыстанцыю паміж імі.
Як і ў Сербіі, у Беларусі фактычна не апраўдала сябе стаўка на масавыя пратэсты як адзіны альбо галоўны сродак палітычнай барацьбы. Колькасць удзельнікаў “маршаў свабоды” 1999—2000 гг. не перавышала 30 тысячаў чалавек, што было яўна недастаткова, каб пераканаць грамадства ці хаця б уласных прыхільнікаў у колькаснай перавазе апазіцыі над уладай. Больш за тое, склад удзельнікаў быў звычайна аднолькавы: аснову ўсіх дэманстрацыяў складалі “ветэраны вулічнай барацьбы”, што фактычна рабіла акцыі пратэсту “навярненнем ужо навернутых”. Прадказальнымі былі дні, часы і нават мэты

масавых акцыяў, што паступова пераўтварыліся ў дэманстрацыю субкультурнай тоеснасці, “прывязаную” да памятных датаў у палітычным календары (15 і 25 сакавіка, 26 красавіка і г.д.). Паступовае зніжэнне масавасці акцый адлюстравала расчараванне нават апазіцыйна настроенай часткі грамадства ў іх эфектыўнасці.
Бадай што першай спробай апазіцыі прыцягнуць да сябе ўвагу ўсяго грамадства было правядзенне альтэрнатыўных прэзідэнцкіх выбараў у 1999 г. (Гэтую акцыю можна прызнаць першай, калі не лічыць кампаніі збору подпісаў за “Хартыю-97”. Сама “Хартыя”, на жаль, з праваабарончай групы, заснаванай на прынцыпах грамадскай салідарнасці, паступова пераўтварылася ў звышпалітызаваную групоўку, якая, не маючы арганізацыйнага статусу, структуры і сістэмы адказнасці, імкнулася навязаць правілы паводзінаў для палітычных структураў і на нейкі час зрабілася механізмам “звядзення рахункаў” паміж рознымі плынямі ў апазіцыі.) Сама па сабе акцыя мела рацыянальнае зерне. У разе поспеху яна магла пахіснуць легітымнасць Лукашэнкі ў грамадстве і пераўтварыцца ў своеасаблівыя “праймарыз” сярод апазіцыйных лідэраў перад сапраўднымі выбарамі. Аднак, на жаль, альтэрнатыўныя “прэзідэнцкія выбары” сталі закладнікам палітычных інтарэсаў іх арганізатараў і ўдзельнікаў ды скончыліся публічным скандалам паміж старшынём альтэрнатыўнага цэнтрвыбаркаму Ганчаром і лідэрам БНФ Пазьняком. Акцыя мела і іншыя разбуральныя наступствы для апазіцыі. Па-першае, пасля яе правядзення сярод вялікага кола актывістаў, што пацярпелі за ўдзел у ёй, запанавала пачуццё (па)кінутасці з боку яе арганізатараў. Па-другое, абвясціўшы неверагодныя вынікі выбараў (яўку выбарцаў у 54% і, на здзек, перамогу Пазьняка), арганізатары выбараў фактычна апусцілі сябе на адзін узровень з лукашэнкаўскім цэнтрвыбаркамам, за тым адно выключэннем, што фальсіфікацыя афіцыйных выбараў ніколі не дасягала такіх памераў (паводле дадзеных незалежных назіральнікаў, у “мабільных” выбарах узялі ўдзел крыху больш за пяць адсоткаў выбарцаў). Выбары 1999 г. засталіся ўзорам палітычнага бізнесу і блефавання не столькі перад нацыянальнай, колькі перад міжнароднай супольнасцю.

Спроба перамоваў паміж уладай і апазіцыяй у 1999—2000 гг.

наконт лібералізацыі выбарчага заканадаўства таксама была ад пачатку запраграмаваная на няўдачу. Па-першае, як я ўжо адзначаў, перамоўны працэс з персаналісцкім рэжымам немагчымы паводле азначэння (перамовы маюць поспех пры ўмове дэцэнтралізаванага размеркавання ўлады, пры якім рэфарматары ўнутры рэжыму маюць пэўную ступень аўтаноміі). Да таго ж, апазіцыя не мела магчымасці весці перамовы з пазіцыі сілы, бо аб'ектыўна не карысталася шырокай грамадскай падтрымкай. Гэта штурхала яе да пошуку "заступніка", які б мог націснуць на рэжым. Гэтая роля выпала на АБСЕ. Паводле трапнага азначэння аналітыка Юрыя Дракахруста, "перамовы пераўтварыліся з перамоваў Лукашэнкі з апазіцыяй пры пасярэдніцтве Захаду ў перамовы Лукашэнкі з Захадам пры пасярэдніцтве апазіцыі"[8]. Але паколькі Захад не меў эфектыўных палітычных, эканамічных ці сілавых рычагоў ціску на беларускага прэзідэнта, пагроза адмовы ў прызнанні яго рэжыму значыла для Лукашэнкі прыкладна тое ж, што адмова дэмакратычным лідэрам у паўночнакарэйскай візе. Да таго ж, заклікі АБСЕ падчас перамоў да кампрамісаў увесь час выклікалі надзвычай рэзкую рэакцыю сярод апазіцыі, і нават даходзіла да абвінавачанняў у адрас кіраўніка місіі амбасадара Ганса-Георга Вікаў прасоўванні інтарэсаў Лукашэнкі, Расіі, нямецкага капіталу і г.д. Гэта, аднак, не перашкаджала і Лукашэнку разглядаць місію АБСЕ ў выкананні ролі мазгавога цэнтру апазіцыі. Вынік перамоваў быў прадказальны. Лукашэнка дамовіў пасадаў сваіх прадстаўнікоў, якія падпісалі пагадненні аб доступе апазіцыі да сродкаў масавай інфармацыі, і замяніў самі перамовы "грамадскім дыялогам" з лаяльнымі яму грамадскімі арганізацыямі. Вылучэнне на пачатку 2000 г. апазіцыяй "чатырох умоваў" удзелу ў парламенцкіх выбарах (доступ да СМІ, прадстаўніцтва ў выбарчых камісіях, спыненне палітычных рэпрэсіяў і пашырэнне паўнамоцтваў парламенту) было добрым публічным крокам, але, як і ў выпадку з сербскай апазіцыяй у 1997 г. (тады патрабаванні да Мілошавіча таксама ўкладаліся на падставе рэкамендацый місіі АБСЕ, якую ўзначальваў былы гішпанскі прэм'ер Феліпэ Гансалес), выглядалі як зачэпка для няўдзелу ў выбарах. Апазіцыя зноў апынулася ў замкнёным коле: каб дамагчыся вольных выбараў, ёй трэба было набрацца сілы, але ж набрацца сілы без удзелу ў

[8] **Белорусская газета. 26 студзеня. 2000.**

сістэмнай палітыцы было, як засведчыў досвед, немагчыма. Было таксама няясна, што мелася паштурхнуць Лукашэнку да прыняцця такіх умоваў.
Важным фактарам, што адбіўся на вызначэнні апазіцыйнай стратэгіі і тактыкі, былі механізмы ўзаемадзеяння паміж палітычнай (партыі) і грамадзянскай (няўрадавыя арганізацыі) супольнасцю ў рамках паралельнага грамадства. Гэтыя два асяроддзі аб'ядналіся да такой ступені, што большасць апазіцыйных партыйных актывістаў былі сябрамі адной ці некалькіх НДА і наадварот, а партыйныя кіраўнікі былі адначасова лідэрамі няўрадавых арганізацый. Такая ўзаемасувязь склалася з аб'ектыўных прычын: палітычная апазіцыя не мела ўнутраных крыніцаў фінансавання, а карыстанне вонкавымі было забаронена законам. Трэці сектар, такім чынам, пераўтварыўся ў механізм забеспячэння жыццядзейнасці палітычнай апазіцыі. У беларускіх умовах гэта мела тры наступствы. Першае — гэта выключная палітызаванасць няўрадавага сектару, які выкарыстоўваўся як "гарматнае мяса" пры правядзенні палітычных кампаній. НДА пачалі абслугоўваць кіраўнічыя структуры апазіцыі замест таго, каб выконваць "грамадскія паслугі" для дэмакратычнай супольнасці, у тым ліку даваць незалежны аналіз яе дзеянняў. Другое — палітычнае існаванне партыйных лідэраў залежала не ад дасягненняў у палітычнай барацьбе, а ад пазіцыі ў "трэцім сектары". Болей за тое, паколькі пазіцыі лідэраў НДА не залежалі ад іх палітычнай эфектыўнасці, то верхавіна палітычнай супольнасці не мела сур'ёзнай матывацыі для ўдзелу ў "сістэмнай" палітыцы. Трэцяе — статус і роля НДА як паралельнай структуры апазіцыйнай іерархіі дазвалялі маніпуляваць апазіцыйнымі сіламі ў абыход іх фармальных кіроўных інстытутаў. Гэтаму спрыяла цэнтралізаваная структура няўрадавага сектару, арганізаваная вакол вядомых рэсурсных цэнтраў.

Падчас выбараў у Палату прадстаўнікоў у кастрычніку 2000 г. пытанні стратэгіі спрычынілі новы раскол у шэрагах апазіцыі. На першы погляд, ён не быў надта глыбокі. Байкот, што абвесціла рада КРДС, не падтрымала толькі Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Народная грамада) Мікалая Статкевіча, моладзевая арганізацыя "Грамадзянскі форум",

якая праз сваё рашэнне пазбавілася статусу моладзевага крыла АГП, і шэраг вядомых палітыкаў (такіх, як Міхаіл Чыгір, Генадзь Грушавы, Гары Паганяйла і іншыя). Аднак, як паказалі прэзідэнцкія выбары 2001 г., менавіта гэтыя групоўкі здолелі стварыць каманду Ўладзіміра Ганчарыка, якая сілаю была амаль роўнай камандзе, умоўна кажучы, “Домаша—КРДС”. Аргументы “за” і “супраць” былі вядомыя: удзел у выбарах легітымізуе ўладу, а байкот вядзе апазіцыю да самаізаляцыі ў грамадстве. Аднак дзве палярныя тактыкі былі ўзведзеныя да абсалюту, і ў выніку выбары/байкот-2000 пераўтварыліся ў чарговую ўнутраную “разборку” ў шэрагах апазіцыі, якая падарвала адзінства дэмакратычных сілаў напярэдадні прэзідэнцкіх выбараў. Высвятленне адносінаў працягвалася і пасля кампаніі — спачатку спробай арганізаваць раскол у БСДП, потым расколам самой КРДС і выхадам з яе сацыял-дэмакратычных партый ды ўтварэння імі кааліцыі “За сацыяльныя перамены”.

Як кампанія дэлегітымізацыі Лукашэнкі байкот не меў сэнсу. Па-першае, легітымнасць выбараў адзначаецца іх адпаведнасцю агульнапрынятым стандартам, а не складам удзельнікаў. Падчас кампаніі рэжым прадэманстраваў выключную няздольнасць да захавання нават нейкага выгляду празрыстасці і справядлівасці выбарчага працэсу. Па-другое, байкот якраз-такі паспрыяў унутранай легітымізацыі Лукашэнкі тым, што ён практычна дэмабілізаваў дэмакратычны электарат і зноў пакінуў тых, што не вызначыліся, без альтэрнатывы існай уладзе. Каб пацвердзіць сказанае вышэй, звернемся да табліцы, якая паказвае, што сярод тых, хто не пайшоў на выбары ў Палату, пераважалі праціўнікі Лукашэнкі, а сярод удзельнікаў выбараў — яго прыхільнікі. Байкот спрацаваў на карысць дыктатара такім жа чынам, як і ў Сербіі. Сама колькасць удзельнікаў выбараў, згодна з незалежнымі апытаннямі, значна перавысіла 50%, так што лічба ў 45%, якая быццам бы сведчыла аб байкоце, была выведзена з вынікаў галасавання ў Менску (аб гэтым сведчаць і вынікі незалежнага назірання ў іншых гарадах, якія адрозніваюцца ад афіцыйных толькі на пару, а не на семнаццаць адсоткаў). Аб’ектыўна кажучы, нават афіцыйныя звесткі, пры ўмове што колькасць выбарцаў не была падкарочаная падчас галасавання, сведчылі, што выбары не адбыліся ў 39 акругах, а гэта быццам сведчыла пра поспех

байкоту. Аднак зноў жа, гэта былі гарадскія акругі, дзе апаненты Лукашэнкі пераважалі!

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/12/14**
[image]

# Валянцін Тарас
# На Вайсковых могілках

Заканчэньне. Пачатак у № 3/2003.

Вайсковыя могілкі, што на вуліцы Казлова — для мяне на Даўгабродзкай, бо ў маім даваенным дзяцінстве, дый шмат гадоў пасьля вайны Даўгабродзкая пачыналася ня там, дзе цяпер, а з таго месца, дзе стаіць Палац мастацтваў, — адзін з самых дарагіх майму сэрцу куточкаў Менску. Там быў пахаваны мой дзед Іван, мамін бацька, і мой дзядзька, мамін брат, таксама Іван, які трагічна загінуў у 1938-м годзе: трамваем яму адрэзала ногі і ён сканаў у машыне хуткай дапамогі, сьцёк крывёю. Там, побач з бацькам і братам, была пахавана і мама — у нечувана халодным студзені 1940 году, калі ў Беларусі павымерзьлі ўсе сады. Каб выкапаць маме дол, расклалі вогнішча, грэлі зямлю, якую немагчыма было ўзяць нават ломам, ён зьвінеў і адскокваў ад грунту, нібы б'еш па жалезе...

Помнікаў усім траім паставіць не пасьпелі. Над абодвума Іванамі Панцялеймавымі стаялі драўляныя каталіцкія крыжы, а над мамай — чырвоная фанэрная пірамідка з чорнай бляшанай шыльдачкаю:

ГАЛІНА ІВАНАЎНА ПАНЦЯЛЕЙМАВА-ТАРАС
1913—1940

Магілы гэтыя зьніклі.

У ліпені 1944 году, у першы дзень свайго вяртаньня з

партызанскага лесу, пабываў на Вайсковых могілках, але ўсіх трох магілак не знайшоў. Хоць добра памятаў, дзе яны знаходзяцца: на ўскраі могілак, у сярэдзіне перадапошняга шнуру пахаваньняў, амаль каля самага плоту з боку вуліцы Берасьцянскай. Але, калі я прыйшоў на тое месца, плот быў павалены (да вайны могілкі агароджваў драўляны плот, мэталічную агароджу паставілі ў 50-я гады), паваленыя былі многія гранітныя помнікі, многія крыжы і пірамідкі. Як быццам іх раскідала выбухам. Я агледзеў усе паваленыя крыжы і пірамідкі, шыльдачкі на іх — ня мог паверыць, што магілаў няма, і падумаў, ці тое гэта месца? Няўжо я забыў, дзе пахаваная мама? Не было ў каго спытаць: што тут здарылася, чаму павалена столькі помнікаў і крыжоў? Можа, сюды патрапіла бомба альбо цяжкі снарад, калі ў горадзе 3 ліпеня дзе-нідзе ішоў бой? Можа, бомба і разьвярнула частку магілаў? А варонку потым засыпалі, зраўнялі зь зямлёй? Але не было ў каго спытаць — нікога, аніводнай душы, акрамя мяне, на могілках не было. І ніводнага жывога жытла, ніводнага дому не было і на Берасьцянскай, і на іншых навакольных вуліцах і завулках — увесь гэты раён згарэў 24 чэрвеня 1941 году.

Я прысеў на адзін з паваленых помнікаў, разгублены, ня ведаючы, што рабіць. Два гады, зь лета 42-га, я нічога ня чуў пра сваіх блізкіх — як і яны пра мяне, — хоць знаходзіўся зусім недалёка ад Менску, за якіх-небудзь сем—дзесяць кілямэтраў, але не было як падаць пра сябе вестку, а яны дык і ня ведалі, дзе я, — пайшоў адноечы з дому і не вярнуўся... А я, калі ішоў на могілкі, быў абсалютна ўпэўнены, што знайду вестачку ад сваіх на мамінай магілцы. Думаў, што калі яны куды-небудзь зьехалі, то проста не маглі не пабываць перад ад'ездам на могілках, перадусім бабуля: і да вайны, і ў часе акупацыі, калі я яшчэ быў дома, яна прыходзіла туды кожную нядзелю — маліцца і ставіць сьвечкі. Мне яскрава ўяўлялася, дзе я знайду вестачку: яна, мабыць, схавана ў карабку з-пад запалак, альбо ў шкляным слоіку, альбо ў бляшанцы з-пад кансэрваў, і той карабок, ці слоік, ці бляшанка ляжыць у траве пад кусточкам за мамінай пірамідкай, там, дзе бабуля хавала рыдлёўку і грабелькі, якімі ўпарадкавала магілы...
Неверагодна, але менавіта так яно і было! Толькі даведаўся я пра гэта празь сямнаццаць гадоў пасьля вайны, у 1961-м, калі

прыехаў у Польшчу, у горад Познань, дзе з дапамогай Міжнароднага Чырвонага Крыжа знайшліся мае бабуля, сястра і цётка. Аказалася, што тады, у 1944-м, пакідаючы Менск за некалькі дзён да яго вызваленьня ад немцаў, яны, як я і думаў, пакінулі мне запіску на мамінай магілцы, у шкляным слоіку! Цётка запомніла, што было ў той запісцы, якую яна ж і напісала: “Валік, калі ты жывы, ведай, мы таксама жывыя. Мы ад’яжджаем зь Менску далёка, даглядай магілкі”. А куды *далёка* і чаму яны ад’яжджаюць, яна пісаць ня стала, бо яны ня проста ад’яжджалі, а ўцякалі зь немцамі ад Саветаў. Так вырашыла цётка. Яна працавала ў нямецкай салдацкай сталоўцы на кухні, мыла посуд, і баялася, што калі застанецца ў Менску, то мала ёй ня будзе за службу немцам. І наўрад ці яна памылялася, гадоў як мінімум на пяць не пазьбегчы б ёй Магадану ці Варкуты, калі б засталася. Ня мае значэньня, што вінаватая была адно ў тым, што мыла ў нямецкай сталоўцы посуд, каб ратаваць ад голаду старую маці і малую пляменьніцу, маю сястру: немцы дазвалялі выносіць са сталоўкі рэшткі супу і якой-небудзь кашы, рэшткі хлебу. На мове “кампэтэнтных органаў” гэта прагучэла б жалезна: “Прадалася за нямецкую поліўку”! Ды што “органы”, я і сам, чатырнаццагадовы партызанчык, лічыў тады, што ўсе, хто так ці інакш служыў немцам, — здраднікі.

У Нямеччыне цётка Люся знайшла сваё шчасьце. Яна была служанкай у нейкім маёнтку і пазнаёмілася там з польскім ваеннапалонным Уладакам, які таксама працаваў у тым маёнтку — брыгаду палонных палякаў прывозілі туды на палявыя работы. У траўні 45-га Люся з Уладакам пабраліся, і ён павёз яе ў Польшчу, а зь ёю маю бабулю і сястрычку — у яе, тады дзевяцігадовай дзяўчынкі, не было выбару: там, дзе бабця і цёця, там і яна. Люся як жонка грамадзяніна Польшчы атрымала польскае грамадзянства аўтаматычна, не было з гэтым перашкодаў і ў бабулі — яна была этнічная полька (у той час беларускія, украінскія і літоўскія палякі маглі свабодна перасяляцца на польскія землі). Бабуля ніколі больш ня ўбачыла радзімы, а Люся пабывала ў Менску ў 1989-м годзе, і я разам зь ёю яшчэ раз паспрабаваў адшукаць зьніклыя магілы ці хоць бы тое месца, дзе яны былі. Бо ў мяне з гадамі ўсё пераблыталася ў галаве, я пачаў думаць, што тады, у ліпені 1944-га, памыліўся і шукаў іх ня там, дзе трэба. Спадзяваўся,

што Люся знойдзе тое месца па якой-небудзь прыкмеце, па якім-небудзь чужым помніку, які некалі стаяў побач з *нашымі* магіламі і запомніўся Люсі.
Быў пахмурны вясновы дзень, накрапваў дождж, на могілках было брудна, сьлізка, паныла. Мы зь Люсяй ішлі ўздоўж агароджы з боку Берасьцянскай, а над намі кружлялі і каркалі зграі варон, і такі сум быў у гэтым карканьні, такая безнадзейнасьць, што я ўжо ведаў, прадчуваў: нічога Люся ня ўспомніць. Яна і ня ўспомніла, разгублена азіралася па баках, кусала губы, каб не загаласіць, твар быў мокры ці то ад дажджу, ці то ад сьлёзаў. Я спытаў, ці пазнае яна хоць што-небудзь. Люся адмоўна пакруціла галаваю: “Ніц собе не пшыпомінам, жадных помнікув… Таке ўчуце жэ нігды ту не былам…” (“Нічога не прыпамінаю… ніякіх помнікаў… Такое адчуваньне, што ніколі тут не была…”). Яна забылася беларускую мову, і расійскую забыла, дакладней, развучылася на іх размаўляць, а некалі хораша гаварыла па-беларуску, хадзіла ў беларускую школу. Дарэчы, у нашай сям’і бытавалі тры мовы: па-польску — і толькі па-польску — гаварыла бабуля; мама, памятаю, па-польску і па-расійску — па-расійску з мужам, маім бацькам, польскай і беларускай мовамі ён у гаворцы не валодаў, хоць усё разумеў. Усе тры мовы, а яшчэ габрэйская, бытавалі на ўсім нашым Трамвайным завулку, але пераважала беларуская, амаль усе дзеці вучыліся ў беларускай школе — гэта цяпер беларускія школы можна пералічыць на пальцах адной рукі, а тады было наадварот. І радыё некалі — да 1937 году — гаварыла пераважна па-беларуску. І Менск яно называла Менскам, а ня Мінскам, і час называўся свой, менскі, гэта пасьля 37-га мы пачалі жыць паводле маскоўскага часу, і жылі паводле яго, аж пакуль не разваліўся Савецкі Саюз. Добра памятаю, як яшчэ недзе ў 35-м радыё пачынала свае перадачы: “Увага, увага! Гаворыць Менск, радыёстанцыя імя Камінтэрну. У Менску дванаццаць гадзін, у Маскве трынаццаць. Праз хвіліну слухайце апошнія паведамленьні” — на працягу гэтай хвіліны тая ж абвестка паўтаралася на расійскай, польскай і габрэйскай мовах…

Жах падумаць, як даўно тое было! Менск майго даваеннага дзяцінства. Сьмерць мамы. Вайна. Той дзень, калі я не знайшоў мамінай магілкі… Але боль аціх, засталася толькі горыч

страты. Цяпер ужо толькі горыч: час лечыць.
Зрэдку прыходжу на Вайсковыя могілкі, туды, да агароджы з боку Берасьцянскай, *прыблізна* на тое месца, дзе былі пахаваны мае блізкія, і дзіўна ўсьведамляць, што я ўжо на многія дзесяцігодзьдзі старэйшы за дзеда Івана, які памёр у 34-м, калі яму было пяцьдзясят чатыры, старэйшы за маму, якой ня стала на дваццаць восьмым годзе жыцьця (яна нарадзіла мяне ў сямнаццаць), старэйшы за мамінага брата, майго дзядзьку Івана, — у 38-м, калі ён загінуў, мне было восем, а яму дзевятнаццаць. Былі — і няма!.. І горыч страты нават іхніх магілак зноў становіцца вострым болем… Здарылася так, што адноечы гэты боль разьдзяліў са мною Міхась Стральцоў, якога таксама даўно няма на гэтым сьвеце, і ў мяне бывае часам такое адчуваньне, што і ён пахаваны на Вайсковых могілках, згубіўся там, як згубілася мая мама, як дзед Іван і дзядзька Іван. Але там, на Вайсковых могілках, і сапраўды засталася часьцінка Мішавай душы.
Ня памятаю дакладна, калі тое было, недзе ў 78-м ці 79-м. Памятаю толькі, што было лета, ласкавы, ціхі, мякка-сонечны дзень. Мы выпадкова сустрэліся зь Мішам на праспэкце, тады — Ленінскім, цяпер Скарыны, на рагу праспэкту і вуліцы Казлова. Я быў у дрэнным, цяжкім настроі, нейкая, цяпер ужо і ня памятаю якая, была ў мяне непрыемнасьць. Паздароўкаліся, і Міша, затрымаўшы маю руку ў сваёй, спытаў: “Што гэта ты такі змрочны, старычок, задуменны? Здарылася што? Ці так кошкі на душы шкрабуць? Можа, прагонім нягодніц? У мяне ёсьць чым!” — і ён паляпаў сябе па пінжаку, па ўнутранай кішэні, і я зразумеў, што там у яго пляшка. Спытаў: “А дзе мы гэта зробім? Не ў пад’езьдзе ж!” І прапанаваў: “Можа, у рэдакцыі “Нёману”?” (Рэдакцыя была побач, цераз дарогу, хлопцы там часьцяком выпівалі, вядома, нелегальна.) Але Міша сказаў: “А ну іх, там употай трэба, з-пад стала. Хадзем на Вайсковыя могілкі, да Паўлюка. Я, дарэчы, туды тэпаў. Там у Паўлюка ўсё ёсьць — чарачкі, відэльцы, “адкрывачка”. Хадзем!” Я падумаў, што Паўлюк — гэта, мабыць, нехта з абслугі могілак, вартаўнік ці адміністратар, і выпіць можна ў старожцы. Пацікавіўся: “А што за Паўлюк?” — “Там убачыш, — усьміхнуўся Міша. — Не турбуйся, свой хлопец!” Мы пайшлі на могілкі. Купілі па дарозе батон, кавалак кілбасы, бляшанку кансэрваў “Сайра”, дзьве бутэлькі піва — гуляць дык гуляць!

Трымайцеся, “кошкі”! Як увайшлі ў браму, я сказаў, што перадусім хацеў бы пабываць на “маім месцы”, ёсьць тут у мяне такое, — да Паўлюка пойдзем потым. Міша не пярэчыў, і мы пайшлі на тое “маё месца” каля агароджы з боку Берасьцянскай, і пакуль ішлі, пакуль стаялі там з паўгадзіны, я апавёў Мішу пра зьніклыя ў 1944-м магілы, пра маму, пра тое, ад чаго яна памерла: трэцяя цяжарнасьць зь нейкай паталёгіяй, “кесарава сячэньне” (плод аказаўся мёртвы), заражэньне крыві — агульны сэпсыс, як гэта цяпер называецца, а пэніцыліну ў той час яшчэ не было... Апавёў пра тую ноч, калі мамы ня стала: а другой гадзіне бабуля пабудзіла ўсіх — майго бацьку, мяне, Люсю, адно шасьцігадовай Таісы ня стала будзіць. Бабуля была апранутая ў чорнае: чорная спадніца, чорная кофта, чорная хустачка на галаве. Бацька, зьбянтэжаны, спалоханы, спытаў: “Что случилось, Елена Францевна? Вам приснился страшный сон?” Бабуля доўга моўчкі глядзела на зяця, мяне, на Люсю і нарэшце неяк жудасна спакойна сказала: “То не сэн, то правда: Галіна не жые...” Бацька разгублена пачаў нешта гаварыць, маўляў, з чаго бабуля гэта ўзяла (ён жа ўчора быў у больніцы, і дактары сказалі, што будуць рабіць яшчэ адно пераліваньне крыві, што ёсьць надзея!.. Бабуля неяк зьдзекліва-горка ўсьміхнулася: “Юж не вымага моя цурэчка жаднэй трансфузьі крві... Не жые!.. Вем жэ не жые...” (“Не патрабуе ўжо мая дачушка ніякага пераліваньня крыві… Памерла!.. Ведаю, што памерла...”) Яна падышла да нізенькай камоды, на якой стаяла ваза з засушанымі кветкамі люнарыямі, розныя скрыначкі, лякаваныя і пэрламутравыя, і некалькі фатакартак у рамачках, пад шклом. Адна зь іх была маміна. Бабуля ўзяла яе ў рукі, доўга на яе глядзела, потым паставіла асобна, далей ад астатніх. Адчыніла адну з шуфлядак камоды, дастала зь яе даўгую белую стэарынавую сьвечку, папрасіла майго бацьку, каб запаліў. Накапала воску побач з фатакарткай і паставіла на яго сьвечку. Склала перад сабою рукі — далонь да далоні. Ціха зашаптала малітву...

Прадчуваньне не падманула бабулю: мама сапраўды памерла ў тую ноч, а палове першай, 21 студзеня 1940 году. Прарочым аказаўся мамін сон, пра які я таксама апавёў Мішу, — сон, што сасьніўся маме за месяц да таго, як яна легла ў больніцу: быццам яна ідзе па сьцежцы праз высокае, густое, залатое жыта і раптам бачыць, што ў жыце ляжыць, шырока раскінуўшы рукі,

яе бацька, мой дзед Іван, у белай вышыванай кашулі, ласкава ўсьміхаецца і кажа: “Куды ты, дачушка? Хадзі да мяне, прыляж побач, адпачні”. Але маме становіцца жудасна, яна кідаецца бегчы, а жыта не пускае, сьцябліны чапляюцца за ногі, за рукі, абвіваюць шыю, душаць, а ласкавы голас усё кліча: “Галя, дачушка, не ўцякай, хадзі да мяне!..” Пра сон гэты я даведаўся ад бабулі, мама яго ёй расказала...

Пра ўсё я тады распавёў Мішу, пра ўвесь свой радавод, пра абодвух дзядоў і абедзьвюх бабулек, пра тое, што няма ў мяне яшчэ дзьвюх дарагіх магілак — дзеда Міколы і бабулі Крэйны, бацькоў майго таты. Дзед Мікола быў родам зь вёскі Мядзьведжына, была некалі такая пад самым Менскам, а бабуля Крэйна паходзіла зь Літвы, зь нейкага габрэйскага мястэчка, так што ўва мне зьмешаныя чатыры крыві: беларуская, расійская (расійская ад дзеда Івана, які паходзіў з Расіі, з гораду Томску, — каб ажаніцца з маёй бабуляй Гэляй, ён прыняў каталіцтва), польская і габрэйская, за якую расплаціліся Мікола і Крэйна. Яны разам былі ў Менскім гета. У 1942-м дзеда Міколу адправілі ў Асьвенцім, і магілай ягонай стала неба, куды струменьчыкам дыму з коміну крэматорыю адляцела яго душа. А бабулю Крэйну забілі ў нейкай ваколіцы Менску ў 1943-м, калі канчаткова ліквідавалі Менскіх габрэяў...
Міша моўчкі слухаў, курыў, і вочы ягоныя былі поўныя сьлёзаў. А потым ён сказаў неяк вінавата: “Спачуваю табе, старычок, разумею цябе... Што ж, хадзем да Паўлюка, памянём тваіх...”
І ён павёў мяне да Паўлюка, але не ў старожку, як я думаў, а некуды ў глыбіню могілак, туды, дзе былі зусім старыя магілы, яшчэ дваццатых — пачатку трыццатых гадоў. І вось мы падышлі да непрыкметнай магілкі сярод густых зарасьцяў хмызьняку, у засені старых бярэзін і клёнаў, і там на сьціплым абамшэлым помнічку я прачытаў імя нябожчыка: ПАЎЛЮК ТРУС.
“Ну, добры дзень, Паўлюк, — нібы зьвяртаючыся да жывога чалавека, сказаў Міша. — Бачыш, нядоўга ты мяне чакаў. Але сёньня я не адзін, Паўлючок, друг з мною, Валя Тарас. Свой хлопец, Паўлючок, свой хлопец!.. Трэба нам тут разам з табою пагутарыць...” Побач з помнічкам, у густой высокай траве быў у Мішы тайнічок. Ён дастаў зь яго цэляфанавы мяшэчак, зь

мяшэчка — дзьве гранёныя чаркі, відэльцы, “адкрывачку”, сальнічку, папяровыя сурвэткі, сталовы нож. Вынуў з кішэні і паставіў на траву бутэльку “Сталічнай”. Завіхаючыся, мармытаў сабе пад нос: “У школе праходзяць паэзію Труса, розныя *літаратураеды* дысэртацыі пра “Дзясяты падмурак” пішуць, а на магілу ніхто ніколі не завітае!.. У Саюзе пісьменьнікаў начальнічкі нашыя, відаць, нават і ня ведаюць, дзе Паўлюк пахаваны, дзе яго магілка. Ну, сядай, старычок! Наразай батон, кілбаску, кансэрвы я сам адкрыю...” Мы доўга сядзелі каля той закінутай магілы, выпівалі патроху і размаўлялі, размаўлялі, размаўлялі. Пра ўсё на сьвеце! Мне было лёгка зь ім і свабодна, хоць зусім розныя мы былі людзі і розьніца ў гадох была ў нас вялікая: ён быў на сем гадоў маладзейшы за мяне. Але нарадзіліся мы пад адным знакам — пад Вадалівам. Я — 9 лютага, ён — 14-га, у дзень сьвятога Валянціна, на мае імяніны. Таму, нягледзячы на ўсю розьніцу ў гадох, на ўсю розьніцу характараў і жыцьцёвага вопыту, было ў нас і нешта супольнае, блізкае і мне, і яму. Можа, таму мне ўдалося няблага (ён сам казаў, што няблага) перакласьці на расійскую мову радкоў трыста ягоных вершаў. На старонках “Нёману” ён яшчэ пасьпеў убачыць гэтыя пераклады, а вось у асобнай — маскоўскай — кніжцы ня ўбачыў, яна выйшла пасьля яго сьмерці. Але самае значнае, што ўдалося для яго зрабіць, — гэта пераклад цудоўнага ягонага апавяданьня “Смаленьне вепрука” (у перакладзе — “Смоление вепря”), які спачатку быў надрукаваны ў часопісе “Дружба народов”, а потым уваходзіў ува ўсе анталёгіі найлепшых беларускіх апавяданьняў у перакладзе на расійскую мову. Перачытваючы час ад часу “Смаленьне вепрука”, зноў і зноў бачу, што ў ім — увесь Міша, уся яго трапяткая, пяшчотная, уразьлівая душа, яго найтанчэйшае, пранізьлівае ўспрыманьне жыцьця, яго сьвятла і яго трагізму. Тое апавяданьне назаўсёды зьвязана для мяне з тым днём, ці то ліпеньскім, ці то жнівеньскім, ужо крыху кранутым фарбамі завяданьня, — ціхім, сумным днём, калі мы сядзелі *ў Паўлюка*. І так хораша, сьветла і журботна было нам за той горкай, але і шчымліва салодкай чаркай памінаньня маіх блізкіх!..

Родныя магілы... магілы, якіх няма... вострае адчуваньне сіроцтва, як некалі ў дзяцінстве, калі памерла мама... Толькі цяпер да гэтага адчуваньня дадалося горкае пачуцьцё страты

сяброў, — *там* іх у мяне ўжо больш, чым тут.
*ліпень—жнівень, 1997 г.*

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/12/14**
[image]

# Вячаслаў Адамчык
# Дзённік 1998

Заканчэнне. Пачатак у №3 і №4 за 2003 год.

**Панядзелак, 3 жніўня 1998 году.**
7.20. Нарэшце можна жыць — у кранах з'явілася гарачая вада. Праўда, рыжавая, як з гнілога балота.
Мой абсяг, як у дыпламата ці прадстаўніка місіі ААН, абмежаваны радыусам у 25 км, і выйсці за гэты круг сёлета мне не ўдалося: горад — дача, дача — горад.
Як хацелася б узляцець на пагоркі, каб убачыць панараму знаёмых палёў з жоўтым, бурштынавым аўсом і запалавелым, шархотка-чуйным жытам, што чакае сярпа. Як зманвае затравелая сцежка пад старымі алешынамі і вербамі, што бяжыць крутым берагам над крынічнаю, сцюдзёнаю Ятранкаю. Я так знябыўся па родным варакомскім кутку. А ён усё аддаляецца ад мяне і ўсё чужэе, зарастаючы новым лесам, дрэвамі, забудоўваючыся новымі хатамі, у якіх ужо гаспадараць свежыя людзі, як называлі ў нас чужога і новага чалавека.

**Панядзелак, 10 жніўня 1998 году.**
Отшельник. Як перакласці? Пустэльнік? Валацуга? Бадзяга? Цяняецца. Цянетнік?
18.00. Як гнецца ў струнким трыццацігадовым сасновым падлеску большая ў ім і адзінокая бярэзіна. Тонкія, годныя

толькі, можа, на латы ці кроквы сосны калышуцца ўсе разам, як, падняўшыся, балельшчыкі на футбольным стадыёне.
Сярод мройна-трапяткіх бярэзінаў пакалыхваецца і ўпартая елка, але зрэдку, пад большыя парывы ветру.
Адліваючы шоўкам, калышацца, ходзіць хвалямі, як разасланае палотнішча, нізкі ячмень.
На залацістым прыцямнелым аўсе хваляў не відаць, толькі ледзьве прыкметнае мройнае калыханне.
Мужчына, трымаючы ў руцэ складное крэсла, выйшаў з лесу, а за ім выбегла чародка чорных і белых коз.
Вецер нясе сівыя пухкія шарыкі асоту. Над гаем уздымаюцца ластаўкі, дачакаўшыся нарэшце сонца. Дождж перагонамі, ветраны надвячорак нагадваюць пра блізкую ўжо восень.
Прыгадалася бабка Магдалена з палачкаю: “Як хмарка набяжыць, так і дождж ык”.

**Аўторак, 11 жніўня 1998 году.**
Каля сотак з сівавата-зялёнаю лапушыстаю капустаю і пажоўклаю бульбаю паходжвае, насунуўшы на лоб кепачку, прыгорблены, як свіны татка, былы кіраўнік звязку літаратараў.
У руцэ яго ўжо кіёк пенсіянера, а каля ног — калматы з белаю грываю колі, вартаўнік дачы.
Наша памылка ў тым, што смерць мы бачым толькі (лишь) перад сабою, а яна ж значнаю сваёю часцінаю — ужо ззаду. Тое, што мы перажылі, — ужо ёсць набытак.

**Серада, 12 жніўня 1998 году.**
9.00. Месяц, як купал белага парашута, на светла-блакітным небе між двума дубамі. Сухі, але трохі сцюдзёны вецер з поўначы, з нашага азярца.
Калыханне, як шоўку, спалавелага ячменю. Залацісты авёс укрыў гарбаты грудок перад зялёным, нібы ўспененым лесам з зубкамі крыжаватых елак, над якім завісла (усплыла) першая белая пеністая хмарка. Трапяткі, раскалыханы ветрам сад. Гарыць, адчуўшы сонца і раскалыхаўшы разеткі кветак, аранжавы кракос.
Цяжкі, непатрэбны ў гэтым мілым, прытомленым ранку гул самалёта.
У гародах з-пад шурпатага і вялікага, як паднос, лісця ўжо

вызіраюць доўгія, нібы парасяты, паласатыя гарбузы.
Ноччу — бясконцыя хваробы: галава, жывот, сэрца. Страшныя сны, ад якіх раз за разам прачынаўся і шукаў таблеткі. Але яны не ратавалі.

Дзённікі Караткевіча, знойдзеныя ў стосе вырваных часопісных лістоў, наіўныя, нібы ў школьніка, з доляй нейкага фантазёрства: “…пісаў ліст у ААН. Сёння Адамчык забраў яго”. Помніцца, ён аднойчы сказаў мне, калі дачуўся, што я паеду ў Нью-Ёрк на XXXVIII сесію Арганізацыі Аб’яднаных Нацыяў:
“Я напішу заяву на імя старшыні. Ты перадасі яе?”
“Перадам”, — сказаў я.
Але заявы я ўсё ж не дачакаўся і перад ад’ездам, у пачатку верасня, зайшоў да яго ў кватэру.
“Я перадумаў. Іншым разам…” — зніякавела і нават трохі збянтэжана адказаў ён.
Але гэта было ў 1983 годзе. Чаму гутарка ідзе ў 1982 годзе, мне не зразумела. Хто пераблытаў — публікатары ці сам Караткевіч? І ці быў, зрэшты, напісаны той ліст?
Як і астатняя частка “Каласоў”, пра якую не раз, асабліва пад чарку, гаварылася: “Нарэшце бяруся за “Каласы”.
Але здароўя, творчай моцы на іх ужо не засталося.
З яго біла, бурліла [срэбным] фантанам дзіцячая выдумка, [уздымала перлавым] наіўная фантазія. Ён, як дзіця, любіў неверагоднае: “Ты ведаеш, Чэсь, учора мы ездзілі ў Налібакі па грыбы. На лясной дарозе натрапілі на асінае гняздо. Яно так узарвалася, што задняе аўтобуснае кола разляцелася ўшчэнт”.
“Ну, Валодзя, як ты і жывы застаўся пасля хірасімскага ўзрыву асовага/асінага гнязда”, — засмяяўся я.
“Ты ксёндз, ты адносішся да ўсяго з недаверам”.
І [як] кожны раз, закрыўдаваў. Я заўсёды падсміхваўся з яго гіпербалічных неверагодных параўнанняў і выдумак: “сабака быў вялікі, як Брыль”, “Пшыркоў — гэта ж прыгонны майго дзеда”, “Ты ж не ведаеш, колькі па свеце раскідана маіх дзяцей. Дачку пара ўжо выдаваць замуж”.
16.00. Фуркоча мой самаробны флюгер. Паварочваецца з захаду на поўнач.
Ранкам раіліся вершы:

Двор глухі —

Крапіва, малачай.
Ад тугі —
Пераспелы адчай
Сноп тугі
На іржышчы чужым
Абцугі
Дум і слёзак іржы.
Валасы
Тонкай лёскай блішчаць <ірдзяць>.
Каласы… <Галасы>
Ацяжэлі, каб жаць
<Пад сярпом ляжаць>.

**Чацвер, 13 жніўня 1998 году.**
9.30. У чыстым сіняватым і глыбінным, як акіян, небе — адзінокі парашут — палавінка месяца. Павярнуўшыся бела-празрыстым купалам да сонца, ён плыве, зніжаецца на захад. А цяпер завіс над жоўта-залацістым аўсом і дальшым, прасвечаным у круглай кроне, прысадзістым, таўстаногім дубам.
Пасля светлай, з палавіны, месячнай ночы з вялікім і калючым ліхтаром Венеры, што ўзышла на ўсходзе адразу ж пасля заходу сонца, — росны, азыраваты ранак. +9°С. Не болей. Бо на мансардзе, дзе сплю, ноччу з-пад коўдры руку ці нагу высунуць было няможна — холад.
Прачынаючыся, перачытваў дзённік Глебкі з часу вайны. Калі аб'ектыўна ацэньваць, то больш праўдзівейшы, чым Танкаў. А ўслед за ім — запалітызаваныя, паўфальшывыя запісы з фронту Фадзеева. Чытаючы апошняга, ужо горка думалася: як усю праўду жыцця, пачуцці, развагі прыгнятаў шматтонны чыгунны сталінізм. Пісьменнік ператвараўся ў холадна-жорсткага камісара, рука якога трымала не пяро, а халодны, гатовы пырснуць куляй кожнаму ў твар, дрыготкі пісталет.
<…> 1934 год. Жылуновіч піша з Ленінграду:
"Я пісаў па-беларуску, і гэта зманіла мяне да супрацоўніцтва ў "Нашай ніве", у якой супрацоўнічалі, як пазней даведаўся, нацыяналістычныя элементы — цяперашнія нацыянал-фашысты і шпіёны дэфензівы на сродкі польскіх магнатаў…"
Цытаваць страшна, крыўдна, непамысна.

Ружовыя ці малочна-бурачковыя (гаштры) флёксы пахнуць густа-саладжавым цяплом нябожчыка. Цвіркат, нібы развітальны, белагрудых ластаўкаў. Гудзе, вуркоча, прападаючы, самалёт, і з дачнага блочнага, падобнага да хлява, дому б'е ў перапонкі ўзмацняльнік, даносячы тамтамы ўдарніка. Там усё шалее шпана, што збудавала шалаш у бярозавым гаі і сярод ночы пад вогнішча пастрэльвае нейкімі ўзрывальнікамі. Кажуць, што гэта ўнукі (байструкі) Клаўдзіі Лукашэвіч.

**Пятніца, 14 жніўня 1998 году.**

9.20. З шасці і да паловы дзевятай у чарзе і гутарцы з жанчынамі. Затое ўзяў два трохлітровыя слоікі малака. Яно цёплае, нібы ранішняга надою. Але, кажуць, перагнанае праз сепаратар, а потым ужо трохі разбаўленае вяршком. Фермер, як бачу, хітраваты, таму і сыценькі дзядзька.

Ноччу, як заўсёды, зноў пакража: з таварыства сувязістаў прыходзіў малады, як мне падалося, трохі на падпітку, коратка стрыжаны мужчына, грозячыся пабіць усіх падлеткаў. Жанчыны паказалі яму на будан, які збудавала ў гаі басатва і дзе яна збіраецца нанач.

А на тутэйшых сотках пакопана бульба. Ад зладзеяў не ўратавацца.

Мякка ўспырхваючы нават ад варонінага каркання, вакол азярца кружыць шаравата-чорная грамадка шпакоў. А каля іх — дразды, пеначкі, сітаўкі ўюцца.

Чапля з тонкаю цэвачкаю хваста, махаючы скобкамі шырокіх крылляў, ляціць над нашым домам.

Свіргатліва пацвіркваючы, грумадкаю — ажно дзевяць — над дачнымі садкамі і пацямнелымі шыфернымі дахамі імкліва лётаюць чырвана(кармінава)грудыя канаплянкі.

Знак восені — усё птаства ўжо сабралася ў чародкі.

Аднак тыдзень назад мухалоўка прывяла ў наш сад сівенькіх, толькі што апераных, жаўтаротых пташанятак.

Сінявата-сівае замурзанае неба — на змену надвор'я ў мяне несціханы боль ў скронях. Трэба шукаць таблетку цытрамону.

13.40. Пачаў церушыць дробны, невідушчы (невідочны) дождж і, покуль я палуднаваў, абрасіў часнок і цыбулю, якія я ў місах выставіў на вецер. Вось так падсушыў.

Лес, лагчына за аўсом — усё ў імжы, у тумане. Адкінуцца расці

грыбы. Толькі дзе мне іх збіраць — так далёка варакомскія пералескі — маладыя, пасаджаныя гадоў 25 таму хвойнікі. А ў старых замшэлых Пясках і Маргах так шмат прысадзістых карычневых баравікоў, асабліва па сівым чуйна-мяккім імху. Дождж нібы суцішыў боль галавы, але ці надоўга?

5-ы, яшчэ выданне "Бібліятэкі "Аганька", светла-блакітны, у лідэрынавай вокладцы, том Уладзіміра Караленкі. Шчыры, больш даверлівы і, вядома ж, больш інтэлігентны, чым, напрыклад, набокаўскі, артыкул такога ж самага ўкраінца ў расійскай літаратуры пра свайго папярэдніка і (земляка) суродзіча Мікалая Гогаля.

Цікавая, можа, знаёмая дэталь: у Расіі ўсё ці ўсе служылі: Дзяржавін быў губернатарам, Карамзін і Жукоўскі — царадворцамі, нават Пушкін не мог скінуць прыдворны мундзір і адышоў у магілу камер-юнкерам. Толькі Гогаль застаўся толькі Гогалем і нічым болей. Толькі пісьменнікам.

Услед за Гогалем пісьменнікі служылі толькі літаратуры: Тургенеў, Дастаеўскі, Талстой. Таму і быў яе залаты век. Сталін вярнуў скасаваны ў літаратуры прыгон. Пісьменнікі пачалі служыць зноў — то губернатарамі (сакратарамі абкомаў), то царадворцамі (членамі ЦК). Ды член Саюза пісьменнікаў — гэта ўжо служба на карысць цара і дзяржавы. Гогалеўскую "тяжкую, мучительную печаль" я перажыў у 1963 годзе, адпачываючы ў Гаграх, а потым, восенню ўжо, на Вышэйшых літаратурных курсах у Маскве. З жахам успамінаю гэтыя дні, 218 і 273 нумары пакояў у інтэрнаце на вуліцы Дабралюбава, дзе я жыў.

"Обмороков и столбняка", пра якія піша ў лісце да Пагодзіна вялікі самотнік Мікалай Васільевіч, у мяне не было, але нешта блізкае да іх я перажыў, помню — у Гаграх.

Перад сном, як у дзяцінстве, раслі, набывалі гіганцкі выгляд усе прадметы. У дзяцінстве я не баяўся, а, наадварот, чакаў гэтай з'явы, а ў трыццаць год ужо разумеў, што са мною адбываецца штосьці ненармальнае, і пачынаў, вядома, палохацца — валасы ўжо ўставалі дыба.

"Сумрачное чувство", пра якое піша Гогаль, я перажываў і ў студэнцкія гады, асабліва ў дні, блізкія да восені, у канцы жніўня, у надвячоркавую пару, варочаючыся дадому з якіх-небудзь гулянак. Я быў стараннім наглядальнікам танцаў на поплаве, акружаным рэчкай і старыцамі, што зарасталі лазою,

вербамі і алешнікам, чужой бяседы з чаркаю і падхмеленым рогатам, чужых абдымкаў… Мне падабалася прывабная маладзіца ў крэп-жаржэтавай лёгенькай сукенцы — жонка п'янага афіцэра ў фуражцы з блакітным аколышам — ці не лейтэнанта — лётчыка. Я крадком назіраў за ёю, высочваў усюды… Саромеючыся, вядома, спаткацца твар у твар.
І дадому ішоў з нейкаю апусцелаю душою.

**Субота, 15 жніўня 1998 году.**
8.05. З першага паверху ажно да мяне на мансарду падымаецца прыемны пах бліноў. Успамінаюцца вясковыя святы і нядзелі і пухкія на стале грэцкія аладкі. Частаванне мяне мёдам з аладкамі ў чарадзе дзяцей на цеснаватай кухні, калі ў святні дзень я прыходзіў да цёткі Настасі. Успамінаецца вялікі гадзіннік з меднымі гірамі на сцяне між вокнаў.
І калі на прадвесні 1940-га Янкавых (цётчын муж Янка Нагорны быў багацейшы ў нашай Варакомшчыне) вывозілі ў Акмолінск — ці не сённяшняя Акмала? — бацька паслаў мяне ў разграбленую ўжо хату, з голымі ложкамі, з нацярушанаю саломаю на падлозе, я найперш успомніў пра насценны гадзіннік і з радасцю шасцігадовага хлопчыка пабег туды, спадзеючыся зняць хоць адну медную гіру.
Але ў апусцелай сумнай хаце мяўкаў толькі каток — гадзінніка на сцяне не было. Зазірнуўшы на кухню, я ўбачыў у выбітай ніжняй шыбе кніжку, якую прыставілі заміж шкла. Я стаў каленьмі на лаву і выцягнуў бруднаваты польскі лемантар — ён аказаўся першай кніжкаю ў нашай хаце. Ці не з яго запомніўся верш Марыі Канапніцкай: "Ешчэ снежак прушы, ешчэ хлодны ранак".
Запомніўся і той сакавіцкі ранак з лёгкім замаразкам, з шорсткай намараззю на саламяных стрэхах і на шарай пясчанай вуліцы, атуленай бэзам і абкладзенай абапал замшэлымі валунамі.
З стрыечнымі братамі (двума з чатырох) я ўбачыўся толькі праз трыццаць чатыры гады.
Ні з цёткай Настасяй, што памерла ўжо ў Сілезіі (Польшчы вярнулі нямецкія землі, якія засяляліся палякамі, а разам і беларусамі з Сібіры, Казахстану і Заходняй Беларусі), ні з стрыечнай сястрою, маёй равесніцай, ні з дзядзькам Янкам, ні з

старэйшымі яго сынамі я ўжо не спаткаўся… Франак загінуў у прадмесці Варшавы Празе, дзе ішлі зімою 45-га ўпартыя баі, Уладак, прайшоўшы не менш страшнае пекла — Монтэ-Касіна, застаўся… Можа, яшчэ судзіць доля ўбачыцца з ім.

**Нядзеля, 16 жніўня 1998 году.**
Як трэба стрымліваць сябе ад гутаркі, асабліва ў транспарце — аўтобусе ці электрацягніку, — бо наўкруга цябе столькі дуроты — беларускай і наезджай расійскай.
Бо каму патрэбна твая праведнасць. Быдлу? Як нізка мы ўсе апусціліся. Дарэчы, гэта і ставіла за мэту расійская імперыя: растаптаць усё нацыянальна свядомае.
А я сказаў усяго адну фразу:
— Я не магу глядзець Беларускае тэлебачанне. Уключыш тэлевізар, а там — альбо вусы, альбо камбайн.
— А без вусоў не пражывеш! — абярнуўся тлусты лысаваты мужчына.
— Ну чаму? Я вось, напрыклад, не нашу і жыву.

**Пятніца, 21 жніўня 1998 году.**
Нездароўчасць — болем і звонам напоўненая галава.
У хваробах сваіх я вінаваты сам — цягнуся да чаркі. А трэба пакінуць піць, як пакінуў курыць. Не куру ўжо роўна дваццаць гадоў.
Зрабіцца вегетарыянцам для мяне было б лішнім, а ўстрымацца ад гарэлкі я мус. Бо іншы раз напіваюся да страты прытомнасці. Як гэта здарылася летась ці пазалетась, калі я ўпаў на стэлаж. Але самы найгоршы — кілішак для здароўя, які рэкамендуюць нават дактары.
Адкаснуцца трэба ад усялякіх кілішкаў і чарак.
Віна і піва я не ўжываю, калі не лічыць паездку ў Малдову, дзе піў кабернэ.
22.00. Гадзіну назад мы з Міраславам вярнуліся з яўрэйскага пограбу на пляцы Волі. Праседзелі доўга, чакаючы — я — курынае філе, ён — нешта бразільскае (валовіну з фасоляй).
А ў нас за спіною дзеразаваліся, свісталі, рагаталі і галёкалі тоўстыя, як парсюкі на пудоў дванаццаць, няголеныя і нямытыя маладыя свінабоі.
Няма ў Мінску зацішнага кутка. Наўкруга брыда, рэспуст і лукашэнкі.

**Аўторак, 25 жніўня 1998 году.**
Украінскае “грае ў футбол” адпавядае і нашаму варакомскаму “граць у мячыка”.

**Пятніца, 28 жніўня 1998 году.**
Гудзе (як) свіння.
Кабыла паліцца.
Авечка міркітуе.
Карова бегаецца (ажно плынь цячэ).
Сучка палюе.
Кошка марцуе.
Трусіха...
Зайчыха
Ваўчыха

Новая хата пахла жывіцаю (смалою)

Жыжа (жыжка) — вогнішча, агонь.

Кабета, чыстая, акуратная, з ружовымі палатнянымі торбачкамі, сівавалосая; напалову рас., напалову бел. гутарка: — Муж памёр. Засталася з дваіма дзецьмі. І выгадавала. Не хопіць грошай — у выхадныя раблю. А ў Расіі — гультаі. Усё быллём зарасло. Лянуюцца нават агарод пасадзіць.

Наша варакомскае слоўца, якое ўжываў нябожчык бацька, — “збыт усяго” — знайшоў у славенскім (славацкім) слоўніку — zbytok (zbytkovy) — звышак, лішак.
Тут жа ўспомнілася і вытворнае ад яго — “збыткуе” (дарма, лішне траціць).

**Аўторак, 1 верасня 1998 году.**
9.30. 1. Івана (Яся) Міхайлава Адамчыка з вёскі Аханяны сын Іосіф (Язэп), 1902 нараджэння, у 1953 годзе браў метрыку (ці не выпіска з Дзятлаўскага архіву ЗАГС).
9.30. 2. Віктар Захар’еў Адамчык. Дачка яго Агаф’я радзілася ў 1891 годзе. Ці не Вітук Адамчык, што даводзіўся (прыходзіўся) майму дзеду Тодару дзядзькам. Як і Міхал (Міхалка) Адамчык.

Яны абое, Віктук і Міхалка, былі роднымі братамі Янку Адамчыку, які прыйшоў у прымы на Аблажэяў участак (Іосіф Аблажэй, Варакомшчына), і Алесю (Аляксандру, 1838—1919), якога Янка паклікаў з Аханянаў на багатую варакомскую гаспадарку сабе ў помач.
На ўчастку Адамчыкаў у Аханянах (суседняя вёска за 3 км ад Варакомшчыны) стаіць ужо хата нейкага Бадзюка.

**Серада, 2 верасня 1998 году.**
7.20. Дзённікі Панчанкі ("Полымя" №7, 98) — шчырыя, нават запальчывыя. І як рэфрэн — дамешак газетнай публіцыстыкі. І шнуркі імёнаў, нібы вязанкі сушаных грыбоў. Сярод іх нямала чарвівых.
Не кажу пра тое, што ён трохі сталініст. Як і шмат хто з яго пакалення. Бацьку крыўдзіць яны не дазвалялі. Боязь перад сталінскім ботам у іх засталася, як застаецца нарасць на губе, калі чалавек разаб'ецца дзіцем.
Хоць невядома, чаго тут болей было ў іхняга франтавога пакалення — боязі ці прызвычаенасці, нават да крыві і жорсткасці. А можа, трохі салдафонства — зманвала моц улады, неабвержанасць загаду, хоць і неразумнага. Не выпадкова, што яму іншы раз хацелася, каб усяўладная рука ў рудым рабацінні стукнула па стале.
І ўсё ж вершы яго я найболей любіў і найболей ведаў іх на памяць. "Гарачыя вятры", помніцца, выменяў на салідны дарэвалюцыйны фетаўскі том.
Я цаніў беларускае вершаванае слова. І маладую іскрыстую паэзію Пімена Панчанкі. Ён для мяне, калі гаварыць па шчырасці, і застаўся паэтам "Гарачых вятроў".

**Панядзелак, 21 верасня 1998 году.**
Колеры: папялова-шэры. Як перад змярканнем было неба. Шарая гадзіна. А цяпер неба сіняе, і сінявата-ліловая чарната пры зямлі.
Жары — ясна-чырвоны, агністы
Мурагі — цёмна-шэры (аб карове)
Мурагі — паласаты (украінскае)
Расовы бык — пляменны
Руно і рунь — адно і тое ж?
Руністы — кучаравы, руністы — зялёны

Дэраш — пёстрый — стракаты
Цагляны
Бэзавы — фіялетавы
Цытрыновы
Крэмавы
Гранатовы — сіні?
Папяловы
Сівы
Цёмна-шары
Ультрамарынавы
Палова
Рудая
? цьмяна-ружовы
Масць коней:
1. Сівы — шэры (серый)
2. Руды — цёмна-чырвоны
3. Гняды — карычневы.
Карова:
Палавая
Пярэстая
Коні:
Каштанавы, буланы
Мышак — сам сівы, а спіна чорная
Ластаўка — карова (чорная, а жывот белы)
Вішня — чырвоная
Зорка — на лобе
Падляска — <як похвы белы, а само чорн>
Каштан — чырвоны
Гняды — чырвоны і чорны, цёмна-чырвоны
Шпак — белы з сівым
Буланы — жоўтай масці

**Серада, 23 верасня 1998 году.**
Калі вярнуцца ў год 1939-ы, то і я помню збой людзей на ганку перад магазінам. Мяне, шасцігадовага, бацька ўзяў у мястэчка, каб глянуць, ці ёсць аконнае шкло, — перад самай вайною, ашчаджаючы і аддаючы апошні грош, бацькі будавалі хату, каб праз год ці паўтара яна была падпалена нямецкім запальным снарадам, што прашыў адразу некалькі стрэх.
Тады ў нашай хаце з'явіліся парусінавыя блакітныя туфлі, соль

і — кавалак рудаватага мыла. І нас, малых дзяцей, пачалі збіраць да солтыса ў хату на ўколы і прышчэпкі… І папяровыя анёлкі з кучаравымі галоўкамі і блакітнымі крыльцамі. Быў ужо разграблены местачковы касцёл і ксяндзоўская плябанія. Матчын сваяк, утапіўшы ксяндза, хадзіў у ксяндзоўскім паліто на футравай падкладцы. Ён быў ці не старшынём сельсавету. Соловый — па-расійску — жаўтаваты.
Насалавелі вочы — мутныя сталі

**Аўторак, 3 лістапада 1998 году.**
Разгортваю Жылку. Блізкія выразы, словы і метафары, якія ўжывала маці. А вершы здаюцца слабаватымі, заквечанымі, там-сям пераймальнымі.
Прыгадваецца шэрая, кішаньковага фармату, яго кніжачка — віленскае перавыданне зборніка “На ростанях” 1945-га, калі не памыляюся, году. Маё першае падлеткавае знаёмства з не ўспомненым у школьных падручніках, жорстка/злосна, бязлітасна выкрасленым энкавэдзісцкаю рукою з літаратурнага ўжытку святым імем паэта. Іх набіралася ўжо шмат у маёй скупой бібліятэчцы, што змяшчалася на кароткай палічцы тумбавага карычневага шкапчыка з вырваным замочкам: Арсеннева, Гарэцкі, Антон Навіна, Вінцук Адважны, Адам Станкевіч. Казіміра Сваяка з Алесем Гаруном ведаў толькі па адным няпоўным вершы. Як і Алеся Салаўя — па скупой падборцы ў часопісе “Новы шлях”.

**Пятніца, 6 лістапада 1998 году.**
Ідзеш праспектам Францішка Скарыны, як ідзеш заштатным, павятовым горадам Расіі — наўкруга расійская мова і ўсе транспаранты над вуліцай напісаныя па-расійску.
Сіпаты в<…> вынішчае даастатку ўсё нацыянальнае. Коштам (цаною) Беларусі намагаецца ўшыцца ў маскоўскі Крэмль. Пры нашай пакорнай згодзе і тупой абыякавасці мы папраўдзе можам стаць Северо-Западным краем.
Няўжо выродзіліся Грынявіцкія?

Для апавядання
Што ёсць сшыткі з белай, нават з сінявата-белай, без стрэмак, паперай, мы ўбачылі, адкапаўшы ў смецці і друзе, выкінутым

на двор з яўрэйскіх хатаў, калі яўрэйскія сем'і зганялі ў гета, па польскіх, як тады называлі (казалі), зэшытах. Мы выбіралі спісаныя да палавіны, асабліва па арыфметыцы ў двайную клетку: у большым квадраце змяшчаўся меншы, выдзелены гусцейшай фарбай. Сшыткі былі з яркімі чырвонымі палямі. Гэта нас зайздросна здзіўляла.
Там жа, на падворках, у грудах паперы і купах лахманоў, у друзе бітага посуду валяліся загадкавыя кніжкі з незразумелым, нечытэльным густавата-чорным, нібы знарок крыўленым і ламаным, шрыфтам.
Я выцягнуў з-пад смецця, узрадавана схапіўшы за кончык, чорную скураную папружку, але чамусьці без спражкі, а з усечаным конусам-калодкай, абабітай гэтым жа самым чорным скурацікам. Але ўсё ж пахваліўся:
— А во — папружку знайшоў.
— Гы-гы, — зарагатаў таўстагаловы, з пляскатым носам, старэйшы за нас усіх Стась Нагорскі. — Гэта ж жыдоўскае багамойла. Выкідай.
Але я моўчкі, скруціўшы чорны скураны пасак з калодкай, зацiснуў у кулаку.
Стасевыя кішэні адтапырваліся ад чарачкаў і кілішкаў. Ён ускараў праз выбітае акно ўскочыць у хату да буфета, падпільнаваўшы, калі паліцыянт па пільнай патрэбе схаваўся ў дашчатай будачцы з двума ромбікамі, што стаяла ў глыбі двара. Малады рослы хлопец, здаецца, яшчэ без уніформы, у хатнім шарачковым пінжаку, у дзюбатай кепцы, дагнаўшы ўжо на вуліцы, доўгаю/чорнаю гумаю, а дакладней, канчаром адсечанага кабелю два разы аперазаў сутулаватую Стасеву спіну. Стась ад моцнага і нечаканага ўдару ажно прысеў.
— Ну, Саладуха, пачакай, — Стась, мусіць, ведаў паліцыянтаву мянушку і гразіўся ціханька здалёк, не падыходзячы болей да прыгожага, на высокім падмурку і выфарбаванага ў карычневы колер дому маленькага Давідоўска[га], уладальніка тартака і дравяных прыстанцыйных складаў, самага багатага яўрэя ў мястэчку. — Сам, нябось, золата нагроб.
Стася злавілі. Напіўшыся на вяселлі, ён спаў у возе каля гумна. На гэтым возе яго і прывезлі ў атрад. Стась потым ужо пахваліўся, што гэта яго брат падпільнаваў Саладуху. На кухні бабы прывязалі да хвойкі галавою ўніз і сталі падпякаць. Стасеў брат не ўцярпеў і застрэліў яго.

21.00. У “Люстэрку” ці “Падробнасцях” разумнае, чалавечае інтэрв’ю Дзмітрыя Ліхачова. Яго словы: дзіўна і страшна, што царква (праваслаўная) падтрымлівае стварэнне піянерскай арганізацыі. Страшна і дзіка: праваслаўе даўно ўжо энкавэдзісцкая павучыная арганізацыя.

**Субота, 7 лістапада 1998 году.**
У Нью-Йорку мяне некалі здзівіла колькасць людзей, асабліва пажылых жанчын, у інвалідскіх каляскаx. У пагодныя светлыя дні кастрычніка, яшчэ пяшчотнага і цёплага там, іх выкочвалі маладыя шакаладныя негрыцянкі. Накрытыя пледам, апранутыя ў дарагія норкавыя футры, зморшчаныя, сухенькія бабці ў модных капялюшыках сонна жмурыліся, падстаўляючы бяскроўны твар ласкаваму сонцу, якое яны, пэўна, і мала бачылі, лежачы з дня ў дзень на шырокай канапе ў наглуха закратаванай/заблакіраванай кватэры.
Тут, у Мінску, мяне дзівіць і глыбока, непамысна ўражвае колькасць людзей з чырвонымі сцягамі, што насустрач парыўнаму ветру і сцюдзёнаму дажджу са снегам, прыспешваючы, ідуць/ідзе праспектам да чорнага помніка з чорнаю працягнутаю рукою.
А ці ведае, дзеля чаго і куды ідзе, прымусова выгнаная на дэманстрацыю студэнцкая моладзь?
21.25. Многія (шмат якія) людзі зніклі з майго гарызонту: Алесь Наўроцкі, Мікалай Тычына, аднакурснік. Летась я іх ледзьве не штодня сустракаў на праспекце Скарыны. Дзе яны? Ці жывыя хоць? Як і Сцяпан Міско, зямляк, слонімец.

**Аўторак, 10 лістапада 1998 году.**
Учора перад сном я ўспамінаў свае дзесяць год. Яны чамусьці аказаліся самымі выразнымі і памятнымі. Ці таму, што я ўжо сталеў, ці таму, што вайна набывала свой самы жахлівы, смяротны пік (шчыт). Усюды ішоў разбой: ноччу партызаны падпальвалі местачковы тартак, склады пры чыгунцы, дэпо вузкакалейкі, удзень немцы, зрабіўшы аблаву, арыштоўвалі і стралялі людзей, палілі вёскі, куды вёў партызанскі след. Гінулі падлеткі з суседніх дамоў у Наваельні, дзе мы, пагарэльцы, кватаравалі. Іх стралялі немцы і партызаны, помсцячы за бацькоў.

**Пятніца, 13 лістапада 1998 году.**
Аер — ад запалення мач. пухіра (посіка), малярыі (трасцы), жаўтачкі.
Бурачнік — ад бяссоння, нерваў, узбуджанасці.
Буквіца (Betonica) — ад запалення посіка.
Валяр'ян — ад нервавай узбуджанасці.
Васілёк — ад запалення нырак і посіка.
Гарыцвет (адоніс) — ад павышанай нервовай узбудж.
Душыца — ад бяссонніцы, нерваў.
Жаруха ? — ад запалення посіка і жоўці.
Гравілат — ад хваробы скуры.
Цыкорыя (мацаўнік) — ад сыпкі (сыпу) на скуры, вугроў...
Грыжнік — ад хваробы нырак і посіка.
Доннік — ад закупару венаў, боляў у посіку.
Душыца — ад хваробы нерваў.
Суніцы — ад пігментных плямаў.
Медуніца (смактуха) — ад хваробы посіка.
Мыльнік — ад лускавога лішаю.
Мята — ад непрыемнага паху з роту.
Авёс —
Расходнік — ад трасцы (малярыі).
Чарада — ад алергіі (скуры)
Чыстацел (цыліндра) — ад экзэмы.

**Субота, 14 лістапада 1998 году.**
6.10. Ужо грукае пад домам электрацягнік метро. Коратка. Як узнікае раптоўна, так і раптоўна знікае. Нібы ўпала некалькі валуноў.
Малая дзяржава, а колькі фанатычнай самаўпэўненасці, маніякальнага гонару ў кіраўніцтве. А ўсё ідзе ад шэрасці, хамства, неадукаванасці. І таму пачынаецца працэс заканамернага вяртання ў сталінскую эпоху — бяспраўя, галечы і духоўнага ўціску. Вяртанне туды, дзе мы раней не жылі, а існелі.

**Нядзеля, 15 лістапада 1998 году.**
У дзённікавых запісах Тодара Дастаеўскага (т.24, стар.113): "Усялякая цывілізацыя пачынаецца з разбэшчанасці (распусты). Прага нажыцца. Зайздрасць і ганарыстасць..."

У нас, у Беларусі, здаецца, усё ёсць — і распуста, і жаданне найболей мець, і помслівай зайздрасці нямала, і хамскага, напышлівага гонару даволі, а ці пачнецца цывілізацыя?
У каго, у якіх дзённіках пра тое прароцтва вычытаць?

**Серада, 18 лістапада 1998 году.**
16.30. Сёння, ідучы на тралейбусны прыпынак, нечакана пахіснуўся. Гэта я заўважыў тады, калі мяне аднесла ўбок. Ногі нібы падагнуліся, і я ледзь устояў, усведамляючы, што зараз упаду. У вачах пацямнела. Я паспрабаваў ступіць яшчэ адзін крок, і мяне зноў, як п'янага, закружыла. Да сэрца падкраўся нават страх. І я стаяў колькі хвілін, чуючы лёгкі шум у галаве, на тратуары насупраць гастраному пад гадзіннікам. А потым ужо разам з натоўпам паволі рушыў на зялёнае святло святлафора — што будзе, то будзе.
Падымаючыся з падземнага пераходу на паркавай магістралі, зноў учуў лёгкі шум у галаве. А ў выдавецтве нібы забыўся пра яго: там галаву затлуміў клопат з выданнем кніжкі.
Цяпер пішу, нібы абязвечаны ці, праўдзівей, аглушаны, гэтым здарэннем.

**Пятніца, 20 лістапада 1998 году.**
Сёння ўзгадваў нашыя варакомскія ўрочышчы, што зараслі маладым трыццацігадовым хвойнікам, і тыя дарогі, што ён ужо назаўсёды ўкрыў... На голым грудзе, заўсёды ветраным, што называўся Юрашчай (ад слова юр), таксама вышугаў калматы грыбны лясок. Старое, даўняе ўсё адышло — дарогі, дрэвы...
На ўклейцы ўжо старажытнага "Нового мира" сярод подпісаў членаў рэдкалегіі, супрацоўнікаў і аўтараў часопісу два подпісы ад беларусаў — Аркадзя Куляшова і Васіля Быкава. Першы распісаўся па-беларуску — Ар. Куляшоў, другі па-расійску — В. Быков.
Нібы дробязь, а шмат значыць: хто, дзе і як распісваецца. Хто помніць, што ён беларус, а хто — не.

**Субота, 21 лістапада 1998 году.**
Памяць вярнула яшчэ ваенную зіму 43-га ці 44-га году, школу ў пабеленай хаце з чорным гонтавым дахам, нашу пагарэлую вёску і амаль штодзённую дарогу ўздоўж незамерзлай рэчачкі, незамерзлых сярод белага снегу крыніц, над якімі, як над

гарачым катлом, курылася ружовая пара, а на іхнім дне, нібы ў бочках ці кадушках, расцягнуўшы лапкі, ляжалі сонныя жабы. Іх было шмат.
Нехта з нас спрабаваў, выламаўшы пруцік, яшчэ намагаўся хоць адну з іх дастаць і выкінуць на снег.
Па гэтай дарозе ў школу іншы раз траплялася яшчэ адна жывая істота — прыручаны, казалі, немцамі чорны грак. Ён сядзеў на высокім дашчатым плоце з трыма калючымі драцінамі, што абкружаў ужо спалены партызанамі тартак, і хрыплавата, галодна каркаў, просячы ў нас хлеба. У рукі дзюбаты чорна-ружовы грак не вельмі даваўся — палахліва адлятаў. Падпіхаючы каго-небудзь [з] спрытнейшых, мы клалі хлеб на слупок плоту.
Не меней, як прыручаны грак ці сонныя жабы на дне крыніцы, нас цікавілі і старыя вуллі ў занядбаным, вымерзлым садку з гарбаю засыпанага снегам пажарышча. Хату спаліў не помніцца хто — партызаны ці немцы, — гаспадар, калі застаўся жывы, недзе пераехаў, пакінуўшы дзве старыя рассохлыя калоды з пчоламі. Яны, гэтыя карычнева-цёмныя скурчаныя істоты, яшчэ варушыліся ў шарых, патрэсканых і пахучых вуллях з выдранымі верхнікамі. Нехта ж, пэўна, выдзіраў воск. Адкалупвалі яго і мы і падбіралі калючыя шчоткі пустых сотаў. Як сённяшнія бамжы, мы абягалі нямецкія сметнікі. Бліскучай фольгаю ад чакалядаў і прыгожымі пустымі пачкамі ад цыгарэтаў нас прываблівaў той, што быў за дашчатым туалетам пры хлявушках рабой ад зялёных па белай сцяне мазкоў гасцініцы з кулямётам на адзіным ганку другога паверху.
Мы, дзеці, у вайну былі не менш галодныя і недагледжаныя, кінутыя на самапас, як гэтыя пакурчаныя ад холаду пчолы.
Не менш цікаваю была і вялікая, гарбатая, з апушчаным хвастом, чорна-рабая пава, якую насатая гаспадыня іншы раз, асабліва ў адлежныя, цяплейшыя дні выпускала з белага атынкаванага хлеўчыку.

**Панядзелак, 23 лістапада 1998 году.**
Першы раз чую, але ўспрымаю як сваё, нашае слова “выніклі” заміж “знікалі” (Ваўкавыск). “Хрушчы выніклі — пазнікалі ўжо”.
І ўсё ж заміж “сіпаты” трэба пісаць “хрыпаты”.
Ахрып.

Хто-та — нашае. Заміж хтось ці хтосьці.
Худзізна.
Конь худы, дык хоць куды: пастаў хоць дзе — ніхто не ўкрадзе.
Хупаць на акрэплыя рукі. Варакомшчына.
Не ведаў: горшая зямля аўсом засявалася, лепшая — жытам і ячменем.
Хцівы — сквапны.

**Серада, 25 лістапада 1998 году.**
Свякрова не матуля, дзіця не прытуля.
У расійскіх дыялектах і жаргонах, нават у лагернай песні "Товарищ Сталин, вы большой учёный", сустракаецца слова "евонный", але ж рускія моваведы не ўносяць гэты займеннік у фонд літаратурнай мовы, а ў нас два дыялектныя слоўцы "ейны" і "ягоны", як блізны на палатне ў дрэннай ткачыхі, застракацелі ў публіцыстыцы і прозе маладзейшых літаратараў. Як і паланізм — напрыканцы. Толькі ж як спяваць вядомую беларускую песню "Шумяць вербы [ў] канцы грэблі".

**Пятніца, 27 лістапада 1998 году.**
У "Народную волю", што туліцца ў падвале, занёс (учора) 15 старонак з "Чорнага адбітка". Газета, як відаць па апошніх нумарах, прачытаных мною, даволі непісьменная. Ажно каюся, што заманулася надрукавацца на яе старонках.
Здароўе ўжо растрачана. Самапачуццё найгоршае. Ноччу — болі, калаццё ў правым боку. Не павярнуцца — кружыцца, як у п'янага, галава. Гараць калені. Шкодзіць гарэлка, у якую ўжо добра ўцягнуўся альбо, як казала нябожчыца маці, уружыўся. Збіраемся з Нінаю ў санаторыю — Міраслаў купіў дзве пуцёўкі. У аўторак, калі АВІР верне пашпарты, бо яны там, едзем у Брэст, а адтуль — у Жабінку: санаторыя "Буг" поруч з гэтым мястэчкам.
Не ведаю, якія могуць быць лекі і харчы пры сённяшняй разрусе, высокіх цэнах і нястачы тавараў. Расія ўцягнула Беларусь у эканамічную прорву. Каб купіць сабе і мне бялізну, Ніна аб'ездзіла ўвесь Мінск. І прадаюць не больш як па дзве пары, нават трусы і майкі.
Марную час — перачытваю вершы Танка, ацяжэлыя ўжо, як сырыя калоды, ад яго ўзнагарод, званняў і бясконцых

афіцыйных паездак за рубеж. Некалі звонкія, як узнёслая сасна, цяпер яны глухія, папраўдзе, нібы адсырэлыя пні. Падкупленыя, прынаджаныя ўладамі, яны абодва з Панчанкам нечакана аглухлі і ахрыплі, страціўшы і велічную адвагу паэтаў, і чалавечую прыязнь і шчырасць, ураз ператварыўшыся ў ссутуленых баязліўцаў.
Паэту, мусіць, патрэбна турма не толькі на пачатку дарогі, але і ў канцы яе. Ад сытага жыцця жырэе сэрца.
15.05. Недзе ў дзённікавых запісах, напэўна, гэта ёсць, але перапішу з лістка, які знайшоў у архіўных паперах. Было два га[ды на]зад: кастрычнік, восень. Я варочаўся з Наваельні ў Мінск. Сеў на спадарожны дзятлаўскі аўтобус, у якім аказаўся Грышан, былы настаўнік з раготнянскай школы. Ён, расхрабраны ад чаркі, з пахвальбою расказваў, як яшчэ школьнікам — ці не ў Баранавічах? — са сваім сябрам у клубе парэзаў партрэт генералісімуса, праўдзівей, выразаў усе ордэны, а сябра крамсаў Леніна. Іх не злавілі. Хоць усіх вучняў класу выганялі босымі на мароз. Але хто зрабіў такое, усё ж не даведаліся.
Расказаў ён і пра нашага агульнага знаёмага Сяргея Лазовіка. Бок, сярэдзіна ў яго балела. Памёр чатыры гады назад ад цырозу печані (1992). 40% пенсіі палучаў. Жонка (бухгалтар) таксама піла. Ёсць дачка. Быў інспектарам (Дзятлава), потым працаваў у школе-інтэрнаце, нарэшце — у васьмігадовай школе ў Жыбартах.
І нарэшце пачалася доўгая да нудоты п’янаватая гутарка пра сябра, што пахіліўся па бензапілу і зарэзаўся.
Дарога была запамінальная, праз бярозавую замець, міма зялёнай руні, чорных згалелых садкоў са светлымі яблыкамі. Чырвоны “Ікарус” з таблічкаю “Дзятлава — Мінск” у выпуклым лабавым шкле. Сілікатна-блочная Наваельня падтаптала ўжо нашае варакомскае поле. Чароды дэрмацінавых падлеткаў каля аўтобуснай станцыі. Цыгарэткі ў зубах. Над торбамі з семечкамі — бабулі. Лёрця з гранёнаю шклянкаю ў руцэ. Насата-надзьмутая братавая ў стоптаных чаравіках. П’яны настаўнік запрашае зайсці глянуць на хворую жонку. Сельсавет. Успаміны. Пахілены, струхлелы дом насупраць. Потым — “Ікарус”, а ў ім — настаўнік з Раготнай, мясцовы паэт з дзвюма пакоўнымі цяжкімі сумкамі. Напэўна, свежыны, якую вёз у Мінск сваім дочкам.

*Публікацыя*
*Уладзімера Адамчыка*

[image]
[image]

**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу №5–2003
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/12/14**
[image]

# Алесь Мемус
# Вецер і сьпераду, і ззаду

**Р**эпутацыя літаратурнага баламута дазваляе Адаму Глёбусу ўжо ня першае дзесяцігодзьдзе трымаць на сабе ўвагу літаратурнай публікі. Больш за тое, яго аўтарская манера ў каламуці (выбачайце, слова вельмі ж прыгожае) сучаснага беларускага пісьменства з гадамі, здаецца, набыла пранізьлівую вастрыню, што часам коле вочы і вярэдзіць слых як яго прыхільнікаў, так і яго нібы нядобразычліўцаў. Спадзяюся, шаноўны чытач заўважыў гэтае “нібы”, бо і адвярнуўся бы ад Глёбуса — не, як магнэсам цягне ня толькі зірнуць, але і пацешыць вока яго прысутнасьцю. Вось жа і Павал Абрамовіч ня вытрымаў і зноў прыцягнуў увагу да Адама Глёбуса.

Дэпрэсія сп. Абрамовіча (гл. “ARCHE” — “Праўда Адамчыкаў”, №4, 2003 г.), “люцейшая за тую, што пакінула сьмерць Быкава”, на мой погляд, альбо перабор у сродках выразнасьці, альбо недабор у разуменьні іх. Чытаючы натурныя замалёўкі (як Вячаслава Адамчыка, так і сына яго Ўладзімера), я ніколі не адчуваю ня толькі дэпрэсіі, але цешуся вастрынёю выяўленчага дару абодвух. Згадзіцеся, вострая цікаўнасьць да блізкага (хай нават прасторава) ужо ніяк ня знак абыякавасьці да яго. Што ж так прыцягвае мастака да сябе падобнага? Бясспрэчна, гэта рысы выразнасьці аб’екта творчага дасьледаваньня, яго неардынарнасьць, але вырашальным тут

бывае нябачнае вокам скрыжаваньне энэргетычных палёў. Калі побач вісяць скуры пантэры і гіены, і ад залішняе блізкасьці поўсьць вылазіць з аднае і другое...
Публічнае існаваньне гэткага жанру як бы “завочнай” рэфлексіі творцы аб творцу — наш добры набытак, які разьвейвае “затухлую” атмасфэру ў грамадзтве. Памятаю студэнцкі тэатар сатыры пры Віцебскім унівэрсытэце, які карыстаўся незвычайнай папулярнасьцю як у саміх студэнтаў, так і выкладчыкаў. У апошніх інтарэс быў асабліва абвостраны, бо каронным нумарам тых вечарынаў была менавіта сцэнічная сатыра на іх саміх. Заля калыхалася ад захапленьня, а некаторыя прататыпы “пэрсанажаў” тых відовішчаў часам хапаліся за валідол. Мяне ўразіла рэпліка жонкі аднаго калегі, які зноў (як і раней) застаўся па-за ўвагаю студэнцкіх кепікаў. Расчараваная, яна неяк безнадзейна прамовіла ў бок мужа: “Шэрая ты асоба, мілы мой, калі студэнты не заўважаюць твайго існаваньня...” На твары ейнага мужа праступілі сьляды дэпрэсіі (гл. дэпрэсію паводле Абрамовіча).
Дык, шаноўныя нядобразычліўцы Адама Глёбуса, ці забойца ён, ці даравальнік жыцьця?

Вось паспрабуйце пераказаць словамі ўжо славутыя шаржы сп. Кукса, скажам, на Бугаёва, Вайняровіча, тых жа Гніламёдава і Зуёнка (у Кукса ён не нагадвае, як у Вяч. Адамчыка, нават Валошына), Мысьліўца, Шаўні, Шамякіна... Вы атрымаеце нешта больш “абразьлівае”, чым пэрсанальныя партрэты з “Сучасьнікаў” ці замалёўкі з натуры аўтара “Дзёньніка 1998”. Відаць, справа ў тым, што маляваны шарж даўно ў нас жанр клясычны, а вось шарж літаратурны, так бы мовіць, яшчэ немаўля. Немаўля, але кусаецца — во зараза!..
Мастакоўскі дар Адама Глёбуса, відаць, і справакаваў яго “Сучасьнікаў” (цыкл друкаваўся раней пад вельмі трапнымі назвамі “Нашы тутэйшыя”, “Цёткі”). Што ж тычыцца “візуальнае” адоранасьці яго бацькі, раю яшчэ раз перачытаць той самы “Дзёньнік 1998”, каб пераканацца ў каляровым багацьці сьвету ў Вячаслава Адамчыка. Гэты дар “злыдня” Адамчыка — ці ня знак яго любові да зямнога, якую крытык Абрамовіч так недарэчна паспрабаваў звузіць да абсурду.
У шаржы-сатыры, як маляваным, так і слоўным, мяжа паміж прыязным і варожым бывае вельмі хісткаю (як цярпімасьць

кожнага з нас да крытыкі). Успрыманьне гледачом-чытачом мае тут сваю спэцыфіку, калі ацэньваецца не мадэль (аб'ект), што прыцягнула ўвагу мастака, але выяўленчае майстэрства творцы. Хваравітае ўспрыманьне шаржу яго правобразам ці блізкім яму чалавекам — знак недаразьвітасьці бачаньня твору, яго выяўленчых сродкаў. Вось тут і прарастае эфэкт "абразы", бо абражаны перакідвае ўвагу з твору на сябе. Яму няўцям, што ён быў толькі носьбітам вобразных рысаў, што натхнілі сатырычны дар мастака. Але ў слоўным шаржы (сатыры) прысутнічае яшчэ і гучаньне выяўленчае палітры (і ёсьць словы, страшнейшыя за пісталет...). Творца захапляецца гэтай забойчай сілаю слова і, бывае, пераходзіць мяжу "дазволенага". І бяскрыўдна сьмешнае для аднаго бывае амаль сьмяротным для іншага! Вось жа Абрамовіч цытуе: "дрыготкія рукі Зуёнка", "тонкія губы Бураўкіна", "сьнежнага чалавека, шыракаплечага і грузнага Гніламёдава", "каратышку Іпатаву"... Але паспрабуйма выправіць "абразу" і ўявім гарэзьліва-таўстагубага Бураўкіна, цыбатую бамбізу Іпатаву, вузкагрудага слабака Гніламёдава, Някляева, што кідаецца наўцёкі ад прывабнае кабеткі... Што, палягчала? Тонкае ёсьць тонкім, шырокае шырокім, а прывабнае — нясьцерпна прывабным.
Цяжка намаляваць нас горшымі, чым ёсьць мы на самай справе. Ну а тым, хто зробіць нас (хай на хвіліну) цікавымі для іншых, раю быць удзячнымі, а то выходзіць зусім ужо сьмешна: такі я добры, а яны... Беларуская традыцыя шанаваньня "знакамітасьцяў" як "жыхароў неба" абяскровіла нашу літаратуру. Ці не таму "Сучаснікі" Адама Глёбуса чытаюцца з такім азартам, бо робяць з "мумій" нешта яшчэ абнадзейліва жывое.

Шмат што і шмат каго Вячаслаў Адамчык выкрасьліў ці абмінуў увагаю як нявартае ўвагі. Тых жа, хто застаўся ў яго "Дзёньніку" (пакрыўджаных асабліва), трэба павіншаваць, бо вартыя ўвагі і застануцца жыць. Як ні дзіўна, супрацьлеглыя высновы ў адрас аднае асобы збольшага бываюць праўдаю. І адны, і другія. Хто, скажыце, ня чуў у свой адрас: сволач, падонак, хам..., а разам з тым: любачка, мілы, найлепшы!..
І вось жа! Аб'ект гэткіх парадаксальных вызначэньняў падсьвядома прымае і адно, і другое, бо па прыродзе ён і такі, і гэткі. Выбар Вячаславам Адамчыкам пэрсаналіяў дзёньнікавых

рэфлексіяў вызначалі драматызм жыццёвага кантэксту і атмасфэра апазыцыйнасьці грамадзкаму ладу жыцьця. Аблога, у якую патрапіў ён і яго блізкія (гл. запісы дзёньніка), пагаршэньне стану здароўя, разбурэньне вынашаных жыцьцём і творствам ідэалаў абвастрылі яго ўспрыманьне тых, хто напаўняў ягоную жыцьцёвую прастору. Падзел на сваіх-чужых у гэтым выпадку непазьбежны.

Сёньня, калі паміж Вячаславам Адамчыкам і многімі яшчэ жывымі яго сучасьнікамі пралёг пэўны пласт часу і боль пісьменьніка (схаваны адыходам) не вярэдзіць суайчыньнікаў, яго дзёньнікавыя запісы многіх прывялі ў стан шоку. Сьведкі і ахвяры іх непасьлядоўнасьці (назавем гэта так) ужо няма, а дух антаганізму абнародаваны. Як тут ня ўзьняць "высакароднага" ляманту, як не абурыцца, бо я ня я. Маралісты адразу засьпявалі пра чыстыя ідэалы дабра і справядлівасьці, забываючыся на тое, што чужая бяда белымі ручкамі не разводзіцца.

Але мараліст абураецца і пад уплывам свайго "высакароднага абурэньня" робіць высновы: "Сэрца пісьменьніка перапаўняла зло і нянавісьць...", "Пагарда і зьнявага да суайчыньнікаў, любоў да сям'і...".

У тым жа дзёньніку адносна размовы з К. Крапівою чытаем: "Было, вядома, і маё прабачэньне і за трывогу, і за тэлефонны званок, за сваю, мусіць, неабдуманую прапанову і некарэктнасьць (Адамчык прасіў Крапіву ў дні яго 90-гадовага юбілею напісаць зварот да моладзі, ад чаго той катэгарычна адмовіўся. – **Аўт.**). Даруйце яшчэ раз, нарэшце я змогся ў сваёй мальбе і просьбе. ...З гадамі, успамінаючы гэты выпадак, я чуў нейкую невымоўна цяжкую, незразумелую і невытлумачальную віну перад Кандратам Крапівою..."

Вось прыклад найдалікатнейшых адносінаў Вячаслава Адамчыка да сучасьніка і субрата па літаратуры, на якія была здольная яго душа. У тым жа дзёньніку далей: "Учора, сустрэўшы Сашу Станюту ў аптэцы, я падмовіў яго купіць маці, вядома за маё, бутэльку до пурпара (мал. віно). Спадарыня Стэфанія, напэўна, была бясконца рада. Бо хто ж успомніць пра шаноўных людзей, калі ня я". Такая вось "пагарда і зьнявага да суайчыньнікаў"... Але кожны чытае і бачыць толькі тое, што запраграмаваў убачыць.

Разумны чалавек павінен быць больш пластычным ува

ўспрыманьні і сьвету, і чалавека, і чалавечага творства. Выснова, характарыстыка, рэфлексія, што выказвае чалавек да чалавека, творца да творцы, заўсёды мае свой кантэкст адносінаў, а зразумець менавіта кантэкст дадзена ня кожнаму. Любоў і нянавісьць — катэгорыі паўнаты жыцьця, у якіх свая мараль і свае ідэалы.

Усё жывое імпульсіўна выказвае сябе. Вось іду па вуліцы, несучы пад носам белыя вусы, а з боку сустрэчных чую: то “Якое страхоцьце!”, то — “А мне даспадобы” (дзьве дзяўчыны, усьміхаючыся, абмяркоўваюць мае вусы). Можна, канечне, выдаць апошнім па ганарару, а да першага кінуцца з палкаю... Нашто тады розум, скажыце? Гэтак жа дваіста будзе, вядома, прынята і маё пісаньне. Адзін скажа: “Стары мудры яўрэй”, другі ўпэўнена: “Сам, мусіць, навалач страшэнная...” Так і жывем, бо вецер і сьпераду, і ззаду (а значыць, дыхаць яшчэ ёсьць чым). Калі нехта загігікае ад словазлучэньня “вецер ззаду”, значыць, жывы...

*Віцебск*

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
**№ 5 (28) – 2003**
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
**Апошняе абнаўленьне: 2003/12/14**
[image]